# Алесь Савіцкі

# Алесь Савіцкі

## Выбраныя творы ў двух тамах

### Том 2

**САМЫ ВЫСОКІ ПАВЕРХ**

**І НІЧОГА ЎЗАМЕН**

Аповесці

МІНСК «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА» 1985

Бел 2
С 13

Савіцкі А.

С 13 Выбраныя творы: У 2-х т. Т. 2. Самы высокі паверх; І нічога ўзамен: Аповесці.— Мн.: Маст. літ., 1985.— 448 с.

У пер.: 2 р. 10 к.

Аповесці Алеся Савіцкага «Самы высокі паверх», «І нічога ўзамен» — творы пра наш сённяшні дзень, пра маладога сучасніка, з яго клопатам аб будучым, вялікай маральнай адказнасцю за кожны свой крок у жыцці.

Аповесць «Самы высокі паверх» адзначана прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

С $\frac{4702120200-010}{М\ 302(05)-85}$ 125—85

ББК 84Бел7
Бел2

© Афармленне. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

# САМЫ ВЫСОКІ ПАВЕРХ

АПОВЕСЦЬ

## *Частка першая*

### 1

Мы будуем новы дом.

Дом з вялікіх белых блокаў.

Дом на пяць паверхаў. А кожны паверх — дванаццаць кватэр.

Гэтыя кватэры існуюць пакуль што толькі на паперы і, мабыць, у думках тых, хто будзе ў іх жыць. А вось рэальнасць: штабялі блокаў, глыбокі катлаван і ў ім левае крыло падмурка. Ды яшчэ графік, у адпаведнасці з якім заўтра павінны быць пакладзены пліты першага паверха.

Графік добры. Але ў ім, на жаль, не быў прадугледжан дождж, што хвастаў усю ноч аж да самага світання. Вада падмыла сцяну катлавана, зямля асела і засыпала пляцоўку. І мы не можам класці пліты. Мы сядзім і чакаем начальства — старшага прараба Грушаля.

Мы — гэта брыгада. Нас у брыгадзе сем чалавек. Самы старэйшы сярод нас Павел Сямёнавіч Ткач. Чалавек ён памяркоўны, сямейны: яго дачка сёлета заканчвае медыцынскі інстытут у Ленінградзе, і Павел Сямёнавіч кожны тыдзень гаворыць нам пра яе поспехі.

Паміж сабою мы завём Паўла Сямёнавіча фамільярна-скарочана — Паўло. Адкрыта звяртаецца да яго гэтак толькі адзін з нас — кранаўшчык Мікола Рыгоравіч Сініцын. Яны дружбакі: у вайну партызанілі ў адным атрадзе. У Сініцына ёсць сын, і вучыцца ён таксама ў Ленінградзе, але на геолага, і пра гэта нам ужо расказана не меней, як і пра дачку Ткача.

Сініцын вельмі падобны да свайго дружбака: спакойны, дабрадушны. Ён не падабаецца толькі аднаму з нас — Пятру. Пятро Чабоха — самы вясёлы хлопец у нашай брыгадзе — заве кранаўшчыка жартаўліва і насмешлі-

ва — Сініца. Толькі адзін Пятро адважваецца на гэта, і Сініцын не крыўдзіцца на яго.

Затое Барыс Шагун цярпець не можа гэтай мянушкі. Барыс увогуле чалавек вельмі нейкі ўжо сур'ёзны. Мы жывём з ім у адным інтэрнацкім пакоі, але па-сапраўднаму не сябруем. Барысу ўжо дваццаць два — на адзін год болей, чым мне,— ён маўклівы і заклапочаны ўвесь час; па вечарах нікуды не ходзіць, больш сядзіць у пакоі і ўсё думае, думае, альбо штосьць занатоўвае ў тоўсты сшытак. Аднойчы прызнаўся: задумаў, браце, пісаць кнігу. Я не вытрымаў, пахваліўся Віктару і Пятру. З таго дня Пятро заве яго пісьменнікам, а Барыс на мяне дагэтуль крыўдуе: табе, маўляў, давяраць нешта сур'ёзнае небяспечна.

Але я не гарую з тае прычыны — сябры ў мяне ёсць. Першы сярод іх Валя. Аб ёй я буду гаварыць яшчэ шмат. Затым Віктар Зубок. Мы разам з ім вучыліся ў школе, разам пайшлі працаваць і вось ужо трэці год тут, на будоўлі. Віктар быў побач, калі памерла мая маці. Штогод вясною ён ездзіць разам са мною ў Вабынічы; там, у брацкай партызанскай магіле над возерам, пахаваны мой бацька. Сёлета мы разам з Віктарам здавалі ўступныя экзамены ў Маскоўскі універсітэт. Здалі добра, але не засталіся чакаць рашэння прыёмнай камісіі. Нам сказалі, што паведамяць і прышлюць выклік. Паведамленне тое чамусьці затрымалася, але Віктар гаворыць, што гэта — справа звычайная.

Прыязнасць мая да Віктара цвёрдая. Тым не менш, ёсць чалавек, які скептычна ставіцца да нашага сяброўства,— Казімір Свірыдаў. Ён працуе ў нас другі год і чамусьці вельмі не любіць Віктара; той адчувае гэта і ніколі не ўпусціць зручнага моманту пакпіць. А Казімір ніколі амаль не адказвае яму, быццам не чуе. Спакойная, паважная Казімірава пагарда да кепікаў мне падабаецца: паважаю яго за гэта, і яшчэ за ўсё тое, што давялося яму перажыць.

Казімір — ён адных год з Барысам, хоць з выгляду намнога старэйшы за яго,— быў асуджаны на тры гады, але адседзеў толькі два: за старанную працу яму скарацілі тэрмін. Усе ў брыгадзе ведаюць Казіміравы мінулае, але пра тое мінулае ніхто ніколі не гаворыць і не ўспамінае: нават Віктар у сваіх жартах абмінае гэтую тэму.

Сціплы, вельмі разумны хлопец, сумленны. І за гэта Казіміра ў брыгадзе любяць. Бацька ягоны загінуў на

фронце, а маці пасля суда захварэла, доўга ляжала ў бальніцы, але цяпер направілася. Жывуць яны па Задзвінні.

Там жа, на Задзвінні, жыве і прараб Іван Тарасавіч Рогач — наш начальнік. Чалавек ён грубаваты, але прынцыповы і справядлівы. Рогач любіць так: працаваць дык працаваць, за чужую спіну не хавацца. І ніколі не крычыць, гаворыць спакойна і ўпэўнена.

Вось такая ў нас брыгада. І цяпер мы сядзім, і кожны лічыць патрэбным сказаць слова пра тую бяду, што нарабіў нам дождж.

Віктар іранічна пасміхаецца:

— Што ж, за рыдлёўкі будзем брацца? Давай каманду, брыгадзір. Ці можа пойдзем кланяцца Жаўняровічу?

Рогач спачатку не адказвае, невыразна хмыкае, спадылба зыркае на Віктара і толькі тады кідае кароткае і бязлітаснае:

— За дурной галавою і нагам і рукам спакою няма...

Галаву, мабыць, ён мае на ўвазе сваю.

Нічога не загадаўшы нам рабіць, Рогач узнімаецца. І мы ведаем: на шосты ўчастак пойдзе, да Жаўняровіча, чалавека хітрага і нахрапістага.

Нейкі час маўчанне. А што тут скажаш! У тым, што здарылася на ўчастку, ён, Рогач, бясспрэчна, вінаваты. Пазаўчора, калі бульдозер працаваў у нас, мы хацелі падраўнаваць катлаван, але прыбег Жаўняровіч і пачаў даводзіць: робіце, маўляў, непатрэбшчыну, надвор'е стаіць добрае, праз дзень-другі выведзеце падмурак з катлавана, можаце аддаць яму на дзень раней бульдозер.

Віктар болей за ўсіх пярэчыў, але Жаўняровіч перакапаў Рогача. Аддалі. І цяпер наш брыгадзір пайшоў упрошваць прараба з шостага ўчастка вярнуць бульдозер.

Парушае маўчанне зларадны смяшок Віктара:

— Выпрасіш ты ў яго цяпер! Трасцу. Ды Жаўняровіч пакуль работы свае не скончыць — на метр машыны ад сябе не адпусціць...

Барыс выцягвае з кішэні газету — ён заўжды купляе газеты па дарозе на будоўлю,— разгортвае, уздыхае:

— Пярэсты ты чалавек, Віцька. Ва ўсім благое табе мроіцца...

— І рэдка, між іншым, даволі рэдка памыляюся. Але паколькі я чалавек адсталы, чытай газету. Буду слухаць і павышаць сваю свядомасць...

Віктар кідае пінжак на блок, кладзецца на яго спіною

і, закрыўшы кепкаю твар, адразу ж сапе, быццам моцна заснуў. Але ж відно: зусім і не спіць — уважна слухае.

Барыс чытае — задумліва і сур'ёзна — маленькі допіс пра мужны ўчынак шафёра нафтабазы: машыну, што была ахоплена полымем, ён, рызыкуючы жыццём, выгнаў за вароты базы і ўсадзіў у сажалку.

— Стой! Гэта не нова, бачыў у кіно.

Барыс аж перасмыкнуўся:

— Эге, дык ты не спіш!

— А чаму загарэлася машына?

— Не пішуць, браце. Магчыма, ад выхлапу.

— Хацеў бы я быць на месцы таго шафёра.

— Ён ляжыць у бальніцы.

— Вы чуеце? Віцьку захацелася славы!

Віктар імпэтна прыўзнімаецца і сядзіць, ашчаперыўшы палатняныя штаны на каленях. У яго вузкіх карых вачах пагрозлівы бляск.

— Зусім не славы! — устаўляе Казімір.— Хочацца, каб Барыс прачытаў у газеце пра мужны ўчынак Віктара Зубка.

— І дзяўчат,— з'едліва кідае Пятро.

— Дзяўчаты мяне не цікавяць. Праўда, Лявон? Я мужна вырашыў адмаўляцца пакуль што ад шураў-мураў...

У мой гарод цэліць. Аднойчы Віктар папракнуў мяне сяброўствам з Валяй: збіраюся ехаць на пяць гадоў у інстытут і заводжу тут нейкі «раман», як ён сказаў. Ледзь не заляпіў тады яму аплявуху. А цяпер што, зноў ён за старое? І аб якой мужнасці вярзе? І чаму глядзіць на мяне, калі спрачаецца з Барысам, быццам хоча чымсь дапячы?

— Ты проста няправільна разумееш мужнасць,— спакойна і дзелавіта гаворыць Казімір.— Мужным нельга зрабіцца дзеля выгоды. Мужнасць павінна быць у сэрцы чалавека, і ён мужны не на вочы, а таму што не можа рабіць інакш...

— Цытуеш з Барысовай кнігі?..

Барыс моўчкі згінае газету; ссунутыя бровы, моцна сцятыя губы, чырвань паўзе вельмі хутка з-пад чорных валасоў на шыю — набліжаецца навальніца.

— Хлопцы,— папярэджвае Пятро,— на даляглядзе Грушаль. Канчай начаваць...

Старшы прараб не даходзіць да блокаў, на якіх мы сядзім, спыняецца непадалёк ад крана, на грабяні выкі-

нутай зямлі. Грушаль не вельмі доўга вывучае сцяну катлавана, што асела ноччу: па зыбкіх драўляных мастках ён ідзе ўніз, ходзіць там, нічога не пытае і не гаворыць, мы таксама моўчкі сочым за тым, як Грушаль таўчэцца на дне катлавана, як зганяе ботам рудую пену, што пухне на бруднай вадзе, як узнімаецца потым па мастках.

— Рогач пайшоў па бульдозер. На шосты,— урэшце вырашаю паведаміць я Грушалю, хоць ён па-ранейшаму нічога не пытае.

— Навошта? Гэта далёка. Пазваніце ва ўпраўленне Якімчыку. І скажыце, што я прасіў прыслаць бульдозер.

— Добра. Перадам Рогачу...

Пагаджаюся з Грушалем, але стаю на месцы, і ён рэзка паварочваецца, брыль ледзь не падае з галавы — Грушаль паспявае прытрымаць яго рукою.

— Я прасіў не перадаваць, а пазваніць. Неадкладна,— дадае ён мякка і даверліва, быццам просіць прабачыць ранейшую рэзкасць.— Ваш катлаван убачыў — ледзьве не самлеў. У мяне на стокватэрным прабілася грунтоўка. Няўжо, думаю, і тут прэ? Ажно бачу — дождж гэта...

Ён глядзіць на мой лоб, але адразу відно, што думкі яго ўжо далёка, на тым, мабыць, участку, дзе будуецца стокватэрны дом. У вялізных чорных вачах Грушаля, пад шырокімі, як бы намаляванымі бровамі, асядае клопат, глыбокая зморшчына праразае шчаку, да сіні выгаленую.

— Можа, і там вада дажджавая?

— Не! І адкуль? Адкуль прэ?

Ён пытае гэта і тут жа, не чакаючы адказу, просіць, дакранаючыся рукою да майго пляча:

— Напомніце, калі ласка, Якімчыку. Людзей з вадаканала ўсё яшчэ няма...

Ён не ідзе, а бяжыць амаль ад нас; зялёны яго пінжак хутка хаваецца за штабялямі белых блокаў, і над імі нейкі час плыве жоўтае кола саламянага брыля.

Віктар шматзначна пасміхаецца:

— Чаго не ідзеш? Бяжы, звані!

— Думаеш, вельмі хочацца?

— Тады я... Дазваляеш?

З руплівай гатоўнасцю Віктар падхопліваецца, робіць адзін крок, другі... Азірнуўшыся, спыняецца, потым варочаецца і штурхае мяне ў плечы:

— Ма-арш! І не пылі тут...

Адкідваю трэску, якой толькі што зграбаў пыл на шырокай бакавіне блока, і выходжу на вуліцу.

Вялікага жадання гаварыць з Якімчыкам у мяне няма, бо ведаю: нічога ладнага з гэтай гаворкі не атрымаецца. Жаўняровіч пашле бульдозер сёння? Смешна. І яго няма чаго вінаваціць — ёсць і ў іх свой графік. А Якімчык? Свой розум трэба мець і не спадзявацца на добрае надвор'е. Вось што скажа Якімчык. І скажа з іроніяй, нажартуе так, што будзе сорамна. І Грушаль ведае гэта. Ведае і таму паслаў званіць мяне.

Калі па шчырасці — не вельмі падабаецца мне Грушаль. Чалавек ён неблагі і інжынер добры, з вялікім вопытам, і з ім лічацца. А вось начальства баіцца непамерна, ніводнага слова наўпярок не скажа. І спрачацца не любіць. А спрачацца, даводзіць сёння, мабыць, прыйдзецца нямала... А што даводзіць? Нам патрэбен бульдозер. Коратка і ясна.

Тэлефон-аўтамат непадалёк ад нашай будоўлі — трэба перайсці вуліцу і, мінуўшы магазін гароднiны, павярнуць направа. Адразу ж за паваротам — чырвоная тэлефонная будка.

Будка пустая, я гэта добра бачу праз шкляныя бакавіны. Дзверы зачыняюцца блага, увесь вулічны тлум лезе ў вушы, і я, прытрымліваючы бліскучую трубку, набіраю нумар нашага ўпраўлення. Трэск. Шолахі. Потым — голас. Глухі і далёкі, быццам з глыбокага скляпення. Але я пазнаю яго адразу. Толькі ў Валі гэткі пявучы і сардэчны голас.

— Мне патрэбна таварыш Лабоха,— прашу з робленай строгасцю і ледзьве не крычу ад радасці, што пачуў яе голас.— Гэта я, Валюха. Званю вашаму Якімчыку!

І адразу, быццам другі чалавек:

— Даю кабінет галоўнага інжынера...

Што гэта з ёю? Адкуль такая афіцыйнасць? Не пазнала, хіба? Ці можа я пераблытаў?

— Гаварыце! Галоўны вас слухае...

Не, яна. Відаць, проста не пазнала: з нашай тэлефоннай будкі заўжды блага чуваць.

— Хто? Бугрым? Які там яшчэ Бугрым?.. Ад Грушаля? Ну-ну... Што здарылася?..

Пытанні Якімчыка кароткія, патрабавальныя. А ва мне — раптоўная незразумелая злосць. Чаму Валя гэтак гаварыла са мною? Магчыма, у прыёмнай было шмат людзей і яна пасаромелася?.. Мабыць. Але як там ні было, а гэтак гаварыць са мною нельга. І ўжо не крыўда, а па-

дазропасць вярэдзіць сэрца: якія там у яо могуць быць людзі?..

Як мага карацей кажу Якімчыку ўсё тое, што загадаў мне Грушаль. Размаўляю з ім, а ўяўляю сабе не яго вялізны кабінет, а вузкі і цёмны пакой прыёмнай, уяўляю людзей, якія сядзяць там і жартуюць з Валяй і якім яна ўсміхаецца. Ёй добра там усміхацца. А мне трэба даводзіць Якімчыку, што бульдозер нам вельмі неабходны, а яго няма, і мы не ведаем, дзе яго сёння ўзяць.

Якімчык гаворыць са мною з'едліва, але лагодна, і раптам павышае тон, і голас яго грукае, быццам забівае цвікі:

— Няма. Няма. А дзе Рогач? Чаму не звоніць?

Калі ён будзе на мяне крычаць, я магу ўвогуле кінуць трубку. Я просты рабочы: сказалі пазваніць — званю. Не магу ж я забараніць Рогачу ісці да Жаўпяровіча.

Ён слухае мой адказ і рагоча, рагоча дабрадушна і весела.

— Вось, вось... Няхай цяпер і дамаўляецца з Жаўпяровічам. Навошта ж было пахваляцца: раней графіка, раней графіка. А што ён думаў? І якім, галоўнае, месцам?

— Не ведаю. «Зараз пазваню ёй. Знарок пазваню».

— А варта было б. Колькі кубаметраў грунту ў катлаване?

— Можа, дзесяць. Можа, болей. Не лічылі. «Пазваню абавязкова. Усміхацца тым знайшла, мусіць, час...»

Далёкае невыразнае шолханне злятае з мембраны. Потым зноў, поўнае іроніі:

— Дзесяць кубаметраў яны не могуць выкінуць. Няхай Рогач сам возьме рыдлёўку. Самую вялікую. Так і перадасі. І каб графік быў!

— Добра, перадам. «Пазваню і спытаю. Ці не ад Якімчыка гэта яна набралася...»

Я слухаю лаянку галоўнага інжынера і пералічваю чорныя кольцы ланцуга, якім прыкута тэлефонная трубка да сцяны. Ланцуг моцны, цяжкі.

— У мяне ўсё,— урэшце гаворыць Якімчык.— І няхай Рогач увечары звоніць сам. Чуеце?

— Так.

Вечкам трубкі я націскаю рычаг. Жалезны ланцуг звонка бразгае па сцяне; трубка гайдаецца, а мне здаецца, што яна ўсё яшчэ дрыжыць ад шалёнага крыку Якімчыка.

Па шкле кабіны, з двух бакоў, барабаняць медзякамі. Пад гэты рэзкі і непрыемны бразгат набіраю Валін нумар.

— Упраўленне слухае...

Яе голас!

І ўсё тыя ж інтанацыі — строгія, афіцыйныя. Але цяпер сапраўды чую ў трубцы невыразную людскую гаману і вясёлы смех. Слухаю і маўчу, пакуль не чую доўгія гудкі — паклала трубку.

Зноў набіраю нумар і на сухое афіцыйнае — «Упраўленне слухае» — кажу змененым хрыпатым голасам:

— Чаму ў вас гулянка ў рабочы час?.. Гармідар адсюль чуваць...

— Таварышы, прашу цішэй...

Яна сказала гэта сцішана — відаць, прыкрыла трубку даланёю,— а потым зноў патрабавальна:

— Прабачце, хто гэта гаворыць?..

— Адразу і «прабачце» з'явілася.

Асцярожна чапляю трубку на рычаг і выходжу.

— Ну, нагаварыліся! Колькі ж можна, малады чалавек?

Паўз мяне шмыгае ў кабіну жанчына, з бразгатам зачыняе дзверцы, і незадаволены голас яе знікае, як бы адрэзаны нажом...

На будаўнічай пляцоўцы ціха. Сініцын і Ткач поркаюцца ля крана. Барыс па-ранейшаму чытае газету. Віктар з Рогачам схіліліся над шахматнай дошкаю, што ляжыць на шырокай бакавіне блока. Шахматы — Казімір цягае іх у кішэні — маленькія, абшарпаныя.

— Што чуваць?

Рогач пытае гэта не ўздымаючы галавы — не можа адарваць свой позірк ад шахмат.

— Загадана браць рыдлёўкі. Бульдозера сёння няма.

— Няма дык няма. А ў нас што ёсць? — пытаецца Віктар і, крыху счакаўшы, урачыста дадае: — Шах вашай высокасці!

— Аддаеш каралеву? — Рогач шчыра здзіўлены.— Бяру яе, прыгожую. Ах, вось якая тут загвоздка! Затым — канём, і мне — капцы!..— Ён у замяшанні чухае патыліцу, зрывае з галавы кепку, кладзе яе на калена і прыціскае кулаком: — І што, няма выйсця?

— На жаль... Усё прадумана. Ты згроб каралеву. І за гэта — мат. Магутны! Хоць і звычайны па кампазіцыі... Дзіцячы, адным словам.

У вясёлых Віктаравых вачах, на ружаватых ад хвалявання шчоках, на падціснутых тонкіх губах радасць пера-

можцы. Але гэтая радасць няшчырая: праз яе прабіваецца дрэнна прыхаваная зларадпасць.

Вось жа натура! Ва ўсім, нават у гульні, Віктар хоча быць толькі пераможцам і пудзіцца, пакутуе, калі выходзіць не па-ягонаму; у такія моманты твар у Віктара робіцца агідны.

— У гэтай кампазіцыі ёсць памылка,— нечакана гаворыць Казімір.— Дзіцячая, ужываючы тэрміналогію Віктара. Але даволі істотная. Дазвольце, брыгадзір, дагуляць партыю...

Віктар скептычна ўсміхаецца, па чарзе аглядае нас. Вы, маўляў, бачыце гэтага дзівака?.. Але, калі хоча ён, будзеце сведкамі вялікай наіўнасці.

— Сядай, Казімір! Сядай! — патрабуюць хлопцы.— Сашкрабі з яго — падумаеш, задавака! — трохі пыхі. Сядай! А мы паможам...

— Наваліцеся, наваліцеся, браточкі. Але тут вам сам гасподзь не паможа нават.

— А нам на яго напляваць,— грубавата гаворыць Казімір і ўпэўнена садзіцца, абжаргаўшы блок.— І на каралеву таксама!

— Каралева — жанчыну паважаць трэба! — табе, між іншым, гэтага не даруе...

— Няхай яна тое свайму каралю, ведаеш, гаворыць!

— Лепей хадзі!

Уладарным узмахам рукі Віктар запрашае гуляць. Казімір робіць ход, чакае, як адкажа Віктар. Той раптоўна чырванее — згледзеў небяспеку.

— Назад хадоў не даю. Каралева ўзята.

— Настойваеш? — Казімір глядзіць на Віктара з усмешкай.

— Так.

— Як хочаш. А можа перадумаеш?

— Твой ход! — сярдзіта, не зважаючы на іронію, загадвае Віктар; лоб яго ўзмакрэў і блішчыць ад поту.

— Мой? Калі ласка... У такім выпадку ён зусім просценькі. Ходзіць пешка...

— Ходзіць? Пакацілася ўжо!..

Рогач нахіляецца да Казіміра, нешта шэпча яму на вуха, потым штурхае мяне локцем, штосьці гаворыць. Але мая ўвага цалкам там, на шахматнай дошцы.

Віктар праігрывае. Мабыць, яшчэ раней, пазіраючы за гульнёй Рогача, Казімір прыкмеціў яго памылку, пра-

думаў партыю і цяпер, знайшоўшы правільнае заканчэнне, адказвае на кожны Віктараў ход маланкава.

Казімір гуляе моўчкі, твар яго строгі і спакойны; ён не курыць, але час ад часу падносіць запалку да рота, кратае яе губамі; запалка ледзь прыкметна ўздрыгвае ў пальцах.

Віктар шалее, пагардліва бурыць шахматы і падхопліваецца; твар у яго чырвоны ад злосці.

— Гэта не гульня! Спачатку адзін боўтаў, цяпер другі сеў. Не люблю!

— Што ты не любіш?

— Гэтага вось і не люблю.

— Не любіш праігрываць,— усё тым жа спакойным тонам удакладняе Казімір.— Гэта мы ведаем...

— Радасці! Чужая партыя! Паспрабуй сваю зрабі. Садзіся! Згуляем!

— ...остался от барона только пшик. Аля-ля-ля... аля-ля-ля...— пад дружны рогат спявае Пятро.

Віктар яшчэ болей чырванее; вочы, звужаныя шалам, зыркаюць дзёрзка і нядобра.

— Чыя б карова мычала... Ты ж нават у шашкі гуляць не можаш. А нос соваеш!

— Не ўмею, Віця, у шахматы. Святая праўда, не ўмею,— з прастадушнай даверлівасцю згаджаецца Пятро.— Але ж затое нікому і не праігрываю. І табе раю: кінь шахматы, пераключайся на каменьчыкі. Тут я цябе абстаўлю...

Мы зноў — у смех. Рогач, хаваючы ўсмешку, гаворыць:

— Пажартавалі, хлопцы, і хопіць: работка чакае. Трэба сёння пліты паставіць, бо нешта зноў збіраецца на дождж падобнае...

Неба сапраўды хмарыцца; сцяжок на вежы крана вісіць нерухома, ад сырога жвіру патыхае парнай вільгаццю.

Віктар глядзіць на блізкія ўжо хмары, моршчыцца:

— Як цяпер катлаван ачысціш...

— Не чуў, што Бугрым казаў? — Рогач пытае гэта са спачувальнай усмешкаю.— Рыдлёўкамі. Самую вялікую, як і загадана ўпраўленнем, бяру сабе...

— І кідаць уверх! З гэткай глыбі?

— Навошта. Возьмем растворны коўш і будзем насыпаць.

Хлопцы ідуць у бытоўку — рыдлёўкі ляжаць там. Віктар усё яшчэ не можа супакоіцца — крыўда жыве ў ім,

і ён злуе, размахвае перад маім носам рукамі, бурчыць:

— Навошта ён выпендрываецца? З раніцы, бачыце, хацеў працаваць. І працуй! Лёгка яму казаць ды загадваць. А як не зацвердзяць гэты нарад? Задарма рабіцьме? Ды яшчэ ківаць будуць, што глядзім раўнадушна на парушэнне закону!

Мне робіцца смешна.

— Ну, не бурчы, не бурчы,— прашу я.— Усё роўна ад рыдлёўкі ты не адкруцішся.

— Рыдлёўка! А чалавек лётае ў космас!

— То ж чалавек, Віця!

— І ты пачынаеш? А яшчэ сябар! Пляваць я хацеў на вашу рыдлёўку. Не пайду!

Пінжак яшчэ ляжыць на шырокай бакавіне блока. Віктар дэманстратыўна кладзецца на спіну, глядзіць на хмарнае неба, пасвіствае.

Прыкра бачыць Віктараву крыўду, але я апраўдваю яе: прайграў партыю. А вось пагарду і непрыязнасць да Казіміра, да Рогача, да ўсіх нас даравацьне магу. Цвёрда і без усялякіх кепікаў я кажу Віктару, што брыгадзір прыняў адзіна правільнае рашэнне. І яшчэ: не магу і не буду раўнадушным, калі бачу хітраватае гультайства. Віктар зазлаваў, нават пакрыўдзіўся, што яго абгулялі ў шахматы. А хто яму перашкаджаў выйграць? А цяпер? Нейкая дробненькая помслівасць. І ў дадатак гэтая скарга. Бяды вялікай, калі нарад не закрыюць. Нам трэба класці падмурак, гнаць хутчэй першы паверх, каб увайсці ў графік. Няўжо гэта цяжка зразумець?

Віктар нічога не адказвае, толькі пасвіствае з упартай злосцю незаслужана пакрыўджанага чалавека.

За катлаванам грукоча бульдозер. Відаць, блага мы ведаем таго Жаўняровіча — прыслаў жа машыну. А мо і з упраўлення націснулі. І, зрэшты, не гэта важна: мы ўратуем графік.

Бульдазерыст, як добрым і старым знаёмым, усміхаецца:

— Што, гаротнікі, заселі? Шосты навінеп вас выручаць!

Рогач не хавае свае задаволенасці:

— Ёсць, значыцца, душа ў гэтай старой жмінды! Ну, хлопцы, цяперака націснем!..

Віктар падхопліваецца з блока:

— Эх вы! Не схацелі мяне слухаць! Рыдлёўкі пахапалі. У час прагрэсу!

Віктар хоча прымірэння. Але на яго ўжо не звяртаюць увагі — няма часу. Мы раўняем сцяну, што асела ноччу, прабіваем траншэю і тут жа кладзём апорныя пліты — баімся, каб крохкая сцяна жвіру не асыпалася зноў.

На ўкладку кожнай пліты ідзе пяць мінут. А потым, пакуль кран прыцягне новую, у нас ёсць дзве мінуты адпачынку.

Мы сядзім на вільготным пяску. Пятро, з робленай дзіцячай наіўнасцю ў вачах, глядзіць на Віктара.

— Ці ж праўда гэта, Віцька? Летась, кажуць, ты гуляў на першынство горада па шахматах?

— У цябе не спытаў.

— Дзівак, і ён яшчэ злуе.— У голасе Пятра тая ж, што і ў вачах, дабрадушная наіўнасць.— Ды проста хачу ведаць. І нібыта прыязджаў Батвіннік.

Дакладны і хітры разлік: Віктар не можа пакінуць і не пакідае такую недакладнасць без адказу.

— У наш Прыдзвінск? Хлусня!

— І мне так здавалася. А цяпер бачу — праўда. А чаму, ты не ведаеш?

— Няма ў Батвінніка іншага клопату! Ды калі яму ўсе гарады аб'ездзіць — жыцця не хопіць...

— Не, Віця, тут, мабыць, зусім не так было,— праставата гаворыць Пятро.— Думаю, спалохаўся Батвіннік — а што, маўляў, як з Віцькам пасадзяць гуляць! Аблапошыць. Таму і не паехаў...

Разам з усімі рагоча і Віктар, рагоча ненатуральна звонка, і я заўважаю, што ягоны голас не зусім шчыры; не, яшчэ не ўсё дараваў ён нам, хоць і намагаецца схаваць гэта. Адкуль у яго гэтая пустая пыха, дурное жаданне ўзвысіцца над усімі? Ён жа роўны сярод нас. Тольі хіба лепей за прараба гуляе ў шахматы. Няўжо ён не разумее, што самае разумнае шчыра пасмяяцца з намяркоўных кепікаў Пятра?..

Кран цягне апошнюю — на вугал падмурка — пліту. Яна павісае над траншэяй, мякка садзіцца на грунт. Барыс першы заўважае, што пліта нестандартная, у расколінах, і абураецца:

— Чорт бы іх там драў. Як цяпер паставіш?

Віктар, весела насвістваючы, раіць:

— А ведаеш, проста фю-юю... Супем — і ўсё. Фю-юю... Зямлёй засыплецца — тысячу гадоў прастаіць.

Рогач, нядобра зыркнуўшы на Віктара, тыхнуў ботам рабро пліты, кінуў кароткае:

— Мяняць!

Рыпнулі тросы; чмякнуўшы, пліта адрываецца ад вільготнай зямлі і, зусім не гайдаючыся, ціха і спаважна выплывае ўверх з катлавана.

На дно траншэі, калі пліта скранулася з месца, асыпаюцца дробныя рыхлыя камякі. Мы зграбаем іх. За насыпам нешта суха трашчыць і глуха, аж здрыгануўся дол, грукае; гучна, як вялізныя струны, гудуць тросы крана.

Віктар ужо выкараскаўся з катлавана на жоўты жвір насыпу, рагоча, у вялікім узрушэнні ўзмахвае рукамі.

— Го-го-го карці-іна, хлопцы! Сініца будыніну скапуціў!

Лезу на насып, да Віктара. Але тое, што бачу, не выклікае ў мяне весялосці.

Сініцын проста не разлічыў, і цяжкая, на паўтары тоны вагою, пліта крыху зачапіла хляўчук і вугал плота, што абгароджвае даволі ладны садок за насыпам. Плот паваліўся, падмяў парэчкі і малінпік; нізенькі, з чорнага бярвення хляўчук — колькі яму там трэба было! — ад удару пліты скасабочыўся, асеў; сярод бэлек, недзе ўглыбі, верашчыць свінчо.

На ганак старой хаты, ашаляванай і пафарбаванай у зялёны колер, што стаіць крыху воддаль ад хлеўчука, за яблынямі, выбегла гаспадыня з бліскучым палонікам у руцэ. Нейкі час — дрэвы закрываюць ад яе паваленны плот і разбураны хляўчук — яна стаіць, слухае, ніяк, мабыць, не могучы даўмецца, што здарылася. Потым, пачуўшы віск парасяці, борздзенька кідаецца з ганка на сцежку і бяжыць да хлеўчука.

Дзверына — маленькая і таксама пафарбаваная ў зялёны колер — перакасілася, не паддаецца. Гаспадыня мітусіцца, вісне на клямцы, потым адбягаецца, глядзіць на нас — а мы, выцягнуўшыся шнурам, стаім на насыпе — і раптам лямантуе, пранізліва і непрыемна, нібыта плача.

— Юй-юй-юй... Што ж яны гэта нарабілі! Юй-юй-юй... Што нарабілі, паразіты! Юй-юй-юй... Людцы, людцы, паглядзіце!..

Свінчо ў хлеўчуку, пачуўшы знаёмы голас, верашчыць як рэзанае. Гаспадыня ярасна тузае дзверыну, спрабуе адчыніць.

— Дзюшачка мая! Дзюшачка родная! Юй-юй-юй... Ды што ж вы стаіцё? Ратуйце, паразіты няшчасныя!..

Мы з Віктарам кідаемся на помач, з усяе сілы напі-

раем па шырокія дошкі плячамі. Дзверыпа прыадчыпяецца, і тады адразу праз тую шчыліну ў сад выслізгвае ладны пярэсты парсюк.

— Гу-гу-га! — галёкае Віктар.

— А каб жа табе ў пячонках гугнулася! — стогне, праплач, гаспадыня і лупіць Віктару палонікам па плячах.— Я ж табе, вісус дурны, па-акажу!

— Аё-ё-ёй! Забіваюць!..

Смеючыся, Віктар бяжыць да Рогача: прараб злез з пасыпу і таксама кіруецца да хлеўчука.

Гаспадыня ваяўніча размахвае бліскучым палонікам, падступае цяпер да Рогача.

— Зараз жа каб мне плот стаяў! І хлеўчучок. Новенькі вы мне цяпер паставіце. Новенькі!

— Навошта ён вам, цётачка,— Віктар пакрысе набліжаецца.— Пазносяць усё тут. На Кастрычнік кватэру дадуць, з ваннаю...

— Чакай, Віктар,— спыняе яго Рогач і робіць знак адысці.— І вы, гаспадынька, дарэмна хвалюецеся. Зараз усё паправім як належыць...

За хатаю верашчыць свінчо. Гэта на нейкі час выратоўвае нас: гаспадыня кідаецца туды. Але яна вяртаецца зноў, калі мы, паставіўшы новы слуп, мацуем да яго плот. Слуп новы, глыбока ўкапаны. Гаспадыня навальваецца на яго грузным целам, учапіўшыся аберуч: слуп крыху пахіляецца.

— Ці ж так мой слупок стаяў? Не скранеш! А гэты? Маліпіна! Ён жа ад ветру хістаецца! Калі не перакапаеце — скаргу падам. Я ведаю, куды пісаць. Ведаю!

Нават маўклівы Ткач і той урэшце не вытрымлівае:

— Аціхні, цётка. Як мае быць слуп укапаны...

— Я вам яшчэ не гэтак аціхну! Я вас яшчэ ў міліцыю пацягну. Колькі малінніку зглумілі. А парэчкі? А вой жа ты вой! Што ж гэта робіцца!..

Ткач ужо сам пе рады, што зачапіў гаспадыню, і маўчыць. Віктар міргае яму, нечакана плёхаецца на мяккі жвір пасыпу, стогне на ўвесь голас:

— Ай, Пятро, рука баліць! О-о-ёй-ёй, баліць. Руку зламала мне гэтая баба жалезным палонікам!

Віктару даспадобы гэтая гульня; ён надзвычай хутка ўвайшоў у ролю пакрыўджанага, так хутка і натуральна, што адразу ж і здзівіў і напалохаў гаспадыню. Узрадаваны гэтым поспехам, ён ужо не можа спыніцца, стог-

не яшчэ грамчэй, выцягвае наперад сагнутую руку, і пальцы на ёй адразу растапырваюцца.

— Во як рука цяперака скрывілася. Калека! Дазвольце, брыгадзір, пайсці ў бальніцу па даведку. А заўтра — у міліцыю! А потым — у суд! Няхай калецтва яна мне аплоціць!..

Усё атрымліваецца ў яго вельмі натуральна — і голас, і рука, і скрыўлены ад болю твар. І толькі па веях, што дрыжаць на прыплюшчаных вачах, я здагадваюся, як цяжка яму стрымліваць смех.

Гаспадыня ўтрапёна аціхае, потым скоранька шыбуе сцежкаю ў другі канец саду. Яна больш не падыходзіць да нас, корміць ля ганка парсюка, і адтуль далятае сытае, ціхае рохканне.

Ткач прыцёг з прарабкі клямары, жалезныя, з рэдкай, але глыбокай насечкай на загнутых канцах. Мы змацавалі імі бярвенне ў сцяне хлеўчука, падправілі дзверыну.

— За гэтую работу і паўлітэрка належыць,— жартуе Віктар; ён ужо «здаровы» і прыбівае аполкі ў плоце.— І яшчэ дзякуй, бо цяпер мацней, чымся і было.

Ткач злосна ўзмахвае рукою.

— Няхай лепей адчэпіцца. І па гэтым дзякаваць трэба. А колькі засталося тут стаяць гэтаму хлеўчуку? Да восені. А звягі?.. Болей гадзіны — таму свінёнку пад хвост... Даўно б сваё кончылі...

Мы зноў лезем у катлаван і хутка ставім апошнюю пліту падмурка. Праца ідзе спорна і весела. У нашых жартах вельмі часта ўпамінаецца той палонік, што быў у руках гаспадыні.

Віктар не крыўдзіцца: круціць рукою над галавой — сігналіць кранаўшчыку — і рагоча:

— Глядзі, Сініца, прарабкі нашай не абярні. Куды ў дождж схаваемся. Пільнуй будан!

Да канца — мы працуем сёння крыху пазней звычайнага: папрасіў брыгадзір, і ўсе пагадзіліся — пасціяваем пакласці першы рад блокаў. Рогач — ён задаволены незвычайна — аглядае катлаван, ледзьве прыкметна ўсміхаецца і сам памагае нам несці ў прарабку ламы і рыдлёўкі.

У прарабцы — вясёлая мітусня. Хутчэй за ўсіх пераапранаюцца Барыс і Пятро — яны спяшаюцца на футбольны матч: прыдзвінскія футбалісты сёння гуляюць на сваім полі з мінчанамі.

— А ты чаго валыніш? — Рогач пазглядае на Віктара.— Ці што, скруцілася каруселька?

— Точна. Зламалася машына...

Віктарава слабасць — карусель — нам вядома. Новае вялізнае каруселынае кола ўстанавілі ў парку ля Дзвіны вясной — з таго дня Віктар вельмі часта па вечарах гібее там. На мінулым тыдні, зусім выпадкова, я раскрыў сакрэт гэтага захаплення: не карусель, а бібліятэкарка маленькай чытальні, што размешчана ў іншым зусім баку парку, цягнула яго туды. Віктар папрасіў мяне нічога не казаць хлопцам. Я абяцаў, хоць і здзівіўся: у брыгадзе паміж сабою мы нічога не ўтойвалі. А цяпер ягоны жарт здзівіў мяне яшчэ больш: навошта тоіць ён свае сяброўства? Чаму нікому нічога не гаворыць?..

— А ўчора, між іншым, карусель працавала.

Адчуваю: гэта Казімір гаворыць знарок.

— Значыцца, адстаўка табе, Віця,— жартуе Рогач.— Ды прызнайся, ніхто цябе за гэта не папракне. Дзяўчаты цяпер капрызныя...

Віктар шматзначна падміргвае:

— Точна, брыгадзір. Адстаўка поўная на сягоння. Запланаваны вечар адпачынку і цыганскіх рамансаў. Прыйдзеш, Лявон? Ёсць новы запіс...

Хіба ён не ведае? У нас з Валяй кіно.

— А ты, Казя? Заходзь, калі час ёсць...

— Няма часу.

— Праўда ж, ты цяпер каруселіш? Жадаю ўдачы!

Казімір бы і не чуе зусім Віктаравых слоў; спакойным кіўком галавы развітваецца і шпуруе да вуліцы. Услед за ім цягнуцца прараб, Сініцын і Ткач — усе яны жывуць па Задзвінні: аўтобусны прыпынак побач, а ехаць ім доўга.

Сёння адзін толькі я не спяшаюся: білеты ў нас з Валяй на дзевяць гадзін.

І справа не толькі ў гэтым.

Люблю, застаўшыся на адзіноце, глядзець на тое, што мы зрабілі за дзень усёй брыгадаю. І я стаю цяпер над катлаванам, і маўклівыя рэчы абкружаюць мяне, і мне добра глядзець на іх і думаць. Усё вакол — гэта толькі здаецца, што рэчы маўклівыя,— поўніцца сваімі гукамі, цікавымі і незвычайнымі: ценелька-ценелька шалахціць, асыпаючыся, падсохлы за дзень жвір на касматых грабянях насыпу; ходзіць вецер у штабялях блокаў, здзьмухвае з белых брусоў лёгкі шэры пыл, і блокі ледзь чутна спяваюць; нерухома вісяць тросы крана, бліскучыя і тон-

кія ў промнях сонца, і вецер кратае іх цёплымі, нячастымі подыхамі, і ў сталёвых нітках тросаў абуджаецца няясны спеў, таксама далёкі і невыразны, поўны таямнічасці.

За спіною чую крокі і ціхае прастуджанае пакашліванне — ідзе Грушаль. Крокі ў яго цяжкія, нейкія працяглыя, быццам чалавек валачэ ногі па зямлі; пад жалезнымі абцасамі чаравікаў рыпіць жвір.

Грушаль спыняецца побач. Ён аглядае пакладзеныя ў катлаван пліты і блокі, але маўчыць, павольна закурвае і працягвае мне пачак грузінскіх папярос. Я ведаю, што іх прысылае яму ягоны брат з Грузіі, ведаю, што Грушаль зараз спахопіцца, як гэта робіць заўжды, бо прапаноўвае папяросы чалавеку, які зусім не курыць.

Але сёння я памыляюся. Грушаль стаіць маўклівы, засяроджаны, потым спакойна, быццам усё яшчэ ўзважваючы штосьці, закрывае папяросны пачак, хавае яго ў кішэню.

— «Построю дворцы ледяные, каких не построит народ...» Не памятаеце, у каго гэта з рускіх паэтаў?

Пытанне бянтэжыць мяне. Яно такое нечаканае, што я, разгубіўшыся, не магу адказаць. Ведаю, хто напісаў. А вось адкуль — не магу прыгадаць...

А Грушалю ўжо, відаць, і не патрэбен мой адказ.

— Рогач, мабыць, пайшоў дамоў?.. Хацеў я цягнуць яго на стокватэрны. Паўдня мы там біліся. І што аказалася? Звычайны водаправод. Знайшлі трубу і — кропка. А бульдозер вам Жаўняровіч даў?

Ён слухае мае кароткія тлумачэнні, зноў аглядае блокі на дне катлавана і скупа, стрымана хваліць:

— Але ж і надабраў сабе Рогач хлопцаў. Пазайздросціш. Даўно ведаю: з галавой ён. І таму баюся, што пацягне яго Якімчык да сябе.

— А мы не аддамо!

Грушаль звонка рагоча.

— І ён пра вас гэтак жа гаворыць. Баіцца, каб не разбурылася брыгада. Што, інстытут ваш маўчыць?

— Але...

— Гэта ў іх бывае. Канцылярыя, відаць, блага працуе. Вельмі пагана, мой юны сябар, калі канцылярыя робіць не тое што трэба...

Моцным узмахам рукі ён адкідвае ад сябе асмалак і, скасавурыўшыся, глядзіць на мяне; цень заклапочанасці знікае з ягонага твару, тонкія зморшчынкі збіраюцца ў

вачніцах, і тоўстыя абветраныя губы ламае хітраватая і ў той жа час добрая ўсмешка.

— Што так паглядаеце, мой юны сябар?.. Здзіўляецеся?

— Крыху.

— І яшчэ думаеце ўпотай: што ён вярзе тут, стары Грушаль?.. А мне, па шчырасці, шкада проста...

Каго ён шкадуе? Незвычайна і крыху дзіўна гучаць гэтыя словы. Але Грушаль не хлусіць, ён заўжды гаворыць праўду. Калі не хоча гаварыць праўды, лепей змоўчыць, але хлусіць не будзе. Дзіва, каго ж яму цяпер шкада? Мяне і Віктара?.. Магчыма, нешта з інстытута прыслалі на ўпраўленне?

Грушаль нібыта ведае, што я чакаю тлумачэнняў.

— Шкада Рогача,— дадае ён.— Не хоча адпускаць такіх харошых хлопцаў з брыгады. Па сакрэту: учора ва ўпраўленні ішла гаворка пра замену. Нічога пэўнага не вырашылі. Брыгадзір ваш абы-каго не хоча...

А Рогач каб жа слоўца мне пра тую размову! А мо казаў Віктару? Не. Ён увогуле нічога не гаворыць пра наш ад'езд, быццам мы нікуды не збіраемся і будзем у ягонай брыгадзе заўсёды.

У змоўчванні Рогача я адчуваю цяпер тое ж, што гучыць у словах Грушаля. У шчырай развазе ягоных слоў, шкадаванні нават, што хутка нас з Віктарам не будзе на будоўлі, я раптам — зусім нечакана для сябе — бачу новага Грушаля, зусім не таго старшага прараба, якога сёння раніцою лаяў і да якога ставіўся з пагардаю, бачу свайго паплечніка і адчуваю яшчэ большую радасць адтаго, што ён памятаў пра мяне і майго сябра. Цікава, а каго ж прапаноўвалі ім ва ўпраўленні замест нас? Спытаць?.. Не, гэта не зусім добра.

— Значыцца, графік вы цяпер зноў пагналі?

— Вядома,— я паціскаю працягнутую для развітання руку Грушаля.— Калі не затрымаюць блокі і раствор.

— Будзем спадзявацца. Яны, увогуле, абяцаюць...

Грушаль ідзе з пляцоўкі, марудны і крыху згорблены,— так ходзяць звычайна ўсе стомленыя людзі,— нечага спыняецца ля нашай бытоўкі, але не падыходзіць да яе і зноў шыбуе далей.

Адале выходжу на вуліцу і я.

Іду пешкі, мінуючы трамвайны прыпынак. Вось і тэлефонная будка. Перад палуднем я званіў адсюль ва ўпраўленне Якімчыку і гаварыў з Валяй. У будцы цяпер

стаіць дзяўчына, крыху нахіліла голаў, і тэлефонная трубка, прыцісnутая да вуха, схавана пад пышнымі чорнымі валасамі. Правай рукою дзяўчына нецярпліва згінае вечка белай сумкі, што вісіць на маленькай полачцы.

Гарачая хваля б'е мне ў твар. Валя?! Куды яна звоніць? І чаму тут?.. Не, не... Гэта ж не Валя зусім.

Я — памыліўся — стаю ля тэлефоннай будкі і гляджу на дзяўчыну ў малінавым плацці. Яна паварочвае галаву, і я бачу скіраваныя на нейкую кропку на шкле вочы, занятыя невядомым мне клопатам і поўныя нецярплівага чакання; двойчы набірае нумар; мне добра відаць яе пальцы, кароткія і моцныя, добра абрудзелыя на сонцы. Здаецца, што я чую доўгія і працяглыя гудкі ў тэлефоннай трубцы.

Урэшце дзяўчына выходзіць. У яе вялізных чорных — ненатуральна чорных — і засмучаных вачах стаіліся разгубленасць і трывога.

— Працуе? — пытаюся невядома навошта.

— Так, так...— здаецца, яна толькі цяпер заўважыла мяне.— Мой нумар не адказвае толькі.

Дзяўчына ў малінавым плацці борздзенька крочыць па тратуары. Вось яна дайшла да скрыжавання, павярнула ўправа і схавалася...

У інтэрнаце пасля вячэры кладуся на ложак адпачыць. Гартаю газету, потым бяруся за кніжку, але не чытаю і адразу ж лаўлю сябе на думцы, што не магу забыць тую дзяўчыну. Якое падабенства з Валяю! І куды званіла? Настойліва званіла. А тэлефон не адказваў... «Построю дворцы ледяные, каких не построит народ...» І як гэта там, ля катлавана, калі спытаў мяне Грушаль, я не мог прыгадаць назву паэмы!..

Дзіўна! Радкі з паэмы аселі ў памяці. Я паўтараю іх, калі іду ўвечары да Валі, і прыгадваю потым зноў, пасля кіно. Прыгадваю і задаю Валі тое ж самае пытанне, якім здзівіў мяне Грушаль.

Яна адказвае весела, не задумваючыся:

— Някрасаў быў у мяне на выпускным у школе. Хочаш зноў паладзіць экзамен?..

Расказваю ёй пра Грушаля, пра тое, што мы рабілі ўдзень, пра дзяўчыну, якую бачыў у тэлефоннай будцы.

— Прыгожая? — з робленай рэўнасцю пытае Валя і нават прыпыняецца.

— Нават не ведаю! Спачатку здалося: ты стаіш! І спыніўся, і нават папытаў...

— Ты гаварыў з ёю?.. На дзесяць крокаў ад мяне!
— За адзіпае слова?
— Ты хочаш прыпыняцца ля кожнай дзяўчыны, якая хоць трошкі падобная на мяне?
— Іх не існуе ўвогуле.
— Доказы!
Гляджу ў чорныя, з смяшынкаю, Валіны вочы. Гэтак вось мы часта спрачаемся з ёю і, спрачаючыся, разумеем адно аднаго, і нам хораша нават тады, калі збіраюцца хмаркі сапраўднай спрэчкі.
Але голас... У ім ёсць нешта ад тых інтанацый, што чуліся ўдзень, калі званіў ёй. Жартуе яна ці злуе па-сапраўднаму? Не магу даўмецца. І не хачу нават: ад гуллівай і вясёлай рэўнасці яна робіцца яшчэ прыгажэйшая.
— Ты адна на гэтым свеце такая,— кажу я.— І цябе нельга ні з кім зблытаць. Ты самая лепшая... Хіба гэта не доказ?
— Слабы!
— Я паўтару тое сто разоў!
— Гэта можа пераканаць. Але не дае права заглядацца на другіх! І не звані ўдзень. Я ж ведаю: ты званіў.
— Знарок. Каб не ўсміхалася ўсім. Нават у трубцы чуваць, як рагочуць там у вас.
— Гэта пастаўшчыкі. З завода бетону...
— Няхай нават з бісквіткі. Са мною ты павінна размаўляць крыху мякчэй.
— Там жа незнаёмыя людзі! І ў кожнага справы. Тэрміновыя. А я табе ў трубачку: «Лёпечка, дарагі...» Падумай, што ты гаворыш!
— Вось я і думаю: трэба званіць часцей!..
Павярнуўшыся, яна з пільнай увагаю ўглядаецца ў мой твар; я бачу адбітак яго ў Валіных зрэнках, адчуваю цеплыню і ласкавасць яе вачэй.
— Ты будзеш мне званіць толькі некалькі дзён. Потым пазвоніш, і табе нехта адкажа: яна ў нас не працуе.
— Ёсць адказ з друкарні?
— Так. Сёння гаварыла з дырэктарам. Урэшце ён прыкаціў з камандзіроўкі...
У Валіным голасе — радаснае ўзрушэнне. Дамаглася-ткі свайго! Але маё сэрца не хоча прымаць тую радасць: сёння, менавіта цяпер, вось у гэтыя мінуты, было б, відаць, лепей, каб Валя нічога не паведаміла мне. Падумаеш, размаўляла з дырэктарам друкарні! Хіба блага пра-

цаваць сакратаркай у прыёмнай галоўнага інжынера? Лінатыпы ёй усё сняцца. Што яна знайшла цудоўнага ў той друкарні?

Я сапраўды не ведаю, чым яе вабіць гэтая справа, чым прывабілі яе друкарскія машыны. Мы часта гаварылі з ёй пра тое, і Валя тады не пераканала мяне, што самая найлепшая спецыяльнасць — лінатыпістка. Мае пярэчанні яна тады таксама не прыняла, нават наадварот, быццам крыху пакрыўдзілася, але схавала сваю крыўду. А цяпер — урачыстае паведамленне: дамаглася свайго, будзе працаваць там, куды цягне.

Шчыра і сумна прызнаюся:

— Упартая ты!

— Не падабаецца?

— Ёсць упартасць. І ёсць настойлівасць.

— Бацька вучыць заўжды: трэба быць настойлівай... І ты сам гэта казаў. А цяпер не вельмі даспадобы мая настойлівасць? Ну, прызнавайся!

— Зараз я табе адкажу. Хадзем...

Мы паволі крочым вуліцаю, і я абдумваю тое, пра што хачу сказаць Валі. Сказаць шчыра, нічога не ўтойваючы. Так, не даспадобы. І дзіўна: намагаюся пераканаць сябе, што гэта не зусім так — я ж сапраўды радуюся,— але нехта ва мне пярэчыць, не хоча прызнаваць самастойнасці Валі. Што гэта? Пакрыўджанае самалюбства? Жаданне, каб усё было так, як гэтага хочацца толькі мне?.. Мабыць, так. І як жа добра, што сваёй шчырасцю Валя разбурае нікчэмнае самалюбства, не дае яму глыбока пусціць карэнні.

За плячыма ў Валі, зацененыя лістотай клёну, гараць электрычныя ліхтары. Валіны валасы здаюцца па краях светлыя, нават аранжавыя, і пад левай скроняю, там, дзе яны злёгку кучаравяцца, дрыжыць, вагаецца маленькая вясёлка. Гляджу на той дрыготкі промнік, крыху плюшчу вочы, і мне здаецца, што ад маленькага крохкага ззяння струменіцца ласкавае, па-сонечнаму цёплае святло. І ад гэтай цеплыні, ад таго, што Валя побач, слухае і даверліва паглядае на мяне, робіцца сорамна за той званок удзень, і смешнай, дзіцячай забаўкай уяўляецца рэўнасць да тых невядомых людзей, што рагаталі ў прыёмнай і чые галасы я чуў.

Я кажу ёй пра ўсё гэта і прыслухоўваюся да сваіх слоў, быццам гавару сам-на́сам, і толькі аб адным не магу сказаць і слова: ненавіта за гэта падабаецца мне Валя — за

не цвярозае, разумнае стаўленне да кожнага майго ўчынку, да нашага сяброўства, да ўсяго таго, што ёсць паміж намі.

2

Дождж. Густы, з ветрам, але надта цёплы.

Ён лінуў апаўдні, калі мы вярталіся са сталоўкі — ледзь паспелі дабегчы да прарабкі; Віктар з разгону смаргануў дзверы, я ўскочыў следам, штурхануў яго, і мы ледзь не паваліліся.

— Не дурэйце, хлопцы! — просіць Ткач, складаючы рэшткі абеду ў зашмальцаваную, паабдзіраную з усіх бакоў, цыратовую сумку.

Напроці Ткача, пры ўваходзе, на шырокім драўляным зэдліку месціцца Сініцын. Ён таксама неадабральна зыркае на нас шэрымі раскосымі вачыма, але ніякай заўвагі не робіць — заняты размоваю з Ткачом. Даўнія дружбакі па садоўніцкай справе: у кожнага добры сад.

— Што, кажаш, пад слівіны сыпаў? Прабач, недачуў...

— Пілавінне ды попел. Ну, вядома, змяшаў як след. Трохі перакапаў зямлю і — туды. А што налета было сліў! Сказаць — не паверыш: чатыры вядры наваліла.

Знаёмая, як кожная дошка ў нашай бытоўцы, размова. Сініцын з Ткачом ніколі не ходзяць у сталоўку, прыносяць харч з дому, абедаюць тут, у прарабцы, і ніколі не сядзяць моўчкі. Мабыць, Ткач накукуецца ўдзень у сваёй будцы на кране, а потым злезе і хочацца яму пагаварыць.

Віктар выцягвае з кішэні маленькія шахматы.

— Правядзём? Адну парцейку! Магу, Лёня, даць фору. Пешку. Нават дзве. Але ўмова жалезная: ніводнага ходу назад. Крануў фігуру — хадзі...

Віктар — ён нядаўна набыў шахматы і цягае іх у кішэні на будоўлю — дэманстратыўна не хоча цяпер гуляць з Казімірам.

Але апошнія дні выпадае вельмі мала вольнага часу: пакуль сходзім у сталоўку — застаецца ўсяго некалькі хвілінак да пачатку работы.

— Табе мала дзве пешкі? — Віктар усё настойвае.

— Ніводнай не трэба. А твае нахабства павінна і будзе пакарана ў чэсным баі!

— Пахвалялася адна птушачка мора запаліць... Ведаеш, дзе цяпер яна лётае? Якімі будзеш? Белымі, дазваляю...

— Рудымі.
— Не хочаш? Тады пра які бой ідзе гаворка?
— Заўтрашні. Сёння няма настрою.
— У салдата павінна быць адзінае жаданне — бой!
— Я мірны салдат.
— Скажы, вольны філосаф, якая муха цябе джыгнула? А-аа, Дульцынея Зарачанская дала вымову. Памыляюся?
— Як звычайна. Каб меней гэта здаралася, пачытай «Вожык».

Віктар чамусьці болей не спрачаецца; моўчкі хавае шахматы ў шырокую кішэню спяцоўкі, садзіцца ля мяне і з шоргатам разгортвае часопіс — мы купілі яго ў кіёску ля сталоўкі.

Я ляжу на лаўцы, падклаўшы рукі пад галаву — мулка, але добра. Драўляныя сцены і толевы дах прарабкі слаба гудуць ад удараў вады і ветру — дождж сцішаецца. Віктар шамаціць часопісам. У Сініцына з Ткачом гаворка ранейшая — садоўніцкія справы.

— У мяне сліва не ідзе,— сумна прызнаецца Сініцын.— І якой толькі трасцы не рабіў. І ванну сыпаў, і гною клаў не шкадуючы. Гоніць лісце, як лес. А сліў жменька...

— То я ж кажу: паспрабуй пілавінне з попелам. Альбо салетры расстарайся і ўвосень падсып. Паглядзіш!..

Віктар кранае рукою маё плячо.
— Слухай... Ну і напісана, браце! Ці ты спіш?
— Сплю...

Ва ўсім целе салодкая саплівасць; і ціхі шэпт дажджу па толевым даху, і спакойная гаворка пра слівы закалыхваюць, настройваюць бесклапотна, і ад гэтай бесклапотнасці прыходзяць утульныя згадкі пра ўчарашні вечар, Валю. Мы доўга хадзілі з ёю ў парку, потым стаялі ля дома — развітваліся; прыйшоў я ў інтэрнат а другой гадзіне ночы. Барыс яшчэ не спаў і сядзеў, схіліўшыся над сваім тоўстым сшыткам, і ўвесь стол у яго быў закіданы паперамі. Я распрануўся і не хацеў перашкаджаць Барысу, і ён не чапаў мяне і ўсё пісаў.

Потым, калі я быў ужо на ложку, ён спытаў:
— Як, Лёня, думаеш, чым гэта ўсё можа скончыцца?
— У тваім сшытку?
— Не, у тым выпадку, калі хлопец штодня прыходзіць амаль на світанні...
— Вяселлем, Барысе, вяселлем...

Ён пагасіў настольную лямпу, выйшаў пакурыць, і я адразу заснуў і спаў добра і моцна да ўзыходу сонца. Калі яно ўзышло, я прачнуўся, паглядзеў на Барыса — ён моцна спаў,— павярнуўся да сцяны, каб святло ад вокнаў не біла ў вочы, і зноў заснуў.

Сон ясна асеў у памяці, быццам сапраўднасць,— саснілася Валя. Яна стаяла ля тэлефоннай будкі і чакала, пакуль я званіў ва ўпраўленне. Якімчык не лаяўся, а нешта гаварыў дужа ласкавае і паабяцаў прысланць нам тры бульдозеры, але патрабаваў, каб Валя не ішла працаваць у друкарню. А я смяяўся з гэтай яго прапановы, і Валя, што стаяла побач, таксама смяялася — і мне было вельмі хораша. Потым мы ўсе дзівіліся шчодрасці Якімчыка, і я рагатаў і казаў Валі, што бульдозеры мы возьмем, а яе нікуды не пусцім. І як толькі сказаў гэта, Валя змоўкла і пакрыўджана адвярнулася, і мне зрабілася непамысна, што я пакрыўдзіў яе. Адале яна зірнула на мяне, і ўсё благое было закрэслена і адступіла, і мы зноў ішлі побач і нічога не гаварылі, і нам было хораша...

Прарэзліва рыпяць дзверы прарабкі. Увальваецца Рогач, смяецца, абтрасае мокрую кепку.

— Во жытуха людзям! Суха. Цёпла. І камароў няма. А чаму госця не сустракаеце? Гаспадары!..

Голас яго бадзёры, незвычайна вясёлы. Згадкі пра Валю яшчэ жывуць ва мне, я ўзнімаюся марудна і слупянею: побач з прарабам стаіць дзяўчына. І хоць цяпер замест малінавага плацця на ёй чорны рабочы гарнітур, я адразу і беспамылкова пазнаю: яна! Неверагодна! Падобна на казку!

— А на вуліцы дождж...

Цяпер ужо і голас пераконвае мяне: так, гэта яна стаяла тады ў тэлефоннай будцы. Ніякіх казак няма!

Дзяўчына моўчкі сцягвае з галавы бліскучую ад вады празрыстую хусцінку; густыя чорныя валасы рассыпаюцца на вострых плячах. Мы моўчкі сочым за ёю і таксама моўчкі пазіраем на Рогача — чакаем тлумачэнняў. І ён, ловячы нашы здзіўленыя позіркі, ледзьве прыкметна ўсміхаецца, і голас яго па-ранейшаму не будзённы, а нейкі святочны быццам.

— Да нас у брыгаду, падсобніца. Загад па ўпраўленню. Сядайце, таварыш Гарохава. І прывыкайце. Народ у нас баявы... Працуе, бачыце, лежачы...

— Гаронка маё прозвішча. Я ж вам казала... Зіна Гаронка.

Яна незадаволена папраўляе рукою валасы пад ілбом: не прыняты ні жарт Рогача, ні наша маўклівая насцярожанасць.

— Гарошына, гарошына! Якая ж ты харошая...

Прараб моўчкі, спадылба зыркае на Віктара, і той, сумеўшыся, змаўкае. Праўда, на нейкі час. Амаль імгненна перасіліўшы разгубленасць, ён непрыкметна дае мне штурхаля, падсоўвае скрынку да Зіны.

— Сядайце, Зіначка. Глядзіце, слухайце і запамінайце прозвішчы ўсіх гэтых гультаёў...

Ён гаворыць з Зінаю вольна, нібыта даўно і добра ведае яе, хутка, як алоўкі, пералічвае нас. Мне сорамна за гэтую ягоную бесцырымоннасць і вельмі прыемна, што Зіна не бянтэжыцца, з іранічнай спагадай успрымае і Віктараву гуллівасць, і жартоўную гасціннасць.

— Досыць лічыць, досыць! У вас тут утульна. Толькі брудна дужа...

Яна акідвае хуткім позіркам нашу прарабку. І ўслед за ёю мы таксама аглядаем шурпатыя сцены, смецце па кутках і неахайна звалены інструмент. Мы маўчым. Рогач ціха хмыкае, і цяжка зразумець, што хаваецца за гэтым: нязгода ці ўхваленне нечаканай Зінінай заўвагі.

— А ваш прараб, ведаеце, не хацеў мяне браць у сваю брыгаду.

Рогач ускідвае галаву, хмыкае, і цяпер ужо гэта вельмі выразна: незадаволены. Але сказаць што-небудзь ці запярэчыць не паспявае.

Зіна вельмі хораша ўсміхаецца — яе нікольки не бянтэжаць нашы позіркі,— садзіцца побач з Ткачом.

— Так, так! Я сядзела ў прыёмнай і чула, як наш брыгадзір спрачаўся ў кабінеце галоўнага інжынера. І тут нейкая незадаволенасць ва ўсіх... А я прыйшла працаваць. Як усе... Старанна... А вы, бачу, сумняваецеся...

Цішыня ў адказ на гэты шчыры, крышку па-дзіцячаму наіўны папрок. Няёмкая цішыня. Але трымаецца нейкі міг яна. Нешта наважыўся быў сказаць Сініцын, і тут жа Віктар апярэджвае яго:

— Нікольки! Нікольки, Зіначка! На шчырасць мы адказваем шчырасцю: прымаем у брыгаду з вялікай ахвотаю. Прызнаёмся, спачатку разгубіліся. Людзі мы, як вы па мне бачыце, незвычайна сціплыя. Ну, зірніце хоць на яго. Лёня, сядай, калі ласка! Хаця не, пачынаць трэба з самага прыгожага. Таму пачнем...

Зноў рыпяць дзверы прарабкі. На парозе, асветленым

сонцам, стаіць Казімір, прытрымлівае дзверы рукою; у нашу камору льецца яркае святло.

— Чаго седзіцё? Дажджу няма даўно!

— Калі ласка,— з падробленым шкадаваннем гаворыць Віктар.— Свірыдаў. І за тое, што ён прынёс нам радасную навіну пра сонца, паставім яго наперадзе мяне. Казімір, падыходзь сюды і знаёмся. Вось, Зіначка, той, каго я меў на ўвазе. Справядлівасць дык справядлівасць!..

Можа, ад сонечнага святла, можа, ад вясёлай Казіміравай усмешкі твар Зіны мяняецца незвычайна, ранейшая насцярожанасць вокамгненна знікае; яна доўга і ўзрадавана трасе Казіміру руку.

— Значыцца, адважылася...— гаворыць Казімір, і гэтыя яго словы як працяг нейкай даўняй гаворкі.

— Але... Як бачыш!

— І правільна. Усё пачынаецца з будоўлі...

Казімір ведаў Зіну? Вядома, гэта ж адразу відаць.

Нешта падобнае на зайздрасць ва мне. Не, захапленне хутчэй. Я нават ганаруся той упэўненасцю, мужнай і сапраўднай прыстойнасцю, з якой Казімір паціснуў працягнутую Зінай руку, гаварыў аб сваёй радасці бачыць яе тут, на будоўлі, у нашай брыгадзе.

З пляцоўкі нас ужо кліча Рогач.

Сонца нібыта ўвагнала шырокія промні ў зямлю і, абапіраючыся на яе, рассоўвае калматыя хмары, гоніць іх прэч ад бяздонных блакітных азёраў, што ўвачавідкі шырэюць у высі над намі; рэдкае, як пыл, дажджавое сяйво асыпаецца з той высі, ззяе і блішчыць. Па драўляных шчытах з цэментавага раствору цякуць у катлаван звілістыя бела-шызыя ручаіны; левы край катлавана зноў асеў і асыпаўся. Але гэта, калі туды ўціснуты апорныя пліты і два рады блокаў, ужо не страшна: няхай цяпер асыпаецца.

Рогач радасны і ўзбуджаны; яго грубаваты, пабіты рабаціннем твар, асветлены натхненнем, цяпер прыгожы.

— А каб учора не напрацавалі лішку? Паспрабуй накладзі пліты ў гэтую сырызну. А так — працуй і пасвіствай...

Казімір, прарэзліва свіснуўшы, скача з насыпу ў катлаван. Рогач строга, але не сярдзіта грозіць яму пальцам — ён задаволены нашай працаю, і дзіцячая гарэзнасць Казіміра яму даспадобы цяпер.

Ва ўсіх — адчуваю гэта добра — прыўзняты настрой. Радасна, мабыць, адтаго, што пераціх дождж, што ўчора

паспелі пакласці пліты і цяпер мы зноў увойдзем у графік і можа нават абгонім участак Жаўняровіча — нашага даўняга саперніка.

У мяне да гэтай агульнай радасці прымешваецца вядомае ўжо ўзрушэнне — я зноў думаю пра Валю. Мы сустрэнемся ўвечары, і трэба будзе, вядома, расказаць ёй пра Зіну. Валя, пэўна, зноў спахмурнее, зірне падазрона і насцярожана і будзе маўчаць і слухаць. Што гэта, рэўнасць? Наўрад. Але адчуваю: хочацца, каб было тое ж, што і ўчора! Няхай Валя сярдуе, з падазронай увагай прыслухоўваецца да кожнага майго слова і хвалюецца, не маючы ніякай падставы на гэта... Потым, за кароткай хвілінкаю наіўнай і нясмелай падазронасці, накоціць хваля пяшчотнасці і ўдзячнасці.

Работа ідзе ў нас спорна, сцены падмурка растуць увачавідкі. Казімір пасвіствае, часта пазірае на штабялі, дзе Пятро з Ткачом чапляюць пад кран блокі, падганяе.

— Гэ-гэ-гэ-ээй, блокшчыкі! Не адставай давай! Нам работкі хочацца!..

— Вас пяцёра там. А мы тут удвух.

— А кран, Пятро, чаму не лічыш? — Віктар падыходзіць Казіміру на дапамогу.— Ён дзесяць чалавек замяніць.

— Такіх, як ты, Віця, трэба дваццаць. Толькі каб маўклівыя былі, моўчкі рабілі.

Не вытрымліваю і я, гукаю весела:

— Не хочам моўчкі. Нам каб гудзела ўсё вакол, спявала. Тады прызнаем: работа!

— Бярыце, бярыце! Работкі вам дамо!

Мы з Віктарам крыху правалаводзіліся, выпраўляючы вуглавы блок, а тут ужо новы плыве.

— Ну як, Віця, запарыліся там?

Гукае Пятро, а Віктар апраўдваецца:

— Вам там добра, з ветрыкам. А тут, як у лазні, прыпякае. Дыхнуць няма чым!..

Хмары сплылі ўжо зусім, у катлаване зацішак — вецер не можа прабіцца праз высокія завалы жвіру,— і сонца смаліць у плечы неміласэрна. Паскідалі спяцоўкі, потым нават кашулі і працуем у майках. Урэшце і майкі — далоў. Усё роўна горача, душна, пот залівае вочы.

Са штабеля, што схаваны ад нас высокім насыпам, як па канвееры, няспынна плывуць у катлаван блокі. Ледзь паставім адзін, зараўняем раствор у пазах, а кран зноў

натужна гудзе, і прама на нас, нарыпваючы нацягнутымі тросамі, сунецца з высі белая глыба блока.

Рогачу вельмі па сэрцы гэты шалёны рытм. Ён таксама скінуў майку, засунуў яе ў кішэню, паглядае на нас бліскучымі вачыма; у голасе — вясёлы імпэт:

— Растворчыку! Растворчыку трэба!

— Канчаецца раствор, таварыш прараб. Апошні коўш наскрэбла. І няпоўны нават, таварыш брыгадзір...

Звычайна раней для ўсіх нас Рогач — проста прараб. А гэтае пачцівае Зініна «таварыш прараб» нібыта выводзіць новую грань паміж намі і Рогачам: ён сам як бы крыху збянтэжаны, нават святлее з твару, прыемна ўражаны.

— Што, зусім скончыўся, Зіначка?

— Няпоўны коўш. І ўсё...

— Э-эх...

Рогач, у час спахапіўшыся, не вылаяўся, толькі прыцішана і невыразна нешта хмыкае; уголас жа загадвае з нейкай невядомай нам раней цеплынёю:

— Адпачывайце, Зіначка! Павінны падвесці раствор...

На тым растворы, што вывернулі з няпоўнага каўша, ставім яшчэ пяць блокаў; сцяна амаль завершана. Стомы няма, і хочацца працаваць і працаваць, класці блокі, радавацца сонцу і жартаваць.

— Адбой пакуль што,— гаворыць Рогач.

Віктар сцеле на блок кашулю, прымервaецца легчы загараць.

— Якраз цяпер ультрафіялету шмат. Ад яго колер прыгожы...

— Як працягне скразнячком — будзе табе колер. Апранiцеся, хлопцы!

Рогач выцягвае з кішэні скамечаную, у мокрых плямах майку; ацёр твар і шыю, нацягвае яе на бліскучыя ад поту грудзі, потым, падумаўшы, надзявае і кашулю.

Рогачаў загад надзяваць кашулі быццам ніхто і не чуе. За лета ўсе мы добра папякліся на сонцы і цяпер з гонарам выстаўляем свае плечы і грудзі, медзяныя ад загару. А ў Віктара — яму сёння нешта не ляжыцца — выспела ўжо новая прапанова.

— А што, калі на рэчаньку?.. Ды кульнуцца! Давайце, браты, плітанём на Дзвіну. Трасцу яны нам сёння падвязуць той раствор. Як твая думка, Барысе?

Барыс — ён у рэдкім выпадку ўхваліць што-небудзь

перэальнае — моўчкі закручвае галаву кашуляй; закруціў, абмацаў рукамі.

— Глупства. Давай лепей палезем наверх. Там хоць ветрык ёсць...

— Э-э-э... З табою нічога не згарбузуеш. Давайце, прараб, загад: на раку!

— Яшчэ што? У рабочы час купацца! Апранайцеся. Зараз раствор падвязуць.

Рогач незадаволены; у яго голасе з'яўляюцца патрабавальныя ноткі. Але Віктар усё яшчэ харахорыцца, усё падбівае Казіміра пайсці на раку. Кашулю ён, праўда, надзеў, лёгка, фарсіста ўскочыў на верхні блок, і тут жа твар яго робіцца збянтэжаны.

— О-о-оо! Майнэ мутэр бачу на даляглядзе! Вось каго не чакаў дык не чакаў!..

Да катлавана скоранька прастуе Віктарава маці. Але здзіўляе мяне не яе з'яўленне: бачу нейкі канверт у яе руках і адчуваю ў сэрцы непрыемны халадок трывогі.

— Лявон! Яна паперу цягне! Ці не перамога? Ляцім, браце!..

Ад хвалявання Віктар крычыць сіпата, бы нешта не паспеў праглынуць, і, прыгнуўшыся, сігае з бруса на жоўты насып катлавана; ён спатыкаецца, ледзь не падае і зноў бяжыць да маці; з-пад ног яго коцяцца ўніз рудыя сырыя камякі.

— Віцюнька, Віцюнька!.. Пісьмо з інстытута. Выклік!..

Яна, спыніўшыся ўскрай насыпу — суровая і строгая ў сваім шыкоўным белым плацці,— кліча Віктара, як малое кураня; рукі выцягнула наперад, нібыта хоча прыняць на іх сына, і сіні канверт уздрыгвае, як жывы.

Віктар выхоплівае канверт у яе з рук.

Мне хочацца падысці да яго, і ў той жа час нешта ўтрымлівае. Выбраўшыся з катлавана, я стаю і не ведаю, што рабіць. Віншаваць? Радавацца?.. Ва мне няма радасці — я разгубіўся. Дакладней, не разгубленасць гэта, а ўпэўненасць, што несапраўдныя і Віктарава ўзрушэнне, і ўсхваляваныя словы яго маці, і нават вузенькі сіні канверт у яе руках.

— Прыняты, Лявон! Ты можаш паверыць. Чытай!

Віктар падлятае да мяне, совае ў рукі хрусткую белую паперку, і я, міжволі сваёй, машынальна бяру яе. Кароткае, усяго на адзін сказ, паведамленне прыёмнай камісіі. Так, Віктар прыняты. Ён — студэнт.

Густая цяжкая гарачыня, раптоўная, як электрычны

ток; яна нарадзілася ў грудзях, шуганула ў твар. «Калі ён, выклік, атрыманы?»

Я пытаюся, але яна знарок не заўважае мяне, адвярнулася і зноў, як малога зусім, просіць Віктара:

— Збірайся, Віцюнька! У нас жа вельмі мала часу...

У яе тонкія і бляклыя ад сцёртай па краях малінавай памады губы, нос ад пудры нейкі жаўтаваты, бы апельсінавая долька. Непрыязнасць да гэтай жанчыны, якую я добра ведаю і якая здавалася мне раней прыгожай, раптоўная і здзіўляючая. Ведаю, што яна ні ў чым не вінаватая, што яна мае права радавацца поспеху сына, і тым не менш непрыязнасць жыве, і я нічога не магу зрабіць з сабою і адварочваюся.

Маленькі дамок у садзе за новым плотам быццам у нейкім тумане. Тросы крана варушацца, і мне на нейкі момант здаецца, што канцы тросаў зачапіліся за новыя, бліскучыя ад сонца клямары ў сцяне хлеўчука, які мы нядаўна рамантавалі, і сама тая нязграбная будыніна гайданулася і ціха крапулася з месца.

Віктару ўжо назаляе матчына клапатлівасць і вельмі не падабаецца роля малога і паслухмянага дзіцяці...

— Добра, мама. Ідзі дамоў,— ціха просіць ён.— Я хутка прыйду...

— Ты застаешся? А дарога? Трэба ж збірацца! Бацька паляцеў заказваць білет. Бяжы па начальству, афармляй дакументы! Гэта там спатрэбіцца!

Яна здзіўлена шчыра, па-сапраўднаму і, улюбёна ўтаропіўшыся ў сынавы вочы, зашпільвае гузікі на ягонай кашулі; апрача Віктара, для яе ўжо ніхто тут не існуе.

Гляджу на іх абодвух і адчуваю, як расце, сталее ва мне непрыязнасць. Непрыязнасць да гэтай радаснай жанчыны, да яе сукенкі, незвычайна белай і дзіўнай тут, сярод брудных дошак, разварушанай зямлі і нашых рабочых спяцовак. Навошта было прыносіць выклік сюды?.. І Віктар... Мой сябар... Чаму ж ён не здзівіцца? «Дзе ж твой выклік, Лявон?.. З якой прычыны, Лявон, яго няма?..» Здаецца, запытай ён гэта, і мне будзе лягчэй, я змагу тады радавацца разам з ім.

Віктар ловіць мой позірк, скіраваны на маці, і чырванее; адвёўшы яе руку ад сябе, ён неахайна совае канверт у кішэню, просіць грубавата, не хаваючы свае незадаволенасці.

— Добра, мама! Ідзі дамоў!..

— Падумай, што гаворыш! Гэта ж такі клопат наса-

браць усё. І да Ермаковых зайсці трэба, каб Клаўдзя пазваніла Гурановым, што едзеш. Яны ж нічога не ведаюць. Ці ты думаеш, што можна так адразу і заявіцца да іх? Гэта ж Масква — не абы-што!

— Вось ідзі і звані. А ў мяне — работа. Рабочы дзень не скончыўся. Не бачыш?..

У яе адразу большаюць вочы, бровы ўздрыгваюць і заміраюць. Нейкі час яна пяўцямна глядзіць на Віктара, потым націскае плячыма і пальчыкам меленька-меленька стукае па верхнім гузіку сукенкі.

— У-уф! Пры чым тут рабочы дзень? Ты — студэнт. І кончылася тваё гібенне тут. Досыць!

— Мама, прашу цябе! Вельмі!..

— Ды хіба ж мне ехаць! А як спознішся?.. Тады ўкусіш локця...

— Не спазнюся. Супакойся, калі ласка, і ідзі дамоў. Хадзем правяду цябе да вуліцы.

Віктар абдымае маці за плечы. Мінуўшы прарабку, яны спыняюцца; маці трасе рукамі, нешта хутка-хутка гаворыць, мабыць, зноў спрабуе перакапаць Віктара кінуць усё і пайсці разам. Мне не чутно аніводнага слова, але я бачу: Віктар пярэчыць і нешта абяцае, паказваючы на гадзіннік.

Урэшце ён вяртаецца да нас, выцягвае з кішэні канверт, урачыста аддае яго брыгадзіру.

— Ну, хлопцы, еду!

Рогач нават не чытае выклік, толькі патрымаў у руцэ і зноў кладзе яго ў сіні канверт; на твары прараба ні захаплення, ні радасці, ні расчаравання.

— Віншую. Табе, праўда, трэба бегчы. Пакуль аформіш усё ва ўпраўленні... Не адразу яны і зробяць...

— Паспею. Цяпер нікуды не дзенецца! Галоўнае — дачакаўся. Увесь час верыў: будзе выклік! І вось!..

Віктарава ўзрушэнне здаецца мне здрадай. Як ён можа радавацца, калі нічога не ведае пра мой лёс?.. Мы разам наступалі, разам хваляваліся, разам чакалі... І навошта цяпер хлусіць? Ён жа ніколі не быў упэўнены, увесь час баяўся, нёс нейкую лухту пра сынкоў «вялікага начальства», перад якімі быццам бы заўжды адчыняцца інстытуцкія дзверы. І гэта я падбадзёрваў яго, пераконваў, што трэба быць мужным і чакаць... А можа, і мне ёсць выклік, і ён ляжыць у інтэрнаце, і я дарэмна хвалююся?..

Усё тое, пра што я ўпарта думаю, але не кажу ўслых, мабыць, вельмі яскрава адбіваецца на маім твары; Рогач

па-сяброўску кладзе руку мне на плячо, раіць падбегчы ў інтэрнат. Магчыма, ёсць выклік і мне...

Спахопліваецца і Віктар.

— Праўда, Лёнька! Калі мне ёсць, дык і табе паведамілі...

— А работа?

— Якая? Усё роўна ж прастойваем!

Віктар быццам хоча ўзяць рэванш за сваю няўважлівасць, усміхаецца, падбадзёрвае і ўпарта даводзіць: трэба мне падбегчы ў інтэрнат. Відаць, яму таксама варта пайсці, гэта будзе самае разумнае: раствор, вядома, не падвязуць сёння, папабегаць жа па тым упраўленні давядзецца.

— Іван Тарасавіч! Дазвольце і мне з Лявонам! Мы потым усё нагонім!..

Цяжка пазнаць Віктара. Не памятаю, каб ён раней называў Рогача па бацьку. А як паддобрываецца да мяне. І гэтая саладжавая ўсмешка... Ніколі раней і не бачыў яе. Прыкра...

— Нагонім мы тут і самі,— смяецца Рогач.— Уключайце добрую хуткасць і — габлюйце!

Мы бяжым да прарабкі, спехам скідаем свае спяцоўкі.

Толькі крыху пазней, апынуўшыся на вуліцы, я адчуваю прыкрую ніякаватасць. Кінуў усіх, паляцеў, як маленькі за цукеркаю... Дзеля чаго? Вузенькі сіні канверт, атрыманы Віктарам, закрыў ад мяне ўсё начыста: і сяброў па брыгадзе, і наш новы дом, і маю асабістую працу... Не, не... Віктараў выклік не вінаваты. Прычына тут іншая. Не атрымаў выклік?.. Дык што з таго. А бач ты, як усхадзілася ганарыстасць, як пыха запенілася, як закруцілася ў душы зайздрослівасць!..

Віктар крочыць побач са мною, смяецца шчыра, накідвае радасныя і зманлівыя планы адносна будучай вучобы. Па-першае — наведаць Маўзалей Леніна. Потым — агледзець Крэмль. Кожную суботу — тэатр. Спачатку — Вялікі, потым — усе іншыя. Трэба абысці ўсе музеі. А ўлетку — падарожжа па Волзе. Да самага Каспія. Пабачыць тыя месцы, дзе плавалі стругі Сцяпана Разіна...

І раптам — урачыстае, цвёрдае прызнанне:

— Усё ў мяне распланавана дэталёва. Даўно вынашана, браце-коце, прадумана...

Даўно? А чаму ж ён нічога не казаў мне пра гэта раней? Ці, можа, ён толькі рабіў выгляд, што хвалюецца, што яму цяжка чакаць?..

У маёй душы спее варожасць. Варожасць да яго рада-

сці, планаў, варожасць да свае бязвольнасці, да таго, што я хачу і не магу шчыра, адкрыта выказаць яму свае думкі аб ім...

Моўчкі слухаю Віктара, паскараю хаду, быццам хачу збегчы ад яго, схавацца. Але ён не адстае ад мяне ні на крок, ён усё гаворыць аб сваіх планах, ён бачыць толькі сябе, ён адчувае толькі сваю радасць, ён гаворыць толькі пра сябе...

Ніякіх лістоў мне ў інтэрнаце няма. Мы праглядаем пошту адзін раз, другі, абмацваем кожны канверт у вялізнай шафе стала, куды кладзецца наша карэспандэнцыя. Віктар, здаецца мне, па-сапраўднаму заклапочаны.

— Колькі разоў на дні паштарка?

— Раніцай. І апаўдні прыходзіць. Сёння няма чаго чакаць болей...

— Значыцца, сёння няма чаго і чакаць. Але я табе скажу: свет за адну ноч не перавернецца. Точна!..

Віктар адразу натхняецца, цягне мяне за руку ў калідор, суцяшае:

— А колькі таго чакання! Адна ноч. І потым, май на ўвазе: немагчыма ж усім адразу паслаць. Мне — сёння. Табе — заўтра... А час ляціць, спазнюся ва ўпраўленне. Разбягуцца чыноўнікі...

Наіўна чакаць заўтрашні дзень, калі ўсё вядома сёння. Дык навошта ж мне суцяшэнні. І гэты клопат аб сабе, гэтая прага не спазніцца, як мага хутчэй уладкаваць свае справы пераконваюць мяне ў Віктаравай няшчырасці. Ён быццам нешта хавае ад мяне, нечага баіцца. А мне хочацца пэўнасці, яснасці.

— Дай мне на хвілінку ліст!..

— Вось... калі ласка!

Апошнія словы кароткага паведамлення нечакана спыняюць маю ўвагу: «...у адпаведнасці са згодаю адмовіцца ад інтэрната». Двойчы ўголас чытаю гэта.

— Інтэрнат? — смяецца Віктар.— А навошта? У маёй цёткі кватэра — мора. Няхай бяруць у свае абдымкі дарагога пляменнічка... Чакай... Гэтая акалічнасць, думаеш, мела нейкі ўплыў?..

— Не ведаю. Ты што пісаў у заяве? Памятаеш? Пасля апошняга экзамена?

— Дужа я помню! А з інтэрнатам... Нас жа мо сто разоў прасілі паведаміць: патрэбен інтэрнат ці не...

Сапраўды, нам часта казалі, што нейкі там час з інтэрнатам для першакурснікаў будзе цяжка. Але нешта не

ў памяці, каб Віктар пры мне адмовіўся ад інтэрната. Наадварот, мы хацелі і марылі жыць у адным пакоі. Ці нешта ён усё ж пісаў?.. Не, не памятаю... Стоп, стоп... Не пісаў. Так, так... Мы разам сядзелі яшчэ, і я праглядаў яго заяву. Значыцца, ён адмовіўся ад інтэрната цішком, без мяне. Але калі?

Мне хочацца, але я не магу спытаць у Віктара гэта, спытаць менавіта цяпер, калі ён бесклапотна і шчасліва ўсміхаецца.

— Цябе інтэрнат турбуе? Кінь! Пацісіем крыху кошак у цёткі. І будзем разам жыць...

— А што, у яе шмат кошак?

— Поўна. Адна нават канапу асобную мае. Здаравенная кацяра. Паласатая, як тыгр!

— А калі ты яе бачыў?

Ён спахопліваецца, бянтэжыцца, тлумачыць з разгубленай настойлівасцю:

— Цётка піша маці пра сваіх кошак. Цётка піша часта...

Хлусня гэта, хлусня. Віктар, відаць, употай ад мяне тады, у часе экзаменаў, заходзіў да цёткі. А калі і заходзіў? Хіба ён абавязаны рабіць мне справаздачу пра кожны свой крок? Не, вядома. Але навошта казаць няпраўду?

— Позніцся, Віктар. Бяжы ва ўпраўленне...

— А ты? Застаешся?

У сваім пытанні нават інтанацыяй голасу ён вельмі цяпер падобны на сваю маці. Там, ля катлавана, яна здзівілася вось гэтак жа...

— Так, застаюся. Здаецца, у інстытут сёлета ты паедзеш адзін.

Я кажу гэта, а чакаю ад Віктара зусім іншых слоў.

Каб толькі ён сказаў: без цябе, маўляў, я нікуды не паеду. Чакаем, Лёнька, заўтрашняга дня. Выклік будзе... Варта было яму сказаць гэтыя словы, і ўсё паміж намі засталося б ранейшым...

Віктар не гаворыць іх; ён зараз, відаць, зусім далёка ў сваіх думках, хоць і абяцае мне і камусьці грозіць пальцам:

— Лухта! Дай толькі дабрацца. Усё там дагары нагамі пастаўлю. У нас жа аднолькавыя балы былі!

— Спяшайся, рабочы дзень канчаецца...

— Папясуся... Але ты прыходзь увечары. Пагаворым...

— Не абяцаю.

Віктар спяшаецца; на парозе ўжо стоячы, развітальна трасе рукою ў паветры.

— Будзе поўны парадак. Пабачыш. Яшчэ абгаворым усё ўвечары. Чакаю...

Не, Віктар, сёння ты мяне не дачакаешся. Сёння я пайду да свайго сапраўднага сябра і ўсё раскажу шчыра: пра сумненні, пра свой боль, пра тваю, Віктар, здраду... Магчыма, памыляюся, магчыма, крыўда гаворыць замест розуму... Не, не крыўда.

«Без цябе я нікуды не паеду... Чакаем, Лёнька, да заўтра...»

Вось што павінен быў ты сказаць.

Ведаю, сэрцам адчуваю: заўтра нічога не зменіцца — выклік не атрымаю. Але каб Віктар сказаў тыя словы, прапанову чакаць, я быў бы ўдзячны яму шчыра, ад душы, сам бы пагнаў яго збірацца ў дарогу. А ён? Некалькі спачувальных слоў, нікчэмных абнадзейванняў... А ў самога — радасць. Радасць на твары. Радасць у голасе. Радасць у кожным руху... І гэтая нецярплівасць, гэтая трывога, каб не спазніцца ва ўпраўленне... Няхай... Бяжы, мой сябар... Бяжы...

Праз гэтую іронію прабівае сабе дарогу цвярозая і разумная развага: у Віктара сапраўды мала часу — трэба збірацца ў дарогу.

Але маё сэрца...

Упарта не хачу пагаджацца з ад'ездам Віктара, не хачу прымаць ніякага спачування. Віктару лёгка абнадзейваць — заўтра ён паедзе. Чаму ж сёння не быць шчодрым і аптымістычным? Чаму не паспачуваць, не абнадзеіць сябра, які застаецца?..

І не гэта крыўдна, што застаюся. Крыўда ў іншым: паміж намі не будзе ніколі ранейшай таварыскасці, поўнага даверу, даверу да канца, ва ўсім, як самому сабе... Які патрэбен вецер, каб сплыла хмара, што насунулася на ранейшае наша сяброўства, каб зноў быў чысты і ясны далягляд? Не ведаю... Вядома, сяброўства не павінна быць эгаістычнае. Але чаго варта сяброўства, калі яно рассыпаецца, як камяк падсохлага пяску, ад першага выпрабавання?.. А мо ўсё тое, што здарылася, і не выпрабаванне зусім? Мо не ва ўсім, браце, разабраўся ты правільна, без памылак, аб'ектыўна?

Ёсць адзіны чалавек, якому я магу задаць гэтыя пытанні. Валя! Але зараз яе ва ўпраўленні няма і дома не знойдзеш — недзе, мабыць, у магазіне: яна звычайна да-

рогаю пасля работы купляе прадукты. Трэба хлопцаў пашых пабачыць. І Рогач жа, відаць, хвалюецца. Магчыма, яшчэ застану іх...

На будаўнічай пляцоўцы ціха. Шарэюць пліты ў катлаване. Цэментавы раствор у новых пазах падобны на цёмныя шурпатыя стужкі. Прарабка не замкнёная чамусьці, адчыненыя дзверы падпірае кавалак рэйкі. У прыцемку прарабкі штосьці грукае. І голас чую знаёмы. Зіна!

— Што робіць у прарабцы таварыш Гаропка?

— Не бачыш? Наводзіць парадак.

Зіна ніколькі не здзіўлена, што я стаю напроці дзвярэй і гляджу на яе.

— Рогач загадаў?

— Дазволіў. О-оох і смецця вы напазапасілі! Поўную скрыню нагрэбла. Паможаш выцягнуць? Адной мне, спрабавала, цяжка...

У прарабцы — святочны парадак. Рыдлёўкі, ламы і іншы наш інструмент расстаўлены ў кутку, падлога падмецена. Дашчанік наш быццам пашырэў і пасвятлеў. Я жартую: хто, маўляў, мог падумаць, што нашу бытоўку можнаператварыць у палац. Жарт мой яна быццам і не чула.

— Ты памажы мне, памажы!..

Выцягнуць скрыню? Калі ласка. Я не дазваляю Зіне нават дакранацца да скрыні і сам цягну смецце ў дальні куток пляцоўкі, дзе мы звальваем і палім рознае ламачча. Скрыня цяжкая, але я самааддана адвалок яе, мыю рукі і твар пад кранам — кран у нас падведзены да самай бытоўкі. Зіна ківае галавою на дзверы прарабкі:

— Ручнік там. Я перавесіла...

Ручнік новы і чысты. Адкуль ён тут з'явіўся? Я выціраю рукі і кажу зусім пра іншае. Зусім абыякавым тонам.

— Ты разумееш, мне не прыйшоў выклік.

І адразу робіцца лягчэй, калі зрабіў такое паведамленне.

— А я ведала.

— Так?

— Нейкае прадчуванне. Гэта са мною здараецца. Калі гора якое ў чалавека, я чамусьці заўжды адчуваю... Вось толькі зірну на яго і адчуваю. І не пытаюся нічога, і ён мне не гаворыць... А я ведаю...

— Тады ты марна траціш тут час. Кідай будоўлю! Тваё месца на сцэне. Увага, увага! Новы нашчадак Месмера. Адгадвае думкі на любой адлегласці!

Мой жартоўны пафас не весяліць Зіну. Але яна і не па-

крыўдзілася, а толькі пацiснула плячыма, і цень як бы шкадавання з'явіўся ў яе вачах.

— Шчыра кажу... А ты...

— Дык няма ж ніякага гора!

— Няма?

— Я цяпер радуюся, што нікуды не еду.

Зіна глядзіць на мяне, і той цень усё яшчэ ляжыць на яе твары; потым дакорліва ківае галавою, і мне здаецца, што дакарае яна не мяне, а кагосьці яшчэ, другога чалавека, якога цяпер тут няма, але якога ёй вельмі хочацца пераканаць.

— Чаму гэта людзі заўжды быццам сaромеюцца шчырасці? Ці баяцца... Нібыта хтось будзе смяяцца з іх... Не разумею...

У яе позірку — чорныя вочы глыбока аселі ў вачніцах, бы завастрыліся — няма ранейшай цеплыні, такія былі ў Зіны вочы там, у тэлефоннай будцы. І ад іхняга маўклівага дакору мне робіцца сорамна. Сорамна за дзіцячую паспешлівасць, з якой я кінуў усё і паляцеў у інтэрнат, за ранейшыя думкі пра Віктараву маці, за сваю падазронасць да Віктара, за свой эгаізм, за тую непрыгожую зайздрасць, што завітала ў сэрца, калі я трымаў у руцэ сіні канверт, за наіўную пыху, з якой пахваляўся тут. І перад кім пахваляўся? Хіба Зіна не сябар па працы? І хіба цяжка было сказаць Зіне шчыра пра тое, што думаў і што зусім нядаўна адбылося? Ці шчыра адказаць на яе пытанні?

Прарабку мы зачыняем моўчкі.

На вуліцы развітваемся. Зіну ўжо не бачу ў людской плыні, але стаю, гляджу ў той бок, куды яна пайшла.

— Лёнік! Лёня!

Валя кліча мяне. Яна бяжыць да мяне цераз вуліцу, а я, узрушаны і ўзрадаваны нечаканай сустрэчаю, нерухомы, як слуп.

— У-ух, як я ляцела. У інтэрнат забегла — няма. Гэтак і падумала: тут цябе знайду...

Яна пяшчотна кратае рукою аўтаматычны аловак у верхняй кішэньцы майго пінжака, глядзіць усхвалявана і быццам крыху вінавата. Толькі яна адна можа гэтак глядзець!

— А я Віктара бачыла...

— Значыцца, ведаеш?

— Віктар мне сказаў...

— У якім жа асвятленні мае поспехі?

— Жартуеш? Значыцца, баліць.

— Усё ўладкуецца, Валюха! Нават не ўяўляеш, якую радасць прынесла, што прыбегла сюды...

— Я не магла чакаць да вечара.

— І малайчына. Зараз я табе ўсё раскажу...

Лоб у Валі спацеў, я выціраю яго насоўкаю, усміхаюся лагодна і прыязна. Слаўная, добрая мая Валюшка. Навошта хвалявацца, навошта бедаваць? Пакуль ты побач, пакуль ты кахаеш мяне, нам нічога не пагражае. Я асілак тады! Я магу і зраблю ўсё, што ты захочаш. І нас, удваіх з табою, ніколі не адолее ніякае гора.

Гэтак думаю. Гэтак кажу Валі. І магу сказаць усім па свеце — няхай чуюць і ведаюць гэта!

## 3

Раніца.

Начная прахалода стаілася пад кудлатымі маладымі клёнамі; ноччу ішоў дождж, і асфальт цяпер чысты, але пярэсты — яшчэ не паспеў як след прасохнуць.

Ашалела крычаць вераб'і.

Ля ўвахода ў інтэрнат пільпую паштарку. Да пачатку работы застаецца шаснаццаць хвілін. Можна яшчэ пачакаць пяць. Нават шэсць. За дзесяць хвілін, калі адразу ўскочу ў аўтобус, паспею на будоўлю, не спазнюся...

І вось, урэшце, яна ідзе. Не ведаю прозвішча гэтай жанчыны — немаладых ужо год — з тоўстай, добра напакаванай чорнай сумкай і яшчэ ладным жмутком газет у руцэ. Яна ведае амаль усіх у нашым інтэрнаце.

Вітаемся.

— Чакаеш пісямка ад мілай?

— Не, у газету зазірнуць хочацца...

Яна бярэ са жмута газету і, нават не зірнуўшы ў сумку, адказвае скорагаворкаю:

— Пачытай газетку! Пачытай. А пісямко пачакаеш. Пішуць, Лявонка... Хаця...— Выцягвае з сумкі не дужа тоўсты пачак рознакаляровых канвертаў, хуценька перабірае іх рукамі.— Не, мой даражэнькі, на жаль, не памыляюся: пішуць. Так што падбяжы да мілай, няхай паскорыць адпраўку.

— Сёння ж падбягу. Увечарку.

— Не гуляй дапазна! Не гуляй! — раіць мне ўслед паштарка.

Аўтобус паўнюткі, нават тырчыць са шчыліны ў дзвярах прыціснуты крайчык рукава — не паспеў хтосьці.

З натужным рыпеннем адчыняюцца дзверы, з цяжкасцю праціскаюся. Знаёмае цяпло металёвага корпуса. Знаёмае патрабаванне: «Давайце, таварышы, будзем плаціць за праезд!»

Новы дзень.

І ўсё тыя ж, старыя клопаты.

У руках — білет. Людская гамана вакол — на душы робіцца спакойна і хораша. Прыгадваю скорагаворку паштаркі. Яна звычайна размаўляе так, бы спяшаецца схаваць за іншыя словы сваё завучанае «на жаль», якое — паштарка, відаць, часцяком бачыць гэта — выклікае ў людзей засмучэнне... А мне яе словы прынеслі радасць. Я сапраўды не чакаю ўжо выкліку, не хачу атрымліваць яго ні сёння, ні заўтра. Я не хачу сёлета нікуды ехаць. Учора з Валяй мы толькі апоўначы скончылі нашы планаванні, нашу гаворку пра будучае. Яна кахае мяне. І я кахаю яе. І на Новы год — наша вяселле. І чакаў я паштарку толькі на тое, каб пераканацца, што выкліку сапраўды няма.

Ч-чорт, праехаў прыпынак лішні!

Куляю вылятаю з аўтобуса. Праз тры хвіліны я ўжо на месцы. Насустрач мне з-за прарабкі выкочваецца самазвал — прывозіў раствор; раствор курыцца на дашчаным насціле, і Зіна падграбае яго.

— Здароў, студэнт! — крычыць мне Рогач і віншуе ўзнятай кепкаю.— А я быў думаў — паехаў. Дарэмна толькі сумавалі. Працуеш сёння?

— І сёння. І заўтра. І далей, пакуль не дабудуем дом. А потым паглядзім. У мяне... планы.

Ледзь не прагаварыўся, не гукнуў з радасці пра тое, што будзе на Новы год.

Рогач адабральна ляпае мяне па плячы.

— Правільна, дружа! Вучыцца табе і праз год не позна. Альбо завочна бяры. Чаму не падумаць? Будоўлю калі кінуў — не тая, на маю думку, і вучоба ўжо. А тут ля блокаў пахаджваеш — вучоба ляціць. І ў інстытут едзеш — павага табе: рабочы прыехаў, не абы-хто!..

Ён па-сапраўднаму, шчыра ўзрушаны. І гэта ж відно і ў Казіміравых вачах: ён здароўкаецца, але гаворыць мала, стрымана і чамусьці загадкава — не магу зразумець, з чаго пасміхаецца. З кабіны крана прывітальна ўзмахвае рукою Сініцын.

Усё гэта радуе мяне незвычайна. Я бачу: брыгада задаволена, што я не еду і застаюся. Уся, апрача аднаго чалавека — Зіны.

Яна раўнадушна сустракае маё з'яўленне на пляцоўцы ў гэтую раніцу: зірнула, нахіліла галаву ў адказ на маё прывітанне і зноў завіхаецца ля каўша. На галаве ў Зіны белая, з чырвонымі рыскамі, хусцінка. Прыгожая.

Першы дзень на гэтым новым доме брыгада працуе без Віктара. І дзіва, мне — я толькі нікому не хачу прызнавацца — быццам нечага не хапае. Віктар працаваў са смяшком, з жартачкамі і, калі справы ладзіліся, насвістваў адно і тое ж — пра капітана, якому скараюцца моры. Абрыдла была мне тая песня, я часта лаяўся з Віктарам, прасіў памаўчаць, але цяпер як бы і сумна без той мелодыі і хочацца зноў пачуць яе...

Падмурак амаль гатовы. Кран апускае пакет з цэглаю, і Рогач з Казімірам бяруцца мураваць вузкі прасценак ля дзвярэй. Мы з Барысам падносім ім цэглу і раствор.

Казімір працуе лоўка — нельга не захапляцца яго спрытам: рухі спакойныя, упэўненыя, хуткія, кельма ў руках пазвоньвае, быццам спявае. Узмах кельмы — раствор ужо на цагліне. Новы ўзмах кельмы — яшчэ адна цагліна накладзена.

Казімір бачыць, што я назіраю за ім, але гаворыць нібыта сам-насам, з развагаю, і гэтая развага яму не перашкаджае ні на міг не адставаць ад Рогача.

— Памятаю, на Калыме будавалі,— ён падраўноўвае цагліну драўляным тронкам, адным узмахам кельмы збірае раствор з пазоў і кідае яго на шчыліну.— Паўсотні градусаў мароз. Ад раствору пара — цагліны не ўбачыш. Змарудзіў хвіліну — як камень раствор. А тут вось па цяплу — любата!..

Роўненька, па шнурочку, узнімаецца прасценак. Але расце ён марудна, і я, слухаючы Казіміра, думаю пра той час, калі будаўнікі не ведалі ніякіх панеляў, блокаў... Цаглінку да цаглінкі ляпілі. Колькі ж гэта спатрэбіцца дзён, каб збудаваць з тых цаглінaчак гэткі вось гмах? Цяпер адзін Сініцын са сваім кранам за дзень зробіць болей, чым у тыя часы добрая брыгада за поўны месяц. А мо і год поўны...

Рогач, ціханька стукаючы кельмаю па цагліне, падміргвае мне.

— Аб чым засмуціўся, Лявоне?

— Ды вось будоўля наша... Гляджу на яе ў аспекце гістарычным.

— А мо па інстытуце? Калі бядуеш — пакінь. І пра-

бач, можа, не ў час пажартаваў. Толькі павер мне: з вучобай на лепшае выкіруецца. Галоўнае — не шкадуй!..

— Нават і не збіраюся! З чаго вы гэта выводзіце, дарагі мой прараб, што я шкадую?

Я кажу шчыра: у душы няма ні шкадавання, ні горычы. Мінуў дзень, і я стаў разумнейшы, зведаў тое, чаго не ведаў раней, адчуў у сабе волю, здольнасць не разгубіцца, цвяроза ўсё ўзважыць. Можа, яно і лепш, што здарылася менавіта так. Што, уласна кажучы, страчана? Прытворнае сяброўства Віктара? Дапусцім. Але Віктарава няшчырасць — гэта ж зусім драбніца ў параўнанні з тым, пра што я даведаўся ўчора. Мяне кахае Валя! І я ведаю: гэта пачуццё добрае і чыстае, яно ніколі не згасне і будзе саграваць мяне ўсё жыццё. Такія дні, калі пазнаеш нешта падобнае, бываюць, відаць, у чалавека не дужа часта, і ад іх пачынаюцца новыя дарогі...

І думаецца яшчэ пра іншае — гэтыя думкі абудзілі Казіміравы словы. Чаму менавіта сёння парушыў ён нікім не аб'яўленую ў брыгадзе завядзёнку і прыгадаў мінулае? Прыгадаў уголас, не хаваючыся. Прагаварыўся, сказаў неасцярожнае слова? Ці, магчыма, хоча неяк параўнаць, паказаць усю нікчэмнасць мае бяды? Хутчэй за ўсё так яно і ёсць — апошняе. Але якая бяда, Казімір? У мяне — радасць. І я хачу сказаць табе пра гэта. І скажу. Скажу Рогачу. Скажу ўсім вам, мае добрыя сябры. І ўсіх мы запросім на вяселле. Вось як бывае ў жыцці: учора хваляваўся, непакоіўся, а сёння — самы шчаслівы чалавек...

Урэшце прасценак выведзены. Цяпер — чарга шырокіх пліт перакрыцця. Пліты тоўстыя, з круглымі адтулінамі ўнутры. Класці пліты вельмі цікава і зручна. Адна пліта. Другая. Трэцяя. І адразу робяцца прыкметныя абрысы першага паверха. І на душы хораша: расце новы дом! Расце, узнімаецца ўвышыню, да сонца бліжэй. Вельмі ёмка працуецца, калі бачыш, што выходзіць з-пад тваіх рук...

Перад палуднем на будаўнічай пляцоўцы з'яўляецца Віктар. Смаліць па насыпу, размахвае тоўстым пакункам і, як учора, калі бег да маці, спатыкаецца, ледзь не падае. І сігае на толькі што пастаўленую пліту.

— Адвучыўся ўжо і хадзіць па нашым пясочку? — жартуе Барыс.

— Амаль што, браце-коце. А ў вас без мяне, аказваецца, паддаецца работа. Першы паверх выводзіце!

— Ты і перашкаджаў. А як пайшоў — адразу і загуло!

— Цяпер вам раскоша...

Віктар прыстуквае абцасамі — пліта глуха пазвоньвае; прыглушаны звон знікае не адразу, а нейкі час жыве ўнізе, пад плітою. Я не гляджу на Віктара, услухоўваюся ў гэты звон. А Віктар зноў выбівае абцасамі нейкі марш.

— Даю прапанову: работы спыніць! Усіх запрашаю сюды!

— На мітынг з повалу таго, што едзеш ад нас?

— Не, Барысе, без авацый. Я чалавек практычнага веку. Не люблю доўгія мітынгі.

Віктар выцягвае з пакунка бутэльку шампанскага, маленькія чырванабокія яблыкі, пакуначак з сырам — сыр пакроены на тонкія лустачкі. Усё гэта ён раскладае на газеціне і ўзбуджана паціраe рукі.

— Развітальная чарка, адным словам. Гэ-эй, Сініца! Цягні Ткача сюды. Гарніцеся бліжэй, хлопцы!

Рогач з энтузіязмам, але падазрона глядзіць на пузатую чорную бутэльку: ён і расчулены, і не ведае, мабыць, якую пазіцыю яму, прарабу, трэба заняць у гэтым выпадку. Асцярожна і не вельмі строга ён дакарае:

— У рабочы час? Ты што гэта намысліў?

— Які рабочы? Абед жа! На перапынак я і меціў. Ці думалі, Віцька цішком змыецца?

Пытанне больш адрасавана мне, чым Рогачу, але я маўчу і гляджу на Віктаравы пальцы, што здзіраюць бліскучую срэбную загортку з рыльца бутэлькі. Мне не хочацца нічога гаварыць яму: такое адчуванне, нібыта мы раней і не сябравалі і нічога агульнага ў нас не было.

— Чаго ж учора не забег?

Віктараў дакор шчыры. Адказаць на яго трэба.

— У Валі быў... Вярнуўся ў інтэрнат позна...

— А я быў падумаў — пакрыўдзіўся. Але маёй віны тут няма. Дапраўды. А выклік яны прышлюць!

— На гэтым стаіць крыж. Пакуль што.

— Дарэмна. Я табе пры ўсіх абяцаю: прыеду і такі ўзніму там вэрхал. Я ім пакажу!..

Падобна на крыўду. Больш таго, я веру ў яго абяцанне. І разумею яшчэ: трэба быць велікадушным. Хіба маю я права прымушаць Віктара сябраваць са мною, сябраваць шчыра, сардэчна? Не, вядома ж! Сяброў не выбіраюць, як гузікі. Сябар, сапраўдны сябар, заўжды наплечнік у змаганні і працы.

— Едзеш сёння? — Адчуваю, што павінен спытаць гэта.

— А дзесятай гадзіне цягнік...

— Памагчы дацягнуць рэчы?

— Якія? Адзін студэнцкі чамадан. І бацька машыну яшчэ арганізаваў...

Падзяка ці простае нежаданне бачыць мяне на вакзале? Не магу зразумець.

Злазіць з крана і падыходзіць Сініцын; усё тое, што месціцца на газеціне, выклікае ў яго вясёлы смяшок.

— Ну-ну... Да гэтай навукі мы ўсе здатныя. Не трэба, Віця, і ехаць далёка. Паўлюк! Цягні тамка і маю пакляжу на закусь. А гарэлка тут ёсць.

— Гарэлка? Пітво багоў! — смеючыся, пярэчыць Віктар.

Ткач дзелавіта пацірае даланёю падбародак — яму ўжо не церпіцца.

— Што ты іх агітуеш, Віця! Сваё дзела вядзі — налівай. Толькі ці ёсць жа куды?

— Усё прадугледжана. Як мае быць!

Віктар выцягвае з кішэні і стаўляе на бок каляровыя, састаўленыя адна ў адну, тры эбанітавыя, звужаныя ў донцы, пасудзінкі; драціну з рыльца адкручвае асцярожна, сцяўшы вусны. Руды корак спачатку паўзе марудна, марудна... Бух! Белы дымок ускіпае над верхам бутэлькі.

Пеніцца, іскрыцца на сонцы шампанскае. Віктар раздае эбанітавыя чаркі.

— Па-першае — жанчыне. Па другое — прарабу. І табе, Сініца, за той хлявок.

І тут не ўтрымаўся — падкалоў кранаўшчыка. А Рогач урачыста і сур'ёзна прапаноўвае:

— Ну! За шчаслівую дарогу.

Можа, знарок так падрабіў Віктар ці простая выпадковасць — мне выпадае піць з ім. Нам нават не хапае крыху шампанскага, каб чаркі былі поўныя.

— Дальём у Маскве,— сур'ёзна абяцае Віктар.— За што мы ўзнімем?

— За навуку!

— Давай. Згода! — Віктар высока ўзнімае чарку над галавой.— І яшчэ за ваш першы паверх!

— Тады і за апошні таксама! За самы высокі паверх!

Чырвоны эбаніт здаецца барвовым, шампанскае ў ім зіхаціць агністымі колкімі промнікамі.

— Правільна, Лявонка! Ты правільны хлопец, Лявон-

ка,— невядома з якой прычыны падхвальвае мяне Ткач.— Бяры, дарагі мой, кавалак сала. Навальвайся ўсе разам.. На ўсіх хопіць...

У сумках Сініцына і Ткача, сапраўды, харчу багата: хлеб, кавалак ружавата-белага сала, вялізныя чырвоныя памідоры, гуркі і дзве шырокія — амаль у далонь кожная — катлеты; Ткач наразае іх нажом на тонкія і прыгожыя лустачкі.

Пра ад'езд Віктара ніхто ўжо не гаворыць. Мы спрачаемся аб паказчыках за мінулы месяц, аб заробку; Пятро зноў узбіўся на сваю даўнюю тэму — пачынае даводзіць, што, маўляў, у Жаўняровіча ва ўпраўленні «свая рука» і таму іх участак заўжды хваляць і ставяць у прыклад.

Казімір абураецца:

— Давайце мяняць пласцінку! Даўся вам, Пятро, той Жаўняровіч у знакі. То бульдозер у яго, то паказчыкі.. Віктар едзе ад нас? Едзе. Вось і ўдакладнім, хто яго будзе праводзіць.

— Я ж казаў, у мяне толькі адзін чамадан. І машына будзе...

— Усё роўна: патрэбна камісія. Сямейных прапаную вызваліць. А далей такім чынам: Лявон, Зіна і я. Хто супраць? Няма. Прынята адзінагалосна. Старшынёю камісіі прызначаю сябе.

— Якія абавязкі ў членаў камісіі? — жартуючы, пытаюся я ў Казіміра.— І задачы?

— Дудзець замест аркестра на пероне.

Рагочам усе. Казімір, хітравата прыплюшчыўшы вока, пазірае на Віктара.

— А калі мы з табою адну шахматную партыйку на развітанне?.. Бо потым, як навукі глытнеш, цябе і пікаю не дастанеш.

— Толькі каб ніхто не падказваў. Глядзець, калі ласка, дазваляецца...

— Згода!

— Зараз... Ну ты скажы! Дома пакінуў!

Віктар у замяшанні абмацвае свае кішэні. Казімір супакойвае яго.

— І добра. Бо гуляць нам не выходзіць.

— Капітуляцыя, значыцца?

— Наадварот, разам адбівацца будзем. Зірні, якая армія на нас коціць!

Па насыпу — цяпер мы ўсе бачым гэта — рухаецца нечаканае шэсце. Жанчыну ў стракатым плацці кожны па-

знае адразу: гаспадыня дома, што стаіць у садку. Следам за ёю шыбуюць Грушаль і сержант міліцыі. Сержант маленькі, з маладым і жвавым тварам.

Болей ад усіх здзіўлены Віктар.

— Э-ээ! Хросная мая сержанта валачэ. Ну і баба! Трэба хоць гэта прыхаваць...

Ён памкнуўся захінуць бутэльку газецінай. Рогач спыніў яго.

— Не руш. Злачынства тут няма...

Мы чакаем. Асабіста мне ўсё яшчэ не верыцца. Зрабілі ж усё, здаецца, як след: і плот паставілі, і хляўчук адрамантавалі. Чаго ж яшчэ не стае ёй?..

— Дзе кранаўшчык? Сюды яго!

Жанчына загадвае гэта, узяўшы рукі ў бокі, потым, згледзеўшы чорную бутэльку, што стаіць на газеціне, бясстрашна кідаецца наперад па сходках; сходкі гнуцца і жаласліва рыпяць пад яе грузным целам.

— Паглядзіце! Вы на гэтых работнічкаў паглядзіце! Паселі радком ды гарэлачку свішчуць. Паглядзіце вы на гэтую кумпанію, таварыш капітан!..

Губы сержанта паблажліва крывяцца.

— Ніколі не быў капітанам...

— Даруйце на слове, даруйце. На тым леце ў мяне капітан кватараваў — пра яго цяперака і ўспомніла. Залатога сэрца чалавек! Ён гэты плот ставіць і памог...

— У пратакол гэта не пойдзе!..

Схіліўшы галаву, сержант вывучальна глядзіць на газеціну, што пасцелена на блоку. Глядзіць неяк надта доўга, і я прыкмячаю, што рэшткі нашага агульнага абеду яго зусім не цікавяць: сержант чытае вялікі газетны загаловак, на якім расплылася вялізная пляма. Грушаль моўчкі кратае бутэльку рукою; позірк, які ён кідае на Рогача, нічога добрага не абяцае.

— Абедзенны перапынак, таварыш інжынер. Развітальная чарка, можна сказаць. Вы ж ведаеце: чалавек у Маскву едзе.

— А я што казала? — з'едліва запытвае жанчына.— П'юць, таварыш капітан! А потым, панапіваўшыся, будынкі крышаць...

Сержант незадаволена моршчыцца.

— Хадземце агледзім. І складзём пратакол.

Жанчына трухае побач, строчыць несупынна, звяглівa. Можа, ёй варта паклікаць сведак? Сведак, дзякуй богу, у яе поўна. Ёсць каму пацвердзіць, што плот быў па-

стаўлены летась. І ёсць майстар, які будаваў хлявок, праўда, гэта было даўно. Можна і яго наклікаць. Ён жыве непадалёчку, і яна злётае мігам, калі толькі загадае капітан...

— Я не капітан! І прашу не блытаць. Мне патрэбны факты: дзе разбурылі, што разбурылі. Паказвайце!

Рэзкі тон сержанта зусім яе не бянтэжыць — толькі рукамі пляснула:

— Што разбурылі? Хіба ж яно не відно! Калі ласка, калі ласка... Паглядзіце, як плот наставілі. Торкні пальцам — паваліцца. Малiннік, агрэст паглумілі. Хадземце, хадземце! Усё пакажу. Як ёсцека, пакажу...

Сержант аглядае плот, а яна трасе слуп, які мы ўкапалі панава, часта торкае пальцам у наш бок; звяглівы голас уладарна падаўляе кароткія сержантавы пытанні і няпэўныя тлумачэнні Грушаля.

— Ачмурыць яна сержанта,— палохаецца Віктар.

— Не ўдасца...

Сержант мне падабаецца: спакойна, з пачцівым выглядам выслухвае ўсё. На маю натуру — не сцярпеў, гаркнуў бы як след...

Урэшце не вытрываў і Рогач: ціха вылаяўся, падымаецца і ідзе да Грушаля.

Віктар чухае патыліцу, кпліва зыркае на Сініцына.

— Ну, Сініца, капцы табе. Хто перадачы панясе? Сядзеш за краты, гэта я табе пэўна абяцаю.

— Кінь, Віцька, жартачкі! Хочацца яму глядзець на гэтую... Як ейны плот зачапіў? Нейкі нячысцік за руку смаргануў...

— Таму і прапаную: на мяне валіце. Што яна са студэнта возьме?

— Ты далёка будзеш, а нам тут давядзецца цяпер... Яна до-оўга не супакоіцца.

— Таму ж і кажу: мяне вінаваціць трэба... Ціха, ідзе ўлада!..

Сержант пераходзіць сходкі і, агледзеўшыся па баках, садзіцца на крайчык блока. За ім узнімаюцца на насып гаспадыня хлеўчука, Рогач і Грушаль. Яны стаяць побач, але сержант чымсь заклапочаны і не глядзіць на іх. Ён быццам адразу забываецца на тую справу, што прывяла яго сюды: невядома навошта зазірае ўніз пад пліты, спрабуе нават скрануць блок з месца.

— Моцна будуеце...

— Цікавіць? — асцярожна пытаецца Рогач.

— Вядома. Калі ж збудуеце?

— Гэты дом? Па графіку — месяц...
— Так... Хутка. Як тыдзень — паверх!
— Нават хутчэй...
— Та-аак,— быццам нешта падагуліўшы, сцвярджае сержант.— Дык што ж, будзем складаць пратакол. Як вы на гэта глядзіце, таварыш Грушаль? Ёсць пярэчанні?
— Ніякіх. Падпіша і Рогач, і я падпішу, калі трэба. Толькі мушу вам сказаць: прэтэнзіі грамадзянкі, мякка кажучы...
— Разумею... Разумею. Пра тое пагаворым пазней. А пратакол — гэта дакумент.
Ён раскрывае планшэтку і, крыху пасядзеўшы моўчкі, касавурыцца на газеціну, хмурыцца. Потым трыма пальцамі ўзнімае бутэльку, стаўляе на дол, за брус, і толькі тады, паправіўшы планшэтку на каленях, выцягвае з кішэні чорную, з бліскучым залачоным пяром, ручку.
Мы моўчкі назіраем за ім.
Сержант піша нядоўга. Зноў шчоўкаюць кнопкі планшэткі.
— Пратакол. Далей — дата. Цяпер — тэкст. Прашу ўвагі,— просіць ён, хоць ніхто з нас нічога не гаворыць.— Тэкст...— і адкашляўшыся: — Прыбыўшы на месца і агледзеўшы аб'ект, па які грамадзянка Цырава паказвае ў сваёй заяве як на разбураны, знайшоў яго неразбураным. Плот, у дужках — адзін, знаходзіцца ў спраўнасці, без пашкоджанняў. Стан хлеўчука таксама здавальняючы, хаця памянёная вышэй будыніна мае нахіл на левы бок, нязначны. Памеры аб'ектаў: плот — даўжыня дванаццаць метраў. Хляўчук — тры на два метры пад гонтавым дахам. Дах не пашкоджаны. На падставе таго, што сказана вышэй, і паказанняў будаўнікоў — сведак, памянёныя аб'екты з'яўляюцца спраўныя, у сувязі з чым лічыць: грамадзянкі Цыравай патрабаванне кампенсацыі ад будаўніча-мантажнага ўпраўлення нумар пяць за нібыта разбураныя пабудовы не мае падстаў.
Склаў пратакол сержант Банькін.
Патрымаўшы аркуш паперы перад сабою, ён кладзе яго на блок і прыціскае ручкаю з жоўтым металёвым каўпачком.
— Прашу. Спачатку існіца падпіша. Потым — таварышы ад упраўлення. Ці абодва можаце...
Гаспадыня хлеўчука ўтрапёна аглядае ўсіх нас, потым шалёна зыркае на сержанта і ўзмахвае рукою, быццам адштурхоўвае ад сябе пратакол.

— Не падпішу! Не падпішу!

Кінулася на сходкі, перабегла на другі бок насыпу, павярнулася; ад злосці твар скрыўлены.

— На ўсіх вас закон я знайду! Ведаю, куды скардзіцца!

Сержант узняўся, пачаў закрываць планшэтку.

— Гэта верна, законы яны ведаюць. Пісьменныя! І прашу вас, таварышы будаўнікі, паменей сутычак з дамаўласнікамі. Іхнія заявы ў нас вось дзе сядзяць.— Ён ляпае далонёю па сваім карку.— Народ нервовы, асабліва каго зносяць... Вельмі...

— Які ж гэта народ! Агрэсары! Агрэсары чысцейшай вады! — падае голас Віктар.— Учора як узялася мяне палонікам лупцаваць ды малаціць. І каб было завошта. Свінёнка, бач ты, у хляўку прыціснула. А выпусцілі яго, дык, не раўнуючы, гайсануў — куля не дагоніць...

Сержант пасцярожваецца, выцягвае з планшэткі тоўсты, вузкі сшытак. Гартае яго.

— Хіба гадуюць свінёнка?

— Ну... Я ўзяў ды свіснуў. А яна мяне палонікам: напалохаў, маўляў, свінчо.

Сержант закрывае свой сшытак, рэзка шчоўкае кнопкамі планшэткі.

— І вы маўчыцё? Я ж у Цыравых пытаў, ці правялі ветэрынарны догляд хатняй жыўнасці, як гэтага патрабуе пастанова выканкома. Няма, кажуць, жыўнасці. Падман мы не даруем...

Ён закідвае планшэтку за плячо і шпаркай хадою шыбуе з насыпу.

Ля брамы сержант дагнаў гаспадыню хляўка. Яна нешта пратэстуе, размахвае рукамі, але потым, унурыўшы голаў у плечы, маўчыць.

Віктар зларадна рагоча:

— Штрафчык таварыш Банькін цяпер засмаліць. Няхай паскача цяпер. І плот ёй паставілі, і хлявок выправілі — стараліся. І ўсё мала... А цяперака палучыш!..

— Табе лягчэй ад гэтага стане?

Нечаканае пытанне Ткача бянтэжыць Віктара, ён адразу ж пагаджаецца:

— Не лягчэй! Толькі і я спытаю: каго абараняць надумаў?

— Не хочацца на развітанне сварыцца,— памяркоўна гаворыць Ткач.— Але адно параю: не трэба так на людзей, з наскокам... Ну, не павезла баба свінёнка на той догляд.

За машыну ж заплаціць трэба... А мо адна баба жыве — за ўсё заплаціць няма чым. Хіба ўсё ведаеш, з чаго яна такая? Ну, дык вось... І я не ведаю. У кожнага нуда свая. Неяк трэба тое разумець...

Віктар — ніколі гэтага за ім не заўважалася — не спрачаецца, моўчкі выслухвае даволі доўгія павучанні Ткача. Быццам нейкая развага і одум пакладаліся па яго твар: пальцам кратае ніжнюю, знарок адтапыраную губу, глядзіць па мыскі сваіх жоўтых чаравікаў. Уздыхае:

— Пачаў ты, шчыра скажам, няважна — абараняць іх няма чаго. А вось апошнім — перакапаў. У кожнага сваё... Гэта праўда...

Віктар не спяшаецца развітвацца, нібыта чакае чагосьці, глядзіць з насыпу на зялёную вежу крана. Не вытрываў урэшце, просіць:

— Адзін камень пакладу. Апошні. На развітанне. Праўда, каб помніць...

Белы, асляпляльна белы, блок, заціснуты чыгуннымі лапамі пад'ёмніка, паволі плыве над насыпам. Гайдануўшыся, зніжаецца. Віктар памагае мне прыняць яго, завесці на месца і выраўнаваць па лініі пліты.

Вуркоча барабан крана. Рыпяць тросы. Пад цяжарам блока суха скрыгочуць патрушчаныя каменьчыкі ў растворы; блок кладзецца роўна і дакладна — з Віктарам можна працаваць.

— Кропка! — радасна сігналіць ён кранаўшчыку.

Грушаль з Рогачам усё яшчэ на насыпе. Яны стаяць спіною да ашаляванай і пафарбаванай у яркі колер хаты ў садочку і ціха — нам не чуваць пра што — размаўляюць. Грушаль час ад часу нахіляецца і нешта малюе тоўстай трэскай на пяску ля ног Рогача.

— А вы ганіце адразу і другі паверх,— урэшце далятае да мяне голас старшага прараба.— Не чакайце...

— Не закончыўшы першы?

— Так. Пашырайце адразу фронт...

Наш будаўнічы клопат ужо адкінуў тое непрыемнае, што зусім нядаўна прыплыло да нас з-за плота: і гаспадыня, і яе пагрозы — усё засталося там, пад насыпам; нават Віктар болей не прыгадвае хлеўчук.

— Ну, браце-коце, яшчэ адзін пастаўлю,— зноў просіць ён.— Сумна мне там будзе без вас...

Віктар стаіць побач з Казімірам, расправіўшы плечы, мажны, упэўнены, з прыветным і вясёлым тварам. Так, калі чалавек працуе з душою, з ахвотаю і праца яму па

сэрцы — ён робіцца прыгажэйшы. Праца — гэта, мабыць, адзінае, дзе чалавек не можа хлусіць. Не можа хлусіць сам сабе і не можа хлусіць другому...

Віктар, бясспрэчна, не адчувае, чаго дамогся за гэтыя кароткія хвіліны. Шмат, вельмі шмат дарую я з таго, што адбылося ўчора. Але не ўсё. Магчыма, гэта і блага, але ягоныя словы я, мабыць, буду памятаць доўга і не ведаю, шчыра кажу, не ведаю, колькі часу спатрэбіцца, каб вывятрылася з памяці мая ўчарашняя крыўда.

## 4

Шэсць мінут застаецца да адпраўкі цягніка.

Усё, што звычайна гаворыцца на пероне пры развітанні, Віктару мы сказалі. Стаміліся ўжо і жартаваць, і даваць парады і цяпер па чарзе паглядаем на пукатае кола гадзінніка; гадзіннік прымацаваны да сцяны вакзальнага будынка на фігурным кранштэйне; унізе, якраз пад ім, у нізкіх шэрых блюдках ружавеюць гладыёлусы.

Вялізны букет такіх кветак — толькі не ружовых, а агніста-чырвоных — на руках у Віктара. Віктар, здаецца, не прыкмячае нашых нецярплівых і трывожных позіркаў на гадзіннік, не заўважае, як мала часу засталося яму быць тут, на пероне Прыдзвінскага вакзала; ён крыху збянтэжаны і ўсё ж шчаслівы бясконца; яго бацькі крыху адступілі ўбок — аддалі свайго сына нам — і цяпер паглядаюць на сумятлівы гармідар вакол яго з паблажлівым сумам.

Пад клёнамі, што растуць у канцы перона, чмыша белаю параю паравоз. Апошнія вагоны састава хаваюцца ў дрыготкіх змроках за віядукам: далягляд там барвовы, як кроў, і здаецца, што ўвесь гэты цягнік, іскрысты ад святла вакзальных ліхтароў, толькі што выпаўз адтуль і, яшчэ не паспеўшы скінуць са сваіх гарачых бакоў водбліскі тае чырвонае зары, стаіць, ціяк не здышыцца.

— Чуеш, Віцька? — пытаецца Казімір.— Адпраўка!

— Чую, чую...

— Запрашаюць у вагон. Табе трэба ісці!

— Гоніце?

— А што з табою рабіць? Падакучыў ужо. Кветкі? Атрымаў. Пажаданні на добрую дарогу? Дадзены ў дастатку. Развіталіся? Так. Ма-арш цяперака ў вагон!..

— Не церпіцца выпхнуць мяне з Прыдзвінска? Ведаю

гэта, ведаю! Таму і еду!.. А дзе ж мая самая вялікая пасоўка? Буду рыдаць... Ой-гу-гу-гууу...

Віктар, жартуючы, усхліпвае і, не ўтрымаўшыся, рагоча — звонка, галасіста, амаль на ўвесь перон; у яго вачах аніводнай кропелькі тугі ці разгубленасці. І гэта мне даспадобы: не люблю, калі сумуюць ці плачуць на вакзалах.

— Ну, як хочаце. А я — еду!

Па чарзе ён абдымае нас, крыху сумеўшыся, спыняецца перад Зінаю, а потым паспешліва кладзе ёй на рукі кветкі.

Букет маіх гладыёлусаў!

Нават, калі ўжо дакладна, не маіх, а нашых. Мы разам з Валяй выбіралі іх на кветніку, і нешта сімвалічнае бачыў я тады ў гэтых гладыёлусах, у вельмі празрыстых і надзвычай тонкіх барвовых пялёстках: Віктар будзе ехаць, прыгадваць свой горад, сяброў, і кветкі на століку ў вагоне будуць як памяць, як прыемныя ўспаміны, ад якіх заўжды лёгка і хораша на душы...

А кветкі нікуды не едуць. Яны ляжаць у Зіны на руках, і таму Зінін твар амаль не відзён — толькі белы лоб ды пышная грыва валасоў за вялізным букетам.

Зусім нядаўна, калі гладыёлусы былі пазразаны з клумбаў, Валя вось гэтак жа, як цяпер Зіна, закрыла кветкамі свой твар і папрасіла:

— Калі захочаш мне што-небудзь падараваць — прынось гладыёлусы... Ты бачыш, якія яны?

Мы стаялі ў садзе, старанна дагледжаным Валіным бацькам, і я ведаў, што гэта самыя лепшыя для яе кветкі, і, тым не менш, спытаў:

— Табе падабаюцца гладыёлусы?

— Вельмі. І асабліва гэтыя...

— Тады пакінь іх сабе. Віктар увогуле не любіць кветак. Сентыменты, кажа...

— Не ведаю... І не паверу. Побач з кветкамі чалавек робіцца лепшы. Пажадай і ад мяне шчаслівай дарогі яму...

Валя не змагла пайсці са мною на вакзал — у іх сёння заняткі. Я прыйшоў адзін і прынёс з сабою крыўду на Віктара, што зноў чамусьці ажыла. Смешная гэта крыўда. І наіўная... Я разумею гэта, але не магу ўтаймаваць сэрца: яно моцна, трывожна стукае. Ведама ж, не з тае прычыны, што Віктар не схацеў везці з сабою кветкі і аддаў букет Зіне. Мы павінны былі разам увайсці ў вагон і разам паехаць: Віктар і я. Разам. Як і марылі пра гэты

дзень даўно. Марылі шмат, марылі доўга, і ў тых марах сталела і мацавалася наша сяброўства. І вось Віктар едзе адзін, а я таксама адзін застаюся тут, на пероне...

Гэтая думка зусім інакш, не так, як учора, трывожыць мяне. Трывожыць, але не прыносіць тугі. Я не адзін застаюся. Застаецца Казімір. Застаецца Зіна. Застаюцца мае гладыёлусы. Дакладней, нашы з Валяй: яны таксама нікуды не едуць.

Віктар развітваецца з бацькамі. Ён робіць гэта спехам, быццам саромеецца крыху іх, і асабліва таго, што маці амаль уголас плача. Яна трымае яго руку, вядзе, як малога, да прыступак і там ужо, калі ён узяўся за поручні, засыпае таропкімі пацалункамі. Бацька, таксама ў спешцы, нешта гаворыць Віктару, але ён ужо не слухае, ускаквае ў тамбур і адразу знікае ў вагоне.

Кранаецца цягнік з месца марудна, амаль непрыкметна, і ў той жа момант вясёлы Віктараў твар вынырвае ў адчыненым акне. Віктар глядзіць на нас, але я бачу, што ён ужо развітаўся і з намі, і з Прыдзвінскам і думае пра нешта іншае, ён ужо не тут, а недзе там, наперадзе, дзе чакае яго новая і невядомая будучыня. І мне яна таксама невядомая. Магчыма, у той будучыні адбудзецца нешта такое, што нанава замацуе нашае сяброўства, зробіць яго ранейшым, добрым і шчырым? Магчыма. Але я не ведаю: ці хочацца мне, каб гэта здарылася.

Крочу ўпоравень з акном, потым пачынаю адставаць, і твар Віктара, яго ўзнятыя рукі адплываюць усё далей і далей. Пагрукваючы, вагоны абганяюць нас. Вокны. Твары. Дзесяткі рук. Кветкі. Гэтая стракатая стужка бяжыць наперад, хутка вузее, і Віктараў твар, нібыта праваліўшыся куды, знікае ў ёй.

Раптоўна, быццам адсякаючы тахканне колаў, адлятае апошні вагон. У мроіве далёкіх агнёў хутка растае святло вагонных вокнаў.

Нейкі час барвоваю кропкаю свеціцца ў начы чырвонае вочка ліхтарыка над тамбурам апошняга вагона, потым і яно блякне, меншае, знікае зусім, і толькі водгулле невыразнага далёкага пагруквання яшчэ жыве, трапечацца ў кляновай лістоце.

За будынкам вакзала, на вузкай плошчы, Віктаравых бацькоў чакае таксі. Маці хуценька туліцца ў куточак машыны і, здаецца, зноў ціха плача; трымаючыся рукою за дзверцы, бацька спыняе мяне.

— Надарыцца вольны час — забяжы... Ці пазвані. Шчыра прашу, не забывай дарогі. Заходзь...

— Дзякую. У мяне Віктаравы кніжкі засталіся. Прынясу...

— Кніжкі, кніжкі.— Ён намагаецца гаварыць весела, але голас у яго глухі.— А ты без іх прыходзь...

З трэскам зачыняюцца дзверцы; чырвоны агеньчык стопсігнала хутка знікае за рогам прыстанцыйнага парку.

— Як дамоў вас загадаеце даставіць? — весела пытаецца Казімір. Ён увогуле нешта вельмі шматгавата сёння жартуе.— Магу прапанаваць аўтобус. Асабісты.

— Не! Я — пешкі! Дапраўды, пойдзем пешкі. Навошта нам аўтобус! Ты згодзен, Лёня?

— Зіначка, Лявон тут нічога не вырашае. Галоўны закон — дэмакратыя. Стаўлю на галасаванне. Хто за? Так... Адзінагалосна...

На вечаровых тратуарах ціха і амаль пуста. Вялізныя белыя кропкі ліхтароў льюць на асфальт невыразнае святло. Асфальт сухі і пыльны: чамусьці па вечарах пах пылу на гарадскіх вуліцах мацнейшы, чым удзень.

— Куды мы гэтак разагналіся? — Зіне, відаць, не падабаецца наш імклівы марш — мы крочым таропка, быццам спяшаемся хутчэй адысці ад вакзала.— Даганяем каго?..

— Чарговая трэніроўка.

— Якая?

— Звычайная. Лявон рыхтуецца да асенне-зімовага кросу на першынство горада...

— Купілі!

— А што ж застаецца рабіць?

— Не звяртайце ўвагі, Зіначка,— мне хочацца нечым адплаціць Казіміру.— У Казіміра ўсе жарты маюць адну цікавую асаблівасць. Яны няўдалыя.

— Паглядзім, якая ўдача напаткае цябе ў час кросу.

— Удачы не можа быць: крос жа твайго імя.

Зіна, быццам чымсь устрывожаная, спыняецца, заклапочана нюхае гладыёлусы.

— Пачакайце... Вы адчуваеце? Нейкі дзіўны пах...

— Не заўважаю,— Казімір шморгае носам.

— Пахне дробязнай спрэчкаю.

— Што, Казімір, атрымаў? Вось табе і кветкі. А ягадкі — пасля кросу.

Нейкі час цягнемся павольна і моўчкі. На тратуары, пад саменькімі нагамі, варушацца дрыготкія і кудлатыя

цені таполяў; на бруку, бліжэй да ліхтароў, цені шырэйшыя, невыразныя і пасярэдзіне вуліцы знікаюць зусім.

— Чуеце, як пахне свежы асфальт?

— Досыць, Лёня, адзін раз панюхаў. Не купіце цяперака...

— А я адчуваю,— адгукваецца Зіна.— Падобна на каву, калі падгарыць...

Чорны асфальт, з бліскучай палосаю ад катка, на супрацьлеглым баку вуліцы асветлены ярчэй — падае святло з новага гмаха. Дом пядаўна засялілі, на вокнах яшчэ няма фіранак, і шыбы, як вялізныя здзіўленыя вочы, смела глядзяць на дарогу; у пакоях людзі нешта робяць. На трэцім паверсе стаіць ля акна маладая жанчына, побач — мужчына ў белай тэнісцы, стаяць нерухома і глядзяць на вуліцу. Магчыма, яны бачаць нас.

Люблю вокны без фіранак, нічым не засененыя.

Насустрач нам сунуцца на тратуары дзяўчына з хлопцам. Ён высокі, у цёмным, з белымі шырокімі стужкамі, світэры — яна ў стракатай, без рукавоў, сукенцы, малепькая і танюткая — руку неахайна ўскінуў дзяўчыне на плячо; ён хістае дзяўчыну, і яна то адлятае ад яго, то прыпадае яму на грудзі і рагоча. Рагоча шчыра, шчасліва.

Яны мінаюць нас, і Казімір абурана глядзіць услед:

— Рыцар! Чаму — можа, ты, Зіна, адкажаш мне — дзяўчатам падабаецца менавіта гэта вось... Каб абавязкова цісную хлопец плячо ці абшчапіў за талію?..

— Трэба ўдакладніць, якім? Здаецца мне, што вельмі ж блага ты ведаеш сапраўдных дзяўчат.

— Іхніх густаў, мабыць, хочаш сказаць? А пра густы, як кажуць, не спрачаюцца...

— Не спрачаюцца? Хто табе гэта сказаў?

Зіна рэзка паварочваецца да Казіміра, нават у бляклым святле ліхтароў відно, як звузіліся яе вочы, бровы ўздрыгваюць. Казімір маўчыць.

— Не спрачаюцца? — перапытвае яна.— І дарэмна. Зусім дарэмна! Бяда часцяком адтаго і бывае, што мы надта мала спрачаемся з тымі, з кім у нас няма згоды. Ат, адумаюцца. І — вынік: хвароба залазіць яшчэ глыбей.

— Хвароба — справа медыцыны. Не люблю ўмешвацца ў тое, чаго не ведаю. І не люблю спрачацца,— гаворыць Казімір.

— Вядома, не кожнаму тое даспадобы. Спрэчка — змаганне. А на гэта патрэбен духоўны гарт.

Гэта якраз тое, пра што я думаў. Думаў у той дзень,

калі Віктар атрымаў выклік, і асабліва сёння — роздум аб нашым сяброўстве з Віктарам вымагае ад мяне пэўных і канкрэтных рашэнняў.

— І яшчэ — вера,— пагаджаецца Казімір.

— А якія ж перакананні, калі веры няма?..

Спытала і ўжо не чакае адказу, прапаноўвае хутка і катэгарычна:

— Вось я і дома. Развітваемся.— І тут жа зусім іншым тонам, жартаўліва, весела: — Кіну вас на волю лёсу, халастых і нежанатых.

— Бяжы хутчэй і адчыняй акно: мы будзем спяваць серэнады. У кожнай туга і агонь.

— Учора ноччу ля першага балкона спявалі. Пасля дванаццаці нехта лінуў на іх вады.

— Мы не з цукру. Праўда, Лявон?

Не разумею я Казіміравай фамільярнасці ў адносінах да Зіны і ў той жа час як бы нерашучасці. Заўжды смелы, ён сёння па кожнай дробязі просіць маіх пацверджанняў. Жартуе, вядома. Але за кожным жартам адчуваецца нешта яшчэ, старанна прыхаванае.

— Для серэнады патрэбна гітара,— кажу я.— А яе ў нас няма.

— Тады ўсё, Зіначка. Спі спакойненька: твой сон ніхто не патрывожыць.

І гэта гаворыць Казімір. Куды падзеліся сціпласць, стрыманасць і сур'ёзнасць?.. Ці, можа, я проста мала ведаў яго, і цяпер усё тое, што раней не бачыў, так рэзка кінулася ў вочы? Наўрад...

Зініна постаць знікае ў скупа асветленым пад'ездзе. Пяціпавярховы дом стаіць на рагу плошчы. За плошчай невялікі парк з помнікам героям-гвардзейцам у цэнтры. Помнік збудавалі ў першы год пасля вызвалення горада. За дрэвамі гараць ліхтары — іх не відаць адсюль з-за густога спляцення галін,— і шпіль помніка, азораны белым святлом, здаецца залачонаю стралою, вылятае з цёмнаї лістоты.

У парку мне вядома кожнае дрэва — садзілі іх тут, калі я вучыўся яшчэ ў школе, а ў Зіньным доме — кожны паверх, кожны блок, кожная пліта перакрыццяў: мы будавалі гэты дом два гады назад. І Віктар працаваў тут. Неяк па восені, калі ставілі блокі трэцяга паверха, яго ледзь не забіла тросам крана, і я выпадкова ўратаваў яго... Казіміра тады яшчэ не было з намі, ён прыйшоў да нас пазней, за нейкі тыдзень да таго, як мы закончылі будаў-

ніцтва па плошчы і пераходзілі на другі аб'ект. Ці казаў я пра тое здарэнне з Віктарам Казіміру?.. Здаецца, не...

— У цябе ёсць веласіпед? — нечакана пытае Казімір.

— Стары як свет,— хутка адказваю я.— Затое ў хадзе лёгкі. Ён табе патрэбен?

Казімір нібыта і не чуе майго пытання, пачынае казаць пра тое, што яго ўласны веласіпед таксама стары, але ў хадзе таксама лёгкі. Не вытрымліваю, перапыняю:

— А чаго ты пра веласіпед прыгадаў?

— Хочацца выбрацца за горад. Паехаць далё-ока. Па якой-небудзь незнаёмай лясной дарозе.

— Цяпер?

— У нядзелю. І запрасіць Зіну... І Валю абавязкова. А маршрут — мой клопат...

— Выходзіць, зноў крос?

— Простая трэніроўка. На кросе мы яшчэ з табою сыдземся!

— Паглядзім, як той казаў. Ты ў інтэрнат?

— Урэшце дастаў «Прыгоды...» Хачу дачытаць...

— Падабаецца?

— Як прачытаю — скажу. Пачаў з цікавасцю.

— А я, прабач, ледзь не плюнуў...

— Не падабаецца Іван?

— Доўгая гэта гаворка...— Ён маўчыць, нібыта ўзважваючы штосьці.— Слухай, Лявон, калі не спяшаешся,— павернем да мяне. Пасядзім, паталкуем. Год жа, здаецца, не заходзіў. Ці болей?

Смяшок у Казіміравым голасе насцярожвае. Няўжо год я не быў у яго? Здаецца, заходзіў сёлета... Ці не, па восені неяк з Віктарам заходзілі. Здаецца, у жніўні. Якраз тады скончылі будаўніцтва новага пяціпавярховага дома, і Казімір запрасіў нас да сябе — гэта быў першы яго дом. Помніцца, дарогаю мы завярнулі ў магазін, напакуплялі закускі, віна... Выпівалі на кухні. Паспелі, здаецца, пусціць па адной чарцы — вярнулася з работы маці. Уражаная, спалоханая, яна, нічога не гаворачы, стаяла і аглядала наша застолле, потым сказала, быццам паскардзілася каму:

— Гарэлкі ў хаце не будзе... З кім жа гэта, Казя, мы дамовіліся, сынок мой?

Вясёлыя ад выпітага віна, мы не заўважалі, як сціскаюцца яе маленькія кулачкі, як нядобра сцягваюцца бровы... Я зухавата пярэчыў ёй, паказваў на бутэльку, тлумачыў, што не гарэлка ў нас, а віно, і ўсё папракаў Ка-

зіміра, чаму не запрашае да стала маці. І тады здарылася тое, чаго не чакалі, мабыць, ні я, ні Віктар і, мабыць, сам Казімір... Яна выхапіла бутэльку з маіх рук, шпульнула яе ў намыйнае вядро і закрычала, стукаючы сухой, як бы драўлянай, далонькаю па стале:

— Не дазволю! Не дазволю спойваць сына! Не дам!..

Вочы ў яе былі злосныя, і ненавіта сухі, колкі бляск іх адразу працверазіў мяне. Неяк быццам зводдалі ўбачылася: маленькая раззлаваная жанчына і тры ладныя дзецюкі на лёгкім падпіцці. І так не вязалася гэта, не ставалася адно да аднаго, што я задыхнуўся на міг. Моўчкі ўзняўся. Я не мог апраўдвацца. Ніводнага слова не сказаў і Віктар...

Мы развіталіся; маці не пусціла Казіміра з хаты, а нам нават галавой не кіўнула, а толькі паглядзела са шкадаваннем і пагардліва скрывіла губы...

Няўжо болей я і не быў у іх?

Пачуццё вінаватасці за той жпівеньскі вечар шырэе.

— Хадзем,— цвёрда кажу я. Мне хочацца ўбачыць Казіміраву маці.

Пераходзім мост і па крутой драўлянай лесвіцы спускаемся з высокага насыпу на прыбераг. Сцяжынка тут шырокая, і можна ісці плячо ў пляччо. На тым беразе, крыху ніжэй моста, вуркоча катэр; яркі прамень прабівае змрок і кладзецца палосаю на ваду, і гэтая светлая шырокая дарога, што злучае берагі, ззяе і блішчыць.

— Назад паедзеш паромам,— раіць Казімір,— бліжэй будзе...

За старымі вязамі на беразе ракі відзён трохпавярховы Казіміраў дом. Побач з намі Дзвіна — ціхая і светлая, а там, пад вязамі, чорна-чорная, і таму дом нібыта вісіць над зямлёю — незвычайна белы, як бы нанава пафарбаваны. Казімір тлумачыць мне, што дом рамантавалі летась, праўда, знадворку толькі, а ў сваёй кватэры яны з мамаю ўсё самі парабілі, што жывуць яны тут ужо дзесяць год.

Мы ўзнімаемся на другі паверх; я ўсё думаю пра Казіміравы словы: яны аселі ва мне, не даюць спакою. Дзесяць год?.. Два гады ён быў там. Год працуе з намі. Значыцца, усё пачыналася ў яго пад гэтым вось дахам... Адсюль, з гэтага дома пад вязамі, што шнурам стаяць па-над Дзвіною, і пачыналася тая нялёгкая дарога...

У пакоі крыху душна, Казімір адчыняе акно.

— Хочаш вячэраць?

— Не дужа.

— Значыцца, хочаш. Што тут мне напісана?..

На стале — вучнёўскі сшытак; ён чытае нешта ў ім, і я бачу на Казіміравых губах добрую ўсмешку.

— Бачыш? Нібыта малому мне маці піша: вячэра на сёння — варэнне, сыр, масла, малако... Табе грэць яго? Я дык люблю чай.

— І я таксама. А дзе маці?

— Дзяжурыць. Хутка прыйдзе. А ты праўду кажаш пра чай? Мама таксама малака не любіць. А мяне прымушае піць...

— На якой станцыі яна працуе?

— На тэлефоннай. А ты думаў на чыгуначнай?.. Пагартай часопісы... Я зараз пастаўлю чайнік...

Мне чуваць, як Казімір бразгае посудам на кухні. Дзіўна, але зусім няма адчування, што сяджу ў чужой хаце. У пакойчыку, здаецца, нічога не змянілася: невялічкі круглы стол па-ранейшаму стаіць пе пасярэдзіне, а крыху бліжэй да сцяны; насупраць акна канапка і за ёю — маленькі пісьмовы столік. І ўсё ж нешта не так, як раней. Тады, здаецца, не было гэтай палічкі з кнігамі, што лоўка прымайстравана да сцяны, і круглай лямпы; святло ад яе яркае, не б'е ў вочы, а роўна залівае ўвесь столік; пасярэдзіне яго разгорнутая кніга. Задачнік па геаметрыі? Не, гэта ж трыганаметрыя. Казімір займаецца?..

— Зараз будзем піць чай. З малаком. І трускалкі знайшоў. Смачныя...

Ён уваходзіць у пакой і змаўкае, убачыўшы сшытак у маіх руках; бярэ яго, неахайна кідае на стол.

— Ганю, бачыш, трыганаметрыю. Вясною здам экстэрнам.

— А дзе прымаюць?

— У сёмай школе. Крыху, праўда, спазніўся — позна даведаўся, што можна экстэрнам. Аказваецца, добра арганізавана ў іх і зручна: два разы на тыдні кансультацыі... Трускалкі ты любіш? У нас роўны густ. Ну, гайда на кухню!

І пра экстэрн, і пра чай, і пра густ Казімір гаворыць упэўнена, аднолькава роўным голасам. Так гаворыць чалавек, які ведае і тое, што хоча зрабіць, і тое, што сілы і настойлівасці ў яго хопіць.

Такія рысы мне падабаюцца. Я і раней бачыў іх у Казіміру, але яны былі і крыху ягоныя, і крыху абстрактныя, а тут раскрыліся на канкрэтным глыбока і таму дужа ўразілі.

Мы сядзім на кухні, утульнай і чысцюткай, за маленькім квадратным столікам; і шклянкі таксама маленькія і просценькія, з тонкаю сіняй аблямоўкаю, а чай смачны незвычайна, і дужа смачнае варэнне з жаўтавата-чырвоных, падобных на агрэст, яблычак.

На душы хораша, ціха і цёпла: Казімірава шчырасць і сардэчнасць расчулілі мяне. Прыгадваецца наша няскончаная гаворка.

— Слухай, Казімір, а чаму гэта кніга табе не падабаецца? Чым...

І зноў, як чырвонае вока светафора, у душы: нельга! Не маю я права на такое пытанне тут; разумею гэта і ўпарта чакаю адказу. А ён глядзіць на мяне ўважна, доўга, тоячы іранічную ўсмешку ў куточках вачэй; вочы яго адразу сцямнелі, бровы неяк насмешліва выгнуліся; пра нешта думае, ганяючы лыжкаю чорную пульхную чаінку на сподачку; злавіў яе, прыціснуў на край.

— Не аповесць,— гаворыць, нібыта адсякае што.— Не падабаецца філасофія галоўнага героя, філасофія тулягі, прыстасаванца. Толькі жыць, толькі выкараскацца — і гэтаму падначальваецца ўсё. Пастаяць у чарзе за цябе? Калі ласка! Але за гэта — кавалачак сала. Пакаравуліць твой хатуль? З ахвотаю! Але за гэта — кольца кілбаскі. Сцізорык табе патрэбен? Бяры, зрабі ласку. Але за гэта — цукру кавалачак. І гэтак ва ўсім, ніводнага каліўца шчыра ён табе не саступіць, нічым асабістым не ахвяруе ніколі...

— Ды няхай сабе жыве той Іван. Што, ён перашкаджае нам? Хіба ў жыцці ж такія людзі не былі?

— Былі! І ёсць! Але навошта з яго рабіць былінпага героя ды крычаць, як гэта робяць некаторыя: ах, цуд! Ах, праўда! А той выпадак — гэта не ўся яшчэ праўда, бо акрамя такога Івана былі другія людзі. Сапраўдныя! Яны, а не такія, як ён і яму падобныя, вывелі мяне на верную дарогу, навучылі быць чалавекам. Ты разумееш?

— Я разумею: людзі павінны ведаць пра той час усю праўду, такую ж шчырую, як прагучала з трыбуны з'езда.

— Правільна. Але ў першую чаргу я хачу чытаць пра тых людзей, што не поўзалі слімакамі, а стаялі, як сцяна... Павер мне: там былі і дрэнь, і сапраўдныя людзі, непрымірымыя да хлусні, няпраўды, бруду. Гэта ж аксіёма: чалавек не адразу нараджаецца мужным. Але святое яго ае права і абавязак — быць мужным, заўжды ўзнімацца над

брудам, кідаць яго сабе пад ногі і ненавідзець бруд. Гэта самая страшная нянавісць. Мудрая і святая.

За цёмнымі і бліскучымі ад святла вяршалінамі вязаў цьмяна серабрыцца Дзвіна. Начны змрок набліжае яе, і гарадскія агні, адлюстраваныя ў вадзе, ляжаць, здаецца, зусім побач — працягні руку за акно і дакранешся да іх халоднай зыркасці.

Гляджу на раку, ціха, маленькімі глыточкамі п'ю чай і слухаю Казіміра. Цяжкая, змрочная старонка ягонага жыцця пачыналася, можа, тут, на кухні, дзе сядзім мы цяпер. Можа, за гэтым вось сталом, з гэтых самых шклянак выпіў ён гарэлкі са сваімі дружбакамі... Маладыя і нявопытныя... Потым быў сад чыгуначнікаў, была дзікая, вар'яцкая па сваёй бессэнсоўнасці бойка... З саду ён не прыйшоў дамоў, але з турмы вярнуўся сюды. І, можа, самае страшэннае было тут тады, калі ён вярнуўся і стаў ля ложка хворай маці. Трэба было не проста ўвайсці ў пакой, а прывітацца, нешта сказаць ёй, сказаць, разумеючы, што прычынаю гэтай хваробы ён сам, адзіны яе сын... Што ён сказаў тады? Што думаў? Якія думкі былі ў галаве, калі ўвайшоў сюды?.. Можа, як я сёння, убачыўшы, што пакойчык не змяніўся, здзіўляўся гэтаму? А можа, радаваўся, што ўсё засталося ранейшым?.. Не, нічога не застаецца ранейшым. Але часта мы не прыкмячаем гэтага, нібыта ў нас няма вачэй. Праўда ж... Казімір рыхтуецца здаваць экстэрнам за дзесяцігодку.

А я не ведаў гэтага. І Віктар не ведае. І Барыс не ведае. А мы ж другі год працуем разам.

— Наліць табе яшчэ?

Казіміраў голас нібыта зводдалі. Я закрываю далонёю шклянку.

— Не, Казімір, досыць чаю. Дзякую.

— Зіна вось гэтак жа робіць. Падзякуе, а шклянку абавязкова далонькаю закрые...

— Зіна?.. Ты шмат, аказваецца, ведаеш розных падрабязнасцей...

Не разумею, чаму гаворка пра Зіну трывожыць мяне? Я кахаю Валю. І яна кахае мяне. А Зіна... Зіна і Казімір! Што хаваецца за гэтым маленькім і сціплым «і»? Неяк вельмі ўжо хутка пасябравалі яны з Казімірам. І, пэўна ж, гэтае сяброўства пачалося задоўга да таго дня, як яна прыйшла да нас. Але чаму тады Казімір не казаў мне пра гэта? А я пытаў у яго? Не пытаў. І не буду. Ён гаворыць, значыцца, гэтак і лепей.

— Хочаш, адкрыю сакрэт, як яна на будоўлі апынулася? — рашуча прапаноўвае Казімір.

Ківаю галавой у знак згоды, але ад пытання ўжо ўтрымацца не магу.

— Ты дапамог?

— Але... Мы разам вучыліся да сёмага класа. Потым яна паехала ў другі горад — бацьку перавялі... У школе Зіна марыла аб сцэне — цудоўны ў яе тады быў голас! «Не о том скорблю, подруженьки, я жалею не о том...» Памятаеш, адкуль? Як яна спявала! Быццам учора было тое. І мы ўсе верылі: будзе артысткаю. А цяпер — падсобны рабочы ў прараба Рогача...

— І яна лічыць, што падсобным рабочым блага быць? Ці, можа, ёй не падабаецца Рогач?

— Наадварот. Яна ў захапленні ад нашага прараба.

— Але ты на апошнім часе не ў захапленні ад яго. Так?..

Ён не паспявае адказаць. Стукаюць дзверы: у калідор уваходзіць маці. Казімір сядзіць бліжэй да дзвярэй, і яна бачыць толькі яго.

— На лесвіцы пачула: спяваеш. Трэба крыху цішэй, бо не ўсім, як мне, падабаецца твой голас.— Маці распранаецца ў калідорчыку, і я чую, як шахціць яе плашч. Убачыла мяне — адразу насцярожылася: — Прабач, у цябе госці...

— Мы з Казімірам прыгадвалі школьныя гады, Вольга Мікітаўна,— кажу я, разумеючы, што трэба як мага хутчэй даць тлумачэнні нашаму застоллю.— Сёння паехаў на вучобу Віктар. Праводзілі яго...

— Сядзіце, сядзіце. Чаго ж вы падхапіліся?

У падазрона-насцярожаных вачах пад выгнутымі дужкамі броваў — адкрытая непрыязнасць; хуценькі позірк абабег стол; тонкія ноздры ўзбуджана ўздрыгваюць: прынюхваецца, ці пахне гарэлкаю. Вось гэтак жа глядзела яна на нас і летась. Непамысна, крыху смешна, але ў сэрцы няма крыўды на гэтую стомленую жанчыну: трывожыцца цяпер за сына, баіцца, каб хто не збіў яго з тропу...

Пачынаю развітвацца. Казімір ідзе са мною, і гэта вельмі не падабаецца маці; яна, аднак, нічога не гаворыць пра тое, а толькі з трывогаю глядзіць на сына.

— Не бойся, Казя, я буду чакаць...

Мы моўчкі ідзём па лесвіцы да берага. Казімір просіць мяне, і голас яго гучыць крыху глуха, як у Віктаравага бацькі на вакзале:

— Ты не крыўдуй на маму. Пасля таго, ведаеш, гэта ў яе хваравітая насцярожанасць. Сядзіш з кім за сталом, нават без бутэлькі... А ёй ужо вораг мроіцца... Цяпер, праўда, крыху менен. Мама ў мяне харошая. Яна ўсё разумее...

— Ты можаш разлічваць і на мяне. Заўжды.

— Ведаю. Таму і кажу...

Хочацца абняць Казіміра, нечым адразу аддзячыць, сказаць цёплыя і незвычайныя словы. А пачынаю чаўпсці нейкую непатрэбшчыну, пахваляюся, што, маўляў, трыганаметрыя ў мяне заўжды ішла лёгка, і я памагу яму з экзаменамі.

— Не трэба! — вельмі рэзка перапыняе мяне Казімір.— Усё зраблю сам. Я загадаў сабе, калі прыйшоў дамоў: сам! Сам станеш на ногі. Усё ў чалавеку залежыць ад яго самога, толькі ад яго! Гэта філасофія, вядома... Спатрэбіцца — папрашу! Табе я веру. Ну, бяжы, катэр зараз адваліць!..

На развітанне моўчкі рукаюся з Казімірам і сігаю з прычала на катэр. Казімір бяжыць па лесвіцы, на самай апошняй прыступачцы прыпыняецца і развітальна ўзнімае руку; у святле ліхтара, што вісіць над лесвіцаю, Казімірава постаць здаецца магутнай і вельмі шырокай.

За кармою катэра пеніцца ўзбунтаваная бліскуча-чорная вада; водбліск яе быццам закрывае бераг, дзе застаўся Казімір; наперадзе выразна акрэсленыя ў цемры асветленыя вокны дамоў. На мачце катэра гарыць ліхтар, у рудым яго святле споўдаюць белыя, з тонкімі празрыстымі крыламі, матылі; іх шмат, і здаецца, што круглае шкло ліхтара спавівае зімовая завіруха, круціцца, мяце сухою беллю...

— Пайшла-а мітулічка,— гаворыць мужчына, што сядзіць побач са мною.— Падуста цяперачкі пацяга-аем...

Споўдаюцца, круцяцца вакол запыленага ліхтара белыя і лёгкія, як сняжынкі, матылі. Мужчына ўсё гаворыць мне пра рыбалку, і я нешта адказваю яму, адказваю дзеля адчэпкі, каб маўчаць і думаць аб Казіміру. Вельмі блізкі і дарагі зрабіўся ён для мяне за гэты вось вечар... Упарты, настойлівы... «Усё зраблю сам...» Але чалавек не можа ўсё толькі сам. Не можа. Яму патрэбны сябры, напарнікі. І табе, Казімір, ніколі не прыйдзецца быць адна-му, гібець на адзіноце. У цябе ёсць сябар, і ты можаш заўжды разлічваць на яго. А ў суботу мы махнём з табою на рыбалку і будзем цягаць падусту, гэтую касцістую рыбу, з загнутым, як гарохавы струк на канцы, ротам і блі-

скучымі фіялетавымі вачыма... І з мамаю тваёй я пагавару, ёй няма чаго палохацца. Не, з ёю мне не трэба гаварыць. Гэта можа пакрыўдзіць яе. Яна хоча хутчэй забыцца па тое, што было, што адляцела ў нябыт, а я пачну вярэдзіць сэрца, варушыць старое... Што было, тое сплыло. Ёсць новае, добрае...

Катэр ужо на сярэдзіне Дзвіны. Агні горада схаваліся за таполямі прырэчнага парку. Уніззе па рацэ палаюць вогнішчы — рыбакі ловяць мітуліцу. Рыбацкіх чаўноў шмат, яны рухаюцца наволыіа, і полымя агнёў наблІжаецца, зноў аддаляецца, быццам згортваецца, потым палае ярка і матляецца над чаўнамі, як ласкуты трапяткой барвовай тканіны.

Павявае вецер, але цёплы і слабы; цяпер насярэдзіне ракі мітуліца ідзе густа, як сапраўдны снег; белыя матылі бясконца лятуць з ветрана-пахкай прорвы ночы, стукаюць у твар — лёгкія, мяккія і халодныя, як сапраўдныя сняжынкі, ападаюць на залачона-чорную ваду, узнімаюцца і зноў кладуцца, нібыта стомленыя, на грабяні пакатых хваляў. Вакол ліхтара густая белая завея, і таму святло, што падае за бортам на гонкую плынь, нярoўнае, хісткае, і здаецца, што там, за кармою, звіваецца і дрыжыць белая снегавая палоса, і яна бяжыць за катэрам і не можа ніяк яго дагнаць...

## 5

Я сумленна спрабаваў неракапаць Валю ў нягодах будучай рыбалкі: па радыё, маўляў, абяцалі дождж, вудзіць будзем да цёмнага і вернемся толькі ноччу. Дарэмныя спробы.

І вось мы едзем утраіх — арцель «марная праца», як Казімір ахрысціў нас. Наш лёгкі блакітна-зялёны човен плыве насярэдзіне Дзвіны. Горад даўно схаваўся за паваротам. Вакол нас зыркі бляск вады. На берагавых узвалах шэра-попельныя, ускудлачаныя ветрам лазнякі, і за імі, на блакіце неба, роўны зубчык прыдзвінскага бору.

Казімір майструе вуду «на сома», Валя вяслуе — яна вельмі добра можа рабіць гэта,— а я сяджу на карме і гляджу ў мяккую сінь бяздоннай высі над намі.

Самае прыгожае неба ў жніўні. Не ведаю, як у іншых месяцах, але ў нас над Дзвіною — у жніўні, і менавіта ў гэты вось час дня: спякота сышла, а з ёю і туманная пара, што звычайна вісіць жнівеньскім ранкам над дзвінскімі

берагамі; неба сіняе-сіняе, быццам толькі што памытае чыстай вадою, бліскучае, густое і блізкае; і чым болей ваглядзіш на яго, тым бліжэй і бліжэй здаецца яно, і усё вакол, нават паветра, пачынае сінець, і ад гэтай звонкай яснай сіні вада ў рацэ робіцца празрыстаю, далі наблізкаюцца і нізкія бярозкі, што растуць на ўзвалах за лазнякамі, нібыта тонуць і прападаюць у густой сінечы-смузе.

— Ну, сябры, гатова! Як?..

Казімір трасе тоўстым вудзільнам. Слаўная вуда, нічога не скажаш. Карычневы паплавок з кавалка сухой сасновай кары надзейны і трывалы — не патопе. Ля кручка струнка: тонкая, амаль зусім празрыстая — такую ў вадзе не адразу прыкмеціш.

А Валя здзіўляецца.

— Хто ж гэткі аграмадны кручок праглыне?

— Сом! Арцель мае заданне: злавіць вялізнага, як гэтае вясло. Гэтая вуда, Валя, спецыяльна табе. Задача ясная?

Жартуе Казімір ці гаворыць сур'ёзна?.. Валя спачатку глядзіць на тоўстае вудзільна, потым пераводзіць позірк на мяне і перастае грэбці. Човен паволі сунецца наперад. Вакол дрымотны спакой; звонка цурчыць вада, што сцякае з абабітых зялёных вёслаў.

— Ён жартуе,— кажу я Валі. Мне смешна бачыць яе разгублены твар.— Уся арцель ставіць перад сабою такую задачу. І будзем аптымістамі: зловім сома вялізнага, як гэтае вясло...

— А што ж рабіць з ім?

— Адправім на кансервавы завод... Але паколькі завод наш яшчэ не збудаваны, мы зловім меншага. І потым павінен папярэдзіць: надта вялікі сом нясмачны.

Я падтрымліваю жарт. Самае галоўнае, маўляў, каб ён змясціўся ў кацялку. Пры ўмове, вядома, што ёсць і сом і кацялок.

Казімір падхопліваецца, цягне з кармы рукзак і, намацаўшы праз брызент круглы бок кацялка, ляпае па ім даланёю.

— Яшчэ б крыху і — інфаркт. Падумалася: кацялок не ўзялі. Рыбак можа і перабольшыць, як і паляўнічы. Але забыць кацялок для юшкі!

— І з табою гэтага ніколі не было?

— Перабольшваў ці забываў? Прашу ўдакладніць...

— Другое,— смяецца Валя.— Вядома, другое...

Казімір уважліва аглядае паплавок, старанна чапляе кручок за вудзільна; у яго вачах ранейшы смяшок.

— Летась, памятаю, узяў спінінг — іду. Таксама ў жніўні. Шчупакі тады на белую блешню добра хапаліся. Бачу — вірок. І асака ля яго такая слаўная. Ну, думаю, ля асакі і навяду. Лап-лап па кішэнях... Авой ты, вой! Няма! Блешні, аказваецца, дома. Што рабіцьме? Прывязаў кручок, пачапіў хлеб з лоем, закінуў... І адразу ж: др-др... Аж звініць спінінг! І што ж вы думаеце? Кілаграмы тры галавень... Яшчэ закінуў, не паспеў і сесці — др-ррр!.. І што? Кілаграмы на чатыры галавень. Скоранька чапляю хлеб, закідваю. І — зноў...

— Др-рр! — Валя пляскае вяслом па вадзе,— пяць кілаграмаў рыбіна вісіць!

Пыркі ляцяць іскрыстым вясёлкавым дажджом; Казімір, баронячыся, махае рукамі, смяецца, але стаіць на сваім, не адступае:

— Табе — смех. А я потым узважыў: роўна пяць кілаграмаў! Зноў чапляю хлеб...

— І гэтак бясконца. Як у таго барона.

— Не, на пятым і скончылася. Пяць штук узапар. Каму скажу — рагочуць. Не вы першыя. Прывык ужо...

— Не верань?

— Ані,— Казімір не заўважае роблепай сур'ёзнасці Валінага пытання.

— Таму, што кажаш: хлеб быў з лоем. Лепей — хлеб з маслам...

— Лой жа быў, а не масла. Ды і якая, зрэшты, розніца? Калі масла, дык болей веры?

— Далікатнейшы харч. Лягчэй праглынеш...

У Казіміравых вачах, скіраваных на Валю, цень разгубленай сур'ёзнасці саступае месца шчыраму здзіўленню: губы ўздрыгваюць, і раптам, як выбух, рогат.

— Ну-уу, злавілі. І як? На голы кручок! Праўда, намаслены...

І Валя рагоча. І я не магу стрымацца — аж слёзы на вачах. Казімір абураецца:

— Чорны ручай недалёка, усю рыбу паразганяем...

Мы змаўкаем, калі Казімір адварочваецца і глядзіць на бераг, але варта яму зірнуць на Валю, як мяне душыць смех, і яна таксама рагоча, кідае вёслы на ваду і заціскае рот рукамі...

— Праўду кажу, цішэй трэба. Унька ручай,— просіць Казімір, але голас яго нястрогі — у ім чуваць смех.

Мы спыняемся ля Чорнага ручая, усцягваем човен на пясчаны бераг пад самыя вербалозы, што падступаюць тут да вады; за вербалозамі кучаравіцца па ўзвалу мядзяна-жоўты, быццам падсмажаны, арэшнік.

— Паслухайце, а чаму Чорны? — Валя цёпкае босымі нагамі па жоўтай касе, што намыў ручай.— Вада ж у ім чысцюткая.

Казімір не дае нам магчымасці абгаварыць гісторыю ручая.

— Бачыце, дзе сонца? Рыхтуйце паліва і бярыцеся за вуды — ля гэтых карчоў акуні ёсць. Пастаў, Лявон, донкі. І назбірайце арэхаў. А я — па сур'ёзную рыбу...

Ён не можа ўседзець на месцы: воддаль ад чоўна стаўляе вуду на сома, прыціскае вудзільна каменнем і, даўшы нам заданне зварыць юшку, хапаецца за спінінг і шнуруе па беразе.

Рыбацкая кроў таксама ходзіць і ва мне. Стаўлю донкі, закідваю з чоўна дзве верхаводкі. Ідзе час, а вузкія коркавыя паплаўкі нерухома ляжаць на вадзе за асакою.

— Лавіся, рыбка, малая і вялікая,— ціха просіць Валя.— А мы будзем рыхтаваць вогнішча.

Паліва на беразе поўна. Веснавая вада пакінула тут трэскі, карчэўе, кавалкі дошак і нават ладныя паленцы. За лета гэта ўсё добра падсохла. Можа, за якіх дзесяць мінут мы наскідалі цэлую груду, расчысцілі пад крывой лазіною пясчаную пляцоўку для вогнішча; гнуткія галіны навісаюць над ёю як дах. Месца ўвогуле вельмі здатнае: рака і супрацьлеглы бераг са стагамі сена і жоўтымі палосамі скошанага ржэўніку як на далоні. А галоўнае — добра відаць вуды і не трэба церабіць дарогі да чоўна — дажджы вымылі ў лёгкім пясчаным грунце добрыя прыступачкі.

— Цяпер трэба старацца, каб юшка была,— кажу я Валі.

— А збіраць арэхі? Было ж загадана.

Мы латашым арэшнік па крутых схілах ручая. Арэхаў тут шмат. Я гну галіны, Валя зрывае рудаватыя, усе ў касмылях, гронкі і кладзе іх у шапку; галіна, якую выпусціш з рук, падскоквае, выпростваючыся, суха шахціць калянным лісцем.

Урэшце шапка насыпана з каптуром. Я клічу Валю глядзець вуды. Яна жартуе:

— Там на кожнай па пяць кілаграмаў рыбіна...

— Ты не верыш у творчыя сілы нашай арцелі? Прызнавайся!

— Прызнаюся!

Валя кідае шапку з арэхамі ля сабранага на вогнішча ламачча і бяжыць да чоўна; я ледзь наспяваю за ёю.

На першай донцы — ладны акунь, цёмна-зялёны, з карычневымі палоскамі; на верхаводцы, якую цягне Валя, трапечацца плотка.

— Добры пачатак! Калі гэтак пойдзе і далей — юшка забяспечана хвацкая. Усе Казіміравы загады будуць выкананы.

— А чаму, Лёнь, гэтак нам шанцуе, ці ведаеш?

— Ты паверыла ў творчыя сілы арцелі.

— І чыстасардэчна прызнала памылкі... О-о... Яшчэ ў цябе. Акунь!

— Ён!

Рыба сапраўды бярэцца добра. За нейкую гадзіну выкідваю на бераг дзесятак акунькоў і аднаго добрага ляшча. У Валі ж чамусьці толькі плоткі ды печкуры. Потым клёў спыняецца, і я іду правяраць Казіміраву вуду, хоць патрэбы ў гэтым няма аніякай: здалёк відзён яе вялізны паплавок ля асакі. Тым не менш сумленна аглядаю вуду, нават кратаю лёску рукою і толькі потым вяртаюся да Валі.

Мы сядзім на чоўне. Сонца апусцілася зусім нізка, амаль чапляецца за стагі на тым беразе, і ўжо не яго промні, а водсвет зялёных вербалозаў кладзецца на ваду; плынь прыціснула паплаўкі да асакі, і на адным з іх прытулілася танюткая цёмна-сіняя страказа.

Валя чэрпае з ракі ваду, пералівае з далоні ў долонь.

— А хораша на рэчцы! Цяпер я разумею, чаго не хацелі мяне ўзяць з сабою. Эгаісты!

— Проста не ведалі, што ты рыбак першакласны. Дзе навучылася?

— Я ж казала табе: у бабулькі. І з касою нават магу. А якое там у іх азярцо! Рыбы-ы... Там гэтак не насядзіш — толькі наспявай выцягваць... Глядзі, якія рыбанькі малюпасенькія... Яны ж есці хочуць!

У вадзе ля чоўна мітусіцца чародка малькоў, і Валя кідае ім скарынку хлеба. Рыбкі рассыпаюцца веерам, потым варочаюцца на ранейшае месца, штурхаюць скарынку насамі, і вада вакол яе аж дрыжыць, нібыта ўскіпае на агні.

Недзе ўнізе — вельмі далёка — ледзьве чутна тарахціць матор, потым аціхае, і ў тым жа баку глуха вухкаюць выбухі; ва ўсе бакі пырскаюць малькі — спалохаліся.

— Спінінгіст наш ідзе. Толькі, здаецца, без рыбы...

Казімір — Валя першая заўважае яго — стомлена тупае па берагавой касе; пырскі адлятаюць ад ног, і над асакою вагаецца, плыве ўслед за ім кола вясёлкі; спыніўся ля вуды на сома, таксама, як і я, пакратаў лёску рукой і ідзе да нас.

Уловам нашым ён задаволены.

— Ого! Дык вы ж малайцы! Ёсцека юшка, а я бядую...

— Мы і ведалі — на твой спінінг надзея слабая...

— Не шанцуе. Чулі выбухі? Нейкі гад рыбу глушыць. З таго, мабыць, шчупакі і пахаваліся. Стаміўся, за імі лётаючы. Падайце, Валя, яблычка, рукзак да вас бліжэй... А сабе?.. За старанную працу вам трэба самае вялікае...— Казімір садзіцца на борт чоўна, чэпкае босай нагою мокры пясок.— Зараз надсілкуюся і — з новымі сіламі. Можа, вунька там, за асакою, пудовік мяне чакае. Я падыходжу, кідаю блешню, а ён яе — цоп! Валя, вы бачылі сома вагою на пуд?.. Э-ээ! Човен коціць сюды.

Паставіўшы далонь на бровы, ён глядзіць уніз па рацэ; адтуль, быццам прарваўшы нейкую заслону, коціцца строкат маторкі; яна хаваецца за павароткай, потым адразу вынырвае з-за асакі.

Казімір, махаючы рукамі, кідаецца да затокі, дзе стаіць вуда на сома.

— Куды гоніш! Вуды пашматаеш! Стоо-ой!..

Маторка, на збаўляючы хуткасці, ляціць усцяж асакі, мінае Казіміраву вуду ўжо, і раптам матор сціхае, човен кладзецца на борт, апісвае паўкруг; тады выразна чуваць гукі губнога гармоніка; хлопец, што сядзіць пры рулі, зрывае з галавы жоўты саламяны брыль, прыветна круціць ім у паветры.

— Зірні, Жора, хто страчае нас на пустынным брэгу Альбіёна! Казя! Здароў быў! Калумб вітае цябе!

Гармонік сціхае; над бортам маторкі ўзнімаецца кудлатая галава хлопца ў чырвонай кашулі; ён агледае бераг і, быццам не заўважаючы нас зусім, артыстычна ўзмахвае бліскучым гармонікам.

— Бачу зямлю, капітан! Права руля!..

Маторка, падмяўшы асаку, успаўзае на бераг; цяжкая хваля гулка б'е ў борт нашага чоўна; як ашалелыя скачуць паплаўкі, і левая, Валіна, вуда плёхаецца ў ваду.

— Мадам! У вас зваліласяя.— Жора паказвае гармонікам на вудзільна, што плавае ля чоўна, і зноў артыстычна ўзмахвае гармонікам.— Звалілася вуда дамы. А гэткія лбы — стаяць. Жах! Уключаем матор, мой дарагі капітан! Цяжка глядзець на гэтую некультурнасць!

— Як улоў, Казя? — весела пытаецца Калумб. Ён усё яшчэ сядзіць пры рулі.— Пакуль што я не бачу вашай рыбкі. Жора! Пакаж ім рыбу!

Жора леваю рукой узнімае вялізнага шчупака; патрымаў яго крыху, неахайна кінуў на дно маторкі і ўзняў яшчэ аднаго, крыху меншага.

— Бум! І — рыбка! Вось як трэба.— Калумб сігае з маторкі на бераг і выцірае рукі аб грудзі.— А яны — вудаю. І калі? У наш атамны час!..

Казімір змрочны; працягнутую руку ён не паціснуў. Я адчуваю набліжэнне небяспекі і вылязаю з чоўна.

— Значыцца, глушылі? — строга пытаецца Казімір.

— Казя, ты ж ніколі не быў пракурорам! Адкуль гэты тон?

— Глушыў рыбу?

— Зачароўваў. І нават не я, а вунь ён — сваім гармонікам. Але няўжо ў цябе няма лепшых слоў для старога сябра?

— Мы ніколі не былі сябрамі.

Я падыходжу да Казіміра, станаўлюся побач, гатовы абараняць яго. Калумб іранічна зыркае на мяне, смешна крывіць губы і ссоўвае брыль на патыліцу.

— Казя, Жора, відаць, казаў праўду: нам прыйдзецца пакінуць некультурны бераг...

— Гэта будзе самае лепшае.

— Ты хочаш сварыцца. А ў мяне няма настрою.— У голасе Калумба прабіваюцца ноткі жорсткасці.— Пару слоў табе мушу сказаць. Адыдзем...

Казімір маўчыць.

— Гаварыць не хочаш? Ці, можа, развучыўся?

— Што ж... Пайшлі!

Хачу ісці з Казімірам, але ён не дазваляе, і я падпарадкоўваюся, спынены трывожнай здагадкай: гэтыя хлопцы адтуль, з таго змрочнага міпулага. Намагаюся зразумець, пра што ідзе ў іх гаворка, але, хоць і стаяць яны непадалёк, не магу злавіць ніводнага слова.

Жора падкідвае на руцэ гармонік, усміхаецца Валі:

— І на якую, мадам, прынаду ловіце? Дазвольце паспытаць...

— А табе што? — Яго міралюбны топ прыводзіць мяне ў шаленства.

— Рыбак павінен быць ветлівы,— Жора прыгладжвае рукою пышную, жытнёвага колеру, чупрыну. Ён нават не глядзіць на мяне, быццам, апрача Валі і яго, нікога няма тут.— Рыба любіць ветлівасць. І музыку,— паднёс гармонік да губ, крыху пайграў і глядзіць на Валю нахабнымі блакітнымі вачыма.— Асабліва каптату. Пачуўшы яе, рыба свядома, з вялікім патрыятычным уздымам, шыбуе са дна ў човен...

— Мне здаецца, ты зараз адсюль пашыбуеш. І далёка!..

— Не трэба,— ціха просіць Казімір і сціскае мне руку. Я нават не пачуў, як ён падышоў.— Няхай едуць...

Калумб ужо ў маторцы, спрабуе адпіхнуцца вяслом, але яна ўрэзалася носам у бераг і не паддаецца.

— Памажы хоць тут, Казя!

Казімір моцна штурхае маторку; хлопец у брылі потырч ляціць на сядзенне.

— Ёсць яшчэ, Казя, порах у тваёй парахаўні! На тым тыдні Жора да цябе падскочыць...

— Дарэмны клопат. Сказаў жа!

— Падумай...

— Габлюй! — Казімір аблізвае губы і сплёўвае.

— Ты плюеш у калодзеж, Казя. Але я чалавек не зласлівы: жадаю поспеху... Адну рыбку вы злавілі ніштаватую. Глядзі, каб не засталася сіроткаю...

— Не пагражай!

— Да пабачэння!

Калумб развітальна круціць брылём над галавою і ўключае матор.

Раскідваючы белыя хвалі, маторка ляціць наперад і хутка знікае за павароткаю ракі.

Казімір змрочна глядзіць у той бок. У пагардлівай усмешцы сціснуліся губы, у вачах асеў нейкі роздум і смяшок — упершыню бачу яго такім; і тут жа, амаль імгненна, Казімір мяняецца, па-змоўніцку, але весела, падміргвае мне і дастае з бляшанкі бліскучую, вельмі падобную на верхаводку блешню.

— Рыбак ніколі не павінен губляць надзеі.

А я чакаю ад яго іншых тлумачэнняў, і ён гэта адчувае і дадае ціха:

— Я табе пра іх яшчэ раскажу,— і ўжо грамчэй, каб чула Валя: — Таварышы! Наша арцель не выконвае план

здабычы буйной рыбы! Прапаноўваю мабілізаваць усе наяўныя магчымасці! І — за працу!..

Нейкі час чуваць, як за вербалозамі ляскоча шпулька спінінга. Я сяджу на чоўне, гляджу на паплаўкі і думаю пра хлопцаў з маторкі. Казімір абяцаў расказаць пра іх. А што расказваць? Яны, безумоўна, адтуль, з таго мінулага, якое Казімір адкінуў ад сябе назаўжды. І, відаць, не варта варушыць яго зноў.

Пачысціўшы рыбу на юшку, Валя ідзе да ручая, бразгае там кацялком і нечакана кліча мяне ўсхваляваным і загадкавым шэптам. Азіраюся. Валі не відно зусім, толькі плечы вытыркаюцца над лістотай, і я бягу да яе.

— Глядзі,— гаворыць яна і нахіляецца над ручаём.— Бачыш?

— Што?

— Ды куды ты глядзіш? Сюды, на ваду трэба...

Валя нахіляе маю галаву да абымшэлых валуноў; у гушчар прабіваецца водсвет вячэрняга неба, і ад яго вада ў ручаі бліскучая і чорна-чорная; на ёй выразна, як бы ў люстэрку, акрэсліваюцца лісцінкі, нашы твары і кацялок у Валіных руках.

— А цяпер паглядзі! — Валя чэрпае ваду кацялком.— Што бачыш?

— Кацялок. І ў ім — вада...

— А якая? Зірні!..

Вада ў кацялку празрыстая, такая чыстая, што відаць кожную драпінку на алюмініевым дне — здаецца, кацялок зусім пусты; Валя вылівае ваду ў ручай, і яна знікае ў чорна-чорнай плыні, на якой дрыжаць адбіткі вострых зялёных лісцін, нашых рук і твараў.

— Таму Чорным ручай і завецца...

Валін голас гучыць урачыста, і тут я чую, як суха стукае вудзільна на борце чоўна. Рыба! Я крычу, што Валя малайчына, што зрабіла яна вялікае адкрыццё, і кідаюся як апантаны да чоўна. Здаля бачу, як варушыцца правае вудзільна, падлятаю... Р-раз!.. А на кручку маленькі акуньчык.

Валя стаіць на беразе за маёй спіною, пасмейваецца:

— Пакаранне за жорсткасць і няўвагу. Будзеш цяпер ведаць, як не прызнаваць геніяльныя адкрыцці...

У той жа момант — і Валя гэта бачыць!— выцягваю ладнага галавеньчыка, а крыху спагадзя ў мяне няма нават часу гаварыць з ёю: акуні бяруцца адзін за адным —

цёмна-зялёныя, з шырокімі карычневымі палосамі, і я ледзь наспяваю ўпраўляцца з вудамі.

Валя запальвае вогнішча; прыцiскаецца да асакі, перакульваецца за човен дым, паўзе нізка над плынню, і я адчуваю яго гаркавасць, і з гэтым адчуваннем прыходзіць трывога: нешта доўга не чуваць Казіміра. Але паклікаць яго не адважваюся — баюся напалохаць Валю. А яна і сама ўжо непакоіцца.

— А як што здарылася з ім? Няма і няма ўсё.

— Сом праглынуў.

— А ты не жартуй...

Вечаровае сонца схавалася за лес, але яшчэ не цёмна і неба над намі чыстае і сінявае, як апаўдні; нізкімі лёгкімі пірамідамі чарнеюць на супрацьлеглым беразе стагі, і вакол іх грувасціцца плыткая фіялетавая смуга. За асакою, ля самай вады, з тужлівым крыкам пранесліся кнігаўкі — яны прыляцелі з таго боку, куды пайшоў Казімір,— і трывога мая мацнее. Мне не хочацца, каб гэта прыкмеціла Валя, і я бяру вуду і кажу як мага весялей:

— Пайду пагляджу, дзе ён там. Мабыць, нацягаў шчупакоў, а падняць не можа...

— Хутчэй вяртайся,— просіць Валя.

— Даставай прыпасы. Я —мігам...

Праходжу адну паваротку, другую... Казіміра нідзе не відно, і я паскараю хаду. Вузкая сцяга дае нырца пад спляценні вербалозаў; прыгнуўшыся, перабягаю гэты зялёны тунель і адразу бачу Казіміра. Ён сядзіць на камяністай касе, што глыбока ўразаецца ў вялікую затоку; затока густа парасла жоўтымі гарлачыкамі. Падыходжу зусім блізка, а ён не чуе і сядзіць нерухома, падпіраючы сагнутай рукою падбародак; побач, на камяні, ляжыць спінінг; белая блешня сухая, нават кавалачкі водарасцей, што пачапляліся на яе, паспелі добра прасохнуць.

Пачуў крокі, павярнуў галаў у мой бок, але не ўзняўся і сядзіць у ранейшай паставе.

— А-аа, ты, Лявоне... Што там у вас?

— Акуні толькі. А ты каго злавіў?

— Нават закідаць ужо надакучыла. Быццам нешта завадзіла маім шчупакам сёння. Начыста пахаваліся...

Аднекуль здаля даносіцца слабы металёвы гуд. Казімір насцярожана прыслухоўваецца.

— Ці не маторка зноў?..

— Не, гэта машына. Тут жа гравейка непадалёк. На ёй і гудзе...

Слабы гуд машыны растае, ледзьве нарадзіўшыся; вакол зноў пануе цішыня.

— А мне здалося — зноў Калумб коціць,— са смяшком гаворыць Казімір.— Не думаў, што тут стрэнемся...

— Не падабаецца ён мне. Нейкі дужа піжоністы...

Казімір падкідвае на руцэ гладкі, адпаліраваны хвалямі каменьчык.

— Не тое, брацо, слова... Ён як гэты галяк — не схопіш...

— Але ж ты ўзяў!

— Тут — камень...

— А той, з гармонікам?

— Яго не ведаю.— Казімір узмахвае рукою, каменьчык са звонам коціцца па касе, падае ў ваду.— Здаецца, страчаліся... А дзе? Не магу прыгадаць...

— А з Калумбам?

— Сапраўднае яго прозвішча Вішнеўскі... Іван Вішнеўскі. Мяне толькі прывезлі тады... А яго тэрмін — другі па ліку — канчаўся. Паўгода там былі разам... Аднойчы ён шапарнуў: жадаеш, маўляў, сваім ліста наслаць? Пішы, без кантролю пойдзе... І я папаўся, як дурны акунь на блешню. Цяпер разумею, чаму тое здарылася... Але гэта цяпер... А тады карцела напісаць маці ўсю праўду пра тое, што перажыў, пра што думаў... І хацелася, каб яна ведала ўсё — мае намеры, жаданне пачынаць новае жыццё.— і каб ніхто не чытаў гэтай споведзі... Калумб слова стрымаў — яна палучыла мой ліст — і цяпер патрабуе ад мяне паслугу...

— Якую?

— Сам не ведаю, здагадваюся толькі. «Ты, Казя, павінен мне памагчы...» Я адразу адсёк: калі што-небудзь з цёмнага — не хачу! Старое закрэслена. І — кропка на гэтым!..

— А ён?

— Ты ж чуў! «Жора да цябе падскочыць...»

— Турні ты іх абодвух... Ведаеш куды?..

Хутка цямнее; стагі за ракой хаваюцца ў прыцемках, супрацьлеглы бераг наблізіўся; непадалёк ад касы зноў гучна б'е па вадзе буйная рыба. Казімір ківае ў той бок галавою, гаворыць з вясёлым шкадаваннем у голасе:

— Ну, глядзі! Цялёпкаецца і цялёпкаецца. А на спінінг — каб табе адна...

— Жэрах, відаць. Трэба «дэвон» паставіць...

— Няма ў мяне.

— Паслухай, Казік, а ты ўсё ж турні іх.

— А што далей? Калумб прыехаў не адзін у горад. Вакол яго — цэлая хеўра. Нешта яны замысlілі...

— Тады неабходна ісці куды след і сказаць!

Казімір моўчкі перабірае блешні — яны пазвоньваюць, і кручкі шкрабаюць тонкую бляшанку; потым прыслухоўваецца да цялёпкання рыбы ў трысці, узнімаецца.

— Пайсці і сказаць... А што? «Прыехаў Калумб. Арыштуйце яго...» А там, можа, і без мяне ведаюць што ён тут. I хіба няма ў яго права прыехаць? Адбыў тэрмін — вольны грамадзянін. Можа, працуе нават дзе... Неабходны факты, дарагі Лявон.

— А рыба? Яны ж глушылі.

— Нашы здагадкі. Трэба злавіць за руку... Цікава, калі ж ён з'явіўся ў нашым горадзе? Мабыць, нядаўна... Не страчаліся ж дагэтуль...

— Ва ўсім, што намысліш, я памагу табе. Май гэта на ўвазе.

— Дзякуй... Адзін я ўлез туды, адзін і разблытаюся...

Казімір па-сапраўднаму ўдзячны мне. Я бачу гэта, але па звужаных вачах, у якіх тоіцца злосны смяшок, па нядобра скрыўленых і моцна сцятых губах адчуваю, што ён не збіраецца раскрываць свае планы.

За лазнякамі, зусім блізка, гучыць здзіўлены воклік, і я адразу ж яго пазнаю.

— Валя!.. Бягом туды!..

Крык, цяпер неяк сцішаны, хрыплы, быццам прыдушаны, чуецца зноў, і мне мроіцца бяда — вярнуўся Калумб.

З усіх сіл кідаемся нацянькі, праз лазнякі. Халодныя легнуткія галіны хвошчуць твар, вуда мая зачапілася; левую ступню апякае гарачы боль. Але я не спыняюся, каб паглядзець, корч ці шкло трапіла пад нагу, злосна тузаю вуду і чую, як з трэскам зламалася вудзільна; з абломкам бамбуку ў руцэ вылятаю з лазнякоў на затравелую сцежку.

Валі на чоўне няма, яна стаіць непадалёк ад яго, ля асакі, па калена ў вадзе.

— Што здарылася? — крычыць Казімір, які ўрэшце дагнаў мяне.

— Вуда! Вуда! Нехта пацягнуў вуду. Пляскала, пляскала вудзільна па вадзе... Пакуль падбегла — няма. Паплыло. Унька яно...

Дурны смех апаноўвае мяне. Акунь, мабыць, узяўся, а мы несліся як апантаныя змагацца з нейкімі бандытамі, ратаваць Валю ад бяды... Саджуся на мяккі халодны пясок і падгінаю левую нагу. Пад вялікім пальцам чырвоная пляма крыві, я выціраю яе лісцінкаю. Здаецца, нічога страшнага няма: ранка зусім маленькая.

— Лёнька, хутчэй! — Казімір абмінае мяне, падлятае да чоўна, скідвае вуды на асаку і ставіць вёслы.— Вуду сом пацёг!

Напраўды, тая вуда паплыла. Накульгваючы, бягу да Казіміра, памагаю спіхнуць човен і саджуся на вёслы. Але ў гэты час вудзільна знікае пад вадою, і я не ведаю, куды веславаць. Казімір, стоячы, аглядае раку.

— Во, халера, пацягнуў на дно, мабыць. Глыбока тут дужа...

— Унька, унька! — гукае нам з берага Валя.— Правей! Правей ад вас!

— Лявон! Управа!

Тоўсты канец вудзільна я цяпер добра бачу. Націскаю на вёслы з такою сілаю, што рыпяць, стогнуць жагялі і вада вуркоча за кармою. Вось вуда зусім побач. Можна дацягнуцца рукою...

— Стой, сушы вёслы! Не грабі, кажу! — Казімір нахіляецца, бярэ вудзільна ў руку і зноў кідае яго на ваду.— Сом, вядома! У-ух і смаргануў! Пудовік! Я ж казаў!..

— Чаго кінуў? Валачы ў човен!..

— Не, не... Няхай пацягае, няхай прытоміцца. А тады мы яго і ўхопім...

Нейкі час вяслую ўпоравень з вудзільнам; тоўсты канец яго то знікае пад вадою, то зноў вынырвае і сунецца наперад вельмі хутка, разразаючы спакойную плынь.

— Трэба яго да берага ціснуць,— раю я Казіміру.— А то завалачэ ў якую пару — не выцягнеш потым...

— Зараз, зараз... Не спяшайся. Як толькі вазьму вудзільна, ты адразу на тую касу гані, дзе асакі няма... Бачыш? Толькі не націскай... Ціха, ціха... Не абганяй. На пясок яго павалачом...

Я ганю човен услед за канцом вуды; вудзільна спыняецца, і Казімір, схапіўшы яго, крычыць на ўвесь голас:

— На касу гані! Гані цяперака!

Міг —і човен ля берага. Казімір вылятае на пясчаную водмель і шпарка, павярнуўшыся тварам да ракі, шнуруе на пакаты мурог; вудзільна гнецца, лёска са свістам рэжа ваду. Урэшце пад берагам, там, дзе канчаецца лёска, з ва-

ды вытыркаецца штосьці вялізнае, жоўта-зялёнае, і з маіх грудзей ірвецца пераможны воклič:
— Шчупак! Шчупак! А здаро-овы!..
— Заходзь у ваду! У ваду, кажу, заходзь! Ад глыбі адразай! Не пускай на глыб! Павернс на глыб — прапала!..
Рыбіна — вялізная, цяжкая — малоціць хвастом, і вада пад берагам кіпіць, як у кацялку; ляцяць уверх пырскі і водарасці.
Казімір хоча выцягнуць рыбіну на сухое, але не можа саўладаць з ёю, цягне з усяе моцы і раптам падае: я чую, як са звонам, цвенькнуўшы, вылятае з вады пусты кручок, і тут жа вушы мне б'е шалёны крык:
— Трыма-аай! Трымай! Трымай яго, Лё-онька!..
Расставіўшы рукі, з разгону кідаюся жыватом на пеннае рудое мелкаводдзе. Нага балюча стукаецца аб нешта цвёрдае, і ў той жа міг адчуваю пад грудзямі пругкі тоўсты жмут; ён варочаецца, выслізгвае, але я ціспу яго жыватом і лакцямі на дно.
На помач імчыцца Казімір і, не спыняючыся, бухае з берага ў раку; вада залівае мне твар; заплюшчваю вочы; побач, засопшыся, дыхае мой сябар.
— С-схапіў, здаецца, за жабры... Сом! Лёнька, сом! Стой! Адпусці крыху!.. Ну, пацягнулі!
Прыгнуўшыся, ён валачэ рыбіну на бераг. Хачу дапамагчы яму, але вузкі доўгі хвост выслізгвае з рук і моцна і балюча ляпае па твары. Спыняюся, праціраю вочы і, калі магу зірнуць, бачу на мурожнай траве вялізнага, болей як у метр даўжынёю, сома.
— Ну, як здабыча, Лявонка? Ты толькі зірні, які прыгажун! Пудовы, калі не больш!
Сом хвошча шырокім цёмна-зялёным хвастом па траве; з кожным разам удары робяцца ўсё марудней, і, урэшце, трапыхнуўшыся ў апошні раз, ён заціхае і ляжыць, выставіўшы жоўтае, як масла, круглае падбрушша. Мабыць, сапраўды вагою на пуд будзе.
— А што я табе казаў? — Казіміраў голас дрыжыць ад хвалявання, і вочы радасна зіхацяць.— Пакуль ёсць вада — рыбак не павінен губляць надзеі!
— Добрая была б надзея, каб я не рынуўся на яго. І жыватом не прыціснуў.
— А я быў думаў — уцёк. Траха на цябе не ўскочыў, як з берага матнуў. Давай пахвалімся...
Мы ўзнімаем сома і, перш чым несці яго ў човен, трымаем на руках — паказваем. Валя стаіць ля вогнішча і

махае пам рукамі, патрабуе ехаць, і яе голас добра чуваць на гэтым беразе.

Казімір садзіцца на вёслы. Мне дужа баліць калена, ные палец, і я апускаю нагу за борт чоўна; ад халоднай вады боль крыху сцішаецца.

А Казімір, здаецца, нічога не бачыць, апроч сома. Ён часта перастае грэбці, узнімае вёслы над вадою і любуецца нашай здабычаю.

— А вусы якія, вусы! Толькі зірні, Лёнька!..

Вусы тонкія, чорныя — нічога здзіўляючага ў іх не бачу. Але расчароўваць сябра мне не хочацца, і мне робіцца весела ад яго захаплення, і ўсё бліжэй бераг, дзе стаіць Валя, і ўсё менш і менш баліць калена, і боль у пальцы пакрысе знікае.

Валя страчае нас віншаваннямі, але баіцца нават дакрануцца да сома, паглядае зводдалі.

— Страшыдла! Ніколі такога і не бачыла. І як вы яго выцягнулі?!.

Тут ужо мы не шкадуем фарбаў. Як выцягнулі? Найскладанейшая задача — такога сома злавіць. Але —умельства! Але — смеласць! Але — рашучасць! Але — традыцыі арцелі!

— Ды хопіць! Хопіць баек! Вы паглядзіце, якія ў вас кашулі! Скідайце! Я іх памыю!..

Казімір, пратэстуючы, выстаўляе далоні перад сабою.

— Ні, ні! Жаночая рука, кажуць, можа змыць рыбацкую ўдачу...

— Яны вераць у такую лухту!

Ніхто, вядома, не верыць. Жарт. Але, калі зірнуць аб'ектыўна, дык кашулі не такія ўжо і брудныя — крыху запаласкаць толькі. Але Валя няўмольная, і мы, крыху адышоўшыся, пачынаем мыць кашулі. Дакладней, мые толькі Казімір — і гэта лоўка атрымліваецца ў яго,— а я абціраю водарасці і крыху замываю каўнер — са спіны кашуля ў мяне сухая амаль.

— Хопіць. Гайда! — кажу я Казіміру.

Дрыжучы ад холаду, вылазім з вады. Цяпер да агню — сушыцца. Не шкадуючы, валім на вогнішча карчэўе.

Полымя шугае, матляе галіны старой лазіны, пабітай крыгамі ў вясновую паводку; на вуголлі булькоча ў кацялку акунёвая юшка; смачны пах казыча ноздры.

Казімір то прысядзе на самае полымя, то павернецца бокам, то, як сцягам, размахвае кашуляю; ад штаноў ва-

ліць белая пара, і гэтая пара і дым ляцяць на мяне; целу горача, і я адсоўваюся ад вогнішча.

— Цішэй! Закапціў мяне гладка...

— Затое спаць будзеш сладка. О! Са спіны твая зусім падсохла.

— Там сухая і была.

— Вядома што! Ты як па сома лёг, дык зверху кашуля ад страху дымела... Лоўка ты яго прыціснуў. А я быў думаў — збегла рыбка. Аж на слёзы на вочы...

Валя збірае вячэру, і тонкія рукі яе лоўка і прыгожа палётаюць над зялёным квадратам плашч-палаткі. Ужо накроены хлеб, раскладзены яйкі, адкрыта шклянка з маслам, тлуста паблісквающь доўгія скрылікі вяндліны; памідоры ў водбліскаx агню здаюцца ненатуральна барвовымі. Гляджу на ўвесь гэты апетытны харч і глытаю сліну — вельмі хочацца есці.

— Ну, арцельшчыкі, калі ласка.— Голас у Валі жартаўлівы, і ў той жа час ёсць у ім крышачку ўладарнай строгасці гаспадыні.— Мылі рукі?.. Ды што гэта я пытаюся — толькі ж з вады вылезлі. Сядайце...

За вячэраю болей за ўсё гаворкі — сом: жартуем з таго, як спалохалася Валя, калі вуда паплыла на сярэдзіну ракі, як бухнуўся я ў раку і сігануў у ваду Казімір. Заўважаю: Валя болей гаворыць з Казімірам, уважней глядзіць яго і часцей, чым мяне, просіць есці, і гэта не дае спакою. І тое, што са мною робіцца, дзіўна. Нібыта рэўнасць якая... Але да каго?.. Да Казіміра? Смешна... І тым не менш у паводзінах Казіміра, ва ўсіх яго словах і жартах я спрабую нешта адшукаць, намагаюся прыкмеціць невядомае мне самому.

А ён, як тады на чоўне, нічога гэтага не бачыць, дзьмухае на лыжку і сёрбае юшку.

— У-ууух, смаката! Толькі гарачая дужа... Ну, прызнайся, Лявоне, еў ты калі-небудзь такое?.. А пах!

— Юшка атрымалася...

— І гэта ўсё? — абураецца Казімір.— Ды гэтай юшцы роўнай няма і не было ва ўсім свеце! А чаму? Валя зварыла!

Валя расчуленая, нават збянтэжаная; вочы бліскучыя, радасныя; смяецца, пачынае апраўдвацца, спрачаецца з Казімірам. А ва мне —непамысная сць, як хваля: хацеў жа і не ўхваліў юшку. Мне ўвогуле заўжды быццам цяжка ўхваліць усё тое, што робіць Валя, я вельмі часта саромеюся прызнаць правільнасць яе меркаванняў. Эгаізм, ві-

даць, гэта, не вельмі разумная ўлюбёнасць у высокую годнасць сваёй асобы, дурная пыха... Казімір тое адразу прыкмеціў і бязлітасна абсмяяў.

Ужо зусім звечарэла; водбліскі полымя азараюць блізкія лазнякі; залатым бляскам зіхаціць пясок, густа стоўчаны нашымі нагамі, і сляды на ім ненатуральна глыбокія і вялікія, і ў іх загадкава варушацца дрыготкія і мітуслівыя цені. А за цёплым колам святла стаілася насцярожаная прахалода ночы і рака — чорная, бясконца шырокая, таямнічая і велічная ў сваёй маўклівасці.

За вербалозамі, здаецца, ля самага нашага чоўна, моцна вухае хвастом па вадзе нейкая рыбіна; гук глухі і кароткі, быццам бэхнулі драўляным пранікам па скрутку мокрай бялізны.

— Сом! — Я падхопліваюся, узрадаваны магчымасцю зноў гаварыць пра нашу рыбацкую ўдачу.— Добра ён прывязаны там?.. Каб не ўцёк часам...

— А я быў думаў, што забыўся ты на яго зусім...

— Сёння ты часта надта думаеш замест мяне. Табе не трудна?..

Казімір быццам і не прыкмячае мае іроніі.

— Зараз прынясу вады — чай згатуем. І на яго зірну. Спіць ён, павер мне, пасля тваіх абдымкаў, моцна...

— Ён прынясе ваду! Чуеш, Лёнік, марш па ваду!

— Няхай сядзіць. Мне і вуду трэба паглядзець...

Казімір бярэ ў руку пусты кацялок. Мы застаемся ля вогнішча з Валяй. Яна сядзіць на той бок агню і глядзіць на хвастатае дымнае полымя. Сіні вялізны корч, што добра выгараў насярэдзіне, сіпіць, на канцах яго клубіцца белая пена; па краях вогнішча атухае буйное чырвонае вуголле, а ў сярэдзіне патрэсквае нешта, полымя трапечацца, адкідвае лёгкія сінявыя скруткі; дым імпэтна, нібы хто цягне яго, узвіваецца над гнуткімі шархоткімі лазнякамі і знікае бясследна ў блізкай зусім цемры.

Невядомая дагэтуль пяшчота, нязнаная раней ласкавасць скавала мяне, і я нічога не магу сказаць, нават баюся паварушыцца, а толькі гляджу на Валю, слухаю, як сіпіць стары корч і як гулка стукае ў грудзях маё сэрца. Валя таксама нічога не гаворыць, а толькі доўга і ўважна ўглядаецца, і я бачу ў яе вачах — вялікіх, бліскучых, поўных невыразнай задумы — водбліскі гарачага і трапяткога агню.

Я кахаю!

Я кахаю цябе, Валя!

Гэтыя словы гаворыць сэрца. Гаворыць толькі мне, але я адразу заўважаю, што Валя быццам падслухала не іх, а нешта зусім іншае: невыразная задума знікае з яе твару, вочы робяцца строгія і непрыветныя.

— І табе не сорамна?

— Не, Валюшка! Ніколькі. Я магу глядзець вось так і глядзець на цябе хоць да раніцы...

Валя ўздыхае.

— Шчаслівчык! Сам рассеўся панічом, а Казіка турнуў у цемень. Цяжка было пайсці?

— Табе хацелася пасядзець з ім?

— Дзівак! Мы ж з табою ўдваіх. А ён адзін.

Раптоўнае абурэнне, не паспеўшы яшчэ і выкрышталізавацца як след, расплываецца, саступае месца новай ласкавасці да Валі. Яна малайчына. Сапраўды, мы з ёю ўдваіх, мы як гаспадары. А ёсць трэці чалавек, ёсць наш сябар, і мы павінны памятаць гэта.

Я падхопліваюся.

— Ка-азі-ік! Дзе ты-ыы?

Мой вокліч коціцца над вадою, і рэха адгукаецца ўводдалі, плыве над санлівай ракою, варочаецца да мяне і нібыта рассоўвае кола святла вакол нашага вогнішча.

— Іду-уу! — далятае з-за лазнякоў.

Шастае голле, брэнькае кацялок — варочаецца Казімір. Ступаю яму насустрач.

— Ну, як там?..

— Спіць, Лёня, сом. А на вудах пуста. Праверыў і зноў закінуў...

— Трэба, мабыць, і дамоў збірацца...

— А чай? Я зараз ажыны назбіраю. Валя! Піла чай з ажынаю?

— Ніколі...

— Бачыш! А ты — дамоў!..

Казімір лезе ў лазнякі, шастае там голлем і ўрэшце выходзіць да вогнішча з поўнай прыгаршчаю чорных буйных ягад. Калі вада закіпіць, іх трэба кінуць у кацялок, крыху счакаць. Чай будзе духмяны незвычайна.

Мы сядзім і чакаем, і вагаюцца, дрыжаць кволыя цені на пяску, і сунуцца, абмінаюць нас дрымотныя шолахі ночы: зноў глуха і мякка плёхнула ў рацэ рыбіна; ледзь чутна патрэсквае ўгрэтая полымем лістота старой лазіны; няясныя ціхія гукі выплываюць з блізкіх лазнякоў — гэта, мабыць, вагаецца патрывожанае Казімірам гнуткае і тонкае голле; цененька-цененька звініць кацялок, і на ваду

ў ім кладзецца лёгкі белы дым, і вада цямнее, потым, калі дым сплывае, зноў блішчыць, як люстра,— у ім адбіваецца чырвонае полымя, дрыготкія дымныя скруткі і Валін твар.

Пра што цяпер думае Валя?

Ведаю: спытай — не адкажа. Але я спытаю пазней, абавязкова спытаю, калі мы прыедзем у горад і застанемся адны...

А Казімір?

Утаропіўся на чырвонае вуголле, бестурботна насвіствае, час ад часу пасміхаецца. Але гэтая вонкавая бесклапотнасць вельмі ж не стасуецца з трывожнай мелодыяй песні пра «бярозы ды сосны».

Ноч...

Сaплівая рака...

І трывожная мелодыя, якую насвіствае Казімір, абуджае вірлівую плынь думак і ўспамінаў, і мне ўжо болей не здаецца, што гарачае кола агню адгарадзіла, адсунула клопат і трывогу. Магчыма, у такую вось цёплую, ціхую ноч, у тым прыдзвінскім лесе, што прапаў цяпер у цемры за ракою, сядзеў ля партызанскага вогнішча мой бацька... Аб чым ён думаў тады?..

Пра тыя думкі я не даведаюся ніколі: яны спяць разам з бацькам у кургане ля бабыніцкага возера...

## 6

Прарэзліва звоніць кран. Тросы, як нітачкі, лопаюцца якраз у той момант, калі блок плыве над маёй галавой і белая аграмада, бліснуўшы роўнымі гранямі, валіцца на мяне, але я нейкім цудам паспяваю адскочыць, і блок з разгону стукае ў сцяну, якую мы толькі што ўзвялі, і яна хістаецца ад гэтага ўдару, потым марудна-марудна хіліцца і рассыпаецца. Ніякага грукату, ніякага трэску. Толькі прарэзліва сігналіць, звоніць кран. Гэты звон прыгінае мяне, і я, крыху адбегшыся, стаю і гляджу, як вакол грувасцяцца на зямлі лёгкія, быццам дзіцячыя цацкі, белыя блокі.

А неба нада мною чорнае, і з гэтай чорнай высі — бязлітасны, але вельмі ж знаёмы голас:

— Уставай! Уставай! Чуеш?..

Барыс? Разумею гэта і ў той жа міг адчуваю грань, што падзяляе сон і рэальнасць. Расплюшчваю вочы. Так, Барыс...

Нахіліўшыся над маім ложкам, ён совае мне над вуха бліскучы будзільнік, які аж захліпаецца ад звону.

— Ты што, звар'яцеў?

Стукаю кулаком па чырвонай кнопцы будзільніка, і ён змаўкае. Выцягнуўшы рукі за галаў, пераказваю Барысу свой сон: як рассыпалася сцяна, як я стаяў пад ёю...

— Ён стаяў! Чуеце? — Барысаў позірк поўны сарказму.— Ты паляжы яшчэ гадзіну, дык і не тое сасніцца. Чакаю тры хвіліны. І ніводнай кроплі больш...

— Скажы, ты ўчора дапісаў раздзел? — Я спрабую неяк выгадаць крышачку часу: уставаць не хочацца — ва ўсім целе сапліва́сць і лянота.

— Не. Зусім нечакана, я ў тупіку. Сюжэт развальваецца...

Здаецца, мая хітрасць не заўважана і ўдасца паляжаць яшчэ якую хвілінку. Але трэба замацаваць поспех...

— А ў мяне ёсць бліскучая ідэя. Наконт сюжэта...

Гэта — хлусня, ніякай ідэі ў мяне няма: кажу ўсё знарок, каб толькі не маўчаць.

— Што, новы фіціль? — Барыс адгукаецца адразу, але ў голасе падазронасць.

— Чаму? Учора на рацэ выпадак быў. Скажы, герой твой любіць лавіць рабу?

— Не ведаю.

— Не ведаеш? І гэта гаворыць чалавек, які марыць стаць пісьменнікам. Твой Іван...

— Мікола,— папраўляе адразу ж Барыс.

— Добра, няхай Мікола. Дык вось... Ён едзе лавіць рыбу. З дзяўчынай. На дзяўчыну напалі бандыты. Утрох. А ён адзін. І не разгубіўся. Бах — аднаго! Бах — другога! Усіх наскідаў у ваду! Лоўка?

— Плагіят. Гэтак білі ўжо аднаго пыхлівага гімназіста. Хаця, чакай... Рыбалка?.. Гэта мне падабаецца. Рака... Ноч... І зусім не патрэбны бандыты. Можа, напрыклад, клюне вялізная рыба, пацягне вуду, дзяўчына кінецца за ёю. А там віры...

— Барыс! Ты геній! У нас сапраўды ўчора сом павалок вуду. І ведаеш, які? Больш метра даўжынёю! Ля самага берага ён — хлоп! — сарваўся з кручка. Я на яго. Паспеў схапіць...

А коўдру схапіць не паспяваю — Барыс зрывае яе. Болей, вядома, не ўдасца выйграць ніводнай хвілінкі. Трэба апранацца. Трэба яшчэ паехаць паснедаць у кафэ.

На вуліцы Барыс увесь час бурчыць, дакарае:

— Ну зусім жа неарганізаваны чалавек. Скажы, цяжка ўстаць на паўгадзіны раней, зрабіць зарадку, спакойна памыцца, памалу ісці снедаць?..

— А я вінаваты? Спіцца, ведаеш, як пасля Дзвіны... І гэты смешны сон...

— Не прызнаю сноў. Толькі дысцыпліна і жалезны распарадак ва ўсім...

— Барыс, я пачынаю сумнявацца.

— У чым?

— У тваіх літаратурных здольнасцях. Людзям творчым уласціва неарганізаванасць, няўважлівасць...

— Лухта! Джэка Лондана ты, мабыць, усё ж лічыш талентам. Праўда?.. Дык вось... Ён пачынаў дзень з напісання сваёй славутай тысячы слоў. І гэта быў непахісны парадак... Дысцыпліна неабходна, увогуле, кожнаму, хто хоча нешта зрабіць у жыцці. Патрэбнае не толькі сабе, але і людзям...

Цяжка і небяспечна перапыняць Барыса, калі ён пачынае гаварыць пра свайго любімага пісьменніка. Тут трэба адно: слухаць. А мне хочацца спяваць і жартаваць. Пры гэткім настроі вельмі цяжка глядзець спакойна на твар Барыса — пахмурна-строгі і сур'ёзны. Мне заўсёды не падабаліся ягоныя кніжныя разважанні і патэтыка. А сёння асабліва. Мастак ён павучаць... Але я ведаю: хаваецца за гэтым натура высакародная, чулая і шчодрая.

У кафэ Барыс па-ранейшаму пахмурны, змрочна і часта пазірае на гадзіннік. А кава на снядапак добрая, і булачкі нават яшчэ цёплыя ад печы, і шчодры сонечны бляск за акном, і настрой у мяне вясёлы, і я цяпер ужо свядома пазаляю свайму сябру.

— Паслухай, Барысе, ты, бачу, не паверыў у нашага сома?

— Застаецца дванаццаць хвілін. Разумееш? Ці, можа, ты чакаеш, пакуль падсмажаць яго?

— Ён будзе засмажаны па вячэру. І я запрашаю цябе пакаштаваць самяцінкі.

— Баюся, мне і хваста не дастанецца...

— Самыя далікатныя, самыя смачныя кавалкі — табе!

— Не люблю смажанай рыбы. Каб мяккі соус...

— Будзе і соус!

— Ты што, не жартуеш?

— Запісана: вячэраем разам.

У маім голасе і паспешлівасці, з якой я працягваю руку, мабыць, ёсць нешта тэатральнае і несапраўднае.

— Хо-хо-хо! Ну, майстра ты на фіцілі. Люблю!..

Рагоча. Яўна не хоча верыць. Абсмейвае нашага сома, што сапраўды ў даўжыню болей як метр. Сома, якога цяжка несці аднаму чалавеку.

Пакрыўджаны рыбацкі гонар бурліць ва мне.

— Не верыш, значыцца?.. Добра ж, калі ты гэтак...

Іранічная ўсмешка дрыжыць у куточках яговых губ.

— Ахвотна. Ахвотна веру...

І гэта конча ўзрывае, і я з пагрозаю абяцаю:

— Памятай! Ніводнай цаглінкі не пакладу ў твае сюжэты. Ты абудзіў ва мне Сальеры!..

Мы выходзім з кафэ. Гамангівымі чародкамі дзеці спяшаюцца ў школу — яе будынак на тым баку вуліцы: за старымі таполямі на школьным двары стракацяць белыя фартушкі і чырвоныя гальштукі, і няспынная дзіцячая гамана плыве адтуль.

— Барыс! Першае ж верасня!..

Я сапраўды толькі цяпер прыгадаў, што сёння ў школах пачынаюцца заняткі. І вось што дзіўна: першага верасня звычайна бывае сонечны ранак. Заўжды чысты, прыгожы ранак. Абавязкова сонечны. Магчыма, гэта і не зусім так. Але я асабіста не памятаю з свайго школьнага жыцця ніводнага хмарнага першага верасня.

Барыс прыпыняецца, узрушаны, у яго вачах захапленне, але ён як бы і не заўважае мяне — уся ягоная ўвага скіравана на дзяцей, што гамоняць па школьным двары, і думкі яго не тут, не са мною, а там, пад дрэвамі, якія ўжо кранула нясмелымі фарбамі блізкая восень.

— Гэта ж цудоўная мастацкая дэталь! Першае верасня можа быць змрочнае, дажджлівае... Але чалавек помніць іншае. Радасць... Толькі радасць, і таму думае, што кожны той дзень — сонечны, светлы... Мне спатрэбіцца яна...

— Бяры,— велікадушна дазваляю я.— У мяне іх поўна. Магу табе штодня даваць добры тузін дэталяў і сюжэт новага рамана. Я і сам мог напісаць, але вольнага часу бракуе. Вось, калі ласка... Ён яе кахае. І яна яго кахае... Што, не падабаецца? Ах, праўда, ты ж цяпер над гэткім і працуеш...

— Ведаеш, хто смяецца апошнім?

— Бачыў нават на сцэне... І таму хочацца смяяцца і заспяваць... Барыс! Ёсць новая мастацкая дэталь. Песня і лазня!..

— Пакінь.

— Разумею... Ты не любіш пісаць пра рэчы надта зямныя. Лазня? Хфі-і...

— Лявон! Наш аўтобус...

Едзем, стоячы ля задніх дзвярэй аўтобуса. Барыс не хоча, але змушаны слухаць пра выпадак у лазні. У нарылцы сядзелі ў чаканні аматары з венікамі. У дзверы зазірнуў дзядок, што глядзіць і адмыкае шафкі: «Мірончык хто тут?» Паглядзелі адзін на аднаго: няма такога. А потым агледзеліся: спіць нехта на верхняй паліцы. Немалады ўжо з выгляду. Паштурхалі яго: «Ты Мірончык?» Ён, аказваецца. Ну і пасеў на яго дзядок. Жонка, маўляў, тамка крыкам заходзіцца: пайшоў ранкам чалавек у лазню і прапаў, а яму няможна парыцца, бо сэрца слабое... «Маё сэрца слабое? — Мірончык бух кулаком сабе ў грудзі.— У касманаўты з маім сэрцам можна. А жонка няхай пачакае: напаруся як след і пайду!..»

Сказаў, галаву — на венік і спіць. Тады толькі заўважылі: на добрым падпітку чалавек. Дзядок пайшоў і пераказаў усё жонцы. І вось адчыняюцца дзверы, і ўлятае ў парылку яна. Зграбная такая кабета. Усе, як па камандзе, венікі наперад, прыкрыліся. Умомант яна таго Міронычыка — за руку і павяла. А ён парыльшчыкаў моліцьупрошвае:

— Хлопцы! Ударым харошую песню! Га? Грымнем усёю лазняй!..

З віскатам адчыняюцца дзверы аўтобуса, мы саскакваем на дол. Чакаю ад Барыса ўхвалення. Хіба ж не цікавая гісторыя?

— Звычайная. І вельмі банальная.

— Сам ты банальны.— Раўнадушша Барыса абурае мяне.— А ты зірні з другога боку. Мужнасць! Пляваць яна хацела на тое, што нехта пра яе там скажа: ах, банальна... Яна ішла ратаваць чалавека.

— П'янчугу! Яго трэба было аддубасіць там венікамі як след...

— І ты б дубасіў?

— З ахвотаю.

— Не хачу быць прарокам... Але намяні: калі будзеш сарамліва адварочвацца ад праўды жыцця, тваю кнігу наўрад ці возьмецца хто чытаць.

— Урэшце прызнаў: кніга будзе напісана!

Вось ён гэтак амаль заўжды: з вельмі важнага можа пакпіць, а пра нейкія нязначныя дробязі — гаварыць сур'ёзна. І толькі адно застаецца нязменнае — яго кніга.

Ён верыць у яе свята і непахісна, верыць, што будзе яна цікавая і патрэбная. Раней я пасміхаўся з гэтага, кпіў, а сёння не магу. Ён узяў з маіх жартаў толькі адно сцвярджэнне, усё астатняе адкінуў, прыняў толькі тое, што яму патрэбна, і ў тым, як ён зрабіў гэта, адчулася зацятасць, спакойная ўпартасць, сур'ёзная развага, з якой гавораць сталыя людзі з маленькімі і неразумнымі дзецьмі. Гэта здзівіла мяне і адразу ўзвысіла Барыса, і ён вырас у маіх вачах.

Барыс спахопліваецца, выцягвае з кішэні канверт.

— Прынеслі ўчора. А мы завялі тут з табою бадзягу. Гладка і забыўся. Даруй...

Ліст з Масквы... Круглы — без нахілу — почырк. Віктар. Не спыняючыся, ідучы, чытаю кароценькае — на адну старонку ўсяго — пісямко. У канверце яшчэ і маленькая паперка са штампам. Чытаю і моўчкі працягваю яе Барысу.

— Што гэта? «...прыёмная камісія просіць пацвердзіць згоду залічэння на першы курс завочнага аддзялення». Дык гэта ж цудоўна!

— Мажліва. Толькі позна. У мяне ўжо вырашана: сёлета — нікуды.

— А я што, горшы за цябе? Вучуся ж...

— Ты чалавек з творчымі здольнасцямі. Пісьменнік!

— Хочаш, каб палаяліся па-сапраўднаму?

Не, не хачу, дакладней, не маю часу. Мы заходзім на будаўнічую пляцоўку, і я не паспяваю нават падумаць як след над Віктаравым лістом, над тым, што мне трэба рабіць. Уся наша брыгада ля прарабкі. Узрадаваны Казімір першы вітаецца са мною.

— Вось урэшце і ён! І пацвердзіць.

Вясёлы рогат аціх, але ў кожнага на твары ўсмешка, і я адразу здагадваюся, з чаго тут такі гармідар.

Казімір становіцца побач са мною.

— Скажы ім, Лёня, скажы. Каго ўчора злавілі... І якой вагою... Бо яны ж не вераць.

— Хіба толькі яны! Толькі што спрачаліся з Барысам — таксама не можа паверыць. Быццам сом на паўтара метра — казка. Але гэтую казку кожны сёння пабачыць. Запрашаю ўсіх на вячэру.

Насмешлівы радасны бляск у вачах Ткача. Схіленая пастава Рогача, быццам ён нешта шукае ў доле. Далікатна стукае пальцам па верхняй губе Зіна. Не, ніхто ўсур'ёз не ставіцца да маіх слоў. Сініцын з робленай за-

клапочапасцю прапаноўвае, што, маўляў, калі ўжо на такое пайшло,— можна вызначыць сведку: вось Зіна, чалавек не зацікаўлены, няхай поўдзе і паглядзіць...

— Чаму толькі яна? — з прыхаванай усмешкаю абураецца Ткач.— Самяцінка і нам не пашкодзіць...

— Дык я ж кажу: запрашаю ўсіх.

— Не, мабыць, цяжка адразу ўсёй брыгадзе сабрацца,— з развагаю гаворыць Ткач.— Лацвей, каб сюды яго прынеслі. Мы б тут рады таму сому далі.

— Дык няма ж яго цяпер у нас.

— А дзе ж ён? — з'едліва пытаецца Рогач.

— Аддалі...

Рогат — дружны, як хваля,— змывае Казіміраў адказ. І мне таксама робіцца смешна: паспрабуй давядзі ім, што сом ляжыць у Валінай суседкі ў паграбку. Лезу ў кішэню па насоўку — рука крапае шархотную паперу канверта. Забыўся?.. Гэта ж такая падзея ў маім жыцці, а я рагачу, быццам той сом самае галоўнае, самае важнае... Перадаю ўсім прывітанне ад Віктара.

Ткач зноў падкалвае:

— Калі Віцьку сома аддалі — правільна. Студэнту харч спатрэбіцца...

А мне ўжо не хочацца жартаваць. Рогач стаіць бліжэй ад усіх да мяне, і я паказваю яму паведамленне з інстытута. Ён чытае задумліва, нібыта ў замяшанні, потым згортвае і кладзе паперу ў канверт — і чамусьці не хоча глядзець на мяне; я нават не магу злавіць яго позірк.

— Прапануюць завочнае,— кажу я, хоць Рогач цяпер гэта, бясспрэчна, ведае.— І трэба паведаміць згоду. На абед ідучы, адстукаю тэлеграму.

Рогач неяк вельмі заклапочана, прыплюшчыўшы вочы, глядзіць на вежу крана, пра нешта думае; вузкія зморшчынкі выбягаюць на скронь з куточка вачніцы.

— Навошта адклад, калі ўсё вырашана? Не патрэбен.— І ўжо тонам загаду: — Шнуруй цяперака! Трэба каваць, пакуль гарачае...

Болей ад усіх — і гэта здзіўляе мяне — радуецца Зіна; усхвалявалася, паціскае маю руку, раіць:

— Толькі абавязкова сюды каб варочаліся!

— Слова даю!

— Значыцца, будзеш вялікім дойлідам!

— Зноў варажба?

— Шчыра гэта. Ад душы...

— У знак падзякі я спраектую табе шыкоўны дом. Вокны — на поўдзень. У кожным — толькі сонца!..

— І вецер,— саркастычна перапыняе Казімір.

Ён цягне мяне за руку і шэптам просіць мяне пазваніць Валі, папярэдзіць, што на вячэру збіраецца ўся брыгада. І Зіна. Во ўжо гэтая мне далікатнасць. Не да чужых жа людзей пойдзем. Але калі ён ужо гэтак настойвае,— пазваню...

Іду па вуліцы, і яшчэ нейкі час бачу кран, чую яго сігналы і рыпенне тросаў — пачынаюць узнімаць панелі. Цікава, каго паставіў Рогач на маё месца? Казіміра, напэўна... Дзіўна ў нас з ім зараз атрымалася. Просіць папярэдзіць Валю, што прыйдзе разам з Зінаю. А пра галоўнае — каб табе слоўца. Як гэта разумець? Віктарава пісьмо, значыцца, яго не ўзрадавала. Ці, можа, я не прыкмеціў? Не, ён нават не павіншаваў мяне, не выказаў сваіх меркаванняў... Мабыць, тут крыху і мае віны ёсць. Быў дужа ўзрушаны, спрачаўся з-за таго сома, нават не напытаў у Казіміра, як ён ставіцца да паведамлення з інстытута. Таму і не прыкмеціў, якое ўражанне зрабіла яно на Казіміра. А можа, ён знарок папрасіў пазваніць Валі, можа, ён хоча, каб яшчэ раз мы параіліся з ёю перад тым, як я адаб'ю тэлеграму?

А што, як сапраўды крыху паспешлівае ў нас рашэнне?

Пытанне трывожнае і нечаканае. Ніводнага разу не ўзнікала яно ў мяне пасля ад'езду Віктара. Ніводнага? Гэта не зусім так. Перад тым як прыняць пэўнае рашэнне нікуды не ехаць сёлета, мы з Валяю ўзважвалі ўсё. Але тады, як прымалася тое рашэнне, не было ніякага паведамлення. А зараз яно ёсць. Але хіба гэта павінна штось змяніць?..

У чырвонай будцы тэлефона-аўтамата горача, смярдзіць табакаю — толькі што выбег мужчына з чорным партфелем. Набіраю знаёмы нумар. Голас Валі выразны, чысты, нібыта стаіць яна побач са мною. І ледзь чую яго, як адразу, нібыта адкінутыя выбухам, адлятаюць разважанні і ваганні. Ніякай згоды на залічэнне.

— Гэта я, Валя! — мой голас збіваецца на крык — на вуліцы грукоча машына.— З пошты званю...

Расказваю ёй аб усім. Валя слухае моўчкі; праз рэдкія тэлефонныя шолахі я чую нават, як яна дыхае.

— Адказаў ужо ім? — гэта першае яе пытанне.

— Не. Раюся вось...

— А мо і варта пагадзіцца. Усё-ткі гэта лепей, чым нічога...

— Адкуль такая формула?

— Якая формула?

— Не атрымаў вялікае — бяры маленькае.

— Адразу — глыбакадумныя вывады.

— Вывады? Гэта формула жыцця слабых людзей: першая няўдача — адступай, шукай другі напрамак...

— Ты добра трымаеш трубку?

— А што? Не чуваць?

— Ты так крычыш па мяне, што я баюся: разваліцца трубка. Крапчэй трымай!

— Трымаю.

Вось такая ў нас ідзе размова, і мне ад яе вельмі хораша на душы: Валя ўмее, калі пачынаю гарачыцца, навярнуць мае думкі да цвярозай развагі. Паспакайнеў. Расказваю, як у брыгадзе не паверылі, што злавілі гэткага сома ўчора, брыгада заваліцца да нас на вячэру, а Казімір прыйдзе з Зінаю, калі яна, Валя, нічога не мае супраць.

— І яму не сорамна?

— Я спытаю.

— І скажы, што ўсё будзе цудоўна. І бацька ўзрадуецца. Вы наладзіце сапраўдны турнір. Перадай усім маё асабістае запрашэнне. Калі хто не прыйдзе — на Казіміру адказнасць. І не прыносьце гарэлкі аніякай. У мамы ёсць віно з яблыкаў... Памятаеш, тое... Можа, варта і Віктару паслаць тэлеграму і падзякаваць яму?

— Правільна! Ліст жа дагэтуль не напісаў.

— Напішаш пазней.

— А зараз грукну тэлеграму.

— І не згубі квіток, я праверу...

Валін голас гучыць ва мне, як песня. Не, я не хачу браць маленькую вышыню. Было вырашана: паступіць на дзённае аддзяленне? Было. Значыць, трэба паступіць. Але пра тое яшчэ будзе гаворка. Цяпер жа неабходна адбіць тэлеграмы. Паведаміць у інстытут, што адмаўляюся ад завочнага аддзялення. Падзякаваць Віктару і папрасіць, каб напісаў падрабязна. Не, прасіць не трэба. Навошта нейкія падрабязнасці, калі ясна галоўнае і добра вядома тое, да чаго я імкнуся...

На пошце я весела размаўляю з дзяўчынаю, што прыняла мае тэлеграмы, акуратна складаю квіткі ў кішэню

і выходжу на вуліцу. Будучыня здаецца мне яснай і чыстай, як празрыстая сіняча неба; у душы па-ранейшаму жыве цеплыня нядаўняй размовы з Валяю, і мне радасна ісці па вуліцах, радасна бачыць твары людзей, радасна адчуваць, што жыццё гэткае цудоўнае.

На будоўлі нічога не змянілася: ніводнага новага блока не пакладзена, па тросах крана вісіць усё тая ж панель унутранай сцяны. Дык што ж яны рабілі?

Таропка ўзбягаю па драўляных сходках.

— Ну і работнічкі! Як пайшоў Бугрым, дык усё і застапарылася. Ну нічога, сёння самяцінкай падмацуецеся, і заўтра работка пойдзе весялей...

Рогач паварочваецца, ацірае даланёю пот з ілба:

— Давай, браце, без падколак. Не бачыш, як мухторымся з гэтай храновінай?

Ён хутка зыркае ўніз, і твар яго перакошвае грымаса робленага страху. Ці не чула лаянку Зіна? Не, здаецца, не чула. Паспакайнеўшы, але ўсё яшчэ раздражнёна, Рогач пачынае невядома на каго скардзіцца. Зрабіў жа, маўляў, паразіт нейкі панель. Цяжка было абгладзіць, калі яшчэ не застыў цэмент.

— Не бядуйце, брыгадзір! Зараз падраўняем...

Шчарбатай сякераю дзяўбу няроўны край панелі, падганяю паз. Работа не цяжкая, але марудная, карпатлівая: сякера часта саслізгвае, але ўдары мае дакладныя і моцныя. Бачу, як Рогач хмурыцца — ён гэткі заўжды, калі работа ў нас не клеіцца,— і гэты ягоны позірк не выклікае ва мне раздражнёнасці: я дзяўбу і дзяўбу сякераю. Урэшце ўсё... Можна, мабыць, ставіць...

Мы цягнем тросы крана, паціху наводзім канец панелі на пазы перакрыцця. Стаўшы на каленкі, Рогач камандуе рукамі: леваю — нам, праваю — кранаўшчыку.

— Управа трошкі, хлопцы. Так, так... Яшчэ кры... Сто-оп!

З глухім крэктам панель садзіцца ў гнёзды. Другую падганяць ужо не трэба — яна сама лёгка ўваходзіць у пазы і становіцца адразу роўна. Лёгка ідзе трэцяя і чацвёртая. Твар Рогача адразу весялее:

— Працаваць ахвота, калі зроблена па-людску. Забач, як пайшло! Панель паставіў — гатова сцяна ў кватэры!..

— Лёнькава рука шчаслівая,— жартуе Казімір.— Дакрануўся — па масле панель.

Рогач маўчыць. Крыху пазней, калі лёгка і хутка мы

ставім апошнюю панель наверха, ён з усмешкаю пацірае падбародак.

— Ведаеш, Казя, на шчаслівай руцэ далёка не паедзеш. Во калі галава светлая...

— А я што казаў? З ім ноччу калі ідзеш — ліхтара не трэба браць. Свеціць!

— Ну, цяперака што ж? — Я спрабую рабіць выгляд, што гэтая размова мяне не тычыцца.— Блок зноў...

— Абед, таварышы! Роўненька.

Барыс таксама зыркае на гадзіннік, а Рогач дабрадушна раіць:

— Не правярай, не трэба. Казімір у такіх выпадках не памыляецца.

Мы спускаемся на зямлю; драўляныя сходкі гнуцца пад нагамі і рыпяць.

— Званіў? — пытаецца Казімір, мыючы рукі пад кранам.

— Вядома. Яна піша табе запрашэнне асабістае. На ружовай паперы.

— На ружовай я не прыму. Трэба на белай.

— На белай табе напісана строгае ўказанне: забяспечыць збор усёй брыгады на вячэру. Пад асабістую адказнасць.

— Валя гэта гаворыць?

— Мы з Валяй гэтак гаворым. Калі ты кінеш падзяляць нас?..

— Трывай. Паедзеш — кіну.

— Да вясны ты сточыш мяне, як шашаль.

— Чаму да вясны?

— Пра гэта мы яшчэ з табою паталкуем. А цяпер трэба паведаміць гвардыі: а палове восьмай —самаціна на стале.

— Наўрад ці атрымаецца што...

Казімір гаворыць гэта такім тонам, што ніяк не магу даўмецца: ці вячэру ён мае на ўвазе, ці будучую нашу размову.

Сініцын і Ткач сядзяць ужо за сталом у прарабцы. Да іх далучыўся сёння і Рогач — выцягвае з старога карычневага партфеля і разгортвае даволі ладны газетны скрутак.

Мой напамінак аб вячэры нікога не радуе, наадварот, заўважаю на тварах як бы непамыснасць. Ткач выказваецца першы.

— Дзякуем, Лёня. І прабач, можа, залішне жартавалі

з таго сома. Верым: злавілі. Але ж якое тут свята? І зноў жа: хіба лёгка сабрацца ўсім? У кожнага свой клопат... Калі з інстытута прыедзеш у адпачынак, тады збяромся. Правільная мая думка?

— Абсалютна,— адразу ж падтрымлівае яго Рогач, і гэта гучыць пэўным рашэннем.

Сініцын дадае:

— Пра Маскву нам раскажаш. Паслухаем...

— Доўга вам давядзецца чакаць.

— Чакаў ты. Пачакаем і мы.

Дарэмна спрабую ўгаварыць сваіх сяброў: не пагаджаюцца — усе згодны чакаць. Нават больш: ніхто не прымае ўсур'ёз маю заяву, што я сёлета нікуды не паеду, усе лічаць гэта жартам, які загадзя разлічаны.

Нічога канкрэтнага не вырашыўшы, мы з Казімірам ідзём у сталоўку. Ён крочыць побач са мною, доўга маўчыць, і яго маўчанне супакойвае мяне і крыху весяліць.

— А ты чаго, як мыш на крупы? Што, таксама адмовіўся ад вячэры?

— Ад самяціны? Няма дурных... Але скажы шчыра: чаму не едзеш? Спалохаўся вучобы?

— Не люблю палавінак.

— Завочнае аддзяленне табе палавінка ўжо?..

Іранічны смяшок не злуе, не абуджае жадання спрачацца і нешта даводзіць; мяне толькі здзіўляе крыху, што Казімір — такі дальнабачны заўжды — не можа цяпер нічога зразумець. Хіба збіраўся я паступаць на завочнае? Была зусім іншая мэта — дзённае аддзяленне. І чаму цяпер трэба пагаджацца на завочнае? Таму, што Віктар паехаў, невядома на каго і што крычаў там і патрабаваў? А я павінен скакаць ад радасці? Не хачу...

— Не хочаш?..

Не адразу магу здагадацца, што ў гэтых словах (пытаецца ён ці сцвярджае?), але яны нараджаюць пратэст рашучы і актыўны. Сам жа ён, Казімір, адмовіўся ад мае дапамогі? Адмовіўся. Нікому не хоча кланяцца. І я не хачу. Але на будучы год паеду. І няхай там сядзіць сто экзаменатараў — вазьму самы высокі бал, які толькі існуе. І тады паглядзім...

— Ты аб усім дамовіўся з Валяй?

— Пакуль што не...

Казімір доўга, занадта доўга ідзе моўчкі і глядзіць на пыльны, сухі тратуар, і, калі ўрэшце я зноў бачу яго твар, мяне здзіўляе сухі бляск вачэй: і захапленне ў іх, і гор-

дасць, і ўдзячнасць, і як бы трывожны далёкі одум, з якога выбіваецца добрая ўсмешка.

— Ухваляеш маё рашэнне?

Я ўсё яшчэ не зусім разумею гэтую ўсмешку.

— Бачыш, Лявон... Калі чалавек ідзе да мэты і раптам збочвае, прываблены нечым лягчэйшым ці прыгожым, ён ніколі не дасягае яе. Ніколі, разумееш?..

Я нічога не адказваю. Але добра разумею цяпер, чаму Казімір не віншаваў мяне, пачуўшы пра ліст з Масквы. Ён чакаў. Чакаў майго рашэння і не хацеў нічога падказваць...

У сталоўцы Казімір праяўляе незвычайную ўвішнасць. Стаю ў чарзе, а ён прыносіць і кладзе на стол хлеб, лыжкі, відэльцы. Радуе і крыху смяшыць ягоная клапатлівасць: заўважаю новыя адценні ў нашым сяброўстве, і яны прыемна хвалююць і абуджаюць узнёсласць і жаданне быць клапатлівым і шчырым...

Пасля абеду ставім блокі ў правым, апошнім кутку другога паверха. Гэта не цяжкія, нязручныя квадраты панеляў. Іх вельмі лёгка наводзіць на пазы і не трэба доўга корпацца з падгонкаю. Адно ведай: прыняў блок, паставіў у пазы, закрыў растворам, і — усё, давай наступны. Мы робім гэтую работу ўтрох. Барыс і Пятро рыхтуюць зварачны апарат — трэба замацаваць металёвыя канцы на стыках.

Рогач непакоіцца:

— Доўга вы нешта валаводзіцеся.

— Усё гатова. Уключаем!..

Агонь электразваркі белы і пры сонцы зусім няяркі. У чорным ахоўным шчытку Барыс падобны на старадаўняга рыцара. Казіміру гэтае параўнанне не даспадобы.

— Пакінь гісторыю ў спакоі пакуль што,— просіць ён.— Падумай, як блок над акном паставіць.

— Паставім. Узбяруся на праём зараз...

— Ды пляспіся яшчэ адтуль. Гэта ж табе не ў катлаване: зваліўся на пясок — падняўся...

Звычайна ля сцяны ляжаць блокі — гэта замест прыступак. Цяпер жа не паспелі ўзняць іх, а кран цягне вузкую шэрую пліту, што звязвае акопны праём зверху. Рогач, нібыта ведаючы наш клопат, валачэ знізу драўляную лесвіцу. Стаўшы на яе, ладкую пліту над акном. Нязручна тут працаваць: тросы круцяцца, пліта вырываецца з рук, і ніхто не можа мне памагчы — вузка дужа, другому не стаць побач. Зрэшты, дакладна. Знак кранаўшчы-

ку — і пліта плаўна садзіцца на сваё месца. Цяпер чарга перакрыццяў.

Доўгія, з круглымі дзіркамі ў тарцы, цяжкія пліты плывуць лёгка, бы зусім не маюць вагі, вагу адчуеш толькі тады, як дакранешся рукою. Кладуцца пліты роўна, але не шчыльна: пазы паміж імі мы забіваем растворам крыху спагадзя, калі звараны металёвыя канцы.

Рогач паглядае на нас урачыста — ён задаволены.

— Цяперака струмент наверх перацягнем. І — перакур на сёння. Заўтра пачнём трэці...

А мы — разгарачоныя працаю. Спыняцца? Ні ў якім разе! Хоць першы шнур прагнаць.

— Не магу пярэчыць,— адразу пагаджаецца Рогач.— Хутчэй грузіце падсобную гаспадарку. І няхай даюць блокі.

Падсобная гаспадарка ў нас не вельмі багатая: рыдлёўкі, малаткі, кельмы ды жалезныя ломікі, якімі надпраўляем пліты і блокі. Яшчэ ёсць два вядры: адно з вадою, другое з растворам. Самы галоўны наш памагаты — кран. Складаем будаўнічы інструмент на дашчаны насціл, дзе ляжаць рэшткі раствораў, і ён хутка ўзнімае ўсё гэта наверх.

Казімір, схіліўшыся над квадратным прорубам лесвічнага маршу, працягвае руку Зіне — памагае ўзабрацца на трэці паверх. Вось яна ўжо побач з ім, аглядаецца ў захапленні:

— А як жа тут хораша! Прастора якая!

— Ты пачакай, да пятага дабяромся! Дзвіна на далоні будзе!..

Казімір, блазнуючы, выстуквае чаравікамі рытмічны танец. Жалезныя абцасы цокаюць гучна, звонка; пліты басавіта гудуць — увесь паверх пад намі нібыта пачынае спяваць. Памятаю, вось гэтак жа, як Казімір цяпер, любіў і Віктар на плітах кожнага новага паверха адстукаць чачотку...

У думках аб Віктару няма незадаволенасці: зайздрасць, што жыла ва мне, калі ён атрымаў выклік у інстытут, здаецца цяпер па-дзіцячаму наіўнай. Вельмі нікчэмнай выглядае і мая нядаўняя крыўда на Рогача, Сініцына, Ткача... Гэта ўсё драбяза: і сом той (няхай навит і важыць ён, можа, пуд!), і вячэра, і мая крыўда. Нас паяднала не гэта. Праца. Яна яднае нас. Тыя дамы, што збудавалі мы сваімі рукамі, і вось гэты, яшчэ адзін новы паверх, дзе вельмі хутка будуць жыць людзі. І ніхто з нас

не мае права на дробязную крыўду, бо, можа, ад таго, якія мы, як мы ставімся адзін да аднаго цяпер, будзе залежаць лад жыцця тых, хто прыедзе пасля нас сюды і паселіцца тут. Няхай сабе гэта таксама наіўна. Але ў адным я непахісны: дабрыня наша пакідае ў сэрцах людзей цеплыню і ніколі не знікае бясследна.

На ганку дома за плотам з'явілася знаёмая жанчына з рабой посцілкай у руках. Адсюль, з вышыні, добра відаць і хляўчук, які мы нядаўна рамантавалі, і ўся сядзіба, і вуліца, па якой едзе самазвал — вязуць нам раствор,— і нават палосы на посцілцы; жанчына глядзіць у наш бок, пэчага чакае, нібыта баіцца трэсці пыл на белыя сцены новага гмаху.

— Гэ-ээй! — крычыць Казімір.

Невядома, каму адрасаваны яго вокліч — ці празрыстай сінечы неба, ці машыне, што грукоча па вуліцы, ці той жанчыне на ганку; сонечны бляск з аднолькавай шчодрасцю льецца на ўсіх і ад голасу Казіміра ўздрыгвае, бы робіцца ярчэйшым.

## 7

Стол прыбраны шчодра, з добрым святочным размахам.

Смачнае яблычнае віно растварыла Казіміраву пясмеласць, што замінала яму на першым часе: ён ужо асвойтаўся, кладзе Зіне на талерку апетытны кавалак заліўной рыбы, прызнаецца са шчырым здзіўленнем:

— І не паверыш, пакуль не пабачыш сваім вокам, што могуць зрабіць рукі гаспадыні з аднаго зялёнага, нават крышку страшнага з выгляду сома.

— Добрай гаспадыні,— дадаю я.

Ніна Паўлаўна ківае галавою на дачку.

— Гэта ўсё Валіна стаііне. Любіць яна на кухні папрацаваць. Прыгатаваць...

Валя крыху збянтэжана.

— Ой, мама, навошта няпраўду гаворыш. Я што табе памагала рабіць? Толькі фарш. І не зважай на гэтых хітруноў. Яны ж паддобрываюцца. Таму і перабольшваюць...

Я сцяною — на абарону Казіміра.

— Не перабольшваем: самяціна сама ў рот просіцца. Ды і што па адных паваліліся! Спытайце Зіну. Няхай скажа чалавек нейтральны. Яе і камандзіравала брыгада не-

ракапацца, што сом не падман, не фікцыя, а самы сапраўдны факт...

— Эх, каб яны пабачылі, як пакараны іхні скептыцызм!..

— Ты, мабыць, не запрашаў як след,— у каторы раз шкадуе Валя.

— Казімір пясе за тое асабістую адказнасць. З ім і размаўляй.

— Ён яшчэ сваё атрымае. І табе хопіць. Адмовіўся няхай сабе Рогач... А Барыс, напрыклад. Што, таксама дзеці плачуць?

— Не можа здрадзіць свайму летапісу. Сядзіць і піша. Прычым і пра тое, чаго не бачыў.

— Чалавек жалезнай самадысцыпліны. І вялікай фантазіі.

Казімір сцвярджае гэта спакойна, сур'ёзна. А ва мне нібыта які нячысцік засеў: пярэчу, гарачуся. Якая ж тут, маўляў, фантазія. Гэта лёгка, калі гаворыш пра тое, чаго і сам не бачыў і ніхто не ведае — прыдумляй да змогі. А сапраўднасць, рэальнасць (вось яна якая!) на гэтым стале. Паспрабуй памалюй мне словам смак і пах смажанай у смятане самяцінкі... І таму неабходны тост за жаночыя рукі, яны твораць рэальнасць, да якой не дапне самая магутная фантазія. У гонар іх трэба складаць паэмы, пісаць вершы і ствараць песні...

— Не слухайце яго,— патрабуе Валя.— Не слухайце. Ён на падпітку!..

Даніла Анупрэевіч неадабральна глядзіць на дачку і ўладарна ўзнімае свой келіх; яго голас гучыць з упушальнай самавітасцю.

— За твае добрыя словы, Лёня! Як найкрапчэй павінны мы шанаваць на гэтай зямлі жаночыя рукі. І хоць я да жонкі прэтэнзіі маю, але за твой тост — з душою!

— Прэтэнзіі? Хадзі сюды, стары, хадзі. Па-агаворым!

— Няма, няма, галубка, ніякіх.

— О! Тады і я з вамі вып'ю!..

Келіхі дзынкаюць па-святочнаму ўрачыста і строга; і гэты тонкі звон шкла, і жартаўлівая размова Валіных бацькоў, і ўтульная гасціннасць гэтага пакоя, дзе сядзім мы, ап'яняюць мяне больш, чымся слабае, з дзівосным яблычным водарам, жаўтаватае віно.

Валіна маці — маленькая, крыху ніжэйшая за Валю, рухавая, з цёплай усмешкай у такіх жа, як і ў дачкі, рухавых чорных вачах,— не можа ўседзець на месцы, міту-

сіцца, лётае ад стала да кухні і кожны раз строга папярэджвае:

— Глядзі за рабятамі, Данілка. Частуй...

Даніла Анупрэевіч не дужа-ткі старанна выконвае абавязкі клапатлівага гаспадара ў адносінах да мяне і Казіміра, але пільна даглядае адну Зініну талерку: то накладзе кавалачак рыбы, запечанай у залацістым ад сала цесце, то памідор, шчодра заліты смятанаю. Бачу гэта, але не вельмі заклапочаны жаданнем ведаць, чым Зіна так адразу і моцна прыцягнула ягоную ўвагу. Сёння мне незвычайна хораша.

Пасля вячэры вялікі круглы стол адсоўваецца на сваё ранейшае месца — да сцяны; Валя і Зіна мыюць посуд і наводзяць парадак на кухні; мы з Казімірам надумаліся памагчы ім, але Валя праганяе нас у пакой.

— Марш, марш усе адсюль! Татка ўжо шашкі расстаўляе...

Даніла Анупрэевіч чакае мяне на сваім улюбёным месцы — за маленькім столікам пры адчыненым акне. Пасля чаркі ён гуляе марудна, грунтоўна і доўга абдумвае чарговы ход, і ў мяне хапае часу і падумаць над партыяй, і паглядзець цераз акно ў сад. Я люблю менавіта гэтыя часінкі не вельмі позняга вечара, калі яшчэ не зусім цёмна, але далеч закрыта фіялетавай смугою, калі ціха стаяць дрэвы ў садзе і пахне крыху прэлым лісцем і яблыкамі, і яшчэ нечым сухім і вострым — здаецца, гэтак пахне падвялы гурэчнік на сырых лехах,— а ў пакоі ўжо ўсталёўваюцца прыцемкі, і маленькія кветкі ў вазончыках здаюцца незвычайна кусцістымі і загадкавымі.

— І даўно яна працуе з вамі? Вельмі сціплая дзяўчына...

Яна — гэта, вядома, Зіна. Раблю выгляд, што не разумею даверлівае пытанне Данілы Анупрэевіча.

— Вы аб Зіне?

— І разумная, без какецтва,— дадае ён, бы і не чуе мяне.— Хочацца, каб Валя пасябравала з ёю. Яна мне, між іншым, казала, што вучылася разам з Казімірам у школе...

Ён асцярожна, але ўпэўнена і рашуча — ніколі не возьме няправільны ход назад! — совае пешку; цень ад яго шырокай рукі закрывае амаль палову дошкі; на тоўстых пальцах выразна акрэсліваюцца чорныя шрамчыкі, і я, з павагаю гледзячы на іх, адчуваю набліжэнне нейкай важнай гаворкі, але чамусьці думаю пра іншае, пра вы-

токі тае ўважнай цікавасці, што выклікала Зіна ў гэтым доме. Валін бацька пачакапа пачынае разважаць пра сяброўства моладзі. Што лепей, маўляў, за яго? Самае прыгожае, самае высокае... У ім крыніца крэпкай, сталай дружбы.

Раблю выгляд, што вельмі задумаўся над чарговым ходам, і маўчу. У разважаннях Данілы Анупрэевіча прабіваюцца ўжо запытальныя ноткі, гучыць жаданне спрачацца, нешта даводзіць. І гэта насцярожвае. За прызнаннем прыгажосці дружбы ў маладыя годы, за сціплым жаданнем сяброўства Зіны з Валяю мне акрэсліваецца прапанова выказаць сваю асабістую думку на адносіны Казіміра і Зіны, чуецца трывога бацькі за лёс свае дачкі.

Разважанні Данілы Анупрэевіча дзіўна пераплятаюцца з гаворкаю Ніны Паўлаўны і Казіміра. Ён сядзіць на канапе насупраць яе і з увагаю сталага чалавека выслухвае скаргі: у Казіміра літаральна заўжды ўсё, што робіць, атрымліваецца прыстойна, прыгожа і самавіта.

— Ах, вы не ведаеце, дарагі мой Казя, які гэта клопат — мець свой уласны дамок. Адны пакуты! То плот паднаві... [illegible] страху латай... А там — падмурак асыпаецца. Купляй цэмент і розную трасцу... А печы? Шукай цэглы, рыхтуй дровы... І так вось бясконца...

— Затое ўлетку раскоша!

— І не зірнеш на тую раскошу! То з пустазеллем ваюй, то ваду цягні, калі студня перасохла ў спякоту. Палівань жа трэба! Вось і валачэш сўды... Не, не... Зайздрошчу тым, хто мае кватэру ў доме, дзе ёсць выгоды...

— Памяняйцеся!

— Лёгка сказаць! І так паглядзіш, і гэтак... Быццам шкада нечага. Звычка...

Валіна маці ніколі не казала мне пра гэта, ніводнага разу не наскардзілася, а была заўжды вясёлая і гасцінная.

А можа, шчырасць яе ідзе ад таго, што Казімір умее вось гэтак спаважна слухаць? Не, проста яна ахоўвае маё сяброўства з Валяй, не хоча турбаваць, хавае ад мяне свае клопаты і таму ніколі не размаўляла са мною гэтак шчыра, як гаворыць цяпер з Казімірам...

— Задумаліся, малады чалавек? Ваш ход!.. Сюды, значыцца. Цудоўна! А мы пешачкі вашыя возьмем.

— Не, не... Тры, калі ласка... Вось так... А я цяпер — раз!.. І яшчэ!.. І яшчэ! І — дамка. І вялікая дарога — мая!

Даніла Анупрэевіч разгублена цярэбіць правае вуха — заўжды яму свярбіць там, калі праіграе.

— Можа, яшчэ?

— Вядома. А белыя, Даніла Анупрэевіч, у мяне...

Новую партыю гуляю чамусьці няўважліва і праіграю. У трох наступных, сабраўшы ўсю сваю ўвагу, пакутліва думаю над кожным ходам, але гэта, як знарок, нічога не дае: прыходзіцца ўзнімаць рукі.

— Стаміўся? — клапатліва пытаецца Даніла Анупрэевіч.

— Сіла саломіну ломіць. Вы сёння гулялі цудоўна!

— Ну, ну,— пагражае ён пальцам.— У першых партыях як заяц на балалайцы я іграў...

У пакой прыбягаюць Зіна і Валя з каляровай хусцінкаю ў руках. Валя весела, падрабляючыся, па-вайсковаму дакладвае:

— Скончылі сваю работу! Шашкі — адставіць. Ідзём гуляць.

Не паспяваю выказаць сваю згоду: з канапы ўзнімаецца абураная Ніна Паўлаўна:

— Гуляць? У гэткую цямрэчу?

Валя ўскідвае хусцінку на плечы.

— Бачыце? За тое, што хачу выцягнуць людзей на прагулку — вымова!

Я рашуча і паспешліва станаўлюся на бок Валі. Хіба можа напалохаць маладых і дужых нейкая там цямрэча? Акрамя таго, сёння ўсе Валіны патрабаванні прагрэсіўныя: піць, есці, гуляць. Мы не можам не прыняць іх. Праўда, Казімір?

— Безумоўна! Трэба быць паслядоўнымі. Сумленна выканалі два першыя патрабаванні? Выканаем і апошняе. Але перад гэтым шчыра дзякуем за цудоўную вячэру. І даём абяцанне з Лявонам.

— Якое, трэба хоць ведаць?

— Злавіць яшчэ аднаго такога сома!

Са смехам і жартамі развітваемся. Валіна маці амаль гвалтам прымушае Казіміра ўзяць пакунак з яблыкамі. Бацька вядзе нас да самых веснічак.

Паабапал сцежкі цвітуць вяргіні — ненатуральна белыя ў цемры і вялікія.

— Будзе дождж,— папярэджвае бацька Валю.— Бачыш, неба якое...

— Я хутка. Толькі праводзём Зіну і Казіміра.

— Тады спакойна кладуся спаць,— Данiла Ануфрэевiч пасмiхаецца.— Гэтую дарогу я ведаю...

— Не, не... Вы ж самi казалi: будзе дождж.

— Ну, хiба што вадой вас разлiе. Бяжыце...

Але што нам вада. Пакрапаў дождж i сцiх, i зноў цiхая i цёплая ноч. Мы правялi Зiну i Казiмiра, засталiся ўдваiх i ходзiм у вялiзным i крыху самотным парку, якi палосаю лёг па-над Дзвiною, i гаворым пра рыбалку, пра тое, што для верасня гэта занадта ўжо цёплая ноч, i я добра разумею: гаворкаю аб нязначных дробязях мы хочам адцягнуць час, калi прыйдзецца гаварыць аб сур'ёзным — маёй тэлеграме ў iнстытут. Валя забаранiла мне казаць пра тое бацькам. «Мы самi спачатку ўсё абмяркуем дэталёва».

Але вось ужо доўга мы ходзiм у парку адны, нiхто не перашкаджае нам, а Валя быццам забылася на тое абмеркаванне. Абыякавым тонам прыгадваю:

— А мне карцела сказаць бацьку пра тэлеграмы.

— Спачатку неабходна дамовiцца, як сказаць!

Адказ цвёрды i хуткi, i па гэтай паспешлiвасцi i ўпэўненаму тону здагадваюся, што яна таксама думае аб тэлеграмах, якiя я паслаў сёння. Але хiба не ўсё роўна, як пра iх сказаць бацькам?

— Ты паглядзi, што атрымлiваецца. Спачатку я пасля школы ў iнстытут не схацела паступаць. Цяпер ты адмаўляешся. Бацька ж абсмяе нас. У Маскву, маўляў, ехаць не хоча...

— Ты была ў Маскве?

— Не...

— Я аднойчы. Калi здавалi экзамены з Вiктарам...

— Я толькi ў фiльмах Маскву бачыла. Прыгожая... Праўда?..

— Мала дзе i быў тады... Чырвоная плошча... Гiстарычны музей. Лужнiкi. Ды наш iнстытут. Вот i ўсё...

— А Горкi Ленiнскiя?.. Ты ж казаў, што былi там...

Праўда, аднойчы электрычкаю мы ездзiлi на экскурсiю ў Горкi Ленiнскiя, аглядалi дом пад клёнамi, хадзiлi па зацененых алеях парку, дзе ўсё дыхае легендамi i праўдай. Потым купалiся на Пахры. Рэчка гэта неглыбокая, з халоднай i чыстай вадой — зводдалi яна выдае зялёнаю, як бы падфарбаванаю. Успамiны як жывыя: мне лёгка казаць пра iх Валi i прыемна...

Сцежка, па якой мы брыдзём спакваля, цягнецца праз увесь малады парк ад ракi да ручая, што густа парос ча-

ромхаю; за ручаём, на пагорку, старыя могілкі з пізкаватымі соснамі; на фоне неба сосны здаюцца чорнымі, вельмі маленькімі, быццам растуць недзе высока-высока.

Мы спыняемся на сваім старым месцы — ля апошняга клёна. Прыглушаны шоргат, што плыве ад ручая, набліжаецца хутка, мацнее — здаецца, пехта сунецца праз чаромхавы гушчар, шастае голлем.

— Твой бацька не памыліўся. Зноў дождж...

— А ты і забаяўся? Яшчэ і не дождж саўсім.

— Усё роўна. Станем пад клён.

— Не, я хачу падрасці...

Дождж барабаніць па лістах гулка, бы трасуць недзе на талерцы гарох, і раптам сцішаецца зусім. З цёмнага неба цярушыцца рэдкі, як у познюю восень, імжака-туман; лёгкія кропелькі-расінкі нячутна ападаюць на твар.

— На агні паглядзі,— просіць Валя.— Унька, у горадзе... Як бы гушкае іх хто. І вясёлка вакол...

— Ніякай вясёлкі не відно.

— Не, не... Ты адно вока саўсім заплюсні, а другое крышку толькі. Ну, бачыш цяпер?

Гарадскія агні за шатамі клёнаў завалочаны туманнай смугою — жаўтаватыя і шырокія плямы; яны быццам вагаюцца на дрыготкіх бэзавых промніках, што як стрэлкі разлятаюцца ва ўсе бакі; светлыя плямы электрычных ліхтароў на вуліцах зліваюцца ў ланцугі, выцягваюцца і, рассечаныя аграмадамі гмахаў, зноў выгінаюцца ў цемры пукатымі залочанымі сцежкамі.

— Прыгожа, праўда, Лёнік? Я люблю, калі прыгожа...

Тулюся шчакою да Валінай галавы; на яе валасах блішчаць вадзяныя кропелькі, маленькія, зыркія, як расінкі, уздрыгваюць, прападаюць і нараджаюцца зноў сярод бліскучых ніцей-валасінак.

— І яшчэ любіш у дождж стаяць пад клёнамі.

— Так...

— Калі навальніца напаткала вас у дарозе, ніколі не станавіцеся і не хавайцеся пад дрэвы. Гэта небяспечна! Ведаеш адкуль?

— Нейкая рэклама.

— Правільна. Вясной мы будавалі дом на Партызанскай. На слупе, якраз напроці нас, увесь дзень роў дынамік, і ніхто яго не выключаў. Хочаш ці не хочаш — слухай! Чамусьці часта перадавалі аб'яву пра навальніцу.

— Вось з чаго ты такі асцярожны! І баішся маланкі!

— Ты пабач — я нічога не баюся.

Ніжэй могілак, недзе вельмі блізка ля нас, абвальваецца ў ручай падмытая вадою берагавіна. Рэха маруднa, нібыта зблудзіўшы ў туманнай імгле, растае ў чаромхавым гушчары. І зноў цішыня. Парная, густая. І раптам зноў у лістоце клёнаў кароткае звонкае лапатанне.

Дождж рэдкі, дробны, а лапатанне гучнае — гэтак заўжды бывае ўвосень: лістота дрэў падсохла, адубела ад летняй спякоты і шахціць ад дажджу грамчэй і званчэй, чым вясной.

— А я баюся.— У Валіным голасе невядомая мне раней развага, самотная як бы трывога.— Што, як твая тэлеграма — памылка?..

— Гэтага я не думаю.

— І трывожыць будучыня. Вясною паедзеш, а я застануся адна...

— А каб давялося ехаць сёлета?

— Паехалі б разам!

— Разам? Ты ніколі не казала аб тым.

— Не казала. Бо ты і не пытаў.

Насмешліва. І зусім нечакана. Не паспяваю нават даўмецца, іроніі ці праўды больш у Валіных словах, а ў яе новае пытанне ўжо:

— Разам з вамі тады многа паступала дзяўчат?

— Не прыглядаўся. Але лепшай за цябе не бачыў!

— Значыцца, прыглядаўся.

— Ты цяпер, мабыць, крыху шкадуеш, што пасля школы не пайшла вучыцца. І не хочаш прызнавацца...

— Ты прыдумаў гэта, калі гуляў з бацькам у шашкі?

— Не, цяпер вось... Спытала пра дзяўчат, а я і падумаў...

— А ты можаш не думаць, а слухаць?

— Паспрабую.

— Тады слухай. У мае гады мама была байцом у Чырвонай. Во прыгожа б было, каб я, дачка яе,— дарослая, здаровая дзяўчына — села па бацькоўскі карак і хадзіла ў інстытут. Я сказала сабе: спачатку папрацуй, зарабі грошы, а потым і паедзеш у інстытут вучыцца. Раней, пасля школы, у гэтым было крыху і наіўнасці. Але цяпер ведаю і разумею цвёрда: правільны я сабе вызначыла шлях. Маці часта падсмейваецца: знайшла, маўляў, запятак — друкарню. А калі падабаецца? Вось ты, скажам, сядзеў калі-небудзь за лінатыпам?

Хлапчанё. Наіўнае, фанабэрыстае хлапчанё. І яшчэ ўзяўся напракаць. «І не хочаш прызнавацца...» Гэта табе

трэба прызнавацца. Знаўца! Лічыў, што ўсё ведаў: Валіны мары, яе імкненні, доказы, што прывяла яна бацькам, калі пасля школы не пайшла вучыцца... Лічыў сябе унька якім разумнікам! А што аказалася? Ты ж зусім не ведаў, якая гэта мужная і багатая натура...

— Чаго ты маўчыш? Хоць раз ты бачыў, як яны працуюць?

— Аднойчы. З Барысам.

— Ён што, сапраўды піша кнігу?

— І яшчэ як! Мех паперы сапсаваў, калі не болей. Але гэты сюжэт я не аддам яму.

— Які яшчэ сюжэт?

— А тое, што разам едзем у Маскву ўлетку.

— Думаеш, гэта магчыма?

— Неабходна. Ці, можа, ты не хочаш разам?

— Я хачу, каб мы стрымалі абяцанне, што далі бацьку.

— Нас затрымаў дождж. Прычына зусім аб'ектыўная...

А дождж зноў перасціх; густы і вільготны туман як сцяна стаіць за клёнамі; у ім глухнуць нашы крокі, быццам гэта зусім не мы, а нехта другі крадком сунецца з таго боку сцежкі; гарадскія агні зніклі, і толькі там, дзе зусім нядаўна груваспіліся іх плямы, сцяна туману крыху радзейшая, і ў ёй вагаюцца светлыя і шырокія істужкі малінавага колеру; мы ідзём да іх, а яны не робяцца ярчэйшымі, усё тапчэюць, бягуць ад нас.

Валіна рука — у маёй, спакойная, даверлівая, мяккая і цёплая рука, і гэткая ж цеплыня поўніць маё сэрца. Валя нічога не гаворыць, і я ведаю, што за гэтым маўчаннем яна хавае сваю згоду і трывогу: згоду ехаць разам і трывогу за наша сяброўства, за тое, што чакае нас наперадзе.

На вуліцах горада, як і ў парку, бязлюддзе, мяккі, зусім не халодны туман; і гэткі ж туман ля веснід, дзе мы развітваемся. Нейкі час мы нічога не гаворым, бы прыгадваючы, чаго не паспелі сказаць, хоць і ведаем, што колькі б ні стаялі, нам ніяк не ўдасца пераказаць усё, што хочацца і трэба сказаць адно аднаму; і адтаго, што менавіта так, а не інакш, што побач са мною Валя, што навокал цішыня, што ніхто не перашкаджае нам, што можна маўкліва думаць, слухаць шолахі ночы і няясны тлум засынаючага горада, я адчуваю сябе шчаслівым чалавекам.

Усё проста і ясна ў маіх планах на будучыню, нібыта гэта заўтрашні дзень, які я ўяўляю сабе ва ўсіх драбніцах. Раніцой — на працу. Удзень — званю Валі. Увечары — у кіно. А перад гэтым, пакуль Валя будзе збірацца, мы з бацькам разанём у шашкі.

— Шашкі — рэальна. А кіно — наўрад...

Валіна загадкавасць крыху забаўляе мяне, і я прымаю гэтую гульню.

— Тады прыйдзецца валачы кінатэатр сюды. Да цябе.

— Але заўтра мяне тут не будзе.

— Ты перед сном молилась, Дездемона?

— Не паспела. Таму і хачу падалей ад цябе схавацца. Адразу пачнеш шукаць.

— Перарыю ўсю планету! — абяцаю я. Але мой голас, мабыць, гучыць збянтэжана, і Валя не можа стрымацца, адварочваецца, і я чую яе смех, крыху прыглушаны далонькамі.

— Не, не! Няхай планета жыве спакойна. Пішы на адрасу: вёска Залессе...

— Зусім па Чэхаву: на вёску дзядулю.

— Дзядулі няма. Засталася бабулька. Ты ж ведаеш...

Якая непамятлівасць. Валя ж казала мне на тым тыдні, што потым, пэўна, яна паедзе ў Залессе, што там затрымаецца колькі дзён, каб памагчы бабцы ўпарадкаваць на зіму гародчык і парабіць тое-сёе. І маці туды збіраецца. Праўда, Валя тады не ведала канкрэтна, у які дзень паедуць, і, мабыць, таму гэта і вылецела ў мяне з галавы. Але ж ці апраўданне гэта?..

Валя прыхілілася плячом да чорных веснічак, твар яе таксама цёмны, амаль зліваецца з шырокімі штакецінамі, але я бачу яе вочы — з іх праменіць хітраватая ўсмешка, за якой тоіцца нешта невядомае мне. Нахіляюся блізенька-блізенька, уважна ўглядаюся, як бы шукаю тое «нешта». Валя цалуе мяне — нясмела, быццам баючыся: гэтак яна робіць заўжды. Я сціскаю яе плечы, цалую губы, вочы, валасы...Валіна далонь закрывае мне рот, і тады я цалую яе мяккія і цёплыя далоні.

— Лёнік, пайду...

— Пачакай. Не ўбачымся тыдзень цэлы!

— У нядзелю, мабыць, прыедзем...

— Калі яшчэ тая нядзеля!

— Бачыш, бацька не спіць, чакае... І ты чакай. Чуеш?.. Прыеду да бабулькі і пашлю табе ліст...

Яна кудлычыць мне валасы, хуценька, быццам баючыся, што я затрымаю яе, цалуе мяне ў шчаку і бяжыць дахаты.

Стаю ля веснічак, слухаю яе крокі і быццам бачу Валю ўвесь гэты час, пакуль яна ідзе па садзе. Вось зарыпела масніцынка на тэрасе. Глуха бразнулі дзверы. Значыцца, увайшла...

За дрэвамі, што навісаюць галінамі на нізкі штакетнік, свеціцца акно — не спіць бацька; вось яно засвяцілася ярчэй — магчыма, бацька стаяў ля акна і цяпер адышоўся, а мо Валя крапула рукою фіранку... Цёмныя шаты яблынь рассякаюць святло, што льецца з акна, на мноства жаўтлява-зыркіх стрэлак; шырокія, але кароткія адразу прападаюць у галінах, а доўгія вострыя адольваюць гушчар лістоты, выбіваюцца з яго, і дымны туман павальваецца на іх, абкручвае сіне-белымі лахманамі.

Зыбкія залочаныя палосы святла вагаюцца, быццам абмацваюць сабе дарогу ў галінах яблынь. Я гляджу на іх і думаю пра вёску, куды збіраецца ехаць Валя. Ніколі не быў там. Але назва чамусьці як бы і знаёмая. Адкуль? Быў там і забыўся?.. Не, чытаў, мабыць, недзе... І буду чытаць яшчэ, бо Валя прышле ліст. Але ж ці заменіць той аркушык паперы Валю, яе вочы, яе голас, неабходны мне кожны дзень, кожную гадзіну?..

Калі Валя побач, мне здаецца, што яна будзе са мною бясконца, што нам не прыйдзецца развітвацца ніколі. Калі мы разам, мяне агортвае нейкая быццам адарванасць ад сапраўднасці, ад рэальнага жыцця, ад таго, што ёсць на самай справе. Вось і сёння. Цэлы вечар як блазён які неразумна жартаваў, пахваляўся сваім рашэннем і бадзёрым адказам у інстытут, суцяшаў Валю і фанабэрыўся, зусім ашалеўшы ад таго, што яна побач, са мною і гэтак аддана мяне кахае, што жыццё прыгожае і радаснае, што я малады, поўны сіл і добрых надзей...

А Валя, аказваецца, думае пра мяне больш, чымся я сам, думае пра зямное і трывожыцца. Магчыма, сёння я крыху пакрыўдзіў яе. Але я не ведаю (і кажу гэта абсалютна шчыра!): як увогуле павінен жыць чалавек, каб ніколі, ні ў чым не пакрыўдзіць свайго сябра, разумець не толькі яго словы, але і тое, пра што ён часам і не гаворыць?..

Святло ў акне згасае раптоўна; цямрэча адразу гусцее, падкочваецца да самых веснiц, і я адчуваю тварам дотык халоднага чорнага туману; абрысы дрэў расплываюцца,

чэзнуць. Стаю, углядаюся ў змрочную навісь галля, нібыта чакаю, што будзе адтуль нейкі знак і ён растлумачыць тое, чаго я не ведаю і не магу зразумець.

## 8

Ранішняе неба хмарнае, непрыветнае. Ля адчыненых дзвярэй прарабкі ў мелкай, круглай лужыне таўкуцца, спаўзаюць маленькія дажджавыя пухіры — усплёскі; адбітак мокрых шэра-белых блокаў у лужыне ўвесь час як бы ўздрыгвае, вагаецца.

Нешта — здаецца, упершыню гэта — позніцца Сініцын. Мы ўсе непакоімся ўжо; толькі адзін Ткач сядзіць абыякавы, пацiху распальвае абкураную, з цёмна-рудымі абпалінамі па краях тоўстую люльку.

Казімір моршчыцца, узнімаецца; следам за ім і я выходжу з прарабкі — цяжка ўседзець, калі курыць Ткач: табака ў яго асаблівая, з прымессю нейкага самасаду, вельмі дыміць, і дым ад яе смярдзючы, як злыдзень.

— Зірніце, хлопцы,— кідае нам услед Рогач.— Зараз Сініцын паявіцца. Пачнём. Не відно, Казімір, яго там?

— Не відно. Але магу і я на кран стаць,— прапаноўвае Казімір.

— Ты станеш, а мяне, калі што якое, павядуць. Ведаеш куды?

Пытанне з'едлівае — Рогач сёння нечым незадаволены. Люлька Ткача працуе на ўсю моц — з дзвярэй прарабкі цягне дымам, нават тут, на свежым паветры, ад яго дзярэ ў горле. Сігаю цераз лужыну да Казіміра, які глядзіць на замглёнае неба.

— У такі дзянёк акунь добра ловіцца. Памятаю, летась на азяро ў Залессе выбраліся. Дожджык шалахціць. А ледзьве закінуў — цягні.

— У Залессі азяро рыбнае.

— Усе чамусьці на Турэц лятуць. А Залессе абмінаюць.

Казіміравы словы як светлае азарэнне, як пробліск ва ўчарашняй няяснасці. Выплывае ў памяці дарога і пакручасты прасёлак, што адгаліноўваецца ад яе за старымі пахілымі бярозамі, і свежы слуп з указальнікам на Залессе. Мы праязджалі там мінулай восенню, калі Віктараў бацька вёз нас рыбаліць на Турэц. Вось дзе я бачыў назву вёскі.

Цененька шархае дождж па брызенце курткі. Успамі-

ны пра ўчарашні вечар нечаканыя, і новы, зусім ужо не будаўнічы клопат сэрца — Валіна паездка ў Залессе. Нібыта ўявс стаіць перад вачыма вясковая дарога, па якой паўзе маленькі аўтобус, поле з карычневымі тырчкамі змоклага бульбоўніку. Як жа ёй працаваць у такую макрэчу? Хаця паедуць яны толькі апаўдні. Дождж, вядома, перацiхне...

— Лёнька, няма плітаў! Ты бачыш?..

Казімір штурхае мяне; адчуваю трывогу ў яго голасе, але яна існуе асобна ад маіх думак, не перашкаджае ім, і я толькі адзначаю сам факт, што Казімір нешта гаворыць, чую словы, але не разумею іх сутнасць, бо яны недзе як бы воддаль. Перад вачыма і ў думках усё яшчэ тыя пахілыя бярозы, ад якіх пачынаецца паваротка на Залессе. Дождж гэткі ноч хвастаў без перадыхі. А там жа гліна скрозь: добрая, чырвоная гліна...

— Цяпераka і пліты паплылі. Ажно дзве зараз...

— Якія пліты? — Я ўсё яшчэ там, на тым прасёлку.

— Зірні!.. Нехта свіснуў дзве...

Толькі цяпер пачынаю цяміць тое, пра што ён гаворыць. Учора мы якраз стаялі тут, вось на гэтым месцы, і Казімір, пералічыўшы пліты, яшчэ пытаўся, ці паспеем пакласці ўсе за змену. Тады іх было восем. А цяпер шэсць. На пліты ўскінуты два сасновыя брусы, што раней валяліся за прарабкай. Ля штабеля сляды гумавых колаў, замытыя і прыбітыя дажджом — не зразумееш, калі была машына тут, бо ўчора прывозілі і раствор і блокі,— але адзін з іх, той, што бліжэй да нас, глыбокі і выразны.

— Трэба ісці па гэтых слядах,— гаворыць Казімір.

— Спачатку паведамім Рогачу.

Казімір няпэўна і як бы расчаравана паціскае плячыма.

— Памятаеш, што ён сказаў, калі дошкі сцягнулі?

— Усё роўна. Я паклічу яго...

Маё паведамленне аб плітах бы нейкі выбух: усе змаўкаюць і потым адразу выскакваюць з прарабкі. Рогач затрымлівае мяне, мы ідзём апошнія, крыху ззадзе ўсіх, і ён незадаволена хмыкае носам.

— Ну і панікёры пасабраліся! Хто павалачэ тыя пліты? Ты што, пералічыў іх учора?

— І не толькі я... Казімір таксама лічыў.

— Зноў гэты твой Казімір! — узрываецца Рогач і стукае брызентавай рукавіцаю сябе па далоні; рукавіца плёхкае гучна, бы з мокрага скурату.— Што вы ўсе на яго

моліцеся? Казімір, Казімір... Жыць сваім розумам трэба! А не чужым!

— Казімір мне не чужы. Сябар...

— А я вораг? Твой сябар вось хто.— Ён стукае рукавіцаю па галаве.— Яна! Разумееш?..

Ніколі не бачыў нашага брыгадзіра гэткім; болей здзіўляе не тое, што ён гаворыць, а голас — сухі, раздражнены і непрыветны. Чаму Рогач гэтак насеў на Казіміра?.. Я і раней прыкмячаў, што ён часам як бы падазрона ставіцца да яго, а цяпер гэта выявілася рэзка, перайшло амаль у адкрытую варожасць. Можа, мы з Казімірам учора разам памыліліся?.. Не, смешна нават. Вось тут жа і стаялі. І брусоў гэтых не было, іх нехта прывалок сёння поччу. Грузілі, відаць, пліты, а потым і забыліся...

Рогач аглядае штабель, стукае ботам па брусе, і вочы яго па-ранейшаму хмурныя, незадаволеныя.

— Прыдумляеш ты, Свірыдаў! Ой прыдумляеш, здаецца мне,— ён вымаўляе Казімірава прозвішча (яно гучыць неяк дужа непрыветна, бо мы не прывыклі да прозвішчаў) з падробленай іроніяй і глядзіць сабе пад ногі.— Каму гэтыя пліты спатрэбяцца?

— Не ведаю. Але добра памятаю: было восем, а цяпер толькі шэсць засталося...

— Мы ж пяць учора палажылі. Ці забыўся па тое?

— Без іх. Тыя не лічу,— упарта стаіць на сваім Казімір.

— У цябе схільнасць усё падлічваць, падлічваць... Матэматык. А мо хто-небудзь пліту ў кішэньку сунуў і забыўся?..

Нікога не весяліць гэты жарт. Казімір, сціскаючы кулакі, глядзіць нядобра: вочы звузіліся, твар збляднеў, і крайчыкі губ уздрыгваюць. Рогач з вінаватай усмешкай адыходзіць ад яго.

— Ну смяхоцце адно, дый годзе!

— Ведаеце, гэта не смяхоцце!

— Прабач, калі не тое сказаў. Жартую.

— Гэткія жарты я не люблю!

— Не любі, зрабі ласку. Толькі спакайней. Спакайней...

За спінай Рогача з'яўляецца Сініцын (мы нават не пачулі, як ён надышоў, і заўважаем яго толькі цяпер), пазяхае на ўвесь рот і глядзіць на нас чырвонымі, соннымі вачыма.

— А-аа-оў-ух... Мітынгуем? І не надакучыла ім...

Усе маўчаць, нібыта чакаюць чагосьці, а я спрабую растлумачыць Сініцыну, што здарылася. Ён слухае без увагі, зноў пазяхае і раптам рашае рэзка і безапеляцыйна:

— І чорт з імі. Свет з-за тых пліт не перавернецца. Новыя прывязуць.

— Трэба, мабыць, скласці акт.

Мая прапанова выклікае ў Сініцына спачувальную ўсмешку:

— Складзі, складзі... Цябе рознымі камісіямі зацягаюць. Па сто праверак на дні будзе — працаваць не дадуць. І прагрэсіўка ляснецца. Ха-арошы будзе падарунак на свята!

Валюхастай хадою Сініцын шыбуе да крана, і тады Рогач, быццам успомніўшы, што ён павінен кіраваць намі, строга і змрочна загадвае пачынаць работу...

Чорнымі гадзюкамі круцяцца пад стралою крана тросы, нацягваюцца пад цяжарам грузу, звіняць; шоргае Зініна рыдлёўка па закарэлых за ноч дошках насцілу.

Мы ставім блокі, раўнуем іх і тут жа закладваем шчыліны ў кладцы. Сёння ўсё атрымліваецца неяк завучана, сумна, быццам парвалася тая вясёлая трапяткая струна, што бадзёрыла раней. Але пакрысе знаёмы рытм захоплівае мяне, выціскае з сэрца padазронасць да Рогача, і мне пачынае здавацца, што не было ніякай непрыемнай размовы аб плітах і што ўвогуле ўся гэтая гісторыя — у мінулым, у вельмі далёкім мінулым, якое не можа вярнуцца.

Зноў у мяне ранейшы клопат: Валя, Залессе. Пачынаецца абедзенны перапынак, і я кідаю рукавіцы на ломік, што ляжыць упоперак блока, таропка мыюся. Абед не ўцячэ. Валя, відаць, яшчэ не паехала, і мне трэба пазваніць, пачуць яе голас.

Казімір затрымлівае мяне.

— Чакай, разам пойдзем...

— У сталоўку потым. Я спачатку на тэлефон.

— Перадасі і маё прывітанне. А я пачакаю. Дарогаю мы пагаворым...

Пагаджаюся неахвотна, спяшаючыся, іду хутка. Казімір не адстае і адразу, як толькі выходзім на вуліцу, хмурна пытаецца:

— Якая ў цябе думка пра гэтыя пліты?

Ніякай арыгінальнай думкі ў мяне аб тых плітах няма. Ды і чаго думаць, калі ўсё зразумела і без таго: сцягнулі іх. І Рогач тут мае рацыю, калі гаворыць, што сам тыя пліты каравуліць не будзе, ахова патрэбна...

— Ахова, кажаш?

— Вядома. А ўпраўленне паставіла аднаго дзядзьку на два аб'екты. Хіба ж ён угледзіць!

— Рогач спасылаецца на вартаўніка. А мне як апраўдвацца?

— Хто цябе прымушае?

— Пакуль што ніхто... Але закрыць вочы, раўнадушным быць?..

— Чаму ты гаворыш «пакуль што»?

— Ёсць падставы.

— Ну, калі гэта тайна...

— Пасля таго як зніклі тыя дошкі, са мною вялі размову таварышы з камітэта кантролю.

— Абвінавацілі цябе?

— Ніхто мяне не абвінавачваў. Але ж у цябе яны не распытвалі.

— Я нават не ведаў, што той гісторыяй з дошкамі зацікавіўся хтосьці яшчэ апрача нас. Ты мне тады нічога не сказаў. Чаму?

— Было — сплыло. Што гаварыць пра тое. Цяпер вось — пліты... Ты хоць не думаеш, што я паклаў іх у кішэньку?

— А пайшоў ты, ведаеш...

— Пастаю лепей. Звані!

— Не, не... Давай па шчырасці. Ёсць у цябе нейкае меркаванне аб тых плітах? Гавары!..

— Сініцын, думаю, ведае, дзе яны,— без крана іх як пагрузіш. Відаць, і Рогач здагадваецца, але баіцца, не хоча звягі. Свята на носе, а калі што якое — цю-цю першынства. Яму ж яно сніцца...

— Не толькі яму. Прэміроўку атрымаць няблага было б.

— А я думаю, што няблага было б падпільнаваць іх. Ідзі звані, кажу... Потым памяркуем...

Валін нумар заняты. Зноў кручу дыск, і ўвесь час бачу за тоўстым шклом кабіны прыжмураныя вочы Казіміра; ён глядзіць на вуліцу, па якой імчыць сіні аўтобус. Мільгануў і знік хутка — я нават не паспеў прачытаць запылёную шыльдачку над кабінай. Магчыма, з Валінай вёскі аўтобус. А чаму мне туды не паехаць? Дапраўды. Вось зараз буду з Валяй гаварыць і скажу, што прыеду ў Залессе. Хоць на дзянёк... А Рогач?.. А пры чым тут Рогач?.. Ах, так... Пліты... Рогач — пліты — Сініцын... І — Казімір, Казімір, Казімір... Значыцца, не зусім гэтак, як ты кажаш:

было — сплыло. Каб жа так. Дошкі зніклі — па яго падазронасць. Ці, можа, выпадковасць гэта, што той чалавек з камітэта Казіміра распытваў? Усё роўна: падазронасць гэтая сцебанула балюча. І чаму менавіта да яго аднаго з гэтым пытаннем?.. Не, мабыць, і з Рогачам гаварылі. Вядома, таму ён так хваравіта і рэагаваў на мае словы... І Казімір цяпер адчувае: зноў падазронасць, зноў пытанні... І, відаць, гэта ён вельмі правільна прыдумаў: падпільнаваць. І выцягнуць гэтых галубкоў на сонейка, няхай усе паглядзяць... Можна нават Барыса ўзяць на дапамогу... Не, толькі мы ўдвух павінны зрабіць гэта: я і Казімір...

Урэшце... Валя... Усё ва мне адразу супакойваецца, набывае ціхую, строгую яснасць. Няма ніякіх клопатаў, няма нават думак пра Казіміра, хоць ён і стаіць амаль побач. Валя зарадавалася, пачуўшы мой голас. Як добра, што я пазваніў цяпер. Яна едзе не апаўдні, як планавалася, а вельмі хутка — машына ўжо чакае. Апошняе мне заданне: рэгулярна наведваць бацьку — ён застаецца адзін. Кожны вечар я павінен быць у яго, і тады Валя будзе спакойная, што са мною нічога не здарылася.

Пагаджаюся адразу ж:

— Добра! Кожны вечар, апроч суботы і нядзелі. У суботу я таксама еду...

— У камандзіроўку?

— Не, па вёску.

— Якую вёску?

— У Залессе. Ведаеш, дзе гэта такая мясцовасць?

— Не рабі глупства,— загадвае Валя, урэшце здагадаўшыся.— У нядзелю мы, магчыма, самі прыедзем. Машына пойдзе па бульбу...

— Бульба? Няхай яна гарам пойдзе!..

Я лунаў амаль на небе ад радасці, што пачуў Валін голас, марыў пра нашы сустрэчы ў Залессі... І вось узнагарода: толькі пра бульбу ў яе клопат. Адкуль такі практыцызм?.. А можа, яна, гэтая практычнасць, неабходная, і нельга ніяк абысціся без яе, і гэта вядома кожнаму і дзівіць толькі мяне, непапраўнага рамантыка?.. Сапраўды, чаму не могуць існаваць побач каханне і бульба?.. Ды не патрэбна мне ніякая бульба. Да д'ябла бульбу. Я хачу ехаць у суботу ў Залессе. Хадзіць з Валяй ля возера. Заганяць човен у чарот і назіраць, як паўзе да вады чырвонае вечаровае сонца...

Казімір робіць мне адчайныя хуткія знакі — трэба за-

канчваць размову; трымаючыся ўжо за круглую ручку дзвярэй, крычу:

— Прывітанне ад Казіміра. І шчаслівай дарогі! Самай шчаслівай!..

— Не надумайся ехаць! — гэта апошнія Валіны словы.

Выходжу, выціраю спацелы лоб — горача было ў кабіне. Казімір абураецца, цягне мяне падалей ад ладнай чаргі, што сабралася ля тэлефоннай будкі.

— Ты звар'яцеў, відаць, палову гадзіны на тэлефоне вісеў!

— Адкуль? Усяго пяць хвілінак.

— Няўжо ўчора не нагаварыліся?

— Гэта яна ўсё гаварыла. А я слухаў. І абдумваў твой план. Ён геніяльны. Не наспім дзве-тры ночкі і зловім галубкоў разам з блокамі.

— Зніклі пліты, а не блокі,— удакладняе Казімір.

— І менавіта таму мы зловім іх!

— Тэлефон пазбавіў цябе здольнасці разважаць лагічна. Кажу ж: плі-ты!

— Правільна. А блокі не чапаюць. І ў гэтым ёсць свая логіка. Пліты яны ўзялі. Што цяпер спатрэбіцца? Блокі! Вядома ж! І яшчэ: ці не Калумб тут арудуе?

— Калумб гэтым не займаецца. Не той размах.

— Тады хто?

— Я з поспехам магу спытаць тое ж і ў цябе. Адказу няма...

Наш план вельмі хутка набывае рэальныя і канкрэтныя формы. Каравуліць будзем па чарзе. Казімір асабліва настойвае: не падключаць да гэтага нікога. І нікому ні слоўца. І, вядома, гэта правільна: лішнім людзям тут рабіць няма чаго. Самае першае, што нам патрэбна,— канспірацыя. Як добра, што Казімір здагадаўся пагаварыць менавіта са мною. Не, ён не памыліўся, надзейнага напарніка выбраў...

У сталоўцы Казімір гаворыць мала, болей маўчыць і, слухаючы мяне, спрытна арудуе лыжкаю. Сёрбаю боршч і я, не адстаю, хоць і заўважаю, што ён крыху халаднаваты і не дужа смачны. Фантазія мая квітнее буйна, малюе ночы, поўныя трывожнага чакання, загадкавых ценей і таямнічасці... І вось з'яўляецца машына, і з яе вылазяць тыя, каго мы пільнуем. Колькі іх?.. Ці ж гэта важна? Няхай іх будзе дзесятак. Усё роўна... Лепшага напарніка Казіміру на гэтай варце не знайсці. Усё як след будзе

зроблена. Пліты знойдзем. На чысценькую вадзіцу выведзем злодзея...

Я паўтараю ўпарта і рашуча:

— Пліты знойдзем! Пабачыш!

Са спакойнай увагаю Казімір бярэ шклянку з камнотам, выпівае, абсмоктвае косткі ад слівы і, прыплюшчыўшы адно вока, лыжачкаю кідае іх на талерку.

— Ты не думай, што ўсё пойдзе на масле. Бывае, не здзяйсняецца і самы лепшы план.

— Значыцца, не верыш у нас?

— Веру!

— А чаго тады гаворыш?

— Ох, гарачая ты галава!

— Табе, прыкмячаю, даспадобы халодныя...

Казімір не дае дагаварыць, кладзе руку на мой локаць і глядзіць паблажліва, і голас яго павучальны:

— Сэрца павінна быць гарачае. А галава — халодная. Што, падзякуем за абед? Час ужо...

Мы вяртаемся на будаўнічую пляцоўку. Зноў сігналіць кран, плывуць са штабеля блокі, жартуе Ткач, зухавата падганяе нас Барыс — знешне ўсё так, як было. Але я прыкмячаю, што настрой ва ўсіх пагоршыўся; нейкі як бы цень у адносінах паміж намі — кожны, мабыць, думае пра тыя пліты, думае моўчкі, маючы, пэўна, свае меркаванні.

І толькі адзін чалавек — Рогач — робіць выгляд, што нічога не здарылася. Ён хмурна паглядае на кожнага, і асабліва на мяне, і штораз, сустрэўшы мой позірк, адварочваецца, і мне тады робіцца не па сабе. Здаецца, Рогач прымерваецца штосьці сказаць мне; карціць ведаць тое, і разам з тым я не хачу яго слухаць. Мяне ўсё яшчэ непакоіць тая абыякавасць, з якой ён паставіўся да тых пліт. І яшчэ высмейваў Казіміра. А словы Сініцына сустрэў памяркоўна і нават заўвагі не зрабіў, хоць той і спазніўся.

Мне цяжка растлумачыць усё гэта, я, баючыся памылкі, не адважваюся ў чым-небудзь абвінавачваць брыгадзіра. Але цяпер, калі я ведаю пра той выпадак з дошкамі значна болей, калі разумею Казіміраву крыўду, дараваць Рогачу тую насмешлівасць, з якою ён гаварыў раніцаю з маім сябрам, не хачу і не магу.

## 9

Мы гуляем з Валіным бацькам у шашкі.

Белыя і чорныя квадрацікі дошкі вагаюцца перад маімі вачыма, зліваюцца ў вялікую стракатую палосу, а круглыя шашкі пухнуць, таўсцеюць, бы добрае цеста, і я ўпотай, каб сагнаць дрымоту, трасу галавою і праціраю кулаком вочы; на нейкі момант усё вакол набывае рэальныя, ясныя абрысы, а потым зноў шэра-белая смуга наплывае на круглыя шашкі, белыя квадраты блытаюцца з чорнымі, і галава мая хіліцца.

Валін бацька рашуча скідвае шашкі ў каробку.

— Стаміўся ты. Кладзіся і спі. Заўтра калі пабудзіць?..

— Не, не... Спаць мне няможна. Сёння — работа...

— Начная? Дык не было ж, здаецца, яе ў вас!

— І цяпер няма,— разумею, што прагаварыўся, але непамыснасці няма.

— А кажаш, работа...

— Дзяжурства. Учора быў Казімір, а сёння мая чарга.

Даніла Анупрэевіч спачувальнаківае галавою, потым з пільнаю ўвагай глядзіць на мяне, чакае, і я адчуваю, што не магу, не маю права нічога ўтойваць.

Ён слухае мяне ўважліва, не перапыняе, але ў яго вачах гусцее, віруе іранічны смяшок, і мне ўсё цяжэй і цяжэй узнесла казаць пра тое, чым мы заняты з Казімірам па начах. Здаецца мне, што лічыць ён наш план дзіцячай забаўкаю.

— Вы, відаць, лічыце, што нешта вартае ўвагі ў нас не атрымаецца? Ці проста не ўхваляеце нашу задуму?

— Чаму? Ухваляю! — пярэчыць Валін бацька, але голас яго гучыць няпэўна.— Яно лепш, чымся сядзець склаўшы рукі. Я заўжды прыхільнік дзеянняў рашучых і смелых. Аднак у гэтым канкрэтным выпадку можна было зрабіць прасцей. Чаму б, скажам, не звярнуцца да такой аўтарытэтнай арганізацыі, як міліцыя?..

— Брыгадзір не хоча.

— І вы баіцеся парушыць субардынацыю?..

— Не! Мы паставім яго перад фактамі. Канкрэтнымі фактамі.

— Значыцца, не давяраеце вы свайму кіраўніку.

— Я б не сказаў. Праўда, асабіста ў мяне да Рогача цяпер нейкая падазронасць. Але ён сумленны чалавек... Толькі, мабыць, не хоча выносіць смецце з хаты. Баіцца пансаваць рэпутацыю брыгады...

Даніла Анупрэевіч паціраэ далонёю твар, рука яго спыняецца на момант на бровах, і тады з-пад пальцаў глядзяць на мяне разумныя і насмешлівыя вочы.

— Рэпутацыю не сапсуеш, калі ў хаце поўна смецця. Яго, дарагі ты мой Лёня, трэба вымятаць адусюль бязлітасна. Як хата чыстая, тады рэпутацыя. І ніякіх тут кампрамісаў!..

— Я разумею.

— І выдатна, калі разумееш... Доўга на той варце?

— Да світання.

— Та-аак... Прыхапі хоць яблыкаў... Усё весялей будзе сядзець...

Ён совае ў маю кішэню яблыкі, і я не вельмі настойліва адмаўляюся: няма ўвогуле ніякага жадання спрачацца, некуды ісці. Зманлівая бель падушкі на канапе, мяккая ўтульнасць пакоя, ветлівы, з усмешкаю, голас Валінага бацькі — усё гэта цягне да ціхамірнасці, спакою; хочацца легчы спаць, адпачыць і ні аб чым не думаць.

Але ісці трэба, і я выходжу з хаты, і Даніла Анупрэевіч, як і ў той раз, калі мы былі тут з Казімірам, крочыць побач да самых веснічак. Неяк непамысна ад таго, што стары чалавек дзеля мяне выходзіць з пакоя, тупае па сырой сцежцы, і я не ведаю, як папрасіць, каб ён варочаўся ў хату — баюся пакрыўдзіць.

— У суботу, Лёня, што робіш? Хаця, табе ж зноў варта выпадае...

— У суботу, думаю, ніякай варты ўжо і не будзе — зловім! На суботу ў мяне запланавана Залессе. Паеду, памагу ім там з бульбаю...

— Прыпазніўся. Сёння мы там усё ўладзілі.

— Вы ж казалі, што не паедзеце!

— Выпала так... ды і работы там было — дзесяць сотак упарадкаваць!.. На дзве гадзіны клопату!..

— Як там Валя?..

— Спявае...

Мы развітваемся, і я шыбую па вуліцы, але ведаю, што Валін бацька стаіць на вуліцы і глядзіць мне ўслед; крыху спагадзя чую сухі пошчак — зачыняюцца веснічы. Сну ўжо няма, і пакрысе сплывае добрае, радаснае ўзрушэнне, што буяла ва мне. Валін бацька быў сёння ў Залессі. А мне ж учора не сказаў, што паедзе. І неяк дужа ж каротка адказаў на маё пытанне. Спявае. Ну і ну...

Наш новы дом маўклівы, ціхі. Прымошчваюся на сухія дошкі, што пакладзены ў кутку другога паверха ля сцяны,

сяджу ціха, прыслухоўваюся. Учора тут сядзеў Казімір — марна патраціў ноч. Няўжо і сёння ніхто не прыедзе? Гэта проста нетактоўна з боку тых, каго мы чакаем. Навошта губляць час? Патрэбны вам блокі? Прыходзьце, калі ласка. І вам будзе лепей, і нам спакайней...

Ноч хмарная, але цёплая. Пусты пакой новага дома сыры і змрочны; чую, як блукае вецер, здзьмухвае абсохлы пясок з аконных праёмаў, і ён асядае на цэмент падлогі з ціхім шамчэннем; недзе на лесвічнай пляцоўцы заварушылася скамечаная газеціна і трывожна шахціць, бы сухое дубовае лісце ў позшою восень ад сцюжы.

Ноч...

Далёка за горадам бязгучна сякуць неба крывыя маланкі: навальніца вельмі далёка, здаецца, у бок Залесся. Там Валя. Што яна парабляе цяпер?.. «Спявае...» Як гэта разумець? Вось пачакай, прыеду ў суботу і пагляджу, якія там песні. Як тады яна падхапілася: «Не надумайся маехаць!..» А ў голасе — ну аніякай строгасці. Таму, мабыць, і сказала так, што сама хоча, каб прыехаў, але баіцца залішніх турбот для мяне. А можа, якая прычына? Не, ніякай прычыны няма. Чакае. І я не магу не прыехаць. Гэта ж блізка зусім. Нават калі б Залессе было і далёка, я б усё роўна паехаў. Адно толькі, вартаванне каб не затрымала. А што вартаванне? Казіміра папрашу. Ён пагадзіцца, ён жа ведае, што ў Залессі Валя мяне чакае...

Гэта вельмі добра, калі цябе чакае сапраўдны сябар. А Валя — мой сябар самы лепшы, самы сапраўдны. Я веру ёй ва ўсім. Веру і кахаю. Гэта, мабыць, адно і тое ж: каханне і вера. Кахаць па-сапраўднаму можа толькі сябар сапраўдны. І сапраўдны сябар павінен быць бязлітасна шчыры ва ўсім. Толькі тады сяброўства будзе жыць. І Валя гэткая. Як яна лаялася, што я ў час не напісаў Віктару. Праўда, тады не вельмі даспадобы прыйшліся тыя папраканні, але я цвяроза паставіўся да іх і не пакрыўдзіўся. І гэта было, відаць, правільна, бо Віктар пастрачыў мне адказ вельмі радасны і ўдзячны.

Ліст той ляжыць у маёй кішэні — атрымаў яго сёння. Віктар трывожыўся, што доўга няма ніякіх звестак з Прыдзвінска, і быў узрушаны, убачыўшы на канверце мой подпіс. Гэтак ён піша. Разам з тым ён і здзіўлены незвычайна і раззлаваны, што я не даў згоду на завочнае. «Не выкарыстаць такую шчаслівую магчымасць. Ды навучыў-

ся б год які і перавёўся на дзённае аддзяленне. Галоўнае — уцісяуцца...»

І з усіх гэтых слоў адно неяк асабліва ўелася ў памяць, адасобілася, выклікае вострую непамыснасць. «Уціснуцца...» Вось як ён разважае. І яшчэ ў вялікую заслугу сабе ставіць: хадзіў, маўляў, узнімаў вэрхал у дэканаце. Не, вельмі правільна я зрабіў, што паслаў тэлеграму і не пагадзіўся ехаць. Нібыта прадбачыў тое, аб чым цяпер піша Віктар...

У кішэні побач з канвертам ляжыць яблык. Зусім нядблага, што ён апынуўся тут — смачны, сакавіты. У пустым пакоі ўсе гукі нейкія грубыя, быццам прапушчаныя праз узмацніцель — здаецца, за добрую вярсту чуваць, як хрумстае яблык у роце; адкусваю маленькія кавалачкі, асцярожна сціскаю іх зубамі, услухоўваючыся ў ноч.

Па той бок вуліцы за маладым паркам атухае святло ў вялікім доме; згасае ў адным акне, у другім, трэцім... Нарэшце на чорным прамавугольніку сцяны, на апошнім паверсе, застаецца адзіны светлы квадрат. Мінае час, а ён усё свеціцца, і я гляджу на гэтую зыркую пляму наперадзе, пад самым дахам. Дзесь далеч усхліпнуў гудок цягніка. Завуркатаў катэр на Дзвіне. Далёкі, невыразны голас дынаміка раптоўна выплыў і знік.

Галава мая цяжэе, хіліцца долу. Выцягваю з кішэні другі яблык, паціху ем, і гэтым адганяю сон, і гляджу на тое адзінае асветленае акно ў доме за маладым паркам. Магчыма, радасць, а мо і гора за тым светлым квадратам акна... Вось нейкі быццам цень наплыў на яго — чалавек, здаецца, падышоў да фіранкі і спыніўся. Бачу невыразныя абрысы маўклівай і нерухомай постаці, спрабую ўявіць сабе гэтага чалавека. Але сон мружыць вочы, глядзець усё цяжэй, і светлы квадрат як бы аддаляецца, адыходзіць углыб, і ў той глыбі паквысе абмалёўваецца знаёмы пакой, маленькі столік, за якім сядзіць Валін бацька. Даніла Ануфрэевіч расстаўляе на дошцы шашкі, а Валя ўзнімаецца з канапы, пачынае абурацца: і ноч, маўляў, а яны гуляць надумаліся...

Сон адлятае адразу ж, як толькі памроіўся Валін голас. Узнімаюся з угрэтых дошак і ледзь не падаю — ногі знямелі. Акно ў доме за паркам свеціцца па-ранейшаму, але цяпер у ім няма ніякіх абрысаў і святло блеклае; і цемра над дахам пасвятлела — пачынаецца світанне.

Ціхі туман спавіў дрэвы ў парку, шаты іх нерухомыя і круглыя, як чорныя брылі; добра відаць пустынная ву-

ліца і блокі, што акуратна складзены ў штабель — іх ніхто не чапаў. Хутка ўзыдзе сонца, і стане зусім светла. Можна ісці дамоў. Яшчэ адна ноч страчана марна. Я ціха лаюся: ці доўга яшчэ чакаць нам? А мо і ўвогуле дзіцячая гэта забаўка?.. Не. Проста стаміўся я. А чакаць і вартаваць трэба...

Сонныя вуліцы ціхія і пустыя. За паркам па тратуары шваркае мяцёлкаю дворнік; ветру няма, і пыл шэрым воблакам вісіць над вуліцаю, і я спяшаюся хутчэй прамінуць яго, і бачу падазроны позірк дворніка: адкуль гэтак ранепька шнуруе хлопец...

А пыл ужо за спінаю, ззаду, і халаднаватае свежае паветра лашчыць твар, але сапліваецць яшчэ ва ўсім целе, і я іду і слухаю глухі поштак сваіх крокаў, і пазяхаю так, што аж слёзы набягаюць на вочы і баляць скіўіцы. Зараз прывалакуся, бухну на ложак, і — усё.

Інтэрнацкія дзверы адчыняю асцярожна, каб не пабудзіць Барыса. Дзіва. Ён і не спіць. Стол спрэс закіданы паперамі, спісаныя фіялетавым чарнілам аркушы раскіданы па падлозе, вісяць на спінцы крэсла і нават на белым абажуры настольнай лямпы; шумна вітаюся, узнімаю з падлогі аркушы, спісаныя з абодвух бакоў.

— Што ты тут накрапаў за ноч?.. Паглядзім! Усе геніі працуюць па начах...

Барыс павольна, бы ў нейкім сне, узнімаецца, адбірае ў мяне рукапіс, акуратна кладзе аркушы ў абтрапаную жоўтую папку; вочы ў яго стомленыя, але шчасліва-летуценныя.

— Гэтай ноччу... Ведаеш, што адбылося гэтай ноччу?..

— Ты не клаўся яшчэ спаць і сапсаваў мех паперы.

— Не, Лёня... Паперы я сапсаваў мала...

— Значыцца, ідзеш дарогаю класікаў. Якуб Колас (бачыў гэта ў ягоным музеі) часцяком пісаў на абодвух баках кожнага аркуша.

— Не, ты паслухай... Застаецца напісаць толькі адзін раздзел. Апошні! Апошні раздзел, і — гатова кніжка!

— І ты марудзіш? Садзіся і габлюй!..

— Не магу, Лёня. Не абдумаў як след... Разумееш, сяджу вось, думаю, думаю... І не ведаю, чым скончыцца гэтая гісторыя. Яе крок разумею. А вось ён?.. У задуме было ясна ўсё... Але цяпер ад тае задумы нічога не засталося, план недзе ўбаку... Ты разумееш? Яна напісала ліст Раману, не схацела нават размаўляць з ім... Што ён павінен зрабіць?.. Якое рашэнне прыняць?..

Ён глядзіць з яснай радасцю, шчырай развагай і з такім летуценным одумам, што ад маёй іроніі нічога не застаецца — не магу больш жартаваць, не магу кпіць з яго працы: упершыню па-сапраўднаму веру, што Барыс стане пісьменнікам, што ён, мабыць, сапраўды напісаў кнігу, пра якую марыў даўно. У маўклівай павазе, з якой ён прыняў з маіх рук узнятую з падлогі паперу і паклаў яе ў папку, у гэтых пяроўных, наспешліва спісаных і пакрэмзаных старонках, што скрозь ляжаць на стале, у задумлівых Барысавых словах, у летуценным бляску яго вачэй адчуваецца спакойная, цвёрдая ўпэўненасць, і аб яе, як тонкае шкло аб камень, разбіваецца мая пасмешлівасць. Раптам прыгадваецца начное акно, тое адзінае, што свяцілася ўсю ноч пад дахам пятага паверха ў доме за паркам.

— Твой Раман нічога не павінен рабіць. Ён моўчкі прачытае ліст і гэтак жа моўчкі падыдзе да акна. А за акном — сонны горад. І ноч. Ціхая, харошая... А ён будзе стаяць ля акна да світання і глядзець на горад. Ён будаваў гэты горад, але ў ім ніколі не будзе жыць жанчына, якую ён кахае.

— Ніколі?

— Вядома. Хіба можна жыць там, дзе цябе не кахаюць?

— Ты прыдумаў гэта? Ці чытаў дзе?..

— Бачыў. Сёння поччу... Гадзіну прыдрамну цяпер. Накруці, будзь ласкаў, будзільнік...

— Гэта, мабыць, маё шчасце, што мы жывём разам. Каму-небудзь другому сорамна казаць пра сваё пісанне. А табе вось магу.

— Закон гісторыі: побач з геніямі заўжды жывуць простыя людзі. Ты правільна паставіў будзільнік?

— Першы экземпляр я аддам табе. Як толькі кніга надрукуецца...

У яго голасе ўдзячнасць і павага, нейкая асаблівая цеплыня, з якой ён ніколі раней нічога не казаў мне.

Верхнія шыбы акна ўжо барвовыя — узыходзіць сонца. Барыс зноў схіліўся над сталом, незвычайна строгі, сур'ёзны, але піша ён ці проста сядзіць над рукапісам, я ўжо не бачу — вочы міжвольна закрываюцца, і я лячу ў мяккую прорву сну.

## 10

Суботні ранак.

Верасиёвае сонца толькі што выбілася з-за хмар, бы абцёрлася аб іх; святло яго зыркае, праменістае, як улетку. А Дзвіна ўжо — з вышыні чацвёртага паверха яе добра відаць — восеньская, цёмна-бурая, шырокая ад аблажных дажджоў; лазнякі на ўзвалах пярэстыя, то попельнашэрыя, то жаўтлявыя, з грывамі блакітна-белага туману; і гэткі ж туман дымна курыцца над мокрымі і бліскучымі дахамі хат за ракою.

Часу ўбачыць усё гэта хапае — самазвала з цэментавым растворам усё яшчэ не відно. Рогач зноў — у каторы раз ужо па гэтым ранку! — непакоіцца, пачынае лаяцца, абурана ляскае брызентавымі рукавіцамі.

— На палудзень сонца верне, а гэтай шафярні і не свярбіць. Давайце хоць блокі ўзнімаць будзем. Каб не прастойваць потым...

Адзін за другім кран прыносіць з зямлі пяць халодных і вільготных ад расы блокаў. Больш іх узнімаць на перакрыцце не варта — будуць замінаць, і мы спыняем работу.

Казімір, выцягнуўшы рукі, кладзецца спінаю на гладкую бакавіну блока.

— Э-ээх, люблю суботку. Кароткі дзянёк! Ляціць — не заўважаеш. А панядзелак не люблю... Што там пішуць у газетах, Барысе?..— Барыс заняты чытаннем, не адказвае, і Казімір, майструючы кепку пад галаву, уздыхае.— А я не люблю чытаць газеты зранку. Прывык па вечарах. Дамоў прыйдзеш, павячэраеш, на канапку прыляжаш...

— Газеткаю накрыешся, заснеш,— кідае Рогач, падладжваючыся пад спакойны Казіміраў голас.

— І гэта бывае... Але сёння на тое часу не хопіць. Падскочу на Пяскі. Учора сусед прывалок адтуль ляшчоў. Па рыдлёўцы кожны! Дык што пішуць, Барысе?

— Пачакай, дачытаю. Фельетон тут...

— Тады каб усе чулі. Луні ўголас. Вось і Лявон чакае...

Барыс пачынае чытаць, і я слухаю яго і вывучаю дом за маладым паркам. Вывучаў учора і вывучаю сёння. І сёння, як і ўчора, не магу вызначыць дакладна, дзе тое акно, што свяцілася тады да самага рання. Учора, здаецца, я знайшоў яго — другое акно ад краю,— а цяпер пачынаю вагацца. Ці, можа, трэцяе?.. Так, мабыць, трэцяе, бо высокі комін за домам чарнеў якраз напроці, а злева быў балкон, і святло з акна адбівалася на вузкіх жалезных балясках... Так, трэцяе... Гэта — яно.

Сонца — яно ўжо над дахам — свеціць мне ў вочы, і шкло акна, што гэтак прыцягвае ўвагу, незвычайна цёмнае, зусім не падобнае на ўсе астатнія. Увогуле яны ўсе розныя, гэтыя вокны. Вось у першым ад краю фіранка доўгая, але на надаконні сабрана ў пук і нечым завязана; у другім адчынена фортка, і фіранка закрывае толькі адну палавінку, левую, і вісіць няроўна, быццам да яе нешта прычэплена, а побач балкон, і дзверына яго адчынена, і белы цюль да самай падлогі. Толькі мае, тое трэцяе акно над дахам, нічым не прыкрыта і цьмяным квадратам уціснута ў сцяну.

— Слыш, Лёнь, ты ніколі не рыбаліў на Пясках?

— Там мелка...

— У тым і штука! Вады зараз нагнала, а яны на мелкаводдзе з віроў пруць. Я ўчора зірнуў на тых ляшчоў — затрэсла ўсяго. Ну, як рыдлёўкі, не раўнуючы...

Ніяк не магу даўмецца, навошта Казімір зноў заводзіць гэтую гаворку? Сапраўды збіраецца ехаць сёння на тыя Пяскі вудзіць ляшчоў?.. Учора — ведаю гэта дакладна! — у яго не было ніякіх планаў на суботу. Усё роўна... Учора не было, а сёння ёсць... І няхай. І няхай ён едзе вудзіць тых ляшчоў. Але навошта мяне спакушае? Ён жа ведае: сёння мая чарга вартаваць блокі і я нікуды не магу ехаць. Можа, таму і гаворыць знарок? Пэўна ж, бо ведае: у суботу я збіраўся ў Залессе да Валі.

Нерэальным і немагчымым здаецца мне цяпер тое, што я казаў Валінаму бацьку — папрашу Казіміра падмяніць мяне. Як папросіш яго цяпер? Нельга парушаць нашу сяброўскую ўмову. Учора ён не спаў. Сёння мая чарга... І я не маю права (падумаеш, у Залессе яму захацелася ехаць) прымушаць Казіміра зноў не спаць... Каб паразрывала таго, хто сцягнуў нашыя пліты. Праз нейкага нягодніка я павінен пакінуць Валю адну ў Залессі... І калі? У суботу...

Унізе вуркоча самазвал.

— Ну, урэшце цэмент! Я зараз табе гарбок намылю, лайдак няшчасны!

Рогач падхопліваецца, кідаецца па лесвічных прыступках уніз, і праз нейкі момант у вуркатанне матора ўплятаецца яго абураны голас:

— Ты што гэта мне? Да паўдня нас затрымаў! Хочаш, каб пусціў дакладную ва ўпраўленне? Ма-агу!..

— Не грымі, прараб. Дзень толькі пачынаецца. І не псуй настрою. Субота. І сённяка цешча імяніпніца!..

— Табе імяніны, а ў мяне людзі прастойваюць! І колькі ж ты прывёз? Чаму гэтак мала?..

Шафёр глядзіць дабрадушна, прыгладжвае чупрыну; карычневая, на «маланцы», куртка — наросхрыст:

— Норма, прараб! Дзяржаўная.

— А чаму Дайлідзёнак не ў рэйсе?

— Не ведаю, прараб, не ведаю! Цяпер на мяне ў вас надзея.

— Яно адразу і відно, якая тут надзея. Слёзы.

— Каму слёзы, а каму і смех... Выгружаем?

— Давай, давай! Не стой толькі!..— патрабуе Рогач і, крыху супакоіўшыся, шыбуе да нас.

Кораб самазвала пакрысе наўкоса ўзнімаецца; шэрая хваля раствору паціху шкрабае жалеза і, раптам адкінуўшы задні борт, падае з шолахам на дол; рыпяць бартавыя крукі, і ланцуг глуха стукае аб пусты кораб. Шафёр неторапка шваргае рыдлёўкаю па жалезным дне самазвала, потым залазіць у кабіну, але марудзіць, не ад'язджае і пранешта гамоніць з Зінаю; гаворка ў іх ціхая, не чуваць ніводнага слова, далятае толькі смех Зіны — вясёлы і крыху збянтэжаны.

Рогач зноў абураецца:

— От жа лайдакі! Цяпер хаханькі наладзіў! Грузіце коўш! Пакліч, Зіна, Ткача, няхай паможа! Чуеш, Паўло! Памажы коўш насыпаць!..

— Чую. А як жа!

Ткач бярэ ў рукі рыдлёўку. Утрох яны хутка загружаюць коўш з каптуром, і кран узнімае яго.

— Давай ад'язджай! — гукае Рогач з вышыні: — Чаго пастаў?

Шафёр нібыта і не чуе, закурвае і, высунуўшы галаву з кабіны, сочыць за попельным ад застыўшага раствору каўшом, што паволі сунецца ўверх.

Зіны ўнізе няма, яна ўвайшла ў пад'езд і вось ужо тут, ля нас. Стала на адкрытай пляцоўцы, пры самым краі пліты, узняла руку, бы дала нейкі знак; і адразу ж унізе раве матор, і самазвал, даўшы кароткі сігнал, з грукатам выкатваецца на вуліцу.

А Рогач — на ўвесь голас:

— Не стой на краі! Гарошка, каму гаворыцца?

Зіна збянтэжана ўздрыгвае ад гэтага нечаканага і рэзкага папярэджання; наважылася штосьці сказаць прарабу, але быццам праглынула словы — моўчкі адышла.

— Што яму сёння? Як свярбіць паўсюль... Невядома, завошта шафёра аблаяў. І на Зіну крычыць...

Казімір гаворыць гэта ціха, змрочна зыркнуўшы на прараба, але тоії пачуў.

— Хто лаяў? Няхай працуе як след... А ён тут цыгаркі пакурвае. А яна ручкамі водзіць...

Праўда, нібыта падмянілі сёння Рогача (ён жа ніколі ні ў чым не папракнуў Зіну), нейкі ўзвінчаны, раздражнены. І Казіміра не пазнаць — набычыўся, у вачах незнаёмы халодны шал, і мне хочацца суцешыць яго, супакоіць.

Але тут умешваецца Зіна.

— Куды кладзём раствор? — пытаецца яна.— Раствор вельмі добры сёння.

Голас яе падзіва будзённы, нават крыху насмешлівы, і спрэчка, што вось-вось не пыхнула агнём, атухае.

І зноў усё, апрача працы, адыходзіць на другі план. Ва ўсіх адзін і той жа клопат — блокі, і мы кладзём іх хутка, адзін за другім. У мяне не хапае нават часу глядзець на акно, пра якое вельмі шмат думаў зранку, не хапае часу папытаць Казіміра пра заўтрашнюю рыбалку і пагаварыць з ім пра новага шафёра.

Пра Залессе, аднак, памятаю, намагаюся перакапаць сябе, што нічога не здарыцца, калі я і застануся, не паеду, але з гэтага нічога не атрымліваецца. Валя чакае. І я павінен быць там. Мне абавязкова трэба паехаць у Залессе.

Але як? Кінуць варту?

Нельга. Папрасіць Казіміра падзяжурыць? Але якое ў мяне ёсць права на тое? Ніякага.

Далёкае і якое ж ты блізкае, Залессе!

Кран не паспявае насіць з зямлі блокі: пакуль трос апусціцца ўніз, пакуль Ткач зачэпіць па яго крукі, мы ўжо зараўнавалі ў шчылінах раствор, падрыхтавалі месца для новага блока. Усё часцей і часцей Рогач весела крычыць з вышыні:

— Гэ-эй, Сініцын! Марудна штось лётаеш. Давай хутчэ-эй!

Вакол нас сонца і вецер; у блакітнай высі плывуць рэдкія, як камякі снегу, белыя воблакі, а за імі паклаўся неяк дужа блізкі блакіт — чысты і ясны; кружацца галубы, таксама высока, пад самымі хмарамі, і вельмі маленькія.

Дзьме вецер, угрэты сонцам, спавіты пахамі блізкай ужо восені, і ад яго павеваў шухцяць, асыпаючыся на дол, пясчынкі, ціха спяваюць блокі. Тут, на вышыні, гэта вельмі выразна чуваць: паставіш шчыльна вуха да халоднай, крыху шурпатай паверхні і адразу адчуваеш ясны звон, быццам там, у сярэдзіне белага цэментавага бруса, нацягнуты тонкія струны і іх нехта ўвесь час памалу кратае — песня працы, сонца і ветру. Мабыць, не толькі я чую яе. Зусім нядаўна хмурны і злосны быў Рогач, а цяпер яго не пазнаць: каўнер кашулі расшпілены, твар лагодны, на вуснах добрая і цёплая ўсмешка; і Казімір супакоіўся, нешта ўсё ціха насвіствае, і ў яго вачах і знаку няма таго халоднага і дзікага шалу; спакойна і дзелавіта арудуе кельмаю Барыс.

На душы ў мяне хораша. Вельмі хораша. Толькі той, ранейшы клопат — Залессе! — жыве, не знікае. Але цяпер я думаю пра яго, як пра нешта даўно вырашанае, без трывогі і крыўды на Казіміра. Сапраўды, чаго прывязаўся да гэтай суботы? Хіба нельга паехаць нядзельным ранкам? На аўтобус ранішні калі паспею — поўны дзень наш. Часу на ўсё хопіць: і бабульцы памагчы гародчык упарадкаваць, і на чоўне па возеры пакатацца, і рыбы на вячэру злавіць...

Кран прыносіць з зямлі крыху вільготныя, з прыстаўшымі пластамі жвіру блокі — ляжалі ў глыбі штабеля; даводзіцца абшкрабваць кожны, а гэта парушае ранейшы рытм, кладка замаруджваецца, і знізу нас зноў падспешваюць.

Рогач надумаў:

— Няхай Зіна ідзе ўніз і паможа пачысціць. Калі блок без жвіру,— мы тут самі ўправімся...

Зноў плывуць з зямлі блокі, цяпер ужо без рудых пластоў жвіру па баках, і нам не трэба губляць час на абчыстку, і мы стаўляем іх без затрымкі. Змену заканчваем весела, з жартамі. Брыгадзір наш задаволены.

— Ну, хлопцы, арлы вы ў мяне! Каб гэта раней раствор далі, мы б, пэўна, пліты са дзве на пяты паклалі...

Ён урачыста аглядае гладкую, роўную сцяну, потым падыходзіць да Казіміра, гаворыць сціхана і як бы крыху вінавата:

— Раніцаю ты правільна гэта мне... Пагарачыўся, ведаеш. Але злосць узяла... Кожная хвіліна — золата, а яна стаіць і ручкамі памахвае...

— Дык гэта ж брат ейны!

— Тут будоўля. І час для спатканняў непадхадзяшчы...

Рогач абсякае Казіміраў дакор сваім ранейшым загадным тонам, але голас яго гучыць непераканаўча: здаецца, што Рогач сам не надта верыць у тое, аб чым гаворыць.

— Усё роўна,— зноў пярэчыць Казімір.— Трэба быць чалавекам.

— Навіну, Казя, адкрываеш. От паставяць цябе брыгадзірам. Што людзям гаварыць? Работа ёсць работа, а ўсё іншае — потым. Гэта і патрабаваць будзеш...

— Трэба быць чалавекам!

— А я каму замінаю?..

Прыкра і непамысна мне ад іхняй спрэчкі. Раней, нават зусім нядаўна, да выпадку з плітамі, я лічыў Рогача шчырым, мяккім чалавекам і, заўважаючы часам яго грубасць, сабе па-свойму тлумачыў яе: за ўсё на будаўнічай пляцоўцы ў першую чаргу ён адказвае. Але цяпер у гэтых іранічных і, па сутнасці, зняважлівых словах учуў я і абыякавасць да Зіны, і непрыязнасць да Казіміра, і пагардлівае стаўленне да ўсіх нас. Так ён, мабыць, ацэньваў кожнага толькі з пункту гледжання працы, нормы, якую мы выконвалі альбо не выконвалі, па-свойму любіў нас, паважаў — гэта я ведаю дакладна,— але пад гэтым пачуццём жыло другое, іншае, што праявілася вельмі ясна цяпер.

Не ведаю, пра што думае Казімір: вочы ў яго прыжмураны, губы сціснуты, і глядзіць ён толькі на свае рукі; не пагаджаецца, вядома, але стрымлівае сябе, не хоча спрачацца.

Рогач прыкмячае нашу маўклівую нязгоду з яго словамі.

— Ну — смехата! Ды што вы на мяне наставіліся, як каты на сала? Брыгадзір ім кахаць забараняе! Кахайце сабе на здароўечка!..

Ён глядзіць на нас, цяпер ужо не пасміхаецца і ў яго ўладарным голасе іронія і насмешлівасць. Значыцца, нічога не дараваў Казіміру, пакрыўдзіўся і не хоча прымірэння. Сухар Рогач альбо жорсткі і не вельмі шчыры чалавек?..

Выходзім на вуліцу разам з Казімірам. На скрыжаванні, ля крамы «Гародніна і садавіна», дзе звычайна развітваемся, я першы працягваю руку, але ён быццам і не заўважае яе, са смяшком ляпае мяне па плячы:

— Пачакай развітвацца. Падскоч са мною на аўтобусную. Возьмем білет.

— Хіба на Пяскі аўтобусам?

— Не, туды чоўнам трэба. А вось на Залессе — можна. Ці перадумаў і не хочаш ехаць?

— Чаго ты чэпішся да таго Залесся?

Ён глядзіць на мяне спачувальна і нават усміхаецца — шчыра, адкрыта, без іроніі.

— Дзівак! Да сасонкі мне тыя лядзчы? Гэта ж я фіцію табе смаліў...

Нейкі час маўчу, не ведаючы, што рабіць. Радавацца? Падзякаваць Казіміру і адмовіцца? Абурацца?..

Казімірава прызнанне ўзрадавала і быццам у чымсьці пакрыўдзіла. Чаму ён маўчаў дагэтуль? Чаму ўдзень, калі я думаў пра Залессе, злаваў, трывожыўся і бедаваў, ён нічога мне не сказаў, цягнуў да апошняга, а цяпер раптам падае мне сваё рашэнне, якое, на яго думку, трэба і можна абавязкова выконваць? Хіба я павінен пакорліва рабіць толькі так, як гэтага захочацца яму? Чаму, зрэшты, ён перакананы, што я паеду ў Залессе? А мне, можа, і не хочацца ўжо гэтага.

— Не паеду туды я, відаць...

— Яшчэ як паедзеш!

— Бо гэтак вырашыў Казімір?

— Цябе там чакаюць. Таму!..

І я не магу пярэчыць, спрачацца. Гэта ж праўда, што мяне чакае Валя і я хачу ехаць у Залессе. І таксама праўда тое, што мне цяжка зрабіць гэта — прыняць прапанову Казіміра і паехаць. Але чаму? Казімір прапаноўвае (нават больш), настойліва патрабуе таго, аб чым думалася ўвесь дзень... А я не радуюся, злую, спрабую ў нечым абвінаваціць свайго сябра, пасварыцца з ім, вагаюся, не ведаючы, ці варта шчыра сказаць аб сваіх думках... Ці, можа, чалавек увогуле робіць так заўжды і гаворыць услых толькі маленькую частачку з таго, чым устрывожаны і пра што думае?..

Казімір настойліва падштурхоўвае мяне.

— Будзем марудзіць — без білета застанешся. Сёння ж субота. І не рабі, калі ласка, такі жалобны твар. Хацеў папрасіць мяне ўдзень, каб я падзяжурыў гэтую ноч?

— Хацеў. Але цяпер...

— І гэта гаворыць сябар! Я ж ведаю: ты вельмі хочаш ехаць.

— Шчаслівчык! Усё ён ведае!

— Не разлічвай — не пасварымся. Хадзем лепей, дарогаю раскажу табе адну гісторыю. Не вельмі вясёлую, але павучальную...

Ён цягне мяне за руку, і я, як малы, не пярэчу і іду за ім. І гэтая мая пакорлівасць невядома чаго крыху бянтэжыць, адчуваю набліжэнне чагосьці трывожнага. Можа, што здарылася ў Залессі? І Казімір ведае, і пакуль што не хоча нічога казаць, і таму гэтак настойліва выпраўляе туды?

— Слухаю тваю павучальную гісторыю. Мабыць, пра аднаго хлопца, які не зразумеў свайго сябра?

— Пра дзяўчыну...

— Нават гэтак! Калі ўдзельнічае дзяўчына — гісторыя заўжды цікавая...

— Не, дружа, тут яна трагічная. Хлопец, якога дзяўчына кахала, загінуў напярэдадні вяселля. Амаль неверагодны выпадак... Мінула пасля таго тры гады... Зіна знайшла сілы жыць і працуе цяпер, і адзін хлопец кахае яе...

Ягоныя словы падобны на цяжкае каменне: яно падае на мяне, начыста сцірае фальш маіх жартаў, б'е мяне, і я амаль фізічна адчуваю боль удараў.

— Зіна?! З нашай брыгады?!

— Так. Я табе кажу пра Зіну. І хлопец, які кахае яе, таксама працуе ў нашай брыгадзе. Гэта Казімір. Ты, відаць, яго крыху ведаеш...

Кроў шугае ў твар, даўкі камяк перасядае ў горле — і адразу цяжка, невыносна цяжка дыхаць. У кароткі трывожны міг пралятае ў думках усё, што я ведаю пра Зіну. Першая наша стрэча ля тэлефоннай будкі... Вось чаму тады так моцна ўразілі мяне яе вочы... Потым хмарны дзень, і дождж, і яе з'яўленне ў нашай прарабцы... І я — дурное, наіўнае хлапчанё! — лічыў сябе дальнабачным чалавекам. Якая наіўнасць. Якая слепата.

— Казя... Я ёлуп. Ты даруй мне...

— Вось я сёння ледзь і не счапіўся з Рогачам. Яму толькі план давай, толькі графік, бо за той план яго лаюць ва ўпраўленні. А не лаюць за сэрца, калі яно баліць чалавеку...

— Казік, дарагі... Я не ведаў...

— Каб жа толькі гэта! Ты не ведаеш, напрыклад, як цяжка быць аднаму. А я ведаю. Я сядзеў там, і ў мяне было вельмі багата часу паразважаць над тым, што звязвае людзей. Ля мяне былі розныя... Але мне і пашчасці-

ла: я знайшоў і сапраўднага сябра. Ён застаўся ў тых краях і працуе, а я паехаў і тут пасябраваў з табою, і веру табе... Хіба можна мне паехаць лавіць ляшчоў, ведаючы, што ты сядзіш у каробцы і каравуліш нейкіх паразітаў, а Валя нудзіцца, чакае ў Залессі?

— Але ты мне нічога не сказаў удзень.

— Проста сачыў за табою.

— І чакаў, што буду прасіць?..

— Сябра не трэба прасіць. Сябар павінен разумець усё сам. А калі гэтага няма — чаго варта сяброўства?..

Зрок мой неяк раптоўна і моцна абвастрыўся, усё навокал быццам наблізілася, набыло незвычайную абрысную яснасць: круціцца пыл па шчарбатым асфальце, і конаюць, бы маленькія каляровыя мышы, скамечаныя паперкі, суха шахцяць; таполі ўсцяж тратуараў стаяць амаль нерухома — вецер не кранае іх,— і бліскучая сінеча над дахамі пасечана зыркімі промнямі; ідуць насустрач людзі, абганяюць нас; у тэлефоннай будцы хлопец прытрымлівае рукою дзверыну, якая ўпарта не хоча зачыняцца, а дзяўчына рагоча і нешта крычыць у трубку.

— Вось тут я ўпершыню ўбачыў Зіну,— кажу я Казіміру, разумеючы, што не павінен дзякаваць яму.— Яна званіла па тэлефоне...

— Мабыць, ты захочаш усё расказаць Валі?

— Калі дазволіш.

— Раскажы. І яшчэ, папытай у рыбакоў, ці ідзе на спінінг судак. У Залескім возеры яго, кажуць, поўна.

— Папытаю.

— Тады мы неяк і падскочым разам... А цяпер паспяшаемся. Табе ж нешта і сабраць трэба.

— Толькі рукзачок захаплю...

Здаецца, ніколі не было ў мяне гэткай упэўненасці, як цяпер, у свае сілы і здольнасці і жыццё не ўяўлялася такім цудоўным. Я хутка ўбачу Валю і абавязкова раскажу ёй пра ўсё: пра мужнасць Зіны, пра свае думкі, пра шчырасць Казіміра... Гэта вельмі добра, што мы пасябравалі з ім. І гэта вялікае шчасце, што ёсць у мяне такі смелы, шчыры сябар.

І ён праўду кажа: сябра не трэба прасіць. Сябар павінен усё разумець сам.

## 11

Ва ўсім наваколлі адценне казачнасці і несапраўднасці.

Неба яснае, празрыста-сіняе, падзеленае белым следам рэактыўнага самалёта на дзве роўныя палавінкі; след гэты адбіваецца ў люстраной паверхні возера, і яно таксама падзелена напалам, і зыркі водсвет ад той белай паласы вісіць над прыазёрнай лугавінай, ападае на блакітна-чорны лес і пакатыя пагоркі за возерам; пагоркі рудыя, як бы мядзяныя, недасягальна далёкія і загадкавыя; сінеча-смуга трапечацца ў азёрным чароце, і ў ёй, як у дрыготкім тумане, зялёныя шаблі аеру выдаюць шырокімі і велізарнымі.

Пахне антонаўкай і свежаўзаранай зямлёю.

Я гляджу, зачараваны, на заазёрную далеч і амаль п'яны ад гэтай сінечы, ад бляску сонца, ад пахаў яблыкаў і сухога бульбоўніку, адтаго, што побач Валя; у грудзях не месціцца радаснае, амаль дзіцячае захапленне.

Адчынена акно хаты, і Валіна бабуля кліча нас:

— Дзеткі, дзеткі! Талеркі паставіла ўжо! Кідайце! Паямо спачатку...

— Зараз! Зараз прыйдзем. Колькі тут і застаецца,— гукае ў адказ Валя і патрабавальна загадвае мне: — Працуй! Ты нешта часта на неба пазіраеш, і я, на цябе гледзячы, спынілася...

— Потым пойдзем за возера, на тыя выспы...

— Ты ж хацеў з вудаю пасядзець.

— І вуды возьмем. Але на тыя выспы. Унь якая сінечка...

— Спачатку трэба дабіць гэты шнур.

— Уключаю камбайн «РСШ-1» на поўны ход.

— Які яшчэ камбайн?

— Рыдлёўка. Старая. Шырокая. Адна. Разумееш? Скарочана — «РСШ-1». Новая марка, калі ты разбіраешся крыху ў тэхніцы...

— Нешта слаба працуе твая тэхніка!..

— Слаба?! Зірні, як ідзе мой «РСШ-1»!

Націскаю на старую рыдлёўку з усяе моцы; тонкі дзяржак падазрона трашчыць.

Валя палохаецца, хапае мяне за руку:

— Асцярожна! Зломіш рыдлёўку — бабка есці не дасць!

— Ты проста не ведаеш нашыя адносіны. Я для яе залаты чалавек.

— О-ох, і дыпламат жа ты! Учора гэтак расчуліў старую сваім падарункам. Ведаеш, што яна мне пра цябе ранкам сказала? «Табе, Валька, гэта бог Лявонку наслаў. Даглядай яго і сцеражы!»

— А ты што робіш? Толькі падганяеш.

— Есці хачу. І пяёмка, бабка ўжо два разы клікала...

— І я два разы яшчэ капану. І на тым спынімся...

Рыдлёўка зноў патрэсквае, але служыць спраўна: капнеш — вялізнае вурвалле адвальвае. Зрэшты — усё: утыркаю рыдлёўку ў зямлю і нясу на падворак плецены кош, дзе качаецца які дзесятак буйных белых бульбін — знайшлі, перакопваючы гародчык.

З акна хаты — вузкага, застаўленага рагатым альясам — зноў чуецца голас Валінай бабулі:

— Дзеткі, дзеткі! Яешня прачакалася. Кідайце!..

— Адну хвілінку, бабуся. Памыцца толькі...

Я хапаю ручнік, які бабуля нядаўна вынесла з хаты і павесіла на бэз, і мы з Валяю навыперадкі імчым па вузкай сцежцы. Але разгону нам няма — возера пачынаецца адразу за гародчыкам, і сцежка ўпіраецца ў счарнелую ад часу дошку, якая ўскінута на корч і прымацавана да яго ржавым клямарам; побач з карчом — човен, і ля яго ў празрыстай вадзе мітусіцца чародка малькоў.

Забіраюся ў човен, а Валя заняла кладку; нахіляецца, чэрпае далонькамі ваду.

— Бяры мыла. Лаві, Лёнік. Кідаю...

Карычневы брус мыла пляскаецца ля борта; пырскі ляцяць мне ў твар.

Валя рагоча:

— Няўмека! Мыла злавіць ён не можа! А бабулька яго яшчэ падхвальвае...

Адбітак Валінага твару побач з чоўнам; Валя выцірае шчокі, і белы ручнік, як сцяг, вагаецца па зырках хвальках, і ўся яе постаць здаецца ў вадзе лёгкай і трапяткой. Асцярожна апускаю рукі за борт — паверхня вады ўздрыгвае, потым супакойваецца, і адбітак Валінай галавы ляжыць на маіх руках.

І раптам усё знікае: прыгнуўшыся, Валя пырснула на мяне вадою, на бераг выбегла, стала на ўзмежку, чакае. Пачакай жа. Я ўпотай зачэрпнуў вады ў прыгаршчы і вылажу з чоўна, пра ручнік пытаюся, але Валя заўважае мае хітрыкі і адбягаецца яшчэ далей, да яблыні.

— Бачу ўсё! Ба-ачу!..

— Мір! Давай заключым мір,— я працягваю да яе пустыя далоні.— Бачыш, іду з чыстымі рукамі.

Валя ўзнімае рукі.

— О! На гэта — згода!..

Бабуля чакае нас ля парога, нязлосна папракае, вядзе ў хату да стала; сама ж становіцца побач, склаўшы на грудзях рукі.

Падхопліваюся, стаўляю сваё крэсла бабулі, а сам саджуся бліжэй да Валі.

— Адны мы не будзем есці!

— А дзеткі мае... Старыя непрыгожа ядуць. Вы ўжо, маладыя, адны... Потым я. Потым...

— Потым? — Валя рагоча, прымушае бабулю садзіцца побач са мною.— Потым ужо нічога не застанецца. Мы тут усё падчысцім!

— То прошу, мае дзеткі, прошу... Дзякуй богу, яды цяперака ёсць. І бульба сёлета зарадзіла — слецце слаўнае было. І гурочкаў парасло — дзве дзежачкі скаптавала. Адну вам ужо з Лёнем. Ешце, ешце...

А нас, прызнамсі, упрошваць і не трэба, і ўсё смачнае незвычайна. Трошкі жаўтаватая, сопкая, з рыхлымі разваранымі краямі, бульба ляжыць у бліскучай карычневай місе спаважна і самавіта; лёгкая пара ўзнімаецца над паліванымі краямі посуда; здаецца, кожная бульбіна жывая і дыхае, і на талерцы (я кладу сабе самую вялізную, з прыстаўшай бакавінай цыбулі) пачынае свіціцца ружовым водсветам ад памідораў, што ляжаць побач на складзеным у тры столкі ручніку.

Бульба!

З усмешкаю прыгадваю абурэнне, што выклікала ў мяне гэтае слова, калі Валя паведаміла аб паездцы ў Залессе, і прагна ўдыхаю смачную, пахкую пару. Толькі дакранаешся відэльцам, і бульбіна развальваецца на талерцы, струменіць апетытны водар: тонкі, ледзь улоўны пах — кроп; густы, саладжавы — гэта пахне развараная цыбуля; і яшчэ нейкая цёплая духмянасць — быццам побач разагрэты сонцам аер... А-ааа. Гэта пахне ўгрэтая гарачай бульбай гліняная міса...

— Стограмоўкі няма, шкада, не маю. Звялося гэтае пітво гладка — няма ў хаце мужчыны. У сельпоўцы ёсцека, але рэвізія тамка — не падступіцца...

— Лёня зусім, бабуся, не п'е,— супакойвае Валя.

— А то і добра, ведаеш. Дрэнь, калі ўлягае каторы ў тую трасцу. Радасці з яе не ўбачыш...

Са згодай ківаю галавою — увогуле нагаджаюся з усім, што кажа Валіна бабка: разумная старая, слухаць цікава. Трохі пад'еўшы, пачынаю спакайней арудаваць відэльцам, спакваля грабу на сваю талерку грыбы са смятанаю і знаходжу час, каб грунтоўна пахваліць бульбу, і раблю гэта шчыра, ад душы: гэткай смачнай не даводзілася мне есці.

Бабуля ўзрадаваная з мае ўхвалы, але сама амаль нічога не есць, а толькі ўсё аб нас клапоціцца: то адну талерку падсуне, то другую, падкроіць хлеба, шчарбатым нажом грабе з патэльні скваркі.

— Яешанькі! Што ж гэта на яе забыліся? І грыбы вось, з алеем...

Яна сядзіць напроці мяне, і я бачу яе вочы, сцвілыя, але жвавыя і вясёлыя, бачу пяроўныя зморшчынкі на шчоках; асабліва густа ляглі зморшчынкі ля вачэй, быццам сабраныя ў адзін пук рудымі і доўгімі, але надта ўжо рэдзенькімі веямі. Але болей ад усяго здзіўляюць рукі — сухія, яшчэ, відаць, крэпкія і дужыя; невыводная чарніза сядзіць у глыбокіх звілістых рэпінах, што абвілі пальцы па краях; нават пазногці пасечаны такімі ж рэпінкамі, а на скуры кісцяў, што задубела ад зямлі, вады і сонца, звіліся, быццам пяроўныя шпагаціны, сінія тоўстыя вены.

— Управілася, дзякуй богу, са сваім гародчыкам. Дзякуй богу, работу скончылі, то вось і адразу восень весялейшая. Дзякуй богу...

Валя перасмыкнулася, моцна дзюбае вілкай бульбіну — аж, тоячы ўсмешку, паглядзела на бабульку:

— Усё — бог, бог... Хіба ж ён табе бульбу павыбіраў, гародчык узараў, дровы пасек? А ты ўсё бога ўспамінаеш!

— На ўсё яго воля, па ўсё — пад ім жывём. І ты, Валька, бога не гнявi! Не верыш — не чапай, ён табе не замінае. Але ў галаве думку пра яго пакладзі — паслухай мяне, дурную бабу. Болей ад твайго пражыўшы, болей і ведаю...

— Верна, бабуся!

Штурхаю нагой Валю. Навошта яна спрачаецца з бабуляю? Хоча сапсаваць ёй настрой? Стары чалавек... Хіба ж яго гэтак перакапаеш? Не трэба і злаваць дарма.

Валя, адразу зразумеўшы мяне, абдымае старую.

— Не сярдуй. Ну, не сярдуй, бабуся! І дазволь нам на выспы паехаць. Грыбоў табе назбіраем.

— Якія грыбы на выспах? Казлякі хіба... Баравікі сёлета ў бярэзніках. Вы па Турэц падбяжыце — у тым лесе ёсць... А лепей нікуды і не лётайце...

Бабка спрабуе затрымаць нас ля стала, але мы, яшчэ раз падзякаваўшы, узнімаемся.

— На выспы за азяро паедзем!..

— То ж чакайце хвільку. Я вам і кош дам. Харошы кош, шчаслівы. З ім грыбы кожны раз ідуць. А, памятаю, пайшла з вядром і — пуста. Каб табе адзін баравічок сеў. А яго ўзяла — поўны назбірала...

Яна прыносіць кошык, сплецены з мядзяна-жоўтай лазы, адбірае ў Валі посуд, які тая сабралася мыць, і выпраўляе нас з хаты.

Возера ціхае, бліскуча-аранжавае. Самы час з вудаю пасядзець. Бяру бляшанку з чарвякамі — назбіраў, калі перакопвалі гародчык.

Валя абурана.

— А грыбы хто будзе збіраць?..

— Ты. А я судака злаўлю. Казімір казаў, яны ёсць тут. Трэба праверыць.

— Ранічкаю праверыш. На золаку ў нас рыбакі ловяць.

— На золаку? Ды я да твайго золаку пяць судакоў выцягну!

— Ну і хвалько! Бяры лепей вёслы...

Рыбацкі човен нейкі старасвецкі, шмат дзе залатаны бліскучымі прамавугольнікамі з бляшанак ад кансерваў, але гонкі — любата веславаць. Выспы за возерам усё выразней выступаюць з сіняй далечы; відаць ужо маладыя бярозкі, што растуць на пакатых схілах, і густы, але нізкаваты ядловец; за выспамі чарнее гай, сосны ў ім высокія і стромкія.

— Летась у гэтым гаі было поўна баравікоў,— гаворыць мне Валя.

— А сёлета яны ля Турца. Бабка ж казала.

— Мы і тут іх знойдзем.

— Ты будзеш збіраць грыбы, а я донку на судака пастаўлю.

— Не, Лёнька, нічога не выйдзе. Далі кашолку, і яна павінна быць поўная.

— А можа, на той бок возера? Унька там чарот які!

— Да яго ведаеш колькі? Кіламетры тры.

— Гэта берагам, мабыць, а папрамкі бліжэй, думаю...
— Не думай, а рулі на выспы...
Валя павярнулася да мяне спіпаю, крыху нахілілася над бортам і спявае: спявае ціха, як бы сабе толькі, і песня нікуды не плыве, а застаецца побач з намі. Валіны валасы па краях асветлены сонцам і здаюцца як бы саламянымі і празрыстымі; далонь правай рукі апушчана за борт чоўна, вада буркатліва ўспаўзае па пальцах, і яны выдаюць тонкімі, амаль празрыстымі, нават крыху ружовымі.

Вяслую ціха, асцярожна, ледзь кратаю вяслом, і бераг пакрысе набліжаецца; ён насоўваецца неўпрыкмет, але няўмольна, і я ведаю, што хутка скончыцца Валіна песня, а мне хочацца, каб яна была бясконца, каб можна было ўсё сядзець у чоўне, і ціха плысці, і слухаць песню, і ўглядацца ў зманлівую далеч сіняй азёрнай прасторы...

Бераг зусім наблізіўся; некалькі ўзмахаў вёсламі, і вось ужо суха шваргае па борце зялёны чарот. Я разматваю донку, чапляю чарвяка і закідваю вуду. А Валя ўжо на выспе і кліча — не хочацца ёй там адной стаяць.

— Ну, чаго ты расселся? Грыбы самі сюды не прыйдуць!..
— Донку пастаўлю.
— І добра. Заматай яе за што-небудзь. Няхай судак і ловіцца. Ты яму толькі перашкаджаеш...

Сасновы гай толькі зводдалі роўны, чорна-зялёны. Увойдзеш у яго, і адразу пачынаюцца пагоркі з густым карычневым сіўцом, неглыбокія лагчыны, спрэс у тонкім асінніку; кара на асінках зеленаватая, як бы празрыстая, а лісці трапяткія і ўвесь час ціха гамоняць; у нізінах пахне прэлым лісцем, а на выспах разліты ўстойлівы і моцны водар сасновай жывіцы.

Разгалісты, як будан, ядловец, і за ім прысела ў густых рудаватых верасах Валя, пахваляецца:
— Баравіка знайшла! А прыгожы ж. Ой, ды вось яшчэ адзін.
— Дай мне аднаго — трэба вока нацерці. Тады вока як лакатар — адразу аніводны баравік не схаваецца. Эге! Слаўныя!

Крэпенькімі карычневымі галоўкамі баравічкі адкінулі пасохлую ігліцу і стаяць на тоўстых белых ножках пад зялёнай галінкай ядлоўцу.

Мчуся побач на кукішкі, нацэльваю нож на грыбы,

але Валя ўзрушана, нават крануць рукамі не дазваляе іх.

— Няхай гэтак і стаяць. І растуць. Другім разам прыедзем і возьмем...

Другім дык другім. Пагаджаюся, хоць і не ведаю, калі нам зноў удасца завітаць сюды, і тут жа, прыхаваўшы смех, выказваю шкадаванне: хто ведае, што можа здарыцца з імі за гэты час — узяць, мабыць, баравічкі трэба.

Валя па-сапраўднаму абураецца:

— Ну, не думала, што ты гэткі жмэнда!

— Я выканаўца! Выканаўца нядобрай волі — ты загадала, каб кош быў поўным. І рэжу гэтыя баравікі. Ж-жых!

Узмахваю нажом над барвікамі, з падробленым здзіўленнем гляджу на іх:

— У вас шчаслівы лёс, грыбочкі! Добрае сэрца ляснoй феі адвяло ад вострага нажа... Жывіце! А як выспееце, вавёркі прыбягуць па вас!.. І ўславяць сэрца добрай феі!

— Ты зараз атрымаеш!..

— Э-э... дык гэта ж не добрая фея, а злая вядзьмарка!

— Ну, чакай жа!..

Смеючыся, я ўцякаю ад Валі, але не так хутка, каб яна не дагнала, і яна даганяе мяне, і нам хораша, і мы зноў вандруем па лесе. Грыбоў у гэтых месцах шмат, але баравікоў нямнога, больш трапляюцца зялёна-чорныя, з палоскамі, мачонкі з нізкай трубачкай-ножкаю, чырвонагаловыя падасінавікі ды вялікія, мяккія абабкі. Стаміліся. Надакучыла ўжо і гукаць адно аднаму пра кожную знаходку. Аддаў Валі шапку, і яна складае грыбы туды, а сам цягаю цяжкі, амаль поўны кош. Урэшце ён накладзены з каптуром, і шапка таксама поўная.

Лес наперадзе парадзеў; блакітнай палосаю блішчыць за сасонкамі азёрная роўнядзь. Нейкія незнаёмыя мясціны. Ці не зблудзілі?.. Валя рагоча («Скажаш! Я тут кожны пагорачак ведаю!») і першая выбягае з лесу; спынілася і стаіць, прыціскаючы да грудзей шапку з грыбамі.

Сіне-чорныя лясы за возерам суцэльнай палосаю закрылі далягляд; заходзіць сонца; шырокія агняна-барвістыя істужкі зіхацяць па вадзе, і ад іх бягуць па сіняй роўнядзі вострыя, як стрэлкі, промнікі; водсвет ад возера кладзецца на вёску, і хаты яе нібыта падсунуты тым

сіне-чорным лесам на даляглядзе да гэтых бліскуча-агнямых істужак, асветлены болей знізу, і таму здаецца, што збудаваны яны не з простага бярвення, а з нейкай доўгай, барвова-белай цэглы.

Чоўен крыху ўлева ад нас, але зусім блізка (гэта ж мы побач зусім і вандравалі!), а здалося, што забрылі немаведама ў якую далеч.

— Я стамілася... А ты?.. Тады адпачнем.

Валя кладзецца на сухую траву, совае рукі пад галаў. Вочы ў яе заплюснутыя, вей час ад часу ўздрыгвалаў, і ўздрыгваюць на скронях кучаравінкі валасоў, і на губах няўлоўная грымаса — нібыта Валя ўпотай смяецца.

— Разглядаеш? — раптам пытаецца яна.— Я ўсё бачу!

— Адкуль? У цябе ж вочы закрыты!

— Ты сам сказаў: вядзьмарка! А цяпер дзівішся чорнай магіі.

Ляжу на спіне і трымаю далонь на дужцы кашолкі, і Валіны пальцы — мяккія і гарачыя пальцы — знаходзяць маю руку.

Сонна мармыча на пясчаным прыберагу вада.

Водар чабору, як хвалі,— то наплывае, то знікае.

Густой, толькі што зваранай каваю пахнуць у кашолцы падасінавікі.

Цененька-цененька шалахціць, асыпаючыся ў маленькія ямінкі, патрывожаны нашымі нагамі пясок; недзе вельмі ж блізка ў чароце жаласліва стогне кнігаўка...

Можа, усё гэта і ёсць сапраўднае шчасце?

Калі так, няхай яно цягнецца стагоддзі!..

Адчуванне незвычайнай паўнаты і замілаванасці да ўсяго, што бачаць мае вочы і чуюць вушы, да ўсяго таго, што ёсць вакол нас з Валяй, імклівае, непамерна вялікае, бязмежнае...

Вяртаемся дахаты на блізкім ужо заходзе сонца; за возерам у сіне-ліловым змроку хаваюцца выспы, а неба над імі набрыняе такой густой сінечай, што здаецца, яшчэ адна кропля гэтай сінізны — і яно зробіцца чорным.

Бабуля ў захапленні ад поспехаў нашай вандроўкі, частуе нас малаком, і мы выпіваем кожны сваю шклянку адным дыхам і просім яшчэ, а потым памагаем разабраць кош. Але вось грыбы даведзены да ладу, і мы, паабяцаўшы не вельмі пазніцца, шнуруем у Крынкі — суседнюю вёску, дзе, як Валя дачулася, сёння ўвечары будзе кіно.

Падарожжа ў Крынкі марнае. Перасоўка недзе за-

трымалася, кіно перанесена на аўторак, і мы вяртаемся ў Залессе, але я не шкадую, што цягнуліся такую дарогу: убачыў новыя мясціны і цяпер адчуваю радасць, нібыта вярнуўся ў родны кут.

Возера за гародчыкам здаецца мне ўжо сваім, яно абуджае ў душы спакойную замілаванасць, і гэтая замілаванасць мацнее ад таго, што не трэба нікуды ісці, і можна сядзець з Валяю на ўзмежку пад старой ігрушынай-дзічкаю і слухаць ледзьве ўлоўны пошум чароту.

Месяца няма, але ноч светлая; усё вакол нерухома, стаілася, бы надоўга паснула; трыснёг ля берага выдае чорным і вельмі нізкім, а човен на светлай вадзе вялізны, як казачны карабель, што заплыў да невядомых прычалаў.

— Паедзем па чоўне? — жаданне для мяне самога нечаканае.

— Не, не хочацца. Чуеш, як пахнуць дзічкі? Іх тут у траве поўна. Пашукай...

Мацаю вільготную ад расы траву і адразу знаходжу маленькую крамяную дзічку.

— Вось, знайшоў. Яны смачныя?

— Пакаштуй. Узімку вельмі сакоўныя.

— А я бачу зорку... Ці, можа, гэта спадарожнік?

— А што, было паведамленне?

— На тым тыдні. Хіба не чытаеш газет?

— Я быў думаў аб якім новым ты... Цяпер гэтыя паведамленні як звычайныя звесткі пра надвор'е...

— А паглядзі на зорку. Бачыш?.. Ды нахіліся ж!..

Мая галава ляжыць на Валіных каленях. Час ад часу Валя закрывае мне вочы далонямі, і тады я не бачу чорнай лістоты над намі, а толькі вузкія акенцы паміж галля дзічкі, і ў гэтых акенцах зырка мігцяць кропачкі далёкіх зорак.

— У тваіх вачах — зоркі... У кожным воку — па дзве зоркі...

Чамусьці пахне грыбамі і чаборам. Грыбамі пахнуць Валіны рукі. А чабор? Адкуль тут, у садзе, чабор?..

Валя нахіляецца над маім тварам.

— Чабор? Слухай, гэта ж твая кашуля ім пахне — ляжаў жа тады на выспе. Там шмат яго расце. Пахне чабор... Пахне чабор...

— Нядаўна па радыё верш чыталі такі. Чула?

— Не. Але я чытала яго. Добры.

— А ты мне ніколі не казала, што любіш вершы.

— «...О любви в словах не говорят».

Валіны губы блізка-блізка. І вочы яе зусім блізка, але яны дужа цёмныя. У іх ноч і нічога не відно...

Мне хочацца, каб увесь час, усё жыццё было вось гэтак: ціхая радасць ва ўсім целе, святочна-дзіўная ўзнёсласць у сэрцы і хмельны пах чабору...

— А заўтра трэба ехаць. Не хочацца.

Валя варочае мяне з казачных вышынь у свет будзённых спраў і абавязкаў.

— І мне не хочацца.

— Тут добра. Праўда? Але ранічкаю трэба ехаць. Каб жа толькі не праспаць. Я сплю ў бабулі як забітая...

— Я не прасплю. Вось скажаш сабе ўвечары: а сёмай узняцца. І ўстанеш. Ты гэтак можаш?

— Не ведаю. Але нам заўтра ўзнімацца разам з сонейкам — тады паспеем на аўтобус.

— А ведаеш, няхай ён коціць сабе — паедзем на спадарожнай.

— Таксама не люблю ў аўтобусе. Едзеш, як у каробцы. А ў кузаве вецер у твар. І ўсё бачыш вакол...

— Чуеш, пачынаецца вецер?

— Не, гэта я галінку кранула. Хочаш яблык?

— З дзічкі?

— Яблыня непадалёк, падкаціўся, мусіць. Трымай...

Яблык халодны, а Валіны рукі цёплыя, і пальцы цёплыя, і дужа мяккія, і я вельмі люблю гэтыя рукі. Люблю гэтыя пальцы. Люблю ўсё, што робіць Валя, што гаворыць...

Ніводнага разу тут, у Залессі, не казаў я ёй пра сваё каханне. І яна мне не казала. Але я ведаю: яна разумее, разумее ўсё, аб чым я думаю. «...О любви в словах не говорят». Гэта яна дарэчы прыгадала. Сапраўды, пра каханне мала толькі гаварыць — яно павінна быць у сэрцы.

Словы не могуць жыць доўга. А наша каханне — на незлічоныя гады, яно будзе жыць, пакуль ёсць я і Валя. І нават потым, калі нас не будзе, наша каханне ўсё роўна застанецца на зямлі...

## 12

Як з дужа далёкай вандроўкі, вяртаюся на будоўлю — кожная драбніца тут хвалюе і радуе незвычайна: нязнаную раней заміласванасць выклікаюць у сэрцы руды дах

бытоўкі, белыя сцены новага гмаху і чорныя правалы вокнаў у ім, скурчаныя над стралою крана тросы...

У Залессі, на світанні (спаў я на свежым духмяным сене), мне саснілася будоўля і наш дом, адбудаваны канча. Мы былі з Валяю на пятым паверсе і крычалі нешта Казіміру, а ён стаяў на зямлі і не чуў нас і быў чымсьці заклапочаны і незадаволены, і мяне дзівіла, што яго нічога не радуе. А потым зверху звалілася пліта і ляцела на Казіміра, і я закрычаў, каб ён адбегся, і ад гэтага свайго крыку прачнуўся і зразумеў, што ўсё тое саснілася, і ляжаў, і дыхаў водарам лугавога сена, а сэрца маё тухкала, калацілася; у высі над возерам ружавелі дзве вузкія палосы, а далягляд быў завешаны цяжкімі хмарамі, і вецер трос дзічку на ўзмежку, і галіны яе гнуліся і шамацелі; і было неяк дзіўна бачыць ветраны хмарны ранак пасля такога пагоднага вечара, і я зноў пад далёкія па ранні галасы неўпяў задрамаў, і абудзіў мяне ўжо голас Валі — яна стаяла ля стажка і клікала мяне; хмары сплылі, праз тонкі, з яловай драпкі, дах біла ў твар сонца, але на душы ляжаў неспакой.

У трэскім кузаве спадарожнай машыны неспакой той выветрыўся з душы неўпрыкмет, але зусім не знік, і цяпер тут, на будоўлі, я зноў адчуваю яго існаванне і, нібыта ратуючыся ад яго, з увагаю і прадчуваннем чагосьці гляджу на белыя сцены. Які ўпушальны і вялікі наш гмах! Крыху пабыў у Залессі, але вока ўжо прызвычаілася да вясковых хат, і наш гмах здаецца незвычайна велічным. На гэтым тыдні мы скончым будаваць яго: застаецца апошні, пяты, паверх і дах; але дах з пліт, і класці яго вельмі лёгка і хутка.

Ля адчыненых дзвярэй бытоўкі тоўпіцца наша брыгада — няма, здаецца, толькі Рогача і Казіміра. Так, іх.

— Віншаванне, будаўнікі!

На шумнае маё вітанне адказваюць ціха, стрымана, і я запытальна гляджу на Барыса (ён стаіць крыху воддаль ад усіх і бліжэй да мяне) і адчуваю, як мацнее ва мне трывожнае прадчуванне нядобрага.

— З Казімірам няшчасце...

Барыс гаворыць гэта ціха і глядзіць не ў вочы, а на штабель блокаў, і мая галава паварочваецца ўслед за яго позіркам, і тады я адразу заўважаю нейкія цьмяныя плямы на белай бакавіне блока.

— Што гэта?..

— Я ж кажу табе: з Казімірам бяда... Яго і знайшлі тут...

— Калі?..

— Ранкам. Непрытомнага. І знайшла ягоная маці... Адны загадкі... Рогач званіць у бальніцу...

— Дык што, ён там?

— Маці і завезла... Я ж кажу табе...

Промні сонца падаюць на штабель, і цьмяныя плямы на белай бакавіне блока, што адразу ж робяцца цёмна-барвовымі, дрыжаць, хістаюцца перад маімі вачыма. Кроў! Сэрца маё гулка, аж аддае ў скроні, калоціцца ў грудзях. Загадкі? Няма ніякіх загадак. Урэшце тыя, каго мы чакалі, прыехалі на блокі. Казімір біўся з імі...

Як апантаны кідаюся на вуліцу. Імчыць насустрач машына, і маленькае зялёнае вочка міргае ў куточку лабавога шкла.

— Стой! Таксі! Сто-ой!

Вішчаць тармазы; шафёр, адчыніўшы дзверцы, абурана крычыць:

— Жыць надакучыла? Пад самыя колы прэ!

— Бальніцу! Хутчэй! — прашу я, не зважаючы на яго лаянку.

Ён, лаячыся, закурвае і злосна круціць ручку лічыльніка.

— Будзеш гэтак кідацца — сам туды трапіш. Што ў той бальніцы здарылася?

— Хутчэй! Хутчэй, я прашу! Можа, ён памірае там...

— Хто, прабачце?

— Сябар...

Шафёр больш не жартуе, пільна ўглядаецца на дарогу; папяросіна ў яго губах моцна сцята, вочы прыплюшчаны ад дыму. Маўчыць, ні аб чым не распытвае і толькі на Замчышчы, спыніўшы машыну перад драўлянай брамаю, за якою стаіць зацененны таполямі чырвоны будынак бальніцы, пытаецца, ці трэба яму чакаць мяне.

Я кладу рубель на сядзенне і адчыняю дзверцы.

— Чакаць? — паўтарае мне ўслед шафёр.

— Усё адно...

Бялявая дзяўчына ў прыёмным пакоі гаворыць са мною ветліва, але падкрэслена афіцыйна. Свірыдаў? Так, паступіў такі. Але да яго нельга прайсці. Забаронена.

— Хто забараніў?

— Парадак. Іспуе парадак.

— Давайце галоўнага ўрача.

Дзяўчына абшуквае кішэні халата, весела зыркае на мяне:

— Бачыш, галубок, няма яго!

І гэтая яе весялосць узвінчвае мяне. Крычу, патрабую... Урэшце з'яўляецца маленькая старая жанчына ў такім жа белым, як у дзяўчыны, халаце — дзяжурны ўрач.

— Нядобра, малады чалавек, буяніць з раніцы. Жывы ваш Свірыдаў. Нічога з ім небяспечнага няма.

— Мне трэба пабачыць яго.

— Нельга.

— Тады наклічце галоўнага!

— І ён вам такога дазволу не дасць...

— Хоць на адзін міг. Толькі зірнуць...

Настойваю, трымаю ўрача за рукаў белага халата, бо ведаю, што гэта адзіны чалавек, ад якога залежыць мой спакой; карыя, з халодным бляскам, вочы глядзяць на мяне непрыступна —ані кропелькі спагады ў іх.

— Навошта вам Свірыдаў?

Пытанне хуткае, нечаканае — за маёй спіной, і я паварочваюся на гэты голас. Ачмурэлы ад свае трывогі і настойлівасці, я нават не заўважыў, як увайшоў у пакой мужчына ў белым халаце. Рудаватыя, крыху сівыя на скронях валасы, тоўстыя кудлатыя бровы над сінізною вачэй, якія насмешліва прыхмураныя. Галоўны ўрач? Так, ён, відаць. Але я нічога не паспяваю папрасіць яго і стаю з адкрытым ад здзіўлення ротам: мужчына распахвае халат, і я бачу пад ім сіні міліцэйскі фрэнч з бліскучымі гузікамі.

Дзяжурны ўрач бярэ ў міліцыянера халат, хавае ў вузкую белую шафу і скардзіцца:

— Вось, таварыш лейтэнант, прабіваецца да Свірыдава. Затрымалі да вашага прыходу, як і прасілі.

— Затрымалі? Каго? Мяне? Нейкая недарэчнасць. Мне толькі адно слова сказаць Казіміру...

І тут жа разумею, як цесна сплялося ўсё ў адзін жмут — Казімірава бяда, мая трывога, няўмольнасць урача.

— Хадзем, мне скажаш тое слова.

Гэта гучыць як загад, якому нельга не падпарадкоўвацца, і я моўчкі іду ўслед за лейтэнантам.

Шафёр таксі стаіць ля машыны і курыць. Убачыў мяне і, атарапелы, глядзіць.

— Зараз паедзем,— кажу я.

Лейтэнант вядзе мяне ў скверык, што напроці ўвахода ў бальніцу, садзіцца першы пад маладым ясенем і ляпае далонёю па вузкіх планках лавачкі.

— Прашу. І — слухаю...

Я кажу яму сваё прозвішча (якое, дарэчы, ён ужо ведае, і я не пытаюся адкуль), расказваю пра сваю чаргу каравуліць блокі і як Казімір замяніў мяне, каб я паехаў у Залессе...

— Блокі? Нешта ўжо зусім новае. Давай падрабязна ўсё. Па парадку...

Загад лейтэнанта гучыць неяк падазрона. Знарок ён просіць расказаць пра блокі? Ці, ведаючы ўсё, ані ў чым не давярае і хоча — толькі ж навошта! — праверыць мяне? Не, не! Тут штосьці іншае.

Таропка і як мага карацей кажу яму пра пліты, якія сцягнулі з будоўлі, нашыя дзяжурствы і планы злавіць тых злодзеяў, пра тое, што я вінаваты — не трэба было нікуды мне ехаць.

— Новая, значыцца, справа: блокі і пліты.

Лейтэнант пацірае рукою скроні, і я бачу яго пальцы — тонкія, моцныя, з кароткімі пазногцямі; ён быццам вагаецца крыху, і рантам — маланкавае пытанне:

— Ты калі бачыў Калумба?

Спачатку наважваюся пажартаваць (мы з ім, маўляў, не адкрывалі Амерыку) і тут жа вокамгненна прыгадваю нядаўняе: Дзвіна, рыбалка ля Чорнага ручая, далёкія выбухі, з-за асакі імчыць маторка... Калумб! Гэта той, што сядзеў на рулі. У саламяным брылі. І яшчэ з гармонікам быў хлапец. Жора...

Лейтэнант слухае мяне ўважліва, і я не бачу ў яго позірку ніякай спагадлівасці — сцюдзёныя і жорсткія вочы:

— А што гаварылі яшчэ?

І зноў, нібыта ўяве, стаіць усё тое перад вачыма: Калумб паклікаў Казіміра, і яны гамоняць ціха, Калумб злуе і з маторкі ўжо гукае, што Казімір «плюе ў калодзеж», пагражае...

І калі цяпер я прыгадваю тыя падрабязнасці (а мы неяк зусім на апошнім часе махнулі рукою і на Калумба і яго прыяцеля) і расказваю ўсё лейтэнанту, мне ўсё выразней адкрываецца мая памылка і прычына таго, што здарылася з Казімірам. Яму помсцілі. Падкаравулілі і адпомсцілі.

— Тут усё складаней,— перапыняе мяне лейтэнант.—

Яны абрабавалі ювелірны магазін. І панеслі ўсё да Свірыдава, каб схаваць. Маці сказала ім — ён працуе ў начной змене. Яны дагналі Свірыдава, і ён павёў іх на будоўлю...

— Вы злавілі Калумба?

— Дзякуючы маці. Яна пазнала яго іназвала нам. Спазніся мы на хвілінку — яны б забілі яго. Таксі, здаецца, чакае.

— Так...

— Тады паехалі. Зірну яшчэ раз на ваш дом...

Колы машыны мякка коцяцца па бруку. Мы едзем моўчкі, і гул матора здаецца мне тахканнем маторкі. Зноў стаіць перад вачыма Дзвіна. Пра што яны гаварылі тады — Казімір і той, у саламяным брылі? Памагчы? У чым? Чаму я тады падрабязна не распытаў Казіміра? Няёмка было... А цяпер як паправіш усё? Як?.. Не, відаць, у Казіміра даўно быў нейкі план. А мне — каб слоўца. Дзе ён стрэў іх і навошта павёў на будоўлю? Мабыць, памроілася: я сяджу там... Так, так! Падумаў так і спадзяваўся, што памагу яму...

На будоўлі лейтэнант пра нешта гаворыць з Рогачам. Але я не слухаю іх, нешта адказваю Барысу пра бальніцу і ўтрапёна гляджу на заплямленую бакавіну блока; можа, ад таго, што крыху падсохлі, а можа, ад яркага сонечнага святла плямы крыві пацямнелі яшчэ больш і блішчаць.

Трывога ва мне расце і моцна, як абручом, сціскае сэрца; думкі пра Казіміра і здарэнне з ім у мінулую ноч дзіўна перамешваюцца з успамінамі пра Залессе, пра нашыя гаворкі з Валяй, пра ўсё тое, што адбывалася там, на беразе возера, на выспах, спавітых водарам чабору, і дзе я быў шчаслівы бясконца.

Ачмурэлы ад шчасця, я ніводнага разу не прыгадаў свайго сябра, свае абавязкі, будоўлю, не ўспомніў літаральна нічога з таго, што засталося тут, пра што я не павінен быў забываць...

Адчуванне свае вінаватасці мацнее, і ад яго робіцца вельмі пагана, і я бязлітасна аналізую свае ўчынкі. Так, у тым, што здарылася з Казімірам, і я вінаваты. Мне нельга было ехаць у Залессе. А я паехаў, кінуў сябра, выкруціўся ад свайго дзяжурства, прымусіў Казіміра пайсці на варту, хоць чарга была мая. І чым прыкрыўся! Вельмі, маўляў, трэба пабачыць Валю, памагчы, пагаварыць з ёю... І толькі? Хіба адзінае гэтае пачуццё было тады,

у дзень ад'езду ў Залессе? А злосць? Злосць на тое, што павінен несці нейкую непатрэбную варту, а Валя змушана чакаць... Я нічога тады не сказаў Казіміру, але ж хацеў, вельмі хацеў ехаць у Залессе. І ён адчуў гэта і настаяў, вытурыў. Чаму я пагадзіўся? Кахаў Валю і хацеў бачыць яе? А Казімір?.. Казімір, вядома ж, знарок прыдумаў, што збіраецца вудзіць ляшчоў. Ніякіх ляшчоў не было. А каб яны і былі? Хіба гэта правільна лічыць, што мая патрэба больш пільная? Мы разам надумаліся пільнаваць тых, хто сцягнуў пліты. Павінны былі і роўна надзяліць цяжкасці... А што зрабіў я? Уцёк. Пераклаў на ягоныя плечы свой цяжар. Збег, бо мяне чакала Залессе...

Залессе, Залессе...

Я быў шчаслівы там, у Залессі, і Валя была шчаслівая. Гэта праўда. І праўда тое, што хацеў я ці не хацеў, але дзеля гэтага шчасця здрадзіў нашаму сяброўству з Казімірам. Інакш не скажаш. Тады, на Дзвіне, я абяцаў Казіміру сваю дапамогу ва ўсім. І пры першым выпрабаванні (каханне, бачыце, чакала!) кінуў сябра, кінуў нашу агульную справу і паляцеў у Залессе. Мне было хораша. Вельмі хораша і радасна. А ў той час, магчыма, калі я смяяўся, глядзеў на зоркі і цалаваў Валю, Казімір ляжаў тут непрытомны, у крыві...

Магчыма, ён клікаў мяне...

Адна ноч. Толькі ж адна ноч!..

А ўсё магло разгортвацца інакш, і ўсё, вядома ж, было б іначай, каб я не збег у Залессе, і не пакінуў яго аднаго, і не выкручваўся ад свае чаргі вартаваць пліты. Яны б сустрэлі Казіміра, і ён прывёў бы іх на будоўлю, і ўдвух мы б не падаліся ім, і Казімір цяпер не ляжаў бы ў бальніцы...

Але што казаць пра тое, чаго не было, чаго вярнуць ужо немагчыма. Трэба казаць пра факты рэальныя, пра самае істотнае ў іх: я захацеў быць дужа шчаслівым і выбраў да свайго шчасця самую лёгенькую сцяжынку. А да сапраўднага шчасця няма лёгкіх дарог. Чалавек не можа быць шчаслівы і спакойны, калі ведае, што ягоны спакой здабыў ён не сам асабіста, што ён не заваяваў сваё шчасце ў змаганні, а выштукаваў яго, выкруціўся неяк ад цяжкасцей і добра ўладкаваўся толькі сам...

Такія думкі і трывога за Казіміра неадступна вярэдзяць сэрца. Нават праца не радуе, не можа супакоіць мяне і вярнуць хоць крышку ранейшай раўнавагі; час

цягнецца пакутліва і марудна — ніколі гэтага не здаралася раней са мною на будоўлі.

Увечары, ледзь скончана работа, зноў імчу ў бальніцу. Ведаю, што ніхто не прапусціць да Казіміра, і ўсё ж з нейкай невядомай падзеяй імкнуся туды.

У рэгістратуры ўжо нікога няма; зашклёныя дзверы зачынены, і за імі відзён пусты доўгі калідор; ціха ў бальнічным будынку, аж звініць у вушах.

Нейкі час сяджу ў бальнічным скверыку, на тым самым месцы, дзе гаманілі раніцаю з лейтэнантам, потым цягнуся на Дзвіну.

Па-над берагам ракі, у засені маладых таполевых насадак, ціхі і маркотны пошум лістоты — вецер з Дзвіны гоніць прахалоду; на процілеглым беразе, дзе збудаваны прычалы паромнага катэра, ляжаць на вадзе доўгія цені прырэчных дрэў; катэр стаіць напроці старых вязаў, і па сходнях бягуць, спяшаючыся, на паром людзі.

За шатамі вязаў жаўцее Казіміраў дом; на другім паверсе, ля самага краю, адчынена акно, і ля яго стаіць жанчына. Постаць яе выдае дужа мне знаёмай. І чым больш углядаюся, тым усё болей і болей пераконваюся, што бачу знаёмую жанчыну ў тым акне, і гэтая жанчына — Казімірава маці.

Жаданне пабачыць яе выспявае нечакана, і я адразу, не вагаючыся, спяшаюся да прычалаў. Падплывае паромны катэр, і я еду на той бок Дзвіны і зноў не зусім упэўнены, што бачыў у адчыненым акне Казіміраву маці, не ведаю, дзе яна зараз, як і не ведаю, што ёй казаць пры сустрэчы, адчуваю пільную патрэбу ісці туды і нешта рабіць...

У дзверы кватэры стукаю асцярожна і, пастукаўшы, бачу плашачку электрычнага званка і чамусьці прыгадваю, што бачыў з таго берага адчыненае акно па правым баку дома, а не па левым, дзе жыве Казімір. За дзвярыма цішыня. Націскаю карычневую бубачку званка, і чую прыглушанае бразджэнне, і разумею марнасць свайго парывання: маці, мабыць, там, ля яго...

Калі выходжу з пад'езда, адразу ж лаўлю на сабе падазроны позірк жанчын, што сядзяць на ўслончыках у засені вязаў. Мабыць, суседкі. І мне робіцца непамысна, але не хачу паказаць гэта і спакваля іду ля іх, і выходжу на вуліцу, і ніколькі не задумваюся над тым, куды яна вядзе; у мяне няма ніякай мэты, я проста цягнуся па тратуары, потым, калі ён канчаецца, доўга шыбую па

нейкіх вуліцах, мінаю скрыжаванні, і зноў брыду, і адчуваю, што толькі ў гэтым мой паратунак — ісці, не стаяць на месцы...

Рэзка і доўга сігналіць ззаду машына, і я саступаю дарогу і толькі тады заўважаю, што апынуўся ў невядомым завулку, ціхім і вузкім, дзе замест тратуараў жаўцее засыпаная гусінымі катахамі нізкая трава; грузавік абмінае мяне, і шафёр, высунуўшы галаў з кабіны, грозіць кулаком:

— Чаго паўзеш пасярод? Давяну зараз — пыркі паляцяць!

Машына спыняецца ля драўлянай брамы, чырвонай і высокай, з тоўстымі квадратовымі шуламі. І ад гэтай брамы і шулоў, завостраных зверху і пакрытых, як шапкаю, ацынкаванаю бляхай, шчыльнага паркана патыхае старасветчынай.

Не хочацца пераходзіць на той бок завулка, і я чакаю, пакуль грузавік прасунецца на падворак, і бачу за адчыненаю на ўвесь мах брамаю брукаваны падворак, разгалістыя яблыні ў садзе, каляровае шкло тэрасы, якую зацінае густы вішняк; лявей вішняку, у канцы падворка, ляжаць шэрыя цэментавыя пліты; яны прыкрыты дошкамі і бляхаю, але дзве белыя літары на тарцах відаць.

Нашы! Нашы пліты!..

Як апантаны я ўлятаю за браму. За вішняком неглыбокі катлаван — збудоўваецца ўмяшчальны паграбок: пакладзены ўжо дзве пліты, і з белай цэглы напалавіну амаль выведзены сцены.

Я прамчаў падворак так хутка, што з будкі, схаванай пад вішняком, не паспеў вырвацца сабака; цяпер, спахапіўшыся, ён узвіўся на дыбках, аграмадны, чорны, і захліпаецца ад яраснага брэху. А я нібыта саслеп і не заўважаю ні сабаку, што вар'яцее на ланцугу, ні маленькага худога мужчыну ў клятчастай кашулі і шафёра, якія ў здзіўленні разглядаюць мяне: стаўшы на кукішкі, я чытаю літары, што выводзіла на тарцах Казімірава рука; шчымлівая спазма сціскае горла.

Падыходзіць мужчына ў клятчастай кашулі — мабыць, гаспадар,— і я не ведаю, што мне рабіць: у мяне яшчэ няма ні злосці, ні нянавісці. Гаспадар паварочваецца, тупае да брамы, і я, гледзячы, як ён, зачыніўшы адну палавіну брамы, ківае мне рукою, адчуваю ўсю недарэчнасць таго, што раблю тут, на чужым, ніколі раней не бачаным падворку.

Шафёр стаіць непадалёк, падроблена ветлівы, але я прыкмячаю на яго шырокім дабрадушным твары ўстрывожанасць.

— Гайда, хлопча,— просіць ён і пачынае закурваць,— пакуль брама адчынена...

Шалее, ірвецца з ланцуга сабака; гаспадар круціць у руках тоўстую засаўку ад брамы, зверавата глядзіць на мяне вузкімі сінімі вачыма, і яго кашчавы, з вострымі скуламі твар чырванее.

— Хведар! Адвяжы Каштана. Ён яму штонікі пачысціць!

— Каштан — звяруга! У-уу і сабака,— паведамляе шафёр і паблажліва пасміхаецца.

І неяк адразу ва мне атухае радасць, прыгожы падворак робіцца варожым, пагрозліва-змрочным. Ад раптоўнага шалу, што абрынуў на мяне, звініць у галаве; словы, вельмі шмат гнеўных слоў, бунтуюць ва мне, і горача ад іх, і цяжка дыхаць. Якія мы з Казімірам дурні! Яны ж з цэглы кладуць сцены і ніколі б не прыехалі па тыя блокі — хоць сто год пільнуй. І ад гневу, роспачы, злосці на сваю дурноту я кідаю ў твар маленькаму мужчыну ў клятчастай кашулі грозныя абвінавачванні.

— Саспілася, дружа. Пліты ўласныя,— неяк вельмі пачціва тлумачыць ён.

— Вы іх укралі! У нас укралі!

— Я ж табе казаў, уласныя!

— Крадзеныя!

— Хо-хо-хо. Гэтак ты і мяне і яго вось, Хведара, зараз злодзеямі абзавеш.— Гаспадар смяецца і, прычыніўшы браму, стаіць перада мною з тоўстай засаўкаю ў руках, і я бачу, як змяшаліся ў яго вачах разгубленасць і нянавісць.— Плітачкі ж гэтыя, мілок, сам вырабіў я. Цэменцік купіў і — зляпаў. І Хведар табе гэта пацвердзіць. І ўвесь наш завулак пацвердзіць...

З-за спіны цягнуцца да маіх грудзей рукі шафёра, і я не паспяваю нічога зрабіць: гэтыя рукі суюць у кішэньчык майго пінжака чырвоную дзесяцірублёўку, потым моцна, як абцугамі, сціскаюць плечы і штурхаюць да брамы.

— Бяжы, хлопча, дамоў і праспіся. Нешта вочы твае дужа чырвоныя. Не спаў, відаць.

Гаспадар спачувальна шчэрыць рот.

— Няма калі спаць — па дзеўках лётаюць у такія гады. І таму раю, хлопча: завярні па дарозе ў якую-небудзь

забягалаўку ды бохні стограмоўку. І выспіся. Як добры сон, потым нас успомніш...

Вырываюся з учэпістых рук, шпуляю ў кашчавы твар гаспадара скамечаную дзесяцірублёўку і выбягаю за браму. Завулак — нібыта павымірала ўсё па ім — пусты. Воддаль, за зялёным разлівам садоў, чарнеюць у небе вежы пад'ёмных кранаў — цэнтр горада там.

Шпурую вузкім завулкам у той бок, туды, дзе краны; не азіраюся, не вывучаю нічога па баках. Ведаю: нават калі ў мяне не будзе вачэй, я ўсё роўна знайду гэты дом у вішнёвым садку, чырвоную браму з тоўстымі квадратовымі шуламі...

## 13

Сёння ўпершыню пасля нашага развітання перад маёй паездкаю ў Залессе я ўбачыў Казіміра. Мы прыбеглі ў бальніцу разам з Валяй і не заходзілі нават у рэгістратуру — дзень не для наведвальнікаў,— а падышлі да вокнаў хірургічнага аддзялення, і ён адразу заўважыў нас. Казіміру ўжо дазволілі хадзіць, але доўга стаяць на нагах, відаць, яшчэ цяжка, і ён — палата на другім паверсе — гаворыць з намі, абапіраючыся локцямі на падаконне; на ім карычневы халат, які вельмі старыць яго; на бледным твары рэзка выдзяляецца чорная барада.

— Што вы робіце сёння? — голас у Казіміра бадзёры.

— Збіраемся глядзець фільм пра мушкецёраў.

— Цікавы?

— Не ведаю. Але афіша бліскучая. Усе мушкецёры ў блакітных плашчах.

— Адзін я табе магу пазычыць. Бальнічны.

— Ты лепей скідай яго хутчэй. Усе чакаюць цябе. Мы ўжо гонім апошні. Самы высокі...

— І тыя пліты паклалі?

— А як жа! На кожным тарцы твае ініцыялы. Вымаляваў — не саскрабеш цяпер...

Валя пакрыўджана перапыняе мяне, не дае гаварыць.

— Блокі, блокі... Знайшлі гаворку! Скажы, ты ясі мёд?.. Гэта ляспы, улічы, лепей любога лякарства. Заўтра прынясём яшчэ!..

— Нічога болей не насіце! Поўная тумбачка, куды ўсё дзяваць?.. Лёпь, а хто прывёз пліты?

— Удвух яны, з шафёрам. Пісаў жа. Табе перадалі маю запіску?

— Адразу ж! Але вельмі тут надакучыла. А што запланавана на заўтра?

— Калі паспеем, возьмемся за ізаляцыю. Шлак яшчэ не прывезлі...

Валя дае мне штурхаля і зноў абурасцца:

— Не хачу слухаць пра вашу будоўлю. Досыць!..

Да Казіміра падыходзіць медсястра, нешта гаворыць яму і грозіць нам пальцам; Казімір развітальна трасе рукою:

— Загадваюць ляжаць. Заўтра дзень наведвашняў — вас пусцяць у палату...

— Сёння ўвечары я падбягу яшчэ. Перад сном. Ты пазглядай...

Медсястра дэманстратыўна зачыняе акно; ніжнія шыбы яго зацягнуты белымі фіранкамі, і нам не відно, што робіцца ў палаце.

Настрой цудоўны, і я жартую, калі мы выходзім з бальнічнага скверыка, спрабую планаваць наш сённяшні вечар, а Валя хмурыць бровы — незадаволена.

— Ты дзіўны,— папракае яна.— Трылузіў аб нейкіх паверхах, ізаляцыі... Казіміра нельга нічым хваляваць, яму спакой патрэбны!..

— Спакой? Ён гэтым словам грэбуе. Але ты цуд, Валюха, па праўдзе кажучы...

Валя ўражана і збянтэжана паваротам гаворкі: яна заўжды крыху бянтэжыцца, калі я падхвальваю яе, і сярдуе.

— Ну і баламут! Яму пра Фаму, а ён пра Ярому. Цікава Казіміру слухаць пра гэты ваш высокі паверх?

— А табе? Слухай, я ж абяцаў паказаць яго. Хадзем! Зараз жа!..

— Звар'яцеў.

— Не хочаш зірнуць з вышыні на Дзвіну?

У маім пытанні гэтулькі святога здзіўлення, што Валя шчыра рагоча:

— А кіно? Не люблю такой непаслядоўнасці. Загарэлася нібыта...

— Ну, калі ты лічыш...

— Прабач... Пачала злаваць. Гэта нядобра.

Валя паспешліва, але дужа пяшчотна бярэ мяне за руку; Валіны пальцы, мяккія і гарачыя, трывожна сталіся ў маёй далоні.

Не магу даўмецца, чаму так хутка змяніўся ў Валі настрой: толькі што жартавала, смяялася і раптам сцішылася, бы спатыкнулася аб тую сваю весялосць. Ці, можа, яна ўсё яшчэ злуе і толькі прыкінулася гэткай ласкавай?..

У душы спее нейкая прыкрасць (калі Валя не хоча ісці на будоўлю — мы не пойдзем), і я адчуваю: здарыцца гэта — нашыя адносіны зменяцца, назаўжды прападзе штосьці важнае і патрэбнае і ёй і мне.

— Не сярдуй... Неяк з галавы вылецела, што там Казіміра і білі...

— А мне тое — па ўсё жыццё. I хацеў сказаць і табе...

— Толькі не сярдуй...

Я не сярдую, але ранейшая прыкрасць стаілася ў душы, і толькі на будоўлі, калі мы ўзняліся на апошні паверх і я ўбачыў зыркую сінечу Дзвіны, яна растала і знікла зусім.

Мы стаім моўчкі. Унізе разлёгся горад: з зеляніны садоў за ракой відаць рознакаляровыя дахі драўляных хат, і вузкая брукаваная вуліца разразае іх на два пасёлкі; вуліца цягнецца да лесу, што сінее на даляглядзе, і па ёй паўзуць машыны; яны быццам выпырваюць з лесу, коцяцца па бліскучай істужцы дарогі, як маленькія карабкі, потым знікаюць за дрэвамі і з'яўляюцца ўжо ля моста; удалечыні за мостам маленькі катэр цягне даўгую істужку плытоў, нерухомых, як бы намаляваных на блакітнай паперы.

— Як адсюль далёка відно ўсё! — Валя па-сапраўднаму і моцна ўражана.— I Дзвіна ж шырокая. Нават і не ведала, што яна такая... А унька вялікі камень. Бачыш? На піраміду падобны. Гэта ж ля яго спыняліся, як на рыбалку ехалі.

Шэрыя гранітныя макаўкі вытыркаюцца з вады — іх асабліва шмат на паваротцы, дзе вузкая каса асакі даходзіць амаль да сярэдзіны ракі. Правільна, ля той касы мы тады зрабілі кароткі прыпынак, капалі ўюноў, а Валя сядзела на вялізным камяні.

— Літары на плітах... А-аа... Ты аб іх і казаў Казіміру.

— Яны навечна. Пакуль дом будзе стаяць...

Валя ведае аб гэтых плітах усё: як я знайшоў іх, як хадзіў у міліцыю, як апынуліся яны зноў на будоўлі, як шафёр гыркаў на мяне і пагражаў кулаком...

Тая грозьба тады мяне не ўразіла, але цяпер я думаю пра яе як пра нешта рэальнае. Хутка будзе суд над тымі, хто пакраў пліты, і мне давядзецца выступаць сведкаю; мяне не палохае гэта, я нават хачу зазірнуць у вочы гаспадару той высокай брамы з квадратовымі шуламі.

Валя ціха кранае маю руку.

— Ты злуеш?

— Не. Думаю пра наш дом.

— Тут вельмі хораша. І ў мяне такое адчуванне, нібыта пасталела, зрабілася дужэйшая...

— На апошнім часе мне ўсё часцей здаецца, што быццам нешта змянілася.

— Паміж намі?

— І паміж намі. Я неяк па-новаму гляджу цяпер на наша сяброўства... І сяброўства людзей увогуле...

— Калі што-небудзь здарыцца ў цябе — нічога не хавай ад мяне. Ніколі!

— І ты таксама.

— Так. Пасядзім крыху? Я стамілася...

Вялізны дыск сонца, агністы, барвовы, вісіць над лесам, што падступае да берага Дзвіны; вада ў тым месцы бліскучая, нібыта заслана змятай срэбнай папераю, а камяні, што зусім нядаўна выдавалі шэрымі плямамі, цяпер таксама бліскучыя і зіхацяць, нібы зробленыя са шкла.

Дзьме, не сціхаючы, вецер, і я чую, як Валіны валасы варушацца на падкрухмаленым каўнерыку кофтачкі, як шорхаюць па шэрых плітах сухія пясчынкі і бруіцца, няспынна плыве цененькі-цененькі меладычны звон; калі пакладзены ўсе пліты столі, ён амаль нячутны, і зусім прападзе, як толькі ў покоях зашкляць рамы, але цяпер тут, на незавершаным паверсе, дзе шмат сонца і несціханы вецер, гэты звон падобны на далёкі, прыглушаны спеў.

— Чуеш, Лёня. Быццам струна нацягнута дзесь... І ўвесь час трымціць...

— Гэта блокі. На кожным паверсе свой гук. Самы грамчэйшы тут, на самым высокім... А ты яшчэ не хацела ісці.

— Маўчы, дай паслухаць!..

Валя нахіляецца, і я таксама ўслухоўваюся і адчуваю сябе незвычайна шчаслівым чалавекам. І гэта таму, што бяда адступіла ад Казіміра, што агняна-зырка свеціць

сонца, што ёсць мой гмах, ёсць блокі, якія могуць спяваць ад ветру, і ёсць Валя, якая чуе гэты спеў, добра разумее мяне. Я прыкмеціў ужо даўно: варта мне аб чымсь падумаць, калі мы разам, і Валя часам адразу ж гаворыць пра тое, нібыта падслухала мае думкі.

Магчыма, і сапраўды закаханае сэрца здольна пасылаць другому сэрцу нейкія патаемныя сігналы. Магчыма. Але зараз не гэта галоўнае. Галоўнае зараз тое, што мы разам тут, на нашым высокім паверсе, і нас абвявае вецер, і мы бачым і Дзвіну, і лес, што стаіць на блізкім даляглядзе, і слухаем посвіст стрыжоў, што лётаюць высока ў сінім небе, і я ведаю, што Валя кахае мяне...

Але гэтага мала — толькі ведаць, што цябе кахаюць. Вельмі мала! Трэба, каб кожны крок на шляху да кахання быў шчыры, сумленны і чысты; і калі ты хоць адзін раз, хоць аднойчы збочыш, схлусіш, паспрабуеш абысці, а не перамагчы цяжкасці, што стануць на гэтай дарозе, паспрабуеш мінуць іх, а не адолець і адкінуць, ты можаш згубіць гэтае каханне назаўжды. Так, праўду казаў наш рахманы і змрочны прараб: у жыцці кожнага павінен быць самы высокі паверх, мяжа, ступіўшы за якую ты адкідваеш ад сябе нешта благое, робішся чысцейшы, больш мужны і смелы, і толькі адолеўшы гэты свой самы высокі паверх, робішся сапраўдным чалавекам...

Дзвіна заліта бляскам сонца.

Празрыстая смуга ў зарэчнай далечы.

Цёмныя плямы каменняў пад сярэбранай вадою.

Далёкі, прыглушаны спеў блокаў і шоргат Валіных валасоў па вузкаму каўнерыку...

Я думаю пра Валю, думаю пра наша Залессе, думаю пра ўсё тое, што адбылося за мінулыя дні... Думаю пра Казіміра, пра маленькую кватэру ў доме пад старымі вязамі...

— А што, калі наведаць сёння да Казіміравай мамы? — раптам пытаецца Валя.— Занясём ёй кветак і яблыкаў...

— Абавязкова. Ты малайчына, што гэта надумала. Маці ўзрадуецца...

І мяне ўжо не дзівіць, што яна зноў нібыта падслухала мае думкі. Гэта добра, што мы пойдзем да Казіміравай мамы. Гэта вельмі добра, што Казімір папраўляецца. Ён жывы, і таму жыве маё каханне да Валі, бо, каб здарылася нешта іншае, я б, мабыць, ніколі не дараваў сабе таго маладушша, калі паляцеў за каханнем у Залессе.

Я і цяпер не ўсё яшчэ дараваў сабе, і побач з радасцю пасялілася ў душы горыч, і я не ведаю, калі яна знікне і ці сплыве ўвогуле калі-небудзь гэтая горыч нядаўняга майго самалюбства. Толькі ведаю цвёрда: у вялікім і малым буду такім, як Казімір,— мужным і шчырым, вялікадушным і шчодрым. У маім жыцці яшчэ не было ніякага подзвігу, але я ўжо ўзняўся на свой самы высокі паверх, ведаю цяпер дакладна, як трэба жыць і што зрабіць у жыцці, і абавязкова зраблю гэта, зраблю нешта вельмі добрае, патрэбнае ўсім нам, і не зраблю аніводнага кроку, за які было б потым сорамна.

Гэта я абяцаю!..

## *Частка другая*

### 1

Наш цягнік адыходзіць апоўначы.

А цяпер яшчэ толькі вечар, і ў нас з Валяй багата часу, і мы стаім на каменным мосце, і нам хораша. Дзень быў спякотны, але гладкі гранітны парапет ужо стылы, і гэты холад студзіць локці; думаецца, што і Валі халодна — яна таксама абаперлася локцямі на граніт,— але я баюся спытаць, баюся парушыць маўклівую прыгажосць расстання. Нічога не гаворым. Глядзім. Слухаем.

Мы развітваемся з Масквою...

Вось-вось ацямнее; сонца ўжо не відно, яно схавалася за стрэхамі, але шырокія жаўтлявыя палосы святла крэсляць далёкую прастору сіне-шэрага неба, і рубінавыя зоры ад іх агняна зіхацяць на стральчатых вежах.

Заўтра ўсё гэта будзе далёка ад нас. Ад мяне... Ад Валі. Цікава, аб чым яна думае зараз? Мабыць, пра тое ж...

Вузкая пляцовачка як балкончык павісае над ракою. За нашай спінай шахцяць колы машын, плыве людская гамана. Усё гэта блізка і разам з тым неяк вельмі далёка, па-за межамі нашага маўчання. Па рацэ імчыць прыгожы рачны трамвайчык, пеністы след шырэе за ім, накатваецца на гранітныя сцены набярэжнай, і хвалі нячутна ўзлятаюць і асыпаюцца.

На Спаскай вежы велічна б'юць куранты.

За сцяной Крамля, па ўзвышшы, роўным шнурам зеляненюць дрэвы. У прагалах відаць чырвоныя пяцікутныя клумбы — гэта цвіце гваздзіка. Кветак там вельмі шмат, і пасаджаны яны з добрым разлікам: здалёк здаецца, што гэта зусім і не кветкі, а ўзняліся з зямлі, нібыта прабіліся ад самай глыбі да святла, вялізныя зоркі. Зоркі з кветак падобны на тыя, што палымнеюць на стральчатых вежах; толькі там, уверсе, яны ярчэйшыя, агняныя і праменістыя, нібыта запёкся ў рубінавых гранях жывы сонечны бляск.

Заміpae бомканне гадзінніка, увысі чэзнуць шырокія промні, але неба яшчэ ружавее, і ў трапяткім малінавым бляску выразна акрэсліваюцца абрысы высозных гмахаў.

— Трэба ісці,— гаворыць Валя.

— А мо застанемся на які дзень?

— Не, не! Толькі дамоў! Я вось цяпер думаю, якая

там Ірка? За гэтыя месяцы яна вырасла. А ты што, сур'ёзна?

Жартую, вядома. Не меней за Валю хочацца апынуцца там, на беразе Дзвіны, у нашым горадзе. Мы прыязджалі туды ўлетку пасля заняткаў, потым ад'язджалі зноў, і нас чакала Масква, і вось цяпер трэба развітвацца з ёю надоўга. Нават не верыцца, што мінула пяць год. Сёлета зімою, калі мы былі дома, я адчуў: кожны дзень гэта не абстрактная мера часу, а імклівая рэальнасць. Адчуў і ўпершыню падумаў, што кожны наш дзень падобны на міг — такі ён кароткі...

— Калі гэта было? — У Валіным голасе ўстрывожанасць, і ад гэтага мне робіцца радасна.

— Зімою, калі мы збіраліся ехаць сюды. Памятаеш, вярнуліся ад Віктара, а Ірка спала. Я сеў ля яе і глядзеў. І вось такая думка тады да мяне завітала.

— А дзе я была?

— На кухні. Вы з маці доўга там сядзелі. Карцела мне тады папытаць, аб чым тая гаворка. Але пачуў імя Віктара і не папытаў.

— Дарэмна. Мы пра яго і гаварылі. Мама ўсё даводзіла, не трэба, маўляў, вяртацца нам у Прыдзвінск, бо з Віктарам у цябе ладу не будзе.

— Гэта не навіна. Але ж крэпка яна не любіць яго.

— А ты?

— Што «ты»? — перапытваю, хоць і ведаю, пра што пойдзе размова: гаварыць пра Віктара мне не хочацца.

— Ты яго любіш?

— Я люблю толькі цябе.

Яна глядзіць на мяне, тоячы ўсмешку; бровы ў яе смешна выгінаюцца.

— Ён сказаў мне: «Я кахаю цябе». Я здзівілася. Ён сказаў мне другі раз: «Я кахаю цябе». Я насцярожылася. Ён сказаў мне трэці раз: «Я кахаю цябе». І я зразумела: ён хлусіць.

Валіны вейкі торгаюцца, у вачах смех спее, Валя лёгка прыхінаецца да мяне, і я адчуваю цеплыню яе пляча, і ад гэтага цяпла, ад блізкасці Валі, ад яе ласкавай насмешлівасці робіцца вельмі ўсцешна.

І тут жа твар яе мяняецца, робіцца строгі; у вачах ужо зусім іншы клопат.

— Ты разумееш? — пытаецца яна і моцна сціскае мой мезенец.— Заўтра — дома. І ўбачым Ірку!.. І нейкае дзіў-

нас ў мяне адчуванне. Цягне дамоў... І не хочацца ехаць адсюль.

— У мяне таксама.

— І ведаеш чаму? Лепшыя гады жыцця ў нас былі тут... Нам было цяжка... Але лепшыя гады мы пражылі тут, у гэтым горадзе. Ён мне цяпер зусім-зусім родны...

Гэтак думаецца і мне — Валя выказвае цяпер тое, што і ў маім сэрцы.

Мы ідзём на Краснай плошчы, вельмі людпай у вечаровы час; неба ўвысі яшчэ больш ацямнела, і чырвоны сцяг над зялёным купалам, што ўзвышаецца за цагляпай сцяною, падобны на жывую палосу агню; болей за ўсё людзей у цэнтры, ля Маўзалея,— чакаюць, каб паглядзець змену вартавых.

— Яны ўжо ідуць,— гаворыць Валя.— Глядзі!

У новай, дбайна адпрасаванай форме рухаюцца зменныя вартавыя. Яны крочаць ля нізкіх каменных трыбун, абцасы ботаў цокаюць вельмі гулка, чыста, і плошча раптоўна сціхае, чуваць толькі гэтыя чоткія рытмічныя крокі. Вартавыя ўзнімаюцца па прыступках, робяць імклівы паварот і застываюць, нібыта скамянеўшы, ля дзвярэй Маўзалея, і зноў чуваць пошчак крокаў — ідзе на адпачынак варта, што адстаяла свой час. А людзі не разыходзяцца, і не хочацца ісці нам, хочацца стаяць, і глядзець, і нічога не казаць, а толькі стаяць і глядзець, адчуваючы, як сплывае ў нябыт марудны і імклівы час...

Валя бярэ мяне за руку, і мы крочым павольна, не спяшаючыся; мы — адны ў густой і стракатай людской плыні. На рагу, ля Гістарычнага музея, спыняемся, акідваем развітальным позіркам плошчу. У апошні раз перад ад'ездам. Заўтра нас тут не будзе. А сёння мы яшчэ можам бачыць сваімі вачыма тое, што заўтра будзе далёка, але застанецца назаўсёды жыць у сэрцы.

— Значыцца, пешкі да самага Беларускага?

— Вядома. Але спярша ты павінен нешта зрабіць. Помніш, як тады дамаўляліся?

— Калі?

Наўмысна паціскаю плячыма. Усё яшчэ здаецца, што Валя не памятае падрабязнасцей, і мне хочацца нечакана яе ўразіць — зайсці ў кандытарскую і купіць доўжанькі пакецік маскоўскіх пернікаў: зрабіць усё так, як было ў першы дзень нашага маскоўскага жыцця. Тады ніхто з нас яшчэ не ведаў, якія падарункі рыхтуе свавольны экзаменацыйны лёс, і стаялі мы над Масква-ракою, усхваля-

ныя і ўзрушаныя. Мы прыйшлі пешкі ад Беларускага вакзала, стаялі на мосце, глядзелі на крамлёўскія зоры і елі маскоўскія пернікі — я купіў іх у латку ля кандытарскай. Пернікі былі вельмі смачныя, але пакецік маленькі, усяго на чатыры штучкі, і Валя сказала, што потым, калі скончым вучобу, прыедзем сюды, а потым пойдзем пешкі да вакзала і будзем есці маскоўскія пернікі.

Мой наўмысны адказ засмуціў Валю, і я ўжо не магу стрымацца і ўголас радуюся, што яна памятае, не забылася. Зараз будуць пернікі. Грошы на тое спецыяльна падрыхтаваны: вось яны, у гэтай кішэні...

У кандытарскай я размахваюся па-купецку: купляць дык купляць. На Валіным твары здзіўленне. Дзесяць пачкаў! Навошта? Але прадаўшчыца ўжо загортвае пернікі ў паперу. Мы выходзім на вуліцу. Несці пакунак зручна — з вяровачкі зроблена маленькая ручка.

— Мабыць, пернікаў болей і не засталося,— жартуе Валя.— Часам такое прыдумаеш... Абрабаваў кандыдатарскую...

— Абраза! За яе належыць пакаранне.

— Цяпер?

— І цяпер. І дома. Мы з Іркаю будзем есці маскоўскія пернікі, а ты — глядзець. Радасная перспектыва?

— Не вельмі. Але ж ёсць надзея: сэрца не камень. Глядзі! Сёння тая ж п'еса! Што ішла і тады!..

Афіша ля тэатра асветлена. Тут мы былі з Валяй неўзабаве пасля прыезду, і тады ішла гэтая ж п'еса — «Перад заходам сонца». У час спектакля пачалася навальніца, і мы чулі грымоты, а калі выйшлі з тэатра, дажджу ўжо не было, зырка блішчалі мокрыя тратуары, з дрэў падалі на асфальт буйныя, рэдкія кроплі, і на супрацьлеглым баку вуліцы вісела над ліпамі дрыготкая шырокая вясёлка.

Успаміны наплываюць раптоўна, здзіўляюча ясныя, нібыта ўсё было толькі ўчора і таму не вывятрылася з памяці, не згубіла свае вастрыні і свежасці. «Лепшыя гады жыцця...» Валіны словы да дзіўнага рэальна ўсплываюць у памяці, неяк рэльефна нават, нібыта вялізныя літары неонавай рэкламы, што разгортваецца ў вечаровых прыцемках над будынкам па той бок вуліцы. Праўда, лепшыя гады былі тут, у Маскве. Самыя цяжкія і самыя добрыя, самыя прыгожыя студэнцкія гады. У мяне іх было пяць. У Валі чатыры: яна рабіла перапынак у вучобе пад канец першага курса — нарадзілася Іра. Адсюль, з гэтага вя-

лізнага будынка тэлеграфа, я званіў у Прыдзвінск, і мне паведамілі навіну, якая зрабіла мяне бацькам і яшчэ больш шчаслівым чалавекам.

— Але чаго ты надумаў званіць менавіта ў той дзень? — Мы прыпыніліся ля будынка тэлеграфа, і Валя разглядае зыркую вясёлку рэкламных агнёў над вялізным колам гадзінніка.

— Быў ліст ад бацькі. Я адразу пабег сюды.

— Мне было радасна, што ты званіў. З маїго ложка я бачыла кавалак неба і клёны. Галіны гнуліся і дрыжалі ад ветру. Я была надумала: напішу, каб не дрыжаў на экзаменах.

— Атрымаў той ліст і смяяўся. На экзаменах я ніколі не дрыжаў.

— Хвалько. А што ў цябе было на выпускным?

— А-аа. З формулай порыстага бетону. Але ж я яе прыгадаў.

— А «Барада» на цябе пакрыўдзіўся.

— Тут — іншае: мая аспірантура прычынаю. Ён і цяпер лічыць: трэба было застацца.

— Хіба ты не казаў аб сваіх планах?

— Казаў. Яго і паважаюць на кафедры і крыху пабойваюцца. Але праз два гады ён, відаць, пойдзе з кафедры. Так, я гэта адчуў пасля гісторыі з Віктарам...

— Дагэтуль не разумею, навошта Віктар пісаў тую скаргу ў дэканат? Ну, заваліўся на экзаменах — дык вучыся!

— Віктар помсціўся. «Барада» яго зрэзаў. А экзамен вырашаў лёс аспірантуры.

— А я часам думаю: ці не разумней было б махнуць рукою на тую гісторыю і паступаць?

— Не. Лепей быць добрым будаўніком, чым пасрэдным вучоным...

Пачынаецца даўняе. І кожны раз у такой гаворцы выплывае імя Віктара, і мне непрыемна неяк і не хочацца спрачацца з Валяю. Над дугамі тралейбусаў успыхвае бліскучая белая маланка, блеклы водсвет яе ўздрыгвае на мокрым асфальце і атухае. Валіны вочы ў такія імгненні большаюць, і бачу я ў іх прытоены клопат; думкі яе цяпер, вядома, далёка ад гэтай вуліцы, яны там, ля Дзвіны...

На Цвярскім бульвары ў шырокіх каменных вазах цвіце настурцыя. Лавачка ў кутку пустая, і мы садзімся на яе, і адразу, нібыта чакалі нашага з'яўлення, запальваюцца ліхтары, і доўгая палоса бульвара выплывае са змроку

вялізнай бліскучай яшчаркай; галіны дрэў спляліся ўверсе, і пад зялёным шатром цемнавата, хоць і гараць ліхтары.

— Глядзі! Барыс ідзе! — Валя паспешліва хапае мяне за руку.— З дзяўчынаю... Не, памыляюся. Але ж як падобны!

— Барыс, мажліва, якраз у гэты момант ловіць рыбу на Байкале. У нас вечар, а там світанне...

— Ён, здаецца, нешта піша пра Байкал.

— Дыпломную працу... Ты ведаеш, я адпоічы падказаў яму цікавую штуку для кнігі. Мы тады гулялі з табою ў парку, а потым я вярнуўся ў інтэрнат, а ён сядзеў і пісаў. Памятаеш у аповесці Сцяпана? Гэта я падказаў яму!

— Але ж Барыса лаялі менавіта за гэты вобраз!

— Адны лаялі. Другія хвалілі. Гэта як першая рэцэнзія ў газеце з'явілася. Ён казаў: адмовіўся б ад кнігі і напісаў новую, каб толькі тое можна было зрабіць. І казаў сур'ёзна.

— А ён увогуле чалавек сур'ёзны.

— А я?

— А ты — гэта ты. Дай перніка, калі ласка. Хоць палавінку.

— Вось яно, пакаранне! Пачынаецца. Дык што мне з табою рабіць?

— Даць перніка. Кавалачак.

— Бяры цэлы. І ведай маё добрае сэрца!

За дрэвамі шастаюць колы машын. Ідуць людзі па дарожцы, пярэстай ад святла ліхтароў, зацененых густым спляценнем лісця,— ідуць павольна, не спяшаючыся; ніхто на нас не звяртае ўвагі, ніхто нічога не гаворыць нам, ні пра што не пытаецца — мы зноў адны, як там, на людпай плошчы.

Валя жмурыць вочы, бы сіліцца нешта ўспомніць. Чаго прыгадала яна Барыса? Відаць, проста ўбачыла хлопца, вельмі падобнага. А мо спачатку падумала, а потым убачыла: «Ён чалавек сур'ёзны». Мабыць, правільна. Але ж і патайны. Мы колькі пражылі разам, а я не так шмат і ведаю аб ім. Памятаю, Барыс не вельмі любіў расказваць пра сваё жыццё, пра тое, што было з ім у Віцебску, адкуль ён прыехаў да нас на будоўлю. А ў Маскве ён з'явіўся на трэці год пасля мяне — паступіў у Літаратурны інстытут імя Горкага. Раней я нават і не чуў, што такі інстытут існуе. А Барыс ведаў. Паступаў ён туды два гады: спачатку не прынялі, а потым ён паслаў на

творчы конкурс рукапіс свае кнігі, і конкурс вытрымаў бліскуча, і рукапіс ухвалілі, нават наспрыялі ў выдавецтве, і цяпер у мяне ёсць Барысава кніга — падараваў з аўтографам. А сёлета ў яго практыка, і ён паехаў на Байкал. Усё казаў, што хоча пабачыць, як ловяць омуля. Які ён, гэты омуль?.. Барыс абяцаў прысланць. Але нешта даўно няма звестак з Байкала. Магчыма, яны прыйдуць у Прыдзвінск?..

Прыдзвінск!..

Заўтра раніцаю мы ўбачым яго, убачым Дзвіну, убачым Ірку. Бацькі, пэўна ж, будуць сустракаць нас на вакзале разам з ёю — яны кожны раз сустракаюць нас, калі мы прыязджаем. А калі я прыязджаў адзін, мяне сустракала толькі Валя. Адна. І кожны раз я бачыў здалёк яе маленькую постаць ускрай перона.

— Мабыць, час ужо,— гаворыць Валя і ўстае.

— Гарантую, не спознімся.

— Такое адчуванне, што даўно сядзім тут.

— А цяпер — да помніка.

— І адразу ж пойдзем. Нам яшчэ рэчы трэба атрымаць.

— Гэта зойме пяць хвілін. Усё сплանавана, усё падлічана.

За помнікам Пушкіна, унізе, акаймаваная шырокім гранітным парапетам, плешчацца вада; чорныя зыркія струмені ападаюць на вялізныя чашы, бруяцца, пеняцца; вецер гоніць ад фантана непрыкметны, як імжа, пыл, ён асядае на дарожку, чырвоную ад дробна стоўчанай цэглы, на вільготныя бліскучыя лісціны кудлатых ліпаў; за дрэвамі, увысі над дахам цёмнага будынка, ззяючы, прабягаюць вялізныя неонавыя літары; у водбліску іх амаль прападае будынак, і тады здаецца, што словы вырастаюць проста ў цёмным паветры і знікаюць у ім жа, пакінуўшы кароткі ўсплёск зыркага агню.

— Мы будзем праходзіць тут практыку,— паведамляе мне Валя і глядзіць на неонавыя літары.— У двары ў іх там друкарня. Спачатку планавалася на камбінаце «Праўды», а потым нас падзялілі на дзве групы: адна будзе там, а наша тут.

— У тваім голасе — радасць!

— У іх выдатная паліграфічная база. Ёсць чаму павучыцца.

— А хто яшчэ ў вашай групе?

— Дванаццаць чалавек. А-ааа... Ты зайздросціш, што

ўвосень мне зноў у Маскву? Калі ты быў тут адзін, такое ж і ў мяне адчуванне было...

Ёсць праўда ў Валіных словах: мне неяк як бы і зайздросна, што яна будзе ў Маскве яшчэ год, і я неяк раўніва думаю пра ўсіх тых, хто будзе хадзіць з ёю на практыку сюды, у гэты вялізны дом на Пушкінскай плошчы. І я маўчу, але Валя не дае мне маўчаць.

— Скажы, пра што ты думаеш? Толькі шчыра.

— Пра цябе,— я тут жа забываюся на свой клопат і думаю ўжо зусім пра іншае і кажу ёй пра тое.— Заўтра — дома. Адразу ж возьмем спінінг і — на Дзвіну. Нашморгаю шчупакоў, а ўвечары прыйдзе Рогач з брыгадаю...

— А каму цяпер збірацца? Казімір з Зінаю ў Брацку. Барыс на Байкале. Сініцын, відаць, яшчэ хворы... Хіба толькі Віктар...

— Адпае ў нас сёння гаворкі — Віктар?

— Ты гаворыш так, быццам шкадуеш, што прыняў Віктараву прапанову.

— Хіба ж гэта яго прапанова? Я сам хацеў працаваць у Прыдзвінску. І мы абмеркавалі ўсё разам з табою. Так? Дык навошта ж спасылацца на Віктара?

— Ён кіруе ўпраўленнем. А ты зайздросціш. Прызнавайся!

— Глупства!

Кажу рашуча, паспешліва, кажу цвёрда, каб у Валі не ўзнікала аніякіх сумненняў. Але ў гэтай цвёрдасці і паспешлівасці — незадаволенасць. І нешта крыўднае для мяне самога. Навошта яна зноў пачала размову пра старое? Знарок ці з нейкай мэтаю? Спачатку Барыса ўспомніла... Цяпер Віктара... Нібыта другой гаворкі няма...

Папракаць не хочацца, і я маўчу і, здаецца, знаходжу прычыну таго, што так адразу насцярожыла, настроіла ваяўніча супраць Валіных слоў. А мо і сапраўды зайздрошчу, што Віктар стаў галоўным інжынерам? Не, не зайздрошчу. І гэта шчыра. Каб мне, у прыватнасці, прапанавалі такую пасаду сёння, я б адмовіўся. Мала вопыту, мала практычных ведаў, каб кіраваць такім вялікім калектывам. Цэлае ж упраўленне. А Віктар пагадзіўся. І нават больш: прыслаў у інстытут ліст з просьбаю накіраваць мяне ў Прыдзвінск. Уласна кажучы, у тым, што я еду менавіта ў Прыдзвінск, Віктараў ліст не адыграў аніякай ролі, бо мая заяўка была пададзена раней і на папярэднім размеркаванні гаворка пра тое ішла. Ды я і раней, яшчэ да паступлення, вырашыў: вярнуся ў свой горад. Так што

не дужа Віктару трэба выпінацца, і Валі не варта ўвогуле прыгадваць тое. Але пісьмо ўпраўлення ляжыць у інстытуце, я еду ў Прыдзвінск, і Валя гаворыць пра Віктара, і ад гэтых яе слоў мне робіцца ніякавата.

— Пойдзем! — кліча Валя.

— Яшчэ пяць хвілінак. Толькі пяць... Вось глядзі на гадзіннік. Як толькі пяць пройдзе, адразу ж шпуруем на вакзал...

Тонкія струмені вады ўзлятаюць у аранжавае кола святла і нібыта разбіваюцца аб яго, рассыпаюцца і зорсвятла і нібыта разбіваюцца аб яго, рассыпаюцца і зорным бліпчастым сяйвом ападаюць уніз, у чорны прамавугольнік басейна; вецер крыху прагінае струмені, зрывае вадзяное сяйво, вагаючыся, сплывае ўбок, і лёгкі дымны пыл ападае мне на рукі; час ад часу светлае аранжавае кола над франтонам уздрыгвае, і адразу ж дрогка трымціць за гэтым колам чорная прастора ночы, рэдкая, спаласаваная водбліскамі гнуткіх агнёў. Я дыхаю на поўныя грудзі, дыхаю так, нібыта вось зараз жа, як толькі пройдуць гэтыя пяць хвілін, скончыцца маё жыццё; час нібыта спыніўся, і я не думаю цяпер ні аб чым, а толькі гляджу на пярэстую сумець, што трапечацца ў блізкай чорнай высі нада мною, і адчуваю на твары халодны туман; вадзяны пыл асядае на лоб, на шчокі пячутна, і здаецца, што ідзеш ля ракі пасля дажджу праз туманную парпасць, і хоць дажджу ўжо няма, у паветры ўсё яшчэ вісіць шэрая імгла.

І раптам аднекуль з глыбі душы, як штуршок, як загад, хуткая і ясная думка: трэба ісці. Я працягваю руку Валі, і яна мне гаворыць:

— Роўна пяць. Вось паглядзі!..

Крочым хутка, і нам весела і добра ад таго, што на развітанне пабылі ва ўсіх месцах, што асабліва моцна звязаны з нашым жыццём у Маскве, з нашым каханнем: на мосце ля Крамля мы сустракалі святочныя салюты; на лавачцы ў кутку Цвярскога бульвара абмяркоўвалі свае сямейныя справы; у скверыку ля фантана сустракаліся кожны раз, калі збіраліся ісці ў кінатэатр; вуліцу Горкага прашпуравалі ўсю, як толькі прыехалі і апынуліся разам у Маскве. Мы тады ішлі, і здзіўляліся, і гаварылі шмат пра сваё жыццё, і захапляліся ўсім, што бачылі вакол, і часта прыпыняліся на скрыжаваннях і плошчах, і вуліца здавалася нам бясконцай, і нешта амаль дзве гадзіны спатрэбілася, каб дайсці да Краснай плошчы...

А цяпер вуліца нібы пакарацела: неяк зусім непры-

кметна мінаем адно скрыжаванне, другое, і вось ужо адкрылася наперадзе, уся ў зіхатлівых агнях, прывакзальная плошча.

Рэчы свае мы прывезлі сюды яшчэ зранку. Чаргі ля акенца багажнага аддзялення няма, і мы адразу ж атрымліваем свае чамаданы і крочым да цягніка.

— Як хораша ўсё атрымалася,— кажу я Валі.— Па раскладу... Зараз пакладзём чамаданы ў вагон, і я прынясу табе марожанае...

— Глядзі не спазніся!

— Без майго дазволу цягнік не адправяць...

Выходжу з вагона на зацененую высокім дахам платформу. Верх акна, ля якога стаіць Валя, адчынены, яна сочыць за мною, і хораша на душы ад таго, што ў нас усё ў парадку, што хутка цягнік павязе нас дамоў, а мы будзем стаяць у вагоне і есці маскоўскае марожанае.

— Пламбір. Два,— прашу я прадаўшчыцу.— Два пламбіры на развітанне...

— Калі ласка. Ешце і нас не забывайце.

— Цяжка забыць. У вас самае салодкае марожанае на свеце. Кожны раз купляю.

— І правільна робіце. Але ж нешта я вас не прыкмячала.

Нам не даюць завяршыць гэтую галантную размову: за спінай у мяне ўжо бубняць пакупнікі, і я адыходжу, развітальна памахаўшы прадаўшчыцы рукою. Валя хмурыцца, калі бярэ марожанае, глядзіць неадабральна, і гэта мяне дзівіць.

— Не падабаецца? Пламбір жа!

— Прадаўшчыцы ты гэта і тлумачыў паўгадзіны. Знаёмая?

— Вядома. Я звычайна перад ад'ездам заказваю марожанае на свой густ.

— Збоку зірнуць — не вельмі прыгожы густ. Людзі чакаюць у чарзе, а ён лясы точыць.

— Апошні студэнцкі камплімент. Павінен я быў сказаць яго на развітанне. Ты паспытай, які смак!

Хрустка шухціць срэбная папера. Ад святла, што скоса падае ў акно на Валіны рукі, абгортка марожанага падобна на бліскучы і туманны кавалак лёду.

— Смачнае! Але ты мог і меней гаварыць з прадаўшчыцай. Мне зрабілася ніякавата, калі ты ёй усміхаўся.

Адказаць Валі не паспяваю. У купэ ўваходзяць дзве жанчыны. Паліцы дасталіся ім верхнія, і яны, паведаміў-

шы гэта, глядзяць на нас. Нам усё роўна, якія месцы занялі, і я бачу згоду Валі, але знарок, каб яна гэта бачыла, не хачу ўсміхацца незнаёмым жанчынам і прапаноўваю абмяняцца месцамі падкрэслена суха, хоць і далікатна. Жанчына ў тонкіх, з залочаным абадочкам, акулярах напраўляе каўнер шарсцяной кофтачкі і паспешліва дзякуе нам.

Я ладкую паклажу нашых спадарожніц па купэ пад ніжнім сядзеннем і выходжу ў калідор, дзе ўжо крыху суняліся мітусня і развітальная гамана. Мы стаім з Валяй ля акна, глядзім на асветлены перон, і яна папракае мяне.

— Яны табе дзякуюць, а ты нават не ўсміхнешся.

— Я ўжо ўсміхаўся прадаўшчыцы. На сёння хопіць.

— Не трэба быць дагматыкам. Ты заўважыў, як можна ўзрадаваць чалавека маленькай паслугаю. Драбязою нават...

— З такой драбязы складаецца ўсё наша жыццё,— кажу я з робленай шматзначнасцю.— Нават каханне...

— І гэта ўсё, што ты зведаў у Маскве?

— Яшчэ я ведаю цвёрда: марожанае смачнае.

— Значыцца, ты не дарэмна вучыўся тут пяць год...

— А як ты думала! Зараз дам знак машыністу — і паедзем!

Цягнік яшчэ не крануўся з месца, але ўсё тое, што мы бачым з акна, як бы адсунулася, яно ўжо зусім не з намі, і хоць побач з вагонам на пероне шмат людзей, якія нешта гавораць, робяць знакі сваім знаёмым, што асталіся ў вагоне, яны ўжо далёка ад нас. Мы ля акна толькі ўдваіх з Валяй, і нам хораша. Я ўслухоўваюся ў тое, што ёсць у сэрцы, а ўсё астатняе абмінае розум, як абмінае мяне вецер, што ўлятае ў адчыненае акно: адчуваю яго, але ён не закранае ні думак, ні ўвагі, ні выклікае тугі і трывогі.

Гайдануліся ліхтары на пероне — цягнік крануўся; ніdзе нічога не грукнула, а толькі ўздрыгнулі і адразу ж пасунуліся назад ліхтары, людзі, металёвая вязь апорных слупоў.

Бывай... Не, лепей — да сустрэчы. Да сустрэчы, цудоўны і слаўны горад.

Агні прыстанцыйных будынкаў падступілі да самай чыгункі, і вокны ў іх асветлены па-рознаму, а некаторыя цёмныя і здаюцца плямамі на светлай сцяне. Але вось адплылі і яны, і адкрылася панарама вечаровай Масквы. Сярод безлічы розных каляровых агнёў ззяючыя абрысы

універсітэта на Ленінскіх гарах выразна акрэсліліся роўнымі гранямі святла і ўсталі ў цёмнай прасторы як казачны міраж, як нерэальнасць. Гэты гмах мы заўжды бачылі здаля, калі пад'язджалі да Масквы, і цяпер ён доўга свеціць нам; пакрысе адплывае ўсё, хаваюцца ў цемры жылыя кварталы і каляровыя агні і акрэсліваецца недзе збоку новы раён святла, а ў ружавата-чорнай высі ўсё яшчэ велічна і прыгожа свецяцца роўныя агнявыя грані.

Масква, Масква!..

Шмат паэтаў уславілі цябе — велічную і простую, прыгожую і таленавітую, мудрую і смелую; і кожны з нас, услаўляючы цябе, ніколі не хлусіў, быў шчыры, бо ты часцінка сэрца кожнага. У вайну ты была нашай надзеяй і надзеяй усяе планеты, палымяным заклікам да змагання, нязгаснай верай у перамогу: у розных кутках зямлі людзі прыпадалі да прыёмнікаў і слухалі твае пазыўныя, як самую чароўную і дзівосную мелодыю, і ад яе прыходзіла да людзей новая сіла, вера ў тое, што хмары разыдуцца і светлае, чыстае неба будзе над нашым краем; і прыпадаюць цяпер, і слухаюць, і чуюць твой голас, голас праўды і міру, голас, які вучыць разумець шчасце і змагацца з бядою, вучыць радасці, чалавечнасці і дабрыні.

Гляджу на водсвет маскоўскіх агнёў, што сталі ўжо далёкія, і бачу вялізны яркі водсвет, што ўвесь час не знікае на даляглядзе, і ў гэтым водсвеце мрояцца мне ўсмешкі сяброў даўніх і цяперашніх, таполі ў нашым інстытуцкім парку, лесвіцы і аўдыторыі, дзе мы сядзелі, мрояцца твары настаўнікаў, што выводзілі нас на шырокую дарогу навукі і ведаў, вучылі шчырасці і сардэчнасці ў стаўленні да людзей...

Прастора ночы за акном; халодны вецер урываецца ў калідор, шастае белымі фіранкамі, і Valіны валасы варушацца ад ветру, крапаюць маю шчаку, і мне здаецца, што я магу ехаць вось так доўга-доўга і што на ўвесь гэты час хопіць мне кахання, хопіць думак пра Маскву і хопіць сілы...

## 2

Адчынены дзверы на поўны мах, і Віктар гукае гасцінна, узрадавана:

— Прашу! Прашу, масквічы! А я чакаю, а я гляджу ў акно. Ну, думаю, здарылася нешта. Ці загаварыліся? Чаго ж так позна?

Радасць яго не робленая, а шчырая, і гэта мяне прыемна ўражвае: думалася, што сустрэча наша будзе сухаватая, што ўбачу ў Віктара фанабэрыю не ў меру ганарлівага начальніка, а ён, аказваецца, нават і знешне ніколькі не змяніўся — па-хлапецку вузкія светлыя штаны, сіняя, у белую кропку кашуля з расшпіленым каўняром, а на плячы неахайна вісіць палатняны, не надта чысты ручнік.

— Ірку спаць клалі,— апраўдваецца Валя.— Пакуль яе ўладкуеш! І яшчэ па Дзвіне затрымаліся. Таму і позна.

— Але гэта лепей, чым ніколі.

— Я табе дам, ніколі! — Віктар штурхае мяне ў плячо, усміхаецца.— Павярніся, павярніся, сынку, як казалі гогалеўскія казакі! Пакажыся!..

— Не, лепей ты пахваляйся. Як ты тут?

— А нічога, ведаеш. Нічога! І праходзь!

— Няма як праходзіць — загарадзіў гаспадар дарогу!

— Аслупянеў ад радасці. Ды што ты туфлікі шаруеш! Наперад!

— Нейкі модны шалік у цябе!

— Знак гасціннасці! Прашу!..

Віктар, спахапіўшыся, зрывае з пляча ручнік (яму нібыта сорамна, што Валя ўбачыла яго ў такім выглядзе), апраўдваецца, пазіраючы толькі на Валю.

— На гаспадарцы кручуся. Маіх жа дома няма. Паехалі ў Слуцк. Цётка там усё хварэе. А я тут вячэру ладзіў...

— Мо памагчы што? — прапаноўвае Валя.

— Усё, усё гатова. На вышэйшым узроўні, хоць я і не ведаў, што жонка майго сябра стала такой прыгажуняй.

— Узровень вячэры ты вызначаеш гэтым крытэрыем?

— А як жа!.. Леначка! Сустракай гасцей!..

Стол у пакоі прыбраны, ля талерак стаяць высокія чаркі, і я, крыху затрымаўшы позірк на іх, не адразу заўважаю ў прасценку ля квяцістай, амаль да самай падлогі, шторы незнаёмую мне жанчыну.

— Зрэшты дачакаліся,— гаворыць яна мякка, і я здагадваюся, чаму не адразу прыкмеціў яе — сукенка жанчыны і штора крыху падобны.

— Давайце знаёміцца. І вячэраць! Э-ээ! Солі не паставіў!

Віктар вылятае з пакоя, а я, рукаючыся з жанчынай, заўважаю: яна крыху збянтэжана, але хавае гэта за бадзёрай і прыветнай, крыху робленай усмешкай. Здаецца,

недзе сустракаліся. Але дзе? Мая ўвага, відаць, празмерная, і я крыху болей, чым трэба, мабыць, спыняю свой позірк на яе твары: Лена знарок адварочваецца, бярэ Валю за руку, і яны ідуць да канапы.

— Сядайце, Валенька, калі ласка, сядайце. Вы прыдаўна з Масквы? Ці гэта Віктар жартуе. Ён любіць жартаваць, я ведаю.

— Пазаўчора прыехалі.

— Ой, а я ўжо месяц там не была. Як выехалі на гастролі — дагэтуль усё на колах. Летні час — прыпар для нас: падарожжа, падарожжа, падарожжа... І пакуты, што з імі звязаны. Праўда, сёлета маршрут цікавы і вясёлы. Памятаю, калі Віктар яшчэ вучыўся, ён усё Дзвіну нахвальваў. «Пабачыш — не захочаш ніколі адсюль ехаць». І вось цяпер давялося і паглядзець яе, і пакупацца, і пазагараць.

— Магу прысягнуць: ён казаў праўду,— умешваюся я ў гаворку.— Згодны?

— Абсалютна. Рака — вышэй любой ухвалы. Ёсць нешта ад Ангары, і на Аку крышку падобна. Там, ля Кашыры, такія ж лазнякі, пясчаныя ўзвалы... Вы не былі там?

— У Кашыры? Бачылі яе з акна электрычкі...

— Ах, даруйце. Усё пра Дзвіну расказваю, вы ж яе з маленства ведаеце! Калі ласка, пра Маскву гаварыце... Яна мне кожную ноч сніцца. Учора званіла маме, дык так расхвалявалася — да раніцы амаль і не заснула...

У дзвярах нячутна з'яўляецца Віктар, робіць мне пальцам знак выйсці да яго, а потым весела, крыху ненатуральна смеючыся, гукае:

— Таварышы жанчыны, я бяру Леаніда на кухню — спатрэбілася рабочая сіла. Але гэта толькі на хвілінку. А мо нават і не на поўную. Згода?

Валя памкнулася ўзняцца з канапы, хоча ісці і памагчы на кухні, але Лена прымушае яе сесці, просіць гаварыць пра Маскву.

— І ты, Віктар, не перашкаджай нам, калі ласка! Расказвайце, Валенька, расказвайце!..

— Толькі спачатку ўсё другараднае раскажы,— кідае Віктар.— Самае галоўнае пакідай. Чуеш, Валя? Самае галоўнае і я з ахвотаю паслухаю...

На кухні адчынена акно, але чадна, моцна пахне смажанай рыбай, цыбуляй і яшчэ чымсьці, мне невядомым, але знаёмым.

— Бяры гэта,— камандуе Віктар і падае мне вазу з круглым тонкім пячэннем.— І вось яшчэ яблыкі па пляцёнцы. Здолееш? А я пацягну рыбу. Смажыў сам, браце, бо Лена ў гэтай справе не вельмі петрыць. Яна пячэнне рабіла. Але нешта са спецыямі перакасіла.

Цяпер я пазнаю гэты невядомы мне пах — карыца. Пакуль мы ўдвух, спрабую даведацца пра іншае і пытаюся асцярожна:

— А хто яна, Лена гэтая?

— А ты хто?

— Упершыню мяне бачыш?

— Не. Але сёння ты госць. А калі госць задае шмат пытанняў, гэта не зусім прыстойна. Разумееш?

— На жаль, не ўсё. Абяцаю аднак: нетактоўных пытанняў больш не будзе.

— Малайчына. Але, паколькі непаразуменне па гэтай тэме ў нас узнікла, я павінен табе паведаміць: Лена — даўняя мая сяброўка па Маскве. Артыстка. Яны тут на гастролях. Так што, як бачыш, я не толькі будую, але і захапляюся мастацтвам.

— Дакладней, некаторымі прыгожымі яго прадстаўнікамі.

— Што паробіш: не люблю абстрактнае мастацтва. Для заўвагі: там, на стале, каньяк. Ці, можа, ты хочаш «Сталічную»? У гэтым кірунку поўная самастойнасць.

— Я госць, з твайго дазволу. Але няхай будзе каньяк.

— А нашым дамам прапаную «Усмешку». Ты не піў такое віно?

— Здаецца, не чуў нават.

— Зусім новая марка. Спецыяльны разліў і для спецыяльнага продажу.

— Ты, я гляджу, робішся вузкім спецыялістам.

— Яшчэ і не тое ўбачыш. Але на ўсё свой час. Пабеглі, бо там нас чакаюць. Рыбу мы паставім на стале з патэльняю. Як у старадаўняй Масковіі. Во гэта яшчэ...

Віктар чапляе на мезенец драўляную падстаўку і нагою зачыняе дзверы на кухню. А ў пакоі нікога ўжо няма, толькі на канапе бялее Валіна сумачка; дзверы на балкон адчынены, вецер ветразем выгінае тонкі белы цюль, і з балкона чуваць смех Лены.

Віктар ставіць патэльню на падстаўку ў сярэдзіне стала, задаволена пацірае рукі:

— Ну, управіліся! Лена! Валя! Чакаем! Што вы там робіце на балконе?

— Глядзім на горад,— гукае Валя.— Як хораша ён відзён! Нават Дзвіна да самай павароткі!..

— Дзвіна не ўцячэ. А рыба мая гнецца ў чакапні. Лічым да трох. Раз... Два!..

Адкінуўшы рукамі цюль, улятае ў пакой Лена, за ёю — Валя.

Віктар наліў чаркі, і першы ўзнімае руку, і прапаноўвае тост, і голас у яго незвычайна вясёлы.

— За Маскву! За самы цудоўны і самы светлы горад на гэтай планеце! За тое, каб цягнікі часцей падвозілі нас да Беларускага вакзала! За ўсё гэта!

Лена разглядае бурштынавае віно ў вузкім келіху, лёгуценька мружыць шэрыя вочы.

— І за маю Таганку, за таполі ў нашым двары.

— І клён,— дадае Віктар.— Той клён, што стаіць ля ўваходу з вуліцы...

Здзіўляе мяне раптам Валя; нейкая ўзбуджаная, з імклівым бляскам у вачах, вясёлая празмерна — такой я яе нават і не бачыў,— яна імпэтна чокаецца з усімі і смела перапыняе Віктара:

— А лепей так: усе за Маскву. І кожны за сваё паасобку.

Віктар, трымаючы келіх у адной руцэ, другою хапае відэлец і бразгае па бутэльцы:

— Адпаасобніцкія тэндэнцыі ў апошнюю чаргу. Спачатку наш агульны тост: Масква! За горад, з якім мы ўсе звязаны крэпка, дзе сталі інжынерамі, дзе гараць рубінавыя зоры, што дораць людзям усяе зямлі цяпло, святло і добрыя надзеі!..

Віктар акідвае нас уладарным позіркам, нібыта з якой высокай трыбуны, а ў голасе, па-святочнаму патэтычным, прабіваецца незвычайная шчырасць, і я заўважаю, што яна хвалюе не толькі мяне; Валя замерла на нейкі міг, імклівы бляск у яе вачах атуманьвае одум — такі быў выраз на твары, калі мы стаялі на Пушкінскай плошчы ля фантана; а Лена ні на кога не звяртае ўвагі, утаропіла позірк на зіхатлівае бурштынавае віно ў вузкім келіху на тонкай ножцы.

— А я ўсё-ткі за сваю Таганку,— раптам гаворыць яна.— І за добрыя надзеі, за свае добрыя надзеі! — І выпівае келіх да дна.

Мне падабаецца Лена. Вось менавіта за свае апошнія словы, за спакойную, самавітую зацятасць: сказала і не адступаецца. Спачатку, як толькі я яе ўбачыў, яна мне

не надта прыглянулася, а цяпер неяк імкліва, увачавідкі змянілася быццам, і мне даспадобы вялікія шэрыя вочы, нейкія дужа мяккія, добрыя вочы, і густыя светлыя веі, не крапутыя фарбаю, і даспадобы яе звонкі, але не крыклівы голас, і яе рашучасць асабліва. Вось сказала, што Таганка ёй самае блізкае і роднае і што яна хоча выпіць за яе, і нічога не змяніла. Малайчына! І твар гэты мне чамусьці дужа знаёмы. Але раней мы не страчаліся — на заклад магу ісці. Тады адкуль гэтае адчуванне?.. Афіша. Вось адкуль я ведаю яе твар. Гэта ж на тэатральнай афішы, якую мы сёння ранкам чыталі ў скверы, я бачыў яе твар. Праўда, там яна была такая строгая, недатыкальная, а тут прасцей, зусім звычайная і мілая.

За сталом усім хораша, і весела, і слаўна — так мне думаецца. Віктар сапраўды засмажыў рыбу з добрым густам. Выграбаю з патэльні на Ленішу талерку самы прыгожы і самы смачны па выгляду кавалак.

— Куды ж мне гэтулькі? Не трэба! — просіцца Лена.

— Вы яшчэ не ведаеце, у якую кампанію трапілі. Гэта ж рыбакі.

— Кааператыўныя, трэба дадаць. Так што рыбкі цяпер вам давядзецца паесці,— кажу я, падтрымліваючы Валін жарт.— Вы ведаеце, якога шчупака заспінінгаваў нядаўна? Во! Мы яго два дні елі.

Віктар з уяўнай дзелавітасцю зводзіць мае рукі:

— Лявон, не перабольшвай. Вось! Такі шчупак і быў. А потым, на трэці дзень, у ларку арцелі прадавалі тое, што не з'елі. Галаву шчупакову, на жаль, і не прадалі. І ведаеце чаму? Ані ў кога ў горадзе не знайшлося такога вялізнага чыгуна.

— Трэба было па частках!

— Спрабавалі пасекчы. Дык ніхто не бярэ — дробязныя кавалачкі атрымаліся.

— Э-ээ! Дык вось якая гэта рыба тут на патэльні!

— Ну-ну! — пагражае Віктар мне пальцам.— Такога судака ў вашым ларку ніколі не было і не будзе. Экстра!

— А які ларок? Ён даўно пераабсталяваны ў фірменны магазін.

Віктар, жартуючы, махае рукою:

— А шыльда? У вас жа няма шыльды. Так што, пакуль не позна, заключайце з намі ўмову — будзем пастаўляць вам судака.

— Леначка, раскажыце гэтаму хвалько, як працуюць сціплыя рыбакі.

— На маторцы ехалі і цягнулі спінінг. Потым як дугне! Я крычу: зачапілі за нешта! А гэта судак!

Віктар вельмі задаволены словамі Лены, глядзіць на яе з захапленнем, потым нахіляецца да мяне, паведамляе таямнічым шэптам:

— Такія мясціны на рыбу знайшоў — не прысніцца. Праўда, далекавата. Кіламетраў трыццаць на маторы трэба гнаць.

— У цябе маторка ёсць? Хутка ж ты развярнуўся!

— Не мая. Збіраюся купіць у бухгалтара ўпраўлення. Пасудзіну зляпілі яму на шкловалакне. Матор, праўда, магутны: цягне як звер.

— Уніз па Дзвіне хадзілі?

— Уверх. Да вусця Абалянкі. І потым па ёй яшчэ кіламетраў пяток... О-ох і мясціны там! Глушыня. Берагі топкія, ніхто падступіцца з вудамі і сеткамі не можа. А рыбы поўна...

Я крыху ведаю тыя месцы, чуў аб іх ад рыбакоў, але лавіць там не даводзілася — далёка. Але цяпер, калі Віктар можа ўзяць маторку, трэба туды падскочыць абавязкова. І чаго марудзіць? Заўтра і катануць.

Віктару чамусьці не па душы мая прапанова, ён задумліва хмурыцца:

— Заўтра? А што ў нас заўтра? Пятніца? Не, тады нельга. Заняты. Бюро гаркома.

— Ого! Ужо і член бюро?

— Не. Запрошаны. Наш шэф робіць справаздачу аб выкананні плана. А разам з ім і нас пацягнулі. Яно, між іншым, цікава і паслухаць, як яму там па мазгаўні лупянуць.

— У вас што, не зусім гладка з планам?

— Не, план далі. Але шэф мой... Ведаеш, нюансы некаторыя... Пачнеш працаваць — сам убачыш. Цяпер не тое, што было тады, як мы з табою ў брыгадзе былі. Механізмаў шмат, аб'ектаў шмат, недахопаў яшчэ больш. Аднаго не хапае — людзей, і матэрыялы затрымліваюць. Тысяча і адна ноч, як любіць гаварыць наш упраўляючы.

— Між іншым, гэта і да яго казалі. Ён проста паўтарае.

Віктар глядзіць на мяне і са смяшком трасе галавою:

— Толькі не ўдумай яму сказаць гэта ў вочы — на ўсё жыццё ворага нажывеш... Слухай, табе вяндлінкі пакладу. Хатні выраб. Ёсць у мяне тут адзін брыгадзір, пядаўна з вёскі, пачаставаў...

— Бойцеся данайцаў, якія прыносяць дары... Памятаеш?

— Не дары, а павага! — Віктар патэтычна ўскідвае палец угору.— Павага! Але пра тое гаворка пойдзе пазней.. Спачатку — паведамленні аб жыцці нашага Алімпа. Як там жыве «Барада»?

«Барада» — гэта Міхась Ціханавіч, загадчык кафедры будаўнічых матэрыялаў. Увесь курс, ды і сам я, расказваючы Валі аб інстытуцкіх справах, часта ўжываў гэтую мянушку; але цяпер, калі я пачуў яе з вуспаў Віктара, яна абразіла, нават пакрыўдзіла.

— Міхась Ціханавіч па-ранейшаму,— кажу я.— Вучыць, патрабуе ведаў...

— Абараняеш? Пахвальна. Для цябе ён быў заўсёды Міхась Ціханавіч, любімы прафесар.

— Хіба толькі мой? Давай прыгадаем...

Віктар слухае мяне ўважліва, але на твары смяшок, і я ўвесь час адчуваю, што ён скептычна ставіцца і да маіх слоў, і да ўсяго таго, што засталося там, у інстытуце. Віктар, вядома, памятае, што менавіта Міхась Ціханавіч, калі гаворка ў інстытуце ішла пра будучых аспірантаў, катэгарычна паўстаў супраць яго кандыдатуры. Не ведаю як, але Віктар даведаўся аб гэтым у той жа дзень і, сустрэўшы прафесара ў калідоры, даволі бесцырымонна запытаўся, чаму ён, прафесар, ставіць яму, Віктару, палкі ў колы.

Па натуры вельмі сціплы, прафесар разгубіўся на нейкі момант, потым пачырванеў, затрос сівою шыкоўнай барадою:

— Ваша нахабства, малады чалавек, мяжуе са смеласцю. А смеласць я паважаю. Таму прыміце як належыць і мой шчыры адказ. Вы пакуль што без колаў, дарагі юнак! І гэта радуе. Бо на колах, нават самых слабенькіх, можна ў навуцы так-сяк і ехаць. Але ў навуцы — запомніце гэта на ўсё жыццё — нельга поўзаць!

— Народжаны поўзаць, як сцвярджае класік, лятаць не можа? Гэтак?

— Вось імепна, дарагі юнак! Не можа!

— Не можа. Згодзен. Але невядома, глыбокапаважаны прафесар, хто з нас у недалёкай будучыні будзе поўзаць, а хто паляціць...

Прафесар затросся, але не знайшоў ніводнага слова ў адказ, ледзьве даваловся да дэканата і гадзіну якую ляжаў на канапе пластом.

Праз гадзіну ўвесь наш курс ведаў, што адбылося. Мы

знайшлі Віктара і патрабавалі, каб ён зараз жа пайшоў і папрасіў прабачэння. Віктар нічога не ўтойваў і шчыра, нават з гонарам, прызнаўся, што сапраўды груба гамапіў з прафесарам, але ж і той быў не дужа ласкавы, і таму, маўляў, невядома, хто павінен прасіць прабачэння...

Прыгадваю цяпер тое і, разумеючы прытоены смяшок Віктара, знарок не шкадую слоў, малюю дзейнасць нашай кафедры самымі яркімі фарбамі, натхнёна расказваю пра лекцыі прафесара, пра тое, як хораша і цёпла развітваўся ён з намі, што казаў на развітанне. Віктар слухае, нервуецца, час ад часу саркастычна ўсміхаецца і ўрэшце не вытрымлівае, рэзка перапыняе:

— А чаго ж ён цябе не пакінуў на кафедры, гэты твой барадаты бог?

— Я не схацеў.

— Хіба ён табе яшчэ і прапаноўваў?

— Уяўляеш, прапаноўваў!

— І ты адмовіўся?

— Катэгарычна. І, здаецца, вельмі пакрыўдзіў Міхася Ціханавіча. Праўда, перад ад'ездам мы з ім абмяркоўвалі маю тэму. Ён нават сказаў, што нікому яе пакуль што не аддасць.

— Паставіў на кансервацыю?

— Проста дамовіліся: незалежна ад таго, як павернецца ў мяне праца, я буду збіраць патрэбны матэрыял. Практычны. Павінен сказаць табе, што тэма мяне і самога цікавіць. Але я па-ранейшаму лічу: лепей добры інжынер, чым пасрэдны вучоны. Іх, дзякуй богу, хапае. А інжынеру можна займацца навуковаю працаю і без аспірантуры.

— Ты выказаў гэтыя думкі яму?

— Выказаў. Праўда, не ў такой форме. І магу цябе запэўніць: не хачу і не буду абстрактным аспірантам. Я інжынер, а клопат інжынера — будаваць. А там будзе відно...

Віктар, прыгнуўшыся, націрае рукою твар, потым далонь яго спыняецца на правым воку, і ён сядзіць гэтак нейкі час, пазіраючы на мяне толькі адным левым вокам, якое насмешліва прыжмурваецца.

— Слухай,— раптам гаворыць Віктар.— А «Барада» ўсё яшчэ гушкае сваю ідэю аб планаванні жылля па кольцасці кватэр?

— Сваёй ідэі ён заўсёды верны. І ты гэта ведаеш.

— А ты падзяляеш яго думку? Кажы шчыра, цяпер «Барада» далёка...

Ізноў чуецца мне нешта абразлівае ў гэтай мяпушцы, і я маруджу з адказам.

«Цяпер «Барада» далёка...» Не, няпраўда! Міхась Ціханавіч ніколі не будзе далёка, і ніколі не сатрэцца з маёй памяці ўсё тое добрае, чаму ён вучыў нас, яго голас, шчырасць. Як захапляўся Міхась Ціханавіч, калі ўзыходзіў на кафедру і пачынаў гаварыць нам пра сваю ідэю новага плапавання. Плапаванне ў метрах — гэта спадчына мінулага, таго часу, калі асповай нашага будаўніцтва была камунальная кватэра. Але гэты час мінуў беспаваротна. Старыя экапамічныя катэгорыі і імкліва растучыя патрабаванні сённяшняга дня — вось дзе тормаз. Ідзе новая эра градабудаўніцтва, у якой асновай для складання плана будаўніцтва жылля ў кожным горадзе будзе ўлік патрэб людзей, патрэб кожнай сям'і, кожнага чалавека. Мы павінны ведаць і гэтыя патрэбы і гэтых канкрэтных людзей і планаваць не метраж, калі складаем перспектыўны план, а колькасць кватэр. І не абстрактных кватэр, не кватэр увогуле, а такіх, дзе б былі поўнасцю ўлічаны склад сям'і, занятак кожнага яе члена, густ і патрэбы кожнага, хто будзе жыць у той кватэры. І адсюль яшчэ адзін напрамак змен у нашым градабудаўніцтве: асноўны эканамічны крытэрый ацэнкі нашых праектаў не кошт аднаго метра пакоя, калідора, кухні, а кошт усяго жыллёвага комплексу. Кошт і мера, у якой ацэньваемы аб'ект задавальняе канкрэтныя патрэбы канкрэтнага чалавека,— вось якія суадносіны вызначаць галоўную эканамічную лінію.

Прыгадваю ўсё тое, знарок падкрэслена паўтараю канцэпцыі Міхася Ціханавіча. Віктар слухае, потым з ляноцтаю і пагардай адмахваецца:

— Ах... Няхай пра тое думаюць архітэктары.

— Павінны думаць усе. Разам. Гэта ж аксіёма: тое, што ўчора было тэорыяй толькі, сёння — практычная ўжо неабходнасць.

Віктар глядзіць на мяне, не хаваючы іроніі, потым гультлівая ўсмешка наплывае на яго твар.

— «Суха теория, мой друг. А древо жизни — вечно зеленеет». Гэтак сцвярджаў паэт.

— Значыцца, ты не згодзен?

І зноў на яго твары ўсё тая ж усмешка, ад якой Віктар робіцца далёкім і безудзельным; слухае, гаворыць, але ўвесь ягоны выгляд сцвярджае, што робіць ён тое толькі па нейкаму абавязку, які вымушаны выконваць.

— Ну, вось ізноў... Хіба справа ў тым, згодзен Віктар

ці не згодзен? Наш час — суровая і неабвержная рэальнасць. Адсюль і галоўнае патрабаванне: быць рэалістам. Помніш байку Міхалкова пра разяву і трамвай? Абсалютная дакладнасць маралі: будзь рэалістам, калі хочаш мець дзве нагі.

— Ты хочаш сказаць, што тыя, хто вучыў нас, стаялі на адной?

— Не. Зусім не! «Барада» нешта марыць, плануе... На здароўе. Ён на кафедры. А тут жыццё. «Інжынер павінен будаваць». Твае словы? І я згодзен з імі: мы павінны выконваць канкрэтныя планы. І гэтыя планы не тэорыя, не завоблачная хімера. Мары людзей! Тых, канкрэтных, пра якіх, дарэчы, і гаворыць твой Міхась Ціханавіч! Цікава, ведае «Барада», колькі чалавек стаіць на чарзе ў чаканні кватэр у нашым горадзе?

— Чарга не апраўдвае анахранізм. Разумееш?..

Я пачынаю гарачыцца: у душы варушыцца непрыязнасць да Віктара, даўняя, якая, здавалася, ужо зусім вывятрылася; яна, аказваецца, жыве, і нічога не закрэслена, нічога не забылася, і гэтая іронія ў словах Віктара не толькі жывіць яе, але і пачынае трывожыць мяне, настройваць варожа. Спрабую заціснуць гэтае пачуццё, прыглушыць, але адчуваю, што яно расце, мацнее, і я не магу саўладаць з ім; хочацца спрачацца з Віктарам, даводзіць, што ён памыляецца, абвяргаць. Але чаму так жывуча тое, даўняе?.. Тут, мабыць, і фанабэрыя Віктара, і крыўда на тую пагарду, з якою ён гаворыць пра нашага прафесара, яго нязгода з маімі думкамі і імкненне павучаць мяне, як малое дзіця. Ён будуе!

Толькі ён клапоціцца пра тых людзей, што стаяць у чарзе на атрыманне кватэр...

Лена з Валяю ўмешваюцца ў нашу гаворку, не даюць нам абвастрыць спрэчку.

— Хопіць, хопіць! — рашуча патрабуе Лена.— Вы тут паводзіце сябе не па-рыбацку. Сышліся, як пеўні. Валя! Патрабуем ад мужчын чай. Віктар! Мы хочам чаю!

— Які загадаеце чай? Індыйскі? Грузінскі? Ці з вострава Цэйлон?

— Усяго патрошку!

— Бу сделано!

Віктар узнімаецца, робіць мне знак рукою, і я наважваюся памкнуцца следам, але Валя затрымлівае мяне:

— Э-ээ, не. Зноў пра свае дамы пачнеце крычаць ды спрачацца. А нам хочацца мірнай і ціхай гаворкі. Праўда?

Лена нібыта не чуе — пытанне, здаецца, ёй нават не-чым і не даспадобы — і, смеючыся, цягне Віктара да ка-напы.

— Садзіся. А мы зараз з Валяю чайнік падрых-туем.

— Во, во! — Валя рашуча ўзнімае рукі, нібыта баро-нячыся ад таго, што пачула.— Гэта ж іх зноў удвух пакі-нуць?

Віктар з размаху плюхаецца на канапу, пакрыўджана ківае галавою, але вочы ў яго вясёлыя, без крыўды.

— Ну, дажыліся мы з табою, дарагі мой сябар. Хат-няя хунта захапіла ўладу. Што рабіць?

— Чакаць. І аказаць ёй поўны давер. І маральна рых-таваць сябе да салодкага чаю.

— А гэта ідэя!

Лена з Валяю прыносяць чайнік і чырвоныя кубкі: яны амаль і не затрымаліся на кухні, толькі пайшлі і адра-зу ж вярнуліся.

Мы зноўку за сталом, і чай духмяны і смачны, і Лена гаворыць пра свой тэатр. Тут, у Прыдзвінску, глядач пры-мае кожны іхні спектакль з цеплынёю незвычайнай, нават лепей, чым дома,— на ўсе спектаклі білеты прададзены ўжо даўно.

— Шкада, хацелася б пабачыць вас на сцэне,— гаво-рыць Валя.

— Абяцаю два персанальныя месцы. Прыстаўныя. Тэатр тут цудоўны — усё пачуеце і пабачыце.

— А Віктару?

— Заўтра не магу,— паспешліва тлумачыць Віктар Ва-лі.— Поўна важных спраў. І самае галоўнае — не ведаю, калі закончыцца бюро...

— Віктар — дзяржаўны дзеяч.— Лена ўсміхаецца, і я чую ў яе голасе крыўду.— Ён у нас на гастролях быў толь-кі аднойчы...

— Гэта праўда, Віктар?

— Але. Цяжка глядзець, Валечка, гэтыя спектаклі. Убачыў, памятаю, яе на сцэне,— Віктар ківае галавою на Лену.— Слёзы — ручаём. А сэрца — ін, ін, ін... Яшчэ б крыху і — фаркт. Таму і не хаджу.

Лена зноў усміхаецца, але смех яе роблены, хоць і прыгожы, і ў куточках губ з'яўляюцца зморшчынкі; не ведаю адкуль, але ў мяне адчуванне, што з Віктарам сяб-роўства ў яе цяжкае.

— І не сорамна яму! — са шчырым здзіўленнем выгук-

вае Валя.— У нядзелю, Лена, мы яго прывядзём у тэатр. І пазапасім насовак — няхай плача.

— Ну і ну! Ды што ж гэта вы сёння? Наваліліся на гаспадара аб'яднанымі сіламі — ратунку няма. І ніякай помачы. Як казаў паэт? «Пойду искать по свету, где оскорбленному есть чувству уголок!..»

— Лена! У вашым тэатры няма вакансіі? Мы зараз дамо Віктару рэкамендацыю. Няхай пачынае спачатку з роляў другарадных...

— Толькі галоўную. Прычым — па замен.

— Які яшчэ замен?

— Вы мне даяце сцэну. Я вам саступлю права мыць сёння посуд.

— А тэхніка дзе? Няхай яна зоймецца посудам.

— Тэхніка адпраўлена на ўдасканаленне. Уся надзея на вашы рукі.

— Валя, ты бачыш, хто просіць галоўную ролю? Няхай памірае актор!..

Валя з Ленай хутка састаўляюць кубкі, талеркі і нясуць посуд на кухню. На стале застаецца толькі керамічная ваза, нізкая, авальная, на трох нізенькіх ножках. Віктар падсоўвае яе, поркаецца, выцягвае ўрэшце цукерку ў бліскучай зеленаватай загортцы.

— Якая ў нас пойдзе гаворка?

— На любую згодны,— кажу я.

— Перспектыва, якая вельмі абнадзейвае.

— «Надежды юношей питают». Гэта ў тваім ключы — ты любіш цытаты.

Дзверы на кухню не зачынены, і добра чуваць, як бразгае там посуд, як ажыўлена і весела размаўляюць Валя і Лена. Здаецца, яны нешта дужа пасябравалі менавіта там, калі засталіся на кухні ўдзвюх. Раптам галасы сціхаюць, і адразу ж, выбухам, смех.

У руках Віктара суха шарахціць абгортка цукеркі.

— Хочаш? Паспытай,— прапануе ён мне і падсоўвае вазу.— Не еў такія цукеркі ў Маскве?

— Чаму? Куплялі.

— Там? У Маскве?

— Вядома. У беларускім фірменным. Яны там амаль заўсёды былі.

— А ў нас — рэдкасць. Як толькі з'явяцца — мігам раскупяць. Вельмі люблю.

— Я не надта.

— «Лявоніху»?!

— Увогуле не люблю цукеркі.
— Ты анёл. І не курыш, як бачу.
— Кінуў.
— Жалезная сіла волі.
— Простая неабходнасць. На другім курсе як быў, Ірка ў нас захварэла. Кашляла ўсё. Валя прасіла: не куры дома. Ну, давялося кінуць. І цяпер вельмі задаволены.
— Сапраўды анёл. І п'еш, заўважаю, малавата. Ці ты ўжо строга, як некаторыя: толькі па рэвалюцыйных святах? Эх, табе б крыльцы — узляцеў бы на нябёсы.
— А мне і на зямлі добра. А гарэлку проста не люблю. Магу выпіць, але радасці ад яе не знаходжу. Я прывык да іншых радасцей. І гэта ж агульнавядома: прымітыўныя людзі шукаюць у ёй весялосць. А слабыя — паратунак...
Віктар перапыняе мяне, узрушана паціраючы далоні:
— О! Слухай, я табе дам цудоўную аўдыторыю. Ты павінен, абавязкова павінен прачытаць у трэцім інтэрнаце лекцыю... Ну, скажам, так: «Гарэлка і сапраўдная радасць». Альбо так: «Сапраўдная радасць не ў гарэлцы».
— Роля паяца мне не падыходзіць.
— Ну вось... Быў кіпяток, ім і застаўся. Я табе сур'ёзна кажу. З трэцяга інтэрната пасля кожнай палучкі «хуткую» выклікаюць. Там ёсць такія завадатары! І не хочаш піць, а вып'еш. А потым ніколі мірна не пройдзе вечар...
— Дык ты мяне замест «хуткай дапамогі»?
— Давай так: не было гэтай гаворкі. Чуеш, яны там прыслухоўваюцца на кухні.
— Згода: не было.
Віктар дастае з кішэні цыгарэты; пачак пусты, ён кідае яго на маленькі столік, што побач з канапаю, нахіляецца і з палічкі, якая закрыта вузкім вышываным абрусам, дастае новы, у хрусткім цэлафане.
— Хадзем на балкон,— прапаноўвае ён і ўзнімаецца.— Пакурым там. І пагаворым. Ёсць у мяне дзела сур'ёзнае і табе патрэбнае...
На балконе ў вузкіх, доўгіх скрынях цвітуць белыя гладыёлусы. Разглядаю кветкі і адчуваю, што супакойваюся. Вядома, крыху я і пагарачыўся, калі сказаў ён мне пра той трэці інтэрнат. Нічога крыўднага ў той прапанове не было. І, безумоўна, не яна мяне ўзвінціла, а тое, якім тонам ён зрабіў яе. А, зрэшты, і не гэта важна. Відаць, калі адкінуць іронію яго слоў, там і сапраўды, у тым трэцім, хлопцы бядовыя. Але што цяпер ён казаць будзе? Відаць,

пачне нешта пра будучую маю працу. Чамусьці не хочацца, каб размова аб ёй ішла тут.

— «Сама садзік я садзіла...», а? — Я жартую, жадаючы неяк выйграць час; зараз павінны вярнуцца з кухні Лена і Валя, і ў нас пачнецца зусім іншая гаворка.

— Маці. Яна кветкі любіць.

— А я іх і не бачыў, як той раз заходзіў. Нават і не помню...

— Калі тое было! Бацька, між іншым, перад ад'ездам тваёю асобай цікавіўся.

— Нават?

— Падабаешся. Ён любіць буяністых і ганарлівых.

— А да якога ж разраду я залічаны?

— Ты з'ява цікавая: спалучэнне першага і другога.

— Гэта ён так гаворыць?

— Ты лепей паслухай, што я табе скажу. Пытанне табе рубам: працаваць да мяне пойдзеш?

Цяпер я разумею, што перад гэтым так мяне ўзвінціла. «У мяне на трэцім...», «Да мяне пойдзеш...» Гаворыць, нібыта распараджаецца ўласнай будаўнічай арганізацыяй. Які князь знайшоўся! Ёсць упраўленне. Строіць з сябе такога валявога буйнога кіраўніка. І, між іншым, цікава, што ж ён там мне падрыхтаваў?

— Да кабінетнай працы, ты сам ведаеш, я не здатны...

Пачынаю асцярожна, але не паспяваю нічога растлумачыць: Віктар паварочваецца, глядзіць на мяне ва ўпор і перапыняе імпэтна і рашуча:

— Лічыш мяне кабінетным інжынерам? Глыбока памыляешся. Ніякіх кабінетаў! Я даю табе канкрэтную работу. Перспектыўную надзвычай. І на вельмі цікавым участку...

Зноў вельмі рэжа слых гэтае яго пахвалістае! «Я даю табе...» Няўжо ён з усімі так размаўляе? Даведаемся з цягам часу. А пакуль што спрачацца не трэба. Работа на нейкім канкрэтным участку? Гэта якраз тое, пра што і думалася. Гэта, уласна кажучы, можна і абмяркоўваць.

Віктар шчоўкае пальцамі, як быццам просіць у некага ўвагі, зацягваецца, пускае тонкі струмень дыму на белыя гладыёлусы; вочы прыжмураны, і мне цяжка злавіць іх выраз.

— Ён яшчэ хоча абмяркоўваць! А ты хоць ведаеш, які гэта ўчастак? Экс-пе-ры-мен-таль-ны! Разумееш сэнс?

— Пакуль што не зусім.

— Каб у цябе пытанняў болей не было, я даю расшыф-

роўку. Участак — гэта тры жылыя дамы, якія мы вядзём хуткасным метадам. Паставім іх у тэрмін — усё будзе на вышыні.

— А чый праект?

— Інстытут распрацаваў. А вядзе яго Крыштоп Раман Пятровіч. Твая натура!

— Ты гэта гаворыш так, нібыта мая натура табе не па душы.

— Бачыш? Мы адразу пачынаем са спрэчкі. Ты хоць папытай, калі аб'ект трэба здаць.

— Спачатку мяне цікавяць праекты.

— А мне яны абрыдлі ўжо — несусветная валтузня з імі была. Планаваўся ўвесь раён. З размахам, ведаеш, на новыя там матэрыялы, на новыя формы... Ну, вядома, тое-сёе паабкарналі трохі... Але праект цікавы. І галоўнае — пра яго ўжо раструбілі. Калі да свята Кастрычніка паставім першы дом, а астатнія на май, будзе сапраўдны бум. Гарантую табе месца на ўрачыстым гарадскім пасяджэнні. У прэзідыуме. За чырвоным сталом з кветкамі.

— А сам ты дзе сядзеш?

— Побач.— Віктар усміхаецца, не разумеючы мае іроніі.— Стол вялікі — месца хопіць... А ты чаго крывішся?

Віктар глядзіць на мяне, хмурыць бровы, і губы таргануліся. Але больш на твары нічога не змянілася, і разам з тым я бачу, што ён вельмі незадаволены маімі словамі.

— Думаеш, што я толькі аб прэзідыумах і мару?

— Ды не. Проста слухаю. Слухаю і ўзважваю прапанову. І прыходжу вось да якой думкі: ты скасуеш адну сваю ўмову — і я іду на той аб'ект прарабам.

— Якую ўмову?

— Прэзідыум. Гэта мне не падыходзіць.

— Не верыш?

— Ахвотна веру.

— Дык чаго ж не падыходзіць?

— У мяне няма патрэбнага гальштука!

— Ну, урэзаў!...

Віктар шчыра, як зусім нядаўна за сталом, рагоча. А мо ён не так ужо і абюракраціўся, як гэта мне здалося спярша?

— Значыцца, гальштук? — смеючыся, перапытвае Віктар.— Добра, пачакаем, пакуль прыдбаеш. Але прарабам без гальштука таксама цяжка — гэта ўжо я лічу асабіста. Старшым! Старшым прарабам. Ну, як? Гэта табе не ў прэзідыуме сядзець. Ведаеш, што гэта ёсць — старшы пра-

раб? Праца, праца, праца... І адказнасць, акрамя ўсяго іншага!

— І на ўсё гэта я згодзен. Толькі напярэдне — заўтра ж раніцаю! — хочацца азнаёміцца з праектам. Ты там, дзе быў Якімцаў?

— А ты, мабыць, думаў: зрабіўся Віктар начальнікам — адразу і кабінет памяняў на большы!

— Крыху думаў.

— А яшчэ што? Давай на шчырасць!.. Я, ведаеш, любому дзякуй скажу, калі ён мне — праўду-матку ў вочы.

— Гэта ўсё, вядома, добра. Але...

— Што «але»?

Дзіўна, якую яшчэ «праўду-матку» Віктар чакае? Калі ён хоча, можна паўтарыць, што мне не падабаецца. Увесь час ён ужывае толькі асабовы займеннік. А граматыка, як вядома, мае і іншыя...

— На «мы» хочаш павярнуць? — са смяшком пытае Віктар.

— Ты хацеў праўду-матку.

— За шчырасць — дзякуй. Але пабачым, як сам запяеш, на аб'екце, які займеннік пачнеш ужываць, калі давядзецца за нешта самому адказваць. Нскалі і мне такое ж думалася: асабістае «я» нічога ў калектыве не важыць. А што аказалася? Важыць! Важыць, калі ты хочаш кіраваць народам. Быў у мяне, ведаеш, адзін прараб на пятым. Свайго «я» ў яго ніколі не існавала: кожны там сябе начальнікам лічыў і камандаваў. І дакамандаваліся: другі год мы той аб'ект не можам здаць — усё рамантуем. У новым доме — рамонт. Бо калі будавалі, там сапраўднага кіраўніка і гаспадарскага вока не было. А цяпер не паспяваем скаргі ўлічваць — хоць ты іх у мех складай. І пішуць, і пішуць, і пішуць.

— І ўсё без падстаў?

— Я не кажу, што без падстаў. Ёсць падставы. Таму я прарабу і сказаў: як будавалі, у цябе ўсе камандавалі, каму хацелася, а цяпер адказваць аднаму давядзецца. Зноў у «я» ўпіраемся.

— Адказнасці не баюся. Таму і прапаную: заўтра глядзім кальку. Мо і на аб'ект паспеем. Хацелася б зрабіць гэта разам...

— Разам не абяцаю — кожная гадзіна распланавана.

І зноў на твары Віктара глыбакадумнасць і заклапочанасць. Мне крыху і смешна бачыць яго такім, і не хочацца крыўдзіць. Бяды вялікай няма, што ён не хоча ехаць

разам. Я спачатку зірну на праект, потым на аб'ект дабяруся, а ўвечары адшукаю Віктара, і ён будзе ведаць маё канчатковае рашэнне і маю думку пра аб'ект.

Віктар працягвае мне руку, у голасе яшчэ мацней гучаць апякунскія ноткі:

— Ёсць. Дамовіліся. А цяпер — да жанчын. Нагрузілі іх работаю. Пайшлі, хоць маральна падтрымаем. А-аа... Вось і яны! Ну, як вы там, таварышы жанчыны? Справіліся без нашай дапамогі і кіраўніцтва?

— Справіліся. Жанчыны не любяць, каб імі кіравалі на кухні. Праўда, Лена?

— А жанчынаю ўвогуле не трэба кіраваць, ні на кухні, ні на вуліцы.— Лена кратае пальцамі доўгія і вострыя стрэлы гладыёлусаў, гаворыць нібыта сабе, але словы яе — адчуваю гэта вельмі добра — у першую чаргу тычацца Віктара.— Якое ж гэта сяброўства, калі адзін кіруе, а другі толькі яго распараджэнні выконвае? Залежнасць і падначаленасць. Ад старога нешта, накшталт «жена да убоится»... У вас як з гэтым прынцыпам?

Валя не разгубілася:

— А мы яшчэ толькі прымерваемся. І яшчэ невядома, хто і каго «убоится».

— Як невядома? У нас ужо вызначылася пэўная тэндэнцыя. Збліжэнне!

— Чаго ты іх чапаеш? — Віктар гаворыць гэта жартаўліва, зусім не апякунскім тонам.— Закажанелыя сепаратысты перад намі. Адна шайка-лейка, як гаворыцца. Таму я прапаную: пакінем звілістую сцежку маральных праблем і зоймемся пытаннямі культуры. Стаўлю на галасаванне кіно. Хто «за» — прашу!

— А білеты? Наўрад ці знойдзеш цяпер.

— Гарантыя. Зараз званю і заказваю. Якраз на апошні сеанс паспеем. Пярэчанні?

— Не, не! Мы — дамоў,— гаворыць Валя.— Мы ж Ірку кінулі.

— А што ёй? Спіць. І бацькі ж у хаце. Гэта каб іх не было. А малая — ім забаўка!

— Мы, відаць, пойдзем. Ці не так, таварыш Бугрым?

Валя пытае такім тонам, што я здагадваюся: ёй хочацца толькі дамоў. І нікуды болей. А ў мяне няма жадання ісці дамоў. Наважваюся падтрымаць Віктара і запярэчыць Валі, але ў самы апошні міг бачу вочы Лены, скіраваныя на вуліцу, і словы адразу атухаюць ва мне. Доўбня! Якая ж я доўбня. Лена таму і не сказала нічога аб прапа-

нове Віктара, бо не ўхваляе яе. Сёння вольны ад канцэрта вечар, і яна хоча быць з Віктарам. А тут — нейкае кіно. Некалі з Валяю мы не шукалі аніякай кампаніі, нам было добра заўжды ўдваіх. І як хутка я зрабіўся эгаістам! Каб толькі мне было добра!

— Муж ды пагадзіцца са сваёй жонкаю. Галасую за новы курс сямейнага карабля — паром!

— А што сёння ў кіно? Я нават не ведаю...

Лена адразу ажывілася, узрадавалася, спрабуе нават настойваць, каб ісці разам у кіно, але гаворыцца гэта толькі па тое, каб не маўчаць, і я, узрадаваны прадбачлівасцю Валі, патрабую рашуча і жартаўліва-ваяўніча:

— Дамоў! Толькі дамоў. Дзякуем вам за вечар і запрашаем у наш край. Калі вас чакаць?

— Ды проста — у любы час. Праўда, праўда, Лена! — перапыняе мяне Валя.— Як толькі надарыцца вольная часінка — прыходзьце абавязкова. Я цяпер дома, і клопатаў у мяне мала. Пасядзіце ў садзе, адпачнеце...

— З ахвотаю. Можа, нават і паслязаўтра. Не ведаю толькі, ці будзе чым заняты вось гэты дзяржаўны дзеяч...

Мы з маўклівым чаканнем глядзім на Віктара. Ён разумее, што адказ трэба даваць, і з падробленай глыбакадумнасцю пералічвае на пальцах справы, якія нібыта трэба яму будзе зрабіць, і, пералічыўшы, раптам гаворыць добрым вясёлым тонам:

— Запісваем: паслязаўтра. На чым едзем? На маторцы паедзем. Забяром вас і — на рыбалку. Чакайце нас у тры гадзіны. І вучыцеся прымаць рашэнні з дзяржаўным размахам.

— Ухваляем!

— А цяпер мы з Ленаю вас праводзім. Ніякіх пярэчанняў. Да самага парома. Шкада, аркестр не развучыў новы марш. Другім разам...

Ідзём па вуліцы таропка: час позні, і хутка спыніцца пераправа, і калі мы не паспеем на яе, дык давядзецца тэпаць аж да моста — далекавата. Валя з Ленаю крочаць наперадзе, а мы з Віктарам шпуруем следам. Амаль увесь час гаворыць Віктар, а я слухаю. Тут, на вуліцы, Віктар здаецца ранейшым хлопцам, тым, з якім мы некалі сябравалі, працавалі разам, нейкі час разам вучыліся. Ён расказвае пра будоўлю, пра тое, што паспеў зрабіць за гэты час, і гаворыць зусім не такім тонам, якім размаўляў са мною дома, а я слухаю яго і спрабую ўявіць, як пойдзе

ў нас з ім работа — я ўжо пераканапы, што працаваць разам нам давядзецца.

Развітваемся на беразе. Паспяваем ускочыць на паромны катэр і стаім ля борта, развітальна ўзняўшы рукі, і глядзім на прычал, дзе засталіся Віктар і Лена. Вецер гайдае дрэвы на беразе, гайдаецца і катэр, і ўвесь час здаецца, што постаць Віктара пад ліхтаром дрыжыць і вагаецца.

— А Лена мне вельмі падабаецца,— нечакана гаворыць Валя.— Разумная і добрая жанчына. І як кахае Віктара!

— «Она его за муки полюбила»!

— Вучыўся разам з ім, а не ведаеш!

— Лена ніколі і не прыходзіла да нас у інстытут. І па вечарах Віктар звычайна быў не з ёю. Ён круціў невялікі раман з лабаранткаю. Такая маленькая, чорненькая. З кафедры гідраўлікі.

— А як ставіцца цяпер ён да Лены?

— Хацеў быў запытацца. Але мяне адразу папярэдзілі: госць не павінен быць занадта цікаўлівы.

— Значыцца, ён лічыць цябе толькі госцем?

— Нават болей: падначаленым. Хіба не заўважыла, як ён намагаўся гуляць ролю вялікага і валявога начальніка.

— А што ён мысліць пра тваю працу?

Коратка перадаю змест нашай размовы з Віктарам. Валя нічога пэўнага не гаворыць, але мне хочацца ведаць яе думку, і яна, урэшце, прызнаецца, што не ведае, ці добра гэта, ці блага — мая будучая работа. Яе словы мяне насцярожваюць. Чаму — не ведаю? Гэта ж якраз тое, пра што я марыў у час вучобы і пра што гаварыў з ёю неаднойчы. Акрамя таго, работа на ўчастку пойдзе па вельмі цікавых праектах.

— Ён табе іх паказаў?

— Дамовіліся на заўтра.

— Значыцца, на гэтым тыдні ты пачнеш?

— Відаць. Так што Залессе, відаць, давядзецца нам адкласці.

— А мне думаецца, што варта паехаць. Бабуля хварэе. Невядома, калі потым мы зможам яе ўбачыць. І табе трэба адпачыць.

— Паслязаўтра паедзем на маторцы — вось і адпачынак.

— А што, калі і іх запрасіць у Залессе. Месца ў бабулі ўсім хопіць. Спаць можна на сене.

— А хто старой накасіў таго сена?

— Бацька. Прыехалі, ён і расказваў, што ездзіў і касіў. Хіба ты не памятаеш?

Шчыра кажучы, не памятаю тае гаворкі. А мо Валя пераблытала? Магчыма. Але хіба гэта мае нейкае значэнне: ёсць там сена ці не. Важна іншае, тое, што мы паедзем у Залессе.

За бортам катэра пеніцца чорная бліскучая вада. Бераг аддаліўся, і там, пад ліхтаром, ужо сабралася некалькі чалавек — чакаюць пераправы. Віктара і Лены, здаецца, сярод іх не відно. Ды я, прынамсі, не вельмі і шукаю іх — думкі мае зусім у іншым кірунку. Вядома, Валя мае рацыю, калі кажа пра Залессе. Трэба нам шухнуць туды. Э-эх, слаўна ж мы пакачаемся па чаборы на выспах! А раніцаю сесці з вудамі ў тонкім і пявучым трысці. Цяпер там добра павінен брацца лешч. А на спінінг — судак...

## 3

Абяцаная Віктарам рыбалка не адбылася — хвастануў дождж, і ўвесь дзень потым імжыў патроху. У Залессе мы таксама не паехалі. Магчыма, з майго боку гэта было крышку эгаістычна, і Валя пакрыўдзілася. Я не апраўдваўся, крыўду Валі прызнаў і паабяцаў, што ў нядзелю, наступную нядзелю, мы, магчыма, паедзем на возера. Паабяцаўшы, я вельмі мала ўжо і думаў пра Залессе: пачалася мая праца на будоўлі, а з ёю самы розны клопат і турботы.

У агульных рысах наш участак выглядае так. На самым беразе Дзвіны мы павінны збудаваць чатыры дамы, у пяць паверхаў кожны. Яны адкрыюць вялікі комплекс жылых збудаванняў, што павінны стаць на паўднёвай ускраіне горада, на былым пустыры. А перад гэтым пустыром падковаю крывіцца вузенькая вулка прыватных дамоў, старых, даваенных яшчэ, маленькіх і счарнелых ад часу — іх трэба будзе зносіць.

З праектам я азнаёміўся дэталёва адразу ж. Тлумачэнні па ім даваў мне Раман Пятровіч, з якім мы сустрэліся ў Віктаравым кабінеце. Крыштоп летась працаваў у Віцебску, там яго праект абмяркоўваўся, і Крыштоп доўга дамагаўся, каб адпусцілі ў Прыдзвінск. Дамогся свайго, прыехаў і працуе. Архітэктар мне спадабаўся адра-

зу ж. Ведаў ён праект бліскуча, трымаўся з Віктарам незалежна, выказваў свае меркаванні ўпэўнена і адстойваў іх смела і рашуча; праўда, ніякіх там асаблівых спрэчак не ўзнікла, але я адчуў, што Крыштоп з тых людзей, якія лёгка сябе ў крыўду не дадуць нікому.

Даючы згоду працаваць на эксперыментальным участку, я прасіў прарабам да мяне прызначыць Рогача. Свайго былога брыгадзіра я сустракаў, гаманіў з ім і дамовіўся. І хоць працаваў Рогач на аб'екце, які заканчвалі, Віктар заўпарціўся: праўда, адчувалася, што спрачаецца ён на тое, каб паказаць, хто мае права вырашаць лёс людзей на будоўлях, якія вядзе ўпраўленне; я настойваў, і Віктар урэшце пагадзіўся.

Цяпер на нашым участку праца набыла добры размах. Натужна равуць і грукочуць бульдозеры, імчаць самазвалы. Глуха гакае коўш экскаватара, і, асядаючы пад грузам, рыпяць рысоры машын. Самазвалы падкатваюць да катлавана, становяцца на пагрузку, не выключаючы матораў, і хутка ад'язджаюць, саступаючы месца новым.

Кіруе пагрузкай Рогач. Гляджу на суладны рытм працы і толькі цяпер пачынаю разумець, як правільна я зрабіў на тым тыдні, калі адстойваў кандыдатуру свайго прараба. Без яго вопыту мне б давялося цяжка. Яшчэ не скончана ачыстка катлавана, дзе стане падмурак першага дома, а на пляцоўку ўжо даставілі першую партыю апорных пліт. Па графіку, які складзены ўпраўленнем і выканання якога ад нас патрабуюць самага дакладнага, мы павінны заўтра пачынаць закладку першага падмурка.

Нам хочацца апярэдзіць гэты графік.

— Я так думаю... Як машыны не знімуць у нас сёння, дык увечары нагоніш пліты,— гаворыць мне Рогач.

Ён толькі што падбег да мяне, совае рабочую кальку ў кішэню; рудая кепка ссунута казырком назад; лоб блішчыць ад поту.

Гаворка пра машыны адразу трывожыць. Самазвалы павінны працаваць тут да заўтрашняга дня. Куды іх могуць зняць?

— На пяты. Там з прыборкаю затрымаліся. Сядзелі, сядзелі, а цяперака спахапіліся.

— Самазвалы не адпускай,— кажу я Рогачу.— Так шафёрам і скажы: пакуль катлавана не выберам — нікуды. Зразумеў?

— Але ж у іх пуцёўкі па нашым толькі да абеду. А потым — туды. Віктара Паўлавіча загад.

— Табе асабіста загадаў?

— Не. Але...

— І добра. Чуў ты толькі мой загад. І яго выконвай.

Рогач шкрабе за вухам, кепка ледзь трымаецца на галаве, перакошваецца, але нейкім цудам трымаецца; ён папраўляе яе рукою, на мяне не глядзіць і гаворыць, што, маўляў, правільна, вядома, каб спачатку закончыць, а потым туды машыны накіраваць, лайдакоў тых выручаць. Але ж як перад упраўленнем апраўдацца?

— Разам будзем апраўдвацца,— абяцаю я Рогачу.— На мяне спашліся. Ты па закону павінен выконваць загад старшага прараба?

— Ды я з ахвотаю...

— Аб чым тады гаворка! І смялей!

— Можна і смялей. Але ж і наперад паглядзець варта...

Ён шчыльней націскае кепку і без асаблівага імпэту дыбае да машын. Загадам маім Рогач, адчуваецца, не задаволены, і я не магу даўмецца, што гэта: баязлівасць ці клопат пра мой будучы лёс.

Экскаватар чэрпае жоўтую вільготную глебу, і ад удараў каўша халодны брус, на якім я сяджу, ледзь улоўна ўздрыгвае; іклы каўша адпаліраваны да люстэркавага бляску і зырка зіхацяць на сонцы. Побач, з другога боку катлавана, ідзе мантаж крана — шпалы з рэйкамі пакладзены, застаецца паставіць тросы і падключыць кран да электрасеткі. Электрыкі павінны былі прыйсці яшчэ ранкам, але яны позняцца, і гэта, мабыць, сапсуе нам усе планы: нават калі мы і паспеем ачысціць катлаван, дык як класці апорныя пліты без крана?.. Але ўсё роўна машыны адпускаць нельга, бо заўтра іх яшчэ на які-небудзь аб'ект шугануць, а потым кукуй. Так што правільна: спачатку скончым работу тут, а потым няхай самазвалы перакідваюць на той участак.

Дзень сонечны, але не вельмі і цёплы — ад ракі дзьме вецер; паверхня Дзвіны пасечана цёмнымі палосамі рабаціння. Адна такая палоса роўна перасякае раку і ўпіраецца ў човен, з якога хлопцы вудзяць рыбу; човен прыкуты ланцугом да гарбатага карча, якраз пад шырокімі лазінамі, што лесвічкаю ўзбіраюцца па ўзвал і закрываюць сваімі шатамі фасад белага дома. Гэта — Казіміраў дом. Учора я быў там, бачыў маці Казіміра. Яна

ўстрывожапа: ад Казіміра хутка месяц няма лістоў. Казімір пе вельмі часта пісаў і мпе, але перад ад'ездам з Масквы вестку я атрымаў. Маці ўзрадавалася, пачуўшы гэта, і я пераказаў ліст, шмат дадаўшы свайго, нават тосёе прыдумаў і зрабіў, мабыць, правільпа. І правільна, вядома, зрабіў я пазпей, прыйшоўшы дахаты,— папісаў яму рэзкае і крыху злоспае пісьмо. Няхай ведае!

Хлопцы на чоўпе стаіліся ў чакапні пад вудамі. Дзівакі. Хіба ж на гэткім мелкаводдзі што зловіш. Во каб махпулі кіламетраў пяток уніз, да Чорнага ручая,— там зусім іншае. Цяпер якраз павіппы ісці па жабак галаўні. У адным з сваіх лістоў Казімір пахваліўся: злавіў тайменя амаль на два пуды. Мо крыху і перабольшаў ёп, але, відаць, і без «амаль» рыбіна была ладная.

Чамусьці сёння я шмат думаю пра Казіміра. Магчыма, гэта таму, што ўчора гаварыў з яго маці. А можа, з таго, што рэзкаваты паслаў ліст. Не ведаю. Але па душы трывожна.

Гудуць самазвалы; бухае коўш экскаватара; у прарабцы крычыць тэхпік з гарадской тэлефоппай станцыі.

— Што, паглухлі вы там усе? Рыба з Дзвіны на бераг павылятала з таго крыку. Што? Добра, збяру рыбу па юшку табе... Ты правер сёмы. Сёмы, кажу!.. Камутатар! Камутатар! А! Вось добра чую. Я кажу, правер сёмы па шчытку. Знайшоў? А што я табе казаў? Я адсюль ведаю, што вы там — партачы. І яшчэ рыбы просяць. Акуня вы ў мяне атрымаеце! Звапі цяпер! Сюды звапі. Чакаю...

За драўляпай сцяпой прарабкі звініць тэлефоп. Зноў чую вясёлую гаворку тэхпіка. Неўзабаве ёп і сам выходзіць, працягвае бланк нарада па зробленую работу і просіць падпісаць.

— Працуе? — пытаюся я, пе адчуваючы асаблівай радасці, бо ведаю, што цяпер пам спакою не будзе. Да гэтага дня пам было добра — званкі не падакучалі: тэлефоп сапсаваўся з першага дня і маўчаў.

— Як гадзіннік. Вось тут, вось тут подпіс трэба. Другі дзень з вашай кропкаю валаводжуся. Яны там наблыталі, а мне ад пачальства пахлопка.

— Строгае ў вас пачальства.

— А я і сам пахлопку па чалавеку б выгнаў, каб у мяне расхлябы сядзелі. Паставілі нумар і не ведаюць куды. Правярайце, пакуль я тут...

— Правяраць я не буду. А пазваніць — пазваню па падстанцыю. Электрыкі пам графік зрываюць.

— Значыцца, не было адпаведнай пахлопкі.— Тэхнік выцягвае з кішэні запалкі, спакойна слухае, як я званю і не магу дазваніцца дыспетчару падстанцыі, потым усё з тым жа спакоем дадае: — На які выпадак я там на дошцы нумар напісаў. І прозвішча. А калі мяне не будзе, скажаце, што Іван Мянухін рамантаваў апарат,— мне перададуць. Ну, закуру і павалакуся. Ці, можа, на якой машыне вашай?

— На любую. Выбірайце самазвал па густу.

— Мне абы даехаць. Во дапрацаваўся Мянухін. Прапанаваць чалавеку закурыць не можа — апошняя. Ды і тая дзіравая...

Ён адкідвае разадраны пачак і, пасліпіўшы кавалак паперы, падклейвае цыгарэціну, фасоніста чыркае запалку. Потым, зацягнуўшыся, глядзіць на самазвал, што стаіць пад пагрузкаю, і раптам скідвае жоўтыя, з шырокімі раменнямі, сандалеты.

Вузкі твар, масляніста бліскучы ад поту, азараецца задаволенай, але хітраватай усмешкаю.

— Транспарту хапае, дык і памыцца паспею. А то з такім партрэтам у горад аб'яўляцца нядобра. Пайшлі разам, куп-куп зробім.

Мянухін паведамляе гэта зусім па-свойску, нібыта лічыць неабходным адкрыць мне свае планы: ён ніколькі не дзівіцца, што я адмаўляюся ісці купацца, і, падчапіўшы на палец сандалеты, борздзенька тупае да ракі.

Я накіроўваюся да крана. Паспяваю зрабіць колькі там крокаў і чую доўгі тэлефонны званок з прарабкі. Вяртацца не хочацца: чамусьці думаю, што гэта звоніць Віктар. Напэўна! Калі ён, дык і размова з ім вядомая: чаго, маўляў, загад не выконваеце, чаго затрымалі машыны. Але шафёрам Рогач перадаў ужо мой загад, і працы ім засталося не так што і шмат. Да канца дня мы закончым падчыстку катлавана, і тады, калі ласка, бярыце самазвалы і перакідвайце на другі ўчастак.

Тэлефон аж захліпаецца ў мяне за спінаю, але я не спыняюся, іду далей, і званок аддаляецца і ўрэшце прападае зусім,— яго глушыць рокат экскаватара.

На пляцоўцы, дзе ідзе мантаж крана, Ткач нешта мудруе ля тоўстых, бліскучых ад масла тросаў, што звісаюць са стралы; побач працуе Сініцын — падсыпае да шпал жоўты жвір.

— Што, не відаць электрыкаў? — пытаюся, хоць і ведаю, што мне адкажуць.

— Мо трэба каго туды паслаць? Ці пазваніць... Але ж як пазвоніш, калі тэлефона таксама не падключылі...

Сініцын гаворыць гэта абыякава, манатонна, нібыта сам дзівіцца і не разумее, навошта ён вымаўляе словы. Пазалетась у экспедыцыі на Камчатцы загінуў яго сын — праходзіў там практыку перад дыпломам. Не ведаю падрабязнасцей, але чуў, што хлопцы нібыта выпілі крыху, узялі невялічкі бот і выехалі ў мора. Наляцеў моцны вецер, бот перакуліўся, і яны ўсе, учатырох, патанулі — ніхто не ўратаваўся.

Вочы Сініцына ненатуральна бліскучыя, глыбока запалі, і здаецца, што адтуль, з глыбі вачніц, б'е чорны сліпучы агонь. Цяжка глядзець у гэтыя вочы, яны нібыта абвінавачваюць, вымагаюць адказу на нейкія пытанні, нечага моляць і патрабуюць. Шмат разоў лавіў сябе на адчуванні нейкай віны перад Сініцыным за тое, што я жывы і здаровы і працую тут, скончыўшы вучобу. Цяпер крыху прызвычаіўся да выразу твару Сініцына, а першы раз вочы ягоныя мяне і ўразілі і напалохалі. Памятаю, расказаў тады Валі пра тое, але яна, здаецца, не зразумела мяне, мабыць, гэтага ніхто не можа зразумець, пакуль не пабачыць вочы бацькі, у якога загінуў адзіны сын.

— Тэлефон падключылі,— паведамляю я Сініцыну.— Тэхнік толькі што скончыў праверку, і я званіў. Маўчыць падстанцыя.

— Мо мне паспрабаваць?

— Калі ласка. Калі дазвоніцеся, скажыце, што з-за іх у нас графік бурыцца.

— То я зараз і пазваню.

Сініцын уціскае рыдлёўку ў жвір, глядзіць безудзельна, заклапочаны толькі сваім, пра што ён ніколі не гаворыць услых, і мне думаецца, што гэты выраз ужо ніколі не зменіцца, бо ў вачах назаўжды запяклася туга і вялікі чалавечы боль, што гэты выраз увогуле не стасуецца з тым жыццём, якое ідзе цяпер вакол Сініцына.

Мернай хадою Сініцын дыбае да прарабкі; шырокая спіна яго знікае ў цёмным праёме дзвярэй, і я адчуваю сябе крыху вальней — нібыта ў чымсь замінаюць мне тыя вочы.

На зыбкіх мастках спускаюся ў катлаван. Рогач тут, аруднуе рыдлёўкаю — паказвае маладому брыгадзіру на неахайна выкапаную працу; голас праараба ціхі, але незадаволены.

— Ты што ж гэта, Уладусь? А? Гэта ж мы тутка праз

тваю ляноту макам сядзем. І ўсіх затрымліваць будзем. Во якія глыжы пакінуў!

— Не вылізваць жа мне канаву гэтую,— адмахваецца Уладусь Кізіла.— Пліты як прыціснуць,— гладкае месца будзе. Падумаеш, камяк нейкі.

Рогач моўчкі раўнуе неглыбокі роўчык, куды павінны легчы цяжкія пліты падмурка, потым, падраўнаваўшы, усё тым жа ціхім голасам, але цяпер сярдзіта, гаворыць:

— Як сабе асабіста дом будзеш ставіць, тады гэтак і саштукуеш, на камяках. А мы тут людзям робім, і праз тваю ляпоту чырванець мне не хочацца. Змікіціў?

— Змікіціў.

— Бяры тады.— Рогач аддае рыдлёўку брыгадзіру.— І давай сваіх хлопцаў мабілізоўвай. Зноў яны перакурваюць?

— Прафсаюз патрабуе. Перакур — адпачынак. А працоўны чалавек у нас мае на яго законнае права.

— Пагаманіць лю-юбіш. А работа стаіць.

— Ну, гэта паклёп на працоўнага чалавека. І на нашу брыгаду. Во які катлаван вывернулі!

— Ты яго хіба вывернуў? Машына. З тваімі тэмпамі мы б яго сто год чэрпалі...

— І правільна. Бо ў нашым сацыялістычным грамадстве ручная праца чым заменена? Ма-шы-наю!

— Хопіць, можа, лясы тачыць? Гадзіну табе, і каб роў быў чысты!

— Будзе чысты, таварыш прараб. Як шкельца!

Кізіла пагаджаецца наспешліва — убачыў мяне на драўляных мастках-сходках — і дае знак хлопцам, што сядзелі на адхоне, і яны, як гракі, пасыпаліся ў катлаван. Наперадзе брыгадзіра Раман Гуда, вёрткі, у яркай каляровай кашулі. Учора ён працаваў у прарабцы — Рогач паслаў яго паставіць столік,— і я быў там, і мы з ім крыху, але даволі своеасабліва пагаманілі. Я сядзеў, вывучаў праектную сіньку, а ён пляскаў малатком — заганяў цвікі ў негабляваныя дошкі — і адказваў на мае пытанні ахвотна і весела. Скончыў дзесяцігодку. На будоўлях тры год. Думае вучыцца далей? Не думае. Чаму не думае? «А хіба я менш вашага зарабляю?..» І глядзіць на мяне блакітнымі вачыма прастадушна, як дзіця. Мне нават ніякавата зрабілася адтаго, што папытаў.

Вось такая ў нас з ім гаворка была. А другіх хлопцаў з брыгады Кізілы я пакуль што мала ведаю, і, прынамсі,

вялікай ахвоты сабрацца і пазнаёміцца з імі ў мяне няма. Увогуле брыгада — яе, дарэчы, падбірае сам Рогач — выклікае ў мяне пейкае двоістае пачуванне. Працуюць хлопцы добра, старанна. Не падабаецца, аднак, што ў час працы яны і пасвістваюць, і спяваюць, часам і рагочуць без дай прычыны — сур'ёзнасці, сталасці ну гладка ж няма. І мне чамусьці думаецца, што ўсё гэтае ідзе ад брыгадзіра, якога яны ахрысцілі іранічна, але пязлосна: «Чупрына». Трапна, вядома: чупрына ў яго добра адгадавана, пышная, аж вушы тапаюць, і заўсёды фарсіста сядзіць на ёй карычневы берэт; берэт ён ніколі не здымае ў час працы і развітваецца з ім толькі ўвечары, калі, памыўшыся на Дзвіне, пераапранаецца ў прарабцы. Кізіла, праўда, хлопец паслухмяны, але чорныя вочы заўсёды глядзяць смела, дзёрзка нават — за лішнім словам ён, як гаворыцца, у кішэню не лезе.

І амаль такая ж чупрына ў Максіма Інчыка, але ён ніжэйшы за брыгадзіра, у плячах шырокі і нейкі змрочны. Аднак пачуе жарт — першы весела і залівіста рагоча і тут жа прымоўкне, зноў глядзіць ваўкавата — нават цяжка паверыць, што гэты чалавек здольны весела смяяцца.

Максім, я заўважыў гэта адразу, вельмі хінецца да Эдуарда Якуша, хлопца танклявага, стройнага, з пригожым, разумным тварам. У Эдуарда чысты звонкі тэнар, і спяваць ён любіць, але і любіць пахваляцца гэтым, і па натуры, здаецца, вельмі з'едлівы — аніводнага разу не чуў, каб ён казаў звычайна, а ўсё з іроніяй, з падкавыркаю.

Убачыўшы іх усіх у першы дзень, я прыгадаў даўнюю нашу брыгаду, і, шчыра скажу, параўнанне было не вельмі прыемным для Кізілы. Але Рогачу хлопцы па душы. Пажывём — пабачым, як гаворыцца, чаго яны вартыя.

Рогач сустракае мяне ля масткоў. Я на апошняй прыступцы, а ён стаіць ніжэй, на зямлі, і твар у яго вельмі заклапочаны.

— Наўрад ці паспеем сёння мы з тымі плітамі, Леанід Яўгенавіч...

Дзівіць не тое, што Рогач паведамляе, а тая сур'ёзнасць і пачцівасць, з якой ён вымаўляе маё імя па бацьку; ніяк не прызвычаіўся да гэтага, увесь час здаецца, што мне, па-ранейшаму падначаленаму Рогачу, трэба слухацца і выконваць яго загады.

— Адкуль такі песімізм?

— Самазвалы гружаныя як пайшлі па краі, дык грунт пачаў асыпацца. Вось нам работы і прыбаўляецца.

— А мы ж дамовіліся: самазвалы толькі з гэтага боку падкатваюць. Толькі тут! Ці вы што, шаферам не перадалі?

Рогач переступае з нагі на нагу, схіляе галаву, потым сціснутым кулаком пацірае кончык носа.

— Асабіста я казаў шаферам. Праўда, не ўсім. Некаторым...

— А чаго? Мы ж дамовіліся ўчора яшчэ: каб не ездзілі тут. Хіба не так?..

— Правільна. Але тады, учора, як вы загадалі, Эдуард падвярнуўся, то я і прасіў яго. А ў хлопца з галавы, відаць, і вылецела...

— Дык трэба было праверыць!

— Думаў быў... А тут пліты падвезлі — на разгрузку кінуўся...

— Здзіўляючая бесклапотнасць! Гэтак далей у нас праца не пойдзе! І таму вельмі прашу: прыміце адпаведныя меры...

Разумею, што словы мае зусім не да месца, што павінен я зрабіць і сказаць зусім іншае. Але што? Зрабіць выгляд, быццам нічога не здарылася, і не папракаць Рогача, нічога не загадваць і нічога не патрабаваць? Але тое, што я загадваю, абсалютна справядліва, абсалютна неабходна. Магчыма, трэба толькі больш канкрэтнае патрабаванне перад ім паставіць...

Але гэтай канкрэтнасці і не хочацца. Не хочацца, бо я разумею: мая незадаволенасць Рогачам перапляталася з тым дваістым пачуццём да Кізілавых хлопцаў. Вядома, Рогач вінаваты — не прасачыў за тым, як выканана яго распараджэнне. Але галоўная віна на тым, хто гэтае распараджэнне не выканаў. Трэба гаварыць з брыгадзірам, папярэдзіць, каб кожны загад прараба выконваўся дакладна. І гэта будзе правільна ва ўсім: узніме аўтарытэт Рогача — я, маўляў, начальнік участка, але лічуся з загадамі прараба і патрабую строгага і няўхільнага выканання іх — і прымусіць усю брыгаду падумаць аб адказнасці.

Рогач нешта абдумвае, соўгае сцятымі губамі, потым хутка і коратка пагаджаецца:

— Добра. Прыму меры...

І тая пядбаласць, зусім нечаканая пасля пачцівага тону, з якой гэтыя словы вымаўляюцца, пераконвае мяне,

што Рогач не вельмі высока ацэньвае маё распараджэнне. І адчуваю яшчэ: Рогач ніколі не выкажа сваю нязгоду з маімі загадамі, змоўчыць, не будзе шчырым ва ўсім і да канца; і не магу зразумець, чаму ён не хоча спрачацца і пярэчыць. Такія ўжо вельмі правільныя загады? Ці лічыць сваім абавязкам толькі надпарадкоўвацца?

— Якія меры? — пытаюся я, спрабуючы хоць штокольвек праясніць у кароткім адказе Рогача.

— Неабходныя. Як вы і загадалі...

Так, з Рогача болей нічога не выціснеш; адказаў і хавае цяпер свой пагляд, узнімае голаў, бы нешта вышуквае сярод белых аблокаў, што плывуць увысі над намі.

На краі катлавана, там, дзе пачынаюцца сходкі, з'яўляецца Сініцын; размахваючы кепкаю, ён гукае, што мяне клічуць да тэлефона. Чамусьці адразу падумалася, гэта, напэўна ж, звоніць Віктар.

Але не крапаюся з месца, пытаюся, што там такое здарылася і хто, галоўнае, звоніць.

— З упраўлення. Не пазнаў па голасе. Здаецца, таварыш Зубок кліча вас...

— А што ён хоча? Не казаў?

— Загадалі тэрмінова вас адшукаць. Трубка там на стале. Яны на тэлефоне вас і чакаюць...

Губы Рогача сціскае амаль няўлоўная грымаса, але ён тут жа гасіць яе і глядзіць на мяне ўстрывожана.

— За машыны, мабыць, будуць лаяць. Можа, давайце адпусцім шафёраў і скажам, што адпусцілі.

— А можа, нам за тое цяпер падзяку дадуць!

— Э-ээ... Не! Калі тэрмінова шукаюць, дык тут не падзякаю пахне. На падзяку ў нашым упраўленні не спяшаюцца... Я ж гаварыў...

— Гаварыць лёгка. На гэта мы ўсе майстры.

Папрок мой рэзкі — я пакрыўджаны ўсмешкаю Рогача. Мне здаецца, ён крыху задаволены, што ўсё атрымалася так, а не інакш: вось, маўляў, цяперка ты там паскачаш, пагаворыш з упраўленнем — гэта табе не прарабу загадваць прымаць неабходныя меры. Разам з тым іранічная ўсмешка Рогача настройвае мяне яшчэ больш ваяўніча: калі гэта звоніць Віктар, калі будзе ён лаяць за тое, што мы не адаслалі машыны, дык я не саступлю, не пагаджуся з тым загадам, буду спрачацца, адстойваць сваё...

Сініцын усё яшчэ стаіць на краі катлавана ля сходак. Я ўзнімаюся, і ён пачынае тлумачыць, што з цяжкасцю

дазваніўся да падстанцыі і дыспетчар паведаміў: брыгада нам, маўляў, выдзелена, працаваць яна павінна з самай раніцы.

— Добра,— кажу я Сініцыну.— Дзякую, што паклікалі. Зараз буду гаварыць з упраўленнем, дык паспрабую знайсці канцы...

План будучай гаворкі выспявае імкліва, у самых драбніцах, і, калі ўваходжу ў прарабку і бачу трубку, што ляжыць на століку, я ўжо канчаткова прымаю рашэнне.

Бяру трубку і адразу ж чую знаёмы голас:

— Чаму затрымалі машыны?

Спакойна, нават крыху весела, пачынаю тлумачыць. Работы ў нас, маўляў, засталося зусім мала і немэтазгодна пераганяць машыны на іншы ўчастак. Магчыма, сёння мы зробім усё на гадзіну раней, тады самазвалы паспеюць і туды.

Уласна кажучы, няма вялікай розніцы, хто з нас першы завершыць работу: адно ўпраўленне кіруе, адзін план выконваецца. А ў сэнсе дзяржаўным выгода ёсць немалая: ліквідуецца пусты перагон машын, эканоміцца час, паліва.

Мне думаецца, што я пераканаў Віктара — на тым канцы дроту ніводнага гуку,— а потым раптоўна мяне перапыняе рэзкае і непрыемнае:

— У іх, бачыце, ёсць меркаванні. А мне пляваць на нейкія там меркаванні! Ёсць загады! Ёсць парадак!

— Паслухай, Віктар, гэта ж зусім неразумна. Навошта непатрэбныя перагоны пустых машын?

— Я пытаюся, чаму не выканалі маё распараджэнне?

— Ты не крычы, Віктар. Спакойна выслухай.

— Кіньце гэтую фамільярнасць, таварыш Бугрым! — Голас Віктара незнаёма рэзкі і непрыемны.— Вы начальнік участка? Дык я да вас і звяртаюся: чаму вы не выканалі маё распараджэнне?

— Ты паслухай, Віктар, я табе зараз усё патлумачу...

— Віктар Паўлавіч, мабыць, хацелі сказаць?

Значыцца, не жартуе. Але ж смеху варта гэтая афіцыйнасць. Чаго ён дамагаецца ёю? Хоча ён сёння пачуць імя па бацьку? Добра, няхай будзе не Віктар, а Віктар Паўлавіч.

— Так павінна быць заўжды,— падкрэслівае Віктар.— А зараз я хачу ведаць: чаму вы не выканалі маё распараджэнне?

Пытае суха, з націскам, намагаецца надаць сваймy

голасу ўраўнаважанасць і самавітасць, але гнеўныя ноты бяруць верх — Віктар зрываецца на крык:

— Чаму не выкапалі?!!

Маўчу.

І ён таксама маўчыць. Хочацца ўявіць сабе Віктара: мабыць, чырвоны ад гневу, як вараны рак, крэмзае алоўкам — у яго звычка маляваць, чыркаць паперу, калі злуе; нешта трэснула ў трубцы, і мне здалося, што я пачуў, як хруснуў, зламаўшыся, аловак, і мне нечага зрабілася шкада Віктара.

Адчынены дзверы прарабкі, і я бачу Рогача, які стаіць ля катлавана і ўглядаецца ў мой бок, нібыта прыслухоўваецца. На гэтай адлегласці наўрад ці чуваць мой голас, але Рогач, калі я не памыляюся, наставіў вушы, слухае, і гэта пачынае мяне злаваць; сталее злосная рашучасць не пагаджацца з Віктарам, пярэчыць да канца, гаварыць з ім тым жа тонам, якім я размаўляў нядаўна з прарабам. Цяпер разумею: не толькі не хачу, але і не выкапаю, не змагу выкапаць тое, што загадвае мне галоўны інжынер, Віктар Паўлавіч. Эйш ты, які афіцыйны тон узяў! Хочаш, каб так было? Згодзен...

— Ваша распараджэнне, Віктар Паўлавіч, не зусім прадуманае,— намагаюся гаварыць спакойна, падбіраю словы памяркоўныя і мяккія.— І таму не магу яго выкапаць. Больш таго, адмаўляюся і ў далейшым выконваць вашыя загады, калі яны пойдуць насуперак разумнаму сэнсу, на шкоду інтарэсам нашай агульнай будаўнічай справы. І не толькі адмаўляюся выконваць такія распараджэнні, калі яны будуць, але і абяцаю змагацца супраць іх усімі сіламі і сродкамі. Вы чуеце?

Хвілінка маўчання. А тады адразу:

— Кожнае слова. І таму папярэджваю, калі такое з вашага боку паўторыцца, неадкладна будзем ставіць пытанне аб вашай здольнасці кіраваць такім адказным аб'ектам. Спадзяюся, чуеце?

Голас Віктара спакайнее, у ім нават з'яўляюцца з'едлівыя, насмешлівыя ноткі, і гэты тон, а галоўнае, тое, чаго не бачу, не чую, але добра ўяўляю сабе — усмешка, якая цяпер на яго твары,— бунтуе мяне; крыху смешна з Віктаравай пыхі і непамысна ад таго, што змушаны спрачацца з ім, і наплывае горкае пачуццё ад думкі, што Віктара, аказваецца, я зусім мала ведаю. Тады, увечары, калі мы гасцявалі ў яго, я нацвельваўся, не надаваў фанабэрыі Віктара вялікага значэння, а цяпер бачу, што

памыліўся. «Будзем ставіць пытанне аб вашай здольнасці кіраваць такім адказным аб'ектам». Во як павярнуў. Ці не сам асабіста і будзе ставіць?

Голас Віктара ўсё той жа — рэзкі і непрыемны.

— І не толькі ставіць. Калі такое пытанне ўзнікне, я буду настойваць на вырашэнні неадкладным.

— А раптам яно і не вырашыцца?..

Адчуваю, што мяне «заносіць», але стрымліваю сябе і пачынаю, як малому, тлумачыць, што, мякка кажучы, Віктар Паўлавіч крыху памыляецца. Старшы прараб Бугрым служыць не яму асабіста, і калі размова зойдзе пра лёс будоўлі, якая яму даручана, пра загады, якія накіраваны не на карысць агульнай справы, дык ніякай баязлівасці з боку Бугрыма не будзе. І няхай Віктар Паўлавіч будзе ўпэўнены, што ў такім выпадку і Бугрым пачне ставіць пытанні. Пачынаючы ад упраўлення і канчаючы Цэнтральным Камітэтам партыі.

— Што, пагроза? Ці дробны шантаж?

— Гэта праўда,— кажу я цвёрда.— Гэтак думаю і думкі свае не хачу таіць.

У трубцы маўчанне. Потым зноў Віктар пачынае гаварыць, але за гэты кароткі час голас крыху змяніўся: ён не тое што памякчэў, але нейкая як бы паспешлівасць у ім.

— Што ж атрымліваецца? Вы там усе разумныя, а мы тут, ва ўпраўленні, дурні? Толькі таго і робім — няправільныя загады габлюем?

— Я такога не казаў. Бо гэта абраза.

— Дзякую. А калі вы вызваліце машыны? Давайце канкрэтны тэрмін і рэальны.

Праз адчыненыя дзверы прарабкі бачу людзей, што аднекуль з'явіліся на краі катлавана ля Рогача. Прараб ім нешта абурана гаворыць, ківаючы галавой на кран, потым выстаўляе руку, стукае пальцам па гадзінніку. Ну, урэшце. Гэта электрыкі. Значыцца, усё будзе ў парадку.

— Сёння катлаван закончым. І заўтра самазвалы нам не спатрэбяцца,— я абяцаю гэта неракапана і весела.— Не выкапаю — пішыце вымову!

І ўжо зусім лагодна, нават са смяшком, Віктар пагаджаецца:

— На тым мы і спынімся. Сам увечары прыеду. Пагляджу і праверу асабіста.

— Калі ласка, прыязджайце. Чакаем...

Нейкі час я ўсё яшчэ трымаю ў руцэ тэлефонную трубку, спрабую дайсці прычыны раптоўнай змены, што адбылася з Віктарам. Крычаў, гарачыўся і раптам паладнеў, адразу пагадзіўся. І як? Весела, з усмешкаю, нібыта хвіліну раней не паграджаў, грубавата не патрабаваў выканаць яго загад. А мо хто там зайшоў у кабінет, дык няёмка было гарлапаніць?..

За сцяной прарабкі чуюцца ціхія і мяккія гукі — нібыта тарабаніць хто пальцамі па пустой каробцы. Выходжу і бачу Крыштопа, які сядзіць на камяні, што падкочаны да самай сцяны; у руках яго пачак папярос.

— Даруйце, слухаў вашу размову.— Ён узнімаецца і вітаецца са мною.— Думаецца, што размова прынцыповая. І цікава было б глядзець на твар Віктара Паўлавіча. О-оох, і не любіць ён, калі яму пярэчаць.

— Вы калі прыехалі?

— Сёння. Адразу з аэрапорта — сюды. Наколькі я зразумеў — патрабуюць самазвалы. А пярэчанняў таварыш Зубок не любіць...

— А мне што з таго? Калі гаворка ідзе пра агульныя інтарэсы, формула «любіць — не любіць» не падыходзіць. Трэба рабіць тое, што рухае справу наперад. Загады пісаць трэба, але ж няблага папытаць і тых, каму яны адрасаваны. Мы не механічныя выканаўцы. Хіба не так?

— Абсалютна. Не ведаю, што ён вам казаў, але тое, што вы яму казалі, мне па душы. Часам у нас бывае... Як гэта дакладней сказаць... Ну, нейкая баязлівасць... Вось я прыкмячаў: думае чалавек адно, па вачах бачу, што не згодзен. А маўчыць. І гаворыць тое, што, ведае, прыемна пачуць начальніку. І не таму часам, што баязлівец. А таму, што галоўнае забывае,— не начальніку ён служыць, а нашай агульнай справе. Дык чаго ты, чалавеча, гнешся? Інтарэсы гэтай справы самы важны, самы галоўны крытэрый...

Я не бачыў Крыштопа амаль тыдзень — ён ездзіў на камандзіроўцы ўпраўлення ў Віцебск, мы з ім мала сустракаліся, размовы ў нас былі кароткія, і цяпер адчуваю сваю непадрыхтаванасць да такой гаворкі і разумею, што павінен выказаць сваё стаўленне да яго погляду. Жартую, што гэта, мабыць, патрабна на філасофскае паглыбленне тэмы і загадзя падрыхтаваныя дыфірамбы, але ён перапыняе мяне.

— Не, не! Проста прызнанне: мы з вамі аднадумцы.

У нас аднолькавыя натуры. І тады, у кабінеце галоўнага інжынера, я зразумеў, што мы з вамі будзем сябрамі.

— Прыемна чуць. Хаця, шчыра кажучы, падстаў на такое сцвярджэнне малавата...

Кажу гэта знарок крыху рэзка: мне думаецца, што Крыштоп будзе пярэчыць, будзе пераконваць мяне, прыгадваць тую гаворку, што адбылася тады ў кабінеце Віктара, аднак ён пагаджаецца, пагаджаецца нечакана хутка:

— І верна. Але нам з вамі працаваць разам. І часта хочацца па-сяброўску пагутарыць. А ў мяне, між іншым, так сталася, што інстытуцкія сябры паехалі па розных гарадах. Тут жа я зусім нядаўна, новых не завялося... Буду ўдзячны, калі мы працягнем гэтую гаворку ў іншай абстаноўцы. У нас дома, скажам... пакуль што на прыватнай, але пасядзець ёсць дзе.

— А чаму не ў нас? І не адкладваючы — сёння. Згода?

— Лепей заўтра. Сёння ў жонкі нейкая работа на прышкольным участку. Яна казала, што рана не вернецца...

Крыштоп прыняў запрашэнне проста, без ліслівай падзякі і прызнальнасці, прыняў з той жа шчырасцю, з якой запрашаў да сябе на госці; ён паставіўся да мяне як да роўні, без нейкіх выгод і разлікаў, і гэта яшчэ больш зблізіла нас, і тая прыязнасць, што завітала ў сэрца, калі я ўпершыню ўбачыў яго, цяпер яшчэ памацнела, расчуліла і зноў прыемна ўразіла.

Разам з Крыштопам шыбуем да катлавана — мне хочацца паведаміць прарабу пра гаворку з галоўным інжынерам. Рогач стаіць усё на тым жа месцы, ля сходак, дзе я і пакінуў яго. Самазвалы, натужна равучы маторамі, паўзуць ад катлавана на дарогу. Рогач бачыць мяне, але не распытвае, і па той зацятасці, з якою ён маўчыць, я разумею, што мне трэба гаварыць першаму.

— Машыны застаюцца. І мы павінны завяршыць ачыстку катлавана сёння — абяцаў гэта галоўнаму інжынеру.

Маё паведамленне — прыемна рабіць яго ў прысутнасці Крыштопа — на Рогача не робіць аніякага ўздзеяння: нібыта і не чуў маіх слоў, нібыта тое, што я сказаў, не павінна было і не магло зрабіцца інакш.

— Электрыкі прыйшлі і працуюць,— дакладвае ён надзвычай будзённа.— Даў ім адпаведную прачоску, дык паабяцалі: за гадзіну падключаць...

Магчыма, яно так і будзе, і праз гадзіну электрыкі

падключаць рубільнік. Але гэта, відаць, не ўратуе нас. Я гляджу на катлаван і са здзіўленнем заўважаю, што работы тут яшчэ шмат: нібыта пабольшала грунту ў траншэях за той час, што я размаўляў з упраўленнем.

Рогач спрабуе супакоіць мяне.

— Паспеем сёння, зробім. Толькі, відаць, трэба гукнуць на падчыстку ўсіх. Каб экскаватар не пераганяць на правы кут.

— А каго ўсіх? Брыгада ж Кізілы тут поўнасцю!

— З крана людзей зняць. Пакуль электрыкі провад цягнуць, ім рабіць няма чаго. І самі рыдлёўкі возьмем.

— А што? Можна і гэта,— пагаджаецца Крыштоп.— Думка не вельмі прагрэсіўная, але карысная. Спалучэнне, так сказаць, разумовай дзейнасці і фізічнай працы. Толькі ці хопіць на ўсіх рыдлёвак?

Рогач, абнадзейваючы, трасе рукою:

— Тут ужо мой клопат. У мяне гэтага начыння — дзвюма брыгадам хопіць. Уладусь! Цягні струмант з прарабкі. Поўны аўрал!

— Ёсць цягнуць струмант! Зараз забяспечым!..

Кізіла мігам прыносіць рыдлёўкі, і мы скідваем пінжакі. Самазвалы падкатваюць часта, экскаватар нагружае іх, а мы падчышчаем услед за ім траншэю і вядзём ачыстку з правага кута, куды экскаватар не дацягнецца сваім каўшом; пераганяць жа яго блізка да краю небяспечна — скос катлавана там рыхлы, у вялікіх расколінах.

Спачатку працую без стомы; потым неяк адразу цяжка дыхаць, рыдлёўка робіцца дужа цяжкая, рассыпчасты жвір саслізгвае, не трымаецца на ёй, а дзяржак балюча ціснс далонь.

Раблю на нейкі міг перапынак, пазіраю на працу Кізілавых хлопцаў. Аж зайздросна. Ва ўсіх загарэлыя, бліскучыя ад поту, нібыта бронзавыя, плечы: уляглі ў работу — ні жартаў, ні смеху; рыдлёўкі чакаюць, вызвоньваюць, пабліскваюць. Наперадзе Уладусь, у старой матроскай цяльняшцы, з фарсіста ссунутым набакір берэтам, і Максім, у якога на галаве белы каўпак, зроблены з насоўкі.

Рогач ад хлопцаў не адстае: павярнуў кепку казырком назад, расчырванеўся, закасаў рукавы і шухае рыдлёўкаю, як машына — толькі пазвоньваюць каменьчыкі па жалезу. А Крыштоп, як і я, прыпыніўся, разглядае свае рукі, выцягвае з кішэні насоўку, выцірае пот на твары.

— Што, Раман Пятровіч, горача? Як адчуваеце?

Ён абапіраецца на дзяржак рыдлёўкі, нібыта баіцца, што не зможа стаяць без гэтага апірышча: шэрыя вочы глядзяць на мяне весела і задаволена.

— Як на патэльні. Але ў цэлым няблага. Я вам скажу, каб штодня працавалі з рыдлёўкаю, мы б шмат чаго ўспаміналі карыснага з гісторыі чалавецтва. Мабыць, ёсць вялікі сэнс у тым, што чалавек, працуючы з рыдлёўкай, павінен часцей глядзець на зямлю. Не вітаць недзе там, у аблоках, а глядзець на рэальную зямлю.

— Накшталт выцвярэзніка рыдлёўка: працуй і думай. Непасрэдны кантакт з зямлёю.

— Не быў у выцвярэзніку. Не ведаю, як там. Але адносна кантакту з зямлёю — правільна. І супраць некаторых «хвароб» рыдлёўку можна ўжываць: лякарства дзейснае.

— Дык што, дамо заяўку на патэнт?

— Не, лепей спачатку праверым. І націснем — даганяць хлопцаў трэба...

Паплявўшы на далоні, ён зноў бярэцца за рыдлёўку, але ў гэты момант гучыць імпэтная і гуллівая каманда Рогача:

— Пе-ра-ку-у-р! Працавалі з агеньком, пасядзім з дымком.

Дружна, як і браліся, усе спыняюць работу. Кізіла першы садзіцца на дзяржак рыдлёўкі, адцягвае, бы гумавую, цяльняшку, дзьмухае на грудзі.

— У-ууф! Горача. У самы акурат прараб закамандаваў, бо прафсаюз пачаў хвалявацца: дзе вызначаны канстытуцыяй адпачынак? Так што закурым, усё абмурым. Гена, кладзі свой арсенал.

Генадзь Дук хуткім рухам падкідвае на далоні вузкі пачак цыгарэт у празрыстым хрусткім цэлафане; робіць гэта ён падкрэслена неахайна, так, як робяць хлопцы, што пачалі курыць зусім нядаўна.

— А мо маіх? Калі ласка. У мяне папяросы,— прапаноўвае Крыштоп.

— А што? Можам. Наваліся дружней!

Кізіла бесцырымонна бярэ ў яго папяросы, частуе ўсіх хлопцаў, што сядзяць побач з ім, закурвае сам і толькі потым вяртае пачак Крыштопу.

Уверсе, у баку прарабкі, сігналіць машына. Рэзкі, настойлівы гудок, які выразна чуваць тут, у катлаване, па-

добны на сігнал нейкай трывогі; усе насцярожваюцца; я ўздымаюся, але Кізіла апераджае мяне.

— Сядзіце, адпачывайце. Зараз зірну, чаго ён там рассігналіўся...

Ён хутка ўзбягае па зыбкіх драўляных мастках-сходках, знікае наверсе, і амаль адразу ж аціхае гудок, і ў той жа міг Кізіла зноў з'яўляецца на самым краі катлавана, але зусім з другога боку, насупраць сходак, там, дзе жоўты скос амаль адвесны, як сцяна.

— Дазвольце далажыць: замкнут провад. Шафёру дадзена ўказанне, і трывога адмяняецца. Гэ-эй!

Кізіла ўзмахвае рукамі і сігае ўніз, на круты адхон. Саскочыў прыгожа, але не ўтрымаўся, ногі загрузлі ў крохкім грунце — і, зрабіўшы колькі там цяжкіх няпэўных крокаў, паваліўся.

Ён глядзеў на нас, рагатаў, а зверху нечакана хіснуўся край скосу, на якім толькі што стаяў Кізіла, асеў, пасыпаўся ўніз і гэтая лавіна жвіру і крохкай сыпучай гліны імгнення, як жоўтая хваля, накрыла яго.

Усё гэта здарылася так нечакана, што мы, знямеўшы, нават не паспелі крыкнуць, папярэдзіць Кізілу; бачылі, як гайданулася і пасыпалася ўніз жоўтая сцяна катлавана, а калі апамяталіся, дык адхон быў пусты і па ім каціўся густы россып гліняных камякоў.

Рогач падхопліваецца раней за ўсіх, і мы, пахапаўшы рыдлёўкі, кідаемся следам за ім. Роўны шырокі скос ляжаў цяпер перад намі, і ў ім, пад глінай і жвірам, ляжыць Кізіла; гліняныя камякі ўздрыгваюць, асыпаюцца ўніз, падкочваюцца да нашых ног. А мы стаім утрапёна і глядзім — здаецца, што адхон жывы, і не ведаем, як ратаваць Кізілу. Рыдлёўкамі капаць? А раптам у твар?

— Рукамі! Рукамі рыйце! — нейкім віскліўым голасам зароў Рогач.

Міг утрапення адляцеў. Я капаю разам з усімі, грабу, рыю глебу рукамі; каменне абдзірае пальцы да крыві, балюча, але боль адганяе зусім іншы клопат: ці жывы там Кізіла?

— Трэба клікаць яшчэ людзей! — усё тым жа тонам загадвае Рогач.— Хто там бліжэй — бяжыце наверх. Усіх сюды.

Крыштон кідаецца па сходках з катлавана. А мы, стаўшы на калені, рыем гліну, грабём, адсоўваем яе рукамі...

Хвіліны мінулі, а мне здаецца, што праляцелі гадзіны. Генадзь — ён працуе побач з Рогачам — раптам дае каманду:

— Бяры рыдлёўкі. Толькі не за дзяржак трымаць, а за жалеза. Каб не абраніць...

Мы хапаем рыдлёўкі так, як гэта раіць Генадзь Дук, і зноў, моўчкі, сапучы, разграбаем сыры, вільготны жвір.

І раптам ціхі і здзіўлены голас Рогача:

— А гэта ж ягонае плячо. Тут! Ён!..

Мы рынуліся да Рогача, але ён, вызверыўшыся, крычыць, адганяючы нас:

— Куды? Стой! Не трамбуйце глебу. Грабіце ад маіх ног. Каб потым абваліць. Генадзь! І ты, Максім, памажы мне...

Усе адразу і без пярэчанняў выконваюць загады Рогача. Мне нават і не думаецца пра тое, што я інжынер, што мне, а не прарабу трэба было камандаваць, правільна расставіць людзей і кіраваць работаю; у думках паранейшаму толькі адзін клопат — трэба ратаваць чалавека.

Коцяцца, шухцяць камякі — гэта прыбеглі і сталі на краі катлавана экскаватаршчык і два шафёры.

— Хлопцы! Я свой экскаватар падганю ды каўшом. А?

— Не, не! Падалей ад краю! — крычу я.— Павядзеце машыну, дык тут увесь бераг можа рынуцца. Рыдлёўкі бярыце!..

Гэта мой першы загад, які я даю людзям пасля абвалу; і адразу ж, даўшы яго, набываю здольнасць разумець усё тое, што робіцца вакол, узважваць і аналізаваць, пачынаю бачыць новую бяду, што пагражае нам. Мы стоўпіліся ў нізіне. А калі раптам новы абвал? Ён пахаваць нас усіх можа.

І такая небяспека ёсць, бо мы падрываем глебу вакол Рогача, і патрывожаны жвір пасунецца ўніз. Рашэнне выспявае імгненна, трэба станавіцца ланцужком ад краю, падсыпаць, умацоўваць адхон.

Мы застаёмся ля Рогача ўтрох. А ўсе астатнія вядуць падсыпку жвіру, ствараючы ахову на выпадак абвалу. Звонка шахаюць, звіняць рыдлёўкі. З узвалу час ад часу коцяцца маленькія камякі гліны, падкочваюцца, стукаюць па нагах, і ад гэтага робіцца трывожна. Як толькі Кізілу вызвалім, нам трэба адразу ж адбягацца. Ды і яшчэ невядома, ці паспеем адбегчыся.

Цяпер, аднак, пра гэта думаецца мала. Галоўнае — Кізіла жывы. Яго ўратавала тое, што на адхоне ляжала скрыня, і ён упаў ля яе, закрыўшы твар скрыжаванымі перад сабою рукамі — утварылася невялічкая паветраная падушка, і нейкі час можна было дыхаць.

Мы крыху адкапалі Кізілу, і ён адразу паварочвае галаву, адплёўваецца, зявае ротам, голас яго перапыняецца цяжкім і хрыпатым дыханнем:

— Но-огі... Ногі ціспе...

Спрабуем як мага хутчэй вызваліць Кізілу ад зямлянога палону. Усе сталі ланцужком, і цяпер, калі можна капаць, не баючыся параніць Кізілу, паціскаюць на рыдлёўкі з усяе моцы.

Урэшце брыгадзір вызвалены, і Рогач падтрымлівае яго, вядзе падалей ад небяспечнага месца.

Твар Кізілы бледны, усмешка — ён спрабуе ўсміхацца, калі глядзіць на мяне,— вінаватая і не вельмі вясёлая.

— З таго свету выбраўся. Можа, дасцё на гэтым закурыць...

— Курыць? Яшчэ што ўдумаў! Табе вады трэба... Памыцца. І ляжаць.

Кізіла пярэчыць слаба, неахвотна. Навошта ж, мауляў, яму ляжаць? Пад зямлёй паляжаўся...

А мяне ахоплівае шал, які ўтаймаваць ужо цяжка:

— Вядзіце яго да ракі! Няхай памыецца і ляжыць! І ніякіх там! Во што з ягоных выбрыкаў мы маем!

Магчыма, не варта ў такі час папракаць чалавека. Небяспека мінула, Кізіла жывы і здаровы. І ніхто, вядома, не вінаваты ў тым, што здарылася, бо скос мог абваліцца і сам па сабе. Але я не хачу прызнаваць гэтага. Навошта Кізіла рынуўся туды? Ён саскочыў, жвір скрануўся з месца і папоўз, а затым і ўвесь адхон шухнуў. Кізіла і вінаваты. Праз яго штукарства ўсё і здарылася...

Зусім нядаўна такіх думак не было. Я капаў зямлю, хваляваўся, ратаваў чалавека. А цяпер думаю і аб яго вінаватасці, і аб выніках абвалу, і аб сваёй разгубленасці, і, бадай, гэта апошняе злуе мяне болей, чым што.

Хлопцы ўсёй брыгадай вядуць Кізілу да ракі. А мы застаемся ўтрох і стаім моўчкі. Зноў сігналіць наверсе, зусім блізка, машына. Рогач шыбуе па сходках, але паспявае дайсці толькі да сярэдзіны, на краі катлавана, прыблізна на тым месцы, з якога сігануў уніз Кізіла, узнікае знаёмая постаць Віктара.

— Назад! Назад! Абваліцца! — крычу я

Нешта гукае і Рогач і, скачучы цераз прыступкі, ляціць па сходках наверх. А мне не хочацца бегчы туды. У памяці ажываюць надрабязнасці нядаўнай нашай гаворкі па тэлефоне. Так, спрэчка тая з Віктарам вырашылася не ў маю карысць — зламаў усё нейкі дурны выпадак. А яго магло і не быць. Але што цяпер бедаваць па тым. Скос катлавана абваліўся. Гэта факт. І вінаваціць не будзеш сыпкі жвір, трэба глядзець на ўсё аб'ектыўна. І калі зірнуць менавіта так, дык, сапраўды, віна тут мая ёсць. Я павінен быў прадбачыць тое, што здарылася, павінен быў загадаць умацаваць краі катлавана альбо ўзяць яго шырэй, калі выграбалі экскаватары, павінен быў, зрэшты, паставіць указальнікі і забараніць рабочым хадзіць па тым месцы.

Ёсць, карацей кажучы, акалічнасці, якія гавораць не на маю карысць. Няхай некаторыя з іх дробязныя, але ж менавіта з-за іх марнымі аказаліся нашы намаганні. Абвал, вядома, не катастрофа нейкая, вялікай шкоды не нарабіў.

Але ён — факт. І Віктар, вядома, гэты факт выкарыстае. І мне няма чаго пярэчыць. Хто ў першую чаргу нясе адказнасць за тэхніку бяспекі? Начальнік участка. Хто абяцаў скончыць ачыстку катлавана сёння? Начальнік участка. Хто цяпер павінен несці пакаранне? Начальнік участка.

— А я спяшаўся, нібыта прадбачыў,— гаворыць Віктар, падыходзячы. Ён спусціўся ў катлаван разам з Рогачам, і той, вядома, паспеў яму расказаць пра здарэнне. Ды і што ўтойваць, калі ўсё як на далоні.

— Прадбачыць гэта цяжка...

— І нібыта што цягнула,— працягвае ён, не звярнуўшы ўвагі на маё пярэчанне.— Абяцаў жа на канец дня прыехаць, а потым падумаў: не, паеду. І ўвесь час было прадчуванне: нешта там у іх здарылася.

— А нічога асаблівага і не здарылася,— кажу я, і цяпер Віктар спыняе ўвагу на маіх словах.

— Не здарылася? — Ён перапытвае са шчырым здзіўленнем, але ў вачах бруіцца непрыхаваная зларадласць.— Ну і ну! Калі начальнік участка так лічыць, калі нічога не бачыць за фактам грубага парушэння правіл бяспекі — гэта вельмі трывожна. Добра, без ахвяр. А каб яны былі?

— Дык што, лепей было б?

— А вось іронія, таварыш Бугрым, тут зусім непа-

трэбна. Але яна мяне не дзівіць. У абстаноўцы анархіі і безадказнасці і не такія журавінкі могуць вырасці. І росту мы ім не дамо: загад па ўпраўленню будзе напісаны сёння...

Значыцца, я не памыліўся. Ды і цяжка тут памыліцца. Ён чакаў зручнага моманту, каб напісаць загад. І не трэба нейкай выключнай пранікліваспі, каб здагадацца, які гэта будзе загад. І ліха, зрэшты, і з тым загадам, і з Віктарам Паўлавічам. Тым больш што сам я даў згоду на любы загад...

Віктар ідзе наперадзе, і я моўчкі сунуся следам, і дошкі сходкаў зыбаюцца пад нашымі нагамі. Ісці вельмі нязручна — мне цяжка патрапіць у такт з яго крокамі. Наверсе стаяць нерухомыя самазвалы — шафёры, экскаватаршчыкі і кранаўшчыкі гаісапулі з уратаваным брыгадзірам на раку. Як знарок усё. Разумею, што Віктар возьмецца зараз папракаць, і ў гэтым не адчуваю ніякага жадання абараняцца.

Але ён не папракае, а гаворыць падкрэслена будзённа:

— Прастоі машын пойдуць за ваш кошт.

— Трэба ж разабрацца!

— За ваш кошт! Кропка!

І ўсё. Затым моўчкі садзіцца ў машыну — урачысты, надзьмуты, недатыкальны — і нават не глядзіць на мяне, але твар аж зіхаціць ад радасці і задаволенасці. Ну што, таварыш Бугрым, гаворыць мне гэты твар, бачыш? Вось як пакарана твая неразумная дзёрзкасць. Чаго ж ты цяпер не апраўдваешся? Чаго ж не пагражаеш, што будзеш ставіць пытанні, пачынаючы ад упраўлення і да ЦК? Не, дарагі мой. Пытанні буду ставіць я. Толькі я. І зарубі гэта сабе на носе.

Машыны, на якой паехаў Віктар, ужо няма, а мне здаецца, што я чую яго павучальна-зларадны голас. Чую і ненавіджу. Магчыма, нядобра гэта. Але я ненавіджу Віктара за словы, якія ён не выказаў услых і якія я прачытаў на яго твары, ненавіджу і разумею, што частка гэтай нянавісці скіравана не на Віктара, а на маю ўласную слабасць, на тую разгубленасць, якая апанавала мяне ў час абвалу.

Ад ракі вяртаюцца хлопцы. Кізіла крочыць наперадзе, час ад часу прыпыняецца, нешта расказвае, і ўсе рагочуць, аж кладуцца. Я гляджу на гадзіннік — застаецца крыху болей за дзве гадзіны да канца рабочага дня, і, вя-

дома, за гэты час мы не паспеем ачысціць катлавана — потым сачу за гаманкім гуртам, што сунецца ад ракі. Намагаюся пачуць, аб чым гаворыць там Кізіла, і не магу зразумець аніводнага слова і са здзіўленнем заўважаю, што мне робіцца смешна ад тых, не ўчутых мною жартаў, і не магу ўжо, і не хачу стрымліваць сябе, і пачынаю ўголас рагатаць.

## 4

У нядзелю да нас завітаў Крыштоп. Валя прыбіралася на кухні, а я сядзеў на тэрасе ў качалцы і праглядаў абласную газету. Потым Валя папрасіла пайсці паглядзець Ірку, бо час позні і трэба малую рыхтаваць на ноч, і я адклаў газету на падаконне, наважыўся ісці і тут жа пачуў, як цымкнулі весніцы, і, зірнуўшы ў адчыненыя дзверы тэрасы, убачыў нечаканага госця.

Пад пахаю ў Крыштопа жаўцее тонкая папка з кардону, побач з ім тупае наша Ірка, нясе, прыціскаючы да грудзей , шэрага з малінавым банцікам коціка.

— А ты зірні, хто да нас у госці коціць, Валя! — Я паклікаў жонку, і яна адразу выбегла на тэрасу.

— А праўда... Раман Пятровіч. А чаго ж адзін?

Яна пытаецца гэта і ў Крыштопа. А ён, павітаўшыся весела і шумна, разводзіць рукамі:

— Ніва народнай асветы. Зноў жонка прышкольны ўчастак бароніць ад слімакоў. А я вось кінуты на волю лёсу...

— Дык чаго ж мы пасталі тут? Давайце на тэрасу. Зараз я буду вас частаваць.

— Думаеце, што як без жонкі чалавек, дык галодны? Дзякую, павячэраў. І на хвілінку па справе Леаніда. Я забіраю яго і павяду куды-небудзь пад яблыню. Ірачка, з намі пойдзеш?

— Не, не. Ёй — спаць,— гаворыць Валя.— Ты чаго не прыбегла, як цябе паклікалі?.. А дзядзя Раман ёй яшчэ цацкі дорыць. Ці сказала ж яна дзякуй?

Малая пунсавее, моцна прыціскае да сябе новую цацку. Крыштоп ласкава гладзіць дзяўчынку па галоўцы:

— А як жа! Аб усім мы ўжо гаварылі. І дзякуй было, і паведамленне пра тое, што бацькі робяць і куды паехаў дзядуля... Толькі вось пра сон не гаварылі. Ці, можа, гаварылі?.. Ай-яй-яй! Як жа гэта мы з табою пра сон забыліся. Памылка! Давай, Ірачка, выправім гэтую памыл-

ку. І коцік ужо спіць зусім. Кладзіцеся вы ўдваіх і спіце. Можна ёй з коцікам?

— Толькі каб другім разам слухалася. Хадзем ножкі памыем і спаць...

Малая, узрадаваная, бяжыць на тэрасу.

Мы з Крыштопам садзімся за маленькі столік пад старым бэзам.

Тут ішлі ў нас з Валіным бацькам шашачныя баталіі: стары нават столік размаляваў квадратамі, каб не губляць часу; квадраты крыху большыя, чым на звычайнай дошцы, а шашкі ляжаць тут жа, на паліцы, што прымацавана да ножак стала.

— Правядзём партыю? — прапаноўваю я Крыштопу.

Крыштоп кладзе папку на лавачку, весела пацірае рукі.

— Даўненька... даўненька не гуляў я ў шашкі!..

— Э-ээ! Не! Гогалеўская школа не пойдзе!

— Няхай сабе. Тады тры звычайныя партыі. Каб нікому не было крыўдна.

— Гэтак і Валін бацька кажа. А як пачнём — канца няма.

— А мы ўмовімся: тры партыі. І кропка! Толькі з увагаю!..

Ён, аднак, не клапоціцца пра апошнюю ўмову, гуляе вельмі няўважліва, і мы зноў расстаўляем шашкі.

Ужо на трэцім ходзе я раблю памылку, ён яе адразу ж прыкмячае, і мне ледзь-ледзь удаецца дамагчыся нічыйнага выніку...

— Ну, апошнюю,— павесялеўшы, прапаноўвае Крыштоп.

— А мо на гэтым і прыпынімся?

— На паўдарозе да маёй перамогі? Не! Дамовіліся на тры? Дамовіліся. Значыцца, назад ані кроку!..

Па-сапраўднаму хочацца выйграць — ваяўнічасць Крыштопа мяне заахвоціла,— і я, заўважаючы, што ён гуляе старанна, уважліва абдумвае кожны ход. Але мне ўвесь час замінае жоўтая папка, што ляжыць побач; увесь час чакаю, што ён пачне гаворку пра тую справу, дзеля якой завітаў гэтак позна, і вельмі захапляюся, і трапляю ў пастку. Камбінацыя простая, не заўважыць яе проста недаравальна; але я яе не заўважыў; за ёй накатваецца яшчэ адна — даводзіцца ўзнімаць рукі.

— Нічога не паробіш. Разгром. Ну, яшчэ?

— Кропка. Дамоўленасць — нічога не магу зрабіць.

Адно магу паабяцаць: другім разам абавязкова згуляем. А цяпер хачу параіцца. І нешта прапанаваць...

Ён кідае на сярэдзіну століка папку, развязвае кароткія сінія матузы і выцягвае шырокі аркуш, спаласаваны карычневымі лініямі. Я толькі мелькам кідаю позірк і адразу ж вызначаю: праект жылога дома. І дужа падобны на той, які мы цяпер збудоўваем ля Дзвіны. На краі аркуша бачу знаёмыя прозвішчы кіраўніка майстэрні і галоўнага праекціроўшчыка.

— Дык гэта ж наш праект!

— Не! Наш вось...

Крыштоп выцягвае з папкі другі аркуш і кладзе побач. Гэта рабочы ліст праекта — дакладна такі ж ляжыць у кішэні Рогача штодзень. Потым Крыштоп моўчкі згортвае яго і пакідае на стале толькі той, першы.

— Гэта была мая мара,— гаворыць ён, углядаючыся ў спляценне карычневых ліній.— Студэнцкая мара, мой дыпломны праект. Яго ўхвалялі паўсюды. Яму ўсе давалі самую высокую ацэнку, і я жыў і сніў свой дом. Бачыў яго менавіта такім і на беразе ракі, і ён быў адкрыты зеляніне, пошуму хваляў і бляску сонца. Потым я працаваў у Віцебску, і мая мара пачала сваё новае, цяпер ужо зусім іншае жыццё. Яе ўдакладнялі, не спытаўшы мае думкі. Яе ўзгаднялі, нават не паведаміўшы мне нічога. Яе абмяркоўвалі, нават не запрасіўшы аўтара. Урэшце нечая рука вывела ў правым кутку дзелавіта-звілістае, але зразумелае і яснае: «Дазваляю». І гэтае адно слова перакрэсліла маю мару. Праект належаў Крыштопу, бо ўнізе стаяў яго подпіс, але мары ўжо не было; яе ўвагналі ў нязвыклыя для мары абручы непахісных стандартаў, і яна памерла.

— І вы не змагаліся?

Маё пытанне, мабыць, гучыць наіўна, вельмі дзіўна нават. Чалавек адкрывае мне сваё патаемнае, гаворыць тое, чаго, магчыма, не казаў нікому. А я папракаю яго. Крыштоп, аднак, надае маім словам зусім іншае значэнне, а мо і не надае яго, але ўспрымае маё здзіўленне шчыра, без усмешкі і іроніі.

— З кім? — пытаецца ён сур'ёзна, бы вядзе які допыт.— Над праектам забудовы раёна працавала цэлая група. Тэрміны сціслыя, нават жорсткія, калі хочаце: не хапала часу нават на грунтоўнае агульнае абмеркаванне, не кажучы ўжо аб дэталёвым абдумванні асобых кампанентаў комплексу. Дык што ж было казаць пра экапа-

мічны і эстэтычны аналіз іншых варыянтаў і рашэнняў?.. Акрамя ўсяго іншага — усе мы людзі. Вы, безумоўна, ведаеце, які гэта магутны рычаг — прэмія. А тут яна была рэальная — прэмія за эканомію часу і сродкаў на праектаванню! Група хацела атрымаць яе. І толькі адна мая мара ведае, колькі пралікаў было зроблена, колькі занадта паспешлівых рашэнняў прынята. Але цяпер яна змоўкла амаль саўсім і моўчкі перажывае сваю новую эпапею...

Прыходзіць Валя — яна толькі што прабегла па сцежцы ў садзе — і ставіць на столік нізкі пляцёнік з яблыкамі, талеркі і нажы.

— Частуйцеся. З дрэва вось... Той раз вам падабаліся такія яблыкі. Я казала пра гэта бацьку.

— Шкада, я зноў яго не пабачыў. Але зноў кажу: самадоўпіцкія поспехі яго вышэй любой ухвалы... А як малая? Спіць ужо?

— Кулогаецца. З вуліцы ледзь даклічаш. Потым ад вады не адцягнеш. А раніцаю ніяк не пабудзіш. Штодня ў садзік позніцца...

Валя ўрэшце пакідае нас, і я радуюся — мне яе гаворка пра ўсе падрабязнасці жыцця нашай дачкі здаецца зусім тут не да месца. Мы застаёмся ўдвух з Крыштопам, памалу крочым сцежкаю ў садзе, і я заўважаю, што ранейшая вязь думак парвалася, нешта прыпнялося да іх і разбурыла стройнасць разважанняў; нейкі одум прыкмячаю і на твары майго госця.

Спыняемся ў канцы саду, ля студні, побач з нізкім, але раскідзістым дрэвам. Галіны яго сагнуліся, і я выбіраю самы вялікі яблык і працягваю Крыштопу.

— Калі яблык адразу ўзяты з дрэва, у ім зусім іншы смак. А паляжыць дзень-другі — ужо не тое,— гаворыць Крыштоп.— Ваш стары, відаць, не проста аматар.

— Летась атрымаў грамату на абласной выстаўцы. Гэты вось гатунак прызналі лепшым сярод усіх насленных.

— Нават і не чуў пра такую выстаўку. Гэта ж калі яе праводзілі?

— У лістападзе.

— А-а... Мы якраз у адпачынку былі — гасцявалі ў майго брата ў Адэсе. Ну і яблыкаў там! Але такіх, здаецца, і няма. З выгляду быццам і не вельмі кідкія. Але смак!..

Ён разглядае белую, з тонкімі чырвонымі пражылка-

мі мякаць, потым адкусвае, павольна жуе, і на твары яго непадробленае задавальненне. Мне гэты яблык не ў навіну, але я таксама выбіраю сабе вялізны, чырванабокі і таксама пагаджаюся: смачны!

— Вышэй любой ухвалы! — паўтарае Крыштоп.— Памятаю з дзяцінства вельмі смачныя яблыкі. У нас іх звалі «цыганкамі».

— Ёсць такія. Вельмі позні гатунак — як лісце ападзе, тады наспяваюць. Яны ўнізе, ля клёнаў. Пройдзем?

— Навошта ж яны мне няспелыя?.. Пакідаю за сабою права прыйсці на іх увосень. Як нальюцца.

— Заяўка прынята... Дарэчы, а якая гэта новая эпапея ў вашага праекта? — пытаюся, каб зноў вярнуцца да ранейшай нашай гаворкі.

— Пераробкі, прычым незвычайныя.

— Пераробкі?

— Вось іменна!..

Нешта незразумела. Углядаюся ў твар Крыштопа і нічога не магу прачытаць на ім. Крыштоп нібыта ўжо і забыўся на свае словы, засяроджана і апетытна распраўляецца з яблыкам: адкусіць, паглядзіць, зноў адкусіць — задаволены.

— Дык усё-ткі, якія пераробкі, калі мы на гэтым тыдні скончым падмурак?

— Яны не тычацца падмурка. Пераробкі плануюцца на другім паверсе. Аб чым і гаварыў са мною сёння таварыш Зубок Віктар Паўлавіч.

— А чаго я нічога не ведаю?

— Спачатку, мабыць, хацелі ведаць маю думку. І атрымаць згоду на тыя пераробкі.

Крыштоп моўчкі хрумстае яблык, потым, агледзеўшы агрызак, узмахвае рукою і далёка шпурляе яго; у галінах клёнаў, што растуць за садам, чуецца мяккі ўдар па лісцінах і адразу ж, патрывожаныя, з бязладным галёканнем, лапочуць крыламі маладыя гракі.

— Ого! Колькі іх тут. Напалохаў. І чаго яны сюды збіраюцца?

— На начоўку.

— А чаго не да ракі? Там жа клёны вышэйшыя.

— Там халадней. Ад вады. А тут зацішак.

Размаўляем пра гракоў, а думаем зусім пра іншае. І ён, і я. Мне здаецца, што Крыштоп завітаў да мяне зусім не для таго, каб паведаміць пра гаворку з Віктарам. Гэтае паведамленне нічога не растлумачвае, бо я не ве-

даю сутнасці тых пераробак, стаўленне Віктара да іх і, галоўнае, дзеля чаго яны робяцца.

— Дзеля чаго? Каб палепшыць жыллёвыя ўмовы некаторых гарадскіх начальнікаў...

Не, такая гаворка мне не па душы. Калі Крыштоп не хоча казаць шчыра, дык навошта ён увогуле пачынаў такую размову?

Мой папрок, магчыма, нават крыху рэзкаваты, Крыштопа не крыўдзіць.

— Табе толькі факты? — са смяшком пытаецца ён.— Добра. Мне загадалі перарабіць праект. На другім паверсе столь павінна быць вышэй на сорак сантыметраў, чым на ўсіх астатніх. На другім паверсе павінны быць асобныя ванныя, а не сумешчаныя санвузлы. На другім паверсе ванныя і кухні павінны быць абліцаваны кафляю. Карацей кажучы, другі паверх — патрыцыям. А ўсе астатнія — плебсу!

— І вы пагадзіліся?

— Я проста выслухаў.

— І далей?

— Далей я сказаў, што праект прайшоў усе ўзгадненні і што нельга яго так проста ламаць. Мяне ж супакоілі: узгадненні, маўляў, не ваш клопат. Усё, маўляў, ужо ўзгаднілі, санкцыі на такія пераробкі атрыманы, а мне застаецца толькі перанесці іх на кальку, а потым разам з будаўнікамі — а будаўнікі гэта вы — увасобіць у жыццё. Я сказаў: не магу зрабіць усё адразу, патрэбен час, каб падумаць. І вось я думаю. І раюся. І скажу адразу: не хачу перарабляць праект так, як удумаў Зубок, не хачу ўдзельнічаць у ягоных шахерах-махерах...

Патрывожаныя гракі зноў прыляцелі на клёны, галёкаюць, лопаюць крыламі; галіны гнуцца, і ўсё вакол здаецца, аж дрыжыць ад шалёнага бязладнага граю. Хапаю яблык, што ляжаў на зямлі, і кідаю яго ў густую навісь галля; гракі, лапочучы крыламі, зрываюцца з клёнаў і лятуць прэч. Але мне не робіцца спакайней: нічога не змянілася ад таго, што цяпер у садзе ціха,— гэтая цішыня не супакойвае, а прыгнятае.

Думаю над словамі Крыштопа, спрабую ўявіць сабе надрабязнасці таго, як ішла гаворка з Віктарам. Відаць, была яна не дужа і ціхая. Пэўна ж! Крыштоп невыпадкова завітаў да мяне. Ён не проста скардзіцца на лёс свайго праекта, не проста паведамляе пра тую гаворку: ён шукае шчырай парады, яму патрэбна сяброўская над-

трымка. Як мне яго падтрымаць? Што параіць? Я чуў пра выпадкі, калі на асобных аб'ектах змянілі праекты і рабілі розныя адхіленні, каб збудаваць частку кватэр з дадатковымі выгодамі. Але пра тое я толькі чуў. Няўжо цяпер мне самому давядзецца рабіць гэта?..

Крыштоп зрывае з дрэва два яблыкі і адзін працягвае мне. Нейкі час мы стаім, нічога не гаворым і хрумстаем сакавітыя наліўы. Рашэнне ўжо выспела: на незаконныя пераробкі, на ашуканства такое мае згоды не будзе, я не зраблю гэтага.

Нават калі і загадаюць — не зраблю!

— Ніхто і не будзе загадваць,— гаворыць Крыштоп, уважліва разглядаючы яблык.— Будуць проста перакопваць: маўляў, памыляецеся, дарагі таварыш, думаючы, што пераробкі робяцца з мэтаю антыдзяржаўнай. Усё пададуць, адным словам, пад пэўным і даволі прыстойным соусам. Кватэры з выключнымі выгодамі? Так. Але каму? Лепшым людзям, пра якіх сам народ клапоціцца, імёнамі якіх ганарыцца ўвесь горад!..

Нават у вуснах Крыштопа гэта гучыць не вельмі пераканаўча, і я лёгка абвяргаю ўсё. Пра лепшых людзей клопат? Згодзен. Але тады давайце будзем клапаціцца і пра ўсіх. І не будзем абліцоўваць кафляю ванныя на адным паверсе. Робім сумешчаныя вузлы на ўсіх паверхах, апрача другога? Чаму?.. І дзівіць, шчыра кажучы, не толькі гэта. Чаму Крыштоп не змог адстаяць свой праект, а тут некаму захацелася, і ўсё адразу ляціць дагары нагамі? Чаму Крыштоп не дамагаецца, каб ажыццяўляліся не нейкія там пераробкі, а ўвесь ягоны праект, ягоная мара, аб якой ён так хораша гаварыў?..

З той жа ўвагаю, з якой ён толькі што вывучаў яблык, Крыштоп углядаецца цяпер у мой твар; чорныя бровы ссунуліся, веі апусціліся — ён нібыта свідруе мяне сваімі карымі вачыма.

— Я б пагадзіўся зрабіць гэта, каб вы далі згоду пайсці на рызыку.

— Рызыку?

— Так. Бярыце і будуйце дом па майму праекту, вось гэтаму, які ніхто не абскубваў з усіх бакоў, не ўдакладняў. Зрэшты, вы не зробіце вялікага злачынства — простае балансаванне ў межах дазволеных будаўнічых стандартаў. Але затое і дом будзе цудоўны, і ў далейшым зусім іншы выгляд атрымае квартал. Дом як бы адкрые яго. А потым, калі зробіцца ўвесь комплекс, гэта

будзе тое, пра што я марыў. І пабачыце: тыя, хто будзе жыць тут, скажуць нам толькі дзякуй...

Дзіўнае адбываецца ва мне: тут і злосць на тых, хто прымушаў некалі Крыштопа адмаўляцца ад свае задумы, і крыўда за яго, і здзіўленне амаль неверагоднай гісторыяй праекта, і цвёрдае жаданне зрабіць наўпярок Віктару. І, вядома, не Віктар галоўная струна ва ўсім гэтым. Ён выкапаўца. Але выкапаўца нахрапісты, хітры. І таму, калі ўжо ісці на рызыку, дык ісці з розумам, не падстаўляючы галаву над абух. Таму трэба, відаць, пакуль што нікому нічога не гаварыць, не скардзіцца. Зубок загадае — няхай Крыштоп прымае загад. Пойдзе са мною гаворка — я асабліва пярэчыць не буду.

Галоўнае, і праект Крыштопаў ажыццявіць, і выкрыць Віктара, і выкрыць тых, хто стаіць за яго спінай!..

Одум, як змрочны цень, кладзецца на твар Крыштопа. Ён паглядае на клёны, пытаецца неахвотна, быццам шкадуючы, што павінен гаварыць:

— А вы разумееце, чым усё можа скончыцца для нас асабіста?

— Пераможцаў не судзяць.

— Але Пірава перамога мне непатрэбна.

— Я веру ў іншую!

— Тады — робім! А як што — жартаваць пачнём: пераблыталі, маўляў, праекты...

Гэта, вядома, наіўна. Віктар будзе прыходзіць на аб'ект, а ён інжынер і адразу ж убачыць, што робіцца па будаўнічай пляцоўцы.

— Безумоўна,— пагаджаецца Крыштоп.— Але чатырнаццатага пачынаецца абласны семінар-нарада. Зубок будзе там дзён пяць. А за гэты час мы ўжо выйдзем на трэці паверх. А там нас няхай судзяць ці мілуюць...

— На першае нам, мабыць, трэба болей спадзявацца.

— Ад торбы і турмы, як кажуць, не адракайся...

— Між іншым, мы не разгледзелі і такі варыянт: паставіць рубам пытанне перад упраўленнем і адстаяць праект.

— Позна,— хутка гаворыць Крыштоп.— Няма ўжо часу ставіць пытанні. І, самае галоўнае, гэта нічога нам не дае. Больш таго, калі мы паспрабуем адмовіцца, нашу адстаўку прымуць з ахвотаю і знойдуць людзей патрэбных. Таму я і завітаў да вас. Таму і гавару з вамі пра ўсё шчыра. Спадзяюся на вас і давяраю...

Давяраю... Толькі цяпер, пачуўшы гэтае слова, пачы-

наю разумець, чаму я так хутка і адразу прыняў прапанову Крыштопа. Я таксама паверыў яму. Паверыў адразу, без ваганняў і падазронасці, паверыў як самому сабе. Дык што ж мы тады стаім? Трэба браць у рукі праект і практычна абмяркоўваць усе падрабязнасці.

Мы зноў вяртаемся да століка, сядзім, гаворым, глядзім. Ужо амаль зусім ацямнела. Прыходзіць Валя і кліча нас на тэрасу. Але Крыштоп пачынае развітвацца, просіць Валю прабачыць.

— Заняў, бачыце, увесь вечар. А ў вас, магчыма, былі нейкія планы з Леанідам...

— Пакуль мама не вернецца з Залесся — нашы планы адны: Ірка. Утаймавала яе — спіць. Цяпер мы будзем спакойна піць чай.

— Ну як тут не прыгадаеш Дзям'янаву юшку?

Крыштоп дазваляе толькі мне аднаму праводзіць яго, і толькі да вуліцы; развітваемся мы цёпла — гаворка з ім мяне ўзрушыла.

Гэтае ўзрушэнне не пакідае мяне і пазней, калі сяджу на тэрасе і гляджу на праект, які пакінуў Крыштоп. Упершыню прыходзіць цвярозая думка: вельмі рызыкоўна, магчыма, адважыўся я на тое, што прапанаваў Крыштоп. Але яго ідэя ўжо мяне захапіла ў свой палон, ужо жыву ёю, ужо бачу яе, увасобленую ў бетон, шкло, дрэва. Ранейшы праект Крыштопа, праўда, не вельмі і адрозніваецца ад цяперашняга, але ў ім ёсць дэталі, якія не спрасцілі будынак, не зрабілі яго падобным на дзесяткі іншых, выразна акрэслілі тое, што Крыштоп назваў індывідуальнасцю, тварам дома.

Мне хочацца будаваць такі дом. І мы яго, безумоўна, збудуем. Але гэтыя пераробкі на другім паверсе, прапанаваныя Крыштопу Віктарам... Дзіўна. Дзіўна і тое, як ставіцца Віктар цяпер да мяне. Ён жа сам прапанаваў аб'ект. А потым, з-за нейкай дробязі, гэтак выбрыкнуў, закрэсліў усё ранейшае і патрабаваў строгасці і афіцыйнасці. Прынамсі, у гэтым ёсць штосьці ад таго, даўняга, Віктара, які праз пыху сваю мог нарабіць глупства. Але тут, відаць, не пыха. Да здарэння з Кізілам можна было зусім па-іншаму паставіцца. Вымова, вядома, ёсць вымова. Згодзен. Але навошта было ўзнімаць вэрхал на ўсё ўпраўленне, напярэджваць у загадзе ўсіх кіраўнікоў аб'ектаў? Магчыма, гэтак і трэба, калі разважаць лагічна. Галоўны інжынер павінен быў, грунтуючыся на здарэнні ў нашым катлаване, патрабаваць ад кіраўнікоў іншых

аб'ектаў стражэйшага захоўвання правіл бяспекі? Без умоўна. Але ўсё гэта ён мог зрабіць тактоўна, без крыку, не выстаўляючы на першы план сваё пыхлівае «я». Але не зрабіў. Па выпадковасці? Ці сумысля?..

Тухціць, бунтуе ў грудзях сэрца. Чаго ж я раней не падумаў пра гэты варыянт, апошні? А ў ім праўда. Запрашаючы мяне сюды, у Прыдзвінск, калі мы былі ў Віктара разам з Валяй, ён разлічваў знайсці са мною агульную мову. Потым знарок па-начальніцку паставіўся да абвалу, спадзеючыся, што запалохае мяне, што я ўжо нічога не адважуся рабіць самастойна, рабіць нешта процi яго волі, процi таго, што ён з кімсь там надумаў.

Усё разлічана.

Ведаю, што не памыляюся, і ўвесь час адчуваю нейкія сумненні, якія жывуць ва мне і непакояць. Неяк як бы крыху і не верыцца ў тое, пра што казаў Крыштоп. Зрабіць у доме спецыяльны паверх з выключнымі выгодамі, паверх для «патрыцыяў», як ён жартуе? Паставіць вышэй столь, паставіць у ванных і на кухнях кафлю, якая зусім не прадугледжана, перапланаваць усё... Не, гэта ж неразумна проста, бо немагчыма зрабіць тое ўпотай, каб ніхто не ведаў. Дом будуем жа не ўдвух з Крыштопам. Ёсць шмат людзей, якія будуць працаваць, перш чым нехта паселіцца ў тых кватэрах: электрыкі, сантэхнікі, маляры. Будзе, зрэшты, камісія па прыёмцы...

Цікава, як пачне са мною гаворку Віктар, як падступіцца? Ён жа павінен даць мне загад, уручыць зменены і перароблены праект... А можа, нічога і не будзе змяняцца ў праекце, а проста загадаюць зрабіць тое і тое?.. Не, Крыштопу ён паведаміў аб пераробках і сказаў унесці іх у праект...

Чую Валіны крокі, але не паварочваюся, і яна асцярожна набліжаецца, садзіцца побач, і мы ўдваіх ужо глядзім на разлінаваны аркуш паперы.

— Новы дом? — ціха пытаецца яна.

— Новы. Спіць Ірка?

— Ногі мылі, дык яна ўжо ківалася. А як лягла, дык адразу ж і заснула. Налётаецца за дзень...

— А чаго кашляла? Я чуў — яна кашляла.

— Дурэла проста. А чаго ён прыходзіў? Нешта з праектам?

— Не, праект цудоўны. Глядзі, які стане дом...

Валя сіліцца зразумець праект, але, вядома, мала пра што гавораць ёй усе гэтыя лініі, умоўныя знакі, зноскі,

указальнікі, і я спрабую што-кольвек растлумачыць Валі. Крыштопаў дом уяўляю добра, і мне ўсё больш і больш думаецца, што гэты будынак на беразе ракі будзе цудоўны — ён сапраўды як бы адкрые дарогу іншым, што выцягнуцца ўслед за ім, а паміж імі асядзе шырокая лента зеляніны, і гэтае мноства кветак і дрэў ля белых зашклёных фасадаў будзе падобна на зялёныя хвалі. Упершыню так абрысна ўяўляю сабе задуму Крыштопа і разумею ягоныя словы пра дом, які, нібыта карабель, будзе адкрыты пошуму хваляў і бляску сонца. А нехта ж паабсякаў пры зацверджанні і гэтыя сціплыя лоджыі, і гэтыя цагляныя закладкі паміж блокамі, і каляровыя пліткі над вокнамі,— паабсякаў усё тое, што робіць цяжкія прамавугольнікі блокаў нібыта лягчэйшымі, з добрым каляровым адценнем...

— Дом харошы.— Валя пагаджаецца, і гэтая паспешлівая згода абуджае ва мне пачуванне насмешлівае і іранічнае.

— На якой падставе такое сцвярджэнне?

— Вельмі простай: за благое Бугрым не можа ўзяцца.

— Ты думаеш?

— Перакапана. Я цябе ведаю.

— А ці ведаеш ты, што калі Бугрым будзе ажыццяўляць гэты праект, дык да тваіх абавязкаў, мажліва, прыбавіцца і яшчэ адзін — насіць яму на перадачу харчы ў казённы дом?

— Пакажы толькі дарогу. Прынясу абавязкова.

— Я не жартую.

— Тады расказвай. І па парадку. Усё!..

Валя кладзе мне рукі на плечы, і мы сядзім, схіліўшыся над сталом, і глядзім на праект. Я думаю пра тое, што чакае мяне наперадзе, і расказваю пра гаворку з Крыштопам, і яна слухае, не перапыняе, і мне здаецца, што Валя не толькі ўсё разумее, але і глыбока верыць у правільнасць нашай задумы, верыць і не баіцца. Але гэта я так думаю. А Валя маўчыць, уважліва вывучае рыскі і лініі на кальцы, углядаецца, нібыта шукае нешта вельмі ж важнае і патрэбнае...

— Ты разумееш, аб чым тут Бугрым красамоўнічае? — Я ціха дакранаюся да Валіных рук; пальцы яе агрубелыя і шархоткія.

— Амаль што. Толькі не разумею Віктара. Навошта яму ўсё гэта? Зрабіць кар'еру? Наўрад ці зробіць ён яе на гэтым. Тады навошта?

— Ну, гэта пытанне чыста рытарычнае.
— Не! Чыста практычнае.
— Удакладні.
— Ты ж быў сведкаю, як ён ірваўся ў аспірантуру.
— Дапусцім.
— А цяпер зрабі такое меркаванне: ён па-ранейшаму рвецца туды.
— Дапусцім, а сувязь?
— Самая непасрэдная. Калі мая здагадка правільная, тады робіцца зразумелым усё астатняе. Яму патрэбна добрая характарыстыка, неабходны для абагульнення матэрыял, нешта накшталт накіравання адсюль. І ён разлічыў правільна: тыя, што сядуць у кватэры з выгодамі спецыяльнымі, з вялікай ахвотаю заўсёды пойдуць яму насустрач...

Валя разважае лагічна. Я слухаю яе, і ўсе мае раскіданыя і сумятлівыя думкі набываюць строгі кірунак, і калі раптам, бы з высі якой, адкрываецца ён, мне робіцца горача. Чамусьці прыгадваю той дзень, калі некалькі год назад Віктарава маці прынеслася на будоўлю з выклікам у інстытут. Тады Віктар паехаў. Цяпер мне пагражае новае: дапусцім, дом збудаваны, Віктар паедзе ў аспірантуру, я працую, і адкрываецца — а рана ці позна гэта ж здарыцца! — гісторыя з усімі тымі пераробкамі. Хто будзе адказваць? Начальнік участка. Значыцца, правільная Валіна здагадка. Валя нават паглядзела глыбей і зразумела больш, чым я, але яна не сказала самае важнае: ці разумна тое, што мы з Крыштопам хочам зрабіць?

— Ну, а скажу я, што гэта няправільна? Вы ж усё роўна не павернеце назад!
— Не павернем! Бо я ніколі не рабіў, не хачу і не буду нічога рабіць проціў свайго сумлення!..
— Слухай, у мяне прапанова. Адкладзём абмеркаванне тваіх будаўнічых спраў на заўтра. Раніца заўсёды мудрэйшая... Ці не так?

Позірк Валін крыху насмешлівы, але ўстрывожаны. Баіцца і непакоіцца. І не сказала яна, відаць, пра сваю трывогу, каб не хваляваць мяне. І не скажа! Але яна і зараз думае пра нашу гаворку, і будзе думаць заўтра, і будзе думаць потым, калі паедзе ў Маскву, а я застануся, і будзе думаць у інстытуце, і будзе там трывожыцца і хвалявацца сама. Тым не менш я зрабіў правільна, што сказаў ёй аб усім: мы нічога адно ад другога не таілі — так было, так і павінна быць...

Валя бярэцца ладкаваць пасцель, і пад яе рукамі мякка шухціць накрухмаленая прасціна, і ўвесь клопат чэзне, адкінуты добрай і цёплай пяшчотаю.

— Пайду зачыню веснiцы,— кажу я.

— Прынясі Іркіны плацейкі. Яны там вісяць...

Зачыніўшы весніцы, іду ў канец саду, дзе нацягнута ад маладога ясеня да плота тонкая тэлефонная драціна, на якой звычайна сушыцца бялізна; драціна схавалася ў цемры, а плацейкі падобны на маленькія сцяжкі — ні на чым вісяць у паветры.

У садзе ціха; светлыя палосы з акна ўпіраюцца ў бухматыя дрэвы, і буйныя налівы загадкава бялеюць; шахціць па лісці, сарваўшыся з галіны, і гулка покае на зямлі яблык; сонна галёкнулі на клёнах гракі.

У асветленым акне, за фіранкаю, рухаецца цень — гэта ходзіць у пакоі Валя; вось спынілася, не варушыцца, і гэта цягнецца нейкі час, і цёмныя абрысы на фіранцы нерухомыя.

А мне хораша і ўцешна і хочацца весела супакоіць Валю, і я ведаю, што зраблю гэта, як толькі вярнуся з саду. Не трэба ёй трывожыцца за мяне.

## 5

Віктар, вядома ж, чакаў ад мяне рэзкасці, катэгарычнасці, а я размаўляю памяркоўна, спрабую нават жартаваць, і тон мой яго дзівіць; ён націху бярэ са стала праект, у якім Крыштоп ужо зрабіў пераробкі, і, выцягнуўшы аркуш у адстаўленых руках, разглядае ўважна, быццам на адзіноце, быццам мяне няма ў пакоі ўвогуле.

Пазваніў мне Віктар учора, паведаміў, што ёсць тэрміновыя справы, і прасіў раніцаю зайсці да яго. І вось мы сядзім у кабінеце, і ён (з самага пачатку нашай размовы сёння ён зноў звяртаецца да мяне па-ранейшаму на «ты») наспеў ужо сёння патлумачыць «аб некаторых удакладненнях» праекта і прычынах, што іх выклікалі, і я выказаў яму свае меркаванні, і ён цяпер маўчыць, утаропіўшы вочы ў адну і тую ж кропку на паперы.

— Значыцца, я памыляўся,— гаворыць Віктар і кідае на мяне хуткі, насцярожаны позірк.— Ведаеш, што я думаў і на што разлічваў, калі клікаў цябе?

— Не ведаю. А скажаш — паслухаю.

— Быў перакананы: нялёгка мне давядзецца, але згаворымся.

— Навошта — не разумею! — са мною згаворвацца? Мы робім дзяржаўную справу.

— Вось у тым і штука! Каб я рабіў сваё асабістае, дык наўрад ці насвяціў бы цябе ў розныя тонкасці. У тым і загваздка — не сабе служым!

— Я працую, а не служу!

— Бачыш, ты з падкавыркаю. А мне хочацца мірна, ціха з табою дамовіцца...

— А я зноў на сваім стаю. Мне патрэбна пісьмовае распараджэнне на тыя пераробкі.

— Вось і маеш! Я — сюды. Ён — туды. Мала я табе сёння казаў? Не Зубок прыдумаў тыя пераробкі. Там! — Ён торкае пальцам у столь, круціць ім над галавой.— Там гэта вырашаюць. Калі там вырашана і мне загадана,— што я раблю? Выконваю! Таму і раю: глядзі на ўсё цвяроза!

— Я і гляджу. Але не разумею адно...

Віктар з рогатам кідае аркуш на стол; папера з шоргатам скруцілася трубкаю. Потым ён становіцца са мною побач і тлумачыць мне, як вучню, які не можа зразумець простай задачы, што я вельмі шчаслівы чалавек, бо не разумею толькі адно. А ён, Віктар, не разумее адно, другое, трэцяе... І не спрабуе нават зразумець, бо ёсць такія пытанні, што іх лепей і не чапаць.

Мяне гэтыя разважанні ўзвінчваюць. Няма, не можа быць пытанняў, на якія нельга знайсці адказу. Чаго мы варты, калі пачнём туляцца, сарамліва ўцякаць ад складаных праблем і пытанняў?

— Філасофія! А тут жыццё! — Віктар хапае кальку, трасе яе ў руках і неахайна кідае на стол.— Вось... Гэта — жыццё! І хочаш ты ці не хочаш, а ты ў ім. Прызнаеш ці не прызнаеш, яно ўсё роўна коціць. І ты павінен так ці інакш ставіцца да яго...

— Хіба я не выказаў сваё стаўленне да пераробак? Выказаў! І калі ты лічыш звычайны абавязак філасофіяй, дык давай разбяромся.

— До! До, до! Ніякай філасофіі. Ёсць загад.

— Я зноў паўтараю: мне патрэбен пісьмовы загад.

— І за гэта толькі мы і зачапіліся?

— Пакуль што.

— Тады лічы, што сустрэча, як кажуць дыпламаты, прайшла ў цёплай сяброўскай абстаноўцы. Надрукуе машыністка — зойдзеш і возьмеш. Хоць тры экземпляры!

— Мне патрэбен адзін.

— Калі ласка, возьмеш адзін...

Стаю ля стала, марудна згортваю кальку і сачу за Віктарам. Ён вытрымлівае мой позірк, ён нават усміхаецца. Тое, што я не вельмі і пярэчыў, хоць выказаў свае думкі аб пераробках у праекце, яго не толькі прыемна здзіўляе: ён святкуе перамогу. Ён нават ляпае мяне па плячы, вядзе да дзвярэй, і праводзіць далей па калідоры, і гаворыць, што вельмі задаволены: я, маўляў, пачынаю ўрэшце разумець усё правільна. І ён гэта, маўляў, шчыра вітае: ускладняць нам не трэба ў жыцці нічога, бо мы простыя выканаўцы.

— Ёсць простыя. А ёсць праставатыя. Дык мяне ты ў якія залічыў?

Не ведаю, ці мой тон, ці само пытанне, але нешта ўразіла яго, ён насцярожыўся, потым роблена ўсміхнуўся, затрос рукамі:

— Хопіць, хопіць, хопіць! Ты зараз пачнеш даводзіць, што мы не простыя выканаўцы, а людзі творчыя, што кожны з нас павінен несці адказнасць за даручаную справу, што мы, будаўнікі,— стваральнікі новага, што стварыць гэтае новае трэба з чыстым сумленнем... Гэтак жа? Ну, вось... А хіба я адмаўляю ўсё гэта?

Што ні кажы, а Віктара дурнем не назавеш. Яго пытанні, яго рашучы тон абяззбройваюць, і ён, я гэта добра разумею, адразу ж, варта мне толькі запярэчыць, наверне кожнае маё слова на сваю карысць, і жаданне спрачацца атухла ва мне. Праўду казаў Крыштоп: спрэчка з ім не прынясе нам карысці, бо ён запраўды добра авалодаў моўнай эквілібрыстыкай і словы для яго нікчэмнасць, пусты гук...

— Не адмаўляеш. Але пакуль што — на словах,— кажу я, разумеючы, што ён зараз абвергне мяне.

— А што словы? Вецер? Кожны чалавек, калі ён сумленны чалавек, павінен заўсёды адчуваць адказнасць за кожнае сваё слова!

— І калі ён верыць у нешта, а яго прымушаюць рабіць зусім іншае, ён не мае права ісці на кампраміс. Так?

— Безумоўна! Але ты што? Зноў пра загад? Ды я табе пяць экземпляраў загадаю надрукаваць. Хопіць табе пяць?

Што запярэчыш? Адчуваю: ён і тут узяў верх. Але ведаю зараз зусім дакладна: свядома буду рабіць тое, аб чым мы дамовіліся з Крыштопам. Віктар хоча нешта дагадзіць. Хоча і разам з тым баіцца. Загад да гэтага часу

не падрыхтаваны, і ён не хоча яго мне ўручыць. Толькі абзац. Мне не пяць, а толькі адзін экземпляр патрэбен. Цікава, ці падпіша ён яго сёння?

На вуліцы людна. У кожнага, як звычайна, свая дарога, свае справы, свой клопат... І ад усёй гэтай будзённшчыны робіцца спакайней, нават крыху весела. І ўсё-ткі цікавая сітуацыя складваецца. Віктар думае, што дамогся свайго, прымусіў мяне скакаць па свой лад. А які будзе ў яго твар, калі ён пра ўсё даведаецца? Але што мне з яго-нага твару. Важна, што мы з Крыштопам робім правільна. І час пакажа гэта...

На будаўнічай пляцоўцы ўсё ідзе сваёй хадою: звоніць кран, плаўна апускаюцца на тросах апошнія блокі падмурка; з правага кутка, там, дзе нскалі быў абвал, пакладзены ўжо чатыры пліты перакрыцця, і на крайняй з іх, ссунуўшы берэтку на правае вуха, стаіць Кізіла.

— Гэ-эй! Сініца! Бяры лявей! Ві-іра! Ха-арош!

І гэты яго голас, і роўны гуд крана, і спакойныя, дзелавітыя рухі рабочых — усё добра знаёмае, вельмі падобнае на той час, калі я працаваў у брыгадзе Рогача і мы ставілі дом ля парку; мне нават здаецца, што лётаў звоніць Валі і што зараз з-за штабеля белых блокаў з'явіцца Казімір.

З-за штабеля і сапраўды выпырвае чалавек, нічым не падобны на Казіміра — высокі, тапклявы, у светлым пінжаку, з жоўтым чамаданчыкам па доўгім рамяні цераз плячо, зірнуў на мяне, але не прыпыніўся, пашыбаваў да Крыштопа, які стаіць ля прарабкі. Крыштоп нешта гаворыць яму, паказвае рукой у мой бок, і яны стаяць і чакаюць, пакуль я падыду да іх.

— Шліман. Карэспандэнт абласнога радыё.

Я знаёмлюся з карэспандэнтам і не ведаю, пра што мне з ім гаварыць; я нават баюся пытанняў, якія, несумненна, будуць. Выратоўвае становішча Крыштоп.

— Я казаў ужо таварышу Шліману, што, мабыць, лепей весці рэпартаж з іншай якой будоўлі. Дзе, скажам, работы завяршаюцца. А ў нас... Ну, што ў нас?

Адразу ж, узрадаваны магчымасцю адвязацца ад карэспандэнта, пагаджаюся з Крыштопам. Але Шліман паблісквае вачыма, глядзіць весела, быццам ніякіх іншых слоў і не чакаў ад нас, супакойвае пачціва і дабрадушна. Работы толькі што пачаліся? Гэта заканамерна. Не можа быць такога становішча, каб на ўсіх будаўнічых пляцоўках работы завяршаліся. Такое становішча не адпавядае

сапраўднасці, бо ў адным месцы пачынаюць, у другім вядуць поўным ходам, у трэцім заканчваюць. Дыялектыка горада, які будуецца. А яго, шліманаўскія, рэпартажы заўсёды былі цалкам і да канца аб'ектыўныя. І акрамя ўсяго іншага сёння галоўны інжынер упраўлення рэкамендаваў зазірнуць Шліману менавіта сюды. І выканком гарсавета такой жа думкі прытрымліваецца: участак, маўляў, паказальны, а сам аб'ект вельмі перспектыўны ў сэнсе разгортвання шырокага фронту работ. І галоўнае: панарама будучага квартала яму, Шліману, вельмі падабаецца, натхняе на гаворку ўзнёслую. А гэта вельмі важна, калі вядзецца запіс...

Крыштоп перапыняе карэспандэнта:

— Але ж мы толькі зусім нядаўна пачалі будаўніцтва! Нічога цікавага. Звычайныя непаладкі першых крокаў...

— Мне гэта, прызнамсі, і патрэбна: пачатак. І вельмі важна перспектыва. Мой бос нязменна падкрэслівае: вядзіце перадачу заўсёды з перспектываю.

— А калі ў вас плануецца перадача?

— У канцы тыдня. Магчыма, у нядзелю. Раніцаю. У вас тут няма радыё? Шкада. Хочаце, мы паставім гэтае пытанне ў перадачы? Няхай упраўленне паварушыцца, зробіць належныя захады, каб правялі. Гэта не так і цяжка...

— А нам не трэба яго праводзіць. Тут непадалёк стаіць дынамік. Дык яго добра чуваць — поўная радыёфікацыя аб'екта...

Крыштоп паведамляе гэта, а мяне адольвае одум. Шліман быў у Віктара раніцаю. Чаго Віктар не папярэдзіў, што накіраваў карэспандэнта менавіта да нас? Забыўліваець?.. Не, наўрад. Гэта на яго не падобна. Тут верагодней ад усяго псіхалагічны разлік: мы з табою, маўляў, спрачаемся, нешта даводзім адзін аднаму, а аб'екту, тым часам, аграмаднае значэнне надаюць, перспектыву вялікую адкрываюць для кіраўніцтва. Лагічна гэта? Бадай што... І яшчэ, мабыць, ён проста баяўся, што я, даведаўшыся пра Шлімана, пачну спрачацца? І тут, між іншым, разлік правільны: каб там, у кабінеце, ён сказаў мне, што накіроўвае да нас карэспандэнта абласнога радыё, дык я б, пэўна ж, пачаў даводзіць тое ж, што даводзім мы зараз з Крыштопам. Значыцца, ведаючы маю натуру, Віктар палічыў за лепшае нічога мне не паведамляць.

Шліман тым часам ужо зняў з пляча сумку, адкрыў

верхняе вечка, разматвае гнуткі шнур попельнага колеру.

— Я думаю, што пачнем запіс адтуль, ад катлавана. Гэта будзе правільна...

— Адразу і запіс? — дзівіцца Крыштоп.— Нічога не атрымаецца без рэпетыцыі. Праўда?

Сказаць, што мне зусім не хочацца выступіць па радыё — не магу. Употай пасмейваюся з гэтага свайго жадання і хаваю яго за рашучай згодаю з Крыштопам: маленькая прыкідка, як гаворыцца, нам не пашкодзіць.

Шліман рашуча трасе рукамі:

— Ні-ні-ні! Паверце вопыту. На прыкідках звычайна атрымліваецца жыва, цікава, а пачнем пісаць — нудота. А чаму? Чалавек хвалюецца. У мяне свая метода: першае ўражанне, непасрэднасць гаворкі...

— А наш канкрэтны абавязак? Задача, так сказаць, на сёння.

— Я даю тры пытанні. Першае — кіраўніку аб'екта: гэта адказ у агульным плане, аб тым, ведаеце, што збудоўваецца. Другое пытанне — прадстаўніку архітэктурнай думкі. Таварыш Крыштоп гаворыць аб асаблівасцях праекта, аб тым новым, што ёсць у планіроўцы квартала. Разумееце?

Пытанне чамусьці адрасавана мне, і я са згодаю ківаю галавой.

У асноўным, вядома.

— Гэта добра. Галоўнае — непасрэднасць. Каб было чуваць, што мы на будоўлі, дзе ўсё гудзе, грыміць, грукоча... Карацей — голас працы. А трэцяе пытанне пасля вас абодвух — слова будаўніка. Хто, вы казалі, брыгадзірам? Таварыш Кізіла? Вельмі добра.

— Ён ля крана цяпер. Паклікаць?

— Ні-ні-ні! «Краном висящим тяжести тащим...» Паэзія, паэзія... Гукі будоўлі — увесь час фон нашай гаворкі. Калі працоўная сімфонія не чуваць — пусты фарс. Праца, праца нам патрэбна. Значыцца, паўтараю яшчэ раз... І майце на ўвазе: кожнае наша слова — гэта эфір. Гатовы? Тады пачнем...

Мы стаім ля сходкаў, якія вядуць цяпер не ўніз, у катлаван, а падняты на апошнія блокі падмурка. Шліман, смела ўзабраўшыся на пліты перакрыцця, увесь час пачварочваецца то ўлева, то ўправа, то пазірае на нас і ўсё гаворыць, гаворыць у мікрафон, які трымае ў руцэ; і здаецца, нічога, апрача мікрафона, і не заўважае. Але гэта толькі здаецца. Гаворка ў Шлімана льецца плаўна, прыго-

жа; ён гаворыць пра Дзвіну, пра людзей, што працуюць вакол, і потым паведамляе, што зараз накіроўваецца да старшага прараба, які кіруе работамі і знаходзіцца непадалёк, а потым ён, Шліман, паспрабуе адшукаць архітэктара, які, ён даведаўся, таксама недзе тут, на будоўлі.

Шліман ідзе да нас па сходках, гучна тупае чаравікамі, і мікрафон увесь час боўтаецца на гнуткім шнуры ля ног.

Калі Шліман быў наверсе, а мы стаялі адны, мне здавалася, што я змагу, не бянтэжачыся, расказаць пра тое, што ў хуткім часе будзе тут, на беразе Дзвіны. Але ў той жа момант, як трубка мікрафона апынулася ў маіх руках і Шліман, моўчкі сагнуўшы маю руку ў локці і наблізіўшы мікрафон да губ, зрабіў знак пачынаць, я адразу быццам пагубляў усе словы: дакладней, яны ёсць, як бы ўяве я бачу новыя дамы, ажыццёўлены Крыштопаў праект, але сказаць пра тое не магу. Зрэшты, перасільваю сябе, вымаўляю першае слова і адразу ж адчуваю ў сябе ўпэўнена, кажу пра тое, як і калі пачаліся тут работы, кажу пра наш галоўны клопат — хутчэй збудаваць новы дом, збудаваць так, каб людзі, што будуць жыць тут, не толькі дзякавалі нам, будаўнікам, але і былі шчаслівыя і жыццё іхняе ішло слаўна і добра. У мяне ўжо выкрышталізавалася лінія далейшай гаворкі, і мне хочацца сказаць аб тэрмінах, аб тым, што нам перашкаджае марудная дастаўка некаторых матэрыялаў, але Шліман выхоплівае мікрафон з маіх рук.

— Вы намалявалі перспектыву бліскучую. І разам з нашымі радыёслухачамі я дзякую вам і жадаю добрых поспехаў. Прабачце, гэта, здаецца, архітэктар, аўтар праекта? Так, мы не памыліліся, гэта Раман Пятровіч Крыштоп. Зараз мы падыдзем да яго, і ён раскажа нам пра свае планы...

Шліман зноў звешвае мікрафон да зямлі, гучна тупае чаравікамі — стварае ілюзію таго, што накіроўваецца цяпер ён да архітэктара.

Не ведаю, ці хвалюецца Крыштоп, але бярэ ён мікрафон неахвотна. Мне нават здаецца, што і голас яго гучыць незадаволена. Тым не менш гаворыць ён роўна, не збіваючыся, не паўтараючыся, і прамова ўся ў яго стройная, прыгожая, дзелавітая.

А з брыгадзірам у Шлімана пачынаецца зусім іншая гаворка, вясёлая, часам нават жартаўлівая. Пытанні Шлімана хуткія, нечаканыя, але Кізіла зусім не бянтэжыцца,

адказвае ўпэўнена, нібыта і не заўважае, што перад ім мікрафон.

— Скажыце, таварыш Кізіла, а як вы асабіста ўяўляеце жыццё людзей у гэтым цудоўным раёне?

— Асабіста? З ахвотаю пажыў бы. Парк — цудоўны плануецца. Дзвіна — побач. Раніцою за вуды і — на раку. Пяць разоў закінуў — снядапак гатовы. Толькі не ляпуйся.

— Вы, адчуваю, любіце рыбаліць? А скажыце, што вы любіце болей: будаваць ці рыбаліць?

— Болей? Здаецца, дзяўчат.

— Бліскучы адказ. Прабачце, крыху інтымнае пытанне: якіх дзяўчат?

— Толькі вясёлых. І байдарку. Сёлета мы ўдзельнічалі ў гарадскіх спаборніцтвах і занялі першае месца.

— Бліскуча. А тут не плануецца водная станцыя? Ці, можа, вы не знаёмы з праектам у цэлым?

— Станцыя будзе крыху ніжэй. Вунь там... Вось гэта — вуліца. А далей — парк. За ім — байдаркі. Так што можам і гайсануць!

— А хто збудоўвае станцыю?

— Наша ўпраўленне. Там таксама работы па ўсю шырыню. Гранітны прычал будзе. Ды вы можаце самі зірнуць.

— Гэтаю дарогаю ісці?

— Гэтай. Пад узвалам яны і працуюць.

— Дзякую... А зараз, дарагія таварышы радыёслухачы, мы накіруемся да будаўнікоў новай спартыўнай станцыі. Хвілінку цярплівасці, і я прывяду вас на бераг Дзвіны, і вы пачуеце плёскат рачных хваляў і адчуеце на сваіх тварах подых свежага рачнога ветру.

Шчоўкае выключальнік. Шліман, задаволены і вясёлы, усё яшчэ трымае мікрафон у руках і, па чарзе пераможна агледзеўшы нас, доўгім позіркам праводзіць Кізілу, які пабег да сваёй брыгады.

— Вы ведаеце? Гэта лепшы запіс за гэты месяц. Жыва, цікава, непасрэдна. А брыгадзір! Ды гэта ж цуд! Якая дыкцыя! Скарб!

— Пагаманіць Кізіла любіць,— згаджаецца Крыштоп.

— Пагаманіць?! Прыроджаны талент рэпарцёра. Я пагавару з рэдактарам — трэба абавязкова паспрабаваць сілы хлопца ў рэпартажы па радыё. А цяперка паслухаем наш запіс. У бытоўку пройдзем — там менеі гуду. Цяпер нам ён будзе толькі перашкаджаць.

У прарабцы Шліман адразу ставіць магнітафон на стол, пераматвае ленту, слухае крыху сам і потым дае мне навушнікі, і я прыціскаю іх да вуха. Голас Шлімана крыху зменены, але добра знаёмы. Знаёма грукоча бульдозер, звоніць кран. Потым гучна і чыста гучаць крокі — гэта ідзе Шліман. Свой голас я ледзь пазнаю. Тады мне здавалася, што хваляваўся я толькі на самым пачатку, але лента магнітафона добрасумленна захавала ўсё: і дзе я проста хваляваўся, і дзе крыху разгубіўся, раздумваючы над тым, што мушу сказаць і што скажу, і дзе гаварыў упэўнена і добра.

Паволі, ленавата паўзе, перамотваецца на другую касету тонкая карычневая лента. Я гляджу на яе з нейкім дзіўным адчуваннем, нібыта нешта трывожыць мяне, нібыта нейкая няясная думка абгнездавалася ў сэрцы, і я, ведаючы, што яна ёсць, ніяк не магу знайсці вытокі яе, не магу даўмецца, што гэтак хвалюе і трывожыць. Тое, што я выступаю і слухаю свой уласны голас? Не, наўрад. Нешта іншае. Але што?

— А цяпер, калі ласка,— гаворыць Шліман і забірае ў мяне навушнікі.

Крыштоп праслухаць сваё выступленне адмаўляецца.

— Я ўжо лепей па радыё пачую. Як пачнеце перадаваць.

— Тады позна будзе — нікога не выправіш. А тут, калі што не так, перапісаць можна. І праўда не хочаце? Тады хвілінку... Я праслухаю сам...

Шліман асцярожна прыстаўляе навушнікі, мружыць вочы ад задаволенасці, потым узнімае руку з адстаўленым вялікім пальцам:

— Бляск! Як сонца!

Ён закрывае скураную каробку магнітафона, закідвае доўгі рэмень на плячо і, удзячны, развітваецца. Шліман пашыбуе да ракі, размахваючы рукамі, нешта вясёлае насвіствае, зусім, відаць, забыўшыся аб нашым існаванні. Не, успомніў. Ля самай ракі ён раптоўна паварочваецца, робіць нам развітальны ўзмах рукою і хаваецца пад рачным узвалам.

## 6

Нарада ў кабінеце галоўнага інжынера цягнецца доўга — на абмеркаванне пастаўлены вынікі работы за прайшоўшы месяц. Са справаздачай выступіў старшы прараб

другога ўчастка, а цяпер гаворыць Іван Красько, начальнік трэцяга. Красько не спяшаецца, часта заглядвае ў блакнот, прыставіўшы акуляры да вачэй, потым, прачытаўшы колькі там лічбаў, здымае акуляры і пазірае на ўсіх ганарліва. Уласна кажучы, хваліцца яму няма чым, няма і падстаў гаварыць так доўга, паказчыкі па асобных брыгадах у іх, праўда, добрыя, але ў цэлым з планавым заданнем яны справіліся горш, чым мы. Гэта падкрэсліў Віктар у сваім уступным слове перад пачаткам нарады. Гэтага не аспрэчвае і Красько.

Выступаць — Віктар прапаноўваў гэта яшчэ ўчора — я адмовіўся наадрэз і цяпер, слухаючы Красько, не адчуваў аніякай радасці ад таго, што ён хваліць наш участак. Я ўвогуле не люблю напышлівыя, шматслоўныя прамовы, а сённяшнія — нож востры. Сёння ўвечары Валя едзе ў Маскву. Ведаю, што памагаць ёй збірацца ў дарогу няма чаго, бо бацькі прыехалі яшчэ на тым тыдні, уся работа ў хаце пароблена, Ірынка дагледжана. Але ўсё роўна расце прыкрасць: дзеля чаго я павінен сядзець тут, слухаць непатрэбнае красамоўства. Мы дамовіліся з Валяю яшчэ ранкам пайсці, як прыеду дамоў, на Дзвіну разам з дачкою. Але, відаць, нашы планы не спраўдзяцца, бо нарада перад самым, здавалася, завяршэннем, раптам зноў набывае добрую сілу: Красько зрабіў некалькі крытычных заўваг кіраўнікам растворнага вузла, тыя закіпелі, пачалі апраўдвацца — гэта хутка не скончыцца.

Сяджу ля акна, якраз напроціў стала Віктара. Хацеў быў заняць крэсла бліжэй да дзвярэй, але крыху прыпазніўся, нарада пачалася, і знайшліся разумнейшыя за мяне — крэслы толькі тут, перад сталом, былі вольныя,— ды і Віктар, як толькі я ўвайшоў, паклікаў і прапанаваў садзіцца бліжэй.

За акном грукочуць машыны; іх не відно, а толькі чуваць гуд матораў, бразджэнне жалеза, і ад гэтых гукаў часта і тонка трымціць шыба.

На стале звоніць тэлефон; зморшчыўшыся, Віктар бярэ трубку, раскручвае шнур і толькі потым прыціскае да вуха; але прыціснуўшы, ён тут жа згінаецца над сталом, узнімае руку — просіць цішыні — і слухае ўважліва, потым неяк паспешліва, радасна паўтарае двойчы: «Ёсць! Прынята! Будзе зроблена!» і, паўтараючы, распраўляе плечы; зморшчынкі ля вачэй разгладжваюцца, і ўвесь твар як бы мажнее, палівaецца чырванню, за якой адчуваецца ганарлівасць, упэўненасць і сіла.

Кладзе трубку Віктар асцярожна, неахвотна і нейкі час моўчкі аглядае нас усіх — позірк яго вясёлы, але далёкі, безудзельны, і затым як бы цень насоўваецца на твар.

— Спрэчкі, думаю, спынім,— начакана прапаноўвае ён.— Самі бачыце, што нагаманілі мы няблага: абагулілі вопыт і аб недахопах нашых тое-сёе сказалі — не таілі. Можна было б, вядома, і яшчэ паспрачацца, але,— ён стукае пальцам па тэлефоне,— клічуць у гарком. А мо хто хоча што гаварыць? Няма? Тады разыходзімся!

Прапанова даспадобы ўсім; кабінет адразу напаўняецца гудам галасоў, грукатам адсоўваемых крэслаў, шоргатам чаравікаў. І ў той самы момант, калі я паважваюся, паставіўшы сваё крэсла да сцяны, пайсці ў калідор, Віктар робіць мне знак пачакаць.

Кабінет пусцее. Віктар хутка шукае нешта ў шафе стала, совае паперы ў жоўтую папку. Мне здаецца, што ён узрушаны і крыху ўстрывожаны.

— Ну, таварыш Бугрым, трымайся цяперака, ведаеш, з кім размаўляў зараз? — Ён пытаецца гэта весела, але па-ранейшаму заклапочаны пошукамі, варушыць на стале зводкі, выбірае дзве з іх і разглядае.— І не прадбачыш жа, што там спатрэбіцца. Паганае, разумееш, адчуванне, калі цябе нешта спыталі, а ты не ведаеш, што адказаць, стаіш слупам. Э-эх, забяру я ўсё чохам-мохам,— вясёлым голасам вымаўляе ён і совае сінія паперкі, якія толькі што разглядаў, у папку.— Дык ведаеш, хто званіў? Маркін!

— Сакратар гаркома партыі па прамысловасці.

— Ну! Кажа, што ўважна слухаў рэпартаж. Задаволены! І вельмі высокай думкі аб нашых справах. Ты разумееш, што гэта азначае?

— Не дужа.

— А сам ты слухаў?

— Не. Перадавалі ў рабочы час. А дынамік сапсаваўся.

— Трэба тэрмінова адрамантаваць!

— Гэта ж не наш дынамік.

— Не мае значэння. Ты што, не разумееш?

Шчыра кажучы, не вельмі разумею. Якая тут сувязь паміж няспраўнасцю дынаміка і тым, што наш рэпартаж паслухалі ў гаркоме? Магчыма, тысячы людзей слухалі яго. Дык што з таго?

Хуткім узмахам рукі Віктар закрывае папку і, узяўшы мяне пад руку, вядзе да дзвярэй.

— А тое, дарагі ты мой, што ты шчаслівчык і ўсё вы-

кіроўваецца, мабыць, па самае лепшае,— гаворыць ён мне з даўняй цеплынёю — так ён размаўляў са мною ў той вечар, калі мы гасцявалі ў яго з Валяю і калі была Лена.— Маркін кажа, што ёсць думка паслухаць мой даклад на пленуме па прамысловасці. Намячаецца, адным словам, такі пленум. І вось ён хоча пагутарыць са мною, тое-сёе высветліць. І раптам ён папытае мяне аб сродках масавай работы. А я скажу: дынамік наш сапсаваны. І, дарэчы, не наш ён увогуле. Ведаеш, што з мяне зробяць? Блінец! Тоненькі блінец у кругленькіх дзюрачках. Э-эх, каб угадаць, пра што цябе запытаюць? Чорта з два ўгадаеш...

— Заўжды хочаш угадваць? На гэтым далёка не паедзеш. Лепей на факты разлічвай...

— Ты не яршыся. І не пніся ў дужа разумныя. Калі ў гаркоме такой высокай думкі пра твой участак — рэпартаж жа адтуль ішоў! — дык пра тое і ў абкоме будуць ведаць. А што гэта азначае?

Я паціскаю плячыма.

— Не думаў над такім пытаннем зусім.

— Вось і блага, што не думаў,— гаворыць Віктар павучальна, і мне раптам робіцца вельмі смешна з яго пыхліва надзьмутага твару.— Дык я табе скажу: на арбіту выходзіш! І на якую арбіту! Цяпер толькі наперад, як кажуць смелыя людзі! Назад табе дарогі няма!..

Мы развітваемся на вуліцы. На прыпынку я доўга чакаю свой аўтобус, і ўвесь час жывуць ва мне апошнія Віктаравы словы. І чым больш я думаю над імі, тым усё больш мацнее, шырыцца трывога, і пакрысе выспявае нераканапасць, што я, мабыць, пачынаю ва ўсёй шырыні разумець, чаму Віктар тады не сказаў мне, што да нас накіроўваецца Шліман. Ён свядома зрабіў гэта, знарок паслаў карэспандэнта да нас нечакана, каб мы, уражаныя гэтай нечаканасцю, не пярэчылі, выступілі па радыё і расказалі пра свае справы. Расказалі і тым самым адрэзалі сабе ўсе дарогі назад: людзі пачуюць гаворку аб нашых поспехах, і мы, вядома ж, не захочам у далейшым кідаць цень на сваю славу, паслухмяна выканаем загады Віктара, будзем моўчкі працаваць далей... А што тычыцца мяне, дык я павінен буду дзякаваць яму, бо ён спачатку пакараў, а потым мілаваў...

Няўжо ён так дакладна ўсё разлічвае, так далёка глядзіць наперад? Магчыма. А што, як усё гэта толькі мае здагадкі? Але якія ж здагадкі? Факты! І зараз, калі поспех упраўлення атрымаў такое гучанне, Віктар замацуе

яго — выступіць на пленуме. Ён будзе рабіць усё, каб гаворка пра наш участак не сціхала, а пазней, калі мы раптам і ўдумаем нешта гаварыць супраць, паспрабуем пайсці наўпярок яго ўказанням, ён жа нас першымі і абвінаваціць: самі ж, маўляў, выступалі па радыё, пахваляліся сваімі поспехамі. Дык чаго ж вы цяпераказ? Назад павярнуць? Не, назад дарогі няма...

Магчыма, у чымсьці я памыляюся. Аднак у адным, вядома, Віктар сказаў праўду: дарогі назад няма. І мне. І Крыштопу. Зрэшты, мы і не будзем шукаць такую дарогу. Мы рабілі тое, што лічылі правільным, і ніякай павароткі нікуды не зробім, што б нас ні чакала наперадзе. Але ўсё жыццё гэта — будучыня. А блізка тое, што ёсць: я не вельмі і пазнюся дамоў, і мы паспеем з Валяй пайсці яшчэ на раку, і ўсё будзе так, як мы і планавалі.

Ля веснiц мяне ўжо чакаюць Валя з Ірынкаю. Сабраліся, апрануліся.

— Я званіла з аўтамата ва ўпраўленне,— гаворыць Валя.— Чакала, чакала, а потым падумала: пазваню. Мне і сказалі: нарада скончылася і ўсе разышліся. Вось цябе і пільнуем.

— А навошта, Ірынка, лялъку цягнеш?

— Яна купацца хоча. А ты будзеш купацца?

— Абавязкова. Толькі пераапрануся. Ідзіце, дaганю вас.

— Не, мы чакаем...

Яны чакаюць мяне ў завулку, і я, мігам пераапрануўшыся, вылятаю з хаты, і мы спяшаемся, але Ірынка не адстае, увесь час бяжыць наперадзе.

Завулак выводзіць нас на старое замчышча; праз галіны маладых каштанаў зіхаціць Дзвіна; драўляныя сходкі крутыя і вузкія, парэнчы на іх няроўныя і хісткія, і я бяру Ірынку на рукі.

Спыняемся на сваім звычайным месцы — зялёнай лапіне мурагу, што клінам уразаецца ў пясчаную касу; вастрыё гэтага кліну ўпіраецца ў шырокі плоскі граніт; камень толькі ў сухое і цёплае лета ўвесь навідавоку, а так звычайна адна бакавіна яго заўжды пад вадою; на ім мы пакідаем цяпер сваё адзенне і маленькі рукзачок з пярэстага брызенту — у ім ручнік, мыла, газетны згортак з яблыкамі.

Вада цёплая, мяккая. Па рацэ плывуць чаўны, дзве імклівыя байдаркі хутка абганяюць іх і знікаюць за паваротkай; на супрацьлеглым беразе спяваюць дзяўчаты, але

песня слабая, ціхая, нібыта стомленая; заціхае стрэкат маторкі, што панеслася ўпіз па плыні, а хвалі ад яе з шоргатам і плюскатам накатваюцца на пясчаную касу, і Ірынка палахліва ўцякае на бераг.

— Хопіць, Ірынка! Хопіць! — патрабуе Валя. Яна, паплаваўшы, першая вылазіць на бераг і бярэцца за ручнік.— Лёць, яна ж ссінела. І табе хопіць, вылазь!..

— Зараз! Толькі на добрую хвалю патраплю...

Далёка ўжо ад берага, але глыбокага месца няма — пад нагамі мяккі жвір; гонкая плынь адразу ж вымывае яго з-пад ступакоў і валіць мяне, цягне ўніз; а хвалі накатваюцца, мякка тукаюць у твар, і ўсё перад вачыма ў зіхатлівым вясёлкавым карагодзе.

Слаўна! Слаўна, мая ты Дзвіна!

Потым сядзім на мурожнай траве, цёплай, добра ўгрэтай удзень сонцам. Ірынка ходзіць непадалёк, вышуквае і збірае на пясчанай касе ракавінкі. Зіхаціць рака ў сонечных промнях, што скоса, бы зламаўшыся на верхавінах клёнаў, ападаюць на ваду.

— Заўтра мы з Іркаю —зноў сюды. А ты ўжо будзеш у Маскве,— кажу я, але гэтыя словы не выклікаюць у мяне ні трывогі, ні адчування блізкага расстання.

— Я ўжо, ведаеш, пакрысе падлічваю: калі назад паеду. Восень, потым снежань... А практыка зусім і кароткая. Астатні час — дыплом. І вось я думаю, а што, калі прыехаць сюды і працаваць тут над дыпломам?

— Тут будзем мы табе перашкаджаць. І розны клопат...

— А-аа! Не хочаш, каб прыязджала.

— Вядома. Засумаваў па халасцяцкім жыцці.

— Я табе ўжо лекі на гэты сум прыпасла.

— Ты назву запішы. Каб з галавы не вылецела. Надзейныя хоць лекі?

— Абсалютна. Цэлы шэраг канвертаў. І будзеш пісаць мне па два лісты на тыдзень. І аб усім падрабязна.

— Сапраўды, не засумуеш.

— Можаш і чатыры. Тады — надзейна. Ну, лекі табе па душы?

— На гэтае пытанне я не магу адказаць. Лекі тыя ў тваім чамадане.

— Ты што? Тыя канверты запакаваў?

— Увесь пачак!

— Во чалавек! І яму яшчэ па радыё дазваляюць выступаць.

— Ты ведаеш, шкадую: не паслухаў.

— Не хвалюйся: даволі, ведаеш, упушальна прагучала. Такое ўяўленне: нібыта і не ты зусім гаворыш... Але на прычалах у іх не так цікава атрымалася. У вас на ўчастку лепей.

— Безумоўна! Не абы-хто выступаў. А сам Леанід Бугрым!

— Так, асоба гістарычная. Але чаму гэтая асоба не паведаміла слухачам, што нядаўна атрымала вымову?

— Вымова — гэта адхіленне ад нормы. Яе нават у працоўную кніжку не запісваюць. А ты хочаш — па радыё!

— Пераканаўча. А цяпер расказвай пра нараду...

Валя слухае ўважліва, але глядзіць на Ірынку, якая ўсё вышуквае на касе ракавінкі, і мне ўвесь час здаецца, што яна занята зусім іншым клопатам і толькі робіць выгляд, што цікавіцца маім апавяданнем. Магчыма, і сапраўды словы мае абмінаюць яе і не хвалююць, бо сам я, расказваючы пра нараду, таксама думаю пра іншае, і тыя здагадкі, што нядаўна апанавалі мяне на аўтобусным прыпынку, зноў не даюць спакою. Мажліва, варта расказаць аб іх Валі? Але навошта? Толькі растрывожыш яе, будзе ўвесь час непакоіцца.

Адчуваю: нешта раблю не так як трэба, як рабіў дагэтуль — таямніц, недагаворанасці ў нас з Валяй не было,— і разумею, што гэта адзіна правільнае выйсце, што ніякае падрабязнае абмеркаванне маіх адносін і стаўлення да Віктара ўжо нічога не зменіць і, галоўнае, не можа змяніць...

— Слухай, што я хацела ў цябе папытаць. Вось вы збудуеце свой дом. А далей? Цябе перакінуць на іншы ўчастак?

Уражвае не само пытанне, хаця яно, праўда, і зусім нечаканае, а той сэнс, што хаваецца за ім: чаму Валю трывожыць будучыня. Я ж казаў ёй, што спачатку збудуем адзін, потым другі, трэці, чацвёрты, што буду працаваць на ўчастку доўга. А ў яе трывога. Значыцца, правільна раблю, што не кажу пра некаторыя падрабязнасці.

— А пераробкі толькі ў адным вашым? — зноў пытаецца яна.

І пра гэта я казаў ёй. І казаў пра тое, калі мы прыкладна пачнём весці другі наверх, і пра тое, што Віктар паедзе на абласную нараду і колькі там дзён ён будзе, і падрабязна казаў аб нашых планах з Крыштопам.

— А вы ўсё добра абдумалі? — У яе голасе цяпер ужо зусім выразна прабіваецца трывога.

— А ты, здаецца, думаеш, што не?

— Не, не думаю. Але, магчыма, існуе і яшчэ нейкае выйсце...

— Магчыма. Але мы знайшлі абсалютна правільнае.

— Скажы, а чаму Лена перад ад'ездам не зайшла да нас? І не развіталася...

— Не ведаю...

Нават больш таго: я не ведаю дакладна, у які дзень яна паехала. Але дзівіць мяне не толькі нечаканая паварotка нашай гаворкі, але і асцярожнасць ранейшых Валiных пытанняў. «А вы ўсё добра абдумалі?..» Што тоіцца за гэтымі яе словамі пра нейкае іншае «выйсце»? Яна ж даўно пагадзілася: што рашэнне мы з Крыштопам прынялі правільнае. Навошта ж цяпер спрабуе шукаць невядома якое «выйсце»? Відаць, трывожыцца? І што яшчэ верагодней — баіцца. І таму сумняваецца ў нашым поспеху і асцярожна падказвае: не ўмешвайцеся, пакіньце ўсё ў спакоі.

Ірынка абышла ўсю касу, спынілася, нешта ўзяла і скоранька тупае да нас; кішэнька плацейка і прыгаршні поўныя ракавінак.

— Лялькам панясу. Яны ж на рэчку ісці не могуць.

— Правільна. Лялькам трэба ракавінак занесці,— кажу я, узнімаючы дачку на рукі.

Вяртаемся дамоў ранейшаю дарогаю. Адолеўшы драўляную лесвіцу на замчышчы, хвілінку адпачываем — лесвіца даволі доўгая; Ірынку я стаўлю на дол, і яна бяжыць па сцежцы.

Быццам нічога і не змянілася вакол. На Дзвіне па-ранейшаму тлумна; па гонкай плыні імчаць дзве чырвоныя байдаркі; схіліліся над вудамі хлапчукі; на чоўне, што сунецца пад тым берагам, нехта брэнькае на мандаліне і спявае, і мелодыя далятае здаля і зусім незнаёмая, а на сэрцы ўжо зусім не тое, што было крыху раней, калі ішлі мы да ракі. Наша гаворка пакінула след, і я, раздумваючы над Валінымі словамі, не магу даўмецца, чаму менавіта цяпер, у дзень ад'езду, яна папытала ў мяне пра тое, што магла папытаць і ўчора і пазаўчора — у любы дзень?

І адказ прыходзіць раптоўна — яна проста трывожыцца, збіраецца ехаць і баіцца, каб не здарылася са мною якая бяда,— і тады адразу ўвесь неспакой адлятае, і робіцца хораша на душы; я прыхінаю да сябе Валю і цалую.

— Ну, ну! Ты што? — Яна крутнулася, адхіляецца рэзка, нечакана.

— Нічога. Паправіў табе валасы.

— І не сорамна?

Голас яе не строгі, і я ведаю, што яна не крыўдуе, і бяру ў Валі руказак.

— О, чаму ён такі цяжкі?

— Ракавінкі. І каменьчыкаў яна панапіхвала... Ірачка! Асцярожней! Глядзі не зваліся!

— Не зваліцца. Дай чалавеку хоць крыху самастойнасці!

Ірынка бяжыць сцежкаю, што лягла па самым краі замчышча; не адказала на перасцярогу, не павярнулася нават, і бяжыць, і бяжыць сабе — свой клопат, свае трывогі, сваё жыццё.

— А я за цябе трывожуся. І за Ірку таксама,— гаворыць Валя. Я ўголас смяюся ад радасці, што не памыліўся: яна сапраўды ўвесь гэты час думала пра нас з Ірынкаю.

— Цяпер я разумею, чаму ледзь не распаўся патрыярхат: у мужчыны не было самастойнасці!

— Не самастойнасць мяне трывожыць. Будоўля гэтая твая...

— Стаўлю ўмову: да ад'езду — ніводнага слова пра яе... Слухай, а я так есці захацеў! Пасля купання яблыкам тым толькі раздражніўся. Што ў нас сёння на вячэру?

— Рыбу засмажыла.

— Э-э-э... Абяцаў жа шчупачка на дарогу злавіць!

— Няхай тоіі шчупачок падрасце.

— Адкуль жа рыба?

— Залеская. З возера. Паехала і злавіла. Нават Даніка пачаставала ўжо.

— А-аа... Дык гэта брат твой прыязджаў. Ён што, адразу і назад?

— Не. Яны ў «Сельгастэхніцы» машыны атрымліваюць. Увечары, казаў, зоіідзе. Можа, ужо і дома.

— Як бабуля там?

— Усё нас чакае. Шкада, што не паехалі.

— А хіба быў час?..

У засені пад каштанамі, якраз на сцежцы, хлопцы гуляюць у сцізорык, а побач сядзіць кудлаты руды сабака. Ірынка, спалохаўшыся, прыпынілася, чакае нас і, калі мы падыходзім, хапае нас за рукі. І ад таго, што яна ля нас, і я адчуваю маленькую далоньку ў сваёй руцэ, і бачу Ва-

ліп твар, які ўсё яшчэ нечым устрывожаны, расце і мацнее ва мне замілаванасць да Валі; здаецца, што Валя нікуды не паедзе, будзе побач і сёння, і заўтра, і ўвесь час далей, што мы як звычайна вяртаемся дамоў і нам не трэба ісці на вакзал ноччу...

— Такое адчуванне і ў мяне было,— гаворыць Валя.— Як ішлі сюды. А цяпер — не. Хочацца ехаць. Каб хутчэй вярнуцца...

— Ліст нашаму прафесару ты ўзяла?

— У чамадане. А мо лепей пашлеш па пошце?

— Ён жа чакае і будзе распытваць аб усім... І абавязкова пачастуе чаем з айвою.

— Я нічога таіць не буду!

— На тое і прашу! Гэтаму чалавеку я давяраю...

Сцежка губляецца па затравелым узмежку, і мы прыпыняемся і нейкі час глядзім на раку — не згаворваючыся, робім з Валяй гэта аднachасова; рака ля замчышча пацямнела крыху, па-ранейшаму зіхатлівая толькі далёка на паваротцы, дзе падае на ваду водсвет сонца; па-ранейшаму павявае цёплы, амаль нячутны вецер. Валя прыжмурвае вочы і доўгім маўклівым позіркам акідвае раку — яна развітваецца з Дзвіною; я ўпэўнены, што яна хоча ўвабраць у сябе і водар каштанаў, і пах палыну, і гэты зіхатлівы бляск вады, і гэтую слабую вечаровую сінечу над вербалозамі, і далёкую гаману людзей, і цяпер ужо блізкую песню, што не плыве, а паволі насоўваецца з ракі на замчышча...

Такой мне снілася Дзвіна, калі я быў у Маскве. Такой, пэўна ж, будзе сніцца яна цяпер і Валі.

## 7

На завод жалезабетонных вырабаў прыехаў раніцаю. Прыехаў лаяцца і спрачацца. Прыехаў, як кажуць, «выбіваць» фасонныя пліты для балконных перакрыццяў, якія і дагэтуль не даставілі на наш участак. Але лаяцца няма з кім. Дырэктар некуды з'ехаў, а галоўны інжынер завода — чалавек тут зусім новы, працуе толькі тры дзень і нічога толкам не ведае. Адно параіў: «Чакайце дырэктара. Час ёсць — завод паглядзіце».

Магчыма, гэта не самая мудрая парада, але самае разумнае, відаць, было выкарыстаць яе. Я хаджу па заводскай тэрыторыі, блукаю, нібыта іду па нейкім казачным горадзе: перада мною паўсюль штабялі блокаў, пліт, апор-

ных слупоў, пад нагамі шахціць россып бетоннага друзу, звіняць кавалкі арматуры. Але фасонных пліт, па якія я сёння прыехаў, нідзе не відно. А яны нам патрэбны як паветра: заканчваецца кладка другога паверха, нам патрэбны пліты, бо калі сёння ці заўтра ў нас не будзе іх — зломіцца ўвесь графік, які мы так дэталёва распрацавалі з Крыштопам.

І раптам, зусім нечаканана, я бачу гэтыя пліты — вузкімі штабялямі яны ляжаць ля самага плота, у кутку, побач з дарогаю, што вядзе праз усю тэрыторыю завода і па якой я ўжо ішоў. Пліты засыпаны тоўстым пластом пылу, парабіліся ўсе чорныя, і, мабыць, таму я не адразу заўважыў іх. Непадалёк аўтакран вядзе пагрузку блокаў. Мужчына ў белым палатняным пінжаку падлічвае іх, робіць нейкія запісы ў блакноціку, і я, здагадаўшыся, што гэта, відаць, нейкае начальства, а тыя ўдвух, што працуюць ля крана, грузчыкі, імчу да яго.

— Вы начальнік склада? — выпальваю, падляцеўшы.

— Якога склада?

— Гэтага. Гатовых вырабаў.

— Не ведаю. Ёсць Яўген Суржан, які ўсёй пагрузкаю тут кіруе. Унь ля крана ён. Нізенькі...

Знаёмлюся з Суржанам і ўзрадавана трасу яго руку. Ён, паглядзеўшы мае дакументы, ставіцца прыхільна, разумее ўсё, што я яму кажу, і ахвотна тлумачыць, што гэтыя пліты былі заказаны яшчэ вясною, але нібыта заказчык ад іх адмовіўся і цяпер яны ляжаць без патрэбы. Хто рабіў заказ і хто павінен быў забраць яго — яму невядома. Але і адпусціць пліты без падпісанай накладной ён не мае права.

Суржан нешта спрабуе тлумачыць яшчэ, але я ўжо не слухаю яго і як апантаны кідаюся ў кантору. Дырэктар яшчэ не прыехаў, знік і галоўны інжынер. Сакратарка папраўляе рукою карычневыя кудзеркі над вухам і ўсміхаецца, і ў голасе гуллівыя ноткі. Ці ёсць дырэктар? Нядаўна званіў, загадаў інжынеру тэрмінова ехаць. Куды? Гэта невядома.

— А ён нічога не казаў дырэктару аб нашых плітах?

— Не ведаю. Абяцаў, што хутка вернецца.

— Хто? Інжынер ці дырэктар?

— Дырэктар.

— Я дакументы пакіну. Няхай падпіша, як прыедзе.

Абыякавы ківок галавою, незадаволены, пакрыўджаны позірк сініх вачэй у маляваным трысці вейў:

— Скажу яму...

Выбягаю з канторы раззлаваны, ведаючы, што шлях да сэрца сімпатычнай сакратаркі я не знайшоў; надкочвае тупы шал. Побач з ганкам — дарога, і па ёй, равучы маторам, сунецца машына з блокамі. Гэта ж каб я не блукаў па заводзе і пагутарыў з дырэктарам па тэлефоне, дык кацiў бы зараз на машыне. Але ж тады б я не знайшоў пліты. І галоўны інжынер не здагадаўся перагаварыць з дырэктарам — ведаў жа, што справа ў мяне пільная. Мог, зрэшты, сказаць сакратарцы, куды едзе і адкуль званіў дырэктар. А цяпер мне — чакаць. Ды не магу я тут бавіцца, бо даўно трэба быць на ўчастку. А мо проста не чакаць? Мо проста пайсці і загадаць, каб грузілі пліты і адпраўлялі?

Рашэнне не здаецца мне дзёрзкім. А што, як і сапраўды так зрабіць? Машын шмат. Пліты знойдзены. Дамовіцца з брыгадзірам, здаецца, можна...

Суржан слухае мяне няўважна, нешта вывучае ў сваім блакноціку, моршчыцца, тоўстым пальцам адцягвае ніжнюю губу, і яго чырвоны твар ад гэтага робіцца непрыветным і хмурым. А я ўсё вяду і вяду сваё, даводжу мэтазгоднасць пачынаць пагрузку зараз жа, і мне здаецца, што, калі я спынюся, ён абавязкова адмовіцца, і таму не даю Суржану нават слова ўставіць; зрэшты, ён злаўчыўся, перапыніў мяне:

— Ага... Зразумеў вас. Вы хочаце зараз іх і пагрузіць?

Ён працягвае пачак папярос, і я не адмаўляюся, і бяру папяросу, і нават не кажу, што кінуў курыць даўно, і зноў упрошваю яго неадкладна пачынаць пагрузку нашых пліт, упарта даводжу, што гэта, сапраўды, разумна: машыны ёсць, аўтакран побач, нават і пераганяць яго не трэба, толькі павярнуць у другі бок...

І Суржан нечакана саступае:

— А хіба пярэчу? Мне нават добра: куток вызваляецца. Мы дарогу тут пусцім, і не будуць машыны круціцца.

— І дакументы тым часам аформяцца. Дырэктар зараз вернецца і надпіша.

— Э-ээ, дакументы... Пакуль першы рэйс пойдзе — паспееце. Паколькі патрэбна...

Хмурны Суржанаў твар, з буйным, крыху не ў меру чырвоным носам, здаецца мне абаяльным, і я гатовы абняць гэтага чалавека, казаць яму самыя добрыя і ласка-

выя словы; нават крыху губляюся ад таго, што ўсё склалася гэтак хораша, пагаджаюся з кожным словам брыгадзіра, абяцаю паехаць з першай машынай, каб там, на ўчастку, арганізаваць хуткую разгрузку і не затрымліваць другі рэйс.

Потым я памагаю грузчыкам, падахвочваю шафёра, але з неспакоем пагдядаю на шырокую браму, за якой хаваецца пыльная, спаласаваная следнікамі дарога. Трэба было б падбегчы ў кантору, магчыма, дырэктар прыехаў. І баюся рабіць гэта. А што, як без мяне заявіцца хто-небудзь, пачне лаяць Суржана за перабольшванне сваіх паўнамоцтваў, і загадае скінуць пліты, і адашле машыны зусім у іншы рэйс?..

Спакой вяртаецца крыху пазней, у кабіне, калі пагрузка закончана і мы выязджаем з тэрыторыі завода. Ну, здаецца, абышлося! Разумею, што мы з Суржанам зрабілі правільна, але адчуваецца невядома перад кім вінаватасць, і, калі машына мінуе браму, прашу шафёра спыніцца на хвілінку.

— У кантору заскочыць трэба. Нарад падпішу.

— Ну, во! А чаго ж не афармляліся, пакуль пагрузка ішла? Цяперака гадзіну мне загараць тут!

— Ты цыгарэціну скурыць не паспееш. Я што буду рабіць? Увайду. Забяру. Выскачу.

— То паглядзім жа! — пагаджаецца шафёр і цягне з кішэні чырвоны пачак.

Сакратарка сядзіць на сваім ранейшым месцы. З дырэктарскага кабінета далятае густы незадаволены бас.

— Падпісаў? — пытаюся, кіўнуўшы галавою на адчыненыя дзверы.— А калі ж прыехаў? Я нават і не заўважыў. Падпісаў?

— Не ведаю. Я падала ўсё на подпіс.

— Дык ідзіце і забярыце.

— Нельга. Міжгародняя размова.

— Як яго па бацьку? Даруйце, запамятаў...

— Мікалаевіч. Віталь Мікалаевіч Сімін. Вы ж, відаць, і прозвішча не ведаеце.— Сакратарка глядзіць на мяне з дакорам, здзіўленая і пакрыўджаная не гэтым пытаннем, а ўвогуле маёй няўвагаю.

Стрымліваю сябе, усміхаюся нават.

— Дзякую. Цяперка буду ўжо ведаць...

Сімін — высокі, крыху грузны мужчына з вострым носам на хударлявым твары — ніколькі не дзівіцца, калі я ўлятаю ў кабінет, і, не адрываючы тэлефонную трубку ад

вуха, торкае алоўкам на крэсла, што стаіць напроціў стала.

У цэнтры стала ляжаць нейкія паперы, і сярод іх я бачу свае нарады, і Сімін, перахапіўшы мой позірк, прыкрывае далонёю трубку і ціха, але вельмі хутка пытаецца:

— Гэта вашыя?

Я сцвярджальна трасу галавой, наважваючыся расказаць пра тое, што мы знайшлі пліты і яны ўжо на машыне, застаецца толькі падпісаць нарад. Але ён, падграбаючы да сябе дакументы, на ўвесь голас крычыць у трубку:

— Зноў паўтараю: вывозьце неадкладна. Не зможаце? Напішыце мне паперу на тое... А я другому заказ аддам і выстаўляю на інкаса. І будзь здароў. Што? Нельга рабіць? Сам ведаю. А што ты зробіш на маім месцы? Падумай хвілінку, а я тым часам чалавека тут адпушчу...

Локцем рукі, у якой заціснута прыстаўленая да вуха тэлефонная трубка, Сімін прытрымлівае бланкі і, паклаўшы рэзалюцыю, мелькам праглядае нарады; раптам перастаў гартаць, чытае, і твар яго асвятляецца задаволенай усмешкаю.

— Ну, вось і знайшлося месца гэтым фасонкам. А мне Суржан спакою праз іх не дае — набіць грозіцца вашы пліты, бо яны там замінаюць яму.

— Ваш брыгадзір вельмі прыязна паставіўся. Усё арганізаваў, і вельмі хутка...

— Значыцца, спадабаліся вы яму. З ім гэта бывае...

Сімін гартае бланкі нарадаў, але не чытае іх, толькі праглядае і зноў усміхаецца.

— Сёння мне званілі з гарвыканкома. Цікавіліся: як выконваем заказы на ваш участак. Ці, можа, вы там скардзіліся на нас?

— Што вы! Я згодзен хоць сёння падзяку напісаць Суржану!

— Яму? Гарвыканкому пішыце!.. Што? Не, не. Гэта тут у мяне размова.— Сімін, спяшаючыся, гаворыць гэта ў тэлефонную трубку, працягвае мне накладныя, а потым энергічна паціскае руку.— Ну, поспехаў вам! — І зноў у трубку, нібыта закрэсліў мяне: — Слухаю... Ну як? Надумаў? Давай, давай... Па нарадачку...

Шафёр, які нават і не заглушыў матор, адразу ж, як толькі я адчыніў дзверцы кабіны, уключае хуткасць і паказвае мне цыгарэціну.

— І праўда: не паспеў дакурыць.

— А цяперка націскаем на ўсю жалезку. Так гаворыцца? Па вуліцы цішэй паедзем, а тут можна і пагнаць.

— Не дужа-ткі пагопіш на гэтых калдобінах.

Ніякіх калдобін не бачу наперадзе, пачынаю даводзіць гэта, і тут машыну кідае па бакі, і я ледзь не тыцкаюся носам у лабавое шкло.

Шафёр рагоча:

— А што, гладка! Вось каб начальства гарадское мне ў кабіну. Я б іх тут панавазіў — на кожнай калдобіне двойчы гайдануў бы.

— Тут жа, здаецца, была добрая дарога.

— Машыны магутныя — раскалашмацілі. Кажуць, з наступнага месяца завод пачне выраблянь спецыяльныя пліты дарогу насцілаць. Ёсць пад Бігосавам такая дарога. Яе перад вайною зрабілі, яна і цяперка, як стол, роўная: па ёй калгаснікі збожжа ўлетку сушаць. Не былі пад Бігосавам?

— Не даводзілася.

— А я з машынаю летась там на ўборцы працаваў. Э-ээх, слаўна было...

Ён змаўкае, вядзе машыну асцярожна, зухавата наклаўшы локаць левай рукі на адчыненае акно, курыць; дым ад цыгарэткі, як воблачка, прапосіцца перада мною. Твар шафёра адлюстраваны ў ветравым шкле: добрая ўсмешка то знікае, то зноў з'яўляецца на тонкіх губах, і вочы прыжмураныя, і ён быццам не заўважае нічога вакол сябе, апрача каляін, што кладуцца пад колы машыны, і глядзіць толькі на дарогу, але думае, вядома, не аб ёй — мабыць, вельмі ж прыемныя ў яго ўспаміны пра тое невядомае мне Бігосава...

Гэтак, моўчкі, мы ўязджаем у горад, і тут таксама нічога не гаворым, апрача таго, што двойчы я паказваю, куды трэба павярнуць, і толькі на ўчастку, заглушыўшы матор, шафёр, быццам пра нешта ўспомніўшы, пытаецца:

— На другі рэйс вы таксама паедзеце?

— Зараз разгрузімся. І тады будзе відно.

— Навошта вам трэсціся? Заставайцеся,— прапанаваў шафёр, і адчуваецца, што ён па-ранейшаму не можа адарвацца ад плыні прыемных успамінаў і думае зусім не аб другім рэйсе па завод, а пра тое, што прыгадалася з паездкі ў Бігосава.

Рогач ужо чакае мяне, падбягае адразу ж, як толькі я вылажу з кабіны, і робіць знак рукою — кліча адысці надалей ад машыны,— і, устрывожаны, я іду следам за ім, і ён паведамляе мне таямніча:

— Арубка прыкаціў. Ходзіць, віжуе ўсё...

— Што яму спатрэбілася?

— Пацікавіўся, ці першы гэта ўчастак. Потым увесь другі паверх аблазіў. А цяперка нейкай вымярае і нешта ўсё на паперу піша.

— Дык трэба было папытаць, што яму тут трэба?

— А як? Начальства! Але, думаю, нейкая ж мэта ў яго ёсць... А-а... Вось і ён бяжыць. Ну, я па разгрузку...

Арубка, дырэктар гаркамунгаса, маленькі і ўвішны, ён не ідзе, а нібыта коціцца па зямлі. Ведаю яго, праўда, блізка мы з ім сустракаліся мала. Але цяпер, калі я гляджу, як ён лёгка пераскоквае каляіны, мяне зусім нечакана весяліць думка, што перада мною першы будучы жыхар гэтага другога паверха.

Арубка выцірае насоўкаю пачырванелы ад хуткай хады твар і вітаецца. Потым, нічога не папытаўшы, паведамляе, што цікавіцца будоўляю і тое-сёе паспеў агледзець.

— Падабаецца? — пытаюся і чамусьці адразу ж пераконваюся ў правільнасці свае здагадкі.— Нічога ў нас тэмпы?

— Тэмпы высокія. Я быў тут на тым тыдні, а цяпер, зірнуўшы, нават здзівіўся. У вас жа тады толькі падмурак завяршаўся. План дома ў вас пад рукамі?

Рогач не паспеў яшчэ далёка адысціся, і я гукаю яму ўслед, каб ён даў нам праект. Гукаю і дзіўлюся з таго, што пачуў. «Я быў тут на тым тыдні». Чаго ж мы не бачылі яго? Ці, магчыма, Арубка прыходзіў, калі мяне не было, ці ўвогуле пасля заканчэння работ?

— Праект у прарабцы, Леанід Яўгенавіч. Прынесці? — голасна пытаецца Рогач.

— Не трэба! — адказвае за мяне Арубка.— Не трэба. Мы самі туды зоідзем!..

Праект ляжыць у прарабцы на стале. Арубка пачынае разглядаць яго і робіць выгляд, што паглыбіўся ў вывучэнне. Але па тым, як хутка зыркаюць яго вялікія вочы з аднаго ў другі кут аркуша, як падціскаюцца тоўстыя губы, адразу ж прыкметна, што ў праекце ён не можа разабрацца; мезенцам левай рукі Арубка шкрабае мясісты, з гарбінкаю, нос, пытае з робленай абыякавасцю, але не можа ўтаіць заклапочанасці:

— А дзе тут дваццаць першая кватэра?

Я паказваю, і ён, зазірнуўшы ў свой блакноцік, густа, але няроўна, плямамі неяк, чырванее.

— Але ж вы будуеце яе, адступаючы ад праекта!

Я вымяраў вышыню. Яна заніжана на трыццаць сантыметраў.

— Магчыма. Дапушчана, магчыма, памылка.

— Дык яе ж трэба выпраўляць! Выпраўляць, пакуль не настаўлены трэці паверх!

У нейкае імгненне мне прыгадваецца і наша гаворка з Крыштопам у садзе, і спрэчка з Віктарам, і трывога Валі. І я цяпер ведаю, што дваццаць першая кватэра прызначана Арубку, і гляджу на яго з жалем і крыўдай.

— На тое ў мяне няма паўнамоцтваў. Ды, уласна кажучы, я не ведаю, хто зрабіў тую памылку. Мы будуем у адпаведнасці вось з гэтым праектам. Без адхіленняў... І, даруйце, чаго вас так хвалюе тая кватэра? Чаго вы толькі цікавіцеся дваццаць першай?

— Мяне цікавіць увесь паверх!

— А чаму не ўсе паверхі?

Ён, адчуўшы іронію, загортвае блакноцік і, хаваючы яго ў кішэню, зыркае строга, нядобра.

— А чаму вы дазваляеце сабе гэта, таварыш Бугрым? Гэта для вас можа не вельмі добра скончыцца...

— Не думаю!

— А варта было б! — Ён грозіць мне пальцам.— Варта думаць! І, пакуль не позна, кіньце свае жартачкі!..

А мне робіцца смешна. Смешна з таго, як ён трасе перад маім тварам пальцам, як намагаецца і ніяк не можа ўтаймаваць сваю злосць, і я, знарок вельмі ветліва і стрымана, кажу:

— Дазвольце вам параіць...

— Параіць? — запытвае ён падазрона і тут жа дадае мякка і дабрадушна: — А што вы такое хочаце параіць?

— Ніколі не крычыце на людзей, калі ласка. Нават у сваім кабінеце.

Зноў няроўныя плямы чырвані фарбуюць яго шчокі і шыю.

— Гэта вам так не пройдзе. Абяцаю: не пройдзе!

Пагроза і абурае мяне і смешыць. Але я, акуратна складваючы праект у папку, не смяюся адкрыта, а з горыччу думаю пра Віктара. З кім ён звязаўся! Перад кім выслужваецца! Брыдота нейкая...

Разам з тым імкліва расце адчуванне, што мне трэба нешта сказаць, што буду памылкаю, калі я толькі выслухаю яго і нічога не адкажу на тую пагрозу.

— І ніколі не спрабуйце запалохваць людзей,— кажу тое, што прыходзіць адразу, кажу, бо не маю часу

абдумаць колкі і ёмкі адказ.— Гэта непрыстойна. І ніколі не спрабуйце прымусіць мяне будаваць вам асабістую кватэру. Гэта ў вас не атрымаецца...

Ён па міг сумеўся, але тут жа страпянуўся: тоўстыя губы яго трасуцца ад шалу.

— Мой клопат не толькі пра нейкую адну кватэру. Мяне трывожыць лёс усяго паверха, усяго дома. І я, як член жыллёвай камісіі гарадскога Савета, мушу вам сказаць, што не разумею ні вашых дзеянняў, ні вашых тлумачэнняў. І абяцаю: гэтым пытаннем мы зоймемся.

— У добры час!

— Што? — Ён вызвяраецца на мяне.

— У добры час, кажу...

Арубка прыжмурвае вочы, пакутліва, бы ад болю, моршчыцца, ніецца выпаліць нешта абразлівае, крыўднае, але потым перасільвае сябе, моўчкі крута адварочваецца і шыбуе-коціцца на дарогу; па дарозе грукоча машына, якая ўжо разгрузілася і выязджае з участка, і ён, спыніўшы яе, садзіцца ў кабіну.

З-за зялёных шатаў дрэў, ад дарогі, вецер гоніць жоўты пыл, і ён, радзеючы, асядае, плыве вакол мяне, як дым, і трашчыць на зубах. Усё ва мне напінаецца, я сціскаю кулакі, але не лаю сябе за тое, што гэтак стрымана размаўляў з Арубкам. Крыўдныя і гарачыя словы мне трэба берагчы, яны яшчэ прыдадуцца нам з Крыштопам, і іх, напэўна, спатрэбіцца шмат. Візіт Арубкі — гэта толькі пачатак, галоўнае, безумоўна, пачнецца на будучым тыдні, калі прыедзе Віктар. Але ён, відаць, затрымаецца. Нарада скончыцца ў пятніцу, а там, у абласным цэнтры, цяпер на гастролях тэатр, дзе працуе Лена. Наўрад ці наедзе Віктар у пятніцу. Мабыць, нам варта разлічваць на сустрэчу з ім у панядзелак. А панядзелак, як гавораць, дзень нешчаслівы — трэба рыхтавацца як след. І не толькі да гаворкі з Віктарам. Акрамя дваццаць першай ёсць яшчэ кватэры на другім паверсе. Будучыя гаспадары, трэба спадзявацца, прыляцяць таксама. Гэты член жыллёвай камісіі выканкома толькі першая ластаўка...

Выходжу з прарабкі і бачу Крыштопа. Ён стаіць з Рогачам ля складзеных у роўны штабель фасонных пліт, нешта гаворыць яму і паказвае рукою на кран; твар у Крыштопа стомлены і хмурны.

— Ну, як пліты? — пытаюся, быццам і не бачу, што ён чымсь незадаволены.— Зараз будзе яшчэ адзін рэйс. Так што мы з Рогачам заслугоўваем узнагароды...

— Хутка атрымаецё.

— Па ордэну кожны. А?

Ён ці недачуў мяне, ці гэтак стаміўся ў горадзе, што не хоча нават і падтрымаць жарт; па-ранейшаму хмурыцца, поркаецца ў кішэні пінжака, выцягвае адтуль вузкі папяровы абрэзак.

— Спачатку ты гэта вывучы,— раіць ён, і я бачу, як торгаюцца яго бялявыя, выцвілыя на летнім сонцы бровы.— Пра ордэны і думаць кінеш...

— А што тут?

— На тое і даю, каб ведаў. Уголас чытай. Паслухаем цудоўную сімфонію гукаў і імёнаў...

На аркушы ў слупок напісаны прозвішчы, і супраць кожнага пастаўлена пэўная лічба. Не адразу магу даўмецца, што тут да чаго, але на вочы трапляе знаёмае прозвішча. Арубка? Насупраць лічба — 21. І адразу ж, як нейкае прасвятленне, здагадка: гэта ж спіс жыхароў другога паверха.

А лічбы — нумары кватэр. Ай ды Крыштоп! Ай ды малайчына! Але ж дзе ён выдраў гэты кандуіт?

Хітраватая ўсмешка зганяе хмурнасць з твару Крыштопа.

— Э-ээ... Не! Пакуль што не скажу. І не таму, што не давяраю. Слова даў: нікому не казаць. Так што прабач... Але спіс дакладны. Магу даць і каментарый да імяністых грамадзян... Свяцін — сакратар гарвыканкома. Пухаў — цесць Свяціна. Працуе на піўзаводзе. Замба — сястра Свяціна, прадаўшчыца крамы № 15. Каняхаў — зяць Арубкі, працуе загадчыкам склада на аўтабазе...

Не вытрымліваю, перапыняю Крыштопа:

— Дык чаго ж нам мудрагеліць? У гарком! У гарком адправіць гэты спіс. Там разбяруцца!

Крыштоп адхіляе маю руку і хавае паперу ў кішэню.

— Спакойна. І яшчэ раз спакойна!..

А мне ўжо не хочацца спакою. Трэба неадкладна дзейнічаць. Актыўна. Рашуча. Цяпер, калі ў нашых руках гэты спіс, не варта марудзіць. І трэба без прамаруджання зрабіць тое, што я кажу Крыштопу: адправіць спіс у гарком. Там разбяруцца.

— А ніхто і не будзе разбірацца. Чаму? Па той простай прычыне, што кандуіт гэты нідзе не існуе афіцыйна. Людзі, якія тут выпісаны, сапраўды маюць патрэбу ў жыллі: адны — большую, другія — меншую. І ўсе яны

сапраўды стаяць на чарзе: адны — бліжэй, другія — далей. Так што юрыдычна ўсё правільна...

Упершыню за ўвесь час нашага знаёмства я не магу пагадзіцца з Крыштопам. Правільна? Ну не. У чымсьці не зусім разумею яго, не магу даўмецца, што ён намысліў, пытаюся пра тое, а ён пазірае на мяне са спагадаю, нібыта на вучня, якому павінна быць сорамна за непісьменнасць.

— Патрэбны доказы. Толькі доказы, якіх, на жаль, ёсць пакуль што мала. Прыходзіў Арубка і сам пацвердзіў: ягоная кватэра дваццаць першая, і яна павінна быць лепшая, чым астатнія. Гэта факт неаспрэчны!..

— А праект? А загад Віктара? Хіба гэта не доказы?

— Слабыя,— безапеляцыйна сцвярджае Крыштоп.— Віктар лёгка прыкінецца: не зусім, маўляў, разабраўся. Загад? А ў ім жа не сказана, што другі паверх — кватэры для выбраннікаў. Пакуль што ў нас ёсць толькі адно пацвярджэнне. Павінны быць і астатнія.

Так, у чымсь ён мае рацыю, мой мудры і добры Крыштоп. Але ў чымсь ён, мабыць, не зусім давярае мне. Можа, нават гэта не тое слова, магчыма, проста не спадзяецца, што я змагу быць мужным да канца. Але ж гэта не так! Ён першы прыйшоў да мяне са сваім праектам, і я быў першы, з кім ён дзяліўся сваімі планамі, і гэта ж разам — ён і я — павярнулі мы супраць небяспечнай плыні. Першая хваля ўжо ўдарыла — Арубка. Але гэта слабая хваля. А калі пакоцяць на нас адна за адною? Дык што ж ён раіць? Проста чакаць іх у бяздзейнасці?

— Чаму ў бяздзейнасці? — Яго дзівяць мае пытанні.— Мы павінны весці да заканчэння тое, што пачалі. Але і перціся на злом галавы не трэба, калі ты хочаш перамагчы.

— Значыцца, асцярожнасць?

— Абавязкова. І будаваць. Хутчэй будаваць...

Крыштопаў голас спакойны, упэўнены, настройвае на добрую, цвярозую развагу. Сапраўды, патрэбна асцярожнасць і вытрымка. Прыбег і крычаў Арубка? Няхай. Прыбягуць і будуць крычаць другія? Няхай. Нам патрэбны факты. Але галоўнае не ў гэтым, а тое, што мы будуем. І зусім няважна, хто і на якім паверсе будзе жыць: на кожным з іх павінна быць усё добра. І галоўны наш клопат — збудаваць новы дом, такі, каб людзі, якія будуць жыць у ім, успаміналі будаўнікоў толькі добрым словам.

8

Вечар ужо, і я сяджу ў садзе, і пішу ліст да Валі, і спяшаюся, каб напісаць усё да цёмнага: як сцямнее, трэба будзе збіраць бартулёў — заўтра мы з суседскім хлопцам пойдзем на Дзвіну рыбаліць. Пазаўчора мы ставілі шнуры, і нам пашчасціла — злавілі трохі добрых самоў.

Сцежкаю ад тэрасы прыбягае Ірынка.

— Ты не спіш? — спытала і глядзіць на мяне, нечага чакае.

— Гэта не я, а ты павінна спаць ужо.

— Бабуля дазволіла яшчэ пагуляць. І мне спаць не хочацца.

— Трэба так і гаварыць, што не хочацца. А на бабулю не спасылацца.

З адчыненага акна — голас Валінай маці: нават не прыкмеціў, калі яна там з'явілася.

— Няхай пагуляе, няхай пагуляе. Пакуль светла, яна ўсё роўна спаць не будзе...

— Але ж мы дамаўляліся з Ірынкаю расклад прытрымлівацца.

— А во той расклад! Паспее па раскладу жыць, як падрасце. А татку чаго перашкаджаеш! Адыдзі!..

Такія гаворкі ў нас узнікаюць часта: я спрабую адстойваць свае погляды на выхаванне Ірынкі, але яны ўшчэнт разбіваюцца аб спакойную ўпартасць цешчы. Нешта падобнае на рэўнасць з'яўляецца часам у мяне, але я разумею не толькі беспадстаўнасць гэтага пачуцця, але і слабасць свае пазіцыі: дзіцячы сад рамантуецца, Ірынка цэлы дзень пад наглядам Валіных бацькоў, і мне з сваімі парадамі, якія я магу даваць малой толькі раніцаю і ўвечары, разлічваць на вялікі аўтарытэт не выпадае. І самае смешнае тое, што гэтае падобнае на рэўнасць пачуццё жыве ва мне побач з вялікай павагаю і прызнальнасцю да бацькоў. Каб не яны, наўрад ці вучылася б цяпер Валя, ды і ўвогуле зусім інакш павярнулася б яе студэнцкае жыццё. Але такія думкі — рэдкія госці, бо яны тычацца мінулага, таго, што прайшло, а перада мною ўвесь час іншыя факты, і я адчуваю, як пакрысе расплываецца мая ўлада над дачкою.

Ніколі ні слова не кажу пра гэта ў сваіх лістах да Валі. Яна піша мне часта, але мала, і ўсё пра адно і тое ж: шмат, маўляў, трэба чытаць кніг па праграме, вельмі хочацца прыехаць дамоў, а дні бягуць вельмі марудна, і яна

пачынае трывожыцца, таму што я мала зусім расказваю ёй пра будоўлю.

А я раблю гэта свядома. Праўда, кожны раз думаю напісаць паболей, але спачатку напішаш пра справы хатнія, Ірынку, розныя клопаты, а на будоўлю застаецца і часу мала і месца. Вось і цяпер малая прыбегла, я пагаварыў з ёю і пішу Валі, што сяджу зараз у садку, а Ірынка панеслася на вуліцу, і я чую яе голас, што яна адчувае сябе добра, што спіць ноччу не прасынаючыся, а ўзнімаецца позна і мы бачымся толькі па вечарах і што ўвечары яна мала гуляе са мною — свае клопаты ў малой, свае ўжо сяброўкі, свае гульні.

Пішу аб усім падрабязна, бо ведаю, што Валі чытаць тое цікава і прыемна. Пішу і адчуваю, што за гэтай падрабязнасцю гаворкі пра хатнія справы я спрабую схаваць іншыя пачуцці — трывогу, наш будаўнічы клопат. І дзіўная рэч: варта мне падумаць пра тое, што робіцца ў нас на ўчастку, і я ўжо не магу пісаць так хутка і лёгка, сяджу, узважваю, падбіраю патрэбныя выразы, баючыся, каб неасцярожнае якое слова не ўстрывожыла Валю.

А на ўчастку ў нас, між іншым, насняваюць, як мне думаецца, падзеі даволі значныя. Не ведаю дакладна, калі грымне навальніца, але бачу, што хмары злавесна гусцеюць: у нашых адносінах з Віктарам няма ніякай, нават самай маленькай прасветліны.

Віктар прыехаў з нарады ў панядзелак, але мы ўбачыліся толькі ў сераду. Пазваніў ён пасля абеду, пацікавіўся тым, як ідуць справы, што новага зрабілі, а потым папытаў, колькі яшчэ часу буду на ўчастку. Я сказаў, што нікуды не збіраюся ехаць, і тады ён паведаміў, што будзе на ўчастку гадзіны праз паўтары і каб я чакаў яго.

Віктар, аднак, прыехаў раней, нешта якія паўгадзіны спагадзя, і па ягонаму хмурнаму твару я зразумеў, што аб усіх нашых справах ён ведае значна больш за тое, аб чым мы размаўлялі з ім па тэлефоне.

На будоўлі за апошнія дні пабылі і Пухаў, і Каняхаў, і Замба. Але ўсіх іх бачыў не я, а Крыштоп. А сёння раніцаю я сустрэў Свеціна. Ён абгледзеў будоўлю дэталёва: спачатку хадзіў з Рогачам, потым гутарыў са мною, але размаўляў дабрадушна, распытваў, як забяспечвае нас завод жалезабетонных вырабаў і растворны вузел. Потым, калі Свецін паехаў, я пацікавіўся, якая гаворка была ў яго з Рогачам. Аказваецца, толькі аб канкрэтных справах — каб табе якая заўвага пра што іншае. Але пазней, калі

названіў Віктар, я здагадаўся, што Свеціп быў у галоўнага інжынера. Не ведаю, на падставе чаго, але такі вывад я зрабіў.

Віктар павітаўся, прыехаўшы, хмурна і незадаволена і адразу ж папрасіў праект; глядзеў ён на яго мала і тут жа загадаў ісці з ім аглядаць аб'ект.

Спачатку мы зазірнулі на першы, потым дэталёва агледзелі другі і спыніліся на трэцім паверсе. Віктар нічога не гаварыў, толькі часта заглядваў у праект, я адчуваў набліжэнне бурнай размовы, але ніякіх заходаў не рабіў, каб яе наслабіць. Чакаў. Потым мы сышлі ўніз, выйшлі з пад'езда і сталі ля слупа, на якім прымацаваны чорны шчыток з рубільнікам.

— Значыцца, з'явіліся і лоджыі,— сказаў Віктар, пазіраючы на аздобленыя пліткаю прасценкі над балконамі.— Яны што, былі ў праекце?

— У пазнейшым не былі, іх пазнімалі. Былі ў першым. А яго мы і паклалі ў аснову.

— А хто вам даў права на гэта? Хто? Вы што, уласны дом сабе будуеце?

У Віктаравым голасе загучала водгулле навальніцы, якой я чакаў, і таму адразу прыняў рашэнне не спрачацца пакуль што з ім, быць асцярожным і цярплівым, паспрабаваць разабрацца да канца, што Віктар ведае, а чаго не ведае, што замысліў рабіць. Я толькі сказаў, што пакладзены ў аснову першы праект, як найбольш разумны, і чакаў.

А як ён глядзеў на мяне! Насупленыя бровы ўздрыгвалі, падціснутыя губы скрывіліся, і нос ад гэтага нібыта ссунуўся ўбок, і ўвесь твар як бы падзяліўся на дзве няроўныя часткі, і кожная з іх жыла сваім самастойным жыццём: нерухомымі заставаліся толькі вочы — здавалася, яны зроблены з кавалкаў лёду.

— Найбольш разумны? — перапытаў Віктар.

— Безумоўна,— сказаў я. Рашэнне пацвердзіць гэтую думку, каб ён ведаў, што я не памыліўся, выспела нечакана.— І мы кіраваліся дзяржаўнымі меркаваннямі...

— А якія тады меркаванні ў мяне?

Пытанне было хуткае. Можна было, вядома, адказаць на яго, але я прыгадаў парады Крыштопа і надаў свайму твару выгляд поўнай неўсвядомленасці. Мне думалася, што Віктар пачне настойваць на тым, каб я даў тлумачэнні зараз жа, але ён змоўчаў, нічога не папытаў болей, а толькі зноў пачаў варушыць праект, бы вывучаў яго;

гэта цяглося не вельмі доўга, але я чакаў ад Віктара нейкага пярэчання, і маўкліваe чаканне здалося бясконцым.

— А лоджыі ўпрыгожваюць фасад,— нечакана сказаў Віктар, і мне здалося, што нешта я недачуў.— Будынак будзе добра глядзецца ад ракі. Я памятаю, як тады спрачаліся ў вобласці, калі абмяркоўвалі праект. Крыштоп бунтарыў. Пазнаю яго і тут. Штукар!

— За тое, што зроблена, я буду несці адказнасць разам з ім.

— Адказнасць? Як да таго дойдзе, дык хопіць усім. У першую чаргу мне.

— Спашліцеся на нас.

— На каго гэта «нас»?

— Старшага прараба і архітэктара.

— Во, во... На іх толькі і спасылацца.

Ён грэбліва махнуў рукою, працягнуў мне згорнуты праект і зноў зрабіўся маўклівы, і твар яго быў хмурны. Віктар пазіраў на дом, але цяжка было зразумець, ці то ён уважна вывучае, як пакладзены блокі, ці проста глядзіць так, ні аб чым не думаючы; але разам з тым прыкмячалася, што нешта яму спадабалася тут, што гнеў крыху аціх і нейкія змены ўжо адбыліся ў Віктаравым настроі, і, мабыць, у лепшы для мяне бок.

І калі я заўважыў усё гэта, дык зноў падумаў: што там ні кажы, а Віктар здольны інжынер. І таму ён, відаць, адразу ж зразумеў, што праўда на баку Крыштопа, што невялічкія змены ў праекце мяняюць вонкавы выгляд будынка, робяць яго зусім непадобным на іншыя.

— А чаму б і не спаслацца? — папытаў я і зноў чакаў.

Пытаўся я, вядома, не пра нешта абстрактнае, а рабіў гэтым сваім пытаннем зусім канкрэтную прапанову добрага міру і згоды. Мы з Крыштопам узялі на сябе ўсю адказнасць. У Віктара, такім чынам, ёсць добрае выйсце: абараняць не нас, а адстойваць нашу агульную справу. Калі ён сапраўды разумны інжынер, хіба ж не ягоны святы абавязак змагацца супраць шэрасці, супраць аднабаковага падыходу ў вырашэнні будаўнічых праблем? Кожны, хто зірне на фасад нашага будынка, які яшчэ не зусім высока ўзняўся над катлаванам, прызнае: ёсць у ім нешта арыгінальнае, нешта не такое, як у іншых кварталах. І хіба нават толькі гэта адно ўжо не ёсць станоўчае? І хіба мы павінны арыентавацца на нейкую суб'ектыўную думку, на нейкі суб'ектыўны погляд? Ёсць адзін разумны крытэрый нашай працы — эканамічнасць і мэтазгоднасць...

Віктар скіраваў позірк на неба, усміхнуўся нейкім сваім думкам і сказаў зусім не тое, чаго я чакаў:

— Мэтазгоднасць? Вось аб ёй і думаю зараз... І ніяк не магу даравáць сабе, што не надумаў аб мэтазгоднасці, калі біўся за тое, каб менавіта Бугрым быў пастаўлены кіраваць гэтым участкам. Няхай бы ён у іншым месцы займаўся сваімі эксперыментамі... І вось цяпер я думаю не толькі аб мэтазгоднасці, але і пра тое, што разам з вамі ў нас ніяк не складваецца праца: і раней так было, і цяпер, і далей, відаць... І не магу ўцяміць: памыляецца чалавек ці робіць знарок? Калі знарок, дык навошта? У імя якой мэты?

— У мяне мэта адзіная: будаваць. І я хачу, каб усё тое, што я будую, было збудавана добра і прыгожа...

— А Зубок не хоча гэтага! Толькі ён, гэты Зубок, імкнецца ўсяляк затрымліваць будаўніцтва, нейкі новы вораг свайго народа... Так?

Ён пярэчыў мне разважліва, нават з нейкім роздумам, але апошняе слова выгукнуў рэзка, і пытанне ў гэтым слове прагучала як удар, як патрабаванне адказаць зараз жа, неадкладна. І гэтая неспадзяваная дзіўная метамарфоза з Віктарам мяне абяззброіла. Я не ведаў, што адказаць, і моўчкі глядзеў на Віктара.

Ён уздыхнуў, нахіліў крыху галаў; ягоны позірк слізгануў па маім твары, і я ўбачыў у Віктаравых вачах прытоеную злосць і, убачыўшы, зразумеў, што галоўная гаворка яшчэ не адбылася і не адбудзецца сёння, што Віктар не схацеў распальваць і абвастраць нашы адносіны, стрымаўся, але нічога не адкінуў, стаў яшчэ больш зацяты ў сваёй крыўдзе і непрыязнасці; я зразумеў гэта, і мне зрабілася прыкра.

— Маўчым? — спытаў Віктар мякчэй.— І што адкажаш, калі аб'ектыўна атрымліваецца менавіта так. А я з гэтым не магу пагадзіцца.— На яго твары з'явілася ўсмешка, якая нічога не магла больш ні вытлумачыць, ні дадаць да таго, што я ўбачыў і што зразумеў.— Відаць, давядзецца мне часцей сюды наязджаць...

— А хіба гэта не ваш абавязак?

— Вось і буду яго выконваць, пастараюся штодня заглядваць, каб менш страчаць розныя «падарункі». А то ў вас тыдзень які не пабудзеш, дык потым за месяц не зразумееш, што да чаго і адкуль узялося... І яшчэ вы памыляецеся, калі думаеце, што толькі вы з Крыштопам здоль-

ны вырашыць усё правільна, што толькі ваша думка нешта вызначае ў руху краіны наперад...

— Такімі вялікімі катэгорыямі мы не мыслілі. У нас клопат меншы — толькі наш дом!

— Вось ім і будзем займацца. Плітку для абліцоўкі прывезлі? Як не прывозілі? Заўтра ж сам прасачу...

Назаўтра ж апаўдні плітку сапраўды даставілі, і цяпер яна ляжыць на часовым складзе, што збудаваны непадалёк ад нашай прарабкі. Стрымаў Віктар і другое сваё абяцанне: штодзень па якую гадзіну прыходзіць да нас, аглядае тое, што зроблена, прыдзірліва сочыць за ўсім. І я заўважаю: некаторым хлопцам з брыгады Кізілы ён па душы. Віктар іх ніколі не падганяе, абавязкова пачастуе папяросамі, пажартуе, пляце розныя байкі і сам ахвотна слухае другіх. Не ведаю чаму, але гэтае частае гасцяванне яго ў брыгадзе Кізілы не па душы мне. Магчыма, нейкая рэўнасць абудзілася — не ведаю, але як толькі ўбачу, што Віктар сядзіць там, пачую вясёлы рогат, у мяне адразу прападае ахвота пайсці да іх, слухаць і прымаць удзел у іхніх гаворках; калі Віктар там, я знаходжу сабе занятак альбо ў прарабцы, альбо ля крана...

Зараз я пішу пра ўсё гэта Валі. Праўда, не зусім падрабязна, апускаючы некаторыя дэталі, абмінаючы вастрыню ў гаворках і спрэчках з Віктарам. Паведамляю проста некаторыя факты, прычым імкнуся пісаць так, каб яны выглядалі крыху і смешна, у добрым святле, каб нічым не ўстрывожылі.

Другая частка пісьма пра дачку. Між іншым, Ірынка вельмі хутка забылася на тое, што маці паехала: у яе хапае і свайго клопату, і цацак, і толькі малавата часу, і вельмі не хочацца класціся спаць рана. Учора з Ірынкаю і дзедам мы хадзілі на раку ўвечары, былі на той касе, дзе ляжыць плоскі граніт; Дзвіна крыху разлілася пасля дажджу, і вада цяпер ля самага каменя, і Ірынцы не давялося пазбіраць ракавінак...

Ля веснiц гучыць радасны вокліч Ірынкі: «Дзеду! Дзеду!» Значыцца, Валін бацька вярнуўся. Зараз ён прыйдзе сюды, і мы з ім будзем гуляць у шашкі і гаманіць пра ўсё патроху.

Пішу адрас на канверце, і якраз падыходзіць цесць, садзіцца побач. Але не цягне з-пад стала шашкі і гуляць не прапаноўвае.

— Што там Ірынка? — пытаюся я і хаваю ручку ў кішэню.— На вуліцы?

— Лётае. Маці пайшла заганяць яе дамоў. А ты ліст строчыш?

— Нешта мала яна піша.

— Чаму? На тым жа тыдні было пісьмо. Ды цяпер і часу ёй малавата...

— Часу малавата, калі не хочаш, каб ён быў...

Слухаю, але тое, што ён, як звычайна, не прапанаваў партыю ў шашкі і цяпер гаворыць хмурна, незадаволена, мяне непакоіць; адчуваю, што ён чымсь устрывожаны, заклапочаны, і губляюся ў здагадках.

На адчыненым акне варушыцца фіранка, нас клічуць вячэраць.

— Зараз, зараз! Адну хвілінку,— абяцае стары, потым, крыху счакаўшы, узнімаецца, нечага ўздыхае: — Ну дык што будзем рабіць?

— Як што? Загадана вячэраць.

— Во як ты навучыўся выконваць загады!

— Прыемныя загады прыемна і выконваць.

— Ну хіба што...

Нешта ён недагаварвае. Але што? Аднак у час вячэры мне не ўдаецца нічога ні высветліць, ні зразумець: цесць вячэрае, як звычайна, моўчкі, але хутка і потым, калі я іду і саджуся за столік, дзе мы гуляем у шашкі, ён застаецца на тэрасе, і гэта зусім пераконвае мяне, што я не памыліўся — нечым ён устрывожаны.

Пакрысе ў садзе цямнее: я сяджу за столікам, наладжваю кішэнны ліхтарык; думаю пра цесця, пра Валю і думаю яшчэ, што заўтра нам, мабыць, пашанцуе з суседскім хлопцам — надвор'е зноў устанавілася добрае, вада ў Дзвіне крыху спадзе, і, значыцца, будуць самы.

З тэрасы ўсхваляваным голасам кліча мяне Валіна маці:

— Лёня! Лёня! Дзе ты? Тэлеграму прынеслі! Ой, я так напалохалася. Сэрца зайшлося, як прынеслі.

І адразу, калі я пачуў слова «тэлеграма», усё напінаецца ва мне і сэрца тукае моцнымі, аж звініць у галаве, штуршкамі. Валя! Мабыць, нешта здарылася.

Тэлеграма кароткая. «Чаму няма лістоў? Як здароўе Ірынкі? Раніцаю назвапю на ўчастак. Чакай. Валя».

Прачытаўшы, смяюся:

— Ну як не навучышся загады выконваць, калі іх нават і тэлеграфам шлюць.

— Прыемныя загады прыемна і выконваць,— паўтарае мне цесць мае нядаўнія словы.

— Ты пашлі ліст, Лёня. І найхутчэй,— просіць цешча.— Можа, нават тэлеграму ў адказ адбіць.

— А як жа! Малапку зараз ён адстукае. Заўтра ж званіць будзе.

— Табе жартачкі,— ускіпае цешча.— А там дзяўчынка пудзіцца. Каб вальнейшыя рукі мае былі — штодня пісала б...

— Дык напісаў жа Лявон. Бандэроль цэлую накатаў...

Стары абараняе мяне, але цешча ўсё бурчыць, і я адчуваю, што трэба тэрмінова несці і адправіць ліст.

— Зараз ліст паляціць,— кажу я і хапаю пінжак.

Паштовая скрынка ад нас недалёка, я хутка вяртаюся. Валін бацька сядзіць на тэрасе, праглядае газеты. Насярэдзіне стала ляжыць сшытак і ручка — стары, відаць, збіраецца пісаць ліст Валі.

— Выканаў загад! Адрапартаваў!

Ісці ў сад мне яшчэ ранавата, трэба пачакаць цёмнага — тады вылазяць бартулі, і я знарок кажу пра загад, каб выцягнуць цесця на патрэбную гаворку; я па-ранейшаму адчуваю, што перад вячэраю ён нездарма папракнуў мяне. Але стары не настроены на доўгую размову.

— А мне далі загад. Тэрмінова. Бяры чытай, а я пісаць пачну.

Ён аддае мне газеты, а сам пачынае пісаць, і я праглядаю загалоўкі, потым чытаю рэдакцыйны артыкул аб падзеях у Кітаі, і слухаю рыпенне пяра, і потым проста трымаю газету ў руках, і думаю пра Валю, пра будоўлю, пра Ірынку, якая робіцца свавольнай і непаслухмянай...

Валін бацька ўрэшце скончыў пісаць і пачынае ладкаваць сабе пасцель на тэрасе — у цёплыя дні ён звычайна спіць тут на старой канапцы, а я бяру электрычны ліхтарык і іду ў сад. Ноч ціхая, без ветру, вельмі цёплая, і вільготны туман плыве аднекуль знізу, ад клёнаў; святло прабіваецца праз галіны яблынь, вагаецца — цесць ходзіць па тэрасе,— і вузкія жаўтлявыя промні то знікаюць у густым спляценні галін, то зноў узнікаюць, і, асветленыя імі, блішчаць яблыкі; лісці здаюцца цёмна-чырвонымі, а яблыкі белымі, нібыта пакропленыя фарбаю, якая не паспела яшчэ абсохнуць.

Бартулёў шмат. Яны павылазілі з сваіх норак, ціха паўзуць, прыўзняўшы вострыя макаўкі. Але трэба быць вельмі ўважлівым: маленькі шоргат, і бліскучая істужка імгненна знікае ў зямлі. Ступаю на сцежцы ціха, асцярож-

на, каб не шваргнуць нагою, каб злаўчыцца і злавіць... А бартулі слаўныя — тоўстыя, вёрткія. На гэткую прынаду будзе на нашых шнурах здабыча...

## 9

Правае крыло будынка на трэцім паверсе яшчэ не завершана, але на левым мы ўжо выбраліся на чацвёрты і ставім блокі будучых сцен. Я і раней захапляўся майстэрствам Сініцына, і захапляюся цяпер, і проста люблю глядзець на яго працу: кожны рух дакладны, разлічаны, здаецца, што кранаўшчык разумее кожны знак з зямлі яшчэ да таго, як ён пададзены, і магутны кран лёгка ўзнімае вялізныя пліты, і яны плывуць у паветры роўна, не гайдаючыся, нібыта ўзнімае іх не бясслоўная машына, а разумныя чалавечыя рукі.

У захапленні ад працы кранаўшчыка і Рогач.

— Мастак! — узрушана гаворыць ён, пазіраючы на стралу крана, што павольна і лёгка праплывае ля нас.— Сапраўдны мастак!

— Вопыт. Ён жа адразу пасля вайны пачаў на кране.

— Якое ж адразу! Першыя тры гады пасля вайны ў нас у горадзе аніводнага крана не было. Толькі лябёдкі. Цэглу на рыштаванні на плячах цягалі... Э-э! — Рогач раптам кідаецца да краю крыла, крычыць, грозіцца кулаком.— Што робіш, Эдзік! Іш, лаўкач! Адыдзі ад краю. Каму кажу? Ну! Хадзі сюды!

Лёгка пераскочыўшы з блока на пліту, Эдуард фарсіста шнуруе па самым краі сцяны, не глядзіць нават уніз, нібыта ідзе не на вышыні, а па зямлі — пагарджае небяспекаю, выхваляецца: глядзіце, маўляў, на мяне.

— Ты што гэта вытвараеш? — Голас Рогача гнеўны і бязлітасны.— Каб зваліцца?

— Не магу, нават каб і хацеў — мне яшчэ жаніцца трэба.

— Жа-аніх! Ляснешся адтуль — будзе табе вяселле!

— А во бяды каму! Хіба толькі галубка мая слязу ўроніць!

— Я табе ўраню! — пагрозліва абяцае Рогач.— Мне праз твае выбрыкі ў турму не хочацца.

— У турму? А іх жа цяперка і няма. Пазакрывалі на пераўлік.

— Ты чуў, што я табе сказаў?

— Так точна, таварыш прараб. Загадана строга захоўваць правілы бяспекі...

Рогач грозіць пальцам, але робіць ён гэта дабрадушна, не вельмі і сярдуючы,— хлопец яму даспадобы. Але тое, што прараб папярэдзіў Якуша,— правільна, вядома: зваліцца з такой вышыні не вельмі шыкоўная перспектыва. Ды і нам з Рогачам, калі здарыцца якое няшчасце, хопіць непрыемнасцей.

Карціць і мне палаяць Якуша — не па душы мне яго падкрэсленая фамільярнасць. Але ў гэты ж момант ён, махнуўшы рукою ўніз, у бок прарабкі, гукае:

— Зноў адказныя кватаранты... На чале з высокім начальствам. Во каму трэба намякнуць на правілы бяспекі!..

Бачу ўнізе Віктара. Апошняя заўвага Якуша раздражняе мяне, і я перапыняю яго.

— Ідзіце і працуйце. І ўлічыце заўвагі, што вам зрабілі. Абсалютна правільныя і справядлівыя заўвагі. І скажыце Кізілу, каб ён папярэдзіў усіх. Мы проста будзем звальняць за парушэнне правіл па тэхніцы бяспекі!..

— Наша брыгада па вышыні. Ніхто іх і не парушае.

— А вы? Што вы зараз робіце?!

Якуш чырванее, потым нешта хмыкае сабе пад нос і паварочваецца; бяжыць ён, праўда, крыху адступіўшы ад краю, але робіць гэта знарок, бы дэманструючы, што паслухаўся, улічыў заўвагі і выконвае іх.

Рогач ужо і не глядзіць на Якуша, на твары яго клопат і насцярожанасць. Я заўважыў ужо: кожны візіт Віктара на будоўлю выклікае ў прараба незадаволенасць. З'яўляецца і ў мяне гэтае пачуццё, магчыма, яно нават і мацнейшае, але я намагаюся яго прыхаваць; мабыць, не заўсёды ўдаецца зрабіць гэта чыста, і Рогач прыкмячае, што са мною робіцца, але ён аніводнага разу не выказаў тое ўслых.

А Віктар па-ранейшаму верны свайму слову, якое ён даў тады ў спрэчцы: рэгулярна, амаль кожны дзень, з'яўляецца на нашым участку. Цяпер, аднак, амаль заўжды ён прыходзіць не адзін, а, як гавораць Кізілавы хлопцы, з «адказнымі кватарантамі». Не ведаю, адкуль з'явілася і хто прыдумаў такую мянушку, але ёсць у ёй штось грэблівае і не вельмі добрае. Увогуле ў брыгадзе Кізілы ставяцца да галоўнага інжынера на апошнім часе зусім не так, як у пачатку. Віктар, праўда, па-ранейшаму частуе хлопцаў папяросамі, гамоніць жартаўліва, але ў большасці свае жарты тыя падтрымліваюць не дужа ахвотна; ён

часта распытвае хлопцаў і аб заробку, і тут ім няма на што крыўдаваць — нарады закрываюцца рэгулярна, без затрымкі, і заробкі ў хлопцаў добрыя. Але, тым не менш, былой павагі і пачцівасці да галоўнага інжынера я не прыкмячаю ў брыгадзе.

Кізілавы хлопцы ўжо ведаюць амаль усіх людзей, якія прыходзяць з Віктарам, ведаюць нават кватэры, якія гэтыя людзі аглядаюць, і жартуюць паміж сабою злосна і нядобразычліва. Аднойчы Максім Вядзецкі — і, думаю, не без згоды брыгадзіра — спрабаваў узняць вэрхал: ходзяць, маўляў, тут прахожыя розныя, перашкаджаюць працаваць, але Рогач абрэзаў яго, і той болей не пачынае адкрытых спрэчак, але часам кпіць з'едліва, варожа нават, і мы гэта чуем.

Сёння Віктара абкружаюць утрох — людзі мне невядомыя. Здаецца, мы не бачылі іх тут. Пытаюся ў Рогача, а ён крывіцца:

— Вядома ж: «адказныя кватаранты». Мо трэба падысці туды?

— А навошта? У іх свая справа. У нас свая. Калі трэба, самі прыйдуць.

— Наўрад. Вышэй другога паверха яны не ўзнімаюцца.

— Тым лепш...

Знарок не хачу ісці ўніз, бо ведаю, што сёння вялікай і непрыемнай гаворкі з Віктарам не мінаваць. Учора на другім паверсе пачаліся аддзелачныя работы, і я загадаў ставіць белую кафлю толькі на адну сцяну ў кухні і на адну сцяну ў ваннай. Нават калі мы зробім і так, дык крыху не хопіць пліткі на ўсе кватэры, давядзецца спыняць работы і чакаць, бо абліцовачных матэрыялаў на складзе ўвогуле няма.

Саджуся на блок і чакаю, рыхтуюся да гаворкі з Віктарам. Неяк нядобра пачуваецца, бо я ўпершыню пачынаю сумнявацца. А мо Віктар і не вінаваты і не ён асабіста надумаў некаму зрабіць паслугу, некаму абгабляваць кватэры лепей, чым усе іншыя? Над ім таксама ёсць начальства. Але ж чаму тое начальства не дае Віктару пісьмовых распараджэнняў, чаму сам Віктар не прысылае пісьмовых загадаў? Не прысылае, карыстаецца больш тэлефонам ды патрабуе, каб яго распараджэнні неадкладна выконваліся. Але ж я і сам, даючы распараджэнні, патрабую выканання іх. Патрабую, бо лічу свае распараджэнні справядлівымі. А мо і сам Віктар гэтак жа ставіцца да сваіх загадаў? Але я нічога не баюся і гатовы пад кожным

сваім распараджэннем паставіць подпіс і стаўлю гэты подпіс, бо веру ў тое, што раблю. Цвёрда веру.

А Віктар? Што ён думае, калі аддае мне загады, якія ў душы я лічу няправільнымі і якія часам проста не выконваю?..

Унізе, за штабялямі блокаў, марудна крочаць «адказныя кватаранты», але Віктара сярод іх ужо няма; пройдуць крыху, запыняцца і стаяць, нешта даводзяць і спрачаюцца вельмі заўзята, размахваючы рукамі.

Слоў не чуваць, але мне здаецца, што гаворка ў іх менавіта пра гэты другі паверх, і я пачынаю прыслухоўвацца і тут жа заўважаю, што Віктар ужо дыбае па лесвічным маршы трэцяга паверха.

Ускараскаўшыся на пліту перакрыцця, ён сагнуўся, атрасае штаны і не спяшаецца падыходзіць да мяне. Я ўзнімаюся і таксама не рухаюся з месца, гляджу, як кран цягне з зямлі белы брус. Мне добра відзён і кран, і бачна Дзвіна па паваротцы, і сам Віктар, і ён прыцягвае маю ўвагу; пазіраю скоса, спрабую нешта прачытаць па ягоным твары, але ён мружыць вочы ад сонечнага святла і ветру, і я не магу ні аб чым здагадацца.

Але мяне пачынае насцярожваць тое, што ён так доўга стаіць, і чакае, і робіць выгляд поўнай абыякавасці да мяне і вельмі пільнай цікаўнасці да ўсяго таго, што ёсць вакол. Не, Віктар прыйшоў сюды зусім не для таго, каб зірнуць з вышыні на Дзвіну.

Ён па-ранейшаму чакае, і я ведаю, што мне трэба першаму падысці да яго. І гэта, вядома, будзе разумна: ён галоўны інжынер, і мне трэба не толькі захоўваць нейкую субардынацыю, але і адчуваць, што я на ўчастку гаспадар, а ён у нейкім сэнсе госць, і абавязак гаспадара — ветлівасць...

Віктар адказвае на маё прывітанне закурваючы, потым хавае пачак у кішэню і тут жа спахопліваецца, выцягвае яго зноў.

— Куры... Хаця... Ты ж не курыш!

— Кінуў. Раз і назаўсёды,— кажу я. Мне здаецца, што гэтая рэпліка яму не падабаецца.

— Мог бы і некаторыя іншыя благія звычкі кінуць...

— Не ўсё адразу.

— А варта было б... Тым больш што гаварылі пра тое. І даволі грунтоўна.

— Гаварыць лёгка. А тут звычкі! — Я спрабую жартаваць, хоць і бачу, што Віктар сёння не схільны да жар-

таў, а ўсё яшчэ спадзяюся неяк павярнуць нашу размову на вясёлую плынь, мне ўсё яшчэ здаецца, што гэта самы верны і самы правільны кірунак: менавіта так і трэба настаўіцца да ўсяго, бо толькі жарт можа даць нейкую разрадку блізкай ужо навальніцы:

— А мы думаем гэтыя звычкі ламаць. Ды так, каб болей і не прывіваліся!..

Віктар стрымлівае сябе, намагаецца не крычаць, а гаварыць спакойна, але губы ў яго дрыжаць, і я, гледзячы на хмурна зведзеныя бровы, якія торгаюцца ад злосці, усё яшчэ не магу адкінуць вясёлы і крыху жартоўны тон.

— Ого! Упершыню, здаецца, сказана не «я», а «мы». Прагрэс!

— Прагрэсіўнымі метадамі будзем ламаць і звычкі!

— Пасееш звычкі — сажнеш натуру. Гэтак гаворыцца, Віктар Паўлавіч?..

— Хопіць алегорый! Я сыты імі па горла. І хачу ведаць, чаму на ўчастку зноў мудрагеляць?

— Кажыце канкрэтна,— прашу я, разумеючы, што жарты скончыліся.

— У семнаццатай і дваццатай кватэрах плітка на кухнях і ў ванных не пастаўлена. Чаму?

— Пліткі не хопіць. Мы падлічылі... Таму робім кафлю на адну сцяну, але ва ўсіх кватэрах.

— Хто вам дазволіў?

— Самі!..

— Самі? Дык самі цяпер і перарабляйце! І папярэджваю: паўторыцца такое — за ваш кошт пойдуць пераробкі. Ці вы ўжо, можа, Ротшыльд? Грошы лішнія завяліся?

— Справа не ў грашах...

— Філантропія! Раю ў апошні раз: маскоўскія звычкі трэба кідаць. Тут не Масква.

— Значыцца, калі Масква далёка, дык можна на ўсё напляваць? Так ці не? Можа, вы растлумачыце?

— Тут не інстытут, дзе ўсё растлумачваюць. Будоўля! А яна патрабуе працы і выканання плана.

— Мы яго выконваем, і, здаецца, няблага.

— Гэта і ўратоўвае. Ды яшчэ тое, што за вашым участкам уважліва сочаць...

Мы стаім блізка ля краю, непадалёк ад таго месца, дзе толькі што прабег Якуш. За краем пліты — далеч, але яна як бы і нерэальная: такое адчуванне, быццам няма вышыні і стаім на зямлі. Ва мне атухае жаданне спрачацца з Віктарам, і зусім ужо не хочацца жартаваць, але

мацнее і расце пачуццё, якое я не хачу ні ставіць пад сумненне, ні закрэсліваць: між намі, як паміж гэтаю плітою, на якой мы стаім, і зямлёю,— бездань.

— І ўсё-ткі я не магу даўмецца,— працягвае Віктар, але гаворыць ужо зусім іншым тонам, раздумліва, бы прыслухоўваецца да сваіх слоў, і я ніяк не магу зразумець, чым выклікаіы гэтыя змены і што хаваецца за імі.— Няўжо і сапраўды вы не разумееце, што Зубок не сабе будуе дом, што не збіраецца ён тут жыць, што нулю роўная яго- ная ўласная зацікаўленасць?

— Магчыма. Але як разумець настойлівасць, якая варта куды як лепшага прымянення?

— Скажу шчыра: не хачу, каб на мяне глядзелі як на кіраўніка, які не можа, не здольны забяспечыць выкананне пэўных патрабаванняў...

— Дык адмаўляйцеся! Няхай ставяць такога кіраўніка, які зможа забяспечваць тыя патрабаванні.

— Думаеце, з тым чалавекам будзе лягчэй?

— Пра мяне гаворка малая. Я заўсёды раблю толькі тое, што лічу правільным і патрэбным...

Віктар шумна, бы пасля хуткай хады, уздыхае.

— Ён — робіць. Ён — правільны. Ён — пуп зямлі. А ўсе астатнія хто? Дурні? Прыстасаванцы?

Я пачынаю апасацца спрэчак з Віктарам. Ён умее, пачаўшы здаля, прывесці гаворку вось да такой кропкі, дзе ты павінен абавязкова апраўдвацца. А я не хачу апраўдвацца. Я будаўнік. Я рабіў і буду рабіць тое, што падказвае мне маё сумленне... Мой найпершы абавязак.

— Стоп! Стоп! — перапыняе мяне Віктар.— Сумленне застаецца пры вас: яго не кантралюю. А вось пра абавязкі гэтага сказаць не магу. Я іх буду не толькі кантраляваць, але і патрабаваць, каб яны выконваліся.

— Мне здаецца, яны і выконваюцца.

— Вось менавіта — здаецца. Таму ў дваццаць першай і семнаццатай кватэрах перакрыцці паверхаў нядбала і зацэментаваны.

— Добра. Я пагляджу...

— Паглядзець мала. Трэба выправіць. І неадкладна сёння ж!

— Выправім сёння!..

Я кажу гэта шчыра: калі сапраўды дапусцілі нядбайнасць, дык тут і спрачацца няма чаго — трэба выпраўляць. Пагаджаюся з Віктарам і ў той жа час добра разумею: тое, што мы гаворым сёння,— толькі працяг нашае

ранейшае спрэчкі, якая, аказваецца, не супялася, а жыве, набірае сілу. Бясспрэчна, Віктар не чакаў ад мяне такой упартасці, бясспрэчна, праз гэтую маю ўпартасць ёсць у яго непрыемнасці з начальствам; бясспрэчна, ён чакае зручнага моманту, каб адплаціць мне за ўсё.

Магчыма, гэта яму і ўдасца. Упраўляючы цяпер у адпачынку, Віктар выконвае яго абавязкі — поўны гаспадар. Праўда, ён робіцца ўсё больш і больш асцярожны, усё часцей паўтарае, што ва ўсёй гэтай гісторыі з нашым домам яго асабістай зацікаўленасці няма. А як звязаць усе ягоныя словы з тым, што гавораць, жартуючы, Кізілавы хлопцы? Як звязаць у адно гэтыя жарты і Віктаравы словы, мае пярэчанні і тое, што скажуць людзі, якія пасяляцца ў гэтым доме, будуць хадзіць адзін да аднаго ў госці і заўважаць, што кватэры іхнія збудаваны неаднолькава? А мо гэта дробязі ўсё — гэтыя пліткі, гэтыя ручкі ў дзвярах, вышыня сцен?.. Не, не дробязі. Не дробязі, бо яны закрэсліваюць шмат таго вялікага, у імя чаго мы імкнёмся хутчэй выканаць план, спрачаемся на рабоце, намагаемся сёння працаваць лепей, чым учора.

Кіўнуўшы галавою на развітанне, Віктар спускаецца ўніз. Неўзабаве ён ужо ля прарабкі, прапаноўвае папяросы шафёру, які толькі што згрузіў блок і стаіць ля машыны, і шафёр прыкурвае ад яго запалкі, і яны пра нешта гавораць, і я бачу, што размова не сумная.

Да мяне падыходзіць Рогач. Нават не ведаю, дзе быў гэты час прараб: убачыўшы Віктара, ён некуды знік і потым гэтак жа непрыкметна з'явіўся: мабыць, спусціўся на першы паверх, а зараз зноў узняўся сюды.

— Пагаманілі? — пытаецца ён.

— Яшчэ і загадаў палучылі. І ўсе строгія.

— Я чуў — стаяў унізе. Там чуваць кожнае слова...

— Значыцца, не трэба мне і паўтараць. Прараб цяпер сам ведае, што загадана.

Рогач падціскае кулаком падбародак, сочыць за машынаю, якая ўнізе выбіраецца на дарогу, у кабіне машыны сядзіць Віктар.

— Прараб і без таго ведае свой абавязак. А вось што рабіць начальніку ўчастка — трэба падумаць...

Ён змаўкае, нешта выглядае ўнізе, дзе ля блокаў завіхаюцца людзі. Адчуваю, як адчуваў у аўторак у час гаворкі з цесцем, недагаворанасць, нешта значнае, важнае, але свядома ўтоенае. Цікава, чаму Рогач не выказаў да канца сваю думку? Спалохаўся? Ці тое, пра што ён паду-

маў, палічыў крыўдным для мяне? І першае і другое не зусім добра.

— Калі пачаў казаць, дык кажы ўсё шчыра, да канца!

— А што... Можна і да канца,— адразу ж адгукаецца Рогач.— Калі ўжо да канца, дык я б на вашым месцы да гэтага канца тут і не быў саўсім.

— Нешта не разумею. Як гэта?..

— А проста. Плюнуць і пайсці ў якое іншае месца. І я з вамі пайду. Праца знойдзецца...

— Пайсці адсюль? Навошта?

Не магу даўмецца: ад чаго ён спрабуе мяне засцерагчы? Але ж, мабыць, нешта ведае, нешта яго ўстрывожыла, нешта такое небяспечнае заўважыў. Але што? Няхай гаворыць.

А ён маўчыць, маўчыць зацята, бы выпрабоўвае маю цярплівасць, і раптам гаворыць хутка, узрушана, трасучы галавою:

— Пайсці навошта? Каб галава сцалела. Галоўны не дасць вам спакойна жыць — гэта ж відно... Некалі такое з Грушалем было... Ён таксама, Грушаль, наважыўся праўду ў вочы Трахіменку разапуць... Ну, той яго і разануў. Праўда, пазней Трахіменку з партыі нават трахнулі. А што тое Грушалю, калі ён ля Данбаса апынуўся: кінуў усё, плюнуў і паехаў...

І гэта яшчэ болей для мяне нечакана. Рогач ніколі раней мяне не папярэджваў, ніколі ні ў чым не папракаў. Ён паважае мяне, і я паважаю яго, заўсёды стаўлюся да яго з павагаю. Паважаю яго працавітасць, паважаю здольнасць разумець кожны мой загад, паважаю яго строгае стаўленне да людзей. Прыехаўшы пасля вучобы ў Прыдзвінск, я быў шчыра ўзрадаваны, што знайшоў яго тут, і ён, здаецца, адчуваў тое ж. Мы заўжды гаварылі з ім шчыра, і цяпер тое, што ён мне сказаў, прагучала як сардэчнае папярэджанне, якога я не чуў раней і на якое не спадзяваўся. І гэтая яшчэ спасылка на Грушаля. Я ведаў толькі, што ён звольніўся і паехаў, але я нават і не спрабаваў раней шукаць нейкія прычыны: захацеў і паехаў.

Ды якое, зрэшты, мае дачыненне той ад'езд Грушаля да падзей, што адбываюцца цяпер тут са мною?

Націху ўзнікае непрыязнасць да Рогача. Але я глушу гэтае пачуццё, не хачу даваць волі яму — ва ўсім трэба разабрацца спакойна і цвяроза. Рогач раіць наплюваць. А на што? На гэты дом? На маю працу? На тое, што мы абдумвалі з Крыштопам і аб чым я пішу цяпер у сваіх

лістах да Валі? Ці толькі па загады Віктара? Не, тут патрэбны ўдакладненні, тут трэба высвеціць усё да канца. Няхай тое, што ён раіць, яго ўласная думка — гэта і добра, калі чалавек мае сваю ўласную думку... Але яе трэба выказаць да канца, пачаўшы гаворку на поўную шчырасць і поўны давер...

— Ат...— Ён узмахвае рукою, быццам адкідваючы нешта ад сябе, і па хмурнасці, што гусцее на яго твары, відно, што гаварыць яму не вельмі хочацца.— Не будзеце вы з галоўным ніколі ў згодзе. Не дасць ён вам працаваць спакойна: не да аднаго, дык да другога прычэпіцца. А ў нашай справе гэтых прычэпак... Во, як тут жвіру: куды ні павярнуўся — факты. Толькі складай іх умела і паказвай. Зубок гэтым мастацтвам валодае. Вы ж яму папярок дарогі сталі, ходу не даяце... Сцерпіць ён? Ніколі! І ён не адзін. Хіба ж не бачылі, колькі тут за ім на будоўлю ходзіць? І кожны з гэтых пры выпадку будзе вас падтрымліваць?

— А мне іхняя падтрымка непатрэбна. І не ім, не Віктару мы служым. Не Віктараў уласны дом будуем. Дарэчы, яго словы паўтараю...

— Яно, канешне, правільна...

— Дык навошта ж пляваць на тое, што правільна?

— Ведама што... Прынамсі, я сваю ўласную думку выказаў.

— І сваю ўласную думку я таксама не хаваю: уцякаць адсюль не збіраюся!

Нібыта апраўдваюся, нібыта самога сябе пераконваю. А ў вачах Рогача — абыякавасць. Нават больш: употай, мне здаецца, ён не толькі не лічыць маю катэгарычнасць разумнай, а нават падсмейваецца, перакананы ў маёй памылцы. Па яго твары прабягае слабы цень; Рогач нібыта збіраецца нешта гаварыць і ў той жа час стрымлівае сябе, раздумваючы і вагаючыся. Адчуваецца, што яму цяжка адважыцца на гаворку, і разам з тым тое, пявыказанае, яго мучыць. І гэта насцярожвае мяне: Рогач не хлапчук які, у яго вялікі вопыт, і працуе ён у нашым упраўленні даўно, і ведае, безумоўна, Віктара лепей.

На пліту перакрыцця выскаквае Якуш, фарсіста ідзе па самым краі, і я, заклапочаны словамі Рогача, не адразу здзіўляюся, што хлопец раптоўна знікае: у мяне нават мільганула думка, што не ўлічвае ён папярэджанняў, зноў фатыгуе, забаўляецца з небяспекаю.

Сухі гучны трэск, і нейкі міг пасля роспачны і трывожны крык:

— А-аа-ээээ!..

І тут жа ўнізе, на зямлі, кароткі, глухі ўдар; бухкае так моцна, што цэментаваная пліта пад нагамі ўздрыгвае, і здаецца, нібыта нахіснулася сцяна і дом зараз разваліцца.

Адчуванне бяды вострае, балючае, і я стрымгалоў кідаюся ўслед за Рогачам, які грукоча ўжо ботамі па лесвічных маршах.

Мы вылятаем з пад'езда амаль разам. На зямлі, крыху лявей увахода, ляжыць пліта балконнага перакрыцця. Хлопцы нясуць на руках Эдуарда, шыя і рука ў яго акрываўлены, але ён жывы і слаба ўсміхаецца.

Усе расступаюцца, калі я падбягаю да Якуша. Нехта тлумачыць, што пліта была слаба падмацавана знізу, з балкона на трэцім паверсе, а Эдуард забыўся пра тое, стаў, і яна абвалілася. Якуш, вядома, уратаваўся цудам: мабыць, падаючы разам з плітою, ён паспеў адштурхнуцца ад яе і зваліўся спачатку не на зямлю, а на балкон другога паверха...

Я хутка бег, цяпер спыніўся, і мне цяжка дыхаць, і падступае да сэрца, цісне злосць. Казалі ж яму. Папярэджвалі. І Рогач папярэджваў, і я патрабаваў кінуць гэтае фатыгоўства, не хадзіць па краі, правілы бяспекі захоўваць. А ён?! Хочацца крычаць, аблаяць Якуша апошнімі словамі, і не магу: нешта даўкае падступае да горла, калі бачу яго акрываўленую руку і цёмныя плямы на майцы.

— У бальніцу! У бальніцу тэрмінова! — урэшце патрабую я, і гэта зусім не тое, што думаю: мне па-ранейшаму хочацца аблаяць Якуша, і я пакутую разам з ім.

— Хлопцы пабеглі. Зараз павінна быць «хуткая».

— Не трэба ніякай бальніцы. Ёду ды бінту крыху... Усё і пройдзе.— Якуш спрабуе ўзняцца на ногі, але твар яго робіцца ненатуральна бледны, губы перакошвае грымаса болю.— Закурыць... У пінжаку... Там... Маім...

Яму працягваюць запаленую папяросу, Рогач папраўляе супуты Якушу пад галаву чыйсьці пінжак.

— Як жа гэта ты? А? Мала цябе прасілі: асцярожна, асцярожна... Пліта не пад блокам, а ён на ёй у скокі...

— Зазірнуць хацеў. Як там, ці крэпка, знізу.

— Крэпка! Ніччэ, можна сказаць, напчасціла. А каб бухнуў ды пліта зверху? Было б тады крэпка...

— Абыдзецца, таварыш прараб. Усё будзе ў парадку... Якушу цяжка гаварыць, і ён, адкінуўшы папяросу,

кашляе, просіць вады. З бытоўкі прыносяць конаўку: Якуш прагна выпівае некалькі глыткоў, але тут жа аддае конаўку і ляжыць нерухома, закрыўшы вочы.

— Ты пацярпі, пацярпі, хлопча,— Рогач раіць гэта мякка, зусім не тым тонам, якім толькі што размаўляў.— Машыну выклікалі. Адвязём цябе да ўрачоў, яны ўмомант падлечаць...

Якуш адплюшчвае вочы; сонца б'е яму ў твар, і ён, мружачыся, просіць ціхім голасам:

— Сонца моцна пячэ... Каб цень які мне...

Пад сцяною бытоўкі хутка робім па дошках пасцель з пінжакоў. Але Якуш не хоча класціся і сядзіць нерухома, прыхіліўшыся да сцяны; вочы ў яго заплюшчаны; потым галава звешваецца на грудзі, і сам ён усё хіліцца і хіліцца, каб легчы. Кізіла памагае Якушу легчы, і той ужо не пярэчыць і не стогне, а толькі моцна сціскае губы.

Трубна сігналіць «хуткая дапамога». На шэрых брызентавых насілках Якуш здаецца маленькім і кволым. Мы пераносім яго ў машыну і потым нейкі час стаім і глядзім на дарогу, дзе, асядаючы, растае жоўты пыл.

Рогач абводзіць усіх цяжкім змрочным позіркам і пытае з пагрозлівым смяшком:

— Ну, што цяпер стаіцё?

Гэтае пытанне адрасавана кожнаму, але ніхто на яго не адказвае, і тады Рогач зрываецца на крык, пагрозліва трасе кулаком:

— Распусціліся! Развінціліся! Я ва-ам па-акажу! Калі хто яшчэ парушыць правілы бяспекі,— сам пяхай піша заяву на звальненне. Не чакае! Ясна?

І зноў няёмкае, але зацятае маўчанне, і раптам, як адчэпнае, невыразная, з уздыхам, згода Генадзя Дука:

— Ясна, таварыш прараб...

Варта, безумоўна, падтрымаць Рогача, паківаць як след гэтым хлопцам, але на тое няма аніякага жадання, і я нават не паварочваюся ў іхні бок; нібыта нейкая спружынка зламалася ва мне, і я стаю ўсё на тым жа месцы, дзе стаяў, калі «хуткая» зрушылася з месца і панеслася ў бок горада, стаю, слухаю, як крочаць хлопцы, як яны гамоняць і як іх увесь час сярдзіта павучае Рогач, як бухае ботамі Сініцын — лезе па металёвай лесвічцы ў будку крана.

Пыл ужо сагнала, аднесла ветрам у палын пад берагавым узвалам, аддаліўся і растаў у мешаніне гукаў тонкі гуд матора, а я ўсё гляджу на дарогу, і ўсё яшчэ мрояцца перад маімі вачыма чырвоныя плямы на майцы Якуша.

Туга апаноўвае так раптоўна і востра, што мне не хапае паветра, няма чым дыхаць, і я хапаюся за каўнер рукою і моцна тузаю; адарваныя гузікі адлятаюць, і я адчуваю свежы дотык рачнога ветру на грудзях, і гэты дотык нібыта глынае тугу і адкрывае шлях раптоўнаму і дзікаму шалу, і ён звальваецца на мяне, як снегавая лавіна; яшчэ не ведаю нават, супраць каго ён скіраваны, але гэты шал ужо сядзіць ва мне, і з ім цяжка, невыносна цяжка; яшчэ не ведаю яго вытокаў, не ведаю, адкуль ён так раптоўна абрынуў на мяне, але адчуваю яго, як адчуваюць удар і гарачыню.

Я рыхтую кару брыгадзіру, ужо нават і не думаю пра тое, што Якуша павезлі ў бальніцу і яшчэ невядома, чым усё скончыцца для хлопца. Гэта Кізіла разваліў дысцыпліну ў брыгадзе. На гадзіну зараз пастаўлю яго перад усімі і буду адчытваць. І не так, як рабіў Рогач...

І тут жа робіцца сорамна за гэтую злосць на Кізілу (хіба ж ён хацеў, каб усё здарылася менавіта так?), і накрысе шал асядае, і прыходзіць думка даўняя і вядомая: ва ўсім тым, што здараецца з табою, ты павінен вінавадзіць у першую чаргу самога сябе. І тут нічога нельга запярэчыць. Тады, пасля выпадку ў катлаване, я павінен быў прыняць самыя строгія меры па захаванню правіл бяспекі. А яны былі прыняты? На словах. Больш таго, я быў тады нават узрадаваны, што ўсё так лёгка абышлося, што Кізіла нават не трапіў у бальніцу. А цяпер без яе не абышлося. І таму адказнасць за тое, што здарылася з Якушам, кладзецца на мяне. Безумоўна, вінаваты і Рогач, і Кізіла, і сам Якуш. Але ўпраўленне спытае спачатку мяне...

І правільна зробіць!

Злосць яшчэ не зусім утаймавалася, і цяпер яна ўжо не стасуецца ні з якім імем канкрэтна, не стасуецца ўвогуле з тым, што нядаўна здарылася. Гэтае маё пачуццё накіравана зусім у іншае рэчышча, і я адчуваю яго з той жа вастрынёю, з якой толькі што адчуваў дотык халоднага ветру на грудзях, і ад гэтага адчування я разумею, што змянілася нешта ва мне, неяк раптоўна і нечакана я пасталеў і пастражэў да самога сябе.

## 10

Загадам па ўпраўленню, строгім і бязлітасным, я вызвалены ад займаемай пасады старшага прараба першага ўчастка. Абгрунтавана гэта даволі ўпушальна і важка:

«...ігнараванне ўказанняў упраўлення, парушэнне працоўнай дысцыпліны і правіл па тэхніцы бяспекі, што прывяло да няшчасных выпадкаў на ўчастку».

Я прачытаў гэты загад, узбунтаваўся, і першае, што намысліў,— адразу ж пайсці і гаварыць з Віктарам, давесці яму, што ў загадзе дапушчана памылка, якую трэба выправіць абавязкова: Якуш жывы, яго праз два дні выпішуць з бальніцы. Навошта ж такая мера пакарання? Мне, калі казаць шчыра, нават не верыцца ў іспаванне загада, увесь час здаецца, што павінна адбыцца невядомая мне з'ява, і ўсё стане на свае месцы.

Цяпер я сяджу ў прыёмнай і чакаю гаворкі з Віктарам. Ён заняты — да яго прыехалі будаўнікі з суседняй вобласці. Мне хацелася гаварыць з ім неадкладна, але я разумею, што нашу гаворку чужым людзям не варта і слухаць. У сваіх справах мы павінны разабрацца сам-насам. Не ведаю, што з таго атрымаецца, але выкажу яму ўсё, што думаю аб ім, аб яго метадах кіраўніцтва, аб яго фанабэрыі, угодніцтве, аб яго пагардлівым стаўленні да сяброў. Вырашыў гэта цвёрда і таму сяджу і чакаю.

У прыёмнай, здаецца, нічога не змянілася пасля тых дзён, калі тут сядзела Валя,— дзіўна, але я ўпершыню падумаў пра тое. Праўда, тады стол стаяў насупраць акна і не было гэтай маленькай пальмачкі ў вузкай драўлянай дзежачцы. А стол усё той самы, і тэлефон стаіць на тым самым баку, бліжэй да ўвахода, і крэслы — ланцужком ля сцяны. А сакратарка зусім не падобная на Валю — маленькая, тоўсценькая, з натапыранымі ад важнасці губкамі. Калі я прыйшоў, яна складала нейкія паперы ў жоўтую папку, потым праглядала іх, ставіла нейкія нумары і зноў складала. Незалежная. Упэўненая. Дзелавітая.

Магчыма, яна такая і па самай справе. І, гледзячы на яе, я думаю, што з гэткім вось выглядам на твары буду размаўляць з Віктарам. Заклікаю сябе да цярплівасці, спакойства, а ўсё ва мне бунтуе, не церпіцца хутчэй дарвацца да кабінета, зазірнуць у Віктараў твар. Хіба не разумее Віктар, які загад сатварыў? Не, мабыць, добра разумее. Каб не разумеў, дык не падпісаў бы яго гэтак хутка, з лёту... Цікава, а што б я рабіў, каб апынуўся на яго месцы? Настрачыў бы гэткі загад? Не, наўрад... Вядома, абмінаць такі факт, як апошні выпадак на нашым участку, нельга. Але ж трэба паставіцца да яго памяркоўна, паклікаць чалавека, якога лічыш вінаватым, пагаманіць, вытлумачыць, што тут і да чаго... А мо той чалавек не так ужо і вінава-

ты, а ты, нічога толкам не ведаючы, будзеш адразу штукаваць загад аб звальненні? Не, рашэнне Віктара занадта паспешлівае, і, вядома, не зусім правільнае пакаранне павінна грунтавацца на абсалютна дакладным уліку віны і абставін, бо інакш яно не пакаранне, а несправядлівасць...

Думкі, як мне здаецца, стройныя, паслядоўныя. Будучая мая гаворка з Віктарам так і пойдзе. Хоча ён ці не хоча — мусіць выслухаць тое, што я збіраюся яму сказаць, тое, што думаю; толькі трэба спакойна, не гарачыцца, кожнае слова абдумваць...

Дзверы кабінета адчыняюцца раптоўна: Віктар выходзіць, абкружаны гасцямі, сустракае мой позірк, але робіць выгляд, што нічога не заўважыў,— зірнуў паверх галавы, павярнуўся да гасцей, бы адгароджваецца імі ад мяне; ён нездарма глядзіць на сівога, маленькага, сухенькага мужчыну ў светлым пінжаку і цёмных, па-хлапцоўску вузкіх штанах, адчыняе перад ім дзверы ў калідор і сам выходзіць туды.

Аддаляючыся, пакрысе заціхаюць галасы; потым журкоча машына за акном, і я зноў чую знаёмыя крокі — Віктар вяртаецца.

— Што ў вас? — Ён пытаецца гэта, а сам варушыць паперы ў жоўтай папцы, што ляжыць на стале ў сакратаркі.

Я цвёрда вырашыў гаварыць з Віктарам, і няўвага такая мяне не крыўдзіць, пагардлівы і абыякавы тон ніколькі не палохае і не бянтэжыць. Няхай!

— У мяне гаворка асабістая...

— Не ведаю, ці будзе ў мяне дастаткова часу на такую гаворку.— Віктар доўга, занадта доўга, глядзіць на гадзіннік і задумліва выгінае губы.— Дзесяць хвілін застаецца. Пяць... Зрэшты, шэсць я змагу ахвяраваць вам.— Ён зноў вывучае паперы на стале ў сакратаркі — я для яго не існую.— З выканкома званілі?

— Не, Віктар Паўлавіч, не званілі.

— Як пазвоняць — адразу пераключыце.

І зноў да мяне:

— Дык я слухаю. Але як і дамовіліся — толькі шэсць. Прашу!

Ён гасцінна адчыняе перада мною дзверы кабінета і чакае, пакуль я ўваходжу.

— І хачу папярэдзіць: загад мы абмяркоўваць не будзем. Ён падпісаны, і тут усё ясна.

— А мне не ўсё ясна. І таму я хацеў бы разабрацца сумесна...

Ён зачыняе дзверы за маёй спінаю і не садзіцца ў крэсла, а стаіць ля стала і мне сесці не прапаноўвае. Сухаватым тонам, вельмі афіцыйна, ён гаворыць мне, што загад адасланы ў вобласць; ні адмяняць яго, ні перарабляць, ні разбірацца ў ім ён, Віктар, не мае і не бачыць ніякай патрэбы.

Гаворачы гэта, ён глядзіць на шырокі залаты пярсцёнак на пальцы правай рукі, накручвае яго.

Не памятаю, ці быў гэты пярсцёнак у яго раней. Здаецца, не было.

Не ведаю чаму, але менавіта гэтая яго ўвага да пярсцёнка мяне раздражняе, і я перапыняю Віктара рэзка:

— Нейкая дзіўная аператыўнасць. І менавіта тады, калі загад па нашаму першаму ўчастку! Трэба ж было спачатку разабрацца ва ўсім!

— Ах... Разбірацца...— Віктар на момант змаўкае, агледзеўшы нейкую пляму на пярсцёнку, дастае з кішэні насоўку.— Адзін — пра Фаму, другі — пра Ярому...

Ён уздыхае так нудна і так заклапочана чысціць-націрае насоўкай пярсцёнак, што ўсе мае ілюзіі чэзнуць і прападаюць, саступаючы месца крыўдзе; яна асядае ва мне трывала, і я ведаю, што гэта надоўга, што крыўда не пройдзе праз дзень ці два. І тады адразу ўсё тое, да чаго я так старанна рыхтаваўся, губляе свой сэнс: што даводзіць Віктару і аб чым з ім гаварыць? Папракаць нашым мінулым сяброўствам? Яно для яго не існуе. Папракаць у фанабэрыі, угодніцтве?.. На вецер тыя папрокі. Патрабаваць справядлівасці?.. Але ж у загадзе ёсць і правільныя падставы. Быў выпадак з Якушам? Быў. І не адзін. Загад упраўлення не выкананы? Не выкананы. Праўда, ва ўсім гэтым трэба далікатна і мужна разабрацца. Не хоча ён разбірацца? Не трэба. Тады я застануся працаваць на ўчастку да канца будаўніцтва: збудуем дом, і я пайду.

— Не магу гэтага дазволіць,— крыху адстаўляе руку, любуецца бляскам пярсцёнка, потым хавае насоўку ў кішэню і выцягвае пачак папярос.— Загад ёсць загад.

— А я чалавек. І мяне нельга проста так... Адкінуць!

Віктар раптоўна і хутка цямнее з твару, дастае папяросы, круціць у руках пачак, пстрыкаючы па ім пальцам, потым падносіць блізка да вачэй, углядаецца, вывучае, нібыта намалявана на ім нешта вельмі цікавае і дзіўнае.

— Правільна. Нельга «проста так», нельга! Бо вы кіраўнік. Ясна? — Віктар з размаху кідае пачак на стол.— Кіраўнік! І вы павінны несці адказнасць не толькі за свае ўчынкі, але і за лёс людзей. Калі вы і Крыштоп рабілі там свае штукарствы — я цярпеў. А калі ад іх робяцца інвалідамі людзі — я бязлітасны. Загад ёсць? Выконвайце. І сёння ж здайце ўчастак Рогачу!

— Ён не будзе яго прымаць.

— Чаму?

Разумею, што зрабіў памылку, што сваім неасцярожным пярэчаннем падставіў пад удар яшчэ і Рогача. Я ж і не спрабаваў перадаваць яму ўчастак. Праўда, Рогач абурана сцвярджаў, што ён кіраваць участкам і не можа, і не хоча, і не будзе. Ён сказаў гэта, прачытаўшы загад. Але канкрэтнай гаворкі аб перадачы ўчастка мы з ім не вялі, і таму мне не варта спасылацца на Рогача.

— Чаму не будзе? — перапытвае Віктар.

— Я перадам участак сёння.

— Во! Гэтак і трэба было казаць з самага пачатку!

— І я хачу застацца на ўчастку простым рабочым. Мне трэба дабудаваць дом...

— Гэта з поспехам зробяць і без вас.

— Але я не прашу, а настойваю!

— А я паўтараю: загад падпісаны. І змен у ім не будзе мною зроблена!

— Тады я не выканаю яго. І прарабам на сёмы ўчастак не пайду!

— А гэта ўжо ваша асабістая справа. Акрамя таго, я змушаны папярэдзіць: калі здароўе Якуша пагоршыцца — мы прыцягнем вас да судовай адказнасці. Рыхтуйцеся і да гэтага!

Наіўны і смешны дзівак я. Каго думаў пераканаць? Віктар чакаў гэтага дня як манны нябеснай і цяперка не выпусціць такую выключна шчаслівую магчымасць разлічыцца са мною. Загад напісан. І ніхто не захоча абвяргаць той загад. Магчыма, будзе і суд. Будзе, магчыма, нават нягледзячы на тое, што з Якушам нічога страшнага не здарылася — я сам учора гаварыў з хлопцам, і ён амаль папраўіўся, і паслязаўтра, магчыма, пачне працаваць. Ці ведае гэта Віктар? А калі і не ведае, казаць пра тое зусім і не варта, бо нічога гэта не зменіць. Але толькі Віктар памыляецца, калі разлічвае, што перамог, зрэшты, мяне, конча запалохаў і зрабіў паслухмяным выканаўцам

сваё волі. Няхай ён піша дзесяць загадаў, а я нікуды не пайду, пакуль дом не будзе збудаваны. Гэта галоўнае.

Не ведаю, як усё павернецца потым, нават не думаю пра тое, што тады адбудзецца, а толькі ўважліва вывучаю Віктараў твар; і чым болей я гляджу на звужаныя ўсмешкаю вочы, на пагардліва скрыўленыя тонкія губы, тым усё больш і больш разумею, што мы з ім ніколі не былі сябрамі і што мая непрыязнасць да Віктара не толькі нарадзілася даўно, яшчэ тады, калі ён падмануў мяне пры паступленні ў інстытут, але і мае свае карэнні, свае прычыны. Я не хачу зараз аналізаваць іх, стрымліваю сябе і спакойна, нават крыху бесклапотна дзякую за папярэджанне і кажу, што падрыхтую сябе і да суда.

— Толькі ўлічыце,— перапыняе ён мяне і пускае тонкі струмень дыму на адстаўленую далонь.— У пэўнай ступені маральную адказнасць за ўсе справы на першым участку нясе і галоўны інжынер упраўлення. І таму ўся гэтая гісторыя для мяне асабіста таксама вельмі непрыемная...

— Непрыемнасці лёс пасылае, каб нас выпрабоўваць. Таму, у пэўным сэнсе, мы павінны быць удзячны за тое, што яны існуюць!..

Віктар таксама пераймае мой тон, гаворыць роблена міралюбна, нават са шкадаваннем нейкім, нібыта зусім не мае ніякага дачынення да таго, што робіцца.

— Але я павінен паведаміць: з сённяшняга дня вам зарплата начальніка ўчастка налічацца не будзе. Таксама паступіў загад у бухгалтэрыю...

— А яшчэ куды паступіў ён?

— Ну, навошта гэты тон? Я толькі паведаміў, што вам, таварыш Бугрым, грошы не налічаць.

— А таварышу Бугрыму, даруйце за слова, напляваць на тыя грошы. Ён напрацуе месяц і без іх. Як рабочы. А рабочаму вы павінны будзеце заплаціць. За працу.

— Мы ўжо ведаем гэтую працу. Нагледзеліся! І хопіць. Часу ў мяне няма!..

Ён злосна чыркае запалкаю; сіні дым трапляе ў вочы, і Віктар моршчыцца крывіцца, дзьмухае. Але мне здаецца, што крывіцца ён не ад дыму, што ён ледзь стрымліваецца, што ён можа зараз закрычаць, затупаць на мяне нагамі.

Бачу ўсё гэта быццам зводдалі і разумею, што ўсе словы, якія могуць быць яшчэ сказаны тут, нічога ўжо болей не зменяць у нашых адносінах, нічога не выпра-

вяць, нічога не пераробяць. Аднесна мяне ўсё ўжо вырашана, і, думаецца, не толькі тут, у гэтым кабінеце. Віктар, безумоўна, пастараўся і ў гарвыканкоме, а магчыма, і ў гаркоме паказаць усё належным чынам. Цяпер, як і ў той раз з выпадкам у катлаване, ён наўрад ці скупаваў на фарбы...

Развітваемся суха, і наша развітанне — простая даніна абавязку. Ведаю, што час позні, што на будоўлі нікога ўжо няма, але саджуся ў аўтобус, які ідзе ў той бок. Кандуктарка аб'яўляе прыпынкі, і я чую яе голас, і ён гучыць для мяне ў нейкай далёкай, зусім нетутэйшай прасторы.

Спрэчка з Віктарам спустошыла мяне. Адчуваю сваю праваты і не бачу ніякіх шляхоў, каб давесці яе, не ведаю, якой дарогаю трэба пайсці цяпер, каб стрымацца, не нарабіць нейкага глупства. Мо варта параіцца з Валіным бацькам? Не, не. Толькі не гэта. Скажаш яму, значыцца, будзе ведаць і маці. А яна не ўтрымаецца — напіша Валі. А Валя, не задумваючыся, кіне ўсё і прыкоціць сюды. Не, нікому мне нічога не трэба казаць. Адно варта, мабыць, параіцца яшчэ раз з Крыштопам. Але што з ім раіцца? Мы з ім гаварылі і ўчора і пазаўчора. Ён лічыць самым правільным тое, аб чым мы казалі і раней: трэба стаяць да канца, трэба спачатку збудаваць дом, а потым пачынаць сапраўднае змаганне, нешта даводзіць і нешта аспрэчваць. Але ён гаварыў гэта, здаецца, не вельмі і ўпэўнена, так, нібыта толькі слухаў мяне, слухаў і падгаджаўся, а сам сваіх думак не выказваў. Не, чаму не выказваў? Ён пагадзіўся і сказаў, што я раблю правільна... Тады ён не ведаў пра тое, што загады ўжо разасланы па ўсіх напрамках. Цікава, што скажа Крыштоп цяпер? Але хіба толькі яго думка важная. Важна тое, што я думаю сам. Важна тое, на што я павінен арыентавацца, тое, у што я веру асабіста, за што гатовы змагацца і што гатовы адстойваць...

За вокнамі аўтобуса мільгае стракаты шлагбаум; грукае пад коламі драўляны насціл паміж чыгуначнымі рэйкамі. Чыгунка? Вось дык штука: не на той аўтобус сеў... Кандуктарка абвяшчае прыпынак, і цяпер я добра чую яе голас і выходжу з аўтобуса.

На другі бок дарогі, крыху ўлева ад прыпынку, уваход у парк чыгуначнікаў. Гэта ж толькі падумаць: зусім на супрацьлеглы канец горада заехаў. Собіла ж неяк. Значыцца, тады, выскачыўшы з упраўлення, не прачытаў як след

нумар аўтобуса і дарогаю, у запале, таксама нічога не заўважыў. А мо гэта і няблага, што так здарылася. Пайсці ў парк і пасядзець крыху, падумаць на адзіноце — знаёмых тут паўрад сустрэнеш. Так што правільна гэта, бо каб трапіў на ўчастак ды сустрэў Рогача — пачалася б з ім гамана. А тут можна ціхенька пасядзець, паразважаць аб тым, як жыць і што рабіць далей...

У цяністых алеях парку ціха і змрочна. Пад старымі разгалістымі клёнамі прытулілася летняе кафэ з блакітнай назвай «Фіялка», з белым палатняным дахам і шырокай, спавітай з аднаго боку зялёным дыванам каляровай фасолі, сценкай; фасоля дзе-нідзе яшчэ цвіце вузкімі сінімі кветкамі. На тэрасе толькі адна маладзенькая прадаўшчыца — чытае кніжку і не адразу заўважае, што я спыніўся насупраць яе; потым, схамянуўшыся, хавае кніжку і глядзіць невідушчымі вачыма — яна яшчэ там, у невядомым мне свеце нейкага рамана.

— Цікава? — Я ківаю галавой на кніжку.

Не ведаю, што — ці твар мой, ці голас, ці само запытанне, а магчыма, усё гэта разам — насцярожвае яе; яна падціскае пунсовыя губы, хмурнее.

— Што вам? — Голас падроблена строгі.

— Ды нешта выпіць. Такая спякота...

— Піва? Напітак?

— Лепей, відаць, піва.— Я ўзнімаю два пальцы, вызначаючы гэтым колькасць бутэлек.— І сяду тут, побач, калі дазволіце...

Яна моўчкі абцірае паласатым ручніком бутэлькі і дастае з кішэнькі халаціка жалезную скобку; суха шчоўкае рыфлёны корак і, саскочыўшы з гарляка, коціцца па стале. Я накрываю яго далонёю.

— Арол ці рэшка?

— Што яшчэ?

Цяпер ужо не робленым, а сапраўды строгім голасам яна крэсліць маю спробу пажартаваць — адразу ж, бязлітасна і спрактыкавана. А мне хочацца гаварыць з ёю — гэтае жаданне ўсё яшчэ жыве ва мне, і я не спрабую нават з ім змагацца.

— У вас тут слаўна. Цішыня. Птушкі спяваюць...

— А-аа... Птушкі. Яны мне план не выконваюць.

— Відаць, вялікі план. Хаця, вядома, такое бязлюддзе ў парку. А ўвечары?

— Як калі...

А далей гаворка ў нас не клеіцца. Усё з той жа робле-

най строгасцю ў голасе яна гаворыць, колькі мне трэба плаціць, і бярэ ў мяне рубель і дае рэшту, і я застаюся адзін за столікам.

Піва халоднае і прыемнае. Выпіваю адну шклянку, другую... Пакрысе ва мне спее філасофскі спакой. Падзеі сённяшняга дня адсоўваюцца, нібыта закрэсленыя нечым, раптоўна адплываюць, і гэта абуджае ціхую і прыемную бесклапотнасць. Я хачу ні аб чым не думаць, а проста сядзець вось так за столікам, адкінуўшы ўсе турботы, і глядзець на незнаёмую мне дзяўчыну. Яна зусім не звяртае ўвагі на адзінага наведвальніка ў кафэ, які сядзіць і п'е піва, яна захапілася чытаннем і нічога, апрача кніжкі, не заўважае. І мне не хочацца перашкаджаць ёй, і я пазіраю ў той бок употай і бачу, як час ад часу здзіўлена выгінаюцца чорныя стужачкі броваў. А валасы ў яе прыгожыя — светлыя і пышныя — і крыху нагадваюць Валіну прычоску: такая ж была ў Валі, калі я ўпершыню ўбачыў яе. Потым, як нарадзілася Ірынка, Валя коратка падстрыгла валасы...

Увысі над галавой шоргае лістота клёнаў, недзе зусім блізка, у густым спляценні бэзу чокае малінаўка; ля крайняга століка скачуць, цвыркаюць вераб'і. Потым пошум клёнаў і галасы птушак прападаюць — іх глушыць гул цягніка: гучна чмыхна паравоз, глуха стогне зямля. Гуд цягніка аддаляецца, хутка зусім чэзне ўдалечыні, і зноў пакрысе ў пошуме клёнаў акрэсліваюцца птушыныя галасы: чоканне малінаўкі ледзьве чуваць, затое льецца, раскатваецца звонкі спеў берасцянкі; вераб'і падляцелі ўжо да прыступак тэрасы, іх сабралася шмат, яны мітусяцца, дзяўбуць скарынку; аднаму з іх — вёрткаму, з рэдкім драным хвастом — пашчасціла схапіць скарынку, і ён мітнуўся ў бэзавы парасnік, і адразу ж усе шухнулі следам, і густая лістота аж дрыжыць ад валтузні, піскату і чырыкання.

І ад таго, што ўсё так будзённа вакол мяне, знаёма, звычна і проста, да незвычайнасці рэзка абвастраецца мой клопат пра нядаўняе — яно ўпарта круціцца ў думках, трывожыць, вымагае параўнанняў, ацэнак, і я спрабую зусім з іншага боку падысці да гаворкі ва ўпраўленні, цвяроза і самакрытычна паставіцца да Віктаравых слоў, да яго ўчынку, спрабую памяркоўна прааналізаваць усё, што звязана з будаўніцтвам нашага дома, і, як ніколі, сурова ацэньваць кожны свой крок. А што, каб нагадзіцца было з Віктарам адразу, не спрачацца, нічога не адстойваць, нічога не браць блізка да сэрца...

Не адстойваць?

Не! Нельга! Як бы я глядзеў тады ў вочы Крыштопу, Рогачу, як бы размаўляў і загадваў нешта рабіць Кізілавым хлопцам?..

Не спрачацца? Прымірыцца?

Гэта ж здрада. І тады ў першую чаргу я б перастаў паважаць сябе самога. Хлусіць, выкручвацца, паддобрывацца, гаварыць і думаць адно, а рабіць іншае... Не-е-е! Гэткай пуцявінкаю я не хадзіў і не пайду ніколі. А тое, што здарылася са мною,— не такая ўжо вялікая бяда. Валя мяне зразумее. Гаворка ідзе аб прынцыпах, аб тым, як разумець свой абавязак на зямлі. І ў нас з Віктарам не дробязная спрэчка і Рогач двойчы памыляецца, калі раіць мне ехаць. Ехаць мне нікуды нельга. Паехаць цяпер — значыцца прызнаць, што Віктар робіць правільна, значыцца адступіць...

У парку пакрысе цямнее; яшчэ рана, але тут, пад дрэвамі, пануе паўзмрок, і на алеі запальваюцца ліхтары. Яны схаваны ў лістоце, і іх не відно зусім, а толькі расплываюцца светлыя кругі над дрэвамі і лісціны робяцца бліскучыя, як бы ад вады. Алея ажывае, гармідарна робіцца і на тэрасе кафэ — хлопцы падвалілі гаманлівай чарадою. Ужо заняты ўсе столікі, і мне трэба ісці адсюль, а я сяджу і маленькімі глыткамі дапіваю піва.

Да майго століка падлятае хлопец. У кожнай руцэ яго між пальцамі па дзве бутэлькі піва; каўнер белай кашулі шырока вывернуты на пінжак, і я гляджу на гэты каўнер, а не на твар хлопца.

— Можна прысуседзіцца? Ці чакаеш каго?

— Не, нікога не чакаю.

— Э-ээ... А чаго ж не вітаешся? Здароў быў, інжынер! — Ён стаўляе бутэлькі на стол, садзіцца, углядаецца на алею.— І дзе Юстын бавіцца? Панеслі ж чэрці. Ну, ліха з ім — прыйдзе, нідзе не схаваецца,— паварочваецца ў мой бок, і я ўспамінаю, што недзе бачыў ужо гэты востры нос, насмешлівыя, бутэлькавага колеру вочы.— Што, Васіля не прызнаеш? Э-ээ... Памяць! А другі вагон памятаеш? І як Нінку ў Смаленску праводзілі?

Вось дык сустрэча. Я ехаў на практыку пасля другога курса. У другім вагоне. Васіль тады быў у вайсковай форме, і з ім была нейкая вясёлая дзяўчынка, якая спявала песні і з якою мы бурна і шумна развітваліся на смаленскім пероне.

— Дык што, за сустрэчу? Падстаўляй шклянку!

— А я ўжо і дамоў сабраўся. Во, дзве пустыя стаяць.

— А вечар? Сёння ж тут шыкоўная гулянка. Ці, можа, дзеці дома ў цябе плачуць?

— Дачка ёсць, але не плача.

— Гэта тое ж самае. Гусарскаму жыццю — крыж!..

Васіль залпам выпівае шклянку піва, выцірае далонёю рот і закурвае; ён нечым узбуджаны, увесь час не сядзіць спакойна, а паглядае на баках, некага вышуквае, потым падхопліваецца, просіць трымаць месца і губляецца ў стракатай людской паласе, што поўніць алею; і амаль адразу ж ён вынырвае адтуль, і за ім сунуцца два хлопцы.

Хлопцы садзяцца за столік, шумна вітаюцца са мною, нібыта даўно і добра мяне ведаюць, паліваюць піва, рагочуць і жартуюць. Васіль знаёміць мяне, і яны называюць толькі імёны: Анатоль і Родзік.

За дрэвамі, на танцавальнай пляцоўцы стогне магнітола, чуваць, як шваркаюць падэшвы па асфальце — не сціхае няспыннае шуханне.

— У мяне якія планты? — Анатоль ківае галавою на алею, дзе, якраз насупраць нас, спыніліся дзяўчаты.— Родзя, нас чакаюць такія планты: на верандзе патупаем крышку, а потым — шурусь да Люсьен.

— Званіла? — пытаецца Васіль.

— Загадвала з'явіцца. Усё па ўзору нядзелі — сімпатычненькі бэнц. І ў Люсьен гасцюе сястра.

— Тады — на конях, Вася, афармі бутэлькі. Рубеж — веранда. Чакаем...

Яны не звяртаюць болей на мяне ўвагі, узнімаюцца і ідуць да дзяўчат. Васіль цягне бутэлькі ў буфет, потым варочаецца, закурвае, але не садзіцца.

— Дык што, інжынер, далучайся! Кампанія наклявалася слаўная. Усё — без дурыкаў. Люсьен любіць толькі майстэрства!

— А хто гэтая Люсьен?

— Толікава. Але ў яе ёсць сястра! Пантамімістка. А вой ты вой! Гэта табе не Смаленск!

— Дзякую за давер. Але я дамоў...

— А мо рванеш? Ну, добрай дарогі!..

Ён развітальна трасе рукою і выбягае на алею, гэты дзіўны і сумятлівы хлопец. Мы з ім і тады вось так сустрэліся і развіталіся — нічога не распытвалі, нічога не расказвалі. Але мне тады ўвесь час здавалася, што ўся яго гаворка — бравада, што за ёю хаваецца добры і шчыры чалавек.

І такое ж адчуванне і цяпер. І тыя хлопцы, сябры яго, таксама, відаць, такія ж: не адразу і здагадаешся, дзе жартуюць, а дзе гавораць усур'ёз... Але мне час ужо...

На аўтобусным прыпынку стаіць некалькі чалавек. Аўтобуса чакаць не хочацца. Ці не пайсці пешкі? Тут я даўно не быў. Ды і тлумна ў галаве неяк...

Вуліца месцамі брукаваная, ціхая; і гэткімі ж ціхімі здаюцца драўляныя хаты ў бухматых шырокіх садах; на слупах гараць ліхтары, і амаль на кожным дрэве за нізкімі фарбаванымі штакетнікамі пабліскваюць ад святла яблыкі.

Гаворка за столікам у парку настроіла мяне гулліва і вясёла. Цікава, што б сказаў Васіль, каб пачуў аб маіх трывогах і ведаў тое, аб чым я думаў увесь вечар? Ды, відаць, зарагатаў бы ці махнуў рукою, як на нейкую дробязь, што зусім не варта ўвагі. Але што гэта я ўвесь час думаю толькі пра тое? Хопіць! Рашэнне прынята. І няма чаго тут бедаваць...

За чыгуначным пераездам вуліца крыху шырэйшая, і ля тратуараў густа і роўна растуць таполі. Хаты ўсе такія ж, драўляныя, але яшчэ далей адсунуты ад вуліцы ў глыб садоў, зусім схаваліся за дрэвамі. Месцы мне ўжо знаёмыя. Зараз будзе завулак, які выведзе да прывакзальнай плошчы, дзе можна сесці на аўтобус і ехаць амаль да самай хаты.

З вокнаў дамоў прабіваюцца праз галіны дрэў вузкія і доўгія промні святла. На лавачцы пад высокім белым штакетнікам хлопец абдымае дзяўчыну. Пачулі мае крокі, сціхліся і сядзяць, бы высечаныя з каменя. Праходжу ля іх, чамусьці робіцца хораша і тужліва.

## 11

Сяджу на тэрасе адзін. Цесць пайшоў да суседа, Ірынка на вуліцы з бабулькаю, а я параскладаў паперу на стале і пішу, пішу...

Пішу ліст у Мінск. У рэдакцыю газеты.

Рашэнне напісаць такі ліст выспела яшчэ на тым тыдні, калі быў падпісаны загад аб маім звальненні і я, праседзеўшы вечар у парку чыгуначнікаў, позна ноччу прываляюкся дамоў. Дзверы былі не зачынены — мяне чакалі, і я ціха ўвайшоў на тэрасу, і цесць, не запальваючы святла, раззлавана папытаў у мяне, якая гадзіна. Дарогаю дамоў я намысліў расказаць цесцю аб сваіх турботах, параіцца, але гэты хмурна-грэблівы яго голас пакрыўдзіў мяне, і я

пайшоў у свой пакой, пастаяў над калыскай дачкі, потым распрануўся і лёг на ложак. Але сну не было, і я ціха адчыніў акно і доўга сядзеў і думаў. Хацелася гаварыць з блізкім чалавекам, а Валя была далёка, бацька ж яе злаваў, што я гэтак позна швэндаўся, і не мог зразумець мяне. А гаварыць мне трэба было, і калі я зачыніў акно, пад руку трапіў аловак і газета — яны ляжалі на падаконні,— і тады неяк зусім нечакана выспела рашэнне напісаць у рэдакцыю ліст. Я нават не ведаю, адкуль такая думка з'явілася, і я тут жа глыбока паверыў, што гэта адзіна правільнае выйсце: напісаць у газету аб усім, нічога не ўтойваючы.

Цяпер я сяджу і пішу. Пачынаю сваё пісанне па вечарах, прыходзячы з работы. Ніхто з хатніх не распытвае, што я пішу, але кожны вечар, як толькі саджуся са сваімі паперамі на тэрасе, усе знікаюць, каб не перашкаджаць. Гэтая пачцівасць да майго занятку радуе і падганяе, і я спяшаюся і хачу напісаць як мага хутчэй. Напісаць добра. Напісаць пераканаўча, сціпла. Ліст не толькі аб тым, што адбылося на будоўлі,— гэта мае думкі, мой роздум аб справядлівасці і шчырасці чалавека, аб яго абавязку заўжды і ўсюды гаварыць праўду, адстойваць і бараніць справядлівасць.

Першы варыянт напісаўся хутка. І ўсё тое, што паклалася на паперу, здалося мне пераканаўчым і грунтоўным. Але назаўтра, прачытаўшы ліст ранкам, я ўбачыў, што ён сухаваты, не прадуманы, не зусім доказны, і перапісаў яго нанава, і не адаслаў, каб перачытаць зноў, крыху спагадзя.

Перачытаўшы яго ўвечары, я ўстрывожыўся яшчэ больш: ліст здаўся мне яшчэ горшы і ў сэрца пракралася сумненне ў мэтазгоднасці мае задумы ўвогуле. І вось цяпер, калі я праўлю яго, перарабляю і перапісваю, здаецца, у апошні раз (ведаю, што раблю правільна — ліст трэба адправіць), мяне зноў адольвае трывога, ці зразумеюць мяне ў рэдакцыі, ці хопіць у іх праніклівасці разабрацца ва ўсім, зразумець не толькі сутнасць мае спрэчкі з Віктарам, але і разабрацца ў тым, што робіцца ў маёй душы. Калі хопіць — добра. А калі не?..

Пішу, адолеўшы трывогу. Зрэшты, не гэта важна — ці зразумее хто, што робіцца ў маёй душы. Мне важна іншае: зразумець сябе, праверыць сваю здольнасць стаяць да канца ў змаганні з тым, што я лічу няправільным, з чым не пагаджаецца маё сэрца, не пагаджаецца мой розум, чаго я не магу прыняць і выконваць. І калі я не разбяруся цяпер у гэтым да канца, калі не знайду правільны адказ... Не, ад-

каз я ўжо знайшоў. Я хачу доказаў. Хачу пацвярджэння правільнасці сваіх думак...

Шохаюць нечыя крокі на ганку. Я чую іх, але не паварочваю галавы і гляджу ў сад на клёны. Думкі, што прыйшлі да мяне, устрывожылі зноў, і я адкладваю ручку і проста гляджу на воблакі, што спыніліся над макавінкамі дрэў; рыпяць дзверы тэрасы; крокі, асцярожныя, прытоеныя, глухнуць за маёй спіпаю. Не, гэта ж нехта чужы.

Паварочваюся хутка, паварочваюся і не веру сваім вачам. На тэрасе стаіць Барыс. У адной руцэ карычневы плашч, у другой складзены вузкай палоскаю часопіс. Барыс маўчыць, намагаецца не ўсміхацца, але губы расплываюцца ва ўсмешцы, якая робіць яго твар і вясёлым і разгубленым.

Я кідаюся насустрач, і мы абдымаемся, і стаім, і агледаем адзін аднаго, і я нават не ведаю, што гаварыць.

— Пішаш, а? — Барыс, смеючыся, ляпае мяне па плячы.— Хочаш адабраць у нас хлеб? О-оў! І паперы зглуміў ладна! Раман? Аповесць? Ці, можа, трылогія?

— Нешта падобнае на пекралог. Але кінем гэта. Потым...

— Чэхаўская сціпласць. Добра. Дазволь хоць зірнуць на стыль...

Ён бярэ са стала аркуш паперы, але я паспешліва выдзіраю ў яго з рук сваё пісанне, хаваю ў папку; мне робіцца чамусьці ніякавата.

— Тоіш прафесійны сакрэт,— жартуе Барыс.— І дарэмна. Некалі ты быў шчодры. Памятаеш тую ноч? Ты вярнуўся на світанні і расказаў мне пра чалавека, які стаіць ля акна. Спачатку мяне лаялі. Цяпер знайшоўся крытык, які лічыць гэта глыбока псіхалагічным і жыццёва праўдзівым. Ты не чытаў артыкула ў «Літаратурцы»? На тым тыдні...

— На жаль... Але як ты апынуўся тут?

— Увайшоў,— ён паказвае рукою на дзверы.— Праз іх. На вуліцы сустрэў маці. Яна сказала: ён піша. А што? Ніхто не ведае. Поўная тайна!

— Слухай, Барыс. Як ты апынуўся ў горадзе?

— Каб жа проста Барыс. Уласны карэспандэнт салідпага часопіса. Прашу!

— Ахвотна веру! Прыму вас з павагаю!

Не хачу пытаць, адхіляю яго руку, але Барыс настойліва совае мне маленькую чырвоненькую кніжачку пасведчання:

— Ты спачатку зірні! Ну, як? Гучыць? Так што правільна робіш, што абяцаеш павагу. І прапануй скінуць пінжак і намыцца. А мо злётаем на Дзвіну? Ці, можа, вада халаднаватая? Пазнавата я прыкаціў.

— Можна паплаваць. Калі ты загартаваны.

— А што? Можам! Быць ля Дзвіны і не пабоўтацца ў ёй? Аб чым жа тады я буду пісаць?

Загортваю ў газету вяхотку, мыла і ручнік.

Барыс увесь час гаворыць аб сабе: як цяжка было яму выбрацца ў камандзіроўку сюды, як ён маліў рэдактара паслаць у Прыдзвінск, як паабяцаў яму залатыя горы: і добры напісаць нарыс пра Дзвіну, і арганізаваць выступленні будаўнікоў...

— А самае істотнае — пачуў твой голас. Была перадача па радыё, і я падумаў: там даўнія сябры. Ірваўся кудысь на Байкал, а часу паехаць і напісаць пра іх — няма. Ды і хто напіша пра вас так, як гэта змагу зрабіць я?

— О! Сталічны апломб і самаўпэўненасць. Дзе ты набыў яе?

— Спадчына. На вуліцы, дзе жыла мая бабка, некалі жыў граф! Ты, бачу, гатовы. Рушылі. Між іншым,— мы прыпыняемся на момант ля прыступкаў тэрасы.— Між іншым, ведаеш, у якое няёмкае становішча я трапіў? Прывёз у падарунак Ірынцы куклу.

— І дарэмна. Яна пачынае лічыць ужо, што гэты свет існуе толькі на тое, каб рабіць ёй падарункі.

— Ты паслухай, што яна мне сказала: «А я ўжо і не маленькая. І з кукламі не гуляю. У мяне ёсць электравіктарына». І так паглядзела! Возьмем яе на Дзвіну?

— Не, не. Мы хуценька вернемся.

Дарогаю не даю Барысу і хвілінку маўчаць і ўвесь час распытваю аб усім яго, баючыся, каб ён не пачаў рабіць тое ж. Мне не хочацца адказваць ні на якія пытанні, але я здагадваюся, што раней ці пазней нам без іх не абысціся, і адчуваю, што гэты нечаканы Барысаў прыезд павінен нешта змяніць у маім жыцці.

На рацэ бязлюдна, толькі на тым беразе, ля павароткі, сядзіць, сагнуўшыся, у чоўне рыбак. Барыс распранаецца першы, бяжыць па касе да вады; пыркі ляцяць ад яго ног, і ён кідаецца з разгону ў ваду і выплывае даволі далёка ад берага, крычыць, узмахваючы рукою:

— Давай! Што, боязь? А ты разганіся і ба-аа-бух! Ах, і цёплая ж вадзіца!..

Вада абдзірае ногі холадам. Разбягаюся, даю нырца.

А выплываю на паверхню, і плынь нібыта адразу пацяплела і незвычайна мяккая.

— Ну, пагналі! — гукае Барыс і хвастае шырокімі саженкамі — плыве на сярэдзіну ракі.— У-уу... Гонкая! Бяры сюды!..

Мы заплываем далёка, потым вяртаемся і доўга брыдзём па мелкаводдзю. Барыс дурыцца, кідаецца на пенныя хвалі, што гоніць перад сабою грудзямі, рагоча.

Вылазім на бераг, дзе ляжыць наша адзенне, і толькі тады адчуваем, што вечар не вельмі і цёплы; твар у Барыса пасінеў.

— А што, як нам да той павароткі? — прапаноўвае Барыс і, прысядаючы, размахвае рукамі.— Улупім навыперадкі! А?

— Не хочацца.

— Не хочацца? Простая боязь. Ты тут заседзеўся і аброс тлушчам. І бегаць развучыўся. Давай, кажу, да павароткі і назад.

— Ну, пачакай! Я табе зараз пакажу, сталіца! Станавіся! Лічу да трох!..

Зрываемся з месца і ляцім па мурожнай траве. Барыс адразу пераганяе мяне — ён бяжыць па сцежцы. Але неўзабаве я вырываюся наперад, імчу, пакідаю яго ззаду і спыняюся толькі на паваротцы; падбягае Барыс, становіцца побач, цяжка і шумна дыхаючы,— ён адстаў ад мяне крокаў на дваццаць.

— Ну як? — пытаюся.— Хто аброс тлушчам?

— Вось і вер людзям. Ты ж абяцаў мне: прыму з павагаю!

— Я сваё слова стрымаю: ззаду цяпер буду. Бяжы наперадзе.

Бяжым назад упоравень, не вельмі хутка. Адзенне здаецца вельмі халодным, калі мы пачынаем апранацца. А выцірацца ручніком нам амаль што і не трэба — высахлі. Барыс, прычэсваючы мокрыя валасы, апраўдваецца:

— Ты тут кожны вечар, відаць, лётаеш. Таму і не дагоніш цябе. А рака якая! Слаўна! Нездарма ж цягнуў я цябе сюды!..

За чорнай пілкаю лесу, што ляжыць на далягляду, барвовым полымем чырвапее неба. Агнявы водсвет кладзецца на ваду шырокай палосаю якраз пасярэдзіне ракі, быццам разразаючы яе на дзве роўныя пуцявіны; вада здаецца барвовай, бы нагрэтая да чырвані; рыбацкі човен высоўваецца з-за павароткі, разразае гэтую палосу, і за

ім кладзецца след, але не чырвоны ўжо, а нейкі цьмяны і зусім не бліскучы, як палын на ўзвалах.

Ісці дамоў не хочацца. Барыс зачаравана глядзіць на раку і раптам пытаецца, і яго пытанне застае мяне знянацку:

— Што ў цябе з Віктарам?

— У якім сэнсе?

— Я бачыў Рогача — выпадкова сустрэліся ля гасцініцы. Тое-сёе ён мне расказаў...

— «Тое-сёе»? Значыцца, інфармацыя поўная. Можаш садзіцца і пісаць нарыс.

— А куды тваё пісанне? Два матэрыялы па адну і тую ж тэму хто друкаваць будзе?

— Хіба абавязкова трэба друкаваць?

— Відаць, трэба. Віктар гэтак ужо заважнеў, што інакшым спосабам яго на правільную дарогу і не вывалачаш... Ну, будзе ў нас з ім размова!..

Мяне зусім не здзіўляе Барысава здагадлівасць. Хаця, якая ж тут здагадлівасць, калі ён ужо гаварыў з Рогачам і бачыў маё пісанне на тэрасе. А вось пагроза размовы з Віктарам... Не трэба, зусім не трэба, каб Барыс абараняў мяне, хадайнічаў...

Толькі пачынаю папярэджваць, і ён адразу закіпае, і я пазнаю ранейшыя яго рысы:

— А я і не збіраюся быць тваім адвакатам! А дакапацца да першакрыніцы не забаронім. Між іншым, гэта часцяком са мною: едзеш па добры нарыс, а прывозіш фельетон. Няўжо і тут тое ж? Рогач здзівіў мяне па-сапраўднаму. Але, думаецца, ён не ўсё і сказаў. Таму выкладвай цяперка! Усю гісторыю!

— Не люблю гісторый. Лепей мы дабрыдзём дахаты, павячэраем, ты раскажаш пра Байкал. І калі ўжо так захочаш — дам пачытаць тую сумную аповесць...

— Ты спачатку раскажы. Там пры бацьках няёмка будзе слухаць...

— Думаеш, прыемна яе расказваць?

— А ты карацей. Але з самага пачатку.

З самага пачатку? А дзе ён, той пачатак? Дзе тая грань, што падзяліла нашы адносіны з Віктарам, з чаго склалася мяжа непрымірымасці? Чаму за такі зусім кароткі час гэтулькі назбіралася крыўды, недаверу, папрокаў? Гэта ж зусім нядаўна Валя была яшчэ тут, мы гасцявалі ў Віктара, і ён, здаецца, быў зусім іншым чалавекам... Не, гэта не пачатак. Гэта працяг ужо... Пачатак быў, думаецца, там,

у тым катлаване, калі мы працавалі ўсе разам — і Барыс, і Віктар, і я — і Віктар моцна злаваў, прайграючы Рогачу партыю ў шахматы... А мо нават і раней, у невядомы мне час, у фактах, зусім мне невядомых...

Барыс не перапыняе, моўчкі крочыць побач, апусціўшы галаў, заклапочаны, хмурны; нават часам здаецца, што ён зусім і не слухае мяне, але варта замаўчаць, як ён адразу ўскідвае галаў, і я бачу ў яго вачах неспакой і зацікаўленасць, разумею, што ніводнае маё слова не застаецца па-за яго ўвагаю. І дзіўна: мне хочацца гаварыць, мне зусім не сорамна прыгадваць усе падрабязнасці, і я не магу даўмецца, чаму гэтак лёгка ідзе мая споведзь. Крыўды на Віктара ў мяне няма. Калі я складаў ліст у рэдакцыю, потым перачытваў яго, дык мне часам здавалася, што думкі ў ім занадта дробязныя, што ў маіх справах толькі асабістае, не вартае вялікай увагі, а цяпер гэтае адчуванне знікла, і я нават і не Віктара абвінавачваю, а нешта большае і, абвінавачваючы, пачынаю разумець, што мая спрэчка з Віктарам закране ўсіх на будоўлі — і Рогача, і Крыштопа, і хлопцаў Кізілы, і Сініцына... Я ведаў і раней, што калі саступлю, не давяду яе да канца, дык перастану паважаць сябе, але цяпер я конча перакананы, што справа не толькі ва мне, старшым прарабу, а ў той агульнай справе, якой заняты мы ўсе на ўчастку.

— Ну і ну! — урэшце выгуквае Барыс.— Каму скажы, дык і не паверыць. Кватэры для выбраннікаў! Адным — ванна з кафляю. Адным — столя высокая... А ўсім іншым — па стандарту, калі ласка. Ай ды Віктар! Чым яго хто купіў? А мо і сапраўды купілі?

— Ніхто яго, думаецца, не купляў.

— Вось бачыш: ёсць у чым разбірацца. І я паспрабую. І не толькі таму, што давяраю табе: гаворка — і тут я з табою цалкам згодзен — ідзе аб вялікім. І абяцаю: на маю падтрымку можаш разлічваць. Заўтра ж... Не, сёння ж я буду гаварыць з Віктарам.

— Сёння гэта не ўдасца — паехаў у вобласць. І прыедзе толькі паслязаўтра. Не раней.

— Пачакаю.

— Але прашу: не абараняй мяне перад ім. Сам за сябе пастаю.

— Я абавязаны праверыць факты. Тады я не толькі забяру твой ліст у Мінск, але і буду змагацца, каб яго надрукавалі.

— А за гэта дзякую. Бо, калі пашлю па пошце, нехта

прыедзе правярань... Пачнецца розная цяганіна... А час ідзе.

— Тады вось як робім. Возьмеш ліст — і да мяне ў гасцініцу. Пачытаем разам. А ў рэстаране павячэраем.

— Не хочаш начаваць у нас?

— Размова на адзінаццаць — трэба званіць дамоў. Рыта не засне, пакуль не даведаецца, як даехаў, што раблю. Такая, ведаеш, творчая справаздача. Толькі не крыўдуй, у цябе мы яшчэ пагасцюем. Я буду з тваімі весці перагаворы, бо спее ў нас такая думка: адпачынак у будучым годзе на Дзвіне.

— Якія табе перагаворы! Дыпламат! Прыедзеш — і ўсё. Месца хопіць.

— Пакінем гэтае пытанне адкрытым. Заўтра я вяду дыпламатычную місію. А сёння ты рыхтуеш глебу. Разумееш? Трэба паважаць старэйшых.

Пакуль што разумею не ўсё. Але тое, што Барыс гаворыць пра будучае лета, мяне радуе: Валя ўжо будзе дома. І калі Барыс прыедзе з жонкаю, адпачынак мы правядзём весела.

Дома мы не затрымліваемся і, адмовіўшыся ад вячэры, збіраемся адразу ж ісці. Барыс жартуе, абяцае, што заўтра зойдзе зноў і застанецца начаваць. Спасылка на размову, якая павінна быць па тэлефоне, гучыць неяк непераканаўча, але Валіна маці не ўпрошвае болей Барыса — пакрыўдзілася. Пракрадваецца і да мяне сумненне, што Барыс гаворыць пра будучую размову не зусім шчыра. Нават мільганула думка, ад якой мне робіцца ніякавата: а мо ён гэтак адмаўляецца, каб не звязваць сябе перад будучай праверкай? Не, не падобна гэта на яго: каб ён што такое думаў, дык не пабаяўся б і сказаў...

Аднак пазней, калі сядзім у нумары гасцініцы і чакаем тэлефоннага званка, я не магу пазбавіцца ад пачуцця нейкай непамыснасці, што завітала да мяне ў хаце, калі Барыс наадрэз адмовіўся застацца ў нас і жартаваў з маці. Я па-ранейшаму веру яму ва ўсім, разумею, што Барыс лепей нічога не скажа, калі не хоча казаць праўды, але маніць і выкручвацца ніколі не будзе, а тое пачуванне прыстала да мяне, і ад яго на душы прыкра.

Барыс сядзіць ля стала, чытае маё пісанне, а я стаю ля акна і гляджу на плошчу. Яшчэ не зусім цёмна, але электрычныя ліхтары ўжо гараць над маладымі таполямі, ярка асветлены і вітрыны дзіцячага магазіна па тым баку плошчы; спяшаюцца прахожыя на тратуарах; ля вітрыны

спыніліся хлопец і дзяўчына, потым хлопец кладзе руку на плячо дзяўчыны, і яны памалу ідуць, і я ўвесь гэты час бачу, як варушыцца яго рука на дзявочым плячы.

Бачу яшчэ краем вока, што Барыс прачытаў апошнюю старонку, пачынае раўнаваць аркушы. Што ён думае? Што скажа? А запытаць не магу: баюся. Цікава, як пачне размову Барыс. «Ну, браце, прачытаў. Мушу табе заўважыць...» Гэтак ён некалі ўвогуле пачынаў гаворку са мною, калі скончыць што чытаць. Калі і зараз пачую гэтыя словы, значыцца, ані ў чым не схлусіць, скажа праўду, скажа тое, пра што думае, нічога не ўтойваючы...

Суха шастае папера ў Барысавых руках. І вось яго голас, нейкі далёкі быццам, нават як бы і незнаёмы зусім.

— Ну, браце, прачытаў. Мушу табе заўважыць...

Я пачынаю дзякаваць, і раблю гэта шчыра, але вельмі паспешліва, і бачу ў яго вачах водсвет агнёў з плошчы, і заўважаю яшчэ, што ён, мабыць, не разумее гэтае парыванне і вызваляе плячо ад маіх рук.

— Дзякаваць яшчэ паспееш, і ліст твой надрукуюць, бясспрэчна. Але я мушу табе сказаць зусім іншае... Разумееш, я гатовы зараз крычаць ад радасці, ад шчасця... Як нейкае адкрыццё, гэты родны мой горад на Дзвіне... Разумееш, вяло мяне сюды не толькі заданне рэдакцыі... Сам ірваўся! Цягнула нейкая сіла, і я апраўдваўся перад сабою, што гэтая сіла — жаданне напісаць пра сваіх таварышаў... Аказваецца, не толькі... І я толькі зараз гэта зразумеў. Нават больш. Не толькі зразумеў, але і жыву ўжо іншым жыццём... Гублялася нейкая ніць у маёй працы... Не хапала нечага... І вось цяпер — наперадзе светла! Я бачу ўжо сваю новую кнігу, як бачым мы вось гэтую плошчу, вось гэтыя агні...

Мы стаім ля акна. Барыс узбуджаны, паглядае то мне ў вочы, то праз акно на плошчу, але, здаецца, не бачыць ні гэтых бляклых у вячэрнім сутонні агнёў, ні людзей, што ідуць па тратуарах, ні нават майго твару — ён жыве нейкім невядомым мне жыццём.

— Хочаш ведаць, аб чым кніга? Чалавек і хлусня. Вось пра што! Пра тое, які след пакідае яна ў душы, як чарсцвее і драбнее чалавечая натура ад маны, ад таго, што чалавек гаворыць і робіць зусім не тое, што думае. І гэта ва ўсім, у малым і вялікім — ва ўсім жыцці.

Ён смяецца, ён прыхінаецца лбом да касяка рамы, і рама дугаецца ўслед за кожным кіўком галавы, потым ён выпрошчваецца і стаіць, закінуўшы назад, на патыліцу,

сашчэпленыя кісці рук, і гаворыць цяпер цішэй, у сумнай і летуценнай развазе:

— Ты ведаеш, бывае так: хлопец сёння гаворыць дзяўчыне прыгожыя словы, а заўтра пахваляецца брудна аб ёй некаму. Ён думае, што гэта смела, што ён мысліць самастойна, думае, што гэта тайна, бо пра тое яна нічога не ведае — не чуе, думае, што ён застаецца ўсё тым жа чалавекам. Няпраўда! Тыя словы, што ён сказаў у брудным пахваленні, начыста разбурылі не толькі каханне, але і змянілі яго: у душы ўжо чарвізна. Нельга брудна і пахабна вылаяцца, а праз хвіліну гаварыць маці высокія і прыгожыя словы. Гэта — абсалютныя супрацьлегласці, як агонь і лёд, як каханне і здрада. Я хачу прасачыць шлях такой натуры: гаворыць адно, а робіць зусім іншае, патрабуе праўды, а сам хлусіць... Што рухае такой натурай? Як яна склалася? Куды яе шлях?

— Ты пазіраеш на мяне так, нібыта я павінен даць табе адказ на ўсе гэтыя пытанні!

— Не, я адкажу на іх сам. Але ты нават не ўяўляеш, якое багацце ты мне сёння падараваў. Ты сапраўдны чалавек, дружа! І мне хочацца — хоць я і не аматар — кульнуць сёння чарку. Толькі не ў рэстаране.

Нас перапыняе тэлефонны званок, доўгі, патрабавальны, і Барыс здымае трубку і пачынае размаўляць з жонкаю. Гаворка яго вясёлая, нават крыху жартаўлівая: даехаў, маўляў, добра, уладкаваўся, паспеў нават пакупацца ў Дзвіне. Тут з повада яго прыезду амаль што нацыянальнае свята, што ён зараз з сябрам возьме чарку, але разам з тым ён сумуе і, мабыць, дні праз тры вернецца...

Слухаю Барыса, і тое, што ён гаворыць жонцы, неяк аддаляе яго ад мяне. На рацэ такога пачуцця не было, а цяпер яно асталявалася ў душы, і я бачу, што Барыс шмат у чым змяніўся, але канкрэтных гэтых змен не бачу, хоць і адчуваю іх, і добра ведаю, што яны ёсць. Магчыма, гэта нейкае дзіцячае самалюбства, але мне ўжо брыдка і няёмка, што я аддаў Барысу чытаць свой ліст, прымусіў разбірацца ў маіх трывогах і клопатах.

Зноў на супрацьлеглым баку плошчы, ля вітрыны дзіцячага магазіна хлопец з дзяўчынаю, якіх я нядаўна бачыў — нечага яны вярнуліся,— прыпыняюцца на хвілінку і потым паціху, бы вельмі ж неахвотна, ідуць у тым жа кірунку, што і раней, і хлопец трымае цяпер дзяўчыну за руку, нібыта вядзе малое дзіця.

І думаю зусім нечакана: сёння трэба паслаць выклік

Валі на тэлеграф. Не ведаю, што буду казаць ёй. Проста хочацца размаўляць з ёю, пачуць яе голас. Толькі голас, і нічога больш...

## 12

Барыс паехаў у аўторак. А сёння субота — «святы», як кажа Кізіла, дзень. Настрой ва ўсіх прыўзняты. Гэта адчуваецца і па жартах і нейкаму асабліва вясёламу і хуткаму рытму нашай працы.

Апошнія дні мы ўвогуле працавалі з напружаннем незвычайным. Усе на ўчастку ведаюць, што я звольнены, але не выканаў загаду ўпраўлення і застаўся на ўчастку радавым будаўніком. Не лічыцца з гэтым загадам і Рогач: ён часова выконвае абавязкі начальніка ўчастка, але ў сапраўднасці кірую ўсімі работамі я сам — Рогач без мяне не аддае ніводнага распараджэння, а мае выконвае строга і няўхільна.

Па-ранейшаму пачціва ставяцца да мяне ўсе былыя мае падначаленыя: ніхто не выказвае мне ніякіх спачуванняў, не распытвае, не прыгадвае той загад, быццам нічога і не здарылася. Але ўсе ўляглі ў працу так, нібыта ад вынікаў яе залежыць не проста нешта вельмі важнае, а асабісты іхні лёс. Адчуваю гэтую маўклівую падтрымку і шчыра ўдзячны людзям, чаго, праўда, апіяк не выказваю, але бачу, што ўсе мы добра разумеем адзін аднаго. За апошнюю дэкаду зроблена тое, што пры звычайных умовах наўрад ці магло зрабіцца і за тры тыдні: пяты паверх амаль закончаны, застаецца на правай палавіне засыпаць цеплаізаляцыю, пакласці сем дахавых пліт, пакрыць рубероідам і заліць швы варам.

Апаўдні прыязджае касір — прывозіць зарплату. Перш чым зайсці ў прарабку, ён падыходзіць да мяне, вітаецца, але маўчыць, не пытае, як звычайна, дазволу выдаваць зарплату; шэрыя вочы за шкельцамі акуляраў нейкія разгубленыя і быццам вінаватыя.

— Выдавайце,— кажу я, забыўшыся, што не маю права даваць такое распараджэнне.— А тое, што мне не налічана зарплата, я ведаю, і няхай гэта вас не трывожыць.

— Так. Віктар Паўлавіч цікавіўся ўчора,— касір азіраецца па баках, нібыта паведамляе мне страшэнную тайну.— І папярэджваў...

— Нават папярэджваў? Строгі Віктар Паўлавіч. А людзі вас ужо чакаюць. Бачыце, сядзяць...

Дзверы прарабкі — нахлашч. Услед за касірам Кізіла вядзе ў прарабку сваіх хлопцаў. Як і звычайна ў такі дзень — жарты, смех. А мне ў прарабцы рабіць няма чаго, і я саджуся на старую скрыню, у якой прывозілі плітку на абліцоўку, выцягваю з кішэні газету.

Звычайна ранкам па дарозе на будоўлю я купляю «Звязду», хоць і выпісваю яе,— газету дамоў прыносяць пазней, калі мяне ўжо няма. І кожны раз, беручы ў рукі газету, я думаю: а што, як надрукавалі! Не прызнаюся сабе, але думаю. Тым часам дні ідуць, а ліст мой не друкуюць. Суцяшаю сябе тым, што Барыс не працуе ў рэдакцыі газеты, ён толькі завёз мой ліст, і, вядома, смешна разлічваць, каб там адразу ўхапіліся за маё пісанне. Барысу яно спадабалася. Але ж не ён усё вырашае. Ёсць рэдкалегія. Ёсць рэдактар. Ляжыць, мабыць, не толькі мой ліст у рэдакцыі, існуе не толькі мая праблема...

Выходзяць з прарабкі хлопцы; ішлі яны туды і жартавалі, а цяпер ідуць ціха, няголасна перагаворваюцца, употай пазіраюць у мой бок. Разумею: гаворка ў іх пра мяне, і разумею — пра што канкрэтна. Я ведаў і раней, што зарплата — у адпаведнасці з загадам — мне не будзе налічана, і падрыхтаваў сябе да гэтага, нават даволі весела, як мне здалося, пагаманіў з касірам і адчуваў сябе няблага, калі бачыў ягоную збянтэжанасць. А зараз адчуваю нейкую пагарджанасць, і яна ўпотай, але настырна валачэ за сабою крыўду. Адганяю гэтае пачуццё ад сябе, змагаюся з ім, але яно вельмі трывала асядае ва мне, і ад яго цяжка і непамысна. Гэта ж я вінюю таму, што ў дзень палучкі ні жартаў, ні смеху ў нас на ўчастку, не чуваць нават звычайнай Кізілавай прапановы — «арганізаваць на ўсю брыгаду...».

Гэтыя дні мне не хапае Крыштопа, і не хапае цяпер, зараз вось,— яго нечакана паклікалі ў вобласць, і ён паехаў, і яго дагэтуль няма. Чамусьці думаецца, што гэты выклік звязаны неяк з нашай справай, з будаўніцтвам дома. Відаць, не абышлося і тут без удзелу Віктара. Пакуль што ў мяне няма падстаў сцвярджаць гэта з упэўненасцю, але я ўжо абвінавачваю яго, адчуваю, як спее, расце мой гнеў. Разумею, што не зусім добра гэта — гневацца, не праверыўшы ўсё спачатку як след, але нічога не магу з сабою зрабіць: адчуванне тое сёння вострае, як ніколі.

Чую за спіною знаёмае пакашліванне — падыходзіць

Сініцын. Нейкі час стаіць побач, потым садзіцца ля мяне і працягвае невялічкі газетны пакецік, падобны на канверт.

— Тут вось... Я надумаў гэта, Леанід Яўгенавіч... Адным словам... І не бярыце за крыўду. Ад шчырага сэрца я...

Не адразу здагадваюся, калі ён гаворыць, які гэта пакецік, і разгортваю. Грошы! Ды што гэта яны! З глузду з'ехалі, ці што?.. Сабралі, відаць, скляліся. Хто прасіў? Чаго яны мне соваюць нейкую міласціну. Я працаваў не горш за любога гэтыя дні. І за маю працу мне заплоцяць — прыйдзе час! — усё, як належыць, колькі б Віктар там ні мудраваў. І грошы чужыя мне непатрэбны!..

— Я пакуль што не жабрак! І з торбаю на сваёй зямлі хадзіць не збіраюся!

Я сoваю Сініцыну пакецік у кішэньку пінжака і так злосна гляджу на яго, што ён узнімаецца і стаіць побач, вінавата апусціўшы долу вочы.

— І хто ўвогуле гэта надумаў?

— А ніхто, Леанід Яўгенавіч. Сам гэта я... Раней я кожную трэцюю суботу Даніку ў Ленінград слаў. А цяперака... А цяперака, як надыдзе гэтае чысло, дык і не магу. Мучыць гэта мяне — не паслаў. Таму і намысліў вашай Валі паслаць. Яна ж вучыцца. А мне — спакой тады на душу...

Ён гаворыць гэта проста, разважліва неяк, але крайчыкі вуснаў у яго торгаюцца і ўздрыгваюць, і ў вачах змрочны, невясёлы цень, ён гаворыць гэта проста і разам з тым як бы крыху няпэўна, нібыта яму дужа няёмка і ён адчувае гэтую няёмкасць, але зрабіць інакш не можа і робіць тое, што намысліў рабіць, і быццам просіць прабачыць.

Разумею, што пакрыўдзіў Сініцына, пакрыўдзіў беспадстаўна, не маючы аніякага права на папрокі. Але ранейшая ніякаватасць не праходзіць, і адчуванне пагарджанасці, якое лягло на сэрца, калі я бачыў, як моўчкі цягнуліся хлопцы з прарабкі, не знікае, а мацнее; паміж ёю і адчуваннем свае вінаватасці перад Сініцыным ніякай сувязі няма, і гэтыя пачуцці жывуць паасобку, і мне цяжка адысці ад першага і яшчэ цяжэй закрэсліць другое; і тое, другое, чамусьці мацнее, расце — яно яшчэ не адолела вінаватасць, але ў ім ёсць сіла, якую я адчуваю і з якой не хачу змагацца.

Сініцын запіхвае грошы глыбей у кішэньку, уздыхае,

але нікуды не ідзе, толькі вочы ў яго цяпер скіраваны не долу, а на нейкую невядомую кропку паверх маёй галавы, і ад гэтага змрочна-далёкага, няўцямнага позірку пачуццё вінаватасці расце, і я міжвольна пачынаю гаварыць, пачынаю пераконваць Сініцына ў тым, што вынадак з маёй зарплатай — часовае непаразуменне, што за сваю працу я павінен і, безумоўна, атрымаю грошы, бо грошы тыя — гэта мая праца, якая стала ўжо рэальнасцю, часткай нашай агульнай справы, што тая мая праца існуе незалежна ад любых загадаў, бо ў ёй увасобіліся мае намаганні, мары, сіла маіх рук...

I з кожным словам, што я кажу Сініцыну, ва мне цвярдзее шчырае перакананне ў тым, што зусім нядаўна, у кабінеце Віктара, я быў дзіваком. «А таварышу Бугрыму, даруйце за слова, напляваць на тыя грошы». Каму патрэбна гэтая наіўная філантропія. Ахвяраваць дзеля вялікага і прыгожага, патрэбнага людзям, патрэбнага народу — пачэсна, высакародна. Ахвяраваць жа сваёю працай з-за свавольства нейкага аднаго чалавека, ахвяраваць на патрэбу бруднай ягонай камбінацыі?.. Гэта не толькі наіўная філантропія. Горш.

Змрочна-далёкі позірк Сініцына скіраваны ўжо на мяне, ён як бы і пасвятлеў, наблізіўся, і ў ім з'явілася нешта ад рэальнасці, зямной думкі. Аднак па-ранейшаму мае словы не закранаюць Сініцына, ён проста не ў стане іх разумець па-мойму — гаворка са мною разварушыла ў яго душы жывы, незагоены боль,— і я пачынаю разумець, што замест гэтай сваёй высокай патэтыкі павінен быў сказаць яму зусім іншае (і гэтае разуменне прыходзіць раптоўна, і мне здаецца, бы нешта цяжкае прыціснула плечы), і робіцца сорамна, што крычаў на Сініцына, папракаў, а потым узяўся апраўдвацца. У чым я хацеў апраўдацца? Трэба было адразу, па-чалавечы, падзякаваць яму, падзякаваць за тое, што ён гэтак блізка да сэрца ўспрыняў маю бяду, трэба было — і гэта, бадай, было б самае правільнае — проста нічога не гаварыць, а моўчкі і шчыра паціснуць яму руку.

— Ну, то так,— марудна вымаўляе Сініцын, і я не ведаю, што хавае ён за гэтымі словамі.— То я тады і пайду... Будзем узнімаць пліты...

— Дык не пакладзена ж яшчэ ізаляцыя!

— Дзе можна ставіць. Прараб казаў, што дзве паставім сёння. А потым тыя. I ўсё!..

I я не ведаю, што яму адказаць, проста няма слоў,

ніяк не знаходжу патрэбныя словы. Крыху спагадзя зноў бачу Сініцына — паволі-паволі ўзнімаецца ён па вузкай лесвічцы да зашклёнай вежы крана; на доле хлопцы завялі ўжо тросы на крукі пліты і чакаюць; з гучным шчоўканнем уключаецца матор крана; уздрыгваюць, варушацца бліскучыя, як жывыя, тросы.

Ад ракі дзьме вецер. Разгарэліся і трашчаць кавалкі дошак пад закопчанай жалезнай бочкай, у якой грэецца вар. Нехта сыпануў на агонь дробнага вару, і цяпер ён гарыць-сіпіць, пухкае, і полымя густое, пругкае, нейкае слаістае, і над бочкаю клубіцца гэткі ж пругкі і тлусты, але дужа чорны дым; вецер круціць яго, гне да зямлі.

Валюхастай хадою дыбае Кізіла. Чамусьці думаецца, што зараз і ён пачне гаворку пра грошы ці пачне папракаць, што паставіўся я да Сініцына нядобра.

— А рубероіду і не вязуць! — весела гаворыць ён, і я нават крыху губляюся ад нечаканай весялосці гэтага паведамлення.— Гэта ж маглі б пачынаць раскатку... І ў сераду б шабашылі!

— Абяцалі сёння даставіць.

— Што тыя абяцанкі! Трэба, мусіць, званіць і ўзнімаць вэрхал. Няма чаго чакаць!

— Рогач званіў учора.

— І сёння не пашкодзіла б. Брыгада прастойвае. Калі вы дазволіце, я магу і звякнуць...

У голасе Кізілы ні ценю насмешлівасці — ён пытаецца майго дазволу сур'ёзна, пачціва, і мне хочацца гаманіць з ім яшчэ: гаворка з ім згладжвае няёмкасць, якую пакінула размова з Сініцыным.

— Пазвані, пазвані... Ты брыгадзір!

Ён выгінае верхнюю губу, чмыхае, цягне з кішэні цыгарэціну, весела і зухавата прыціскае берэт.

— А што? Мне з упраўленнем дзяцей не хрысціць. Я ім зараз па-рабочаму выдам!

— Лаянкай нічога не выправіш.

— А навошта лаяцца? Проста скажу тое, што ёсць. Няхай варушацца...

Насвістваючы, Кізіла дыбае ў прарабку. Потым я бачу ў адчыненыя дзверы яго плечы, бачу, як ён узмахвае і ківае рукою — гаворыць па тэлефоне, нешта даводзіць. Потым ён нечакана вылятае з прарабкі і галосна кліча мяне:

— Вобласць! Вобласць звоніць!..

Тэлефонная трубка яшчэ цёплая ад Кізілавай рукі. Прыціскаю яе да вуха і адразу чую далёкі, але чысты голас Крыштопа. Крыштоп цікавіцца, што ў нас робіцца, і я адказваю яму, але я ўзрушаны, усхваляваны і таму спяшаюся, баюся, што ў нас не хопіць часу на размову, і першае, што пытаюся, дык гэта тое, чаму ён так доўга там затрымаўся і калі, зрэшты, прыедзе.

— У чацвёр прыеду,— гаворыць Крыштоп.— У чацвер. Тут я да старшыні на прыём запісаўся. Разумееш? А ён толькі ў сераду з Масквы вернецца. Разумееш?..

Тэлефаністка папярэджвае, што застаецца адна хвілінка, і гэтая хвілінка пралятае імгненна — мы амаль што нічога і не паспяваем сказаць. Выходжу з прарабкі са шкадаваннем, што не распытаў у Крыштопа пра ўсё як след. Але што распытваць? Тое, што ён сказаў, яснае і вельмі важнае. Крыштоп, безумоўна, не хоча вяртацца, не пагаварыўшы са старшынёю аблвыканкома, таму затрымаўся, чакае яго прыезду з Масквы.

У сераду мы закончым наш дом. А ў чацвер прыедзе Крыштоп. Ён прыедзе з перамогаю. З перамогаю? Не, па яе нікуды не трэба лётаць. Яна тут. Яна заўсёды з намі.

Дзьме вецер. Гнецца, варочаецца на зямлі чорны дым — надвор'е змяніцца, відаць. Свеціць сонца. Зырка бліпичаць тросы, на якіх павольна паўзе ўверх доўгая шэрая пліта. На даху, ля самага краю, стаіць Рогач, раскінуўшы рукі на бакі — камандуе. У вузкім, адсунутым убок акенцы бачу твар Сініцына — засяроджаны, уважны і строгі, але, здаецца, зусім не хмурны. Бачу гэты твар, і неспадзеўкі прыходзіць радасць, накатваецца хваляю, адкідваючы ўсё тое, што пядаўна нудзіла, трывожыла, не давала спакою, я імчу, як хлапчук, наверх, туды, на самы высокі наш паверх, апошні паверх нашага дома, каб стаць там, раскінуць рукі, як гэта зрабіў Рогач, падставіць свой твар пад пругкі і цёплы вецер з Дзвіны...

## 13

Я купіў газету ў кіёску, дзе купляў звычайна, па дарозе на аўтобусны прыпынак, разгарнуў і адразу ўбачыў свой артыкул. На першай старонцы. На самым відным месцы. Загаловак вялікі, кідкі, і пад ім — маё прозвішча: не ўнізе напісана, а ўверсе, у цэнтры артыкула, вялікімі чорнымі літарамі.

Тут жа, ля кіёска, саступіўшы на край тратуара да рэдкай драўлянай агароджы, я чытаю, не зважаючы на тое, што робіцца вакол.

Маё пісанне скарацілі, з'явілася нават некалькі новых выразаў, але ў асноўным артыкул застаўся такі ж, як і быў: нічога не выкраслена, нічога не папраўлена з таго, што я лічыў самым галоўным і патрэбным. Раней, калі я пісаў і потым перачытваў рукапіс, шмат чаго ў ім здавалася мне нязграбным, супярэчлівым, нават не вартым вялікай увагі. А цяпер — поўны гонару. Артыкул, несумненна, важны, калі яго друкуюць на першай старонцы, калі даюць такі вялікі загаловак.

Вуркоча аўтобус, і я, спахапіўшыся, бягу на прыпынак. На хаду ўскокваю. Ля акна чытае газету нейкі незнаёмы мужчына. Чытае (не адрываючыся!) мой артыкул. І хоць ёсць месца наперадзе, і можна прайсці, і нават сесці, я знарок прыпыняюся ў праходзе насупраць, скоса пазіраю на гэтага чалавека. Светлыя, без адзінай прыкметкі сівізны, валасы гладка зачасаны; лоб шырокі, у зморшчынах, нос востры, са скошанымі ноздрамі. На пальцы правай рукі — шырокі залаты пярсцёнак. Зусім як у Віктара пярсцёнак!

Упершыню за гэтую раніцу я думаю пра Віктара. Як ён успрыме артыкул? Што скажа мне, калі прачытае? А прачытае абавязкова ж. І хутка. І будзе, пэўна ж, званіць на ўчастак. Ці, можа, не будзе? Цікава, як ён паставіцца да ўсяго гэтага? Будзе грому! Ой будзе! Але цяпер ужо ніякі гром не закрэсліць гісторыю нашага дома, гісторыю розных пераробак, розных загадаў, гісторыю той працы, што прарабілі Рогач, Сініцын, Ткач, Кізілавы хлопцы... І ў гэтай гісторыі будзе працяг. І як гэта добра, што надрукавалі якраз перад тым, як Крыштоп будзе весці гаворку ў аблвыканкоме.

Вылятаю з аўтобуса і імчу на ўчастак. Ля прарабкі на заплямленых ваннаю дошках сядзяць будаўнікі, стаіць толькі адзін Кізіла — у цэнтры. З газетаю ў руках.

Падыходжу, вітаюся. Адказваюць дружна, як па камандзе.

— Перакур? — гэта самае нейтральнае пытанне, якое, мне думаецца, неабходна зараз.

— Палітінфармацыя,— адказвае Кізіла і трасе газетаю, у якой надрукаваны мой артыкул.— Чытаем вось ваш артыкул.

— Яго можна пачытаць і пасля працы. Спраў у нас на сёння ёсць.

— Ну дык што?

— А тое, што іх рабіць трэба.

— Ды пагонім, пагонім, таварыш інжынер! Тут хоць пачытаем, дык душу аблегчым. Думаеце, добра нам пачувалася, калі Арубка прымушаў тыпкоўку па палец таўсцей класці — свая ж кватэрка! А астатнім — хоць ты захлыніся...

— А чаго я пра тую тынкоўку нічога не ведаю?

— А што казаць было? — пытаецца Кізіла і хавае газету ў кішэню.— Мы ўжо тут пісямко народнаму кантролю чухнулі. Няхай каго трэба пашкрабуць...

І ў маўклівай цішыні з прарабкі далятае звяглівы тэлефонны званок. Тэлефон звоніць працягла, доўга, увесь час, пакуль я іду да прарабкі. Узнімаю трубку, разрываючы сухі напорысты званок, і адразу ж чую голас Віктара — злосны, раздражнены:

— Што, павыміралі ў вас усе? Хто? Звоніш, звоніш...

— А хто патрэбен?

— Хо-хо! Пісьменнік! Не пазнаў — багаты будзеш!..

— Вядома, буду,— кажу я.— Атрымаю зарплату — пабагацею.

— А чаго ж не атрымаў дагэтуль? Я праверыў усё... І даў распараджэнне. Бяры і атрымлівай.

— Пачакаю.

— Чаго ты пачакаеш?

— А пакуль працэнты нарастуць. Як у ашчаднай касе.

— Жартуеш усё. А ў мяне размова сур'ёзная. Слухай, я табе шчыра кажу: трэба грунтоўна пагаманіць. Сёння на дванаццаць мяне тэрмінова выклікае першы сакратар гаркома. Загадана даць усе матэрыялы па першаму ўчастку... Да дванаццаці мы павінны з табою сустрэцца і дамовіцца. Ты ж ведаеш, што на мяне таксама ціснулі. Таму і кажу: самае верпае — нейкі разумны кампраміс. Хто не памыляецца?..

— Кампрамісу не будзе.

— Дык чаго ж ты хочаш?

— Праўды і справядлівасці!

— Праўдашукальнік!

Суха шчоўкае мембрана — Віктар кінуў трубку. Мне яго ўжо быццам і крыху шкада, але тут жа, толькі падумаўшы пра тое, я адкідваю жаласлівасць. Нікчэмная яна

і непатрэбная. Цяпер ён добранькі. А які б ён быў, каб усё павярнулася інакш, каб у маёй кішэні не ляжала газета з надрукаваным артыкулам пра нашу будоўлю?

Выходжу з прарабкі з адчуваннем перамогі. Але ў сэрцы незадаволенасць. Калі мне прапаноўваюць кампраміс, нешта я ўсё-ткі рабіў не зусім правільна. Але што?

Пад рукавом у кішэні шахціць газета, і я кратаю яе рукой, але даставаць яе ахвоты ўжо зусім няма — ён, мой артыкул, нібыта страціў частку свае магічнае сілы. Але я думаю пра яго, думаю пра пісьмо Кізілавых хлопцаў, пра якое даведаўся зусім нядаўна, думаю пра выклік Віктара ў гарком. Будзе, відаць, апраўдвацца, вярнуць, безумоўна, розную лухту на мяне, на Крыштопа... А чаму я даў яму такую магчымасць? Чаму сам, першы, я не знайшоў дарогу ў гарком, чаму змагаўся толькі разам з Крыштопам, а не звярнуўся за дапамогаю да Рогача, Сініцына, Кізілы, да ўсіх тых, з кім я працаваў? І артыкул у газету трэба было, відаць, пісаць калектыўны. А мы вырашылі ўсё зрабіць удвух, толькі самі, адны... Відаць, у гэтым і памылка...

Але ў галоўным я рабіў правільна. У галоўным я не саступіў. І вось наш дом збудаваны, стаіць такі, якім марыў бачыць яго Крыштоп. І гэты дом — яшчэ адзін паверх, самы высокі паверх, у маім асабістым жыцці, тым жыцці, што было да гэтага дня. Я адолеў яго. І цяпер дакладна ведаю, што ў нашым будзённым жыцці, у нашай паўсядзённай працы заўжды трэба быць шчырым і мужным. Інакш нельга. Калі ты быў шчыры і мужны ў дробязі сёння — заўтра ты будзеш шчыры і мужны ў вялікім. Сёння ты не збаяўся, смела выступіў супраць няпраўды і бруду, сказаў смела тое, што думаў, і мужна бараніў свае думкі — заўтра за гэта ўдвая больш будзеш паважаць сябе і ўтрая больш будуць паважаць цябе людзі. Сёння ты дапамог сябру ці зусім незнаёмаму чалавеку — заўтра адчуеш, што гатовы на высокі і мужны подзвіг. Сёння ты скінуў з дарогі камень, што замінаў людзям ісці, заўтра табе захочацца будаваць новую трасу.

Гляджу на наш дом і гэтак думаю. Уласна кажучы, не буду сцвярджаць катэгарычна, што гэта мае ўласныя думкі — мы неяк гаварылі пра тое з Барысам. Ды і хіба важна, ці Барысавы гэта словы? У іх праўда. Жыццё кожнага чалавека, як будаўніцтва новага дома: які збудуеш, такі ён і будзе. І толькі ён, сам чалавек, можа вызначыць,

які гэта будзе дом, якое гэта будзе жыццё: і тое, што ён вызначае і што ажыццяўляе потым,— гэта ўжо не яго, чалавека, асабістае — гэта і справа сяброў, якія з ім побач. І калі ўсё тое, што ты робіш,— гэта ўжо не толькі тваё асабістае, а справа ўсіх, дык ад цябе асабіста залежыць вельмі шмат, залежыць ад тваё мужнасці і смеласці.

А над домам — блакітнае неба. Доўгая страла крана, як узнятая для прывітання рука, здаецца лёгкай і няважкай; у канцы яе, там, дзе звісаюць бліскучыя ніткі тросаў, белая выгнутая, як каромысел, аблачынка; тросы вагаюцца, і аблачынка, здаецца, гойдаецца, бы ўзнімае яе кран на дах нашага дома, і над гэтай аблачынкай, і над дахам у далёкай высі, як стрэлкі, мільгаюць чорныя стрыжы.

*Полацк—Мінск*
*1964—1968*

# І НІЧОГА ЎЗАМЕН

## АПОВЕСЦЬ

### 1

Бывай...

Бывай, Мінск!

Гэта гаворыць Вольга. Яна стаіць непадалёк, ля прыступак, і трымаецца за поручань, нібыта баіцца, што цягнік уцячэ. Але ён яшчэ нерухомы; на шкле, на зялёнай фарбе зіхацяць буйныя кроплі — вагон нядаўна памылі; жаўтаватыя абажуры настольных лямп у вокнах падобны на аграмадныя, бліскучыя ад слёз вочы. І вочы Вольгі таксама бліпчастыя, нетутэйшыя вочы. І голас нейкі роспачны, з трывогаю.

Бывай...

Раней я не любіла гэтае слова. А цяпер яно са мною, і я знаходжу ў ім нешта прываблівае. Але вымаўляць яго ўслых не хачу, бо разумею, што яно закрэсліць шмат чаго з майго мінулага, будзе замінаць мне ў дарозе. З ім увогуле — цяпер я добра разумею гэта — людзям цяжка. А можа, наадварот, лягчэй? Можа. Сапраўды тое, што не міла сэрцу, чалавек часам вельмі лёгка закрэслівае гэтым кароткім словам.

Але Вольга нічога не хоча закрэсліваць — гэта я ведаю дакладна. І мне таксама няма патрэбы нешта закрэсліваць. Я пражыла не вельмі вялікае жыццё. Уласна кажучы, не жыла зусім. Вучылася. Пазнаёмілася з Вольгаю. Разам з ёю скончыла медыцынскі інстытут. Цяпер едзем на працу.

Разам, праўда, мы толькі на пачатку дарогі: Вольга едзе працаваць у Друйскую чыгуначную бальніцу, а я — у Заазер'е, што на самай мяжы з Латвіяй. Там таксама бальніца, але вясковая, і чыгункі паблізу няма. Бліжэйшая чыгуначная станцыя кіламетраў за паўсотні — так мне здалося, калі я зірнула на карту.

Магчыма, гэта крыху і дзіўна: сяброўкі, а працаваць едзем у розныя куткі. Уласна кажучы, нічога дзіўнага тут няма: мы з Вольгаю дужа розныя і ў вялікім і ў драбні-

цах. Я нават не ведаю, чым мне так блізкая Вольга. Праўдзівая, смелая, часам нават да рэзкасці шчырая. Яна нікому не змоўчыць, нават калі і па шкоду ёй гэта павернецца.

І ў мяне такая ж натура.

І яшчэ ў адным мы зыходзімся: любім паэзію. Праўда, я блага запамінаю вершы, але люблю іх слухаць. Магу слухаць бясконца. А ў Вольгі памяць бліскучая. Вершаў ведае яна мноства і чытае іх вельмі ж выдатна.

Аднойчы мы былі з ёю ў Батанічным садзе. Мы з магнітафонам туды пайшлі — галасы птушак запісаць. Але птушкі блізка да сябе нас не падпускалі. Мы тады намыслілі іх падпільнаваць і стаіліся на лавачцы пад бярозаю.

Сядзець моўчкі нам хутка надакучыла, і Вольга пачала чытаць вершы. Можа, з гадзіну яна іх чытала, а я магнітафон уключыла і запісвала. Потым мы разам паслухалі запіс. Вольга нечага збянтэжылася, пачала патрабаваць, каб я сцерла запіс. Але я адмовілася, нават сказала, што ёй варта паспрабаваць чытаць у філармоніі. Яна на мяне пакрыўдзілася страшэнна. Раней не крыўдавала, а тут нават крыкнула, што я чалавек няшчыры. А потым прызналася, што маці ўвесь час марыць артысткаю яе бачыць.

Колькі я пазней ні прасіла Вольгу пачытаць на запіс мне, яна адмаўлялася і жартавала ўсё, што, маўляў, з філармоніяй развіталася. Я і не прасіла болей, але аднойчы, калі мы сабраліся на Новы год, яна зноў чытала вершы і пасмейвалася, маўляў, чаго ж ты магнітафон не ўключаеш. А потым з усмешкаю сказала: «Бывай, філармонія...»

І мяне дзівіць цяпер: тыя ж ноткі гучаць у яе голасе — быццам знарок гаворыць, нібыта дражніцца. Можа, яна і сапраўды цяпер шкадуе, што не паслухалася матчынай парады. А мо ўсё гэта мне проста здаецца?

Вакол Вольгі поўна родзічаў. Яны нананосілі кветак, нешта ўсё ёй гавораць, гавораць. Маці Вольгі заўсёды была ласкавая і ветлівая да мяне, а цяпер быццам і не заўважае, паглядае толькі на сваю дачку: то прыгладзіць валасы ёй, то паправіць каўнерык кофтачкі. А ў вялікіх чорных вачах — слёзы. Вольга ж — усміхаецца. Тут, на пероне, у гэтай сваёй новай белай сукенцы і малінавай кофтачцы яна зусім не падобна на сваю маці: нізенькая, танклявая, светлыя валасы над высокім лобам. А бровы — матчыны: чорныя-чорныя.

Ніхто не праводзіць, ніхто не прыкмячае мяне. На пероне ўсё шырэе натоўп, гусцее людскі тлум. А я — адна.

Уласна кажучы, мяне няма каму праводзіць. Бацькі другі год за мяжою — працуюць на Асуане. Дома толькі бабуля. Яна старая, і ў мяне з ёю ладу часцяком не было. Бабуля не жыла з намі, але як бацька і маці паехалі ў замежную камандзіроўку, яна перасялілася ў нашу кватэру. Вольга жартам сказала, што бацькі нанялі яе пільнаваць маю маральнасць. Яно і праўда: бабуля падазрона глядзела на кожнага хлопца, які падыходзіў да мяне бліжэй чым на два крокі.

Але бабуля цяпер дома. Белае святло ліхтароў ліецца на асфальт, і ён здаецца бліскучым; бляск гэты сухі, колкі; і нейкім сухім і далёкім выдае голас з дынаміка — металёва спакойны голас.

Да адпраўлення цягніка застаецца пяць мінут!

— Усё! Бывай! І — бывайце! Да новых радасных сустрэч! — гаворыць Вольга.— Галка! У вагон!

Вольга ўскочыла на прыступкі, знікла ў калідоры, і ў тоїі жа міг усе яе родзічы дружнай купкаю мітнуліся да акна. Я ўзялася за поручань і, быццам хто паклікаў мяне, азірнулася.

Валера! Мой Валера!

Я нават ледзьве не крыкнула гэта ўголас, калі ўбачыла яго, знямела ў радасным здранцвенні. З вялікім букетам кветак, за якім амаль хаваўся яго твар, Валера бег уздоўж вагона. Шэра-белы пыльнік, выцвілы на сонцы, напінаўся за яго плячамі ветразем. Валера вынырвае з-за купкі родзічаў Вольгі, перакідвае букет кветак з адной рукі ў другую.

— Дзе сёмы? Дзе сёмы вагон? — стукаў мне ў вушы незнаёмы голас.— Сёмы дзе вагон?

Ніякі гэта не Валера. Але якое падабенства! Не, нічога ў ім падобнага на Валеру няма!

— Гэта і ёсць сёмы,— кажу я, хоць і бачу, што хлопец глядзіць на нумар вагона.

— Без акуляраў. Я вельмі блага бачу без акуляраў. Дужа ж спяшаўся...

Праваднiца спрабуе спыніць яго, гаворыць, што цягнік зараз адправіцца. Але хлопец нават не хоча слухаць яе.

— Праводзіны. У мяне — праводзіны. Толькі праводзіны. Аддам кветкі, і ўсё! — тлумачыць ён праваднiцы і знікае ў вагоне.

У мяне такое адчуванне, нібыта ў вагон зайшоў Валера. Глупства, вядома. Валера зараз далёка — паехаў на Мангышлак у камандзіроўку ад кафедры. Дзіўна, чаму я

зблытала яго з гэтым незнаёмым хлопцам? А-а-а, гэта шэра-белы ветразь!

Летась, увосень, мы з Валерам паехалі на Мінскае мора. Я не збіралася туды ехаць, і ён напярэдадні не меў такога намеру, але паехалі. Сустрэліся выпадкова ля пошты — ён адпраўляў артыкул у маскоўскі часопіс,— і надышоў якраз аўтобус, і мы селі і паехалі. Валера любіць гэтакія неспадзяваныя і нечаканыя рашэнні. І ніколі, ані-воднага разу нам не было сумна.

Мора было буйнае, неспакойнае. Хвалі лезлі на сцэментаванае каменне дамбы; гнуліся, шумелі таполі; і біўся, трымцеў, напяты ветразем на Валеравай спіне, старэнькі шэра-белы плашч. Я бахнула яшчэ па гэтым ветразі рукою, а Валера, сагнуўшыся, зачэрпнуў у прыгаршчы вады і ліпуў на мяне; але толькі маленькія кроплі трапілі мне на твар — такі моцны быў на дамбе вецер...

А цяпер Валера далёка.

Але нават каб і быў ён зараз у Мінску, ён бы не прыйшоў сюды. Я б не сказала, калі і якім цягніком еду. Мяне зараз ніхто не праводзіць. І ён не ведае гэтага. Ён увогуле шмат чаго не ведае. І не ведае, вядома, галоўнага, не ведае, што я кахаю яго.

Аднаго!

Назаўжды!

На ўсё жыццё!

Дзіўна, вядома: кахаю, а еду не да свайго кахання, зусім у іншы бок, нібыта ўцякаю. Не памятаю дзе, але чытала, што каханне наша падобна на цень: бяжыш за ім — ён уцякае. Калі ж спрабуеш уцячы — імкнецца наўздагон. Наўздагон?! Але мне не варта і думаць пра гэта...

Да адпраўлення цягніка застаецца дзве мінуты!..

Дынамік падобны на зыркую белую птушку. Я гляджу на яго з нейкім страхатлівым узрушэннем, нібыта хрыпаты металёвы голас не проста папярэдзіў пра гэтыя дзве мінуты, а паабяцаў паведаміць нешта дужа добрае і патрэбнае, але пра што я загадала сабе не думаць.

Дзівачка! Як жа гэта не думаць пра тое! Ты будзеш думаць пра тыя дні і ніколі нічога не закрэсліш з іх. І ў гэтым, магчыма, і ёсць найвялікшае шчасце чалавека: благое ён можа закрэсліць і адкінуць, а добрае гадаваць у сваім сэрцы, з ім жыць, на яго спадзявацца.

Яркай чырванню зіхацяць вялікія літары на франтоне станцыйнага будынка. Белаватая, бы з фальгі зробленая,

лістота таполяў за агароджаю матляецца ад ветру, і мне здаецца, што я чую той сухі шоргат таполевай лістоты там, ля Мінскага мора, уніз за дамбаю.

Цягнік крапаецца. Я ўваходжу ў тамбур, у вагон, але мушу адступіць крок назад: мне насустрач імчыцца той хлопец у шэра-белым пыльніку. З ружамі! Значыцца, ён не знайшоў таго чалавека, каго прыходзіў праводзіць.

— Гэта — вам! Разумееце, вам! — Ён кладзе мне на рукі цяжкі букет руж і сігае з тамбура.

Ні адмовіцца, ні сказаць яму нешта, ні проста падзякаваць я не паспела. І не магу зірнуць на перон — праваднiца гоніць мяне з тамбура ў вагон.

Я спяшаюся ў купэ, каб зірнуць у акно на таго хлопца.

«Гэта — вам...»

Ён проста пераблытаў нешта. А мо не стрэў тую, каму былі прызначаны гэтыя кветкі, і вырашыў падараваць іх мне? Стаяла ў яго на дарозе, вось і аддаў.

У акно купэ бачу чырвоны цагляны гмах — перон ужо скончыўся, застаўся ззаду; і недзе там, на пероне, той незнаёмы хлопец. А мо яго проста папрасіў Валера прыйсці на вакзал і праводзіць мяне? Але Валера не ведае, калі я павінна ехаць, куды...

А ружы цудоўныя! Якія ж яны цудоўныя, гэтыя ружы! І дужа няёмка, быццам чужое што на тваіх руках...

## 2

## *Думкі ўночы*

Вяселле Вольгі.

Усе на добрым падпітку. Ужо ўсе стаміліся скардзіцца на гаркату віна, стаміліся спяваць. І ніяк не стомяцца госці гаманіць, балбатаць — кожны аб сваім, прымушаючы свайго субяседніка толькі слухаць. Але слухаць ніхто не хоча, і ў пакоі гармідарна, шумна вельмі, але весела.

Відэлец, што ляжыць ускрай мае талеркі, пачынае — я нават у такім гармідары чую гэта — трымцець: у суседнім пакоі шпараць «Лявоніху». Ведаю: гэта — Валера. І нейкая магутная сіла цягне мяне туды. Убачыць яго. І — усё! Болей мне нічога не трэба!

Я думаю пра гэта, і сама пасміхаюся з свайго жадання, і разумею, што гэта не проста жаданне, а нешта большае, непадуладнае ні сэрцу, ні розуму. Яно, гэтае «нешта», прыйшло да мяне зусім нядаўна, калі я ўбачыла Валеравы вочы.

Блакітныя... Амаль сінія вочы!

Ён прыпазніўся на вяселле, прыйшоў, калі было ўзнята нямала тостаў, і яго з'яўленне не выклікала здзіўлення і авацыі. Але я заўважыла яго адразу, заўважыла, як толькі ён увайшоў і выглядаў месца, дзе сесці.

«Сядай каля мяне!»

Я загадала гэта ўпотай. І ён сапраўды сеў побач — ля мяне было вольнае крэсла. Але я падумала, я была ўпэўнена, што гэта выконваецца мой маўклівы загад, і гэта надало мне смеласці. Я наліла яму чарку, спытала, што пакласці на закусь, і калі рыхтавала бутэрброд, не пашкадавала масла.

— Аднак,— заўважыў ён.— Рука ў вас шчодрая! Клопат пра бліжняга?

— Закон вяселля. Калі п'юць — трэба закусваць. Асабліва добра масла пасля першай чаркі. Прапаную яшчэ гэта. Фаршыраваная рыба. І аздоблена яна прыгожа. Нават цыбулька з пашчы. Цыбулькі пакласці?

Ён кіўнуў галавою:

— Шчупак глядзіць на мяне, нібыта збіраецца праглынуць, як гэтую цыбулінку.

— Мужчыны павінны заўсёды ісці насустрач небяспецы!

— Але разумна! Не на злом галавы.

— Гэтую перасцярогу мне рабіла звычайна Вольга.

— Па логіцы рэчаў: вы таксама будзеце казаць гэтую перасцярогу на сваім вяселлі каму-небудзь.

— Магчыма. Але не раней як праз тры гады.

— Тры? Вельмі задавальняе мяне гэты тэрмін. Раней мне не ўдасца, на жаль, прапанаваць вам руку і сэрца.

— А навошта расцягваць на тры гады? Зараз — руку. А сэрца — потым...

Жартую. Ведаю, што гэта неразумна, але ўтрымацца не магу, нібыта не я, а нехта выmаўляе мае словы і прымае мае жарты, і мне з ім весела і добра...

А цяпер ён там, у суседнім пакоі, дзе звініць, грукоча «Лявоніха», дзе гучна пляскаюць далоні. Але яго твар, яго насмешлівыя вочы глядзяць на мяне з кожнага кутка. Туды! Мне трэба быць там, побач з ім!..

Затрымлівае Зіна. Падыходзіць з працягнутым келіхам, патрабуе выпіць.

— За нашае славутае трыё! За памяць аб ім! І за добрае жыццё вольных птушак — нас з табою!

Славутае «трыё» — гэта мы: Вольга, Зіна і я. Тры

школьныя сяброўкі, якія яшчэ ў сёмым класе пакляліся на кляновай лісціне: заўсёды, ва ўсім, на ўсё жыццё — разам! Да магілы! І вось, калі ласка: Вольга, якая і стварыла гэтае трыё, першая і разбурыла наш саюз.

У маім келіху няма віна. Зіна робіць знак Вользе, але тая нічога не бачыць, нічога не заўважае, апроч Сцяпана.

— Бачыш! — абураецца Зіна.— Яна вінаватая, што наш саюз гіне, а робіць выгляд, што яе хата — з краю. Пайшлі да яе, разам узнімем чаркі!

— Гэта няпраўда, што наша трыё гіне. Святая справа ніколі не памірае, калі адзін салдат памірае ў баі. Нават не памірае, адпраўляецца ў другую армію. Наш саюз бессмяротны!

— Правільна! — гукае Валера. Я нават не заўважыла, як ён апынуўся побач, але вельмі ўзрадавалася, што гэта здарылася.— На яго месца стане другі! Я не ведаю статута вашага саюза, але ахвотна іду ў яго. Прымаеце?

— Патрэбна рэкамендацыя!

— Калі ласка, вось яна. Рэкамендацыя чысцюткая, як боская крыніца!..

Валера працягвае бутэльку, налівае нам віно, і мы, узняўшы чаркі, ідзём да Вольгі. Да яе цяжка прабіцца, нас прыпыняюць, прымушаюць чокацца, і мы чокаемся, але не п'ём, і Зіна ўпарта цягне нас наперад.

Вольга, узрадаваная, чакае нас. Яна ўсміхаецца, чокаецца з усімі намі па чарзе, падносіць да вуснаў і тут жа адстаўляе чарку: позірк яе затуманены, шчокі запунсавелі — мы для яе ўжо не існуём.

Зіна штурхае мяне локцем.

— Пайшлі. З ёю няма чаго гаварыць. Яна ўжо на небе. І не на сёмым, а ўдвая вышэй. Але мы — за яе п'ём!

Нашы келіхі звіняць. Я патрабую: наліць яшчэ! Зіна рашуча мяне адгаворвае: блага, маўляў, будзе, закусіць трэба хоць чым. Я ўпарта трасу галавою: няхай блага, але мы павінны выпіць за нашае сяброўства, за агонь вернасці, які не павінен згасаць у нашых сэрцах... Скончыць гэты тост мне не даюць, і мой голас патанае ў патрабавальным і радасным: «го-рка!» І я сама крычу гэта, і роў сп'янелых галасоў дзіўна вярэдзіць сэрца.

Валера сустракае мяне ўзнятым келіхам.

— У гонар справы салдата, які ніколі не памірае! І справы, якая жыве, калі салдат памірае ў баі!

Ён паўтарае мае, крыху перароблены́я, словы. Помніць! І я губляюся ад гэтага, мая смеласць некуды знікае.

Але ён глядзіць на мае рукі, і я ўзнімаю келіх. Ён сочыць за маімі рухамі, яго вочы глядзяць даверліва і падбадзёрваюць, і я выпіваю келіх да дна.

— Пойдзем кружыць «Лявоніху»!

Я нібыта чакала гэтае прапановы, паставіла келіх на стол і працягнула Валеру руку.

Мы кружым «Лявоніху», потым вальс і зноў вальс, і Валера вельмі асцярожна трымае маю руку, і я толькі цяпер заўважаю тое, чаго не заўважала раней: спартыўны пінжак Валеры, асабліва рукавы, занадта кароткі, ён вырас з яго. І тэніска, некалі тэракотавая, выцвіла, зрабілася амаль белая. Я бачу гэта, і бачу яго вочы — крыху сцямнелыя, але даверліва-радасныя вочы,— і бачу свой адбітак у бліскучых зрэнках.

На ўсю моц грыміць радыёла. Цяпер ужо не «Лявоніха», а плаўны вальс. З суседняга пакоя ляціць узрушанаха», а плаўны вальс. З суседняга пакоя ляціць узрушана-патрабавальнае «го-орка»; глуха бухае шампанскае. Але ўсё гэта цяпер далёка, вельмі далёка, а тут, дзе мы з Валерам танцуем, зусім іншы свет, і ў гэтым свеце ўсё спявае і некуды імчыць, але я нічога не заўважаю, апрача Валеравых вачэй.

— Гэта «Вальс кветак»,— гаворыць Валера.— Вы любіце кветкі? Закрыйце вочы, калі ласка... На хвіліначку! Вось, вось... Цяпер мы ўжо не тут. Мы далёка адсюль. На лузе, і рэчка побач. Адчуваеце, якая мяккая травіца... Асцярожна, тут капаўка... Та-ак, мы перайшлі яе... А вакол — кветкі, кветкі, кветкі... І гудуць пчолы. І павявае ветрык. І водар кветак. Адчуваеце? Прыгожыя, слаўныя кветкі...

Сапраўды гладыёлусы! Водар іх я ніколі ні з чым не зблытаю — водар тонкі, амаль няўлоўны, крыху нагадвае звялую гартэнзію. І я не здзіўляюся, веру яго словам, і ў маім уяўленні дужа выразна бачыцца тое, пра што гаворыць Валера. Прырэчная лугавіна, кветкі... Мы шпуруем гэтым вялізным лугам. Свеціць сонца. Паволька плывуць над лугам белыя маленькія парасончыкі, з кароткім цвырканнем мільгаюць ластаўкі — нізка-нізка, над самай травою, і лугавіна здаецца бясконцай, і гнуткае мроіва трымціць над стракатым россыпам кветак. І раптам — павеў халоднага ветру. Гэта — рака! Яна была далёка за лугавіною, а вось цяпер наблізілася, мы спыніліся па-над узвалам, і халодны вецер — гэта адтуль, з таго боку...

Адкрываю вочы і бачу ў Валеравай руцэ каліва белага гладыёлуса, і бачу адкрытае акно, і адчуваю, як поў-

ніць сэрца ўдзячнасць. Удзячнасць за Валераву прыдумку, за тое, што ён так лёгка вальсуе, і вальсуе менавіта тут, ля адкрытага акна, удзячнасць кожнаму яго слову.

Мне здаецца, што ўва мне няма ні сэрца, ні думак, ні імкнення, а ёсць толькі гэтая лугавіна, якую Валера дзеля жартаў прыдумаў, але якая жыве звычайным рэальным жыццём, і ў гэтым жыцці поўна кветак, шчэбету ластавак, бляску сонца і водару траў і кветак. Я ў палоне гэтага летуцення, гэтай дзіўнай, па-дзіцячы наіўнай казкі, але я веру ў яе існаванне, жыву ёю, радуюся, нават ніколькі не трывожуся, што яна можа скончыцца, скончыцца ў адно імгненне, як толькі аціхне радыёла і мы спынімся...

З вяселля мы ідзём разам. Валера яшчэ там, на вяселлі, сказаў, што будзе праводзіць мяне дадому. Перадранішнія вуліцы ціхія, гулкія, і я іду асцярожна, быццам нясу ў руках тонкую кволую пасудзіну.

Ідзём пешкі да парку Чалюскінцаў, і неба над соснамі паціху ружавее. Ночы ўжо няма, у шэрай дымцы калоны аркі ля Батанічнага саду здаюцца тоўстыя, нібыта абгорнутыя шызай ватай. Мінаем гэтыя калоны і блукаем сцяжынкамі парку, а потым выходзім на лугавінку ля валейбольных пляцовак; белая ад расы лугавіна здаецца зацярушанай зыркім зорным жвірам.

Дом мой непадалёк, за ручаём, цераз які перакінуты жалезны масток. Ручаіна двойчы перагароджана глiністай дамбаю, і на тых азярках заўжды поўна рыбакоў. А сёлета вясною спявалі салаўі. Я кажу пра гэта Валеру, а ён смяецца, цягне мяне за руку:

— Хутчэй, хутчэй. Зараз пабачым, як хораша ўзыходзіць сонца. Ёсць такая кніжка — «Хораша ўзыходзіць сонца». Чытала?

— Чытала. І бачыла мо сто разоў, як яно ўзыходзіць.

— Але такога ты яшчэ не бачыла. Мы на вышку ўскараскаемся і пабачым. Яго ніхто яшчэ ў Мінску не бачыць, а мы — убачым! Самыя першыя ў горадзе ўбачым!

Драўляная, даваенная яшчэ вышка здаецца мне казачным і дзіўным збудаваннем. Мноства разоў я ішла сцяжынкаю непадалёк, але да яе не падыходзіла: вышка была звычайнай, як і любое дрэва ў парку. Але цяпер яна трывожыць і хвалюе мяне, і я падыходжу да яе з нейкай перасцярогаю. Унізе вышка шырэзная, бэлькі ўсё ў расколінах, спрэс парэзаныя сцізорыкамі, накрэсленыя рознымі надпісамі, лічбамі, імёнамі.

Першых прыступак на лесвічцы, што вядзе на пе-
ракрыцце, няма. Валера прыгінаецца, прымушае мяне ста-
навіцца яму на плечы. І я раблю гэта, і ён узнімае мяне, і
я караскаюся на драўляны насціл першага перакрыцця.
А далей ужо ёсць прыступкі, і мы ўзнімаемся на самы
верх.

На вачах у мяне нейкая імгла. Сэрца грукоча ў гру-
дзях, і адчуванне свае істоты знікае, нібыта незямная зра-
білася.

— Гэта цуд! — гукае Валера.— І мы з табою — яго
творцы!

— А сонца якое! Якое сонца!..

Такога я яшчэ не бачыла ў жыцці! Наш трохпавярховы
дом за азярком, само азярко і гліністая дамба, і рэйкі дзі-
цячай чыгункі, і зялёныя і сінія вагончыкі за пераездам
здаюцца маленькімі, быццам цацкі. І ўсё тое, што на зям-
лі, маленькае і кволае. А затое неба — агромністае, агром-
ністае! І гэтае агромністае неба, з трыма маленькімі па-
лоскамі белых хмарак, нібыта ўзнімае мяне насустрач
яркаму сонечнаму дыску, што ўсплывае на небакрай крыху
лявей соснаў парку. Раней я насміхалася з выразу «нібыта
крылы выраслі». А цяпер яны ў мяне былі. І каб Валера
прапанаваў мне паляцець туды, да соснаў, за якімі ўзыхо-
дзіла сонца, я б не вагаючыся рынулася б з вышкі...

І гэтае адчуванне лёгкасці і ўзнёсласці было са мною і
пазней, калі мы развітваліся з Валерам ля майго дома.
Я запрашала яго зайсці да нас, абяцала яму выключную
«каву па-турэцку». Але ён доўга і моўчкі ўглядаўся ў мае
вочы, потым з нейкім шкадаваннем у голасе адмовіўся і
развітаўся.

Я глядзела, як ён ідзе. Спартыўны, пругкі крок. Мне
хацелася, каб Валера азірнуўся. Я маліла, загадвала, як ра-
біла гэта, калі ўбачыла яго на вяселлі, але ён не азірнуўся.
А я ўсё чакала, стаяла і чакала да таго часу, пакуль яго
постаць не схавалася за дамбаю. Ён не азірнуўся, і мне
чамусьці зрабілася ад гэтага яшчэ радасней, нібыта я пера-
каналася ў нечым важным, і была ўдзячна яму за гэта, і
птушкаю ўзляцела на свой паверх.

Дзверы былі адчынены нахлапч, і, трымаючы іх за руч-
ку, у калідоры мяне чакала бабуля. Упершыню я адчула
да яе варожасць, сапраўдную варожасць, і яно, гэтае пачуц-
цё, яшчэ больш памацнела, калі пачула лаянку.

«Я ночы не спала, чакаю басурманку гэту, а яна лю-
бошчы да сонейка ладзіць».

Аказваецца, бабуля стаяла ля акна і назірала за намі! Яна бачыла, як мы ішлі дамбаю, як развітваліся! Гэта ж цуд проста, што Валера не азірнуўся. А каб ён азірнуўся, я б напэўна мітнулася да яго і пачала б цалаваць, цалаваць...

І гэтая мая думка закрэслівае ўсе бабуліны папрокі. Бабуля ходзіць на кухні, грыміць там посудам, бубніць «бацькам яшчэ напішу, усё чысцяком напішу», але я ўжо жыву зусім на іншай планеце.

Бухнулася на ложак, закрыла вочы і зноў адчула сябе птушкай, якая можа ляцець куды захоча. А потым мроілася: лугавіна над ракою, і я іду ўслед за Валерам, і Валера абсыпае мяне кветкамі. Валера ідзе шпарка і ўсё далей і далей адыходзіць ад мяне, і я не магу дагнаць яго, бо трава высокая і густая і замінае ісці.

Але голас Валераў увесь час чуцён мне, і гэты голас, як чароўная мелодыя, ад якой радасна і добра на душы, і не хочацца ані пра што думаць, а толькі слухаць той голас і ісці за ім па густым сплячэнні траў і кветак...

Валера жанаты.

У іх ёсць дачка, ёй ужо два гады. Але з жонкаю Валера не жыве. Разышліся яны летась, а ў чым прычына, невядома. Дакладней, вядома, ёсць дзве прычыны, але адна выключае другую.

Тлумачэнне Валеры: эгаістка з галавы да ног, я ёй не веру.

Тлумачэнне Рыты: эгаіст з ног да галавы, верыць яму, спадзявацца на яго нельга.

Пра ўсё гэта мне расказвае Вольга. Яны прыйшлі да нас удваіх — яна і яе муж Сцяпан. Твар Вольгі нейкі змрочны, а вочы — разгубленыя. А Сцяпан трымаецца пачціва, з гонарам, на мяне паглядае як на малое дзяўчо — аніводнага слова ўсур'ёз. Як толькі прыйшлі яны, дык Сцяпан амаль увесь час з бабуляю маёй,— нейкая ўзаемная павага ў іх,— сядзяць, гамоняць.

А мы з Вольгаю на кухні. Нам ніхто не замінае, і Вольга, нібыта выключную таямніцу, адкрывае мне ўсё тое, што яна ведае пра Валеру. Дакладней, тое, пра што даведалася ад свайго мужа: Сцяпан і Валера, аказваецца, даўнія таварышы.

Усё гэта мне ведаць цікава, але я ніяк не магу пазбавіцца ад дзіўнага пачуцця, якое ўпарта расце ва мне. На-

вошта яна ўвогуле гаворыць мне гэтыя свае таямніцы? Дзеля чаго? Хоча, магчыма, пераканаць мяне, што Валера благі чалавек і папярэдзіць, каб не зрабіла глупства. Але ж пакуль што яна нічога такога, мабыць, не мае на ўвазе, гаворыць неяк вельмі абстрактна, не звязваючы маё імя з лёсам і мінулым Валеры.

Але вось ужо і канкрэтная парада:

— Ты не вельмі давярайся яму. Валера галаву ўмомант замуціць-закруціць.

— Няхай круціць, галава — мая,— сказала я, не таячы крыўды.

— У Рыткі таксама была не чужая.

— Якая яшчэ Рытка?

— Жопачка яго! Законная!

— Ты ж казала, што не жывуць яны разам другі год.

— А хто можа паручыцца, што гэта праўда? Такія вось халасцякі дужа небяспечныя: іх падманулі, дык яны любой дзяўчыне гатовыя адпомсціць. Ой, Галчо, прыглядайся ўважна!..

Я прыкусіла губу. Усё ва мне ўзбунтавалася. Чаго Вольга павучае мяне, як малое дзіця? І якое значэнне мае той факт, што Валера жанаты быў? Ды ніякага!

Я хлусіла сабе. Мае значэнне! Вялікае! І з гэтага перакананне брала свае вытокі неўсвядомленая яшчэ крыўда. Невядома на кога і завошта. Валера?.. Я не хацела ані ў чым яго вінаваціць. Не сказаў мне нічога пра сваю жонку? Дык я ж і не пыталася ў яго пра тое! І хіба гэтак прыемна казаць пра горыч сваю і бяду?.. І, зрэшты, ён не абавязаны быў спавядацца перада мною ў сваіх памылках, крыўдзе...

Валераву крыўду я не магла зразумець, я не ведала яе, а словы Вольгі мяне не перакапалі ані ў чым. І Валера да таго ж быў далёка. А тут, блізка, была Вольга, і мая крыўда скіравалася цяпер супраць яе. Толькі яе адной!

Сцяпан паклікаў Вольгу, і гэта было для мяне паратункам. Мы сядзелі за сталом усе ўчатырох, мірна гутарылі. Бабуля частавала маладых вішнёвым варэннем, Сцяпан дзякаваў, расказваў смешныя гісторыі, і ўсе рагаталі — прыстойная, дружная сямейка, калі зірнуць збоку. Але ўсе яны і кожны паасобку, нават мая бабуля, здаваліся мне чужымі; яны перашкаджалі мне засяродзіцца на нечым адным, галоўным, і болей ад усіх замінала мне Вольга. Яе смех ніяк не даваў мне адасобіцца ад усіх, схавацца ў свае патаемныя думкі; ён, гэты яе смех, нібыта штурхаў мяне

з добрай і ўтульнай засені ў кола святла, нясцерпна яркага святла.

Нядобрае пачуццё пасялілася ў маім сэрцы да Вольгі. Але я перасіліла і сябе, і гэта пачуццё, і гэты смех і засталася ў вылратавальнай і ўтульнай засені. А думкі мае нібыта ўвайшлі ў тое светлае кола — былі яркія, выразныя, і нішто не ўтрымлівала іх, не азмрочвала.

Валера... Ён не казаў мне аб сваім асабістым жыцці нічога. Значыцца, былі на тое свае прычыны. Боязь, каб я не спалохалася?.. Дык гэта ж добра: значыцца, ён зберагаў мяне. Але каб і сказаў! Хіба ж гэта нешта змяніла б? Хіба не ўзышло б у тую раніцу сонца? І хіба ж не такое было б неба над намі, калі мы караскаліся на старую вышку?

Я зноў убачыла сябе там, на счарнелым ад часу насціле, хісткім, драўляным насціле вышкі, і адчула тую ўзнёслую радасць, і гэтая радасць прыўзнімала, клікала, цягнула мяне з такою ж сілаю, як і там, на вышцы, цягнула ў прастору ранішняга неба.

Каб мяне пабачыла там у той міг бабуля! Напэўна б, скамянела ці знямела.

Не стрымалася, засмяялася, і гэты смех быў вельмі дарэчы, бо Сцяпан якраз скончыў сваю чарговую гісторыю, і доўга смяяліся ўсе, і ніхто не ведаў сапраўднай прычыны мае весялосці, і гэты смех прымірыў мяне з Вольгаю...

Учора — сонца, аксамітнае мора, пах міндалю, нібыта ў жоўтую вату абкручаныя галіны мімоз — вясновы поўдзень, адным словам. Райскае жыццё, як казала Вольга.

Сёння — слота, сцюдзёны вецер, замглёнае непрыветнае неба, нудное чаўканне размяклага снегу пад нагамі. І як дадатак — у аэрапорце мяне не стрэў Валера.

І вось ужо другую гадзіну я дома, і не ведаю, дзе ён, і не ведаю, дзе яго можна шукаць. І галоўнае — аніводнага пісямка! А можа, гэта і справядліва — адплата за тое «райскае жыццё», дзе не было аніякіх клопатаў?

Шчоўкае замок у дзвярах — вярнулася бабуля. Але яна не адна — з кімсьці гаворыць. Але з кім жа? Дык гэта ж Валера!

Куляю — на калідор! Жартавала, а ён усё абглядаў мяне з усіх бакоў, пацвельваўся:

— Засмажылася! Ну і ну!

— І ты загарэў. Нават бровы выцвілі.

— Гэта табе,— ён працягнуў мне жоўты скрутак.— Шле падарунак Дзвіна.

— Сом?

— Нават два. Судакі сёлета не бяруцца...

Што мне тыя судакі! Валера не проста тады жартаваў на пероне, ён помніў пра мяне, думаў. Там, па поўдні, я думала пра гэта: прывязе сома — значыцца, кахае. Глупства, вядома. Ён мог купіць рыбіну ў магазіне. Галоўнае ж не гэта: ён — помніў, думаў пра мяне!

Вячэралі ўсе разам. Бабуля сядзела побач з намі, расхвальвала сома; рыба прыемна пахла дымам.

— Цяжка яе, такую рыбіну, злавіць, думаю,— вохкала бабуля.— Вэнджанне хіба сам рабіў?

— А як жа! Мяне гэтай справе дзядуля навучыў. Ён у нас рыбак патомны. І Дзвіну ведае — ніхто так яе не ведае, як ён.

— Вялікі сом, мабыць, не мяккі. А гэты — мяккі. Бляхаю не смярдзіць, як кансерва. Кансерву рыбную я ўвогуле есці не магу...

Я слухала іх гаворку і не магла надзівіцца. Што ж гэта робіцца з бабуляю! Гаворыць з Валерам пачціва, жартуе, павага невядома адкуль з'явілася. Дзіўныя змены! І Валера змяніўся: трывожныя, сумныя вочы. І мне пад гэтым яго трывожным поглядам робіцца ніякавата.

Калі гадзіну спагадзя мы гулялі ў парку, размова ў нас з Валерам не ладзілася. Мы і раней маглі хадзіць моўчкі, але адчужанасці паміж намі не ўзнікала. А цяпер яна, гэтая невядомая мне раней адчужанасць, была, і я сэрцам адчувала: нешта адбылося нядобрае. Але што? Сілілася і ніяк не магла даўмецца.

— Як на поўдні? — спытаў Валера.

— Прыгожа. І дужа цёпла. Вада, праўда, халаднаватая, але мы купаліся. А як там, на Дзвіне?

— Таксама купаліся. Але — не па сваёй ахвоце. Я з човна бухнуўся ноччу. Ночы, праўда, былі дужа цёплыя.

— І там таксама дужа цёплыя. Мы спалі ў палатцы...

Сказала і тут жа спахапілася, што казала яму ўжо і аб гэтай палатцы і ўвогуле аб усім тым, што было ў маім нечаканым паўднёвым падарожжы. Спахапілася і адчула нікчэмнасць нашае гаворкі, адчула, што ўсе словы мае, а таксама і яго — шырма, не болей, як звычайная шырма, за якую і ён і я хочам схавацца.

Я ведала: хачу схавацца ад той адчужанасці, што была

ў Валеравых вачах. І не разумела, ад чаго хоча схавацца ён сам.

Сапраўды, ад чаго?

Ад мяне? Магчыма, ён усё ўжо адкінуў, магчыма, я са сваім наіўным каханнем толькі перашкаджаю яму, а калі і не перашкаджаю, дык зусім непатрэбна. І гэта, здаецца мне, падобна на праўду, падобна на праўду — гэта мая здагадка, бо ён мужчына і ведаў другое каханне, сапраўднае, мне невядомае.

Другое каханне!..

— Паедзем у Ратамку? — спытаў Валера, і я нават здрыганулася ад нечаканасці гэтага пытання.

— Куды, куды?..

— Паедзем у Ратамку, кажу. Я цяпер там жыву — знайшоў маленькі пакойчык. З цёткаю ў нас не атрымліваецца ладу — сварымся. Я табе потым усё раскажу пакрысе... Дык едзем у Ратамку?

— А дзе гэта?

— Ты не была хіба там? За Ждановічамі. Электрычкаю. Далей Крыжоўка, Зялёнае... Едзем?

— Такая слота.

— Ты што, не бачыш? Марозік бярэцца. І снег. Звычайнае сакавіцкае надвор'е.

У электрычцы мы зноў гаворым пра снег, які ідзе цяпер густа; у бела-шэрай імгле хаваецца далягляд. Валераў твар насцярожаны, як у чалавека, які ўвесь час чакае непрыемнага пытання.

За акном ужо Ждановічы. Снег не ідзе, нават свеціць сонца. Злева ад станцыйнага будынка лёгкі драўляны павільён для пасажыраў: вастраканечны дах, ярка пафарбаваны франтон. А побач, у два рады, растуць таполі, высокія, але не разгалістыя, як звычайна, а тонкія, імкліва выцягнутыя ўверх.

— Зусім як на поўдні. І вельмі падобныя гэтыя таполі на кіпарысы... Ты бачыў, як растуць кіпарысы?

— Ты цяпер шмат чаго будзеш параўноўваць толькі з поўднем. Пазалетась, калі я адтуль вярнуўся, у мяне было такое ж адчуванне...

У Ратамцы ад станцыі ідуць дзве дарогі. Мяне прывабіла вузенькая, тая, што ўлева.

— А гэтая дарога куды? У лес? — спытала я.

— Так. За соснікам дачны пасёлак збудаваны.

— Пойдзем у лес. Унька на той пагорак.

Мы пайшлі дарогаю, і ўсё вакол нас паўздзіў хутка

мянялася. На сонцы, якое дагэтуль ярка свяціла, паплывала шэрая хмара, і было дзіўна бачыць, як чэзнуць, робяцца непрыветнымі і пагорак, і лес, і звілістая, слаба ўезджаная дарога. Лес быў ужо зусім блізка, і паабапал дарогі ўсё вышэй узнімаліся снегавыя гурбы. Падыходзім бліжэй, і гурбы адсоўваюцца, і тады паміж гарбатых шэрых пагоркаў бачыцца нешта накшталт дарогі. Падобна на тое, што мы зблудзілі.

— Не хвалюйся, я не Сусанін, у багну не завяду,— паабяцаў Валера.

— Сусанін вёў ворагаў. А я — твой сябар. І я ведаю, што сяброў не вядуць у багну, сябрам гавораць усё, з імі раяцца, у горы ці бядзе — апірышча яны. А ты тоішся ад мяне... А я ж ведаю, адчуваю: нешта здарылася...

— А як жа! Змяніў месца жыхарства!

— Гэта не больш як жарт. І не зусім удалы.

— І ўрэшце ўхвалілі тэму дысертацыі. І гэта шмат што мяняе ў маім жыцці... Хоць мне часам здаецца, што дарога навукі — не мая дарога. Але начальства зацікаўлена — я пагаджаюся!

— У нас з табою заўжды амаль так: калі што сур'ёзнае ў гаворцы — адразу жарт на дапамогу. За ім хаваемся. Мяне гэта заўсёды крыўдзіць.

— Ты ўпершыню папракаеш мяне.

— Не папракала. І ніколі не буду. Ані ў чым!..

Мы крочым моўчкі і гэтак жа моўчкі ўваходзім у лес. У рэдкай снегавой імгле — сонца свеціць праз хмару — усё навокал зацярушана мядзяным пылам — дрэвы выдаюць тоўстымі, і сняжынкі відаць толькі ў той міг, калі пралятаюць блізка ля твару, а далей вісіць усё тая ж мядзяная імгла. І ціхуткі, ледзьве ўлоўны шоргат і шархаценне — гэта шархаціць, спаўзаючы па сасновым голлі, снег.

— У горы ці бядзе — апірышча яны,— паўтарае Валера мае словы.— Правільна. І самая цяжкая віна — гэта калі вінаваты перад сваім сябрам. А перад табою я вінаваты дужа...

— Не-ее, Валерачка! Перада мною ты ані ў чым не вінаваты. Ані ў чым!

— Я ведаю, што кажу... Калі цябе не было, прыязджала Рыта. Яны з цёткаю заўсёды сябравалі, і тая сустрэла яе з вялікай радасцю.

— Прыехала дык прыехала. Вялікай бяды!

— Рыта была два дні.

— Навошта ты гаворыш мне гэта? Навошта?!

Толькі цяпер я пачынаю разумець, што адбылося, і сэрца маё гатова вырвацца з грудзей, і яно тахкае так моцна, што ад яго ўдараў звініць у скронях. Адчуваю: яшчэ міг, яшчэ адно яго слова, і я ўдару Валеру, буду крычаць ад крыўды і болю ў скронях. Але рукі мае як звязаў хто, я ўся нібыта паралізаваная.

— Навошта? На тое, каб не было падману. Ані ў чым. І ніколі не было ў нас падману...

Валера нахіляецца, бярэ ў прыгаршчы снег, доўга камечыць яго і нечакана моцна шпурляе снегавы камяк; нейкі міг, і з лесу далятае мяккі пошчак — камяк бэхнуў па сасне. І гэты мяккі пошчак, як стрэл, гучыць у вушах.

«Каб не было падману...»

А хіба ж ён не падмануў мяне?

«Рыта была два дні».

Магчыма, і ёй таксама ён казаў гэтыя ж словы, тыя ж словы, што гаворыць зараз мне. І, можа, вось так, як зараз, ён хадзіў па дарозе з ёю, там, ля возера, у тым парку, ля тых нашых бяроз!..

Гэта здрада!

Гэта здрада!

Гэта здрада!..

Звінелі, ціснулі мне скроні гэтыя словы, але я не пусціла іх на волю. Я не сказала яму нічога. Хацела і не сказала. Невядомая мне сіла звяла вусны, і я змоўчала.

А Валера спытаў зноў:

— Навошта? — і дадаў пасля кароткай развагі: — У гэтым — увесь сэнс. Адказаць на тваё пытанне можна проста, я, безумоўна, табе адкажу. Але цяжэй зразумець, чаму ўзнікае ў тым патрэба, патрэба ў шчырасці, патрэба не хлусіць, і я хачу, каб ты гэта зразумела. Я б мог табе і не казаць пра тыя два дні, і ты ніколі б, магчыма, не даведалася пра іх. Але тое, пра што я не сказаў бы табе, усё роўна жыло б, існавала ва мне і рана ці позна паўстала б паміж намі сцяною і падзяліла нас на два светы. Чужыя, якіх нічога не звязвае. А я не хачу! Не хачу, каб гэта калі-небудзь адбылося... Не, не! Не перашкаджай мне, я хачу ўсё табе сказаць, і ты, калі ласка, слухай... Калі ты побач — мне вельмі хораша і заўсёды блага, калі цябе няма, калі ты далёка. А яшчэ горай мне было, невыносна горай было тады, калі я думаў, што магу памыліцца і прынесці табе боль. Боль адзіноты. Быць аднаму — гэта цяжка, але гэта — не адзінота яшчэ. Адзінота — гэта тады, калі ты ўдваіх, але ты — адзін. З табою побач чалавек, якога ты

лічыш блізкім, не чужым, але ты — адзін, і ён, гэты чалавек, горай чужога...

— Некамунікабельнасць, адным словам. Гэта цяпер модна. Модна спасылацца на гэта. Навуковая падстава, як гаворыцца...

Ён быццам не пачуў мае словы, і нічога на твары ў яго не адбілася, толькі ён увесь неяк прыгнуўся, бы нечага шукаў у доле пад нагамі.

— У мяне была жонка,— сказаў Валера, і я прыкусіла губу і загадала сабе, што буду маўчаць, ніводным словам не перапыню яго.— І я прыходзіў дамоў, бо ў мяне быў дом, і адчуваў, што я адзін, што дом пусты, што ў сапраўднасці ў мяне няма і ніколі не было таго, што чалавек заве звычайна «мой дом». Удзень гэта яшчэ нічога. Але ўночы... Побач з табою чалавек, а ты — адзін. Горай гэтай адзіноты, мабыць, няма нічога больш жахлівага...

І калі цяпер прыехала Рыта, я ўбачыў не проста жанчыну, а чалавека зусім, зусім адзінокага. Адзінота кладзе на твар чалавека знак, які нават і час з цяжкасцю сцірае... І гэты знак мае над намі нейкую ўладу: ты адчуваеш патрэбу дапамагчы чалавеку і потым доўга дакараеш сябе, калі не працягнуў руку помачы. Але я падмануў сябе, дакладней, не падмануў, а праверыў свой стары боль, зразумеў яго вытокі, зразумеў, што павінен не таіць ад цябе нічога, а ўсё расказаць, каб ты ведала, каб нас не падзяляла, ніколі не магла падзяліць адзінота...

Розумам я разумела гэтую споведзь. А сэрцам — не! Больш таго, я была жорсткая і бязлітасная, быццам мяне падманулі ў нечым самым важным, святым.

— Ты будзеш помніць яе ўсё жыццё. І закрэсліць яе не зможаш. І не зможаш ненавідзець.

— А пры чым тут няnавісць?

— Ёсць толькі дзве ніці, што звязваюць жанчыну і мужчыну: любоў і нянавісць.

— Ёсць, на жаль, і іншыя. Суіснаванне і адзінота, напрыклад.

— Мне гэта не трэба.

— А мне тым больш. Мне толькі думаецца, што ты зараз пакрыўдзілася. І не ўсё зразумела... Гэта — разуменне — прыйдзе потым, крыху пагадзя...

Падаў і падаў снег, і цяпер ужо не мядзяным, а густааранжавым бляскам свецілася неба над лесам, і яшчэ гучнейшы зрабіўся шорхат сняжынак, што церусіліся з сасновага галля. Як гучна можа шархацець мяккі снег!

— Ты памыляешся,— сказала я, як мне здалося, спакойна і зусім абыякава.— Я ўсё зразумела. Літаральна ўсё! Хадзем назад!..

— Хадзем...

Зноў вакол нас былі снегавыя гурбы, і мне цяжка было ісці, а ў сэрцы маім незразумела змяшаліся скруха, туга і трывога. Цяжка разабрацца ў гэтай мешаніне, але я прымусіла сябе маўчаць, нічога не казаць Валеру.

З гэтага маўчання пакрысе прыходзіла да мяне яснасць. Скруха — гэта шкадаванне ад таго, што ў маім жыцці ўсё разбурылася, усё тое, у што я глыбока верыла і што цяпер пахавала бязлітасна сама — маё каханне; туга — гэта крыўда на Валеру за тое, што ён не зразумеў маёй жорсткасці, не паспрабаваў ані ў чым пераканаць ці патрабаваць нейкіх тлумачэнняў, а тут жа з усім пагадзіўся і пакорліва пайшоў побач, бы нічога не здарылася, быццам усё ішло так, як трэба; трывога — гэта спачуванне і баязлівасць, бо мяне пачынала непакоіць думка пра тое, як цяжка будзе цяпер Валеру.

Нейкая як бы згрызота прыйшла. Што ж я пакінула яму? Зноў — адзінота? Няхай я была яму благім сябрам, калі слухала яго споведзь, не разумела яго, але ж я, як магла, увесь час ахоўвала яго пакой, хацела, каб яму было лепей!..

Наіўная спроба апраўдаць сябе. Няхай, няхай ты намагалася, каб было як лепей. А што атрымалася? Як найгорай!

Наіўная дзівачка! Дзе ты шукаеш спакой? У каханні? Цяпер ты знайшла яго. Бяры!

Да станцыі мы дайшлі моўчкі. На пероне зусім і не давялося пастаяць. З-за павароткі пранеслася, узнімаючы пыл, электрычка; у вокнах гарэла святло, і я бачыла, што вагоны амаль пустыя; памкнулася да вагона, але Валера затрымаў мяне:

— Гэта — маторны. Электраматоры вельмі гудуць — будзе балець галава. Лепей садзіся ў гэты...

Яго клапатлівасць раззлавала мяне, але я зноў стрымалася. Мяне нават здзівіла, што я магу так валодаць сваімі пачуццямі. Але я не ўзрадавалася, а толькі адзначыла гэты факт і ўпершыню адчула, што недзе зрабіла памылку. Але якую, дзе — не магла даўмецца.

Валера ішоў упоравень з вагонамі, калі электрычка кранулася. На яго твары то напльвалі, то знікалі дрыготкія палосы, і твар ад гэтага чаргавання дзіўна і хутка

змяняўся, і толькі пазней, калі за вокнамі імкліва адляталі назад пярэстыя дрэвы, я здагадалася, што Валераў твар быў такі пярэсты ад святла, што падала з вокнаў электрычкі; і мне раптам так стала шкада яго, так шкада свайго кахання, што я не ўтрымалася і заплакала. У вагоне было ўсяго тры пасажыры, і сядзелі яны далёка ад мяне, і, вядома ж, нічога не заўважылі, але мне было непрыемна, і я хуценька выцерла слёзы і адчула як бы нейкую палёгку.

А электрычка імкліва неслася наперад, і цяпер за акном было ўсё знаёмае. Станцыйны будынак і нізкі перон, счарнелыя і чэзлыя яліны на касагоры, вузкая сцяжынка ў густой сцяне ахоўных насадак. Аднойчы мы варочаліся з мора, спяшаліся дужа на электрычку і беглі гэтай сцяжынкаю, і я зачапілася за гнуткае карэнне, але не павалілася — Валера падхапіў мяне на рукі,— і мы ўляцелі ў вагон электрычкі і доўга смяяліся з таго здарэння на сцежцы.

Валера... Валера...

Усё ўва мне як бы зварухнулася. Думкі несліся назад, на перон, дзе пад таполямі застаўся Валера, і прыводзілі мяне да высновы, якую я не хацела прымаць і ўсё адкідвала ад сябе; тут, у вагоне, пад грукатлівы звон колаў, я пачынала разумець, дакараючы сябе — ах, чаму ж гэтак запозненa прыйшло гэтае разуменне, а не з'явілася там, у лесе, замест нікому не патрэбнай маёй жорсткасці! — і неракопваючыся, што яшчэ болей, чым калі-небудзь, кахаю Валеру.

Страчацца з ім ты болей не будзеш! Гэта я загадала сабе.

Ты выкінеш яго з душы, з сваіх думак, з сваіх успамінаў і спадзяванняў! Сама загадала і сама пасмяялася з гэтага.

Выкінуць? А навошта? Сустрэчы з ім, гаворкі, радасць спатканняў — хіба ж гэта не самае лепшае, што было ў маім жыцці?.. А тая навагодняя ноч над возерам у зімовым парку? І аснежаныя бярозы, і зоркі, што віселі, як прывязаныя на галінах, і Валераў пацалунак?..

Чым жа тады жыць?..

Не, гэта ўсё павінна быць у душы, гэта трэба берагчы, захоўваць і нічога з гэтага ніколі і нікому не аддаваць!..

## 3

Ранкам Піваварава з намі ўжо не было — ён злез з цягніка на світанні на нейкай маленькай станцыі. Толькі адзін лейтэнант развітваўся з ім, ён жа сказаў мне і назву станцыі, але яна тут жа выветрылася з памяці. А вось прозвішча нашага былога спадарожніка па купэ, яго жарты засталіся. Ёсць такія людзі: мільгане перад тваімі вачамі, пажартуе, і словы гэтыя застаюцца надоўга ўспамінам лёгкім і прыемным.

Адчуваю: лейтэнант не належыць да такіх людзей. Мы з ім зноў выйшлі на калідор, і зноў стаім на ранейшым месцы, і зноў глядзім у акно. Нейкая вёсачка. Дымы над комінамі. Машына па дарозе, што жоўтай падковаю агінае возера. Яно невялічкае, злева зарасло рудой нізкай асакою, а ля вёскі асака трыма палосамі, быццам нізенькім плотам, разгароджвае пабітую рабаціннем паверхню; плавае чародка качак, адна качка ўзлезла на беражок, лопае крыламі, бы спрабуе ўзляцець, і над ёю вісіць празрыстае вясёлкавае кола — сонца ўзыходзіць там, на той бок вёскі.

— Прыгожа, праўда? — пытаецца лейтэнант.

— Звычайная вёска. І лес далёка. Я люблю, калі лес побач. Можна тады штодня хадзіць па лесе...

— Звычайная мара гараджаніна. А той, хто жыве ў вёсцы, марыць пажыць у горадзе. Напрыклад, скажы мне: жыві, браце, вось у гэтай вёсцы, хадзі штодня ў лес, збірай грыбы... Не пагаджуся, мабыць. Не, напэўна не пагаджуся. А ў душы жаданне такое часам узнікае. І я не ведаю, адкуль яго вытокі. Бацькі мае гараджане, патомныя чыгуначнікі. Праўда, дзядуля быў чалавек вясковы...

Адчуваю: ён хоча распачаць гаворку аб маёй будучай працы, нешта даводзіць, штосьці раіць, у нечым пераконваць. Учора такая гаворка была мне па душы, а сёння, пасля прайшоўшай ночы, мяне быццам падмянілі. Успаміны пра мінулае вярнулі мяне ў той, зусім нядаўні і радасны свет, дзе я жыла, і я адчула цяпер нейкую як бы вінаватасць перад Валерам. Нават не, не перад ім, а перад маімі думкамі, перад кожным маім словам, што я кажу і казала тут, у вагоне, незнаёмаму раней чалавеку.

Успаміны ўночы абудзілі абавязак перад тым мінулым, перад маім пачуццём да Валеры. Я нават не разумею, адкуль ва мне пачуццё гэтага абавязку. Валера? Нас нічога не звязвала, нічога не звязвае зараз. Але чаму тады я так лаю сябе за крыху гуллівую размову ўчора з лейтэнантам, чаму і сёння неяк ніякавата мне, быццам я па-

віна была гаварыць зусім іншыя словы і ўчора і сёння? І разам з тым адчуваю сябе неяк спакайней, калі лейтэнант звяртае на мяне ўвагу, гаворыць са мною. Ён жа мог размаўляць і з Вольгаю! Але ён быццам і не заўважае яе, асабліва сёння ранкам. І яна гэта бачыць і знарок паганяла нас на калідор.

Дзверы з тамбура адчыняюцца — уваходзяць наш праваднік і жанчына. Жанчына голасна патрабуе:

— Вы аб'явіце, калі ласка, аб'явіце па сваім вагоне! Павінен адшукацца ўрач які-небудзь! Хлопчык жа крывёю сцякае! Крывёю! Разумееце?!

І ўжо зусім прафесійная рэакцыя ў мяне на гэтыя апошнія словы невядомай жанчыны,— я мігам апынулася ля яе.

— Што з вашым хлопчыкам? І дзе ён?

Шэрыя, як з пасыпанага попелам шкла, вочы спалохана ўтаропіліся на мяне.

— Мы ў трэцім вагоне. У трэцім едзем... Адкрытыя дзверы былі, а Пецечка ручкаю за капцік узяўся. Вагон — то-орг. А яму — расціснула ручаньку... Кроў там, кроў... Ай-яй-яй! Дык вы доктар? То скарэй жа, доктар!

— Чакайце. Я зараз!..

Уляцела ў купэ, схапіла сваю сумку, і мы пабеглі. Лейтэнант увесь час наперадзе, адчыняе перад намі дзверы. Пад нагамі стогнуць і соўгаюцца, як жывыя, жалезныя пляцоўкі; бумкаюць буферы; вугальны гар і пыл сячэ твар. Уваходзіш на калідор — і дзверы за спіною быццам адсякаюць ярасны бразгат, здаецца, жывога, як рух, металу, і гэты бразгат імчыць за табою ўслед.

Я поўная адвагі, гатовая на вялікі подзвіг і самаахвярнасць. Вось і трэці вагон. На калідоры поўна пасажыраў, але ўсе яны расступаюцца, калі мы ідзём. Уваходзім у купэ. Заляпаная крывёю прасціна, спалоханы твар кучаравага хлопчыка з вялізнымі ад болю і жаху вачамі. І буйныя слёзы коцяцца па шчоках. А рука ў хлопчыка тоўстая, як калода — навярнулі на яе ўжо адзін ручнік, другі, а над ім яшчэ і хусцінка нейкая, белая, уся ў буйных чырвоных плямах. І калі хлопчык бачыць гэтую хусцінку — ручнікі я хуценька зняла — твар яго расцягвае грымаса болю, і ён верашчыць, як парасё:

— Баліць! Баліць! Баліць!..

Ведама, баліць. Але хлопчыку пашчасціла, і ўсё не так страшна, як мне здавалася: рука цэлая, пальцы цэлыя, толькі на вялікім і ўказальным разадрана скура.

— Ну, не плач, не плач,— прашу я хлопчыка і адкрываю сваю сумку.— Мы цябе зараз і вылечым. І ты праз дзень будзеш гуляць у футбол. Ты гуляеш у футбол?.. Дык вось, аднойчы Пеле... Ты ведаеш, хто такі Пеле? Ага, ведаеш. Дык вось аднойчы ён паваліўся і абадраў абедзве далоні — гэтак моцна ўдарыўся. Але ён гуляў да канца. Праўда, яму перавязалі руку, і ён гуляў да канца і забіў два галы. Нават не два, а тры. А ў цябе, калі гэты палец зажыве, а зажыве ён роўна праз два дні, скура на пальцы будзе такая моцная, што ні аб які камень не праб'еш. Карацей кажучы, будзеш ты забіваць галы і хлопцы яшчэ табе пазайздросцяць, бо ў іх ніколі не быў так падрапаны палец...

Я, вядома ж, хлусіла, бо аніякага такога выпадку з Пеле не ведала. Не ведаю, як мне ўвогуле цюкнула ў галаў сказаць пра таго Пеле — футбол я ўвогуле не люблю,— але гэтае імя падзейнічала на хлопчыка магічна: ён перастаў плакаць, дазволіў, хоць і моршчыўся ад болю, перавязаць палец.

Жанчына дзякавала бясконца. Потым, калі мы з лейтэнантам вярочаліся да сябе і былі ўжо ў тамбуры, яна дагнала нас, і зноў дзякавала мне, і хацела сунуць мне ў сумку нейкі стары скамечаны канверт.

— Гэта ж вы мяне ўратавалі, доктар, ой, як уратавалі. Гэта ж я ўнука вязу!.. Дык вы кажаце, што заражэння не будзе. Я дужа баюся, бо ў нас аднойчы ў доме такое было. Драпінка — а заражэнне...

— Гэта што? Грошы?!

— Ай, доктар, кіньце. Якія там грошы. Падзяка, проста падзяка вам. Не крыўдуйце на мяне. Я так спалохалася, так спалохалася...

Я знямела. Было сорамна, нясцерпна сорамна. А лейтэнант адвярнуўся высакародна, нават нахіліўся, быццам не паддавалася ручка, і ён сіліўся і не мог адчыніць дзверы ў суседні вагон.

А жанчына ўмольна глядзела на мяне даверлівымі шэрымі вачамі. І за адзін гэты кароткі міг я зненавідзела яе. І гэтае пачуццё нават палохала мяне сваёй сілай, яно ўзнялося з невядомай глыбіні і прабіла, здаецца, мяне навылёт — мне падалося нават, што ў мяне стрэлілі, і стрэліла менавіта яна, вось гэтая жанчына, з такімі добрымі шэрымі вачамі. Там, у нашым вагоне, калі яна прасіла праваднікa пашукаць урача, і пазней, калі была з намі і бегла з вагона ў вагон, з устрывожаным тварам, але ра-

дасным бляскам у вачах, яна здавалася мне нейкай наўздзіў прыгожай, а цяпер я глядзела на яе з гідлівасцю. Непрычасаныя, тлустыя, відаць, даўно не мытыя валасы, вуграваты нос... Не, я ж яе ніколі, здаецца, і не бачыла!

— Сорамна! Сорамна! Сталая жанчына, а такое робіце,— выгукнула я і кінула канверт жанчыне на далонь.— Ды нельга ж так! Нельга! Усё на капейкі мерацце! Горай абразы ўрачу прыдумаць не змаглі!

Яна ніколькі не збянтэжылася, хуценька схавала канверт у рукаў кофтачкі, спытала, быццам нічога не адбылося:

— Скажыце, калі ласка, сёння яму перавязку трэба?

— Заўтра зробіце. Толькі не самі. У паліклініку звярніцеся. Вы дзе жывяце?

— У Віцебску. У цэнтры.

— Вось у паліклініку і зойдзеце. Праз два дні яму ўвогуле ніякая павязка не спатрэбіцца. Там вам скажуць...

— Урэшце! Урэшце я яе адчыніў! — выгукнуў лейтэнант, прытрымліваючы дзверы на пляцоўку.— Калі ласка, хадземце!

Я скочыла на жалезныя пласціны, што, як жывыя, соўгаліся, дугаліся пад нагамі; лейтэнант нешта сказаў, але яго голас заглух у грукаце жалеза, і я нічога не перапытала.

Мы зноў стаялі на калідоры ля знаёмага акна, і дзверы ў наша купэ былі па-ранейшаму зачынены — Вольга, відаць, яшчэ не падымалася,— і гэта было, вядома, вельмі зручнай прычынаю, каб пачаць гаворку нейтральную, якая не вымагала ад нас ніякіх ацэнак таго, што адбылося нядаўна ў тамбуры чужога вагона; але ніхто з нас, як я бачыла, не меў жадання яе пачынаць.

Мяне ўсё яшчэ гняла, душыла крыўда, і ўсё яшчэ не праходзіў сорам. Якая подлая і брыдкая традыцыя: плаціць чалавеку за тое, што ён робіць не дзеля выгоды, а кіруючыся добрымі і шчырымі парываннямі свайго сэрца. Абавязкова заплаціць! Чаму? Калі і адкуль узялася такая завядзёнка? Вядома, я не філантропка. Урач працуе, і яго праца зусім не лягчэйшая за іншую, і яна, безумоўна, павінна аплачвацца. Але ж гэта ўжо зусім іншыя адносіны, гэта з вобласці адносін чалавека і яго рабочага абавязку. А маральны абавязак? Чуласць? Сардэчнасць? Гэта што, таксама павінна аплочвацца, таксама па нейкай графе? А дзе ж тады годнасць урача, тая годнасць, быць верным

якой прысягае кожны, хто звязвае свой лёс з медыцынай?..

Я ўсё яшчэ спрачалася з той, невядомай мне жанчынай. І яна ж не проста нейкая там жанчына! Першая мая пацыентка. Хаця ніякая яна і не пацыентка, а проста звычайная пасажырка, ёй патрэбен быў урач, каб дапамагчы хлопчыку, якога яна вязе ў Віцебск. А з хлопчыкам здарылася бяда. Ды не, якая ж гэта бяда?!

Некалі ў інстытуце я спрабавала ўявіць сабе — дыпламаванаму ўжо ўрачу — свайго першага пацыента, свайго першага хворага, і ўяўляла сабе даволі лёгка, але ў арэоле гераічным і значным. Мяне паклікалі, і я паехала і ўратавала жыццё чалавеку, і людзі бясконца ўдзячны мне і схіляюцца ў павазе і захапленні. А вось яна, сапраўдная, рэальны факт жыцця! Нейкая драбяза, маленькая драпінка на пальцы хлопчыка, і гэтая істэрычная амаль жанчына, і гэты змяты канверт з узнагародаю, і спачувальная пяёмкасць лейтэнанта — выпадковага спадарожніка па купэ... Ён нават і зараз неяк саромеецца глядзець мне ў вочы, утаропіўся позіркам у акно, нібыта вельмі чымсь зацікаўлены.

— Аднойчы чытаў па дарозе з аднаго чынку кніжку... Ці часопіс... Не памятаю, адным словам,— гаворыць ён і паглядае на мяне, і ў вачах яго няма і цені насмешлівасці, а шчырая заклапочанасць чалавека, які хоча нешта прыгадаць.— І не памятаю — чыё тое было апавяданне. І назву таксама. Але вось тое, пра што там — у памяці незвычайна... Вы слухаеце?

— Ахвотна нават.

— Прыкладна так, як зараз — таму, мабыць, і прыгадалася. Ну, дэталі я не памятаю. Асноўнае, значыцца... У дарозе здараецца няшчасны выпадак з дзяўчынкаю. Цягнік у стэпе — станцыя далёка... Па ўсіх вагонах па радыё — аб'ява: шукаюць урача. Тройчы паўтарылі. І ўяўляеце? Ля гэтай дзяўчынкі сабралася ажно шэсць ці пяць урачоў — дакладна не памятаю, ды і гэта не мае значэння. Галоўнае, сабраліся, усе такія паважаныя, у купэ ўсе не месцяцца — кансіліум на калідоры. А дапамагчы канкрэтна ніхто не можа: ані ў кога няма шпрыца. Патрэбнае лякарства знайшлося, а вось шпрыца няма: усе гэтыя эскулапы — з пустымі рукамі. Праўда, у трох, здаецца, былі стэтаскопы. І ўяўляеце? Шпрыц знайшоўся! Ён знайшоўся ў маленькай, дужа непрыкметнай, сціплай такой дзяўчыны. Яе нават не прынялі за ўрача — гэты кансіліум

паважаных эскулапаў! — і проста адцісиулі яе ад хворай, хоць у вагон яна прыбегла, відаць, першая. Проста яе праз гэтую яе сціпласць адсунулі, каб не замінала. А ў яе партфеліку, старэнькім вучнёўскім партфеліку, было ўсё патрэбнае: дзяўчына толькі што скончыла інстытут і ехала да месца свае работы. Тады гэтае апавяданне не прымалася: намудрыў, маўляў, пісьменнік. А вось зараз інакш думаю: якая глыбіня, якая назіральнасць і пісьменніцкае майстэрства. Не даводзілася чытаць апавяданне?

— На жаль. І не разумею, на жаль, у чым жа гэтая, як вы кажаце, вялізная глыбіня!

— У простым надзвычай. Тым, паважаным эскулапам, прыелася іхняя праца, яны ўжо звыкліся з ёю і не ўзялі з сабою ў дарогу нічога, што з гэтаю работаю іх звязвала — цягнік ішоў на поўдзень. Натуральна, усе ехалі на адпачынак. Згодзен, не ўсе —розныя маглі быць абставіны. Але не гэта галоўнае. Галоўнае тое, што яна, тая дзяўчына, той малады ўрач, не магла не ўзяць з сабою шпрыц, розныя лекі, бо яна ехала да свае работы, як на свята вялікае, гатовая да вялікага подзвігу, падрыхтаваная да яго...

Я перапыніла яго: маўляў, тое, пра што ён гаворыць, магчыма, сапраўды было, магчыма, мае добры сэнс, але мне асабіста зараз не гэта карціць даведацца. Свядома ці міжволі спрабуе ён супакоіць мяне? І дзеля чаго?

— Свядома ці міжвольна — адзін грэх,— добразычліва сказаў лейтэнант, і я зразумела, што падазраваць яго ў няшчырасці нельга.— Але вы пагадзіцеся: пісьменнік заўважыў, падглядзеў у жыцці вельмі тыповае, тое, у чым ёсць вялікі сэнс і што наводзіць на роздум. І ўжо мая цяпер асабістая думка: у жыцці бывае даволі часта, што малады спецыяліст — неабавязкова ўрач — едзе працаваць як на подзвіг. А сустрэнецца з цяжкасцямі, мяшчанствам, абывацельшчынай, і гэта багна засмоктвае бязлітасна...

— І што, па вашай тэорыі, кожны малады спецыяліст — у сферы дзеяння гэтага закону?

— Не, не кожны. Лёс слабых. А тыя, у каго ёсць мужнасць, перамагаюць. Мне вельмі падабаецца думка аднаго пісьменніка: мужнага чалавека не адолее аніякая бяда! Мужны толькі яшчэ крапчэйшы на зломе.

— Бадай што правільна. Косць, якая зраслася, калі і зломіцца другі раз, дык абавязкова ў новым месцы. А на зломе — ніколі.

— Не ведаў гэтага. А вось ужо з галіны іншай — з вайны. Мне казалі франтавікі, што ў старую варонку другі снарад амаль ніколі не трапляе.

— Бачыце, мы з вамі ўжо і да вайны дабраліся. Гэта робіцца небяспечным...

Дзіўная і незразумелая сіла слоў. Ну, прынамсі, што такое выключнае сказаў зараз лейтэнант? Нічога ж! А настрой мой змяніўся: ні крыўды, ні раздражнёнасці, ні адчування ніякаватасці. Мабыць, яно заўсёды так, калі побач з табою чалавек, які здольны разумець цябе і разумее ў любым выпадку, пры любых абставінах.

А што, Валера не разумеў мяне?

Разумеў. І вельмі добра разумеў. І я, здаецца, таксама разумела яго. А што гэта дало нам?..

З Валерам мы былі знаёмыя амаль два гады. З гэтым лейтэнантам — другія суткі. Ды адкуль? І сутак жа не мінула. А я ўжо раблю гэткі глыбакадумны дыягназ: здольны разумець і разумее. Не, праз гэтую сваю даверлівасць я некалі загіну...

Але што гэта я? Знайшла аб чым думаць!

А за вокнамі ўжо не відаць вёскі — затуліў бярэзнік, бліскучы ад начной расы. Потым сплывае і бярэзнік, і па нізінах сцелюцца рэдкія дыванкі тумапоў, і ззяе, зырка зіхаціць уверсе блакітнае ранішняе неба...

## 4

Бальніца драўляная. Тры прыбудовы да яе таксама з бярвення, але святлейшага па колерах — не ў адзін і той жа час будаваліся. І нават шыльдачка з кароткім надпісам «Залеская бальніца» — таксама драўляная.

А ганак будынка цэментаваны, з трыма шырокімі прыступкамі, і на верхнім з іх стаіць жанчына ў белым халаце. Нерухомая яе постаць здаецца нежывой, як бы злепленай з гіпсу: я прыкмеціла жанчыну адразу ж, як толькі выйшла з бярэзніку і ўбачыла будынак вясковай бальніцы, і пакуль ішла нейкія тры сотні крокаў, жанчына не зварухнулася; яна і цяпер нерухомая, як статуя, глядзіць на мяне, і на яе шырокім мангольскім твары няма аніводнай рысачкі цікавасці.

Разгледзець добра жанчыну я не магу — увага мая раздвайваецца. За бальніцай сад, дрэвы ў ім разгалістыя, прыгінаюцца да самай зямлі ад цяжару вялізных, чырвоных, прадаўгаватых, як ігрушы, яблыкаў; яблыні амаль

крапаюць галінамі белыя вокны бальніцы. І дзівіць яшчэ халат жанчыны: бялюткі, накрухмалены, адпрасаваны.

Мяне ніхто не стрэў на аўтобусным прыпынку, хоць у раённым аддзеле аховы здароўя паабяцалі, што мяне стрэнуць і кватэра мне падрыхтавана. Я ішла пешкі ад гравійкі, стамілася, праўда, не дужа, толькі намуляў далонь чамадан, і я з ахвотаю стаўлю яго на зямлю і трасу знямелай рукою.

— Указальнік на гравійцы сцвярджае, што два кіламетры да Залесся. А тут, напэўна, усе тры будзе. І пясок, пясок... Дужа цяжка ісці...

— Залессе далей, да яго яшчэ кіламетр. Унь у той бок...

— Дык, значыцца, я толькі ўсяго адзін кіламетр і прайшла? Гэта з таго, што цяжка ісці.

— Правільна,— сказала жанчына, і цяжка было зразумець, што яна лічыць правільным: ці тое, што я прайшла адзін кіламетр, ці тое, што дарога пясчаная і цяжка ісці; яна па-ранейшаму была нерухомая і стаяла, шырока і цвёрда паставіўшы на ганку ногі ў жоўтых скураных тапках.

— Я ўрач, прыехала сюды працаваць да вас. Вам паведамілі? І вы, мабыць, Твораж?

— Не, я Мацяш. Медсястра. Сапраўды, паведамлялі з раёна, бы прыедзеце. Але сёння мы не чакалі вас. Таму і не загадана страчаць.

— А хто павінен быў даць гэты загад? — я спытала гэта, добра разумеючы, што рабіць тое было не трэба, бо загад, вядома ж, павінна была даць Твораж, загадчыца, якая, як мяне папярэдзілі ў райаддзеле, мае «не вельмі мяккі нораў».

— Галіна Сямёнаўна павінны былі даць загад. А яе няма. Яна зараз у Крынках. Гэта там, па левы бок возера А шыльда на гравійцы сапраўды няправільная. Да Залесся тры кіламетры, а нехта мераў ад нашай бальніцы, а напісаў — да Залесся...

Жанчына сышла з ганка, папытала, як маё імя, па бацьку, і, пачуўшы яго, у нейкім дзіцячым здзіўленні пляснула рукамі:

— Дык цяперка ў нас дзве Галіны Сямёнаўны будзе! Дзіўно!

— Не бойцеся, не пераблытаемся. А вас як, давайце ўжо бліжэй знаёміцца.

— Мацяш.

— А імя па бацьку?

— Яно цяжка выгаворваецца. Рузана Марыканаўна. Так што мяне ўсе прызвычаіліся — Мацяш. Кватэру вам падрыхтавалі, хадземце пакажу. У нас, ведаеце, усе ў Залессі жывуць. Тут толькі Карабань. І Габінаў яшчэ. Але ён на выкліку паехаў. Унь у тым будынку жыве. А ваша кватэра добрая, вам па душы будзе, галоўнае — зручна: пад адным дахам з бальніцаю. Гэта цяпер суха, а як дажджы — толькі берагам азяра можна ў Залессе, бо лясгасаўскія машыны гліну нашу, як кашу, ператаўкуць...

— Лясгас тут вялікі?

— Не, участак толькі. Яго нібыта закрываць збіраюцца — лясы павысякалі. Праўда, цяпер пасадкі вядуць. Раней у нас ціша была. Цяперка нам гэтыя мантажнікі гоману паддалі.

— Вы даўно, значыцца, працуеце тут.

— Адразу, як з партызанаў выйшлі. Я санітаркаю ў атрадзе была. Спачатку санучастак быў, потым пункт, а цяпер — бальніца. Так што да сябе ў Арэнбург я і не паехала. Мне і на пенсію скора...

— А твар у вас вельмі ж маладжавы!

— Гэта — ад вады. У азяры нашым вада дужа мяккая. Можа, на азяро з дарогі памыцца хочаце? Тады гэтаю сцяжынкаю і пойдзеце...

З другога боку бальнічнага будынка быў дакладна такі ж ганак, з шырокімі цэментаванымі прыступкамі. Дзверы толькі іншага колеру — светла-карычневыя, з шырокай, крыху абіржавелай ручкаю. Мацяш націснула яе, і дзверы адчыніліся, але сама яна не ўвайшла ў пакой, і я засталася адна.

Пакой маленькі. Ля сцяны звычайны бальнічны ложак, але засцелены, і белая тумбачка побач. Ля кафельнай бакавіны печы ёсць праём у сцяне, завешаны белай шырмаю — уваход на кухню. Кухня яшчэ меншая, нават без акна, месцяцца толькі пліта, вузкі столік, два зэдлікі і скрыня, у якой акуратна складзены дробна насечаныя дровы.

І яшчэ што здзівіла — пах. Моцны, добра знаёмы мне пах бальніцы. Гэта, відаць, таму, што з кухні вядуць дзверы,— мабыць, на бальнічны калідор. Так, на калідор...

Я агледзела гэта ўсё ўмомант, села на ложак, ён непрыемна зарыпеў, і гэты нудны гук нібыта падштурхнуў мяне. Не даспадобы табе ўсё гэта? А ты што, чакала, каб стрэлі гулам аркестра і казачнымі палацамі?.. Бярыся ле-

ней за справу! Акно — адчыніць. Цяпер мыла, ручнік, купальнік у руку — на возера бягом!..

Бегла сцежкаю, наабапал якой жаўцелі пасадкі акацыі, густа абсыпаныя доўгімі карычневымі струкамі. Потым пайшла заглуш чаромхі, але яна раптоўна скончылася, і ў вочы ўдарыў асляпляльны бляск вады.

Возера!

І якое возера! Цуд! Лясы наперадзе, за ім, лясы справа, і само возера на даляглядзе, здаецца, знікае за чорна-сіняй сцяною. А там, на тым паваротку, бачна вёска. Гэта, мабыць, і ёсць Залессе. Толькі тры хаты відно, астатнія — затуляе старая чаромха, што расце ля самай вады. І чарот у вадзе. Зялёны-зялёны чарот, густы, як сцяна, але тут, дзе выходзіць на бераг сцежка, бы выкасіў хто яго — шырокая і ўтульная затока з драўлянымі масткамі. Ля масткоў патоплены, заліты вадою ўпоравень з бартамі, новы човен, нават не пафарбаваны.

І што яшчэ дужа ўразіла — пясок. Не рачны жвір, буйны і дужа цвёрды, а дробненькі, быццам пушчаны на сіта, мяккі-мяккі. І дно пясчанае, не тванісгае; ідзеш па ім, быццам па мяккай халоднай коўдры.

Я радуюся, як малое дзіця, тупаю па вадзе, мыюся раз, другі, а паплысці — баюся. Зайшла ў возера па калена, стаю, адчуваю, як пачынаюць тукаць у ногі маленькія рыбкі. Вада калыхаецца, цень мой соўгаецца, дрыжыць, і цяжка згледзець, што там робіцца на пясчаным дне.

І паветра. Я дыхаю на поўныя грудзі і адчуваю, што паветра нават крыху п'янкае, аж тлум б'е ў галаў, і ўсё не магу прызвычаіцца да гэтага хараства, не магу паверыць, што ўсё гэта — неба, і зялёныя гаі вакол, і чыстая вада возера, і зялёна-дымны чарот, і заглуш чаромхі — усё гэта нікуды не знікне ні сёння, ні заўтра, што ўсё гэта будзе са мною, будзе доўга-доўга.

Ля бальніцы мяне чакае ўжо мажная, з пранізлівымі чорнымі вачамі жанчына ў белым халаце. Здаля мне спачатку падалося, што гэта Мацяш.

— Наста Яфімаўна,— гаворыць яна і працягвае мне руку на знаёмства. Далонь у яе сухая, цвёрдая; хуценька схаваўшы руку ў кішэньку халата, тут жа дадае: — Наста Яфімаўна Карабань! З прыездам вас, з прыездам і прыбыццём. І даруйце, што не стрэлі, нейкая, разумееце, недакладнасць...

Звычайная, адным словам, размова, і мы вядзём яе і ўваходзім у пакой, і Карабань становіцца на сярэдзіне

пакоя, а я стаю ля дзвярэй і адчуваю сябе непажаданай госцяй. Карабань разглядае мяне, і я змушана таксама глядзець на яе. У яе паўнаваты, але крыху зжаўцелы твар, востры, як дзюба, падбародак; а чорныя вочы, якія мне спачатку здаліся нейкімі пранізлівымі і ўчэпістымі, дужа засмучанымі — вочы стомленага і добрага чалавека.

І зноў здзіўляе мяне халат: ён на Карабань такі ж чысцюткі, накрухмалены, як і ў Мацяш. А мой халат, які я выцягнула з чамадана, калі збіралася бегчы на возера, зараз вісіць на спінцы ложка і здаецца змятай і непрыгожай анучкаю. І мне няёмка, і я пачынаю гаворку, прыгадваючы тое, што мне казалі ў раёне.

— Калі не памыляюся, вы хірургам тут. Я чула ў аддзеле: вопытны спецыяліст, казалі, можна павучыцца...

— І хірург. І тэрапеўт. І акушэр-гінеколаг. Мы ўсе тут урачы самага шырокага профілю... Па душы вам нашыя мясціны?

— Вельмі.

— Так, улетку тут жыць можна. Зімою блага: снег, снег, снег... І вятры ўвесь час — з азярка...

— А я люблю, калі снегу шмат. На лыжах тады можна...

— Лыжы? Гэтым у нас дзеці займаюцца. Мой Генка зімою сёлетняй дзве пары патрушчыў.— Карабань спахопліваецца, быццам пачала не тую гаворку, дзеля якой прыйшла, і глядзіць на мой халат.— Гэта студэнцкі, мабыць? Я дам вам новы. Твораж наша ў гэтых адносінах вельмі патрабавальная. І, калі хочаце, зараз паглядзім бальніцу...

Нічога, здаецца, крыўднага і не сказала яна, але я адчуваю непрыязнь да Карабань. Мой халат, які праляжаў гэтулькі ў чамадане, і не адпрасаваны, пакамечаны, выгляд у яго не вельмі прыстойны. Але мне ён — па сэрцы: на пятым курсе мы шылі халаты самі, і мой у групе быў прызнаны лепшым...

— Дык што, ёсць ахвота? Тады хадземце. І пойдзем тут, цераз вашу куханьку...

І гэтая яе прапанова, дабрадушная і прыветлівая, скасавала непрыязнасць, і я адчула сябе вальней. Карабань ішла наперадзе і расказвала аб сваёй працы, аб патрэбах бальніцы. Не, яна не скардзілася — і гэта мяне прыемна ўразіла,— а проста даверліва паведамляла тое, што ёсць, і ў яе голасе гучалі гонар за ўсё тое, што яна

паказвае мне і паведамляе, і перакананне, што я разумею яе так, як трэба.

Бальніца на два дзесяткі ложкаў, і амаль усе яны вольныя — хворых толькі шэсць чалавек. Карабань мне растлумачыла: увосень, маўляў, хварэюць тут мала, а вясною, звычайна, нават ложкаў не хапае. Нейкая ёсць у гэтым заканамернасць, якую ніхто, на жаль, не ведае. Гісторыі хваробы? Яны ўсе ляжаць у Твораж, і зірнуць на іх можна будзе, калі яна вернецца.

За якую-небудзь гадзіну мы агледзелі ўсё, выйшлі на калідор, потым спыніліся на ганку, якраз насупраць сцежкі, па якой я ішла з аўтобуснага прыпынку.

— Стаміліся? — спачувальна запыталася Карабань.— Адпачывайце, а ўвечары сустрэнемся з Твораж. Калі ёсць жаданне, можна будзе прайсці ў лясгасаўскі клуб — там сёння кіно. Я пазнаёмлю вас з Зіначкаю — яна аніводнага фільма не прапусціць. Сама я не заўсёды іду: клопат хатні, турботы... Ну, адпачывайце, адпачывайце... Заўтра ўжо ўсё — у вас рабочы дзень...

Адчыніліся дзверы, і Мацяш неяк разгублена і напешліва паведамляе, што хворы Пяшко патрабуе ўрача.

Карабань незадаволена крывіцца:

— Зноў гэты аматар скандалаў! Таму і не гоіцца нага, ад скандалаў ягоных. Я вам яго паказвала. Памятаеце?

Намагаюся прыгадаць твар хворага, пра якога кажа мне Карабань. Але не магу прыгадаць. Ды мы, уласна кажучы, ля ложкаў хворых і не затрымліваліся: яна сказала прозвішча, два-тры словы пра гісторыю хваробы кожнага, і ўсё. Дарэчы, з хваробаю ног ляжаць у бальніцы тры чалавекі. Хто ж з іх Пяшко? І сорамна прызнавацца, што не памятаю, і я пытаюся, спадзеючыся, што будзе нейкае тлумачэнне:

— Відаць, нешта ж яму спатрэбілася?

— Скандал яму спатрэбіўся. Усё яму не па ім — во ўжо натура! І як толькі з ім жонка жыве!

Мацяш ціха пярэчыць Карабань:

— Яна вясною памерла. У нас і памерла...

— Ах, праўда. Зусім з памяці выбегла. Дык што ён хоча?

— Новага ўрача патрабуе. Вас ён кліча, Галіна Сямёнаўна... Абавязкова каб прыйшлі...

Карабань падціскае губы, потым, безнадзейна махнуўшы рукою, дазваляе мне ісці, і гэты дазвол гучыць як загад, які немагчыма не выканаць:

— Ідзіце, ідзіце... Пазнаёмцеся бліжэй — даведаецеся, што гэта за чалавек... І стражэй з ім. Будзе прасіцца на выпіску, я ведаю... А Твораж загадала не выпісваць...

І тут я прыгадваю, хто такі гэты Пяшко. На трэцім ложку, ля акна ён ляжыць. Калі мы спыніліся ля яго, Пяшко знарок заплюшчыў вочы, прыкінуўся, быццам заснуў. Але я бачыла, як уздрыгвалі доўгія рудыя веі і торгаліся таўставатыя, напружана сціснутыя губы.

— Вы клікалі мяне? — пытаюся я ў Пяшко і крайчыкам вока бачу, як прагна цікуе за мною яго сусед, які ляжыць на ложку ля сцяны. Адчуваю па цішыні ў суседнім пакоі, што там таксама слухаюць з увагаю нашу размову. І не гэта мяне турбуе — да новага ўрача цікавасць хворых зусім натуральная і абгрунтаваная,— а тое, што мне, мажліва, давядзецца выслухваць скаргі на працу сваіх калег. Як мне да гэтага паставіцца? Не ведаю. Не ведаю ўвогуле, як мне трымацца тут з гэтым хворым.

— Клікаў,— адказвае, крыху счакаўшы, Пяшко.

— Што-небудзь здарылася?

— Нічога не здарылася. Я папытаць вас хацеў. Вы доўга правяраць іх будзеце?

— Каго правяраць?

— Ды ўсіх іх тут трэба праверыць. Яны мяне знарок тут трымаюць. А мяне даўно ўжо трэба было выпісаць!.. І ўсё тут праверыць...

— Не бачу я ў тым аніякай патрэбы, у тым, каб усё праверыць, як вы кажаце. І я не збіраюся нікога правяраць. Я новы ўрач, прыехала сюды працаваць. І бальніца мне падабаецца. Ва ўсім — узорны парадак. Чысціня і парадак!

— Чаму ж тады нага ў мяне не гоіцца?

— А што ў вас з нагою?

— Прапароў нагу. Ноччу. Рыбаліў.

— Як жа вам гэта собіла? Возера ў вас тут чыстае, пясочак мяккі...

— Дык яно ж, калі на злом пойдзе, і на роўным месцы ляснешся...

— Пакажыце вашу нагу... Паглядзім!..

Пяшко з ахвотаю адкідвае коўдру, варушыць пальцамі, хоць я і не прашу яго рабіць гэта — прызвычаіўся ўжо. Я бачу, што пальцы ў яго кратаюцца хутка, лёгка і скура нармальнага колеру. Але як гоіцца рана — мне невядома: нага ад самай ступні і да калена добра і акуратна забінтавана. Сказаць што-небудзь пэўнае мне цяж-

ка, бо я не бачыла гісторыю хваробы, не прысутнічала на перавязцы, і здымаць павязку не маю права.

Але гэтыя тлумачэнні Пяшко не здавальняюць, і ён цвердзіць адно і тое ж, не заўважаючы, што супярэчыць самому сабе: чаму, маўляў, яго не выпісваюць, чаму рана гоіцца блага.

— Вы дзе жывяце? — пытаюся я, разумеючы, што самае лепшае перавесці гаворку на іншае.

— Пры самым азярку.

— І човен у вас ёсць? Я сёння хадзіла на возера, дык бачыла човен патоплены. Вада ў ім — па самыя барты.

— Дзе гэта такі човен? Дзе гэта?

— А вось тут, непадалёчку, як па сцежцы ад бальніцы ісці на возера. Ён ля кладак тамка...

— Э-ээ, не! Гэта не мой човен. Мой там, на пасёлку. Човен у мяне хвацкі — сам зрабіў. Бо па нашым азярку без чоўна рыбіну не зловіш добрую. А ў нас рыба ё, ой ё!

— Вось пра гэта вы і думайце. І не трывожце сябе дарэмна. Нага тады хутчэй загоіцца. Дарэчы, судак у вас водзіцца ў возеры?

Не ведаю, што на мяне найшло,— я пачала з ім гаворку зусім не пра тое, аб чым павінен быў бы весці гаворку добры ўрач. Але гэта было, мабыць, самае разумнае выйсце, бо Пяшко падтрымаў гаворку ахвотна, ажывіўся, вочы яго глядзелі на мяне па-сяброўску, і адчужанасць, што была паміж намі на самым пачатку, знікла незаўважна.

— Судак ёсць, а як жа! — амаль што выгукнуў Пяшко на поўны голас, хоць да гэтага размаўляў сцішана, быццам стрымліваючы сябе.— Цяпер самы раз яго на блешаньку прыхапіць. Ведаеце, доктар, я летась, якраз у гэты час, пад канец лета, ох нахватаў судакоў. На тры кілаграмы кожны. Як жыты накосяць — ён на блешню ідзе. А ў мяне блешанькі з сакрэтам. Я іх сам раблю. Сам!

— А з люстэркам у вас блешанькі ёсць?

— Як, як?

— З люстэркам. Такая на лыжачку падобная блешня, а ў сярэдзіне — кавалачак люстэрка прыпаяны. На Дзвіне такімі блеснямі рыбаляць...

— Гэта што ж, сюды, значыцца, прыпаяна люстэрка? — пытаецца Пяшко, сагнуўшы далонь левай рукі.— А што ты думаеш? Гэта ж яна тады ў любое надвор'е бліскаць будзе. Во, халера, прыдумалі! Ну, то і я ж змайструю. Гэта мне як ніць даць зрабіць...

Ён глядзіць у адчыненае акно, і я заўважаю, як хутка і дзіўна змяньваецца твар Пяшко: даўно пяголены, збляднелы твар жывіць добрая ўсмешка, а ў прыжмураных крыху вачах лятуценнасць, прывабная і добрая засяроджанасць чалавека, які заклапочаны чымсь вельмі важным і дужа яму патрэбным.

Я пайшла з пакоя, і Карабань чакала мяне на тым жа месцы. Нашу гаворку з Пяшко яна, мабыць, не чула, а можа, і чула — акно ж было адчынена, але зрабіла выгляд, што гэта — нейкія там патрабаванні хворага Пяшко — яе зусім не тычацца. Яна спытала мяне зусім роўным і спакойным голасам:

— Можа, вам трэба што дапамагчы? У сэнсе побыту... Рэчы вы свае ўсе перавезлі?

— Багаж я свой на станцыі пакінула. Можа, знойдзецца якая машына — і прывязу.

— Гэта не праблема. Твораж дамовіцца з лясгасам ці мантажнікамі — іхнія машыны на станцыю штодня ідуць... Тады, магчыма, да заўтра? Вы Твораж толькі дачакайцеся. Яна, мабыць, зараз прыедзе...

Але Твораж мне давялося чакаць доўга. Я прыбрала пакой, потым сядзела ў садзе з Мацяш, ласавалася дужа смачнымі яблыкамі, слухала, сама расказвала аб сабе і дзівілася, што мая субяседніца зусім мала цікавіцца маёй асобаю; гэтая простая сціпласць мяне адразу настроіла дужа даверліва, і я адчула, што з Мацяш мы будзем сябраваць.

Быў ужо блізкі вечар. Вялізнае агністае сонца, але не прамністае, быццам ахутанае ў ярка-чырвоную тканіну, вісела ў бэзавай дымцы над лесам; справа ад яго, як вялізны накаты трамплін, выгіналася чорная, нібыта дым, хмара; хмара была нерухомая, а сонца непрыкметна хілілася на далягляд, і таму здавалася, што яно толькі што зляцела з гэтага трампліна-хмары і толькі-толькі замарудзіла свой рух.

Я глядзела на неба і не адразу заўважыла, што па сцежцы ад возера ідзе жанчына ў светлым плашчы і коціць побач з сабою веласіпед. Ішла яна хуткім, па-вайсковаму чоткім крокам, і я адразу ж, як толькі ўгледзела яе, невядома па якіх прыкметах, здагадалася, што гэта ідзе Твораж. І здагадку маю тут жа — шэптам чамусьці сказала «яна ідзе» — пацвердзіла Мацяш, якая адразу ўзнялася і пайшла ў бальніцу.

Мы пазнаёміліся. Твораж прыветна ўсміхнулася мне,

але у яе вялікіх карых вачах я прыкмеціла незадаволенасць, нейкую як бы падазронасць. Магчыма, гэта ішло ад стомленасці, але думка такая завітала да мяне і не праходзіла.

— Мы сёння не чакалі вас,— сказала Твораж, але не дадала, калі канкрэтна яны чакалі мяне тут, і я, злавіўшы ў яе голасе ноткі незадаволенасці, здзіўлена адзначыла сабе, што яна літаральна паўтарыла тыя ж словы, што сказала Мацяш пры нашай сустрэчы.— Ды і заўтра, мабыць, тое ж самае было б. Гэты месяц мы амаль што і не сядзім у бальніцы: то туды, то сюды лётаем. І ўсё пешачкі, ды ножанькамі сваімі...

— Хіба бальніца не мае транспарту? Хаця, праўда, я ж гэта ведала...

Яна зірнула на мяне так, нібыта я сказала неверагоднае глупства і ёй сорамна нават адказваць на гэтае недарэчнае пытанне, але і пакінуць маю нетактоўнасць незаўважанай ёй таксама цяжка і немагчыма. Дзіўныя вочы ў гэтай Твораж: злуе, безумоўна ж, злуе, а незадаволенасць знікла, і на бровах нечакана разгладзілася хмурнасць — нібыта чымсь узрадавалася жанчына.

— У нас дамоўленасць і з калгасам і лясгасам. Даюць, часам, «газік», а зімою і ў бездараж — конь выручае. На фурманцы, дарэчы, сёння Габінаў пакаціў. У Крынкі. Там, па ўсіх меркаваннях,— эклампсія. Званіў Хведар Іванавіч?

Яна спытала гэта ў Мацяш, якая не паспела яшчэ ўвайсці ў будынак бальніцы.

— А як жа! З сельсавета званіў. Казаў, Галіна Сямёнаўна, што да вечара застаецца. А магчыма, да раніцы.

— І больш нічога?

— Вас пытаўся. Сказаў, што пазвоніць.

— У які час? Трэба ж было дамовіцца канкрэтна. А самаадчуванне жанчыны?.. Трэба ж было ўсё гэта запісаць. Вось што, звaніце і шукайце мне яго зараз жа! Ідзіце!

Іхняя гаворка ляцела паверх маёй галавы, але мне здавалася, што кожнае слова пранізвае мяне, пранізвае і не знікае зусім, а пакідае ў душы нейкі няясны водгук, падобны на лясное рэха.

— Стамілася я з гэтым канём,— сказала Твораж і прыхіліла веласіпед да спінкі рабрыстай лавачкі, зробленай пад акном бальніцы ля старога язміну.— Сядайце. Вы агледзеліся ўжо тут? У нас хораша — райскі куточак...

— І вельмі добрая бальніца, я вам павінна сказаць. І гэта не камплімент які, а праўда...

З гучным бразгатам адчынілася акно, і Мацяш, стаўляючы тэлефон на падаконне, радасна выгукнула:

— Знайшоўся! Звоніць Хведар Іванавіч!

— Давай яго сюды,— з пагрозаю, але не злоснай, а мяккай, дабрадушнай пагрозаю сказала Твораж. Яна стала ля акна, рашуча ўскінула тэлефонную трубку да вуха.— Гэта — Твораж! Што, што? — яна падзьмула ў трубку, патрэсла яе, зноў прыклала да вуха.— Твораж гаворыць. А-ааа... Пачуў, урэшце. Чаму адразу не паведаміў, што там?.. Ну, ну... А зараз?.. Ага! Бачыш, я заўсёды цябе першая павіншую... Ведама, шчаслівая, а як жа! — Твар яе праясніўся, потым спахмурнеў, але тут жа, амаль імгненна, зноў добрая ўсмешка разгладзіла зморшчыкі ля вачэй.— Я заўсёды казала: Габінаў калі захоча — усё зробіць найлепшым чынам. Не, не... Кампліменты ты свае прыхавай. Знойдзеш, каму перадаць... Так, прыехала... Не, не распытала яшчэ... І прыгожая. Вельмі купат! Так што спяшайся, бо давядзецца табе з мантажнікамі ваяваць. Ці лясгасаўскімі хлопцамі! А як жа, зараз і перадам!..

Яна аддала трубку Мацяш і сказала ёй, задаволена націраючы рукі:

— Наробяць панікі... Ніякая там не эклампсія... Проста двайняты нарадзіліся. Пастаўце тэлефон на месца, калі ласка. І зачыняйце акно,— і ўжо дадала мне, усё з той жа ветлівай усмешкаю: — А вам прывітанне перадае. Таленавіты ўрач, я вам павінна паведаміць. І — удачлівы. Вы верыце ў гэта? Я веру ва ўдачу. Ёсць такія людзі: за што возьмецца — усё ў яго як па масле коціцца.— І раптам, быццам не было тэлефоннага званка і размовы з невядомым мне Габінавым, працягвала перарваную размову:— Вы кажаце «вельмі добрая бальніца». Пачуць гэта прыемна. А што вам болей ад усяго па душы?

— Чысціня. І ўвогуле, праўда, гэта першае ўражанне, адчуваецца клапатлівая рука. Крыху ўладарная такая рука... Вас тут, заўважыла я, крыху пабойваюцца...

Мае словы ёй не спадабаліся, і я гэта бачыла і адчула, што нечым пакрыўдзіла Твораж.

— Вы канчалі Мінскі, як я ведаю. Так? — нечакана спытала яна, быццам і не пачула маю заўвагу.— А я вучылася ў Першым Маскоўскім. Вы ведаеце Маскву?

— Не вельмі. Некалькі разоў была там...

І зноў пытанне, такое ж рэзкае і нечаканае:

— Па ўласнаму жаданню сюды? Ці размеркавалі?

— Раён выбрала сама. А вашу бальніцу прапанавалі ў раённым аддзеле. І ехала сюды з ахвотаю — я ўвогуле люблю новыя дарогі, новыя месцы...

— А я ехала сюды, нібыта ў вір. Маладая, каханне не зусім удалае... На нашым курсе ніхто не хацеў ехаць у Беларусь: балаты, маўляў, камары, усё спалена... А я — паехала... І вось ужо амаль чвэртку стагоддзя. Значна, праўда?.. Замуж тут выйшла, дзяцей нарадзіла... А яна, Таганка, часам і сасніцца... І яшчэ — фантан ля Вялікага тэатра, дзе мы сустракаліся з Пятром. Я заўсёды прыходзіла на спатканні раней, а ён — пазніўся. Сяду на лавачку, вось як тут зараз... А з яблынь пялёсткі — шур-шур-шур... Ох, там і цвітуць вясною яблыні! І асыпаюцца, і чуваць, як шархацяць пялёсткі... Зірнеш на франтон тэатра — страшна робіцца: здаецца, няма калон, а коні ляцяць у паветры. І са страху вочы заплюшчыш. А зірнеш — ляцяць коні, як жывыя... Гэта і сасніцца, бывае...

— Вясною мне не даводзілася бываць у Маскве. Больш — улетку. Звычайна, горача было там улетку. А я гарачыню ў горадзе не люблю: не пераношу пах асфальту...

Не магла даўмецца, чаму мае словы так падзейнічалі на Твораж: ледзьве ўлоўны цень прабег па яе веях, яна села раўней, і на мяне глядзела ўжо зусім другая жанчына — патрабавальная і ўладарная. І гэты пагляд мяне здзівіў, і я дадала:

— З малых год не пераношу.

— Цяпер аб нашых справах,— сказала Твораж, і я адчула, што на ўспамінах пастаўлена кропка.— Я дамовілася з раёнам: будзеце на паўтары стаўкі. Поўная — тэрапія, і палову — вушніка. Месяцы тры стаўка вушніка ў вас будзе поўная — Барэцкая наша ў дэкрэце. Вернецца — возьме ў вас палову стаўкі. Кватэра тут, пры бальніцы... Лепшага пакуль што няма. Нам, праўда, абяцаюць дом у пасёлку — на чатыры кватэры, цагляны, з усімі выгодамі. Але гэта — будучыня... Што яшчэ?..

Я маўчала. Працаваць яшчэ і вушніком? Пра гэта мне каб слоўца ў раёне! Калі б сказалі — не пагадзілася б сюды ехаць. А што цяпер зробіш? Працаваць яшчэ і вушніком, мне, якую пры адным толькі напамінку пра хваробы вуха пачынае ванітаваць... Дзяўчаты ў групе ведалі гэтую маю слабасць і пацвельваліся, але пераадо-

лець гэтую сваю дзіўную і нічым нерастлумачаную непрыязнасць я не магла. Хацела і не здолела. А тут мне давядзецца самастойна працаваць па гэтай спецыяльнасці, якая далёкая мне, якую, дарэчы, я зусім блага ведаю, павярхоўна, і якую страшэнна не люблю. Гэта ж нейкае пакаранне! Ці насмешка?

Не, на жаль. Твораж глядзіць на мяне стомлена, абыякава, быццам усё даўно вырашана і мая згода ці нязгода нічога не могуць змяніць і аніякага значэння не маюць.

І я сама падзівілася! Нічога не запярэчыла ёй, нават выгляду не падала, што гэта мне ўсё не па душы, моўчкі выслухала, і гэтае маё маўчанне, я заўважыла, яе таксама здзівіла, але яна, мабыць, зразумела яго і па-належнаму высока ацаніла.

— Паверце, вы мне яшчэ будзеце дзякаваць за гэтую нагрузку. Абяцаю вам спецыялізацыю на вясну,— і ўздыхнула.— У нас, самі бачыце, пакуль што цеснавата. Вось гэты пакой, дзе тэлефон, ён і кабінет мой, і прыёмны пакой, і дзяжурка — усё разам. Будзем дабудоўваць новы корпус,— паведамляе яна, і гаворыць гэта такім тонам, быццам я ў стане нешта тут жа і змяніць.

— Гэта, мабыць, складана...

— Вядома! Але рашэнне ёсць, матэрыял таксама... Будаўнікоў толькі няма. Людзей у нашых месцах мала, асабліва мужчын...— і, быццам спахапіўшыся, дадае: — Тут да раніцы можна гаварыць — гэтулькі праблем. Самі пабачыце, каб вас не запалохаць адразу... Адпачывайце. Будзе час — аб усім падрабязна пагамонім... Да заўтра. Эх, хо-хо-хо... Цяперка — хатні клопат на плечы...

Яна ўзяла веласіпед і, гонячы яго побач, пайшла сцежкаю. Твораж ішла ўсё тым жа чоткім крокам, і штосьці вельмі ўпэўненае было ў яе па-вайсковаму дакладных кроках і рухах. Паходка — люстэрка душы. Кажуць, што нішто з такой дакладнасцю не сведчыць аб натуры чалавека, як яго хада: зірні на паходку чалавека, і ты лёгка можаш зразумець яго натуру, схільнасці, слабасці.

З медыцынскага пункту гледжання гэтае сцвярджэнне вельмі ж спрэчнае, але я недзе чытала ці чула аб ім і зараз прыгадала гэта з нейкай унутранай засцярогаю. Сухар, мабыць, гэтая Твораж. Уладу любіць. Вайсковы парадак тут навяла. Але як тады разумець гэтую яе дзіўную шчырасць? Упершыню ўбачыла мяне, зусім не ведае, што я за чалавек, а так даверліва — як ні кажы, а я ж

ёй падпачаленая! — і шчыра адкрыла мне старонку свайго даўняга асабістага і не зусім удалага жыцця. І хто гэта той Пятро, з якім яна страчалася некалі ля Вялікага тэатра?..

Тварэж прыпынілася, сказала, бы нешта раптоўна прыгадаўшы:

— А вы ведаеце што? Хадземце да нас. Убачыце, як мы тут жывём. І пасёлак пабачыце. І, вядома ж, не вячэралі?

Я падзякавала, сказаўшы, што ведаю, дзе сталоўка, і буду вячэраць там.

— Не, не! Пайшлі! Сталоўка нікуды не дзенецца. Не ўцячэ сталоўка тая, толькі плашчык захапіце. Дождж, напэўна, збярэцца. Хутчэй жа, хутчэй!

Я ўзяла плашч, і мы пайшлі.

Хмара, якая зусім нядаўна вісела над лесам, паблізілася, усчаўся парывісты вецер, і акацыі паабапал сцежкі суха, бы званочкі, шухцелі перасохлымі струкамі. Тварэж сарвала струк, патрушчыла яго ў пальцах.

— А на дождж можа і не сабрацца,— зноў выказала яна цяпер зусім супрацьлеглае меркаванне пра надвор'е.— Гэтыя струкі, як барометр. На дождж яны так не пазвоньваюць. На засуху звіняць.

— Дождж не патрэбен зараз. Ураджай жа ўбіраюць.

— Не, што вы! Вельмі патрэбен дождж — азіміна пасеяна. А поле сухое. У нас тут калгас моцны: у жніўні жытні кліп звычайна ўвесь засеяны.

— Вы, аказваецца, добра ведаеце вёску!

— Жонка агранома! А хіба я вам не казала, што Васіль мой аграном? Ну, вось пазнаёмлю зараз... Ён — аграномам у калгасе. А да праўлення далёка — амаль дзевяць кіламетраў. Да ўзбуйнення было чатыры калгасы, а цяперка — адзін. Магутная гаспадарка. На выстаўцы дасягненняў у Мінску ёсць нашы экспанаты. Не даводзілася пабачыць?

— На выстаўцы я была. Але гэтага не ведала. Цяпер, калі давядзецца, абавязкова спынюся... Але ж на працу вашаму мужу далёка. Дзевяць кіламетраў!

— У яго — матацыкл. Я ўсё падбіваю на «Масквіча». Не пагаджаецца. Баіцца, што я машыну ў бальніцу забяру. У мяне ж ёсць і правы. Яшчэ са студэнцтва — у гуртку займалася. Састарэлі, вядома, хачу памяняць, але часу не стае: клопат, клопат, клопат... Калі не было гэтых маньтажнікаў — тут ціхутка. А цяпераќа праз гэтых рызыкан-

таў спакою няма. На мінулым месяцы — два няшчасныя выпадкі. І ўсё — па дурнасці...

— А мантажнікі гэтыя што, лінію куды вядуць?

— Так, на Бігосава. Высакавольтную. Была звычайная, а цяпер яе замяньваюць. На жалезныя апоры ставяць... Даруйце за цікавасць, а бацькі ў вас ёсць?

Знянацку гэтае пытанне. Але я зразумела, што зусім не бацькі мае цікавяць Твораж: яна, напэўна ж, хацела ведаць нешта і пра маё асабістае жыццё, і зайшла на гэтую гаворку непавіта з такога боку. І я не пакрыўдзілася: Твораж мела права на гэтае пытанне, і я не магла, не хацела таіцца ад яе, але неяк міжвольна атрымалася, што пра Валеру я не сказала ёй аніводнага слова.

Яна з цікавасцю слухала маё апавяданне пра бацькоў, якія павінны былі — тата пісаў у апошнім лісце — неўзабаве вярнуцца з далёкай будоўлі. Але, як мне здалося, зразумела, што нешта з свайго асабістага жыцця я ўтаіла, не пажадала ёй расказаць, і, зразумеўшы, тактоўна не распытвала мяне, і ў маім сэрцы пасялілася трывалая ўдзячнасць ёй за гэта.

## 5

Мы ішлі з Твораж вуліцаю лясгасаўскага пасёлка, і яна расказвала мне пра кожны дом і яго гаспадароў, і я слухала і не заўважыла, як мы павярнулі ў маленькі і вельмі вузенькі завулачак. Паабапал у садах буяў пакамечаны і дужа лапісты вішняк, там-сям крануты ўжо восеньскімі барвамі.

Кароткі, крокаў на сорак, завулак заканчваецца крутым схілам да ручая, які зарос высокай чаромхаю. Чаромха расце ўнізе, на схілах ручая, і здаецца, што яе густыя разгалістыя шаты вытыркаюцца з-пад зямлі. І ля гэтых шатаў, крыху ўправа ад завулка, стаіць маленькі драўляны дамок з тэрасамі на два бакі. За ім, на пагорку, расце сасна, нізкая, быццам прыціснутая чымсь зверху. А злева ад яе, праз лістоту чаромхі, паблісквае блакітнае срэбра вады.

І гэтыя разгалістыя шаты чаромхі, з чорным россыпам спелых і дробных ягад, і сасна на пагорку, і блакітны бляск вады, і нават дамок — літаральна ўсё, што так раптоўна адкрылася пагляду — былі неяк дзіўна знаёмыя, нібыта сасніліся нядаўна, і вось я зноў, у яве ўжо, бачу дзіўныя малюнкі сну. Падабенства было такое вялізнае, такое

раптоўнае, што я нават не адразу і сцяміла, дзе і калі бачылася мне ўсё гэта.

Спынілася, стаяла і глядзела, не маючы сілы зрушыцца з месца. Гэта ж Валераў дом! Толькі пафарбаваны ў ярка-цагляны колер!

І дзівіла мяне не гэтае нечаканае і так раптоўна ўбачанае падабенства, а кволая, чуйная ціхамірнасць, што апанавала мяне. Я баялася крануцца з месца, каб не спалохаць, не разбурыць гэтае мроіва ўспамінаў, і гэтую чароўную, крыху тужлівую, поўную стрыманага агню мелодыю, што поўніла мяне і зачароўвала: ціхенька-ціхенька, нібыта баючыся чагосьці, асцярожна пудзіла-малілася флейта, глуха, як астматык, бубнілі фаготы і трывожна, як плакалі, крыўдавалі скрыпкі; потым, нібыта адсунуўшы ўсе гэтыя гукі ўбок, уладарна, з святочнай урачыстасцю павялі сваю песню кларнеты.

— Пазнаяце? — спытала Твораж, і я зразумела, што гэтая мелодыя жыве не ва мне, а існуе самастойна, ліецца з шырокага акна тэрасы за вішняком.— Гэта песня Сольвейг. З «Пер Гюнта». Ведаеце? Васіль заўсёды, калі ўбачыць, што я іду, уключае магнітафон... Калі па шчырасці — дык і не кожны раз... Гэта — калі настрой у яго добры. А сёння — добры, бо ўключыў магнітафон. У нас ладная падсабралася фанатэка. Бачыце, я ўжо расхвальваю свайго Васіля...

Васіль стрэў нас на падворку. Ён быў у каўбойцы, з вялікімі белымі квадратамі, трымаў і старанна разглядаў нейкую дэталь, чорную ад мазуту; рукі ў яго былі таксама перапэцканы мазутам, і вузкія пісягі спаласавалі замурзаны твар, і ад гэтага твар здаваўся састарэлы і стомлены. Васіль зрабіў крок нам насустрач, і тады я ўбачыла матацыкл, схаваны пад нізкім вішняком; матацыкл быў амаль і не відзён, толькі бліскала, як вока нейкае, белая фара з-пад галін.

— Рамонт? — спытала Твораж і дадала ўжо мне: — Ён толькі адно і ведае: рамонт, рамонт, рамонт... А ўсё таму, што болей твар мазутам змазвае, чым дэталі... Пакінь, Васіль, свой занятак. І я цябе пазнаёмлю. Гэта — наш новы ўрач...

— Во добра, во добра! — шчыра выгукнуў Васіль і зірнуў на мяне вельмі ўзрадавана і даверліва, і я здзівілася, убачыўшы, як змяніўся раптам чалавек, калі насціраў анучкаю, што вісела на галінцы слівы, чорныя пісягі з носа і шчок: перада мною стаяў малады яшчэ даволі муж-

чына, з мяккім паглядам сінявых вачэй.— Цяпер жонка хоць менеї дзяжурыць будзе, бо мы ўжо і не страчаемся амаль. Нават баюся: сутыкнёмся дзе на сцежцы і не пазнаем адно аднаго — гэтак рэдка бачымся...

— А дзеці дома?

— З вудамі сядзяць. Зараз прыйдуць. Я гукаў...

— Давайце памыемся,— прапанавала Твораж і, падаўшы мне з падаконня ручнік, пайшла да круглага бліскучага ўмывальніка, які вісеў на калку над сліваю. Яна ўзняла накрыўку, паглядзела, ці ёсць вада, і зноў з бразгатам паставіла яе на месца, і я заўважыла, што ў Твораж вельмі прыгожыя рукі — пальцы доўгія, гнуткія.

— Вы, мабыць, іграеце? У вас рукі, як у піяністкі...

Яна не сумелася, адказала памяркоўна, быццам працягвала перарваную размову:

— Крыху вучылася. Бацькі прымушалі, а я ўсяляк упіралася — не любіла сядзець за інструментам. Мелодыі ведала, любіла, а вось сядзець і развучваць — не. А цяпер шкадую. Праўда, дзяцей кантраляваць магу. У Наткі слых ёсць. І яшчэ лепшы — у Валеркі. Але хлопец дужа натурлівы. Выступаў на школьным вечары, калі сёмы канчаў — ён зараз у дзявятым — і нехта пажартаваў: артыст, маўляў, знайшоўся. Як адрэзаў пасля таго: да піяніна ані блізка. А здольнасці ёсць... Васіль! Вячэраць на тэрасе?

— Лепей у садзе,— адгукнуўся Васіль.

— Дождж хвастане — уцякаць давядзецца. На тэрасе, на тэрасе лепей. І гукай рыбакоў гэтых!

— Няхай паловяць. Перад дажджом клёў добры. Паспеюць, павячэраюць.

— Тады кідай сваю тэхніку. Мы есці хочам...

Твораж стаўляла на стол талеркі, папрасіла мяне пакроіць хлеб, і я, дапамагаючы ёй, зноў падзівілася з таго, як хутка замест строгай жанчыны, загадчыцы бальніцы, з'явілася дужа прыветлівая, зусім жа маладая гаспадыня, змяніла сукенку, фартушок белы, у сінюю палоску надзела, і такі ж на галаве шалік, завязаны, як хусцінка.

— Васіль у мяне харошы,— зноў усё з той жа даверлівасцю, якая здалася мне падазронай у бальніцы, паведаміла.— І жывём дружна. Будаваліся — цяжка было. А цяпер — лёгка. І дзеці падраслі: памочнікі добрыя. І што дачка, што сын — рыбакі: могуць цалюткі дзень на

возеры гойсаць,— і гукнула ў шырокае, па ўсю сцяну акно.— Васіль! Мы чакаем!

Мы селі вячэраць, і Васіль, звяртаючыся больш да мяне, чым да жонкі, прапанаваў:

— З нагоды вашага прыезду, а таксама ў гонар госці належыць, мабыць, чарка...

— Не, не! Я — супраць! І рашуча супраць.

— Ён жа таксама не п'е,— сказала Твораж і, быццам даапраўдваючыся перада мною і пераконваючы некага, дадала:— Каб вы ведалі, як тут, часам, п'юць! Па-дурному. З нейкай злосцю, ці што? Асабліва лясгасаўскія з маштажнікамі!

— Што ты наша Залессе чорнай фарбаю малюеш? Ніхто ў тую гарэлку асабліва і не глядзіць. Тым больш цяпер!

— Дык з чаго ж яны тады п'янеюць? З ветру?

— А дзяўчаты нашто іспуюць? Чалавек малады, поўны тыдзень, лічы, у лесе, а тады вернецца, на дзяўчыну зірне — галава і закружылася!

— Ай, кінь...— адмахнулася Твораж.— Чэснае слова вам даю, Галіна, што каб не гарэлка гэтая, дык наша б бальніца пуставала паўгода, не меней.

Васіль адразу ж і падхапіўся:

— А што, гэта ідэя! Выліць усю гарэлку, а бальніцу зачыніць. Гаспадыня тады дома. Дзеці дагледжаны. Муж спакойны...

— Ты і без гэтага спакойны. Табе адзіная трывога — запчасткі для матацыкла!

— А я ж магу і забастоўку пачаць — кіну матацыкл!

— О, не! Тады мне спакою не будзе!

Яны жартавалі, і я жартавала разам з імі і расказвала пра Мінск, і адчувала сябе як дома, быццам ведала гэтых людзей даўно, і вячэра ішла весела. А вячэралі грунтоўна: тушоная бульба з баранінаю, смажаныя грыбы, свежыя памідоры і гуркі, парэзаныя буйна, густа аздобленыя чорным перцам і алеем. Потым пілі чай.

— Паспытайце варэння,— прапанаваў мне Васіль і падсунуў рабрыстую вазу з сіняга шкла.— Гэта — чаромха. Я іх тут папавучваў варыць, як у нас у Сібіры...

— Дык вы сібірак?

— На Іні вырас. Чулі пра такую рэчку? Э-ээ... Пра яе мала ведаюць. А гэта — даволі буйны Обскі прыток. Там я нарадзіўся. І каб не гэтая вось жанчына,— ён лыжачкаю паказаў на жонку,— я б там і застаўся...

— Мы пазнаёміліся з ім у цягніку,— растлумачыла Твораж.— О-оо! Я калі-небудзь вам раскажу пра гэтае знаёмства — цэлая гісторыя.

— Толькі без хлусні,— патрабаваў Васіль.— Як на споведзі, як гэта кажа ваша Мацяш. Дарэчы, вы пазнаёміліся з ёю? Адзіная жанчына, якая нечага вартая ў вашай бальніцы,— і тут жа са смехам дадаў: — Ведама, пасля вас і маёй жонкі!..

Моцны парыў ветру зашастаў у вішняку, і тут жа, амаль следам за гэтым мяккім шоргатам, гулка, аж зазвінелі шыбы, ляснулі грымоты.

— Васіль! А дзеці ж на возеры! — усхапілася Твораж.

— Не размокнуць. Ды і не будзе дажджу вялікага сёння...

— Васіль, я цябе прашу. Зараз жа гані іх дамоў!

Я ўзнялася:

— Мне таксама час. Дзякую за вячэру!

— Сядзіце, сядзіце. Зараз вы нашых пабачыце дзяцей. Васіль! Ты пойдзеш ці не? Збіраецца ён, як мокрае гарыць...

Яны ўпрошвалі мяне застацца яшчэ хоць на гадзінку, але я не пагадзілася, развіталася і не дазволіла, каб Твораж праводзіла мяне. Амаль сцямнела, вецер памацнеў, і злева, над лесам, што быў за возерам, успыхвалі на счарнелым небе крывыя пісягі маланак, і грымоты накатваліся грукатлівымі хвалямі, ад якіх аж звінела ў вушах.

На сцежцы ўжо, той знаёмай сцежцы, па якой я бегла сёння памыцца пасля дарогі, мяне дагнаў гучны покрык: «Вале-ера! Дамоў, дамоў зараз жа!» Рэха, пашкуматанае ветрам, ляцела над вадою, і яму ў адказ гучаў малады звонкі голас: «Ідзём зараз! Ідзём ужо!» І зноў магутнае і патрабавальнае: «Валера! Валера!» — І ў адказ яму маладое, бадзёрае, як песня: «Ідзём! Ідзём! Ідзём!»

Ведала: муж Твораж кліча дзяцей. Але гэтыя галасістыя покрыкі і само імя «Валера» спарадзілі ва мне глухую, як цемра ў заглушшы чаромхі, тугу. Пачыналіся паабапал сцежкі пасадкі акацыі, і да мяккага шоргату лістоты прымешваўся ціхі і сухі звон вузкіх патрэсканых струкоў, здавалася, што ўсе галіны акацый зроблены з тонкага гучнага металу і дробненька ўвесь час трымцяць.

Я слухала гэты ціхі няроўны звон, які то мацнеў ад парываў ветру, то слабеў і быў ледзьве ўлоўны, і ў памяці зноў ажывала мінулае. Нават не мінулае, а толькі адзіны зімовы вечар у мінскім парку над возерам. Мы зайшлі ў

самы дальні куток з Валерам, вакол быў ружаваты паўзмрок, і ружавеў, здавалася, снег, і неба на захадзе, дзе толькі што схавалася сонца, было аранжавае, у шырокіх бэзавых палосах; мы спыніліся, і я пачула, як ціха-ціха звініць вакол нас паветра.

— Дубы,— сказаў Валера.

Нечаканасці ў гэтым не было — Валера часцяком казаў мне дзіўныя, нічым, здаецца, не звязаныя словы — і я засмяялася, прыняўшы Валераву гульню:

— Бяроза!

— Ды не, ты паслухай. Гэта ж дубы звіняць. Вунь яны, бачыш? Ад лістоты такі гук...

Маладыя дубы раслі непадалёк ад сцяжынкі, пры самenькім беразе возера. Лістота на іх не абляцела, нават не скурчылася, а толькі пажоўкла. Была адліга, потым падціснуў мароз, лісце падмерзла і цяпер звінела, быццам зробленае з гучнай жоўтай фальгі. Я ведала, што лісціны на дубах самыя звычайныя, толькі зледзянелі, і бачыла, што вецер гайдаў галіны — не вельмі моцны вецер, ён нават не адчуваўся на твары зусім,— і чула, як па зямлю церусіліся звонкія гукі, быццам яны, гэтыя гукі, наледзянелі і набылі бачныя на вока формы, зрабіліся, як ільдзінкі,— ведала, але ўсё роўна ўспрымала бомканне зледзянелых лісцінак, як самую чароўную і дзіўную мелодыю, якая калі-небудзь іспавала ў свеце. І каб мяне хто-небудзь у той час намысліў перакапаць, што гэта не так, я проста пасмяялася б, не пагадзілася б, нават магла б і пакрыўдзіцца...

І цяпер — зноў. Амаль тыя ж гукі!

Звінелі, брэнькалі падсохлыя струкі акацый, і змрочна шухцела чаромха, і ўсё гэта было як песня, якая была пачута толькі аднойчы, але лягла на сэрца назаўжды. Усё гэта было, як жар пад попелам: падзьмуў вецер, адкінуў попел — і вуголле зноў горача і ясна свеціцца і не згасае.

## 6

Вось і мінуў першы дзень мае самастойнае працы. Ён быў кароткі, як імгненне. Пазнаёмілася з медперсаналам, перачытала гісторыі хваробы хворых, што ляжаць у бальніцы, зрабіла перавязку Пяшко і доўга гутарыла з ім. Рана гоіцца добра, і, відаць, на тым тыдні мы яго выпішам.

Вось, здаецца, і ўсё. Хаця не, складалі яшчэ графік — дакладней, абмяркоўвалі, бо склала графік Твораж — начных дзяжурстваў на будучы месяц. Я выказала жаданне дзяжурыць адразу ж, сёння, але па графіку, які быў складзены яшчэ да мяне, гэтае дзяжурства належыць Зіне Ягорчык, якую Твораж увесь час заве ласкава Зіначкаю. Дык вось, Зіначка не пагадзілася, каб стары графік неяк ламаўся і рабіліся нейкія карэктывы. Я на сваёй прапанове не настойвала: Ягорчык гэта было па душы, як мне падалося.

Мінуў дзень, і я зусім не стамілася, і намысліла напісаць ліст у Мінск, абяцала бабульцы, што напішу адразу ж, як толькі прыеду на месца і неяк уладкуюся. Бацькам я пішу раз у месяц.

Сяджу цяпер, пішу ліст. Яшчэ толькі сем гадзін, але на дварэ цямрэча, цярусіцца, лапоча па яблынях дробны дождж. Потым сціхае, толькі мякка шахціць мокрая лістота, і мне прыемна слухаць гэтыя ціхія гукі, пісаць, думаць, што я надзвычай добра зрабіла, што паехала працаваць сюды, у гэты мілы і зацішны куток, дзе мяне сустрэлі вельмі цёпла і па-сяброўску.

У аднастайны, звыклы пошум лістоты ўмешваюцца зусім новыя гукі. Чмякаюць капыты, рыпяць колы фурманкі, і голас — глухі і хрыпаты — патрабуе:

— Тр-ррр! Стой!

На імгненне ўсё сціхла, потым гучна, бы стрэл, хлабыснуў пошчак пугі — загучаў ужо зусім іншы голас, вясёлы і бесклапотны: «Чуть живые, в ночь осеннюю, мы с охоты возвращаемся. До ночлега прошлогоднего, слава богу, добираемся. Вот и мы! Здорово, старая! Что насупилась ты, кумушка? Иль о смерти ты задумалась? Брось, пустая это думушка...»

І зноў першы голас:

— Болей нікуды сёння, Хведар Іванавіч? Я тады шугану на стайню...

Гэта ж Габінаў прыехаў! Я здагадалася, узнялася, але да акна не пайшла, слухала; акно было адчынена, і чуваць усё вельмі добра.

— Эх ты, таварыш Шумейка! Таварыш Шумейка! — з вясёлым шкадаваннем сказаў Габінаў.— Хоць і ўдзячны я табе за гэтую дарогу бязмежна, але мушу сказаць па ўсёй шчырасці, што глухі ты да мастацтва чалавек. Яму класіку чытаю, а ён — «шугану на стайню...». Ды шуганеш, паспееш. Ёсць жа яшчэ ў нас час! Давай на апошняй па-

пяросіне скурым, і ты мне шчыра прызнаешся, што гэтага самага Някрасава ты «ни при какой погоде», як казаў другі бліскучы паэт...

— Чытаў я Някрасава, чытаў, Хведар Іванавіч! І вы ж гэта добра ведаеце!

— Тады — усё. Пытанняў больш няма, дарагі таварыш Шумейка. А што, добрая ў нас з табою дарога была? У дарозе ты чалавек незаменны, і розум у цябе... Ой, розум! Міністэрская галава! Не ведаюць у нас часам, каго міністрам ставіць трэба! Ну, да новых радасных сустрэч?!

Успыхнула полымя запалкі, потым загурчэлі колы, затокалі капыты. Хісткі прамень электрычнага ліхтарыка дрыжэў і вагаўся на чорнай і мокрай зямлі — Габінаў ішоў да бальніцы.

Крыху спагадзя грузныя крокі сцішыліся пад маім акном. Габінаў адсунуў убок цюль фіранкі і тройчы пастукаў пальцам у шыбу.

— Дазвольце ўвайсці?! І добры вечар! І яшчэ адно, калі ласка, пытанне. Як сказаў паэт? «Что ты жадно глядишь на дорогу, в стороне от веселых подруг?..»

Габінаў стаяў пад акном, і твар яго быў добра асветлены. Мяккая лінія губ, чоткі цыганскі профіль носа і высокі, блішчасты ад вады лоб. А веі ўвесь час міргалі — не прызвычаіліся да яркай электрычнай віднаты, і цяжка было зразумець, якога колеру ў яго вочы.

— Ды калі ласка, калі ласка...

Ён увайшоў і быў збянтэжаны, і мне падалося, што я размаўляла ля акна зусім з другім чалавекам, але не з гэтым, які стаяў цяпер на парозе, прыхінуўшыся спіною да касяка. Занадта доўгі ваеннага крою зеленаваты плашч звісаў аж на халявы кірзавых ботаў і быў зашпілены на ўсе гузікі, а башлык вісеў за спіною, і ў складках яго было відаць янтарнага колеру сасновае шыгалле, у тоўстых губах зацiснута згаслая папяроса, якая абгарэла няроўна, адным краем.

— Вы толькі цяпер з Крынак? Як там? Я, дарэчы, прысутнічала пры вашай размове з Твораж. Што, сапраўды было падазрэнне на эклампсію?

— Спачатку я прапаную пазнаёміцца. А потым пяройдзем да звычайных бальнічных спраў і клопатаў.

— Так, сапраўды. Але ў мяне такое адчуванне, што мы нібыта і знаёмыя...

Я пацiснула яго руку, вельмі шырокую, моцную, і ён не адразу адпусціў маю руку з сваёй далоні, угледаўся, і

я ўбачыла зблізку яго вочы, блакітныя, дабрадушныя вочы.

— Значыцца, на чым мы з вамі спыніліся? А-аа! Што там у Крынках? Адказваю: звычайны выпадак элементарнага акушэрства. І вось вынік: два новыя жыхары нашай вялікай планеты глядзяць на гэты боскі свет. Калі вы чулі нашу ўчарашнюю гаворку, дык вы павінны гэта добра ведаць.

— А як парадзіха?

— У найвыдатнейшым стане. І там, дарэчы, ёсць медсястра. Працуе на ферме даяркаю. Выгадней — гэтак яна кажа. Як вам гэта падабаецца? Увогуле — фенаменальна тое, што я бачыў. Між іншым, не дужа і рэдка такое ў нашым жыцці: тонюткая кволая жанчынка працуе на ферме, а гэты Рамізевіч — біцюг, класічны біцюг — лайдачыць на вольным паветры. Ляснік. Я нічога не маю супраць гэтай прафесіі, паважаю яе, але ён — доўбня, да таго ж у самай непрыкрытай форме. Гоніць самагонку і паціхеньку спекулюе. Як вам гэта падабаецца?

— Рамізевіч — гэта хто?

— Я ж вам і кажу: муж парадзіхі.

— І ў яго блізняткі?

— Уявіце сабе,— ён развёў рукамі і самотна ўсміхнуўся, і яго блакітныя вочы неяк раптоўна сцямнелі.— Ды яно ж часцяком гэтак і вядзецца ў нашым найпрыгажэйшым кутку: дурням — шчасце. Верная прымаўка, я мушу вам сказаць...

— Гэта вы зусім дарма. Сядайце, калі ласка...

Габінаў застаўся стаяць, быццам і не пачуў маіго запрашэння, толькі пацёрся плячамі аб касяк: змяты плашч тапырыўся на яго плячах, крыху прыгорбленых; ён глядзеў на мяне недаверліва, але не хаваючы свае цікавасці. Цішыня была ў пакоі, і я пачула асцярожлівыя крокі на калідоры: ціха і хутка рыпнулі масніцы, і гук гэты растаў ля дзвярэй, што вялі з кухні на бальнічны калідор. «Няўжо хтось падслухоўвае нас? Не, гэта неверагодна, не можа быць! У бальніцы зараз адна толькі Карабань. Не, Зіначка яшчэ дзяжурыць збіралася...»

І ад гэтай маёй падазронасці, ні на чым не абгрунтаванай, ад таго, што я ў думках назвала Зіначку так, як заве яе Твораж, мне зрабілася смешна.

— Вы стаміліся, Хведар Іванавіч! І вам трэба адпачыць.

— Гэта верная думка! Але я разлічваў на гаворку грунтоўную, па праблемах. У вас ёсць праблемы?

— А ў каго іх няма?

Я падышла да яго бліжэй і тут жа адхіснулася. «Ён жа зусім п'яны!» Пах гарэлкі я ўвогуле не выношу, а тут быў не проста пах, а смярдзючы, агідны перагар, змешаны з пахам табакі, часнаку, цяжкі і густы, як мазута.

На падворку прагучаў гучны покрык:

— Хведар Іванавіч! Хведар Іванавіч! Дзе вы тут ёсць?

Па голасу я пазнала адразу: Карабань кліча. Пазнала і хацела пажартаваць, каб ён спяшаўся, але не паспела. Габінаў салютнуў мне рукою і кіўком галавы і, пстрыкнуўшы выключацелем, выйшаў з пакоя, асцярожна прыціснуўшы за сабою дзверы.

Не ведаю, знарок ён зачапіў рукою выключацель ці гэта атрымалася міжвольна, калі ён пахіснуўся. Святло я не запальвала, стала ля акна. Вочы хутка прызвычаіліся, і ноч за акном не здавалася зусім цёмнай. Простая жаночая цікавасць: карцела даведацца, ці Карабань гэта клікала Габінава. І на гэтую цікавасць былі, як мне здавалася, падставы: асцярожлівыя крокі за сцяной па калідоры, патрабавальны, поўны нецярпення покрык на ганку.

Але як я ні ўглядалася, нічога не змагла заўважыць. Габінаў знік, нібыта ноч праглынула; ні гуку крокаў, ні голасу, толькі шапацелі ад ветру голлем мокрыя яблыні.

Я памкнулася найсці ўключыць святло і тут жа ўбачыла Габінава. Натапыраны плашч развяваўся пры хадзе, башлык насунуты на голаў — незямная нейкая істота рухаецца. Побач з ім была Карабань. Ён ішоў хістаючыся, і яна падтрымлівала яго, і яе постаць здавалася надзвычай тапюткай і кволай.

Да сэрца падступіла знаёмае пачуццё адзіноты. Я не магла заставацца ў пакоі. А што рабіць? Лясгасаўскі клуб? Але там сёння нічога, здаецца, няма. Найсці хіба ў бальніцу? А што, гэта самае лепшае, мабыць: там людзі, хоць не адна будзеш...

Плафоны на калідоры былі прыцемнены, толькі шырокім колам свяцілася лямпа ў кабінеце Твораж. Дзверы туды былі адчынены, і я адразу ж, як толькі ўвайшла ў бальніцу, убачыла і гэтую лямпу, якая стаяла на белай бальнічнай тумбачцы, і Зіначку, якая прытулілася ў кутку канапы, бы згубілася на гэтым старасвецкім, з высокай спінкаю і полачкамі па баках, збудаванні; ля канапы, на

дыванку, стаялі маленькія, бы дзіцячыя, жоўтыя скураныя пантоплі.

Зіначка пачула, як адчыніліся дзверы, вядома, потым пачула мае крокі і ўбачыла, зрэшты, і мяне, але не зварухнулася, нават не выпусціла з рук часопіс, толькі ногі закрыла шчыльней халатам, быццам разам са мною ўвайшоў у дзверы холад.

— Дзяжурым? — запыталася я, адчуўшы, што Зіначка не вельмі прыветна глядзіць на мяне.— Я таксама па начах дзяжурыць люблю. Даруй, магчыма, я перашкаджаю табе чытаць?

— Ой, не. Што там! Праўда, кніжка цікавая. Не даводзілася? — яна адгарнула вокладку часопіса, прачытала з адкрытым і шчырым захапленнем невядомую мне назву рамана.

Я шчыра прызналася, што не чытала, і гэта прывяло яе ў захапленне, яна тут жа мне паабяцала даць шосты нумар, дзе друкуецца пачатак рамана і які яна прачытала ўжо.

— Гэта нешта ў стылі Рабле,— дадала яна, і адчувалася, што захапленне раманам непадробленае і вялікае.— Якая ж сіла! Увесь час паўтараецца адзін і той жа матыў — гінуць чалавечыя надзеі. І не адчуваеш аніякай трагедыі, бо з сілаю незвычайнаю ўслаўляе пісьменнік любоў чалавека да сваёй зямлі, вернасць ёй, смеласць чалавека і грамадзяніна. І яшчэ адна галоўная думка ясна акрэсліваецца: страціў мужнасць, прымірыўся са злом, закрэсліў мінулае, утаптаў яго ў гразь — і, лічы, няма чалавека, бо чалавек — часцінка гісторыі. Гэта — выключна! Гэта — выключна.

— Добра, я пачытаю, і пачытаю абавязкова, а потым мы пагамонім. Мне проста цікава цяпер. Ты так глыбока можаш аналізаваць... Мабыць, шмат чытаеш?

— Не, мала. Большасць вось так, на дзяжурстве. А дома немагчыма. Маці не любіць, калі я з кніжкаю сяджу.

— А бацька?

Яна спахмурнела, але адказала гэтак жа роўна, як і казала дагэтуль аб рамане, але было відаць, што гэта ёй даецца не вельмі лёгка.

— Ён не жыве з намі. І даўно. Я вучылася тады, а ён маму кінуў. І вы ў мяне, калі ласка, пра яго ніколі не пытайцеся. Разумееце? — спытала і зноў папрасіла, і голас яе зазвінеў.— Ніколі не пытайцеся!..

— Даруй... Я ж нічога не ведала, чэснае слова, не ведала. Я праўду табе кажу...

У пакоі было цёпла, але я сцялася, бы ад сцюжы; нейкі холад знутры — непрыемны і колкі холад, прабег па плячах. Няма, няма і не было ў цябе аніякага права на такія роспыты! Быццам допыт нейкі: чалавек табе адно сказаў, а ты ўжо адразу з душы прыгаршчаю хочаш!

Лаяла сябе не за гэтую сваю празмерную цікавасць — у маім пытанні не было аніякай цікавасці, проста мне хацелася быць бліжэй да Зіначкі, нейкая патрэба ў цеплыні, а за тое, што міжвольна прынесла ёй боль. Чамусьці прыгадаўся Габінаў. Як ён натапырана стаяў каля дзвярэй. І ад яго гэтак смярдзела перагарам і часнаком. І ён, мабыць, заўважыў гэтую маю агіду, па-свойму зразумеў яе і не схацеў размаўляць са мною шчыра, а ўзяў той гулліва-бесклапотны тон, які так здзівіў мяне напачатку і насцярожыў. А ён за гэтым сваім тонам, магчыма, хаваў жаданне па-сяброўску пагутарыць; а гутарыць ён хацеў, я бачыла, адчувала, і цяпер з асаблівай яснасцю пачынала разумець гэта.

— А чаму вы не спіце? — запыталася Зіначка.— На новым месцы, відаць? Так?..

— Мабыць...

— І яно ў мяне заўсёды так. Памятаю, як прыехала я ў Віцебск на ўступныя экзамены — амаль тры ночы не спала. Смешна нават прыгадаць. Мы жылі ў вялізным пакоі — ложкаў на пятнаццаць. І мяне не так экзамены хвалявалі, як грошы: мама дала мне грошы, яна іх паўгода збірала, і я баялася, каб іх не ўкралі. Ноччу засынала і тут жа спахоплівалася: ці цэлыя. А потым сорамна нават было тое прыгадаць, гэты свой недавер...

— За свае грошы я спакойная. У мяне іх проста няма.

— Вы мяне зусім не так зразумелі. Проста быў выпадак у маім жыцці... Амаль усе дзяўчаты, што жылі тады ў тым пакоі, паступілі, і мы вучыліся разам, і сябравалі.

— Ты даўно вучобу скончыла?

— Ну. Трэці год працую. Цяпер тут добра — стаўкі вольныя ёсць. А тады і не было, як я прыехала. Я ўсяго на палову стаўкі і рабіла — Хведар Іванавіч мне тады палову стаўкі аддаў. Ён перад тым, як мне на вучобу ехаць, сюды прыехаў. А жонка яго сюды не паехала з Масквы. Не, прыязджала, але потым зноў паехала і болей не вярнулася. А ён так і застаўся і адзін жыве.

— Ён што, масквіч?

— Ну. Але вучыўся ў Мінску. І чалавек вельмі харошы. І кнігі любіць дужа. Толькі вось адно ў яго гора — кніжку ў шкляной вокладцы любіць часам пагартаць.

— П'е?

— Ну. Не заўсёды, праўда, і розум не прапівае...

— І Твораж спакойна глядзіць на гэта?

— Ну-уу, не скажыце! Яна яму такую прачоску дае — возера кіпіць. Але яна яго цэніць — выдатны ўрач. І хворыя да яго хінуцца,— яна раптам узялася гартаць часопіс, бы штосьці шукала ў ім, потым паклала яго на тумбачку каля лямпы, хуценька запыталася:— Вы надоўга сюды?

— Гэта цябе дужа зацікавіла?

— Ну. Але я папытала проста так.

— Відаць, не зусім і «проста так»...

— Хочаце на шчырасць?

— А як жа інакш?!

— Ну. Значыцца, гэтак,— сказала Зіначка, рашуча страсянуўшы галавою, і ад гэтага яе светлыя валасы закрылі ёй амаль палову твару. Тое, што яна збіралася сказаць мне, мабыць, бянтэжыла яе, яна пачырванела і змахнула пасоўкаю кропелькі поту, што віселі над верхняй губою.— У нас тут урачы чамусьці не затрымліваюцца апошнім часам. Папрацуюць і паедуць. Летась два да нас прыехалі. А сёлета вясною — ту-ту... Толькі вы, калі ласка, не думайце, што я гэта знарок кажу. Я па праўдзе кажу, і мне за гэтую праўду іншы раз грабяня даюць.

— Хто ж гэта?

— Ды ўсе патрошку... Але мне хацелася, каб вы тут засталіся.

— Сапраўды?

— Ну!

— А чаго ты гэта «нукаеш»? Усё «ну». Звычка?

— Ну,— і сама добра і міла засмяялася.— У нас у пасёлку ўсе так гавораць.

— А ты сачы за сваёю мовай. Гэтае «ну» вельмі ж непрыгожа гучыць... І не хвалюйся, што я адсюль збягу. Тут мне пакуль што ўсё даспадобы. Лясы, возера... Бальніца добрая. Дый патрэбы няма некуды бегчы ці ехаць.

— Замуж пойдзеце і паедзеце.

— А можа, у мяне муж ёсць.

— Не, няма. Твораж, калі з раёнам дамаўлялася, распытвала. Ёй сказалі: адна.

— Я адна і далей буду. Пытанне гэтае вырашана і падпісана.

— І я прыкладна тое ж казала. Абяцала, клялася нават сабе. А сюды прыехала — праз месяц нейкі і вяселле гулялі. Міхась мой у лясгасе працаваў. А зараз — у калгасе. Электрык.

— Дык вы замужам? — спытала я і не змагла, як дагэтуль, казаць Зіначцы «ты».— Вось чаго не думала, дык не думала.

— І дачка расце — другі гадочак. Так што «адна» — глупства... Дарога дзявочая вядомая. І я вам па шчырасці параю: прыглядайцеся да мантажнікаў. Мілата. І спецыяльнасць якая ў руках! Ды наш старшыня, скажы каторы з іх, што заставацца хоча ў калгасе,— дом адразу збудуе... Цяпер электрык на вёсцы, як міністр, не раўнуючы,— і, невядома з якое прычыны, засмяялася.— Толькі гэтыя мантажнікі — нахалы страшэнныя. І летуны: сёння — тут, заўтра — там. Дзяўчаты вясковыя іх проста набойваюцца. Набойваюцца, а самі ліпнуць, як мухі на мёд. А мёд — гэта рэч добрая, толькі многа яго не з'ясі...

Яна разважала самавіта, грунтоўна і спакойна, як жанчына, што пажыла на гэтым свеце багата і нямала пабачыла. І чаму ж гэта Твораж ды і іншыя завуць яе Зіначкай? І я вось разам з імі. І як гэта ў Зіначкі з яе мілым, зусім дзявочым тварыкам хапіла тактоўнасці не заўважаць маю фанабэрыстую перавагу. Але якая ж тут перавага? Ніякай перавагі няма. Зіначка, ведама, у сто разоў лепей ведае жыццё, з гэтым я згодна. Ведае людзей, і з гэтым я спрачацца не буду.

Але ў адным, перакананa, яна памыляецца. Памыляецца ў гэтай сваёй безапеляцыйнасці, з якою яна вызначае маю асабістую дарогу. Відаць, гэта заўсёды лёгка дужа: вызначаць камусьці яго шлях у жыцці, нешта раіць ці патрабаваць. Сапраўды, як гэта гаворыцца: чужую бяду, маўляў, рукамі развяду, а да сваёй дык і розуму не дабяру. Зіначка вунь як лёгка вызначыла мой будучы лёс, усё ёй ясна, усё на свае месцы паставіла. А мне гэты мой будучы лёс, як суцэльны туман, туман і невіднота. Не, чаму туман? Спецыяльнасць ёсць. Месца ў жыцці вызначана — працуй, прынось карысць людзям. Ты ім шмат чаго вінна, бо і вырасла і вывучылася, а яны ў гэты час працавалі...

Мне здавалася, што я пераканала і супакоіла сябе. Але гэта быў самападман: я разумела, што зараз мне, як ніколі раней, не хапае чагосьці, і гэтае «чагосьці» зусім не другараднае, галоўнае і, калі не галоўнае, дык вельмі ж

важнае і патрэбнае, і яго не хапае і не будзе хапаць і сёння, і заўтра, і пазней. І гэтае галоўнае — Валера!

Валера, Валера...

Я не хацела ні прызнавацца Зіначцы ў тым, што яна, безумоўна, у нечым мае рацыю, ні шчыра ёй пра ўсё расказваць, ні нават даваць ёй падставы ў чымсь сумнявацца. Яна гэтак думае? Калі ласка, гэта яе права. Але ж і ў мяне ёсць права думаць інакш!

Самае смешнае ў гэтай сітуацыі было, бадай, зусім не тое, што мяне не цікавіў накірунак маіх думак. Самае смешнае, на мой погляд, і гэта я добра разумела, было тое, што гэтых доказаў, якія я рабіла сабе, ніхто не вымагаў ад мяне, ніхто не патрабаваў ніякіх тлумачэнняў, ніхто не чакаў ад мяне шчырасці, а, наадварот, усе самі ішлі, як гэта зараз зрабіла Зіначка і рабіла Твораж нядаўна — на гэтую шчырасць.

Мы дамовіліся з Зіначкаю: заўтра яна прынясе мне часопіс, і я буду чытаць гэты раман. Я вярнулася ў свой пакой, прычыніла акно, легла на ложак.

І зноў сну не было, і зноў думкі пра Валеру не давалі мне спакою. І зноў я размаўляла з сабою, размаўляла спакойна, дакладней, думала так, што размаўляю ў думках спакойна, але думкі гэтыя адганялі спакой, і я намагалася неяк ураўнаважыць іх простым і катэгарычным доказам таго, што мне Валера зусім і не патрэбны. Ну зусім жа не патрэбны! Зусім!

Я не хацела думаць пра Валеру, пераконвала сябе, што трэба спаць, бо заўтра пачынаецца працоўны дзень, яшчэ адзін дзень мае самастойнае працы, што ў мяне ёсць цяпер цікавая праца і што ёсць шмат іншага клопату. Трэба, у прыватнасці, дамовіцца наконт машыны і прывезці са станцыі багаж, а гэта зойме поўны дзень, і трэба яшчэ шмат папрацаваць, каб зрабіць у пакоі ўсё так, як мне хочацца, і трэба пайсці на пошту, а да яе кіламетры чатыры, і аформіць падпіску на газеты і часопісы...

Ёсць клопат, адным словам, не малы. І чым болей я думала пра гэта, тым усё болей пераконвалася, што без Валеры мне цяжка давядзецца ў гэтым ціхім і прыгожым кутку. І ўвогуле нельга мне без яго! Ён павінен прыехаць сюды! І сапраўды, чаму не прыехаць яму сюды? У адпачынак, скажам. І я пазнаёмлю яго з гэтым Пяшко, і тут ёсць човен, і ён можа парыбаліць!..

Валера прыедзе сюды!

Калі, як гэта здарыцца, я не ведала. Але гэтая думка авалодала маім розумам, і я ніяк не магла, ды, шчыра кажучы, і не хацела ёй супраціўляцца: разумныя доказы нерэальнасці і немэтазгоднасці прыезду Валеры сюды ўшчэнт глушыла дурная і сляпая перакананасць сэрца, і я разумела, што менавіта так, як патрабуе сэрца, і адбудзецца, і ад гэтай перакананасці ў маім сэрцы абудзілася цяпер ужо не з успамінаў сатканая, а з цвярозых і цвёрдых надзей магутная і радасная мелодыя, і гэтая мелодыя закалыхвала мяне, як мяккая і бязгучная гушкалка.

## 7

Спадарожнай машынаю еду на торфаўчастак — самы «пакутны», як кажа Твораж, пункт зоны нашай бальніцы. Захварэла Ганна Міхайлаўна Супрун, жонка памочніка экскаватаршчыка. Мясціны там дрыгвяныя, дарогі ўвосень амаль непраезджыя. Праўда, ёсць вузкакалейка, па якой вывозяць торф у райцэнтр, але зараз па ёй ідуць рамонтныя работы — апошняй навальніцаю размыла насып. Так што дабірацца туды цяжка: трэба даехаць машынаю да Завалынскага лесу, потым селавой дарогаю прайсці кіламетраў пяць аж да самага насыпу, павярнуць затым управа і па шпалах выйсці на ўчастак.

Усё гэта расказала мне Твораж, нават намалявала падрабязны план у маім блакноціку, як мне ісці, і запэўніла, што ўвечары гэтай жа машынаю — машына мантажнага ўчастка ідзе ў раён, я вярнуся ў бальніцу. Хацеў паехаць разам са мною і Габінаў, але загадчыца бальніцы не дазволіла.

І вось я ў дарозе.

Але «еду» — гэта не зусім дакладнае вызначэнне таго, што адбываецца. Мы ўжо другі раз стаім на ўзбочыне гравійкі. Першы раз — гэта калі праехалі кіламетраў пятнаццаць — шафёр Юрась Бабіч, рудаваты круглатвары хлопец з зялёнымі кацечымі вачамі, мяняў пярэдняе кола. На чыстай вясковай дарозе трэба ж было собіць колу на цвік! Потым, калі мы праехалі амаль такую ж адлегласць, нешта страшэнна забразджэла пад кузавам, і мы спыніліся.

Вось ужо амаль дзве гадзіны Бабіч поркаецца пад машынаю. Бачу яго ногі ў ботах, якія былі, мабыць, сёння раніцою добра наглянцаваныя, а зараз перапэцканыя і шэрыя ад пылу, і назаляю сваімі пытаннямі. Колькі ра-

зоў пыталася, калі ж мы паедзем і ці паедзем увогуле, але ён толькі рагоча і кажа адно і тое ж: «Паедзем, галубка, паедзем!»

Ён увогуле нейкі сумятлівы і, здаецца, дужа нахабны хлопец, гэты шафёр. Як толькі я села ў кабіну, ён бесцырымонна агледзеў мяне, нечага ўсміхнуўся, а крануўшы машыну з месца, абвясціў па-свойску, быццам сказаў сваймy сябру:

— Паехалі, галубка!

І сказаў ён гэта так проста, будзённа, па-таварыску нават, што я не запярэчыла і прыняла гэтае ягонае «галубка» як звычайны і добры жарт. Ён увесь час пацяшаў мяне рознымі гісторыямі, якіх ведае незлічонае мноства.

Пасля першага прыпынку, праўда, крыху сумеўся, але ненадоўга і зноў пачаў жартаваць. Калі ж мы ў другі раз спыніліся, ён вылез з кабіны, агледзеў машыну і, дастаючы з-пад сядзення сумку з ключамі, абвясціў з гуллівым, але змрочным смяшком:

— Закукуем, галубка, мабыць, да раніцы!

— Тады я пешкі пайду. Не магу ж я тут чакаць да раніцы — там чалавек хворы!

Спыніліся мы ў бязлюдным месцы — не відаць паблізу ніякага жытла. Ды і што можна пабачыць, калі стаімо ў нізіне, паабапал дарогі балаціна, парослая чэзлымі сасонкамі, а далей, на пагорках, зжаўцелыя бярэзнікі. Выязджалі, было і сонца, і неяк цёпла здавалася, а зараз пранізлівы вецер, неба змрочна асела да зямлі, і хмары нібыта зачапіліся за жоўтыя вастраверхія бярозы і спыніліся.

Мне холадна. Бабіч двойчы раіў мне залезці ў кабіну і там чакаць, але зрабіць гэта мне неяк няёмка: я буду ў кабіне сядзець, а чалавек на холадзе нудзіцца! Але ж і памагчы яму не магу, і вось тупаю ля машыны, і назаляю аднымі і тымі ж скаргамі, і ўсё спадзяюся, што ён нешта зробіць і мы паедзем далей.

Урэшце Бабіч вылазіць з-пад машыны і ярасна, быццам побач з ім нікога няма, пачынае лаяцца:

— ...каб я болей калі на чужы драндулет сеў!.. табе, паразіт, абібок, маржовы...

З бразгатам кінуўшы ключы пад сядзенне, ён скокае да калюжыны за ўзбочынаю, мые рукі, потым выцірае іх аб дзірван, тады аб штаны і нейкі момант саграе далоні пад пахамі. І я баюся ў яго што-небудзь запытацца.

Закурыўшы, Бабіч робіць дзве глыбокія зацяжкі, з

шумам выпускае дым і рагоча, і яго зеленаватыя вочы з пахабнай прыветнасцю глядзяць на мяне.

— А мы і па-аехалі! Паехалі, галубка? Шчаслівая ты, ой жа шчаслівая! Я думаў, што сядзець да раніцы, бо ў суботу па гэтай дарозе аніякі чорт не паедзе. Але і мне гэта навука: не садзіся на чужы драндулет. Лёнькава гэта ламачча, безручы гэтай.

— А што з ёй такое?

— Кардан барахліць. Можа, да райцэнтра дачыкіляю, а назад і не ведаю. Субота і нядзеля — воля! Чорта лысага знойдзеш на рамонтнай базе. Але пастараюся. І заўтра ты мяне, галубка, чакай. Ты калі там управішся?

— Не ведаю.

— Тады дамаўляемся: а чацвёртай на дарогу выходзіш.

— Раптам не адрамантуецца?

— Там Мохіна машына павінна быць. Я з ім тады назад і паеду. Слухай, галубка, а што гэта я цябе на танцах ніколі не бачыў у клубе?

— Мама не пускае.

— Э, мама. Ад мамы збегчы можна. Абы дзеткі малыя не плакалі. У наступную суботу мы з табою «полечку» ўрэжам, а?

— Старасвецкі ж танец!

— А ў нас яго па-сучаснаму шпарыць. Ніякі іншы ці заморскі параўнання не вытрывае. Бляск, адным словам. Значыцца, чакаю ў суботу?

— Чакай, гэта не·забаронена.

— Не, я па поўны сур'ёз!

— І я таксама...

Я была такая задаволеная, што мы ўрэшце едзем, і не звяртала ўвагі на яго жарты. У клубе быць? Калі ласка. «Полечку», як ён кажа, урэзаць? Можам і гэта. Паглядзім, увогуле, як яны тут час вольны бавяць. І нічога няма, на маю думку, у тым недарэчнага: я ж не бабулька якаянебудзь!..

А яго мая згода ўзрадавала, ён забубніў, засвістаў нешта невядомае, ніколі раней не чутае мною, і гэты яго спеў, і гучны гургат матора абуджалі ўва мне вясёлую і ўрачыстую мелодыю. Гэта мне дужа імпанавала, што адно маё слова, простая згода пайсці ў клуб выклікала такую радасць у Бабіча; я не прымала і яго жарты ўсур'ёз і яго нрапанову, і магла ўвогуле не пайсці ў той клуб, але адчуванне свае ўлады над гэтым крыху нахабным, але ра-

зумным і ў чымсь арыгінальным хлопцам мне было прыемным.

Да павароткі, што вядзе з гравійкі на торфаўчастак, мы даехалі амаль у прыцемках. Вузенькая селавая дарога, машыне тут не прайсці аніяк, непрыкметна звярнула з дарогі ў голы, без лістоты зусім, вольхавы параснік. Я і не заўважыла гэтую паваротку, але Бабіч добра ведаў яе, загадзя папярэдзіў і потым нават паказаў, як ісці.

— Недалёка тут «высакавольтка». Слупы ўбачыш — каля іх ісці можаш. А не хочаш — сцягою шпуруй, зблудзіць тут проста немагчыма — адна тут гэтая сцяга на вузкакалейку. Значыцца, дамовіліся? Заўтра ў чатыры — тут чакаю. А ў суботу — клуб у нашых руках!..

— Дамовіліся,— кажу я і ўскідваю лекарскую дарожную сумку на плячо; сумка даволі цяжкая, з чырвоным крыжам на бакавінах.

Гуд машыны амаль імгненна растаў у лесе. Я ішла хутка, і вольхавы параснік неўзабаве скончыўся, і паабапал ледзь прыкметнай сцежкі суцэльнай чорна-сіняй сцяною паўсталі маладыя ялінкі, быццам па калідоры ідзеш.

Неяк хутка амаль сцямнела, і ледзьве не згубілася сцежка, і галіны ялін перагароджвалі шлях, і даводзілася адводзіць рукою іх і пільна ўглядацца, каб не збіцца з аснoўнай сцежкі — увесь час нейкія прагалы, падобныя на сцяжынкі, былі то злева, то справа; я ішла ўсё наперад і наперад, не адчуваючы ні жаху, ні няўпэўненасці.

Міжвольна прыгадваліся жарты Бабіча, дакладней, не яго ўласныя, а вядомыя габраўскія, але яны ўпераказе шафёра гучалі зусім не так, як успрымала іх я, калі чытала невялічкі зборнічак тых жартаў у Мінску, і мне было смешна, і хацелася спяваць, а ногі ішлі лёгка, і стомы зусім не адчувалася.

Лясны калідор канчаецца, як адсечаны, і я бачу наперадзе роўную вузенькую і светлую паласу. Няўжо гэта насып? Так! Гэта ж я амаль што і прыйшла да мэты. Цяпер павярнуць і проста па шпалах — роўная, чыстая дарога. І нейкі светлячок міргае, коўзаецца наперадзе ля самай зямлі, потым спыніцца, вагаецца патроху, і тады ў светлым коле відаць бліскучыя рэйкі. Э! Дык гэта ж ліхтарыкам нехта забаўляецца!

— Хто там? — гукаю я і сама палохаюся свайго голасу: хрыпаты, дрыготкі, зусім незнаёмы голас.

— А там хто? — гучыць мне ў адказ з цемры дзіцячы галасок, і тут жа святло ліхтарыка знікае.

— Я хату Супруна шукаю. Ты не ведаеш, дзе ён жыве?

— Каторы Супрун? Той, што па станцыі? У нас два Супруны ёсць...

Я падыходжу бліжэй. Дзяўчынка свеціць ліхтарыкам не ў мой бок, а разглядае шырокае шкельца, і я добра бачу яе востранькі носік, пульхныя шчочкі і зусім не спалоханыя, а поўныя цікаўнасці вачаняткі. Дзяўчынка ў доўгім зімовым паліто з каўняром, а на галаве ні шапкі, ні хусцінкі.

— Мне патрэбен адзін чалавек,— кажу я.— Там хворая жанчына. А я з бальніцы прыехала. Ганну Міхайлаўну Супрун я шукаю.

— Гэта мая мама. А ў Супруноў, якія за калейкаю жывуць, усе здаровыя. Толькі Віцька кульгае.

— А чаго ён кульгае?

— З даху зваліўся. Нага залячылася, а ён кульгае.

— Мы яго заўтра паглядзімо, не будзе ён кульгаць. Цябе як завуць?

— Люда. Я ў чацвёртым класе,— дадала яна, быццам ведала, што будзе і гэтае пытанне, аб школе.— Толькі я цяпер не вучуся, як мама захварэла, трэба пры ёй быць. Бо школа ў нас далёка. Сем кіламетраў. Калейка як працавала, добра было: нас падвозілі. А цяпер тупаць усё трэба. Кажуць, на папядзелак наступны яна ўжо адраманттуецца. А вы не ведаеце пра чыгунку нічога?

— Не, не ведаю. Далёка да вас яшчэ ісці?

— Дык мы ж амаль і дома! Гэта ж вунь мы і жывём... Скажыце, вы маму хутка лячыць будзеце?

— Не ведаю. Я ж яе яшчэ і не бачыла. Вось як пабачу, уведаю, чым яна хворая, тады і скажу.

— А калі да Віцькі доктар прыязджаў, дык доўга вылечваў. Віцька ляжаў, ляжаў, спяваў нават, а хадзіць не мог.

— А мама твая хутка паправіцца і хадзіць будзе. Яна на ўчастку працуе?

— Ну. Без мамы блага. А яна ляжыць ды ўсё «ой» ды «ой»... Толькі гэта і гаворыць...

Мы ідзём па насыпе, пад нагамі рыпіць жвір, на рэйках мітаюцца кароткія промні жаўтлявага святла. Наперадзе ўжо добра відаць вокны будынкаў, і мы хутка набліжаемся да іх, і я заўважаю, як толькі сыходжу з насыпу, што гэта не будынкі, а тры таварныя чыгуначныя вагоны, толькі без колаў, на нейкім нязграбным шырокім

падмурку. Да кожнага вагона прыбудавана драўляная лесвічка з парэнчамі. Злева ад вагонаў горбяцца пязграбныя нізенькія хлевушкі, з пакатымі дахамі.

З тонкім перарывістым брэхам да нас кідаецца шчанюк, круціцца ў коле святла ад ліхтарыка, падскоквае.

— Воўк! На месца! Ма-арш! — загадвае Люда, але ў яе голасе адна ласкавасць, і шчанюк не дае дзяўчынцы ісці, спрабуе ўскочыць на рукі і ледзь не валіць Люду з ног; ліхатрык падае з яе рук на зямлю, і шчанюк кідаецца на ліхтарык, цяўкае, і я бачу яго нос, бліскучы і чорны, як вялізны гузік.

— Бачыце, што ён нарабіў? О, неслух які! Вось сядзеш ты ў мяне на ланцужок, будзеш ведаць,— з пагрозаю абяцае Люда шчанюку і, узняўшы ліхтарык, свеціць на крайні, справа, вагон.— Вось гэта і ёсць наш...

Мы ўваходзім, і нам насустрач узнімаецца з нізенькага бярозавага кругляка, што стаіць ля жалезнай печачкі, бацька Люды, шырокі ў плячах, з даўно няголеным і чарнаватым, бы закопчаным, тварам, і тады я бачу за яго спіною ложак, пры самай сцяне, і на гэтым ложку жанчыну, з мокрым ручніком на галаве.

— Памажыце, доктар, памажыце,— просіць ён і вядзе мяне да хворай, нахіляецца над ёю, папраўляе ручнік.— З чаго ўсё прыключылася? Каб жа хто сказаў! Цэбрык свінёнку несла, а назад ногі не вядуць. А зараз і яшчэ горай — ратуначку ж ёй няма...

Ганна ціха стогне. Яна не адразу зразумела мае пытанні і глядзіць няўцямна, потым закрывае вочы; лоб гарачы, скроні тлуста блішчаць ад поту.

Урэшце ломкі, са стогнам, голас:

— Жывот схапіла. Як нажом рэжа. І ў пахвінах рэжа. І са спіны... Авой ты вой, родненькая мая, памажы, ратуй ад болю, цярпець жа сілы няма. Ой, няма, няма, няма!..

Першае, што прыходзіць мне ў галаў,— апендыцыт. Але брушына пальпіруецца лёгка, пальпацыя аніякага болю ў хворай не выклікае. Не, тут нешта іншае. Супрун кажа, што жонка застагнала ад болю адразу ж, як толькі легла на ложак, і тэмпература падскоквала, то зноў была нармальная. І яшчэ гэты боль у пахве. Значыцца, ірадыяцыя ў пахву. Магчыма, нешта з ныркамі. Падобны боль на ныркавую коліку. Ныркакаменная хвароба, звычайна, дае такі боль, з ірадыяцыяй у пахву. Тут патрэбна, каб сказаць нешта пэўнае, клінічнае абследаванне, патрэбны адпаведныя аналізы...

Патрэбны мне, урачу... А ёй, хворай, патрэбна мая дапамога, тэрміновае збаўленне ад болю, а не якія-небудзь там аналізы. Разумею гэта і не магу сама без болю глядзець на Ганну. Позірк яе блукае, рот адкрыты, шчокі збляднелі, нос бліпчыць ад поту; Ганна цяжка дыхае, спрабуе ўскочыць, корчыцца, і мне з цяжкасцю ўдаецца ўтрымаць яе на ложку.

Шкада, ах як шкада, што я адмовілася ад дапамогі Габінава. Ён вельмі настойліва прасіўся ў Твораж, каб наехаць разам са мною. Яна была і пагадзілася, але я катэгарычна патрабавала: паеду толькі адна!

І вось цяпер, калі ласка, што ты можаш тут адна? Нават няма з кім параіцца. Сімптом Пастэрнацкага даволі яўны, крышталікі на дне вядзерца, якім карысталася раніцою хворая... Мабыць, гэта ныркавакаменная хвароба... І тут патрэбны гарачыя ванны, атрапін і шмат яшчэ чаго... А дзе гэта мне ўсё ўзяць?

Зноў гэтае «патрэбна»! А ёй, хворай, патрэбна толькі я, мае веды, мая дапамога. І я павінна нешта зрабіць. Не, не гэтае няпэўнае «нешта», а паставіць зусім дакладны дыягназ, павінна не памыліцца, дапамагчы хворай жанчыне!

За тонкай сценкай вагона нешта ціха звініць, пазвоньвае, і гэты нудны гук спачатку шкодзіць мне засяродзіцца, але потым я прызвычаілася да яго, не заўважаю нікога і нічога, апрача хворай. Зноў пальпірую брушыну, распытваю Ганну, прымушаю яе прыгадаць усе дэталі і падрабязнасці, што папярэднічалі хваробе; яна ўжо стамілася, ёй цяжка весці гаворку, але тое-сёе мне ўжо прасвятліваецца. Раптоўныя прыступы ныркавай колікі пачаліся ўслед за фізічным напружаннем, потым яны паўтарыліся, і наступіла анурыя. Яе выклікала, мабыць, закупорка ныркавых вен альбо трамбоз ныркавых артэрыяў... Што я магу? Ін'екцыю атрапіну, а потым — грэлкі, саграваючыя кампрэсы!..

Свой дыягназ стаўлю бадзёра, павесялеўшы, абяцаю Ганне, што ўсё пойдзе на лепшае, загадваю гаспадару грэць ваду.

— Ёсць вада, доктар! Ёсць! Кіпіць на ўсе пакрыўкі. Я ўжо ведаю, што ў лекавай справе вадзіца спатрэбіцца... Дачунька! — просіць Супрун дачку.— Бяжы на куханьку — яна ў нас у двары, доктар, куханька,— паглядзі, каб на пліце таксама кіпела...

У кутку стала, на трох белых цаглінах, электрычная

плітка і на ёй вялізны сіні чайнік; тонкі струменьчык пары выбіваецца з-пад накрыўкі, і накрыўка час ад часу ціха звініць-трамбоніць. Дык вось што, аказваецца, звінела, як мне здавалася, за сцяною. І я ўзрадавалася, і яшчэ больш узрадавалася не з гэтага адкрыцця, а з таго, што, урэшце, паставіла, і, як мне падалося, зусім правільны дыягназ. Шкада, вядома, што ў гэтых умовах ванны хворай не зробіш, але ў мяне ў сумцы ёсць грэлка, і можна наналіваць гарачай вадою бутэлькі!..

Праз паўгадзіны Ганна ляжыць на ложку, абкладзеная бутэлькамі з гарачай вадою, якія закручаны ў ручнікі; пульс робіцца роўны, але вочы яе глядзяць на мяне па-ранейшаму ўстрывожана; яна шырока і часта пазяхае.

— Спаць захацелася. Як боль суняўся, дык дужа ж спаць хочацца. Можна гэта, доктар?

— Неабходна нават! Вы спіце, спіце, калі ласка.

— Ужо ж мне так лёгка стала, дзякую вам, дужа ж лёгенька,— яна стомлена закрывае вочы, потым адкрывае іх, глядзіць на мяне даверліва і ўдзячна, і позірк яе не такі ўжо ўстрывожаны, крыху прасветліваецца, і вочы робяцца глыбокія і цямнеюць.— І маладыя ж вы саўсім. Кажуць, што па доктарку цяпер трэба сем год вучыцца. Я хачу, каб Людачка на доктарку пайшла. Мне казалі, што можна і меней.

— Меней, гэта ў тэхнікум калі паступіць. Там рыхтуюць фельчараў...

— Не, фельчар гэта не тое. Людачка на фельчарку не хоча. У інстытут каб паступіць ёй.

— Паступіць, абавязкова паступіць Люда. Толькі каб жаданне было, а калі жаданне ёсць, паступіць, і вучыцца не праблема... А цяпер спіце... Вам абавязкова паспаць трэба...

Пакуты стамілі яе зусім, і зараз, адчуўшы палёгку, яна засынае амаль імгненна і дыхае роўна, глыбока; шчокі ў яе ўсё яшчэ бляклыя, але гэта ўжо не сінюшная хваравітая бляклаcць, а жывая, тонкая і празрыстая, як у час абуджэння.

Колькі я так сяджу ля ложка хворай, не ведаю, нават не гляджу на гадзіннік. Ішла па лесе, падыхалася ляснога п'янкага паветра, стамілася, ды і блага спала мінулую ноч, цяпер прыгрэлася ў цяпле, і змора бярэ мяне, і, галоўнае, не ведаю, што рабіць далей. Назад вярнуцца? Няма як. А як тут можна будзе адпачыць? Мабыць, трэба нешта пашукаць на станцыі. Але ж якая тут станцыя?

Няма тут у ёй патрэбы, звычайны чыгуначны тупік, ды яшчэ вузкакалейка...

Асцярожна кашляе гаспадар, і гэты яго голас вяртае мяне ў свет рэальных фактаў і з'яў. Ува мне ўсё тая ж трывожная пустэча, і тлум у галаве, і стома ва ўсім целе; азіраюся вакол і адчуваю сябе так, нібыта толькі што апынулася ў гэтым чужым і нязвыклым для вока жыллі.

Шырокі белы плафон уверсе, прамавугольнік акна і каляровая фіранка на ім, абклееныя старонкамі з часопісаў сцены, падвешаная на драціне і замурзаная на краях шырма, што падзяляе вагон на дзве палавіны... Ніколі б не падумала, што з простага таварнага вагона можа атрымацца такое даволі ўтульнае і прасторнае жытло.

— Можа, вы адпачнеце, доктар,— прапаноўвае Супрун і шморгае ўбок шырму, і я бачу яшчэ два вузкія ложкі, і на адным з іх спіць Людачка, не распранулася нават, скурчылася ля сценкі.— Вы наспіцеся да раніцы. Мне зараз на ўчастак, на машыну зірнуць. Восень цяпер, дажджы... Небяспечна без нагляду...

— Я таксама выйду... Нешта тлумна ў галаве...

— А гэта можна, можна... Толькі апранаху, калі ласка, бярыце. Дождж пабубнівае...

Ён працягвае руку, здымае з вешалкі брызентавы, як у пажарнікаў, бушлат з башлыком, і я толькі цяпер чую над галавою рэдкае і ціхае туканне — дождж і сапраўды барабаніць па даху. Апранаю бушлат, і мы выходзім.

Усё змянілася вакол. Мы ішлі з Людай у суцэльнай цямрэчы, а зараз яркімі прамавугольнікамі свецяцца вокны, і гарыць ліхтар над кожным вагонам, і ланцужок электрычных агнёў наперадзе робіць голле бяроз амаль празрыстым, і слабае зарыва вісіць справа, недзе зусім блізка: пасёлак, мабыць, а можа, як казала Люда, гэта і ёсць станцыя, дзе жыве сям'я другога Супруна. Распытваць мне няёмка. Лепей заўтра ўсё тут, пры дзённым святле, агледжу сама ці распытаю ў Люды.

Я стаю і гляджу, як чэзне, расплываецца ў начы пастаць Супруна, слухаю глухое бомканне вадзяных кропляў па сухім брызенце башлыка, і мне здаецца, што дождж густы і моцны, а ў сапраўднасці — гэта добра відаць у светлых колах ля электрычных ліхтароў — ён слабы і рэдзенькі.

У дажджавым сяйве зноў бачу Супруна, які вяртаецца, але ідзе не адзін: побач з ім тупае нізенькі і тоўсты мужчына. Да мяне яны не дайшлі, спыніліся, закурваюць і пра

нешта гамоняць. Потым Супрун набліжаецца адзін і, адкашліваючыся, просіць:

— Такое тут, доктар, дзела, што Юткевіч кажа, што дачка яго на вуха жаліцца...

— Хіба ён сам гаварыць не можа? Нямко ён, ці што?

— Не, разумееце, час позні. Ноч жа... Я і кажу, што вы стаміліся... А ён упарціцца: дамовіцца, кажа, трэба...

— І правільна робіць. Няма вам патрэбы маім часам распараджацца,— мне падабаецца яго ціхі, упэўнены голас, і я папракаю Супруна, разумеючы, што раблю гэта толькі дзеля таго, каб падкрэсліць сваю самастойнасць і незалежнасць.— Што ў яго з дзяўчынкаю здарылася? Ды падыходзьце вы бліжэй! Цяжка ж размаўляць!..

Юткевіч набліжаецца; агеньчык папяросы — ён зацягваецца часта і моцна — успыхвае і асвятляе худыя, запалыя шчокі, буйны, з гарбінкаю нос і кудлатыя бровы не маладога ўжо чалавека.

— На вушка жаліцца. Правае. Баліць і баліць. Другі дзень ужо баліць. Вы б, можа, зірнулі на дзяўчынку, вельмі ж я вас прашу...

— Далёка?

— Чаго?

— Я пытаюся, ці далёка вы жывяце.

— Яно побач. Во тутка, на станцыі,— ён паказвае рукою на слабае зарыва.— На станцыі мы і жывём. Мы ёй галоўку завязалі, дык яно шчэ болей жаліцца, што баліць... Змаглася, дык і заснула. А заўтра раненька яна падбяжыць, як прачнецца. Дазволіце?

Мяне пачынае раздражняць гэты плаксівы тон. Не люблю, калі людзі паддобрываюцца немаведама чаго; па мне дык лепей грубасць, але адкрытая, шчырая, чым вось гэткая саладжавая, угодніцкая пачцівасць. Мабыць, шчыры чалавек нам заўсёды здаецца крыху грубаватым: мы вельмі хутка прызвычаемся да таго, што нашы слабасці шкадуюць, а калі гавораць праўду, яна заўсёды б'е па гэтых слабасцях, і мімаволі думаецца, што чалавек гэты грубаваты; потым такое пачуццё знікае, і мы адчуваем удзячнасць чалавеку менавіта за гэту, няхай сабе і грубую, але праўду.

Не хочацца размаўляць з Юткевічам, і я паспешліва пагаджаюся, што ранкам я з ахвотаю пагляджу дзяўчынку. Усё з той жа ліслівасцю ён пачынае дзякаваць, і мне непрыемна, што Супрун усё гэта чуе, і робіцца непамысна, і нейкая раздражнёнасць ускіпае ў сэрцы: па-

вошта, навошта ён гэтак гнецца? Чалавек жа! Няхай бы з Супруна браў прыклад, які не губляе пачуцця ўласнае годнасці, незалежна трымаецца, і яго паважаеш.

Урэшце я застаюся адна. Сугадныя крокі мужчын, што ідуць і пра нешта гамоняць, аддаляюцца, слабеюць і зусім знікаюць у начной цемры, і мне не хочацца нікуды ісці, але не хочацца і стаяць на месцы, і карціць даведацца, што гэта за бярозы такія злева ад вагонаў, і дзе тое зарыва, і я націху тупаю па сцежцы, што агінае вагоны.

Сцежка неўпрыкмет выводзіць мяне да нябачнага ў цемры насыпу, нізенькага, і я ледзьве не валюся, але наспяваю ўперціся рукамі ў мокры жвір; жвір халодны, і ад яго прыемна зябнуць пальцы, але болей я ўжо нічога не бачу — башлык замінае мне, зваліўся на твар, і я адкідваю яго, і тады адразу чую ў ціхім шапаценні дажджу па галлі і апалай лістоце прыглушаны гуд, і не адразу магу сцяміць, што гэта гудуць рэйкі.

Супрун з Юткевічам, мабыць, ідуць непадалёк па шпалах, а можа, і яшчэ хто-небудзь крочыць па насыпу, і каменьчыкі вылятаюць з-пад ног і стукаюць па рэйках, і яны цвынькаюць, дрыжаць, нібыта струны, якія крапулі пальцамі; гэтыя гукі змешваюцца з гукамі вадзяных кропляў, і мне пачынае здавацца, што я чую глыбінную песню зямлі, начную песню жыцця. Гэта ж толькі падумаць! Я магла пражыць усе гады, якія прадпакаваў мне лёс і якія я не ведаю, як пройдуць, пражыць іх і не ўведаць, не пачуць, як тукае па шпалах дождж, як шапаціць ён у змакрэлым лісці і ў чорным галлі бяроз, як ціўкаюць каменьчыкі па рэйках і як таямніча звіняць тыя ў начной цямноце...

Раніцою прачнулася позна — ложак, дзе спала Люда, пусты. Прачнулася ад гарачыні і непрыемнай парнай духаты і адразу, толькі дакранулася рукамі да сцяны, даўмелася: ад сонца гэта. Сцяна танюткая, у адну дошчачку, і цёплая, нават тварам адчуваеш гэта. Перад маімі вачамі выялізны газетны фотаздымак зорнага неба і ракеты; фотаздымак разарваны напалам і гэтак і прыклеены, і ў ракеты адарваны стабілізатар, і ён ляціць нібыта самастойна.

Ля ложка тупае шчанюк, зусім не падобны на ўчарашняга. Ціха паклікала яго, і ён тут жа ўскочыў на ложак, пульхненькі, з чорнымі бліскучымі вочкамі-гузікамі; хацеў пералезці беражком да падушкі, не ўтрымаўся, шмякнуўся на падлогу, пакрыўджана цяўкнуў.

І тут жа зварухнулася шырма, і ў шчылінку зазірнуў

жаночы твар, і я адразу пазнаю яго. Ганна! Дык што ж гэта? Хворая раней доктара ўзнялася!

— Ён вас пабудзіў, шчанюк гэты,— гаворыць Ганна і накіроўвае шырму.— Апу, марш адсюль! Воўк, на месца!..

— Ай, не чапайце вы яго. Я сама прачнулася і бачу, што праспала ўсё на свеце!.. А чаго вы ўзняліся? Вам трэба паляжаць!

— Ой, доктар! Скажу — не паверыце. Быццам і не балела нічога ўчора. Як адвяло ўсю хворасць за ноч!..

— Не, не! Абавязкова паляжаць трэба. Зараз я ўзнімуся і пагляджу вас. Вы дзе працуеце? Я вас учора і не папытала...

— Укладчыца. На ўчастку. Тут усе па ўчастку працуюць. Іншай работы тут і няма...

— Атрымаеце бюлетэнь. І накіраванне вам дам у бальніцу, у раён трэба будзе пад'ехаць і зрабіць адпаведныя аналізы. Няхай вас уролаг паглядзіць. Вы асцярожна з гэтай хваробаю...

Адчуванне Ганны добрае, і агляд, які я раблю крыху пазней, мяне супакойвае і абнадзейвае: небяспека, здаецца, прайшла. Я прыгадваю ўчарашнюю размову з Юткевічам, пытаюся ў Ганны, ці прыйшла дзяўчынка, і яна гаворыць, што малая Юткевічаў чакае мяне, што гэта Алачка, што вучыцца яна разам з Людаю, але сёння не пайшла ў школу, бо дужа баліць вушка, а Люда даўно ў школе...

Алачка такая ж рослая дзяўчынка, як і Люда, але худзенькая дужа, з доўгімі і тонкімі рукамі. Чорныя вачаняты смела пазіраюць на мяне. На пытанне, што ў яе баліць, адказвае хутка, як па камандзе:

— У вухах.

— У цябе вушкі баляць, трэба так і казаць. А «ў вухах» — гэта няправільна. Ты ж у трэцім класе, амаль дарослая... Ну, будзем глядзець твае вушкі...

Без лобнага рэфлектара даследаваць вуха цяжка, і вонкавы агляд нічога не дае. Адно бачу: слухавы праход вонкавага вуха зусім шчыльна закрыты. Але што там — невядома. Магчыма, серны корак? Але чаму так блізка? А можа, гэта толькі знешняе праяўленне хваробы, а пачатак-яе там, углыбі?.. Акрамя вонкавага, ёсць яшчэ вуха сярэдняе, унутранае вуха, у якім, акрамя рэцэптара гукавых раздражняльнікаў, ёсць вестыбулярны рэцэптар, раздражняльнікам якога з'яўляюцца не гукавыя хістанні, а...

Не памятаю. А хваробы? Магчыма, аціт?.. Але сімптомы яго? Не памятаю... Ёсць, ведаю, тэорыя Барані. Але сутнасць яе?.. Ну, галубка, выдатна ж ты пачынаеш практыку вушніка! І яшчэ на палову стаўкі працуеш! І як ты адважылася, без спецыялізацыі? Ну, галубка, думай!..

Прыгадала гэтае насмешлівае «галубка» і адразу пасупакойнела, пачала мысліць і разважаць лагічна. Боль Алачка адчувае, калі я ледзь дакранаюся да яе вуха. Значыцца, хвароба не можа быць глыбока, значыцца, слыхавы праход чымсь закрыты. Гэтак і ёсць! Яшчэ імгненне, і я выцягваю з вушка дзяўчынкі семка сланечніка. Семка ўжо набухла, вострым канцом упіраецца ў сценку слыхавога прахода — адсюль і боль нават пры слабым дотыку.

— Ой, не баліць! — выгуквае Алачка.— Перастала!

— Ага, цяпер не баліць. А каб семка ў вушку прарасло? Там жа цэлы сланечнік мог вырасці!

— У вушку? Не-ее, ён без зямлі не вырасце. Ён толькі на зямлі расце! Я ведаю!

Алачка тоненька і радасна смяецца, і мне таксама весела, і я бачу, што болей ад усіх узрадавалася Ганна. Яна, мабыць, цяпер паверыла, што я не проста малады ўрач, а чараўніца, якая можа вылечыць любую хваробу.

Добра адчуваць гэта, хоць і ведаеш, што яно і не зусім так.

Але гэты радасны настрой са мною ўвесь час: і калі мы снедаем з Ганнаю, і калі Іван Супрун вядзе мяне паказаць торфаўчастак, я сама папрасілася на гэта, бо часу да сустрэчы з Бабічам вельмі шмат, і я ніколі не бачыла, як здабываюць торф,— і пазней, калі я бачу магутны экскаватар, на якім працуе памочнік Супруна, і калі стаю ля транспарцёра, па якім бясконцаю істужкаю паўзуць у вагоны прамавугольнікі торфу, рудаватыя, з бурштынавымі ніткамі карэння невядомых мне раслін.

Апоўдні я развітваюся з сям'ёй Супруна. І муж і жонка былі памкнуліся праводзіць мяне, але я адмовілася рашуча і пагадзілася толькі на тое, каб са мною пайшла Люда, яна на той час вярнулася са школьных заняткаў. Мы развітваемся з ёю на тым жа месцы, дзе і сустрэліся ўчора, на сцежцы, што вядзе ад вузкакалейкі на дарогу, дзе мяне павінен чакаць Бабіч.

Далей я іду адна, і мяне зусім не трывожыць, будзе чакаць на дарозе мяне машына ці не. Прыгажосць сённяшняга дня зачаравала. У высі — невымерны працяг блакітнай глыбіні, чыстай, сіне-белай па далягляду, за якім,

здаецца, пачынаецца неаглядная марская прастора. А вакол крыху прыгаслы пажар восеньскіх лясоў: празрыстая, бы падсвечаная знутры, сінеча яліц; густая, як бы набухлая ад дажджоў зеляніна бухматых соснаў; баязлівая трапятлівасць агняна-чырвоных асін; сухая, бы зацвярдзелая охра, спакойна-ўдумлівая мядзянасць бярэзнікаў; змярцвелая, нібыта атручаная, чарнізна вольхавага параснiку.

Я дыхала халаднаватым смаляна-пахкім паветрам, п'янкім і чыстым, і не магла надыхацца, хацела сказаць гэтай маленькай дзяўчынцы, якой учора ранкам і не ведала зусім, звычайнае пры расставанні «бывай» і не магла: пачуццё невядомае, пязнанае ніколі раней, трымала мяне, прымушала глядзець навокал моўчкі, моўчкі дзівіцца, моўчкі ўслаўляць усё тое, што бачылі мае вочы.

## 8

Цяпер я прыгадваю ўсё гэта спакойна. Цяпер усё гэта — у мінулым: і заліхвацкая «Лявоніха», і неверагодна перакручаная мелодыя народнай песні «Касіў Ясь канюшыну...», і сцежка ў лесе, і кароткі, як нечалавечы, крык Бабіча...

Не ведаю, чаму я пагадзілася танцаваць з ім. Не ведаю, чаму пазней, калі ён прапанаваў праводзіць мяне з клуба, я з той жа лёгкасцю пагадзілася...

Не, хлушу! Я ўсё ведала! Я бачыла позіркі яго сяброў, позіркі, у якіх была зайздрасць, і бачыла драпежны пагляд яго зеленаватых вачэй, і адчувала, што і ён, і яго сябры, і ўсе яны разам выйшлі на паляванне і што ён, Бабіч,— галоўная асоба, а яго дружбакі — звычайныя ганчакі, і што я — дзічына, лёс якой ужо вызначаны.

Усё ва мне пратэставала супраць гэтага. Я не хацела быць дзічынаю і яшчэ больш не хацела праслыць баязлівкаю і добра ўсведамляла, які гэта дакладны псіхалагічны разлік: запрасіць пры ўсіх — не адмовіцца, не схочаш паказаць сябе баязліўкаю!

Ведала гэта, разумела. Але калі ён пры ўсіх прапанаваў праводзіць мяне, прапанаваў з выклікам, ведаючы, што я спужалася, разумеючы, што не прыняць яго прапановы і адмовіцца — значыцца паказаць, што спалохалася,— ва мне абудзілася злосць — не, не на сябе, а на сваю мяккасць, гэтую кароткую хвілінку баязлівасці — і

я загадала сабе: «Ты поїдзеш! Ты поїдзеш, і яны, гэтыя яго дружбакі, і ён сам, гэты хлопец з нахабнымі зеленаватымі вачамі, не будуць святкаваць перамогу!»

А ўголас, каб пачулі ўсе, я сказала бесклапотна і таксама з выклікам:

— А як поїдзем? Можа, лесам, наўкола азярка?

Ён не чакаў такой хуткай згоды, і яшчэ больш не чакаў менавіта гэтых слоў, заміргаў спачатку, потым зарагатаў, і я бачыла, як ён адкрыта, не тоячыся, падміргнуў сваім сябрам.

— Ведама, наўкола. Можа, і качку якую-небудзь упалюем.

— Качкі паляцелі ўжо, мне здаецца.

— Не-ее... Добры паляўнічы заўсёды дзічыну знойдзе!

— Знайшоўся мне паляўнічы! У цябе ж і стрэльбы няма! Ці, можа, ты будзеш тых качак на сала, як той барон Мюнхаўзен?

Ён зразумеў, што я насмяхаюся, і зазлаваў.

— Барон іх — на-панску. А мы — на-пралетарску: на костку! Ха-ха! Рушылі?..

І мы пайшлі.

Выходзілі з клуба, і я зірнула на гадзіннік: палова дзесятай. Але было не цёмна, свяціла поўня. Вялізная, матава-белая, як плафон дзённага святла, яна вісела ў вечаровай высі, яшчэ не вельмі высока, і ўсё вакол набыло адценне нерэальнасці. Але думкі мае былі гранічна рэальныя, і я ведала, разумела намер Бабіча, і таму, калі ён узяў мяне за плечы і паспрабаваў пацалаваць, я вельмі лёгка перахапіла яго рукі, адвяла іх на бакі і сказала словы, якія былі падрыхтаваны:

— Паслухай, Юрась! Я не качка. І ўвогуле аніякая табе не дзічына. Ты гэта помні!

Відаць, у гэтай маёй рашучасці было нешта такое, што прымусіла яго збянтэжыцца. Але толькі на нейкі міг, бо тут жа ён рагатнуў, схапіў мяне за плечы і тузануў да сябе з такою сілай, што я імгненна апынулася ў яго абдымках.

— А кажаш, што паляцелі качачкі,— рагатнуў ён зноў.— Качачкі цяпло любяць. А ў мяне сэрца — сонцу раўня!..

— Пусці, сонца! Глупства ты робіш. Вось пабачыш!..

— Цёмна ночка — не пабачыш! Цёмна ночка — не пабачыш. Толькі шчасцейка ўбачыш, не адпускай яго, трымай...

— Кінеш ты глупства? Не блазен жа ты які-небудзь... Каб ведала, ніколі б не пайшла...

Яго рукі хутка і лоўка расшпілілі мой плашч, і тады я схапіла мезенец яго левай рукі, сагнула і сціснула. Бабіч засычыў, але нічога не мог зрабіць са мною: нават самы нязначны рух яшчэ больш узмацняў боль, і я ведала, што гэты боль страшны.

— Зломіш! Зломіш жа,— злосна гыркнуў ён.

— Будзеш глупствам займацца? Будзеш ці не?

— Адчапіся!

— Будзеш?

— Ды не, адчапіся ты!

Я адпусціла яго, ён нешта ціха пабубніў, потым дастаў пачак цыгарэт, запалкі. Слабае полымя асвяціла яго злосны скрыўлены твар, і я зразумела, што верыць яго абяцанню нельга, і зноў была гатовая да любой нечаканасці.

З пізіны мы выбраліся на вышэйшае месца, і адразу тхнула цяплом, бы ўвайшлі ў ацеплены пакой, і моцна запахла жывіцаю, і ў глыбіні лесу, і блізка зусім ля сцежкі былі відаць на соснах рабрыстыя палоскі падсочкі. Ішлі моўчкі, і поўня была над намі, і сцежка пад шатамі соснаў здавалася цьмяная, бы зробленая з волава, а потым яна зрабілася зыркай і белай, быццам пасыпаў яе хтось снегам, і сосны парадзелі, і справа, у прагалах, нечакана адкрылася снегавая пізіна.

Я не адразу здагадалася, што гэта возера, якое зацягнута туманам, але, калі зразумела тое, дык была так уражана, што спынілася і прыхінулася спіною да сасны.

Перада мною чарнеў ядлоўцавы куст, з трыма вострымі, як свечкі, макавінамі, а за ім, хоць дакранайся рукою, увачавідкі гусцеў туман, узнімаўся вышэй, расплываўся, і змрочныя сосны, што былі ўнізе, амаль пад намі, здавалася, натанаюць, павольна правальваюцца некуды ў глыб гэтай белай аблогі; а далей, за той аблогаю, над цёмнай паласою лесу, таксама шырэлі, расплываліся белыя гурбы, і цяжка было зразумець: туман гэта альбо воблака, але яно яшчэ больш падкрэслівала рух белай аблогі ўнізе; мяне ахоплівала такое адчуванне, быццам я паволі-паволі ўзнімаюся, плыву ўгору, і яшчэ крышачку — і сосны будуць унізе, пада мною, а я павісну над імі і буду плысці, і святло поўні асвеціць і лес, і возера, і я ўбачу нешта незвычайна прыгожае і дзівоснае...

Бабіч знайшоў маю руку, і я не адвяла яе, і я ўжо,

так мне пачувалася, зусім прымірылася з ім, і не сердавала, і спахапілася, калі адчула боль: мезенец маёй правай рукі быў заціснуты ў яго жмені. І ў той жа міг я была ўжо на зямлі, і галава мая патанала ў шархоткіх халодных верасах, і Бабіч, расшпільваючы адной рукою плашч, прагна цалаваў мяне.

— Ты мяне за пальчык, дак і я ж цябе таксама... Ды не брыкайся ты, дурнічка. Я кахаю. Кахаю! І не думай чаго — ажанюся! Ажанюся потым — усё па закону будзе! Законна!

Бабіч наваліўся на мяне, і дужа цяжка было бараніцца: левую руку, якой я спрабавала адпіхнуць яго, ён прыціснуў лобам да зямлі. І ўсё ж я баранілася, змагалася і плакала ад болю, ад злосці на тое, што гэты рудаваты хлопец падмануў мяне, як дурнічку, плакала ад нянавісці і свае бездапаможнасці, і малілася, і прасілася, але на вуснах у мяне было зусім другое імя — Валера.

— Валерачка? — спытаў Бабіч.— А-аа... Валерачка быў, значыцца. Ну і чорт з ім. А я — Юрась. І маё слова — закон. Я не падману. Ажанюся. Бо кахаю. З таго дня, як на машыне ехалі, я закахаўся. У-ух, качачка ж ты мая. Ды што ты круцішся?..

Правая рука мая намацала ў верасах нешта халоднае і цвёрдае. Камень! Я крутнула рукою. Бабіч матнуў галавой, хацеў прыціснуць маю руку да зямлі, і я з усяе моцы бахнула яго каменем па галаве!

Кароткі, зусім як не чалавечы, крык!

Бабіч пакаціўся, стогнучы, і раптам змоўк — нерухома застыў на зямлі. Я ўскочыла і кінулася бегчы.

Колькі бегла — не ведаю. Спынілася, калі апынулася на лясной прасецы, доўгай і вузкай, як калідор. Злева і справа на мяне павольна насоўваўся белы, як над возерам, туман. Але тут ён быў рэдкі, і за ім, як за празрыстай тканкаю, акрэсліваліся няясныя абрысы, бы нейкія людзі падкрадаліся, каб схапіць мяне.

З нейкай зацятай самаахвярнасцю я пайшла ім насустрач, і цела калаціла дрыжыкі, непрыемныя, як ад сцюжы, і на губах была салёная горыч ад слёз. Я злізвала гэтую горыч, і ад яе быццам праясніваліся мае думкі, і сам туман сплываў ужо, адсоўваўся, і знікаў жах, і знікалі няясныя абрысы, і адкрывалася ўся прасека, чыстая і зыркая, нібыта волава на свежым зрэзе.

І халодная і цяжкая, як з волава, была думка: «Забіла! Ты ж чалавека забіла!»

Я закрычала ў роспачы і адчаі, я клікала Бабіча, і бегла назад, і рэха кацілася па лесе пераліўамі, гучна, доўга, і ў скронях звінела, і галава была як не свая ад тлуму, ад крыўды, ад злосці, і на губах была салёная-салёная горыч.

Бабіч ляжаў усё на тым жа месцы, у верасах, бы патанаў у іх, і я б не знайшла яго ніколі, каб не знаёмыя тры пірамідальныя, як свечкі, вяршаліны ядлоўцу. Бабіч быў нерухомы, але ён дыхаў. І я панеслася ўніз да возера, намачыла ў вадзе насоўку, і, калі даставала яе, знайшла ў кішэні капронавы башлык ад плашча, і набрала ў яго вады.

Мокрай насоўкаю я абцерла яму твар, дапамагла сесці, і ён сеў, прыхіліўся спіною да ядлоўцу, і ядловец згінаўся, і разам з ім згінаўся, вагаўся, бы вось-вось зваліцца на зямлю, Бабіч, і я паднесла да яго твару башлык, вада з якога выцякала мне на рукі, і Бабіч піў ваду, а потым адштурхнуў маю руку з башлыком і пачаў абмацваць галаву; у святле поўні я бачыла, як адразу счарнела яго далонь, якую ён разглядаў з увагаю.

— Кроў,— сказаў Бабіч.— Гэта ж каб крыху ніжэй, дык у скронь. І канцы Юрасю. Чым ты гэтак гваздганула? Мне здалося, што па вачах — зорка... Зорка ўзарвалася...

— З неба, мабыць, звалілася.

— А што ты думаеш? Мяне неба часта карала ўжо. І па выпадках самых розных... Трэба неяк абцерці кроў... Ты ж медык, паглядзі. Можа, мазгі ўжо выцякаюць...

— Не, не! Не чапай мокрай насоўкаю. Заражэнне можа быць.

— Пашкадавала, аднак. Чаго ж не пашкадавала, калі цаглінаю малаціла?

— Ніякая не цагліна. Камень...

— Ведама ж... Ад цагліны не так, думаеш, балела б?

— Гэта не я, ты ж сам кажаш. Неба. Сядзі ціха, я пагляджу галаву...

Рану ўбачыць было цяжка — цёмна ў лесе, святло поўні няяркае і няроўнае, і валасы зліпліся ад крыві. У кішэні жакеціка ў мяне была чыстая насовачка, і я наклала яе на рану і загадала трымаць яе рукою, і мы пайшлі. Я сказала, што поедзем у бальніцу і там я прамыю рану і зраблю добрую павязку.

Мы ішлі ўвесь час моўчкі, і калі лес скончыўся, і я ўбачыла наперадзе святло ў вокнах бальніцы, я адчула, што самае жахлівае ўжо засталося ззаду, што мне цяпер

няма чаго баяцца, і я нават паспрабавала пажартаваць з Бабічам.

Ён не адгукнуўся на мой жарт, толькі папрасіў, і голас яго быў вінаваты:

— Ты не кажы пра гэта нікому.

— Не разумею.

— Мяне хлопцы абсмяюць, жыцця не будзе. Разумееш?

— Дык яны ж галаву ўсё роўна ўбачаць!

— Скажу, што паваліўся.

— Няўдалае паляванне, адным словам. Тады па тваіх слядах пойдуць другія паляўнічыя...

— Ніхто не пойдзе!

— А гэта чаму ж?

— Я буду абараняць цябе. І ты на мяне разлічвай. Цябе ніхто не зачэпіць. Нават пальцам не кране...

І мне стала смешна ад гэтых слоў. Я прыкрыла рукою губы, баялася, што пачну ўголас рагатаць; не крыўдавала і не злавала больш. Я хацела быць абыякавай да Бабіча, намагалася ажывіць у душы няпавісць, каб неяк пакрыўдзіць яго, зняважыць, адпомсціць, але ўсе гэтыя спробы былі марныя, і ўсё ва мне сцішылася, супакоілася, з'явілася нават спагада. Але закрэсліла яе, разумеючы, што зрабіла ўсё правільна, здолела абараніць сябе, і нічога не збаялася, перамагла.

І яшчэ было адчуванне невымернай, я адчувала гэта яскрава, улады над Бабічам, і з таго нейкая як бы ганарыстасць расла і мацнела ў душы.

## 9

Снег. Снег. Снег...

У Мінску я такога не бачыла. Пасёлкам ідзеш, быццам на дахах крочыш: снег упоравень з апошнімі вянцамі хат. І бальніца наша як бы ўсё глыбей і глыбей правальваецца ў снег: мы ўсе амаль штодня ўранку працуем з рыдлёўкамі. Сцежкі ў снезе, як глыбокія, па самыя плечы, калідоры, казачныя, дзівосныя дарогі.

І сама я апошнім часам жыву нібыта ў казцы — чакаю дзіва... Але гэта не казачны, а зусім рэальны цуд — да мяне прыедзе Валера. Гэта ўжо, як гаворыцца, выраднана і ўзгоднена. Яго дысертацыю абмеркавалі і далі амаль два месяцы на дапрацоўку. Сядзець і працаваць там, на адзіноце? Не! Ён намысліў прыехаць сюды, і калі

раней я не ведала дакладна дзень, дык цяпер я ведаю дакладна і яго намер, і яго планы: прыехаць сюды, у гэты зацішны куток, і працаваць, працаваць, працаваць... І ён гэта зробіць, бо ён — разумнік, бо ён — малайчына, бо ён — геній! Ён тут напіша найцудоўнейшую дысертацыю!

І я чакаю!..

Раней, не ведаючы дакладна, у які дзень прыедзе Валера, я была намысліла расказаць і Зіначцы і Карабань... Але ў час спахапілася і цяпер нікому ні слоўца не сказала і не скажу. Я таю гэта ад усіх, каб нічога не змянілася. Недзе чула: пахвалішся — не спраўдзіцца. Глупства, вядома. Але я веру ў гэтыя забабоны, употай пасмейваюся, але маўчу. Маўчу і чакаю. І кожную хвіліну думаю пра Валеру. Я ніколі нават і не ўяўляла, што гэта так радасна і добра: думаць, чакаць, спадзявацца на блізкую сустрэчу...

Вось і цяпер, калі мы едзем у вазку да мантажнікаў, думкі мае — зноў пра Валеру. Шумейка гаворыць са мною, я нешта адказваю яму, але адказваю абыякава. І гаворка наша як адчэпнае што. Пад шырокімі палазамі рыпіць снег, на дузе, як званочак, мерна брэнькае жалезнае кольца. Дуга старая, фарба месцамі аблупілася, а кольца абыржавела і выбіла на бакавіне дугі роўны белы знак. І навошта гэтае кольца? Цяжка Шумейку адвінціць яго?

— Няма патрэбы яго адвінчваць,— спакойна і раўнадушна адказвае мне Шумейка; каўнер чорнага кажуха хавае твар фурмана, але я адчуваю, што Шумейка смяецца.— З ім весялей. Асабліва ноччу. Ціша навокал. А ён табе, як жывы, як песня: брынь, брынь, брынь... Нібыта і не адзін едзеш.

— Аднаму хіба блага?

Шумейка паварочваецца, націрае далонёю буйны, як спелая дуля, чырвоны нос, змахвае з вузенькай, падобнай на альховую трэсачку барады белы іней і толькі пасля гэтага скупавата кідае:

— Блага...

Ён змаўкае надоўга, яго вочы слязяцца ад марознага ветру, і мне здаецца, што ён плача. Жонка Шумейкі памерла. Летась ён пасватаўся да нашай Мацяш, але тая адмовіла, і адмовіла толькі па той прычыне, што Шумейка нейкі час быццам быў звязаны з нейкай баптысцкай сектаю, а Мацяш не любіла сектантаў і звае іх «праймзісветамі з вялікай дарогі».

Усё гэта расказала Зіначка, аднаго разу мы дзяжурылі з ёю разам ноччу. Яна ўвогуле здзівіла мяне скрупулёз-

ным веданнем падрабязнасцяў жыцця амаль усіх, хто працуе ў нашай бальніцы. Ад яе я пачула, напрыклад, што Гапнаў п'е з таго, што жонка не пагадзілася паехаць сюды, потым, праўда, прыязджала, паглядзела і ўцякла, а ён рабанне арганізаваў раман з Карабань, але тоіць гэта, і Кацяпер Карабань сур'ёзна пакахала яго, а Мацяш нядаўна закахалася ў камбайнера з Ветрына, які быў прысланы сюды ў час жніва на дапамогу мясцоваму калгасу, бо там, на Ветрыншчыне, глебы пясчаныя і збожжа ўбралі дужа рана, а ў таго камбайнера ёсць жонка і двое дзяцей, і ён нібыта паабяцаў, што будзе падаваць на развод і прыедзе сюды і ажэніцца, але вось ужо тры месяцы няма ад яго аніякай пагудкі.

— Блага,— паўтарае Шумейка і зноў маўчыць, і сядзіць нерухома, і на швах яго кажуха паблісквае іней, і ўся яго постаць нібыта высечана з каржакаватай і абрудзелай на сонцы тапол.

— Гэта правільна, блага, калі чалавек адзін...

Я пагаджаюся і кажу толькі на тое, каб не маўчаць, але ў мяне чамусьці недавер да Шумейкі, баязлівасць навват нейкая і разам з тым цікавасць: карціць распытаць яго, ці праўда гэта, што ён звязаны з нейкай баптысцкай сектаю, а калі праўда, дык чым займаецца тая секта і, у прыватнасці, ён асабіста.

І раптам Шумейка з нечаканай ахвотаю падтрымлівае гаворку, заварушнуўся, адразу цікавасць у голасе:

— Правільна не тое, што чалавек адзін. А тое, што калі чалавек адзін, ён пусты чалавек. Чалавек павінен быць з вераю. А калі няма ў ім веры, ён ва грахах заблытаецца і загіне ва грахах...

— Гэта ўжо нейкае сектанцтва!

— Ці такую ці іншую назву дасі, што зменіцца? Калі секта чалавека добраму навучае: не пі зелле згубнае, не куры, не паганъ вусны свае словамі благімі... Хто супраць пойдзе?

— Але ж баптысты, скажам, не пускаюць дзяцей сваіх у кіно, кажуць, што кніжкі — зло, погань, не вераць у медыцыну. У нас свабода веры, калі ласка. Але ж чаго ты, скажам, другіх падбіваеш на тое, дзецям душы калечыш?..

— Я аніводнай душы не скалечыў. Я сам па сабе!

— Вы даруйце, я ж вас і не мела на ўвазе. Я проста так, абстрактную гутарку вяду...

Шумейка імпэтна тузануў лейцы, працяглым покрыкам падагнаў каня:

— Нно-оо! Н-но-аа!

І зноў адварочваецца, раўнадушна маўчыць, нібыта ні пра што ў яго не запытвалася, ніякай гаворкі ў нас не было.

Гэтак, у маўчанні, мы даязджаем да невялікай лясной паляны. Але яна пустая: перасоўных дамкоў мантажнікаў няма. З паляны, аднак, вядзе шырокая дарога, снег на ёй спрасаваны рабрыстымі прамавугольнічкамі ад трактарных гусеніц, і паабапал іх шырокія каляіны — сляды ад бярвенняў-палазоў, на якіх дамкі перацягнулі на новае месца.

Мы едзем па гэтаму следу і неўзабаве выязджаем да лясной балацінкі, на ўскрайку якой, пад соснамі, стаяць два домікі мантажнікаў, сіні і жоўты, і з вузкіх жалезных комінаў сінявымі скруткамі паўзе дым.

Я ведаю, што Валяк жыве ў жоўтым дамку, і мы спыняемся ля яго, і ў той жа момант адчыняюцца дзверы, і на снег выскоквае Рая Чмель, у сіняй нейлонавай куртачцы, зусім незашпіленай, і сінім пуховым шаліку, які пакрывае галаву і завязаны ля шыі, як гальштук; у руках чырвонае пластмасавае вядзерца. Раю я добра ведаю: у кастрычніку яна ляжала ў нашай бальніцы болей за тыдзень, ступіла ў гумовых ботах на ржавы цвік у дошцы.

Убачыўшы мяне, Рая ўзрадавана войкнула:

— Ой-ой! Гэта ж я з пустым вас стрэла!

— Тры разы па вядзерцу стукні, будзе лічыцца поўным,— сказала я. Цюкнула ж такое ў голаў!

— Ой, не чула такую завядзёнку! Раз!.. Два!.. Тры! — Яна і сапраўды тройчы стукнула па донцу рукою ў зялёнай рукавічцы.— Будзем лічыць, што з поўным стрэла. А Генадзь ужо здаровы! Уваходзьце! Я мігам буду таксама!..

У дамку душна — комін жалезнай печачкі накалены да чырвані. Валяк ляжыць на ложку, але апрануты, толькі коўдру накінуў на ногі, і на гэтай коўдры сядзіць дужа знаёмы хлопец, а побач з ім, спіною да мяне, хтосьці мые посуд у сіняй пластмасавай місе. Мая ўвага прыкавана да гэтага хлопца, што сядзіць на ложку ля Генадзя. У яго белыя кучаравыя, нібыта пасля завіўкі, валасы, вочы цёмна-вішнёвыя, з разумнай і зычлівай хітрынкаю.

— Ваш былы пацыент, таварыш доктар,— гаворыць ён, прыкмеціўшы мой уважны пагляд, і я тут жа ўсё прыгадала. Гэта ж Алесь Лукаш! Неяк ноччу ён прыйшоў у бальніцу з глыбокай нажавой ранаю вышэй локця, я не

магла памыліцца, рана была ад нажа, але ён не прызнаўся і цвердзіў адно і тое ж: выпадкова, маўляў, паваліўся ў лесе. Потым я даведалася ад Зіначкі, Алесь спрабаваў утаймаваць хлопцаў, што былі на падпітку, але якія гэта былі хлопцы і якая прычына была бойкі, яна мне не прызналася. Я зашыла яму тады рану, хацела пакласці яго ў бальніцу да раніцы, але ён не застаўся, пакрыўдзіўся нават, потым прыходзіў на перавязку, але перавязку мне давялося рабіць толькі аднойчы, усе разы ім займалася Зіначка.

— Юрась! Крэсла доктару! Мігам! — загадвае Лукаш і бярэ з маіх рук паліто.

Хлопец, які мые посуд, паварочваецца.

Бабіч! Гэта ж Юрась Бабіч!

Ён збянтэжаны, і талерка валіцца ў яго з рук на падлогу і разлятаецца на дробныя кавалкі.

Лукаш рагоча:

— Не адхіляйся ад аспоўнага, Юрась. Не адцягвай увагі ад асноўнага! Дарэчы, доктар, вы ведаеце гэты бліскучы анекдоцік? Памірае цешча, побач сядзіць зяць. Цішыня, чуваць, як ляціць муха, і цешча сочыць за ёю. А зяць ласкава патрабуе: не адцягвайце ўвагу, мамаша, ад галоўнага. Го-го-го!

І сам першы смяецца, смех яго прыгожы, раскацісты і шчыры. Цяжка ўтрымацца, і мне смешна глядзець, як Бабіч, сагнуўшыся, збірае чарапкі, як ён адводзіць позірк убок і не хоча глядзець на мяне. Я ўпершыню пасля тае начной «прагулкі» па лесе бачу Бабіча, і мяне дзівіць, як моцна ён змяніўся за гэты час: у рухах, у позірку знікла фанабэрыя, з'явілася самавітая сталасць. Памкнулася дапамагчы яму, а Лукаш затрымаў мяне:

— Юрасю — пакаранне. Ён у заклад ішоў са мною і, як бачыце, прайграў. Увесь тыдзень будзе мыць посуд. Увогуле, як я думаю, лячыць чалавека трэба. Пазаўчора мой юбілей быў — ад чаркі адмовіўся. У клуб даўно не ходзіць, а які танцор быў! Цяпер вось талеркі гваздачыць. Дайце вы яму якія-небудзь таблеткі. Або ў стацыянар кладзіце...

Весела і добра мне ў гэтым жоўтым дамку. Валяк амаль направіўся, хрыпаў зусім не чуваць у бронхах, і я кажу, што яму трэба рабіць далей, і мы дамаўляемся, што на тым тыдні ён прыедзе да нас у бальніцу, каб закрыць бюлетэнь; я размаўляю і з Бабічам, і мне нават прыносіць задавальненне яго збянтэжанасць, і робіцца крыху шкада,

Лукаш пасміхаецца з яго бязлітасна, і ён змушаны цярпець усё гэта.

Уваходзіць Рая, вядро поўненька, і, вядома ж, цяжкае, але ніхто з хлопцаў не зварухнуўся, каб памагчы паставіць яго на ўслончык ля печачкі, і Лукаш зноў тлумачыць мне:

— Выхаванне фізічнай працаю — таксама на заклад ішла са мною. Не ведае, колькі дзён працуе лунаход, колькі цягнецца ноч на Месяцы. А спрачалася!..

І зноў рагоча, але я адчуваю па яго голасу, што тут не просты пройгрыш у спрэчцы, а нешта большае, і гэтае, большае, Лукаш ад мяне тоіць, і тоіць Рая; зняла з галавы пуховы шалік, кінула на спінку крэсла, села са мною побач.

— Яны ўсе дзівакі — не любяць да крынічкі бегаць. А я люблю. Як пайду, дык магу і гадзіну там быць. Мароз, сцюжа, снягі, а крынічка — жыве: вада бруіцца, бруіцца, бруіцца. Як жывая. І як у люстэрка можна глядзецца — такая чыстая...

Мне ўсё даспадобы ў гэтым маленькім дамку, і не хочацца развітвацца і выходзіць на сцюжу, але час ужо, і трэба развітвацца, і развітанне наша па-сяброўску шчырае і сардэчнае. Падалося, што нешта хацеў сказаць мне Бабіч, і мажліва, і сказаў бы, але пасароме́ўся хлопцаў, націснуў, як і ўсе, руку; яго вочы глядзелі на мяне спаважна, і ў іх было захапленне...

У бальніцы мяне чакае ліст ад Вольгі. Нешта зусім мне незразумелае робіцца з гэтай Вольгаю. Доўга ад яе не было аніякіх звестак, калі не лічыць кароткай запісачкі, што я атрымала на шосты дзень свайго жыцця ў Залессі. І вось, першая вестка ад яе, першы ліст пасля нашага расставання!

Вольга просіць прабачэння, што доўга гэтак маўчала, і просіць не крыўдаваць, калі і далей, у будучым, ад яе не будзе лістоў: няма лістоў — значыцца, усё ў парадку. І не толькі гэта мне незразумела.

Ліст поўны нейкай таямнічасці, загадкавых недагаворак, і побач з тым — пахвальба. Уладкавалася, маўляў, добра, кватэру далі прыстойную. Бальніца новая, летась толькі пабудавана, абсталявана па-сучаснаму. Галоўны ўрач бальніцы вельмі цікавы чалавек, масквіч, светлая галава, грандыёзны розум і шчырае добрае сэрца. Але гарадок, маленечкі гарадок, ёй не па душы, і, галоўным чынам, таму, што ў крамах няма сыру. «Расійскі» сыр быў у кра-

ме толькі аднойчы, але няякасны. Праўда, універмаг добры, і бывае шмат цікавых «анучак», і мэбля імпартная ёсць. Але яна не хоча абзаводзіцца гаспадаркаю, бо хутка, мабыць, адбудуцца ў яе ўласным жыцці вялікія змены, і ўсё пойдзе на лепшае. Але перад гэтым — мора перваў і валтузні, бо ёй трэба, урэшце, давесці да ладу свае адносіны са Сцяпанам, які, як цяпер ёй стала зусім відавочна, ёсць «прыстасаванец у трынаццатай ступені», а з гэтым яна мірыцца не будзе. Яна папярэджвае і мяне, каб неяк уладжвала свае адносіны з Валерам — што яе трывожыць! — і трымала яго далей ад Сцяпана, далей увогуле ад людзей, якія здольны прыстасоўвацца і маскавацца ў любых умовах. І трэба памятаць, што галоўнае ў нашым жыцці — каханне, высокія ўзлёты чалавечага духу, калі чалавек адкідае будзённасць, узнімаецца да творчага парывання, у якім ёсць прызначэнне чалавека. У яе душы, маўляў, зараз змагаюцца два пачуцці — пакрыўджаны гонар і захапленне, шчасце і радасць з таго, што яна кахала, кахае і будзе кахаць...

Каго яна кахала і будзе кахаць?

Не магу даўмецца з гэтага блытанага і бязладнага і сумятлівага ліста. Зразумець з яго пешта пэўнае дужа цяжка. Вольга ёсць Вольга! Яе не пераробіш і не прымусіш адмовіцца ад схільнасці да маралізавання, не пераробіш яе здольнасць з самай нязначнай дробязі рабіць ледзьве не сусветнага значэння праблему, не адвучыш павучаць і раіць.

А каб жа яна ведала, што Валера збіраецца прыехаць сюды?

Напэўна, быў бы цэлы трактат парад і павучанняў. А са Сцяпанам у яе, відаць, жыццё не ладзіцца. А некалі ж малілася на яго! І яшчэ цяпер гэты галоўны ўрач, пра якога яна так заўзята піша, быццам імкнецца перада мною апраўдацца.

Згасла святло. Я прылегла на ложак, і адразу ж саплівасць агарнула, і ўжо зусім нерэальнае і казачнае жыццё было вакол мяне. Зімовы лес, і мы з Валерам гонім на лыжах, і Валера са стрэльбаю і ўвесь час аддаляецца ад мяне і потым знікае, і я наўмысна не хачу ісці па яго следзе і іду сваёй дарогаю цераз рэдкі і тонкі бярэзнік, і нечакана бачу, што на мяне імчыць аграмадны руды воўк. Воўк ужо блізка, зусім блізка, і я намагаюся паклікаць Валеру, і ён спяшаецца да мяне, але ён імчыць не па снезе, а ў паветры, і лыжы яго рухаюцца павольна, бы ў за-

маруджаных кінакадрах, а воўк усё бліжэй, і я патрабую, крычу, каб Валера страляў, і ён узнімае стрэльбу і адразу з абодвух ствалоў вылятае бязгучнае чырвонае полымя, вылятае і не знікае, а, неяк дзіўна павярнуўшыся ад воўка, упіраецца ў мяне чырвонай вялікай свечкаю, і мне робіцца горача і цяжка дыхаць, і я ўвесь час адчуваю ўсім целам гэты пругкі і цвёрды камяк гарачай чырвані, і чую знаёмы-знаёмы голас, які кліча мяне, але добра разумею, што гэта не Валераў голас, і мне цяжка адкрыць вочы, бо я баюся, што іх спаліць гэты бязгучны чырвоны агонь.

З цяжкасцю, урэшце, адкрываю вочы.

Габінаў!

Ён схіліўся нада мною, і я добра бачу вочы, дужа бліскучыя, спалоханыя, і ніяк не магу даўмецца, рэальнасць гэта ці ўсё той жа сон.

— Я пастукаў — ніхто не адказаў,— гаворыць Габінаў і пераастаўляе настольную лямпу бліжэй да падваконня.— Але я чуў голас — вы крычалі. Відаць, нешта прыснілася. А я быў падумаў, што нешта прыключылася тут у вас... Дык што саснілася?

— Нават цяжка растлумачыць. Мне здаецца, што вы таксама адтуль, з нерэальнага...

Ён бесцырымонна садзіцца на крэсла ля стала, з даверлівай натуральнасцю пасміхаецца:

— Я не магу прысніцца. І мне ніхто і ніколі не сніцца. Я занадта рэальны і, шчыра кажучы, люблю малдаўскі каньяк і, наўпярок сцвярджэнням розных знаўцаў, лічу, што гэта найвышэйшая марка. І вернае разбурэнне ілюзій. Тры зоркі на этыкетцы — гэта рэальнасць, якая даецца нам у нашых адчуваннях. І яшчэ з свайго ўласнага вопыту: таго, хто прымае гэтую рэальнасць — ну, вядома, у дапушчальных рамках! — ніколі не наведваюць розныя благія сны, міраж, ілюзіі...

— Затое часта наведваюць хваробы. Каліты, у прыватнасці.

— Э, усіх хвароб баяцца! Ад сваіх хворасцяў нікуды не ўцячэш. Дарэчы, вы не пакрыўдзіліся на мяне за гэты позні візіт? Чакайце, сказаць лепей, мабыць, запозненый... Так, семантычная фактура тут багацейшая. Бачыце, я ўжо амаль наблізіўся да класікі. «Дарагая графіня! Вашы вочкі...» Памятаеце, адкуль?.. Вось, вось. Усё ідзе ад асветы! Як кажуць біблейцы? Ва ўсялякай мудрасці ёсць шмат скрухі, і той, хто памнажае веды, той памнажае жальбу... Жарт, які наводзіць мяне заўсёды на роздум.

Але не люблю цытаты — лепей свая думка. Я заўсёды быў рабом сваёй думкі. І гэта — блага. Чалавек павінен заўсёды быць гаспадаром сваёй думкі. Ці не так?..

Я нагадзілася. Габінаў крыху на падпітку, я гэта бачу і разумею, і мне не хочацца спрачацца з ім, і яшчэ больш не хочацца, каб ён пайшоў: я люблю слухаць яго развагаў, у якіх ён звычайна гранічна шчыры, гаворыць тое, што думае, ніколькі не клапоцячыся пра тое, як гэта будзе ўспрынята яго субяседнікам; цвярозы, ён хмуры, негаваркі, злосны нават.

Але сёння Габінаў нейкі незвычайны, ён з увагаю, якая бянтэжыць, углядаецца, бы штосьці шукае на маім твары, і я заўважаю, што ён зусім, ну зусім жа цвярозы; вочы яго знаёма пабліскваюць, але бляск гэты нейкі іншы, трывожна зацяты бляск, і бровы ўпарта схмураны.

— Вы чыталі «Старик и море»? Памятаеце, якім сказам заканчваецца аповесць? Бліскучая аповесць.

— Не прыгадваю. Але чытала.

— Ну як жа! Хвалі гайдаюць ля берага шкілет — рыбу зжэрлі акулы. Стары тэпае ў сваю халупу, кладзецца спаць, і далей ідзе кароткі і дзівосны сказ. Прыгадалі?

— На жаль...

— «Старику снились львы...» Вось чым заканчваецца аповесць! Бліскуча заканчваецца! — ён вымаўляе сказ нараспеў і з трывожным узрушэннем у вачах глядзіць на мяне.— Разумееце? Ільвы! І яны, дарэчы, сняцца яму тройчы — дзівосная дэталь сапраўднага мастацтва! Яна трымае на сабе асноўную ідэю! Стары, стомлены ў моры, прыдрамаў — сасніліся львы. Маладыя. Потым ён змогся зусім, рыба выматала яго, акулы зжэрлі здабычу, якую ён заваяваў у сумленным змаганні, стары спіць і зноў перад ім мроіва далёкіх успамінаў: ён у Афрыцы, і ён дужы, крэпкі мужчына — сняцца львы. І ў трэці раз — у халупе. Але гэта ўжо старыя львы, і яны яму сасніліся. Вось як! — Габінаў дастае пачак папярос, паказвае мне, просячы дазвол закурыць, але не закурвае, пакручвае пачак у пальцах.— Старому сасніліся львы. Толькі сасніліся. Яны — мроіва. А ў сапраўднасці — стары. Але яго ніхто не перамог, бо ён асілак, ён чалавек, і ён мацнейшы за ўсіх ільвоў. Так. Ён мацнейшы таму, што яны — мроіва, ілюзія, а ён — рэальнасць, сапраўднасць, жыццё!

У Габінава летуценна і ўзнёсла свяціліся вочы, і я не ўтрымалася, пажартавала, надаўшы свайму жарту адценне зусім сур'ёзнага пытання.

— Вы, мабыць, пісалі вершы. А можа, і пішаце?

— У маладосці пісаў, гэта правільна,— ахвотна пагадзіўся ён, і на яго губах з'явілася і тут жа знікла пагардлівая і горкая грымаса, якая сказіла і зрабіла дужа непрывETным і злосным яго твар; але патрымалася нядоўга, і тут жа знікла, і перада мною сядзеў той, ранейшы, Габінаў, якога я магла слухаць бясконца.— Пасылаў спачатку ў адну рэдакцыю, потым у другую. Нейкі дурны лёс: двойчы, з розных газет, мне адказваў адзін і той жа кансультант — Студзянкоў. Зімовае прозвішча, праўда? Памятаю, ён раіў мне чытаць паболей Маякоўскага. Але я люблю Цютчава. Памятаеце гэта? «Не рассуждай, не хлопочи!.. Безумство ищет, глупость судит; дневные раны сном лечи, а завтра быть чему, то будет!..»

Я сказала:

— Гэта выдатны паэт. І верш выдатны. Але філасофія яго: «день пережит — и слава богу» — мяне не задавальняе. Яна не па мне, гэтая філасофія.

— Мала, як мала мы ведаем тых, хто побач з намі. І здзіўляемся потым, калі раптам нешта адкрываем у блізкім нам чалавеку. Даруйце, але я ўсё ж запытаюся: а якая філасофія вам па душы?

— Вера ў заўтра. Я чакаю гэтае заўтра, ім жыву, на яго спадзяюся. «Пусть час не пробил. Жди, не уставая. Пусть лгут лжецы — не снисходи до них...»

— Кіплінг славуты. Але ў яго ёсць і такое, за што паэта не паважаюць... Скажыце, няўжо я падобны на хлуса?

— Вам я веру. Як у сваё заўтра, Хведар Іванавіч!

— Вы — Юлька! Ёй-ёй... Такая ж сляпая вернасць ідэі заўтрашняга дня, але без ведання сваіх уласных магчымасцяў. А калі гэта магчымасці не бяруцца пад увагу? Горкія расчараванні — рэальны дзень часцей за ўсё больш змрочны і цяжкі, чым надзеі ў вясёлкавым святле жаданняў. І гэтыя расчараванні ў душы, іх часцей за ўсё сорамна паказаць нават сябру, ад іх нікуды не схавацца...

— Якая Юлька?

— Хіба вы не чыталі «Истоки»? Яна адтуль, з гэтага бліскучага, на мой погляд, рамана. Цудоўная натура, суцэльнае буянства. Часам нават не асэнсаванае, проста так, ад шырыні душы.

— Прачытаю абавязкова. Але і зараз я магу вам запярэчыць. Я — за асэнсаванае буянства. Няхай нават бунтарства, але ў імя высокае мэты. Упартасць, але дзеля таго,

каб людзям было добра. Такое буянства я разумею. І гэта — мужнасць. А мужнасць павінна спадарожнічаць усяму, што робіць чалавек.

— Нават каханню?

— Каханне — гэта таксама мужнасць.

— Арыгінальная формула.

— Усё залежыць ад таго, з якога боку яе разглядаць.

— Арыгінальная форма,— паўтарыў ён і змоўк.

Габінаў сядзеў сагнуўшыся і не глядзеў на мяне, і я бачыла яго профіль, чоткі, амаль класічны, каб не крыху адвіслы падбародак.

— У вас была сёння на прыёме Данілюк,— нечакана, без усялякай сувязі з папярэдняю гаворкаю не то спытаў, не то проста заўважыў ён.— Такая худзенькая, прыгорбленая, як стогадовая бабулька...

— З дачкою? Прыходзіла. У Лідзіі — гэта дачка яе — правае плячо апухла. Улетку, кажа, паваліліся. Здаецца, нічога сур'ёзнага. Але патрэбен рэнтген абавязкова. Дала ёй накіраванне ў раён.

— Дарэмна. Я не паспеў вас папярэдзіць. У яе саркома.

— Як? Не можа быць!

— І ёсць у іх ажно чатыры рэнтгенаўскія здымкі. Але старая Данілюк ім не верыць. На ампутацыю рукі — мы прапаноўвалі гэта — не пагадзілася. Да вас, як да новага ўрача, яна і прывяла яе — усё яшчэ не губляе надзеі... Між іншым, павінен вам сказаць, што ў вас складваецца бліскучая рэпутацыя сярод хворых.

— Можа, гэта якая другая Данілюк?

— Я глядзеў рэгістрацыйную картку. Гэта яна...

Мы гаворым яшчэ і пра Данілюк, і Габінаў расказвае мне пра нейкую новую кнігу, якую ён нядаўна прачытаў і абяцае прынесці яе, і я адказваю яму, але тое, што я кажу, нібыта зусім і не мае словы, і ў душы ў мяне трывога, адчай і разгубленасць.

Як я магла памыліцца?

Недаравальна!

Дык вось чаму так паглядала на мяне старая жанчына, і чаму такія журботныя і празрыстыя, быццам незямныя, былі вочы ў Лідзіі! І я супакойвала яе, казала ім абедзвюм звычайныя словы спачування, абнадзейвала, жартавала, і яны пайшлі ад мяне зусім не такія, якія былі на пачатку нашай гаворкі! Яны мне паверылі! Я — новы ўрач, і яны мне паверылі! Яны ўбачылі надзею, і гэтую надзею дала ім я.

Габінаў разумеў, што робіцца са мною, развітаўся і пайшоў. Я хацела гэтага, але як толькі засталася адна, адчула невыносную тугу, падхапілася, пабегла ўслед за ім.

Навошта? Не ведаю.

Я не сумнявалася ў яго словах пра Данілюк: не дзеля таго, каб пазларадпічаць, сказаў ён мне праўду, ён шчыры і сумленны чалавек. Дык навошта ж я буду бегчы за ім? Каб яшчэ раз пачуць усё тыя ж словы?

Звонкая марозная цішыня. Рыпіць снег пад нагамі. Паўсотні крокаў да паваротні і зноў назад да ганка па вузкім калідоры, які зроблены ў снегавых гурбах. Бальнічныя вокны я не бачу, яны там, за снегавой сцяною, і святло ад іх, як зарыва далёкіх пажараў. Не, болей падобна на ранішні далягляд, дзе вось-вось павінна ўзыходзіць сонца. Аднойчы я бачыла такі далягляд з Валерам...

Непамыснасць ад гэтай думкі. Непрыстойна, нядобра думаць у такі час пра нейкі там далягляд, пра сваё асабістае! Я памылілася, паставіла не той дыягназ. Мая памылка нічога не можа змяніць: ні я, ні Габінаў, ні хто-небудзь іншы не ўладарны над той страшэннай хваробай. Разумею гэта, і разумею, што я таксама не ўладарная над сваімі думкамі, і доўга не змагу даравацъ сабе сваю памылку...

## 10

Прыехала на станцыю сустракаць Вольгу. Цягнік будзе праз паўгадзіны і спыніцца толькі на тры мінуты!

На пероне ветрана, шчокі ўвесь час трэба націраць рукамі — мерзнуць. А нагам — раскоша. На мінулым тыдні я купіла сабе валёнкі, чорныя, зграбненькія, дужа цёплыя валёначкі. У мяне былі раней зімовыя боты, французскія, модныя, з жоўтымі спражкамі на высокіх халявах, але нават і дзве пары шкарпэтак не ўратоўвалі — мерзнуць ногі страшэнна. А цяпер адны, летнія, а ў валёнках нагам і цёпла, і мякка, і снег парыпвае прыемна і мілагучна.

Але гэтае прыгожае рыпенне снегу не радуе — на душы нешта зусім незразумелае. Я хачу бачыць Вольгу, і разам з тым да яе ў мяне абыякавасць, і за гэтай абыякавасцю хаваецца глухая неўсвядомленая крыўда. Я чакала Валеру. Яго хацела страчаць, ад яго чакала тэлеграмы, і ўжо ў думках усё распланавала, як паеду на станцыю, як буду з нецярпеннем пазіраць на гадзіннік, як будзем разам варочацца са станцыі.

А тэлеграма прыйшла ад Вольгі.

Мне адразу ж тады падумалася, што гэтая, ае, тэлеграма запыніла тую, Валераву, нечым перашкодзіла ёй. Глупства, вядома, але я і зараз не магу сябе пераканаць, не магу прымусіць сябе не думаць пра тое, што тэлеграма ад Вольгі аніяк не звязана, не можа быць звязаная з тэлеграмай Валеры.

Тэлеграму я атрымала апоўдні, а ранкам Твораж запрасіла мяне на свой дзень нараджэння — у іх з мужам адзін і той жа дзень — і напрасіла абавязкова прыйсці, і я наабяцала, а потым адпрошвалася, калі атрымала тэлеграму, каб паехаць на станцыю, і абяцала, што прывязу Вольгу, сваю сяброўку, і была дужа ўдзячна, што Твораж запрасіла мяне на сваё сямейнае свята і што дазволіла паехаць на станцыю ў рабочы час. Тэлеграма зараз пры мне, і варта апусціць руку ў кішэню, і я адчуваю хрусткую ад марозу паперу, і да сэрца падступае туга, невядомая, незразумелая туга.

«Буду праездам восьмага. Даўгаўпілса. Вагон пяць. Сустрэнь абавязкова. Вольга».

Гэта напісана ў тэлеграме. Ці спыніцца Вольга ў мяне, нягледзячы на гэтае «праездам», я не ведаю. Мне яшчэ і пашчасціла. Усе аўтобусы, што ідуць у наш бок, пайшлі ўжо, але я ўбачыла знаёмага шафёра з нашага калгаса, Ягора Апохіна, які пагадзіўся пачакаць мяне, пакуль я не стрэну цягнік.

У кастрычніку ў нас ляжала ў бальніцы — двухбаковае запаленне лёгкіх — яго жонка, загадчыца калгаснай бібліятэкі. Яна жанчына моцная, высокая, але Ягора, які на галаву ніжэй яе, пабойваецца. Магчыма, нават і не тое слова я тут ужываю: паважае яна яго. Ён штодня прыходзіў да яе ў бальніцу, прыносіў свежыя газеты — «Праўду» і «Медицинскую газету». Першую яна проста праглядала, а другую чытала з увагаю, падкрэслівала алоўкам тое, што лічыла важным і ёй патрэбным, і так налаўчылася ў медыцынскай справе, што сама ставіла дыягназы кожнаму, хто быў побач з ёю, аспрэчвала парады ўрачоў, і хворыя ўпотай скардзіліся мне.

Чым меней заставалася часу да прыходу цягніка, тым усё больш і больш радаснай робіцца мне, чэзне, адступае туга. Убачу Вольгу! Гэта ж здорава! Раней, быў час, здавалася, што і тыдня не пражыву, калі не пабачу яе. А вось ужо колькі месяцаў мы не бачыліся, і нічога, жыву, нават спрабую абвінавачваць яе ў тым, што яна сваёй тэлегра-

маю нібыта разбурыла мае ўласныя планы, нечым пашкодзіла ім. Глупства! Трэба радавацца, бо мы зноў убачымся. І пагамонім аб усім! Не, далей ёй я проста не дазволю ехаць. Сцягну з цягніка!

На перон выходзіць Анохін, паведамляе мне, што быў у дзяжурнага па станцыі і даведаўся: цягнік з суседняй станцыі выйшаў са значным апярэджаннем. На дзесяць мінут раней раскладу яны будуць яго страчаць.

— А ў мяне як прадчуванне якое было: трэба, думаю, раней прыехаць на станцыю,— кажу я Анохіну.— А каб па раскладу, дык магла б і не стрэць сяброўку... Смешна, я ўжо веру ў нейкія там прадчуванні!

— Зусім і не смешна! Прадчуванне ў чалавека ёсць!

Ён гаворыць гэта дужа даверліва, быццам мы нямала перагаварылі пра вялікія і малыя таямніцы, а цяпер вось зноў сышліся і гамонім, і кожны з поўным даверам і павагаю ставіцца да кожнага слова ў гаворцы: гаворыць з такой упэўненасцю, з такой глыбокай вераю, што мне цяжка пярэчыць яму. Аднак, сама не разумеючы, як гэта атрымліваецца, я процiў волі пярэчу яму:

— І вы верыце ў гэта? Супадзенне. Звычайная выпадковасць.

— Мажліва, мажліва,— сказаў ён і хрыпата закашляўся.— Але як тлумачыць тое, што здарылася ў сорак чацвёртым?.. Я ляжаў у шпіталі пад Краснаярскам. А Пятрусь, старэйшы мой, ваяваў пад Віцебскам — на знішчальніку лятаў. Прыдрамаў я, памятаю, па абедзе і прахапіўся, нібыта стрэлілі. У самае сэрца стрэлілі. Ускочыў з ложка — адзін у палаце. А ў вушах — сынаў голас, Петруся майго голас: «Канец, бацька! Гарыць машына...» Не паверыў, не паверыў, што загінуў. А перад тым днём не спаў ноч — балела, балела сэрца... Кха-кха...

Ён зноў хрыпата закашляўся, і воблака белай пары затуліла твар, і нейкай дужа велізарнай і тоўстай здалася мне яго зімовая заячая шапка. Тое, што ён мне расказаў, уразіла, але я чамусьці ўявіла сабе Анохіна не там, у шпіталі, а тут, у палаце нашай бальніцы, як ён сядзіць на белым зэдліку ля жончынага ложка, трымае ў руках газету, але не чытае яе, а галава нахілена, і ў стомленых вачах спачуванне і трывога, і глыбокія горкія зморшчынкі, пачынаючыяся ад шчыльна сціснутых вуснаў, праразаюць шчокі, чыста паголеныя — я ніколі не бачыла, каб ён прыйшоў у бальніцу не пагаліўшыся. І я не ведала, не магла нават падумаць, што сын Анохіна загінуў на вайне.

Дзіўна, чаму нават Ягорава жонка, якая чытала «Медицинскую газету», як мне здавалася, больш дзеля пахвальбы, аніколі не наскардзілася, што сын яе загінуў? І чаму Анохін сам сёння наспавядаўся мне ў гэтай сваёй горкай страце? Ды як жа гэта, чаму? Гадавіна! Сёння ж гадавіна! Сёння ж якраз той дзень, у які і загінуў іх сын!..

Дзве шырокія жоўтыя плямы ўзнікаюць у марозным сутонні; разлёгся далёкі яшчэ гудок паравоза.

— Вось і цягнік. Мы тут не затрымаемся, зараз жа і паедзем. Мяне ж сёння на дні нараджэння чакаюць...

Сказала і адчула няёмкасць ад таго, што нібыта знарок, сумысля хаваюся ад неабходнасці паспачуваць чалавеку ў яго даўняй і незабытай бядзе; зрабілася горка і крыўдна. Як жа я мала ведаю людзей, з якімі зводзіць мяне лёс!

— Тады я да машыны. Ці што давядзецца памагчы?

— Не, не!

Анохін пайшоў, і я таксама іду па пероне насустрач жоўтым плямам, што растуць, робяцца ўсё ярчэйшыя, і раптам разломваюцца на вузкія промні. Марозны белы цягнік. Вагоны пралятаюць, абдаючы калючым снегавым пылам. Няўжо ён і не спыніцца? Не, скрыгочуць тармазныя калодкі, бахкаюць буферы. Нумары вагонаў заляпаны снегам. Але лічба «5» чыстая, быццам толькі што абцертая.

Дзверы пятага вагона адчынены, і я бачу за спіною праваднічы твар Вольгі. Вясёлы і радасны, але нейкі дужа ж незнаёмы твар!

Цягнік яшчэ не зусім спыніўся, вагон паўзе наперад, але Вольга, адціснуўшы плячом праваднiцу, саскоквае на перон і павісае ў мяне на шыі. Яна прыемна пахне цяплом, добрымі духамі, а губы крыху салодкія, мабыць, ад цукерак. Як была, так і засталася: ласуха!

Вольга і слухаць не хоча, каб спыніцца ў мяне на дзень-другі, а потым паехаць далей. А мая рашучасць — давай, маўляў, чамадан і кропка — вельмі бянтэжыць яе. І я не разумею Вольгу, не разумею, што гэта да мяне звернуты ўпушальны самавіты бас, што ракоча за маёй спіною:

— Практически это невозможно, ну абсолютно же невозможно. Симпозиум начинается во вторник, а нам еще надо провести в Минске день. Никак не менее...

Модны карычневы кажушок з асляпляльна белым каўнерыкам, зімовая кепка з нерпы. І разумныя чорныя вочы, у якіх прыхавана насмешлівасць і якія ўзважваюць, ацэнь-

ваюць — і, як я гэта заўважаю, даволі высока ацэньваюць — мяне. Нават і не прыкмеціла, як апынуўся гэты мужчына за маёй спіною, але ён тут жа, як толькі я павярнулася да яго, становіцца побач з Вольгаю, папраўляе ёй аранжавы махеравы шалік.

— Ты разогрелась в вагоне, а здесь ветер. Боюсь, можешь простыть. Пригласи, пожалуйста, подругу в вагон. Кстати, я должен вам заметить, что именно такой вас и представлял. Оля мне столько о вас рассказала...

— Гэта мой муж,— гаворыць мне Вольга, але гаворыць з такім выразам па твары, што немагчыма зразумець, літаральна немагчыма, жартуе яна ці гаворыць праўду. І ён жа зусім немалады. Сівізна на скронях. І, мабыць, лысаваты.

Апошняя думка мяне падвесяліла, і Вольга тут жа злавіла мой настрой, і зусім ужо новым тонам папрасіла:

— Лёня, ідзі ў вагон. Прашу цябе. У нас — сакрэты!

— Секретничайте! Бога ради, секретничайте!

Ён лёгка ўзбіраецца па прыступках у тамбур, і я, гледзячы на яго шырокую спіну, пытаюся шэптам:

— Ты звар'яцела?

— Не, я чакаю віншаванняў. І даруй, я нават і не пазнаёміла. Усё так нечакана.

— І яшчэ больш, мабыць, нечакана для Сцяпана? Як жа ён цяпер?

— Ніяк. Ён — сам сабе. Я — сама сабе. Хочаш абвінавачваць мяне ў мяшчанстве — абвінавачвай. Але Лёня — талент незвычайны. А талент падобны на магутны магніт — прыцягвае слабыя душы. І я не хачу нічога ўтойваць ад цябе: апынулася ў сферы яго ўздзеяння. І нават гапаруся, што менавіта мяне ён абраў. На сімпозіуме яго даклад. А потым — кафедра ў навуковым інстытуце. У Маскве!..

— На месцы Сцяпана... Каб я была на яго месцы — я б забіла цябе. Альбо стаўкла на горкі яблык!

— Няхай твой Сцяпан і харчуецца тымі горкімі яблыкамі. Мізэрнасць! А ўяўляе сябе сусветнай велічынёй. І стогне, што ніхто яго не разумее і не хоча прызнаваць!..

Святло з акна вагона падае на твар Вольгі, і ён выдае сінюватым, як нежывы, і толькі вочы, злосна прыжмураныя вочы, зыркаюць ліхаманкава і драпежна. Крыўда, разгубленасць, пейкая спустошанасць ва мне. І гэта ўсё вярзе мая лепшая сяброўка! Яна была смелай у інстытуце, пра любыя цяжкасці казала з усмешкаю, ніколі не

скардзілася, паўпярок волі бацькоў пабралася са Сцяпанам, захаплялася ім і цяпер з такой бязлітасцю кінула яго, бэсціць, як ворага найгоршага...

— Не асуджай мяне! Не асуджай! — гаворыць Вольга і бярэ мяне за руку, і мы ідзём усцяж вагона; у вагонным акне я бачу мужчыну ў кажушку з белым каўнярком, але мужчына без шапкі ўжо, і ніякай лысіны ў яго няма, але я гляджу на яго ўважна, і Вольга, перахапіўшы мой позірк, прыветна махае рукою свайму мужу, і тут жа, быццам яго і не існуе зусім, цягне мяне наперад і гаворыць хутка, і кожнае слова мяне дзівіць.— Не асуджай і зразумей правільна. Гераічнай Жанны з мяне не атрымалася. Я не змагла прыжыцца ў тым закутку, куды закінуў мяне лёс. І потым: Сцяпан падмануў мяне. Я праз месяц, як мы тады ехалі, падскочыла ў Мінск, а ў нашай кватэры ўжо жыве нейкая «журналістка». Гэта ён так мне тлумачыў, але ж я не сляпая — палюбоўніца гэта, а не нейкая там «журналістка». І тады я сказала сабе: Вольга, у другі раз цябе ніхто не падмане і не ашукае. Што буду рабіць? У клініцы мне месца забяспечана — займуся навуковай работаю. Лёня мне кажа: у цябе, маўляў, ёсць здольнасць сістэматызаваць і аналізаваць факты. І яшчэ ў Лёні ў Маскве будзе кватэра, машына, а ўлетку — Крым. Як хочаш расцэньвай мае намеры і думкі, я нічога ад цябе не таю, гэта, калі хочаш ведаць, самая шчырая споведзь. Споведзь перад тым, як кінуцца ў той вір...

— Ты звар'яцела!

— Не, убачыла жыццё. Убачыла і не чытаю болей апіводнага перадавога артыкула, і будаваць нешта сваім нашчадкам не хачу. Кожны будуе сам сабе — гэта закон жыцця. А я хачу жыць,— яна пагладзіла мой рукаў і дадала нейкім чужым і незнаёмым мне голасам, ціха, быццам нешта вымольвала ў мяне.— Ты ведаеш і маё здароўе. Я слабая, які з мяне будаўнік ці змагар? І потым... Потым — ты ж ведаеш гэта добра! — люблю тэатр,— і ўсміхнулася, і ўсмешка атрымалася кволая, змучаная, незнаёмая.— І яшчэ — свежы сыр. І гэта ты таксама ведаеш...

Глуха сапе паравоз, потым, як крык, пранізлівы гудок; цягнік яшчэ стаіць на месцы, але з-пад колаў чуваць прыглушанае храбусценне, і вось ужо тукнулі наперадзе буферы, і жалезнае дрыжэнне пранеслася па ўсіх вагонах, і Вольга, плачучы, кідаецца мне на шыю.

Потым бачу Вольгу ў акне і бачу спаважны, скірава-

ны не на мяне позірк яе мужа; Вольга трасе рукою, нешта гаворыць, і я бачу, як варушацца яе губы, і разумею, што яна шмат перажыла, перанесла, але не сказала мне і дзесятай часцінкі свае бяды; дзіўлюся, спрабую неяк уладкаваць у нейкую сістэму тое, што пачула, і не хачу аніяк вінаваціць Вольгу.

Апошні вагон, і па ім абрываецца візгатлівае тахканне колаў; адплываюць, аддаляючыся, вузеюць дрогкія светлыя палосы і плямы; пасярод іх, здаецца, амаль ля самай зямлі, ярка свеціцца круглае чырвонае вока; яно не дрыжыць, а плаўна адсоўваецца, сціскаючыся і змяншаючыся, адплывае ў цемру, і здаецца, што не чырвоны агеньчык ліхтарыка на хваставым вагоне цягніка, а вугольчык, і яго хтосьці клапатліва і дбайна нясе ў руках і ідзе з асцярогаю, баючыся, каб не выпусціць з рук.

Анохін чакае мяне, і мы едзем, едзем адразу ж, як толькі я саджуся ў кабіну. Дарога добрая, грэйдзеры ачысцілі яе ад снегу, і яна бліпчыць, як шкло, і стрэчных машын няма, і мы едзем хутка. Анохін, здаецца, нават і задаволены, што ў кабіне — я, між іншым, папярэдзіла яго, што, магчыма, Вольга застанецца і паедзе разам з намі — няма трэцяга пасажыра, і ўвесь час гаворыць са мною, і я падтрымліваю гаворку, вельмі ўсцешаная тым, што ён нічога не распытвае, а толькі гаворыць і гаворыць, расказвае мне пра свой асабісты клопат і хатнія справы, пра тое, што вясною пойдзе на пенсію, а машыну перадасць Лавецкаму, але гэты Лавецкі лайдак несусветны і ліхач, і можа сесці за руль пасля чаркі, а чарка шафёру зусім непатрэбная ў дарозе, і што ўсе аварыі, у асноўным, ад гэтага і прыключаюцца, ад чаркі, і што ён, Анохін, намерваецца прасіць старшыню калгаса, каб машыну лепей перадалі Андрэю Бураку, хлопцу хоць і зусім маладому, але сумленнаму і дужа стараннаму...

Дзве гадзіны мільганулі незаўважна. Магчыма, я зрабіла глупства, але не ўтрымалася і ўсё расказала Анохіну пра Вольгу, пра тую нашу гаворку на пероне, пра яе нованага мужа, пра Сцяпана. Я абуралася, лаяла Вольгу, абараняла Сцяпана, гэта быў крык душы, я зусім інакш глядзела на ўсе падзеі, чым там, на пероне, дзе ўсё ёй гатова была дараваць, дзе я была проста не падрыхтаваная правільна разумець і крытычна ацэньваць.

А тут, у машыне, у мяне хапала часу, і Анохін слухаў мяне са спачуваннем, і пазней, калі мы былі ля самай паваротні да нашай бальніцы, ён сказаў мне, як гавораць

добраму сябру, і не проста сказаў, а параіў, як можа толькі раіць умудроны жыццём чалавек:

— Вы пра гэта сваім не расказвайце ў бальніцы... Пра сяброўку сваю...

— Чаму? — я нават не адразу зразумела, чаму ён папярэджвае мяне.

— Лепей яно так... Пачнуць пра сяброўку вашу байкі розныя вязаць... Прыплятуць такое, чаго і за сто год не прыдумаеш. А вам і крыўда...

— Вам жа вось расказала!

— У Ягора яно, лічыце, як памерла. Вам балела, вы мне сэрца адкрылі...

І толькі пазней, калі я была ўжо ў Твораж, пачала адкрывацца мне вялікая мудрасць, слушнасць таго, што Анохін мне раіў. Сямейнае свята ішло ўжо ў добрай сіле, але маё з'яўленне было сустрэта надзвычай цёпла, і мне налілі чарку, і я з ахвотаю яе выпіла, і з яшчэ большай ахвотаю ўзялася закусваць: прагаладалася. Карабань села ля мяне, нейк быццам нават адціснула ад усіх, спытала:

— А што ж сяброўка ваша, не схацела зазірнуць у нашыя краі?

— Яна з мужам. А ў яго сімпозіум у Маскве, яны туды едуць. Кожны дзень разлічаны.

— Масква, Масква! Шанцуе ж людзям... А што, ён шышка якая-небудзь?

— Хірург. Першая катэгорыя. І абараніў нядаўна дысертацыю...

— О-оо!..

І за гэтым «о» хавалася гэтулькі цікаўнасці, што я з вялікай падзякаю прыгадала сяброўскую параду Анохіна і зразумела, што варта мне было б сказаць пра сямейнае бязладдзе Вольгі хоць адно слова, і давялося б разматваць увесь клубок да апошняй ніточкі. Сапраўды, каму гэта цікава рабіць!

Ад далейшых пытанняў мяне ўратаваў Габінаў. Ён падышоў з келіхамі ў руцэ, і Карабань адразу ж пакінула нас, а ён уручыў мне келіх і патрабаваў:

— Будзем піць за Асуан! Разумею, патрэбны тлумачэнні. Калі ласка... Узнімем чарку за грандыёзнейшае збудаванне дваццатага стагоддзя, да якога прыклаў рукі савецкі чалавек! Дарэчы, гэта ваш бацька ўзнагароджаны за Асуан? Сёння ў газетах Указ.

— Не, вядома. Вы што, не памятаеце маё прозвішча?

— Гэта проста зачэпка, каб надаць тосту больш шы-

рокае гучанне: ваш бацька вядомы цяпер на ўвесь свет. Такім чынам — за Асуан. Такім чынам — за вашага бацьку. Такім чынам — асабіста за вас. За ваша асабістае шчасце.

— Тады давайце спалучаць тост. І за ваша!

— Я магу выпіць толькі за чужое шчасце. І гэтак раблю заўсёды. Усё тое, што мы завём уласным шчасцем — наіў, ілюзіі, міф, няўлоўнае мроіва... Яго ў нас не бывае ніколі. «Глупое сердце, не бейся... Все мы обмануты счастьем...» Так кажуць паэты.

— А ў жыцці часцяком інакш, чым гэта сцвярджаюць паэты.

— Ну, ну! Растлумачце!

— Шчасце не бывае ў чалавека толькі тады, калі ён стаміўся і не хоча змагацца...

Я сказала гэта знарок: здалося, ён хоча пра нешта ў мяне запытацца, і гэтае «нешта» было, магчыма, ненавіта тое, аб чым мне гаварыць не хацелася; ён зыркнуў на мяне не зусім дружалюбна, потым перавёў позірк на келіх, гайданул яго; з тонкіх граняў зляцелі іскрыстыя промні.

— Вы шчырая. І мне няма патрэбы хлусіць,— сказаў ён.— Гэта праўда: я стаміўся. Стаміўся ад частых і доўгіх раз'ездаў, розных плётак, якія даводзіцца чуць, стаміўся ад благога віна...

— Гэта ж «Токай»! Калі ўжо гэтае віно благое!

— Сёння мы з вамі на ўзроўні багоў,— пажартаваў Габінаў і правёў рукою па чорных валасах, і я ўпершыню заўважыла, колькі ў яго сівізны.— Але каб вы ведалі, які «Токай» даводзіцца ўжываць дзе-небудзь у вёсцы. Уласнае вытворчасці! Часам, праўда, і на высокай тэхнічнай аснове тая вытворчасць.

— Дык не піце! Я не бачу тут аніякай праблемы!

— На жаль, яна ёсць. Не хочацца крыўдзіць людзей, не хочацца чуць услед зняважлівае «загапарыўся»... Эх, кінуць-рынуць усё гэта, дый паехаць, далёка-далёка... Па ўсёй Расіі — ад краю да самага краю!.. Памятаеце ў класіка?.. «Так ты все ходишь? Это хорошо! Ты славную долю выбрал, сокол! Вот так и ходи, и смотри, а насмотрелся — ляг и помирай...» Здаецца, не наблытаў. І каб я быў крыху маладзейшы, я б прапанаваў і вам, каб разам... Але мяне ўжо не хопіць на тое, каб ад краю і да самага краю... «Боливару не снести двоих...» І таму яшчэ адзін тост.

Толькі без пярэчанняў. Без тлумачэнняў. За тое, што вы шчырая, смелая, мудрая! За ваш прыгожы лёс!..

Ён выпіў келіх да дна. Спытаў:

— Паўторым?

— Хопіць. Я не люблю віна.

— Я таксама. Але яно часам вельмі патрэбна чалавеку. Навошта? Каб зразумець сябе і быць бязлітасным. Калі чалавек крыху на падпітку, ён часцей бязлітасны і да другіх і да сябе. Вы ведаеце, я хоць заўтра магу паехаць адсюль і жыць па формуле: «ходи и смотри...» Махаць вельмі проста! Не благі спецыяліст, матэрыяльна забяспечаны, нічым дужа не звязаны: падаў заяву — бывайце здаровы. А я не еду. І не пішу заяву. Што мяне трымае? Натуральнае, зусім натуральнае пытанне... І яшчэ больш натуральна тое, што я не ведаю гэтага. Не, хлушу: ведаю! Я ведаю дакладна, абсалютна дакладна: паеду адсюль — нешта страчу, страчу і больш ніколі не знайду, згублю непапраўна. Спачатку гэта пачалося з хворага. Я лячыў яго, і мне не хацелася, пакуль ён не паправіцца, адсюль ехаць... Не, дакладней: не хацелася ўцякаць. Потым хворы мой паздаравеў і развітаўся са мною, і я бачыў яго вочы, і той позірк застаўся са мною. Вочы ўдзячнага вам чалавека!.. А потым быў другі хворы... Я лячыў яго і чакаў, і ён паправіўся... І так было ўвесь час, гэта ўжо зрабілася нейкім бясконцым ланцугом, які не бачыш, які нельга адкінуць, і гэта ўжо не ланцуг, а нешта такое, без чаго жыццё робіцца нікчэмнае... Вы ведаеце, я не памятаю многія прозвішчы... Прозвішчы хворых, якіх я лячыў і вылечыў... Але вочы кожнага з іх я памятаю. Вочы людзей, якія адданы табе, удзячны бясконца... А потым прыехалі вы...

— Гэта што, яшчэ адзін ланцуг?

— Не! Гэта — сяброўства. І я шчаслівы, што я, намнога старэйшы за вас, гэтак сябрую з вамі, і гэтак шчыра размаўляю, і магу нічога не таіць ад вас... Які ж гэта ланцуг! — ён засмяяўся, паліў сабе віна, хацеў наліць і мне, але я закрыла сваю чарку рукою, і Габіпаў не настойваў, узняў свой келіх.— Гэты ланцуг можна несці ўсё жыццё. І той, хто яго прапясе — найшчаслівейшы з людзей. Вось яму я магу пазайздросціць. І дужа вас прашу: спатрэбіцца — у любым выпадку вы можаце разлічваць на маю шчырасць, падтрымку... Паверце, у наш атамны век гэта нечага ды варта...

Мы размаўлялі з ім, і я ўвесь час адчувала на сабе по-

зірк Карабань: ці завіхалася яна ля стала, ці адсоўвала крэслы, каб не заміналі людзям танцаваць, ці размаўляла з Твораж — увесь час назіркам сачылі за намі яе вочы, і калі, здаралася, яна праходзіла паўз нас, я прыкмячала ў іх ярасць і непрымірымую варожасць. І было з гэтага крыўдна, і была ў гэтым прыкрая падазронасць, якая кідала на нас, на нашу гаворку, на кожнае слова Габінава недобры цень, і гэта стрымлівала мяне, прымушала не адказваць на яго шчырасць такой жа шчыраю скаргаю на сваю адзіноту.

Пачуццё адзіноты мацнела, і я змагалася з ім, і, як за апошні паратунак, ухапілася за думку пра блізкую сустрэчу з Валерам. Гаючая, як дзівосныя лекі, думка! Я больш і глыбей разумела цяпер Габінава і была ўдзячна яму. Разумела і Карабань і не крыўдавала, наадварот, шкадавала яе пакуты, пакуты нікому непатрэбныя, штучныя і зусім неразумныя.

Думка пра хуткую сустрэчу з Валерам узнімала мяне над усім гэтым святочным тлумам, над клопатам і трывогаю блізкіх, зусім не чужых мне людзей, настройвала ўзнёсла, аптымістычна і па-філасофску. Валера не можа не прыехаць, бо ў любым выпадку, калі ён не прыедзе, губляе сэнс усё — мая трывога, і чаканне, і сама мэта майго жыцця.

Жыць трэба тады, калі ты кахаеш альбо чакаеш сваё каханне, а чакаць можна толькі тады, калі ты верыш у гэтае каханне, верыш у тое, дзеля чаго жывеш. Але, калі ты верыш, значыцца, ты чакаеш, а калі не верыш, значыцца, не чакаеш, а проста самым звычайным шляхам супакойваеш сябе, думаеш, што менавіта гэта і трэба, а на самой справе маніш, падманваеш сябе, подла здраджваеш сваёй веры; і тады няма чакання, а ёсць агідны самападман, самая звычайная няпраўда і хлусня, таму што нельга ў адзін і той жа час і чакаць і не верыць.

## 11

Валера пацалаваў мяне зімою. Адзіна-адзіны раз. І гэта быў першы мужчынскі пацалунак, які лёс падараваў мне.

Цяпер таксама зіма, і я цалую Валеру. Цалую яго вочы, яго губы... Потым углядаюся ў яго твар — нічога не кажу.

Проста маўчу.

Поўня на небе, і ноч за акном сіня-шэрая, як блізкі ранак, але да ранку яшчэ вельмі далёка, і цішыня ў бальнічным пакоі, і цішыня ў бальнічным калідоры, і чырвонымі вочкамі свецяцца вугольчыкі ў пліце, на якой мы рыхтавалі вячэру і дзверцы знарок не зачынілі, каб бачыць агонь, ад якога ў пакоі таямніча і загадкава, як звычайна ў лесе, калі сядзіш ля вогнішча; прыглушана сіпіць чайнік, і пліта астывае, і чайнік канчае сваю сіпатлівую песню, і тады добра чуваць, як грукоча па гравійцы машына, і я адчуваю, што ўсе гэтыя гукі жывуць далёка ад мяне, аніяк не звязаны са мною, але яны вельмі патрэбныя, бо з імі няма мёртвай цішыні, а ёсць жыццё, якому я ўдзячна бясконца.

І яшчэ я адчуваю, як гулка стукае маё сэрца, і адчуваю, што я не адна, што я магу пакласці сваю галаву на грудзі Валеры, і слухаць яго сэрца, цалаваць Валеравы вочы, песціць, галубіць яго і ведаць, што ён нікуды не знікне ні сёння, ні заўтра, ні праз тыдзень — толькі гэта, толькі гэта, і нічога больш не існуе для мяне. Няпраўда, вядома. Ёсць не толькі мы з ім, і я гэта ведаю з такой жа дакладнасцю, з якой ведаю, што зусім блізка ад нас — колькі там крокаў! — пачынаецца бальнічны калідор, а за ім бальнічныя пакоі, дзе ляжаць хворыя, і ведаю, што заўтра маё дзяжурства, і мне давядзецца праводзіць ноч у тым калідоры на старасвецкай канапе, а Валера застанецца тут, і што яшчэ адна ноч выкрасліцца з нашага шчасця, але гэтае шчасце бясконцае, бо пройдзе гэтая ноч, і пройдзе наступная, і за ёю будуць яшчэ і дні і ночы, і потым прыйдзе час, калі Валера паедзе адсюль, але паедзе не адзін, а разам са мною, а калі і адзін, дык я паеду пазней крыху, але я ўсё роўна буду з ім, бо мы цяпер разам і непадзельныя...

Усё гэта я ведаю, але ўсё гэта існуе недзе дужа далёка, існуе ў нейкім нерэальным свеце, куды я не хачу ўваходзіць, і куды не хачу пускаць Валеру. Навошта мне той свет, калі Валера побач са мною, і мне больш нічога не патрэбна ў жыцці!..

І зноў гэтае «не патрэбна» далёка ад праўды. Мне трэба шмат, і ўсё тое, патрэбнае, так ці інакш звязана з Валерам, і зусім не абмяжоўваецца толькі тым, што ён побач. Але ўсе тыя мае патрэбы і ўсе тыя планы, што вынікаюць з іх, зноў жа жывуць аддалена ад нас, аб іх можна толькі думаць, думаць і ніяк не звязваць з тым, што

ёсць блізенька,— працягні рукі і дакранешся; і гэта — Валера!

Я шмат чытала пра каханне. Цяпер кахаю сама.

Гэта пачалося не ўчора і не сёння. Калі мы з Валерам сустракалі світанне і бачылі, як узыходзіць над Мінскам сонца, мне здавалася — і я верыла ў тое бясконца! — свет народжаны для мяне, што я шчаслівейшая за ўсіх на свеце. Цяпер разумею: тыя мае адчуванні і радасці — гэта і не каханне зусім, гэта толькі вытокі, маленькія ручаінкі, драбнічка, кропля вялікай і неабдымнай ракі, якая гушкае зараз мяне, выносіць у свет незвычайны, такі дзівосны і казачны свет, што робіцца смешна з таго дзіцячага наіву. Тады быў прыгожы і цудоўны малюнак. Але — малюнак. Цяпер — жыццё, рэальнасць, з такімі дзівоснымі фарбамі і адценнямі, якіх не можа злавіць самае пільнае вока самага таленавітага мастака. Не, можа, але ў той жа міг, калі такое можа адбыцца, фарбы змярцвеюць, і гэта будзе ўсё ж малюнак, а не жыццё.

— Я люблю, калі ты ўсміхаешся,— гаворыць Валера, і мае думкі зноў тут, у святле рэальным і цудоўным.

— А хіба я смяюся? І потым — ноч. Як жа ты бачыш у цемры? Гэта толькі кошкі бачаць ноччу. У іх у вачах ёсць такія светавыя крышталікі.

— Я і без крышталікаў бачу. І валасы твае бачу. І вочы,— ён кратае пальцамі мае павекі.— Гэта вельмі добра, што ты не фарбуеш веі. І вусны фарбаю не пэцкаеш. Не люблю гэтага.

— Тады я зраблю знарок.

— Не зробіш. Таму, што калі зробіш гэта — будзе ўжо зусім іншы чалавек. Зусім другая жанчына. А я люблю вось гэтую.

— Ой, як у цябе стукае сэрца!

— Магчыма, доктар, з ім што здарылася? Раней яно ў мяне стукала зусім бязгучна. А зараз — тоўх-тоўх-тоўх... Гэта блага, доктар? Магчыма, патрэбны нейкія лекі?

— Зараз мы паслухаем ваша сэрца. Паслухаем... Глыбей дыхайце. Цяпер не дыхайце!..

— Як жа не дыхаць? Памерці можна.

— Хворы! Не свавольнічайце, калі ласка!..

Неверагодна, дзівосна пабудаваны свет — я прыціскаюся да грудзей чалавека, якога пазалетась зусім не ведала! Слухаю сэрца чалавека, якога раней і не бачыла ніколі, не ведала нават аб яго існаванні. Ён мог прайсці паўз мяне на вуліцы, а, магчыма, і праходзіў, і мы глядзелі адно

па аднаго і разміналіся, і ў нас не ўзнікала шкадавання, што мы ідзём у розныя бакі, і цяпер гэты чалавек побач са мною, і гэта для мяне самы дарагі, самы блізкі, самы родны, бо ён — гэта я сама, уся як ёсць, разам з думкамі і клопатам, надзеямі і трывогамі; дакладней, няма ні яго, ні мяне, а ёсць адзін чалавек, ёсць мы, ёсць адзінства, у якім сабраны і нашы думкі, і нашы хваляванні, і нашыя трывогі, і надзеі, і радасці, і гэтая радасць такая вялікая, што, каб яе даць мне адной толькі, дык я б не вытрымала яе вагі, яна б знішчыла мяне і знікла б сама, таму што адна яна сама па сабе, гэтая радасць, існаваць не можа, і нам ужо без яе няма і не можа быць жыцця.

— Дык што, доктар, вы скажаце пра сэрца?

— Магу ўзрадаваць вас. Сэрца — цудоўнае: пражывяце сто год без хвароб, а далей будзе відаць.

— А ваша, калега, мне ўнушае трывогу. Дазвольце яшчэ раз праверым... І дыхайце роўна, глыбока... Яшчэ глыбей! Цяпер не дыхайце! Не, патрошку можаце... Дыхайце, дыхайце...

Валерава галава ў мяне на плячы, і пасмы пачынаюць казытаць мне шыю, і я кратаю рукамі мяккія валасы, гладжу іх...

Валера! Родны! Каханы мой!

Як выказаць удзячнасць табе? Як увогуле я магла жыць увесь гэты час адна і не ведаць такой радасці? Як гэта магло здарыцца: ён — там, я — тут? Але што я варушу мінулае? Было — сплыло. Ён — побач! Блізенька! Ён са мною! І ён — мой!..

— Ты чаму нічога мне не гаворыш?

— Слухаю тваё сэрца. І ўсё дзіўлюся. Жывуць далёка людзі, невядомыя, потым яны разам, і яны — самыя блізкія, самыя дарагія адно аднаму. На першае месца сярод цудаў свету я б паставіў менавіта гэта.

— І я пра тое ж думала.

— А пра што ты думала, калі мяне не было тут?

— Рознае здаралася... Справы, клопат усялякі... У нас Карабань працуе. Памятаеш, я табе казала, што яна раўнавала мяне да Габінава? А я ведаю: ён не кахае яе. А яна на тое і ўвагі не звяртае. Я гэтага не магу разумець...

— І не трэба. Гэта даволі горкая навука. Лепей яе не ведаць...

І гэтыя яго словы, як абухам мяне па галаве. Ох, якая ж я дурніца! Бы знарок падвяла яго да той яго бяды! Бы патрабую, каб ён яшчэ мне і нешта даводзіў, тлумачыў

тое, пра што я не павінна чуць ад яго аніводнага слова. Не было ў яго той бяды! Не было! Ён павінен яе забыць, закрэсліць тую бяду!..

— Ведаеш, што я намысліў? На гэтым тыдні, не адкладаючы, нам трэба афарміць наш шлюб.

— Ой, якое глупства! Хіба тое пасведчанне, што мы атрымаем, будзе гарантыяй нашага шчасця? Шчасце павінна быць у сэрцах. А калі яго там няма, і сто тысяч самых розных і самых адказных папер не ўратуюць...

— Правільна. Але я паеду ў сельсавет і даведаюся, калі і як можна ўсё зрабіць.

— Ехаць у такі мароз?

— Але ж ты ездзіш да хворых. Вось учора ў Залессі два разы пабыла!

— Інакш нельга. Там жа хворыя!

— Каб мы з такой жа хуткасцю імчаліся да людзей, калі ў іх знікае каханне!

— За наша каханне я спакойная. Ты верыш у гэта?

— Веру. Але я думаю зараз аб сваёй памылцы.

— Якой памылцы?

— На першае месца сярод цудаў свету трэба паставіць цябе... Ты не пярэчыш, я ўключу транзістар. Паслухаем, што робіцца на гэтым свеце.

— Толькі не вельмі гучна. Ціхенька-ціхенька каб...

Мы штовечар так робім: уключаем транзістар, ловім розныя станцыі, слухаем не толькі мелодыі, але і перадачы на англійскай мове, Валера кажа, што яму патрэбна штодзённая практыка па мове. Вось і цяпер ён злавіў нейкую станцыю, і мы слухаем ціхі голас англічанкі. Агульны змест гаворкі разумею — каментарыі да пасадкі нашай аўтаматычнай станцыі на Венеры: пазаўчора мы чыталі пра гэта ў газетах. Валера слухае цяпер вельмі ўважліва, але я перашкаджаю яму.

— Ты перакладай,— прашу яго.— Я разумею не ўсе словы.

— Яна гаворыць, што савецкі луназод здзівіў свет. А станцыя, якая села на Венеру, пераконвае свет, што камуністы не фанатыкі, як гэта казалі раней, а цвярозыя рэалісты. І цікавыя падлікі: чалавек, каб не спаў, не адпачываў, а толькі ішоў і ішоў пешкі, адолеў бы адлегласць да Венеры праз дванаццаць тысяч, здаецца, гадоў. А радыёсігнал амаль чатыры мінуты ляціць. Разумееш?

— Значыцца, каб ты быў там, я ніколі б не дайшла

да цябе. Ці, каб размаўляла на радыё, чакала б адказ чатыры мінуты?

— Я часам чакаю болей, пакуль ты скажаш слова!

— Лепей ты выключай. Ці не, пашукай, каб спявалі. Злаві «Маяк»...

Валера ловіць патрэбную хвалю, і я чакаю, і сачу за яго пальцамі, і не хачу болей аніякіх размоў. Ноч за акном, здаецца, яшчэ больш пасвятлела, шыбы нібыта ціха звіняць ад сцюжы, і ад гэтага цеплыня і ўтульнасць пакоя ўспрымаюцца асабліва востра; і згаслі ўжо чырвоныя вочкі-вуголле ў пліце, і толькі свеціцца маленечкая зялёная кропачка за шклом транзістара, якое падзелена лічбамі шкалы; мне не хочацца па-ранейшаму нічога гаварыць, а толькі хочацца трымаць Валераву руку, і я трымаю яе, абмацваю пальцы, вялікія і шархоткія, але такія ласкавыя пальцы, а ў вушах гучаць не словы песні з транзістара, а яго, Валеры, ласкавыя словы; Валерава галава ля майго пляча, і нашыя валасы спляліся ў адно і пераблыталіся, і я баюся мяняць паставу і адкінуць валасы ад шыі, бо ведаю, што варта мне толькі зварухнуцца, як адразу беззваротна знікне гэтае адчуванне цеплыні і ўтульнасці, і я баюся гэтага і не варушуся, і толькі кратаю, бы ўзважваючы, Валеравы пальцы, і дотык да іх адгукаецца ўва мне ціхім гудам; я ведаю, што гэта зноў прачынаецца ва мне жаданне пяшчоты...

Шчасце...

Цяпер я ведаю, што заключаецца ў гэтым слове. Шчасце ёсць, а цябе няма: ты — у другім, ты раствараеш сябе ў ім, другім, каханым чалавеку, раствараеш сябе цалкам і ўжо не існуеш адна, ты болей, чым адна, ты мацнейшая, больш важкая, бо ты аддала сябе цалкам, ты пералілася ў новую сілу, больш магутную і аграмадную, чым тая, што заключалася ў табе дагэтуль!..

## 12

Валера сам рыхтуе снеданне. Сам распаліў пліту, наліў ваду ў чайнік і зараз не дае мне нічога рабіць. Я гляджу, як ён завіхаецца ля пліты, і мне і радасна, і тужліва, і трывожна. А з чаго гэтая трывога, не ведаю. Памкнулася была памагчы яму, забараніў:

— Падвязуць балон — будзеш працаваць. А зараз твой клопат — газета. Чытай! Ты ўжо зусім адсталы элемент — тры дні газеты ў рукі не брала! І ўсё гэтая пліта вінавата!

Ён часта пацвельваецца гэтак. Пліта ў мяне стаіць новая, але балон з газам яшчэ не падвезлі. А з дрывамі сапраўды клопат вялікі. Плітка электрычная ёсць, але па ёй не так хутка згатуеш. Калі адна была, упраўлялася. А цяпер, калі разам, аніяк не ўпраўляешся. І Валера сказаў, што ён павінен вывучыць заканамернасць гэтых з'яў, і таму я павінна сядзець і чытаць газету ўслых. А ў мяне на тое аніякай ахвоты. У мяне трывожна на душы, і я не ведаю, з якое прычыны, і газета валіцца на падлогу, і Валера пачынае злавацца.

— Калі ты думаеш, што сваімі дзеяннямі ты дапамагаеш мне, дык глыбока памыляешся.

— Затое гэта, мабыць, паскорыць нам снядапак,— кажу я і цалую Валеру.

— Не вывучаная да канца праблема. Між іншым, у часе перапынку кухар таксама мае права на сваё асабістае жыццё!..

Валера ўздымае мяне на руках, кружыць, потым спыняецца, цалуе і ўважна ўглядаецца ў мае вочы, і гэтае яго кароткае маўчанне прыгнятае мяне і трывожыць; кожны раз, калі ён маўчыць, мне здаецца, што яго думкі недзе далёка.

— Ты чаго маўчыш, родны мой? Скажы, толькі шчыра, пра што зараз думаеш?..

— Мяне хвалюе зараз адна вельмі актуальная праблема, праблема, можна сказаць, веку: адметныя якасці матэрыі. Вада, якую нагрэлі да ста градусаў, ператвараецца ў пару. А масла — у дым. Ты бачыш, што робіцца ў нас на патэльні?

Вочы яго хітравата прыжмураныя, і мне смешна, і я веру, што ён кажа мне праўду, што іншых думак у яго не было. Але ж смурод сапраўды! На патэльні гарыць масла.

— Пусці, я адсуну патэльню.

— Табе забаронена падыходзіць сёння да пліты. А ў мяне не асэнсаваная да канца праблема.

— Калі згарыць усё масла, яна праясніцца, думаю, праблема!

— Не раней. Я здагадваюся, што трэба патэльню раз'яднаць з агнём!..

Ён цалуе мяне, усаджвае на зэдлік, кладзе на мае рукі газету. Які ж ён прыгожы ў белай маёй шапачцы, што дзеля жартаў надзеў, беручыся за кухонную справу. І як

фацэтна ўскінуты на плячо ручнік! Не, не глядзець на яго я не магу. А гэта яго злуе.

— Чытаць ты будзеш? — пытаецца ён і замахваецца на мяне ручніком.— Ну?

— Так, цяпер няма куды дзявацца. Значыцца, пачынаем з перадавога артыкула. Дарэчы, Вольга тады на пероне мне сказала: я, маўляў, не чытаю болей перадавых артыкулаў. І таму калі ты не пярэчыш, я пачынаю з апошняй старонкі...

Я чытаю газету ўслых, але час ад часу паглядаю на Валеру, захапляючыся лоўкасцю, з якой ён смажыць бульбу — «аля-Дзвіна», як ён паабяцаў мне. Кожную бульбінку — выбраў з вядзерца самыя кругленькія — разрэзаў на тры пляскатыя долькі і асцярожна, з кончыка нажа, апусціў іх у масла, потым перагортвае часта, і долькі робяцца падобныя на маленькія піражкі.

— Ой, як жа хочацца есці! І такая смаката ў цябе палучылася. Быццам спецыяльна дзе вучыўся!

— А як жа! Жыццё — школа грунтоўная. І газеты чытаць не шкодзіць. Між іншым, гэты рэцэпт, толькі назву, вядома, сваю даў, я ў газеце вычытаў. Сто адна страва з бульбы. Чытала?

— Навошта мне чытаць? Я сто дзесяць сама ведаю!

— Час у нас будзе — паглядзім. А цяпер газету — на падваконне. Сама — да стала. Снедаем. А потым, ведаеш, я намысліў адразу ў сельсавет, каб аб усім дазнацца. І ведаеш як? На лыжах. Лыжы твае. А бацінкі мае якраз для лыжаў і прыстасаваны...

Бацінкі ў Валеры цёмна-карычневыя, на тоўстай гумовай падэшве. Я гляджу на іх і пачынаю разумець, чаму гэтак трывожна ў мяне на душы з самага ранку. Валера казаў мне яшчэ на тым тыдні, што паедзе ў сельсавет, каб даведацца, калі можна афарміць шлюб. А ўчора сказаў катэгарычна, бо раней я яго адгаворвала, што едзе, маўляў, сёння.

І ён паедзе, я ведаю, і мне самой хочацца, каб ён паехаў, але я баюся яго адпускаць. Чамусьці ўчора мне прыгадаўся сон, які я бачыла напярэдадні прыезду Валеры,— лес, лыжы, што лятуць у паветры, воўк, стрэл... А сёння пры адной думцы, што Валера выпраўляецца ў дарогу, мне робіцца страшна: а раптам з ім што-небудзь здарыцца?

Сельсавет не так і далёка, і апоўдні Валера вернецца, але гэткі час не бачыць яго? Ды няхай застаецца без нас той сельсавет. Афармім шлюб пазней, калі Валера напі-

ша сваю працу, тады і вяселле згуляем, а зараз не трэба адцягваць яго ўвагу, няхай сядзіць і робіць сваю справу. Час жа ідзе!

Але Валера не хоча больш адкладваць, гаворыць, што трэба ехаць, і, я ведаю гэта, паедзе, і з таго ў мяне на душы трывога. Я не хачу адпускаць яго ад сябе і на гадзіну. Калі ён сядзіць і працуе, і я ведаю, што ён у пакоі і я магу ў любы час яго ўбачыць — я спакойная. А цяпер надвор'е такое, што і выходзіць страшна — вецер, сцюжа... А ён — ехаць! Ды няхай згоніць мароз, тады і паедзем разам!..

Мы снедаем, і я ўвесь час думаю пра гэта, і пазней, калі прыбіраю посуд, зноў асцярожна даводжу яму, што ехаць не трэба, і ён дзівіцца з мае настойлівасці. Сказаць, аднак, яму пра нейкія там нядобрыя прадчуванні я не адважваюся. Але пераконваюся ўсё больш і больш: не трэба яму сёння ехаць!

— Ты плачаш? — ён туліць мяне да сябе, ласкава адводзіць пасмы, што падаюць мне на лоб.— Ну, гэта ж зусім неразумна. Але скажы, чаго ты плачаш?

— А, не звяртай ты ўвагі. Я і сама сабе не падабаюся: увесь час вочы на мокрым месцы. І адліга пад носам. Зусім не сучасная жонка.

— Ты — цуд. І я гэта даўно ведаю. І буду ведаць усё жыццё. І мне так хораша з табою, што нават і на хвілiначку не хочацца пакідаць цябе і ехаць. Лепей бы я папрацаваў, напісаў... Але ж вырашана: трэба!

— Гэта ты сам вырашыў. І я толькі не разумею, чаму ты хочаш менавіта сёння? Не згарыць той сельсавет. Давай хоць на наступным тыдні. Дысертацыю за гэты час падгоніш наперад, увагу не будзеш адцягваць...

— Учора ж вырашылі!

— Нічога, родны, не вырашылі. Ты сказаў, а я пагадзілася: калі ты лічыш, што трэба, значыцца, зробім. Але ж я не казала, што абавязкова сёння.

— Падобна на тое, што мы пачынаем спрачацца...

— Спачатку я цябе пацалую. А спрэчка — гэта потым ужо...

— У мяне адчуванне віны перад табою. Учора я размаўляў з Габінавым, і мне пачулася... Не, не ведаю, магчыма, памыляюся... Але яго словы, тон... Адным словам, асуджэнне мне пачулася. І Твораж скоса пaглядае. Тут ужо я не памыляюся...

— Ой, Валерка, Валерка! «Скоса пaглядае»... Што з

таго? Ды папа, асабістае, не павінна залежыць ад нейкага там пагляду. Галоўнае — нашы адносіны. Тое, што мы верым, патрэбны адно аднаму!

— Ты — разумная. І сапраўдны сябар!

— Значыцца, не паедзеш у сельсавет?

— Паеду, родная мая, паеду! Апоўдні вярнуся абавязкова. Калі ваўкі не з'ядуць. У вас тут, кажуць, шмат ваўкоў!

— Папрасі ў Габінава стрэльбу. Слухай, гэта ж ідэя! Бліскучая ідэя! Я сама папрашу!..

Валера паедзе са стрэльбаю, і мне будзе не так страшна за яго. Але па-ранейшаму прадчуванне чагосьці нядобрага жыло ва мне, і з гэтым пачуццём цяжка было змагацца, і я разумела, што нічога не магу змяніць, і адчувала, што жаданне такое ў мяне ўжо сышло.

Дзіўна, каб ён сказаў «не паеду», мне б было пачуць гэта непрыемна. Я ведала, што ён паедзе, і ў той жа час на нешта спадзявалася і разам з тым не хацела, каб ён змяніў сваё рашэнне, хоць і трывожнае, і не магла прагнаць сваё прадчуванне, і яшчэ больш кахала яго менавіта за гэтую настойлівасць, за тое, што сваё рашэнне ехаць у сельсавет Валера не змяніў. Гэта здараецца цяпер са мною: хочацца і не хочацца ў адзін і той жа час, і ніяк не даўмецца, якое жаданне пераважае.

Пасля снедання Валера едзе ў сельсавет, і я стаю на ганку, пакуль яго постаць са стрэльбаю за плячамі не знікае ўнізе ля возера за снегавымі гурбамі, і толькі потым іду ў бальніцу.

Разам з Твораж мы робім абход, а потым я пачынаю прыём. Хворых мала — усяго тры чалавекі, я выслухваю іх скаргі, выпісваю рэцэпты і застаюся адна. Не, не адна — са мною думкі, і ўсе яны пра Валеру. Дваццаць тры дні ён ужо тут. Яшчэ засталося трыццаць сем. Месяц і сем дзён. Потым Валера паедзе.

А што рабіць мне?

Ён кажа: паедзем разам. Спачатку і я так думала. А цяпер бярэ одум. Ехаць? Але куды? Валера казаў, што абмяркоўваць яго працу планавалася ў маі, а цяпер, нібыта, пераносяць — зноў жа няпэўна — на ліпень. Канчаткова ўсё будзе вырашана толькі тады, як ён здасць рукапіс. Зрэшты, што гэта мне? Трэба, вядома, падаваць заяву аб звальненні. Але як паглядзяць на гэта ў раёне? Толькі што прыехаў малады спецыяліст і, калі ласка, кідае ўсё і едзе. Куды едзе? У Мінск! Не будзеш жа тлума-

чыць, што ў Мінску ім і не давядзецца жыць, а трэба будзе ехаць у Ратамку, а потым, калі вырашыцца канча справа з дысертацыяй Валеры, яна будзе, дзе яны асядуць стала. Ды гэтае «стала» папяццс зусім няпэўнае. Ды, зрэшты, не гэта важна і не гэта галоўнае. Яна едзе разам з мужам! І гэта, вядома, правільна, што Валера паехаў у сельсавет. Шлюб неабходна афарміць: патрэбныя дакументы будуць, і ніхто не возьмецца пярэчыць, ніхто нічога не паставіць пад сумненне — сям'я! І нібыта шкада ўжо, што давядзецца ехаць адсюль. А можа, Валеру нікуды і не трэба ехаць? Ён жа можа і ў школе працаваць. Настаўнікам!

Падыходзіць Карабань, прысаджваецца, гартае гісторыю хваробы, але я бачу, што гэты занятак — адчэпнае, што ёй хочацца нешта мне паведаміць. Маўчу і чакаю. Пасля таго як да мяне прыехаў Валера, дужа змяніліся нашы адносіны. Карабань празмерна ветлівая, імкнецца напярэдзіць мае жаданні і ўжо двойчы па сваёй ахвоце ўзяла мае начныя дзяжурствы. Разумею, чым гэта выклікана: у яе няма цяпер падстаў раўнаваць мяне да Габінава! А ён, Габінаў, зрабіўся апошнім часам хмурны, размаўляе са мною неахвотна і нават раздражнёна. І Твораж нібыта падмянілі: гаворыць, а глядзіць не табе ў вочы, а некуды ў прастору, быццам чалавек, з якім яна размаўляе, там, далей, а ты — пустое месца.

— Значыцца, вы хутка ад нас і паедзеце? — пытаецца Карабань, і ў яе карычневых вачах ярка свеціцца цікаўнасць і баязлівасць, што, магчыма, такую гаворку пачынаць і не варта.

— Адкуль такія звесткі?

— Муж ваш гаворыць. Учора я паскардзілася яму: вы ўжо, кажу яму, хоць да вясны ў нас Галіну Сямёнаўну не забірайце. Нам без яе цяжка. А ён цвёрда: забяру, маўляў, хоць у тры ручаі рыдайце ўсе тут...

— Ну, рыдаць, здаецца, асабліва няма каму.

— Хворыя ўсе вас дужа паважаюць.

— А здаровыя, значыцца, не ўсе?

— Не, не, я гэтак не кажу. Мы ж усе добра ставімся да вас, бо бачым, што вы чалавек душэўны і думку другіх паважаеце. Во, дарэчы, прыгадала. Камар вы прызначылі біяміцын, а яна яго не хоча піць: горкі, кажа. Горыч, маўляў, ныркам шкодзіць. Вы скажыце ёй, калі ласка.

— Скажу абавязкова. Хтось, здаецца, прыехаў...

— Так, дзверы бабахнулі. Але ж машыны не чуваць.

Не, пайшоў жа толькі аўтобус. Нехта з яго да нас... Зараз я пагляджу...

Галава гудзе. Падобна на тое, што прастудзілася. Не, не прастудзілася, зусім іншае гэта — мая трывога. Варта мне толькі пакласці галаву на сашчэпленыя на стале рукі і закрыць вочы, як адразу ж адступае, бы правальваецца кудысьці, увесь бальнічны клопат, і ў маім уяўленні паўстае Валера. Ясна, нібыта на экране, бачу аснежанае поле, лыжны след, які праклаў Валера, а вось і ён сам імчыць на лыжах па схіле, і над зялёным сасоннікам, што шнурам стаў у нізіне, вісіць мядзяна-бляклае зімовае сонца.

— Доктар! Доктар! На вас адна надзея, даражэнькая!

Тужлівы і ўстрывожана-адчайны голас гэты рэальны, і я ўсё не магу пераключыцца ад тых сваіх думак да таго, што гаворыць старая жанчына, якая ўвайшла і спынілася на дывановай дарожцы ля дзвярэй. І дужа ж знаёмая жанчына! Дык гэта ж Данілюк!

— Вы да мяне? — я спытала, хоць і добра ўжо разумела, што, мабыць, здароўе яе дачкі пагоршылася, і яна прыйшла, вядома ж, да мяне.

— Так, доктар, так. Увосень, помніце, я да вас прыходзіла. З Лідачкаю мы былі ў вас. Вы ў раён нас паслалі — палегчыла дзяўчыне. А цяперка зноў усё горай і горай... Баліць ручанька. А ніхто лячыць не хоча. Каб жа вы зноў Лідачку ў раён накіравалі, можа б, палегчыла, а яна тут у калідоры чакае. Дужа ж вас прашу...

— Не трэба адчайвацца. Ніякая хвароба не страшная, калі верыш, што здужаеш яе. А чалавек можа і павінен здужаць усё!..

Я кажу гэта ёй, а потым кажу і Лідзіі, а ў сэрцы трывожна і пуста. Навошта я лгу? Габінаў казаў праўду: адзінае, што магло на нейкі час, вядома, уратаваць дзяўчыну, дык гэта ампутацыя. А цяпер... Пухліна перайшла ўжо на прадплечча, скура зрабілася васковая і амаль празрыстая; пухліна амаль зжэрла косць і яна пачынае ўжо дэфарміравацца. А Лідзія — жывая... Як яна выцягнулася за гэты кароткі час, што я не бачыла яе.

— Баліць рука, Лідачка?

— Часам, не вельмі.

— Паправіцца павінна рука. Вясной будзеш яшчэ збіраць на лузе кветкі. Ты любіш кветкі?

— Да вясны далёка. Не дачакацца мне...

— Ой, якая ты песімістка! Не трэба адчайвацца. Пры

любым выпадку ў жыцці — нельга адчайвацца. Ніколі нельга! Разумееш?

— Разумею...

Вялікія шэрыя вочы глядзяць на мяне з дарослай строгасцю і смеласцю. Яна, мабыць, ведае ці здагадваецца, што хлушу ёй, што аніводнаму слову майму нельга верыць, але слухае і маўчыць. І мне яшчэ цяжэй ад гэтага маўчання.

— Хочаш, мы пакладзём цябе да нас у бальніцу?

— Не, я хачу, каб у раён. Мне тады, як вы ў раён пасылалі, адразу лепей зрабілася, не так балела...

— Заставайся тады ў нас. Заўтра будзе машына, можаш тады і паехаць...

Кажу гэта з усмешкаю, намагаюся супакоіць дзяўчынку, і з палёгкай уздыхаю, калі зачыняюцца дзверы і я застаюся адна. Не, яшчэ б хвілінку такой размовы — і я б не вытрымала, зараўла б ад болю і роспачы. Такой сцюжаю пасылаць — наўрад ці зменіцца надвор'е да заўтра — беспадзейна хворага чалавека ў раён? Гэта ж глупства, непатрэбная жорсткасць. Але я прымаю менавіта такое рашэнне, прымаю, яшчэ не ведаючы, як паставіцца да яго Твораж, бо разумею, што тут, пад позіркам гэтых стомленых, зусім не дзіцячых вачэй, іншага рашэння я прыняць не магу. Недзе ў душы жыве надзея, што да раніцы нешта зменіцца, што, магчыма, мне ўдасца пераканаць Лідзію і яе маці не ехаць у раён, што, магчыма, адбудзецца ўвогуле нешта такое неверагоднае, неспадзяванае, але выратавальнае.

Цішыня ў пакоі, чуваць, як часта і гучна шухкае галінка акацыі ў падваконні — усчаўся моцны вецер,— і я бачу, як за акном па снегавых гурбах узвіваюцца белыя закруткі, і зноў працінае мяне трывога за Валеру. Навошта, навошта ён паехаў на тых лыжах! Такая далеч! Такая сцюжа!..

Бачу машыну, што павярнула з гравійкі і хутка імчыць да бальнічнага ганка, бачу, як з машыны здымаюць і нясуць некага ў бальніцу, нясуць на стракатай коўдры, накрытага чорным кажухом, і толькі нейкі міг спагаддзя, калі чую па калідоры галасы, я пачынаю разумець, што гэтае «нешта» — чалавек, і гэтае разуменне ўваходзіць у мяне вострым болем, і мне цяжка дыхаць, і я захлінулася, бы ад моцнага ветру, і гэты вецер не там, за акном, а тут, у пакоі, і ад яго няма ратунку.

Валера!

Гэта ж з ім бяда нейкая прыключылася!

А з месца крануцца не магу. Стаю як змярцвелая, толь-

кі ўсё чую, усё разумею, але як паралізаваная, ні рукою паварушыць, ні кроку зрабіць не магу.

А за акном, на снегавой гурбе, стаіць Валера. Жывы Валера! Стрэльба з рукзаком за плячамі. Лыжныя палкі пад пахаю. Стаіць, здымае рукавіцы і глядзіць на бальніцу. Шапка ў яго белая ад інею, і белыя плечы, і рукзак, і спартыўны касцюм з правага боку выкачаны ў снезе — паваліўся, мабыць, недзе.

Ці бачыць ён мяне? Не ведаю, не магу зрабіць аніякага яму знаку, толькі смяюся ад радасці і адчуваю, што па шчоках коцяцца слёзы.

— Галіна Сямёнаўна! Галіна Сямёнаўна! Дзе ж вы там? — Твораж урываецца ў прыёмны пакой.— Лукаш, манташнік, разбіўся. Я даўно казала, што ён дабром не кончыць. І калі ласка: палез без ахоўнага рамяня на апору... Яны, пакуль гэтую лінію сваю правядуць, пазабіваюцца ўсе. Кажуць: на заклад ішоў...

Мне патрэбна нейкае імгненне, каб прыйсці ў сябе. І вось я раблю першы крок, і тады ўсё праясняецца, і я магу разумець словы Твораж, сэнс таго, што здарылася, і магу ісці ўслед за ёю, і рабіць перавязку, і нават раіць Твораж, каб пазваніць у вобласць і прасіць самалёт. У нашых умовах Лукаша не ўратаваць: у яго пабіта ўся грудная клетка і зламаны рукі, і ён увесь час трызніць, і Твораж не ведае, што рабіць.

— Трэба ў вобласць яго адпраўляць. Толькі ў вобласць,— кажу я, і тое, што я прапаноўваю, мабыць, адзіна правільнае выйсце.

— Надвор'е не вельмі спрыяльнае... Ды і не так жа лёгка і хутка можна прыслаць той самалёт...

— Без аперацыі — дзве ж аперацыі трэба! — ён да ночы нават не працягне.

— Спыніце паніку! Зараз жа! І выкіньце з галавы гэтае «не працягне»! Ясна?

Упершыню я бачу Твораж такой суровай. Яна загадала мне ні на хвілінку не пакідаць манташніка аднаго, а сама пабегла званіць у вобласць, і нечакана хутка змагла дазваніцца і аб усім дамовіцца.

Вярнулася і паведаміла ўжо сваім ранейшым знаёмым тонам:

— Можаце ісці паабедаць. Самалёт будзе ў пятнаццаць гадзін.

— Вы хочаце, каб я і суправаджала яго?

— Не, гэтага не спатрэбіцца. У іх будзе свой урач.

— Як у спешпі? Памятаеце, абяцалі, што будзе свой урач, а давялося ляцець.

— Ну і што? Паляціце зноў. Не, я думаю, што не давядзецца. Але на ўсякі выпадак трэба падрыхтавацца, збярыцеся. Ідзіце, ідзіце рыхтуйцеся!..

Намагаюся ісці па калідоры спакойна і ціха, спаважна, але ногі не слухаюцца мяне, саўладаць з сабою цяжка, і я, рыўком адчыніўшы дзверы на сваю куханьку, ўлятаю віхураю ў пакой.

Валера сядзіць ля стала, нават не пераапрануўся, не зняў бацінак, і на падлозе вакол іх нацякла лужынка — растаў снег. А ў руках — шапка; ён падчапіў яе пальцамі і гайдае, як маятнік, зірнуў на мяне і не змяніў паставы. Я не прыдала гэтаму аніякага значэння — стаміўся ж чалавек у дарозе! — абдымаю яго, цалую, прымошчваюся на Валеравых каленях.

— Дзе твае ваўкі, паляўнічы?

— У рукзаку. І не ваўкі, і толькі ў адзіночным ліку.

— Значыцца, дарэмна я цябе палохала. Не ваўкі, а драбната!

— Не сказаў бы. Белячок трапіў — першы гатунак. Ведаеш, сапраўды зайца ўпаляваў. Паставіў цяпер задачу сабе: на футра табе настраляю.

— Можа, ты мне яго і пакажаш? Не, лепей сама пагляджу!..

Заяц сапраўды ў рукзаку, і вялікі, але я не магу да яго дакрануцца. Як убачыла яго галаву, аж адхіснулася: вочы зайцавы адкрыты, як жывыя, і ў вачах тых, зусім як чалавечы, боль, скамянелы крык і адчай; і кроў на поўсці, і нейкі не зусім прыемны пах...

Здаецца, Валеру таксама не прынёс вялікага задавальнення паляўнічы трафей. Валераў твар азмрочаны, вакол губ збіраюцца тонкія зморшчынкі — злуе. І толькі тады, калі я бачу гэтыя зморшчынкі, я прыгадваю, дзеля чаго ён ездзіў у сельсавет, але не магу распытваць, чакаю, і ён сам нечакана прызнаецца мне:

— Марна толькі час патраціў. І таму што дурань. Выпіска з рашэння суда аб скасаванні таго шлюбу — гэта проста судовая паперка. Трэба яшчэ заплаціць грошы і атрымаць пасведчанне. І гэта, аказваецца, робіцца па месцы жыхарства. Толькі пасля гэтага можна будзе рэгістраваць наш шлюб.

— І з гэтага ты такі змрочны?

Ён паціснуў плячамі, а я спытала зноў:

— І болей нічога не здарылася?

— Ды не, здаецца... Ваўка яшчэ бачыў, але далекавата. І не ўтрымаўся — стрэліў. Ведаў, што дарма, але стрэліў...

— Ой, паляўнічы ты мой, паляўнічы,— я цалавала яго і смяялася.— Выкідай ты ўвесь клопат з галавы! Чуеш? Ты дома, і нікуды табе не трэба ехаць, і ніякія там насведчанні выпраўляць, толькі ўвагу адцягваеш і нервуешся марна. Навошта? Потым усё зробім, потым. Галоўнае зараз — твая праца. Ты павінен напісаць яе бліскуча. Каб усе былі задаволены, каб захапляліся. І каб захапляліся. І каб я магла сказаць табе: малайчына, Валера!

Ён схапіў мяне ў абдымкі, і я прытулілася да яго моцна, я адчувала ў сабе шмат сіл, моцы, я была ўпэўненая, што змагу ў любым выпадку яго падтрымаць, супакоіць.

— Ты хвалюешся,— сказаў ён.— У цябе не так, як звычайна, стукае сэрца. І вочы такія, быццам бяда якая здарылася...

— Прыключылася, Валерачка, бяда. Мантажніка прывезлі. Мажліва, памрэ... Выклікалі самалёт — аперацыі патрэбны складаныя. Павязуць у вобласць. Дарэчы, мне, мабыць, давядзецца ляцець разам з ім, калі не будзе абласнога ўрача. Вось гэта — бяда сапраўдная ў чалавека. А гэтая твая паперка сельсавецкая... Пакінем мы гэта, прашу цябе... Бедны Лукаш. Мабыць, яго і не давязуць...

— А хто вінаваты?

— Сам вінаваты. Пайшоў на заклад, што на адной назе пройдзе па страле апоры. Гэта ж такая вышыня! Так бяздумна зглуміць жыццё...

— Гэта той, што спяваў, калі мы былі ў іх?

— Ага, ён. А Раечцы цяперака будзе непрыемнасць. Могуць судзіць, бо яе ж двойчы папярэджвалі. Гэта ж элементарнае парушэнне правілаў па тэхніцы бяспекі...

— Я, між іншым, хацеў, калі назад варочаўся, да іх завярнуць. Але сюды спяшаўся. Ты ведаеш, палаяўся я ў сельсавеце... Потым ехаў, пра цябе думаў...

— Благое?

— Спрабаваў зразумець, за якія такія якасці і дабраты ты мяне гэтак кахаеш? Ты кахаеш мяне крэпка, я гэта ведаю, бачу...

— Гэта ты бачыш, а тое, што я магу паляцець на тым самалёце галодная, не заўважаеш, так?

— Я таксама галодны як воўк! На вячэру ў нас зайчына, Габінава паклічам. Як ты на гэта глядзіш?

— Калі не палячу — абавязкова. А зараз давай свініну «па-залеску» і боршч. Гэта ты ўсё на пліту паставіў? Ох, малайчына! Падзяка табе!

Я пацалавала яго, і мы селі абедаць, і гэта першы наш абед, калі мы мала гаворым і яшчэ меней жартуем.

Валера есць марудна, праўда, пахвальвае свініну — гэта Зіначка мяне навучыла так рыхтаваць свініну: спачатку абсмажыць крыху, потым перакласці ў каструльку разам са скарынкамі чорнага хлеба, дадаць спецыі розныя, і потым трэба, каб упрэла добра, у белым соусе, з цукрам, але я адчуваю, што ён устрывожаны, трымаецца неяк няпэўна, быццам у чымсь вінаваты; на абедзе, упершыню за гэтыя дні нашага жыцця тут, ён не ідзе разам са мною на куханьку, а застаецца сядзець ля стала, курыць, сядзіць нерухома, сагнуўшыся, нават не звярнуў спачатку ўвагі, што я зноў увайшла.

У гэткай узрушанасці я яшчэ Валеру не бачыла. Зрэшты, ён заўважыў мяне, узняўся, паклаў папяросу ў попельнічку.

— Трэба ж давесці да ладу гэтага беляка. Спатрэбіцца дошчачка, каб шкурку пацягнуць.

— Паглядзі за плітою. Ля сцяны там. Падыдуць, мабыць. А я тым часам чамаданчык спакую. Калі ляцець — толькі заўтра вернешся. А мо машына якая-небудзь надарыцца...

— Проці ночы ў машыне? Лепей у гасцініцы пераначуй...

Валера ўзнімае рукзак, але стаіць на месцы, быццам вагаючыся, ці варта яму ісці і нешта рабіць. Пакутуе. Пакутуе і хоча ўтоіць ад мяне сваю разгубленасць, схаваць яе за будзённым паляўнічым клопатам, і гэтыя яго намаганні — не трывожыць мяне, не турбаваць залішне — расчулілі незвычайна.

Эх, Валера, Валера!

Нейкая маленькая няўдача, нейкае насведчанне, якое мы не зможам афарміць у нейкі пэўны час, гэтак выбілі цябе з раўнавагі! А хіба ж гэта бяда? Хіба гэта сапраўднае выпрабаванне і для нашага сяброўства і для нашага кахання?.. Сапраўдная бяда яшчэ пастукаецца ў нашыя дзверы, пастукаецца абавязкова, і няхай хто хоча пацвельваецца, маўляў, прадчуванні нейкія там, але я разумею, што гладкім жыццё ў чалавека не можа быць, у мяне, у прыватнасці, у мяне і Валеры не будзе... І гэта, мабыць, даволі сумна, калі ўсё гладка, як дошка!..

Расце, накатваецца грукат матора. Самалёт! Шыбы звіняць, быццам вось-вось развалянца на дробныя кавалачкі. І ўвесь гэты клопат наш з Валерам, усе гэтыя трывогі, якія Валера сам напрыдумляў дарогаю, адлятаюць.

— Пойдзем разам,— прапануе Валера.— Можа, што дапамагчы давядзецца...

— Нічога не трэба. Заставайся. Перамёрз на лыжах гэтак. Не хапала, каб яшчэ ветрам на возеры прапесла. О! Урач з лётчыкам! Значыцца, не трэба будзе ляцець! Чакай мяне, я хутка вярнуся!..

Самалёт сеў на возера і падруліў да самай сцежкі, што вядзе ў пасёлак. Твораж таксама ўзрадавалася, што прыляцеў з вобласці ўрач і мяне не трэба пасылаць, пагадзілася нават адправіць у абласную бальніцу хворую дачку Данілюк.

Ля самалёта адбылося амаль неверагоднае: у лётчыку, які вылез з самалёта і чакаў нас на сцежцы, я пазнала лейтэнанта, з якім мы ехалі разам у цягніку ў мінулым годзе. Сваім вачам не адразу паверыла, і ён таксама быў узрадаваны незвычайна, сумеўся нечага, са шчырым шкадаваннем прызнаўся:

— Дык вы тут? А я вас зусім у іншым месцы шукаў!

— Яно ж звычайна так: шукаеш там, дзе няма.

— Сапраўды! І сяброўка ваша, як я разумею, тут таксама?

— Сяброўка далёка! У Маскву заляцела!

— Фю-юююю! Да прафесара якога-небудзь сівенькага, як я разумею...

— Амаль што!

— А вы што ж адстаеце і курс на сталіцу не ўзялі?

— Возера прывабіла.

— І мне яно па душы. Тройчы мы тут увосень рыбалілі. І чаму я вас тут не стрэў?

— На паплаўкі, мабыць, увесь час глядзелі!

— Не было патрэбы: зусім жа не клявала. Усе тры разы не клявала. Болей і не ездзілі. Ну, цяпер я ў вас — часты госць!..

І калі роў матор, і нас з Твораж і Габінавым, хоць мы і стаялі ўжо далёка, закідвала снегавым пылам, і пазней, калі самалёт рабіў развітальны круг, і яшчэ пазней, калі ён знік за лесам і мы ўсе разам вярталіся ў бальніцу, у маіх вушах гучаў гэты вясёлы голас лётчыка, голас чалавека незвычайна ўзрадаванага, але і крыху збянтэжанага і разгубленага. І раптам разгубілася сама. Як жа яго прозвішча?

І імя? Не ў памяці! Намагалася, імкнулася прыгадаць, нешта вельмі блізкае і вядомае круцілася ў думках, але сапраўднае прозвішча так і не прыгадала. Нават смяялася — невядома з якой прычыны зрабілася весела.

Пра гэтую сустрэчу Валеру не расказала. Хацела расказаць, расказаць у тоне жартаўлівым і вясёлым, але сама дзівілася, што адбылося са мною. Увайшла, а Валера на кухні, у майцы, без кашулі, цвічкі ў вуснах зацiснуты, а ў руках шкурка беляка, вывернутая, нацягнутая на дошчачку, завостраную з аднаго канца. І на тым канцы, дзе галава беляка, чорныя дзве адтуліны замест вачэй, і поўсць з іх акрываўленая тырчыць, і рукі Валеры ў крыві, і ён голымі рукамі цвічкі з губ бярэ і тронкам нажа ў дошку — загапяе — «тук», «тук»... І зноў бярэ цвічок пальцамі, на якіх засохла кроў, і зноў гэтакае мяккае «тук», «тук», быццам у жывое цела цвічкі гоніць. А на стале, у місе, пакроеныя на кавалкі бяляк.

Не першы раз бачу гэта, ведаю, што трэба цвічкі загнаць у дошку, каб шкурка не скурчылася, калі пачне сохнуць, ведаю, што і без крыві зайца не пакроіш, а тут як мне што завадзіла: яшчэ крышку і ванітаваць пачне. Ці, можа, гэта пах такі ад зайца — не ведаю. Але тое, што хацела расказаць Валеру, з галавы як ветрам выдзьмула.

— Паляцеў самалёт? — спытаў Валера і паклаў дошчачку з нацягнутай шкуркаю беляка ў куток за пліту, пачаў мыць рукі.

— Паляцеў,— сказала я.

— І мантажніка адправілі?

— Так, адправілі. І яшчэ там адзін хворы. Дзяўчынка. Таксама паляцела...

Размаўляла, адказвала, а на душы неспакой. Нашошта спытаў, чуў жа, што самалёт паляцеў, дый з акна відаць жа возера? Проста спытаў, як адчэпнае, каб нешта сказаць, бо думаў жа ён, відаць, пра іншае. Але вось ён паклаў дошчачку са шкуркаю ў куток, падышоў да мяне, глядзеў устрывожана, і гэты пакутлівы выраз яго вачэй расчуліў мяне; і тое «іншае», пра якое, як мне здалося, думаў Валера, болей ужо не іспавала, і я кінулася да яго, сама напалохаўшыся гэтых міжвольных і мімалётных сваіх думак.

Увечары мы пайшлі з Валерам у клуб, глядзелі новы фільм, які нам не спадабаўся, і мы пра яго адразу ж забыліся, як толькі выйшлі на вуліцу пасёлка.

Амаль ва ўсіх дамах свяціліся размаляваныя марозам вокны, і грабяні снегавых гурбаў у палісадніках зіхацелі,

і аснежаныя стрэхі некаторых дамоў крапаліся гэтых грабянёў, і здавалася, што будынкі закручаны ў белую вату і толькі ёсць гэтыя светлыя адтуліны, і Валера дзівіўся, і быў настроены дужа весела і летуценна.

— А хораша як тут! Хораша! Вельмі падабаецца,— прызнаўся ён, і гэта я пачула ад яго ўпершыню; ён і раней, здаралася, казаў пра нашыя мясціны добразычліва, але вось такой узнёсласці ў яго я раней не заўважала.— Нават і не хочацца ехаць. І калі гэтая мая праца скончыцца, я папрашу адпачынак. Да вясны, адным словам...

Хацелася закрычаць ад радасці, але я толькі сціснула яго руку, утаймавала — божухна, аказваецца, я павучылася кіраваць сваімі парываннямі! — гэтае жаданне, сказала хопаспешліва, баючыся, што стрыманасці мае непадоўга хопіць.

— Ой, я ж забылася сказаць табе. Нам жа кватэру ў канцы месяца дадуць! У новым доме! Бачыў чатыры дамы, што будуюцца па беразе? Цагляныя, з усімі выгодамі. Сучасныя гарадскія кватэры, адным словам. Хадзем, я табе пакажу. Гэта ў першым, па саменькім беразе...

— А каму ж наш пакой у бальніцы?

— Нікому. Там пературбацыя страшэнная будзе. Пераборку, куханьку — далоў! Рэнтгенаўскі кабінет абсталююць. У чэрвені атрымліваем найноўшае абсталяванне, гэта мне Твораж сказала. А Габінаў хутка паедзе на спецыялізацыю. Ён жа рэнтгенолаг... Скажы, а калі ты намысліў гэта? Ну, свой адпачынак...

Валера нейкі задуменны, быццам чуе і не чуе мяне, і тое, што я кажу, яму не зусім цікава, і ён ніяк не рэагуе, чаму гэта я толькі сёння кажу пра той кабінет, і я чакаю, што ж ён мне адкажа, і ён пачынае гаварыць, і гаворыць зусім не тое, чаго я чакаю.

— Ты ведаеш, я табе даўно хацеў сказаць... Толькі не ведаю нават і цяпер, ці трэба... І ты, калі ласка, без іроніі, паспрабуй зразумець, што гэта вельмі важная патрэба, і я трымаю яе ў тайне...

Страхатлівае ўзрушэнне апаноўвае мяне; мне мроіцца нейкая бяда, якая прыйдзе зараз, за гэтым вось Валеравым прызнаннем, і гэта бяда тычыцца нашага агульнага жыцця, нашых планаў, нашае будучыні. «Тоўх-тоўх-тоўх...» Гэта — маё сэрца...

— Я некалі пісаў вершы,— гаворыць Валера.— І пісаў зусім нядаўна. У Ратамцы... Тады ты паехала, а я застаўся на пероне. Помніш? Я вярнуўся ў свой закутак, і не спаў

да раніцы, і думаў аб табе, і пісаў, пісаў... Адзіны чалавек, якому я паказаў вершы — Сцяпан. Але ён закрэсліў амаль... Не, усё літаральна закрэсліў, пакінуў толькі адзін верш і сказаў, што можна паслаць у газету ці часопіс...

— Я павінна пацалаваць цябе за гэта,— мне сапраўды хочацца цалаваць Валеру, мне смешна з мае нядаўняе трывогі.— Ты пачытаеш мне свае вершы? Усё да апошняга радка. І ніколі не будзеш слухацца Сцяпана! Знайшоўся мне аўтарытэт!

— Сцяпан быў бязлітасны, магчыма, яно і правільна. Цяпер я не пішу вершы. Цяпер я проста пішу ўсё тое, што бачу, што адчуваю...

— Чакай, увесь гэты час ты, значыцца, не працаваў над дысертацыяй?

— Працаваў. І працую. Дысертацыя ідзе сама па сабе, гэта мая праграма, тут адступленняў няма і не можа быць... Але тут, у Залессі, мне адкрыўся незнаёмы раней свет, зусім новы свет. Гэта ж ты, здаецца, неяк мне сказала, што каханне робіць людзей празарліўцамі... Нешта такое адбываецца і са мною... Габінаў... Зіначка... Лукаш... А Мацяш!.. І твая гэта праца, і тое, што ты працуеш значна больш, чым трэба, і не заўважаеш гэтага, і шмат другіх людзей, з якімі я страчаюся тут, і іх думкі, словы, жарты... Вось я пра гэта і пішу. Магчыма, гэта ўсё не больш, як дзіцячы наіў. Не ведаю. Але тое, што я ўбачыў тут: і гэтыя снягі ўпоравень са стрэхамі, і лясы, і гэтая цішыня, і гаючы для мяне аптымізм людзей, вера ў неабходнасць таго, што яны робяць... Усё гэта, як казачнае дзіва, у якім табе — першая роля. І мне здаецца, што я пішу нешта вартае ўвагі...

— Дасі мне пачытаць?

— Адразу ж, як толькі скончу. Абавязкова. Толькі ты ў мяне ні пра што больш не распытвай, быццам я нічога табе і не расказваў, няхай усё так і ідзе, як ішло. Згода?

— Згода. Але ўмова: больш ад мяне ты нічога не ўтойвай. Нічога! Калі што якое здарыцца, адразу ж і кажы. Не рабі ніякіх таямніц!

— А ў мяне іх няма. І не будзе. Я ўвогуле лічу: калі што тоіш ад сябра — гэта падман, здрада. Быць разам, ведаць, што табе давяраюць ва ўсім, на цябе спадзяюцца,— і нешта хаваць?.. Здрада найгоршая!.. І калі раптам пачнеш кахаць каго-небудзь другога, скажы мне адразу ж. Толькі не падманвай.

— Ой, які ж ты дурны!

— Можа. Але вось ты доўга затрымліваешся ў бальні-

цы, ці поччу там дзяжурыш... Ноччу, калі цябе няма, я абавязкова прачынаюся, і ляжу, і думаю, і мне мроіцца, што ты не адна, побач з табою нехта мне невядомы, і ты гаворыш з ім, жартуеш...

— Слухай, Атэла! І ты можаш такое казаць?

— А ты ж кажаш мне часам пра нейкія там свае прадчуванні. Я пацвельваюся, а ў душы — знак...

— Няхай табе будзе і яшчэ дзесяць знакаў!.. І па чарзе. Спачатку — першы!

Я цалую Валеру, і мы рагочам, і спыняемся, і глядзім на неба, шукаем Палярную зорку. Валера дзівіць мяне: ведае шмат сузор'яў, з прыгожымі загадкавымі назвамі, і паказвае мне іх абрысы, але я слаба разбіраюся ў зорных россыпах на чорнай высі і не вельмі намагаюся, каб засталося ў памяці, дзе і якая зорка.

Мне належаць усе яны, усе зоркі начнога неба. Мне належыць цішыня ночы, рыпенне снегу пад нашымі нагамі, належыць марозны вецер, што дзьме ад возера, належаць думкі Валеры і належыць ён сам, я адчуваю сябе гаспадыняю гэтага незлічонага і неацэннага багацця, і мяне нічога не трывожыць, нічога не турбуе...

## 13

Месяц вялікі, рудавата-белы. Увечары яго не было, цяпер, бліжэй да поўначы, хмары разарвала ветрам, яны імчацца па небе, насоўваюцца час ад часу на месяц, і ў пакоі то святлее, то робіцца цямней, і ад гэтага ўсё зыбаецца, бы плыве.

Валера ляжыць на ложку, а я сяджу побач, і на мне доўгая, аж да пятак, кашуля, і гляджу на яго твар, і бачу: то пасвятлее, то пацямнее, і вочы губляюць свой бляск, бы яшчэ глыбей праваньваюцца ў вачніцы — быццам аддаляюцца, аддаляюцца вочы Валеры.

Але ведаю: гэта толькі здаецца, і не трывожуся. Гляджу на яго і маўчу: вельмі мне падабаецца глядзець гэтак на яго — схіліцца над ім, звёўшы свае рукі ў яго над галавою. Пасядзіш так крышку, а потым нырк пад коўдру, а там — цеплыня Валеравых рук, пяшчота, сонечнае папаўзабыццё.

Валера накідвае коўдру на мае плечы, пытаецца, чаго я не кладуся. А я жартую: не люблю, маўляў, класціся ў халодныя прасціны.

— Сагрэй, сагрэй крышку пасцельку. Я, ведаеш, без

цябе, калі холадна дужа было — прас уключала і пад коўдру клала. Нагрэецца пасцель — тады і кладуся.

— Значыцца, я замест праса?

— Ты разумны, а гаворыш глупства.

— Высокая адзнака. Але лепей кладзіся. Не цёпла ў кватэры. Во якія плечы азяблыя!

— Паспею. Сагрэюся. Хачу бачыць твой твар. І вочы.

— Кладзіся пад коўдру і будзеш бачыць.

— Не, не тое!

— Застудзішся, тады будзе табе «не тое»!

— Можа, мне і хочацца схапіць прастуду і памерці. Адкуль ты ведаеш?.. У дзяцінстве ў мяне такое было. На мяне мама насварыцца, а я сяду ў куток і мару: вось, маўляў, буду сядзець тут, на халоднай падлозе, захварэю, памру, і будзеце тады плакаць — сагразіць думала. Татка мяне разумеў, ён звычайна падыдзе, за руку возьме, на крэсла пасадзіць і казку пачне расказваць...

— Бацька калі дамоў вернецца?

— Ой, не вельмі хутка! Яго яшчэ на тры месяцы пакінулі там, на Асуане... Хіба я табе гэта не казала?

— Казала. Але замоўчала іншае: чаму хочаш сагразіць мне? Гэта ж твая «прастуда» не проста прыгадалася... Нешта цябе трывожыць. А сказаць не адважваешся.

— Які празарлівец!

— Каханне робіць людзей празарлівымі. Заўсёды.

— Альбо сляпымі.

— Дык адкажаш?

— Не, я спытаць хачу... Два пытанні ў мяне вось ужо які дзень жывуць... Толькі без крыўды каб... Скажы, ты сваю жонку, тую, першую, прыгадваеш?..

Спытала і спахапілася: навошта? Нельга было, нельга было яго пра тое пытаць! І ведала ж, разумела, а вось жа як знарок, як нячысцік які ва мне заварушыўся, узяла і папытала.

— Прыгадваю,— адказаў Валера спакойным дужа тонам, і мне крыху палегчала.— І часам здаецца мне, што не заўсёды быў справядлівы да яе, вінаваты нават. Вінаваты ў тым, што не здолеў яе навучыць жыць інакай... І скажу табе шчыра: гэтыя ўспаміны абуджаюць ува мне і пачуццё гідкасці... І яшчэ я цябе хачу папрасіць: ніколі, ніколі не чапай тое мінулае. Абяцаеш?.. А цяпер — другое тваё пытанне. У цябе ж іх было два.

— Так, два. Пра дачку хацела папытаць. Любіш яе, ведаю, і гэта правільна. А раптам захочаш да іх вярнуцца?

— А ты б мяне адпусціла?

— Не ведаю. Каб убачыла, што наша жыццё — пакуты табе... Не вагалася б у такім выпадку... Абстракцыя, вядома. А што б было па справе — не ведаю... Магчыма, я б узяла і забіла...

— Каго? Мяне?

— А каго ж яшчэ!

Нейкі міг быў — хацела пахваліцца, сказаць пра Бабіча, якога ледзьве не забіла. І не сказала. І што ўтрымала мяне — не ведаю. Не сорам, не, а нейкае іншае пачуццё, і я сама сабе раптам зрабілася гідкай. Як жа гэта можна? Кахаць і нешта ўтойваць? Утойваць ад чалавека, якога кахаеш, якому давяраеш ва ўсім? Як гэта? Пра такое мне раней не думалася, не ўяўлялася нават, што такое магчыма...

— Не, я не памыліўся: ты — вялікі цуд! А тое, што цябе трывожыць, гэта міф, ілюзія, гэта ніколі не можа здарыцца. Не можа, бо ты — вялікі цуд!

— Занадта нахвальваць жанчыну небяспечна. А ты ўжо колькі разоў кажаш пра гэты цуд. А я — звычайная жанчына. І таму я хачу папрасіць цябе, толькі вось не ведаю, як лепей... Увогуле... Няхай твая дачка лічыць наш дом сваім домам. Разумееш? Ну, зусім сваім...

— Дзякую табе...

— Даруй, можа, я не тое зусім кажу? Можа, мне лепей было пра ўсе гэтыя свае думкі маўчаць? Але калі ты побач... Вось ты прыехаў, і я ўжо не я, а нейкая вар'ятка...

— Ты яшчэ зусім не ведаеш, якая ты слаўная жанчына. Адно не магу сцяміць: як мне ўдалося знайсці цябе?

— Гэта я сама цябе знайшла. Толькі не ведаю, на шчасце ці на бяду... Ты вось на паляванне едзеш, мяне жах бярэ, нешта прыгнятае ўвесь час, нечага баюся. Прадчуванні мяне мучаць тады. Нядобрыя прадчуванні...

— Смеху варта. Урач, а верыць у нейкую лухту!

— А можа б, ты не хадзіў на гэтыя свае паляванні?

— Не магу. Футра павінна быць! А ёсць яшчэ толькі рукавы і адно крысо.

— Мне зайцоў шкада. Не магу глядзець, калі ты іх прыносіш. Мёртвыя, а ў вачах боль, жах, непазбежнасць...

— Я і за гэта цябе кахаю.

— А слаўна, што мы адны, праўда? Гэта проста выключна, што мне кватэру далі ў гэтым катэджы.

— Не кватэра галоўнае, нам і там было добра.

— Тут лепей. Тут крышку далей бальніца, і гэта мне

падабаецца. Імчу з работы ведаеш як? Вецер не дагоніць. Ух, як жа гэта здорава: імчыш дамоў і ведаеш — там цябе чакаюць. Раней гэтага не адчувалася: праца і жытло пад адным дахам... А ўлетку тут будзе, як у раі, ускочыў — і ў возера. Ба-абух!

— Улетку мы будзем на Дзвіне. Лавіць рыбу, загараць. Ты ведаеш, мне Дзвіна ўсё часцей і часцей сніцца. А табе?

— Я ж там не была.

— А ты вось падумай — і сасніцца. Я цябе пацалую, потым будзем спаць, а ранкам раскажам, каму і што прыснілася. Дамовіліся? Спі!..

— А я ўжо засынаю...

Мая галава ў яго на грудзях. Валера трымае мяне за плечы, і я адчуваю, як яго рука пакрысе слабее, а потым сутаргава ўздрыгвае, ён засынае. Слухаю яго спакойнае дыханне, а сама аніяк не магу заснуць — хочацца есці. Вячэралі, здаецца ж, няблага: і тварог быў, каўбаса сялянская, халодная, смажаная, у белым азярку шмальцу, Валера вельмі любіць такую каўбасу, і яшчэ бліноў я напякла. А вось цяпер есці хочацца, аж сліна ў роце.

Чым больш пераконваю сябе, што сытая, што не трэба мне нічога есці, тым мацнее жаданне з'есці хоць кавалачак адтэтай каўбасы ў шмальцы. Не вытрывала. Асцярожна адвяла Валераву руку, ён нешта мармытнуў скрозь сон, але не прачнуўся, і я, намацаўшы рукою халат на крэсле, узнялася.

Стаю ля стала, ем каўбасу з чорным хлебам, а цяпер яна не такая ўжо і смачная, як была ў маім уяўленні, і запіваю цёплым яшчэ чаем, і бачу, як сцямнела раптоўна за акном,— мабыць, хмара закрыла месяц — і як быццам адсунуўся, аддаліўся ложак, на якім спіць Валера, і мне хочацца хутчэй да яго, і я стаўлю шклянку з чаем на стол, і, жуючы каўбасу, асцярожненька западаю зноў пад коўдру.

Стаяла басанож на халоднай падлозе, ззябла, а Валера гарачы-гарачы, і ён не чуе, што я ў пасцелі, толькі сказаў штось скрозь сон, прыгарнуў мяне да сябе і носам сіпкае, як малое дзіця, і я адразу ж сагрэлася, і саплівасць наваліласся, але я не зусім яшчэ заснула, і бачу дзіўныя малюнкі, і не магу даўмецца, сон гэта ці ява.

Іду, мроіцца мне, па вуліцы, горад мне незнаёмы, але крочу ўпэўнена, бо наперадзе Валера і, нібыта малую, вядзе мяне за руку. І з кожным крокам усё больш знаёмай робіцца вуліца, і мы падыходзім да лёгкай драўлянай тэ-

раскі, жоўтай, з белай ліштваю, і на гэтай тэрасе вісяць, нараскладаны футры розных колераў і памераў; шмат людзей на тэрасе, але ўсе яны быццам аддалены, а наперадзе маці з малой дачкою, і падспешвае малую, моліць і просіць, быццам гэта не малое дзяўчо, а сталая паважная жанчына:

— Дык на чым мы з вамі спынімся? Можа, варта напытаць Галіну Сямёнаўну? Скажыце, калі ласка, гэта мы можам набыць? Здаецца, зусім прыстойнае, і ёй падыходзіць...

— Безумоўна,— пагаджаюся адразу ж я і пачынаю бянтэжыцца пад уважным позіркам дзяўчынкі. У дзяўчынкі светлыя, як у лялькі, кучаравенькія валасы і ярка-зялёны бант на макаўцы. Дзяўчынка дужа знаёмая. Але дзе я магла бачыць яе?

— Пакуль вас не было — у нас лад, мірна ўсё ішло, мы з ёю амаль і дамовіліся. А вас убачыла — упарціцца пачала, зусім непаслухмяная зрабілася. Выбралі футра, грошы заплацілі, а яна цяпер просіць іншае, просіць, каб вы параілі. Вы абавязкова ёй скажыце, загадайце, каб слухалася мяне...

Загадаць? Якое я маю права? І Валера маўчыць. Нічога не гаворыць. Павярнулася, каб спытаць, чаго маўчыць ён, а яго ўжо ля мяне няма, Валера ўжо далёка, бяжыць па чыгуначным насыпе, а насустрач яму імчыць зялёная яшчарка — электрычка; выпаўзла яна з-за павароткі, а набліжаецца бязгучна. І дзяўчынка паказвае ручкаю на гэтую яшчарку, і тут жа здагадка ва мне, як маланка: гэта ж дачка Валеры! І жонка яго! Так, так... Гэта ж я бачыла іх на фотаздымку, які паказвала мне Валерава цётка!..

Чаму вы не загадаеце ёй, Галіна Сямёнаўна?

Пытанне патрабавальнае, як на допыце. Я бачу ў вачах жанчыны і асуджэнне, і дакор, і знявагу. Але голас яе дужа ціхі, прыглушаны, а толькі гучна бумкаюць на шпалах Валеравы бацінкі, і ўсё грамчэй, грамчэй, і электрычка ўжо спынілася, а Валера бяжыць да мяне, і я чую яго голас, і ўсё знікае, і толькі голас Валеры, і гэты голас — рэальны:

— Да нас стукаюць. Нехта стукае да нас. Чуеш?

Цяпер я ўжо сама чую, што стукаюць у акно, разумею ясна, што прыснілася мне і дзяўчынка, і маці яе, і электрычка, што ў бальніцы нешта здарылася.

Голас Маццяш, якой я адкрываю дзверы, блытаны, устрывожаны — зразумець што-небудзь наўнас цяжка.

— Чалавека прывезлі. Увесь у крыві. Зіначка там адна. Перапалохалася, нічога зрабіць не можа...

Дрыжыкі паўзуць у мяне па спіне. І ад таго, вядома,

што паведаміла Маццяш, але яшчэ болей ад перажытага хвалявання, перажытага там, на вуліцы горада, які не існуе ў сапраўднасці, і дзе, вядома ж, я не была аніколі...

У бальніцы мяне чакае Зіначка. Я ўвайшла, і яна кінулася мне насустрач, вінавата заўсміхалася:

— Ой, сорамна мне дужа, не трэба было вас і клікаць. Кінамеханіка нашага прывезлі. Увесь у крыві. І не дыхае, як здалося. А потым агледзела — гарэлкі нерапіў, тварам недзе бразнуўся. І на холадзе ляжаў, з таго і халодны. Нічога, ажыў, як нашатыркі дала. І раны апрацавала, драпінкі, драбяза...

— А дзе ён цяпер?

— Дрыхне, п'яніца няшчасны,— гаворыць Зіначка, і твар яе імгненна змяняецца, губы злосна падціскаюцца, потым уздрыгваюць, і на іх стыне пагардлівая грымаса.

Выходжу з бальніцы. Ад марознага паветра аж суха ў роце. Ускрай возера, за чорным голлем алешын, бачу мядзяную кропачку святла — наша акно! І ўжо не магу спакойна ісці, імчу з усяе моцы туды, у наш дом, да гэтага святла, да Валеры!..

Валера на ложку, але не спіць, і я гэта бачу, калі заглядваю ў размаляванае марозам акно. Але што ж ён робіць? Падушкі за спіною, на крэсле ля ложка настольная лямпа, на падлозе ад яе светлае кола; і вось у гэтае яркае кола лягла яшчэ адна вузкая папера — гэта Валера хацеў пакласці напісаны аркушок побач з лямпаю, а ён зваліўся на падлогу.

Піша!

Пасля таго як Валера прызнаўся мне, што пісаў вершы і намысліў зараз напісаць нейкую кнігу, у нас з ім болей пра тое гаворкі не было. Больш таго: раней я бачыла яго за сталом, часам рыхтую снеданне, а ён ужо сядзіць і піша, гэта было, калі ён працаваў над дысертацыяй. Але апошнім часам я ўвогуле не бачыла ў Валеравых руках алоўка, ён пісаў толькі алоўкам чамусьці.

Зараз ён з алоўкам, і піша хутка-хутка, потым прыціскае аловак да губ, глядзіць на акно, і мне здаецца, што ён заўважыў мяне. Не! Ён не бачыць мяне, не можа бачыць: калі ў пакоі гарыць святло, што за акном робіцца — не відно. А я бачу яго добра: схмурнелыя бровы, нейкія доўгія пальцы, у якіх заціснуты аловак, а сам аловак кароценькі, і ён яго круціць у пальцах, быццам узважвае, потым прыціскае да губ, потым паківае ім, быццам грозіць камусьці, і пачынае хуценька-хуценька пісаць.

І я не хачу яму перашкаджаць, бо ведаю, што ён, пачуўшы мае крокі, схавае аловак, схавае паперу. Няхай піша!

Прайшла раз ля дома, другі... Змерзла. Зноў зазірнула ў акно, і ў гэты ж самы момант, як гляджу на яго, ён адкладвае і паперу, і аловак, і працягвае рукі, бы выпроствае іх насустрач мне, і губы яго варушацца, і мне здаецца, што Валера кліча мяне, і ўжо не магу заставацца ля акна і ляту дамоў.

Саджуся на ложак, Валера цалуе мяне, вохкае:

— А ты ўсё яшчэ пахнеш лекамі. Там мне здавалася, што гэта таму, што бальніца пад адным дахам. Але тут дом новы, а ўсё роўна — пах лекаў. Такое адчуванне — быццам па-ранейшаму жывём пад бальнічным дахам.

— Хіба нам блага было там?

— А тут яшчэ лепей. І таму павінен я цябе разы тры пацалаваць.

— Ты проста неўтаймоўны. Учора ж дамовіліся: сёння — выхадны дзень!

— Выхадныя дні ў нас будуць, калі састарэю. Тады кожны дзень — выхадны. І я зраблюся зусім спакойны. Увечары забяруся пад коўдру і да раніцы не зварухнуся і цалаваць цябе не буду.

— Цудоўная перспектыва ў мяне!

Ён цалуе мяне, і я гляджу на яго твар і адчуваю, як тумаціць галаў пяшчота, з якою я не магу саўладаць і не хачу змагацца. Як я кахаю Валеру! Я буду кахаць яго заўсёды, і заўсёды маё жыццё будзе належаць яму. Што ён пажадае — зраблю. Буду берагчы яго ад гора і бяды, ад турбот, усіх сумненняў... Але адкуль, якія сумненні могуць быць? Іх не было, іх няма, іх не можа быць, калі мы разам, калі нам хочацца пяшчоты і цяпла.

Кахаць!

Які ж гэта цуд дадзены чалавеку!

Кахаць!..

Кідаюся да Валеры ў абдымкі, і свет болей, ніякі будзённы свет, ужо не існуе больш для мяне...

## 14

Валера зрабіўся сапраўдным паляўнічым. Кожную пятніцу, а бывае, што і два ці тры разы на тыдні, ён бярэ стрэльбу і выпраўляецца з хаты на цэлы дзень. Вельмі ча-

ста з ім ідзе і Генадзь Валяк. І не было яшчэ выпадку, каб з пустымі рукамі ён вяртаўся: ці двух, ці трох зайцоў яны ўпалююць абавязкова.

Па суботніх жа і нядзельных вечарах у нас наладжваюцца, як кажа Габінаў, «зайчатнікі», і тады нашу кватэру не пазнаць: ні цішыні, ні спакою, толькі жарты, смех, песні, роў магнітафона. Звычайна акрамя Габінава прыходзіць Генадзь Валяк з Раяй, Зіначка з мужам, Карабань. Некалькі разоў была і Твораж. На стале акрамя смажаных зайцоў — сухое віно, вядома.

Напачатку мне гэта было ўсё даспадобы: і гамана, і спевы, і розныя гісторыі; падабалася, як усе слухаюць галасы зімовага лесу і песні «Песняроў» — усе гэтыя запісы на стужку мы зрабілі разам з Валерам; падабалася частаваць нашых гасцей, падабалася чуць, як усе пахвальваюць смачную зайчаціну; падабалася глядзець, як Генадзь набівае табакаю люльку, якую потым увесь вечар амаль не выпускае з зубоў; падабалася нават, што ў кватэры ажно назаўтра пасля «зайчатніка» трымаецца пах табакі.

Але неўзабаве я стамілася. Стамілася смажыць зайцоў, стамілася прыбіраць посуд пасля таго, як усе разыдуцца, і ўся гэтая вясёлая бязладная гамана пачала мяне раздражняць; асабліва тое, як хто-небудзь на свой густ перарабляў маю любімую «Александрыну» і спяваў фальшыва, нядобра; з кожным вечарам усё меней было арыгінальных гісторый, паўтарэнні пачаліся, з'явіўся нават трафарэт слоў, жартаў, паводзін, рытуалу; ведала, што Валяк закаханы ў Раю, і было непрыемна бачыць, што яна больш гаворыць з Габінавым і Валерам, а ён сумуе ў кутку.

А сёння мне гэта асабліва кінулася ў вочы. Я намысліла падвесяліць Генадзя, падсела да яго, але ён набычыўся, гаварыў са мною не дужа ветліва, і гэта мяне непрыемна ўразіла, а потым пачало раздражняць. Я, як гаспадыня, павінна ўсім дагадзіць! А чаму? І няўжо Валера гэтага нічога не заўважае? Не, не заўважае.

І менавіта гэта, апошняе, мяне раздражняла больш ад усяго. Ледзьве дачакалася, пакуль усе разышліся. Валера пачаў дапамагаць мне наводзіць парадак у кватэры, і я сказала яму:

— Трэба табе кідаць гэтае паляванне.

— Бачыш? Пачаліся ўзаемныя папрокі. І не першы раз ужо. І яны мяне крыўдзяць.

— Не сярдуй. Наша — заўсёды наша!

Ён узняў мяне, насіў на руках, люляў, як малое дзіця, і я гладзіла яго валасы, і раптам заўважыла, што каўнер яго світэра вельмі ж забрудзіўся.

— Табе цяжка. Пусці. І здымай свой світэр. Я намыю яго.

— Зараз? Ды ўжо дванаццатая гадзіна!

— І яшчэ каўбойку за адным разам ужо. Дзе яна?

— Вісіць на кухні. Ды заўтра паспееш!

— У мае жаночыя справы ты не лезь. Табе загадана? Давай сюды світэр!..

Я настаяла на сваім, мне трэба было супакоіцца. Я нават не ведаю, чаго мне так карцела пачынаць тое мыццё супроць ночы.

Намыўшы світэр, узялася за каўбойку. У кішэньцы ляжаў невялічкі блакноцік, і я не адразу заўважыла яго, і ён шмякнуўся на падлогу.

Шмякнуўся і раскрыўся.

У блакноціку, за цалафанавай вокладкаю, была фотакартка. Зірнула і пазнала адразу — Валерава дачка! Дзяўчынка была ў той жа сукеначцы, што і там, на той фотакартцы, якую паказвала мне Валерава цётка. Але чаму ж такая вузенькая фотакартка? А-аа. Гэта ж ён разрэзаў той здымак: пакінуў толькі дачку!..

Боль узнік у сэрцы раптоўна, і быў ён рэзкі, як удар, і тут жа знік, але сэрца тукала глуха і ўстрывожана. Ён помніць! Ён кахае! І тут, уласна кажучы, няма чаго дзівіцца: яго ж уласная дачка, не чужая!..

Я глядзела на дзяўчынку ў белай сукеначцы, з белым зайкам у руках, і бачыла іх усіх трох. Бачыла нават больш выразна, чым там, на той фотакартцы. Яны нібыта прыйшлі сюды, на кухню, сталі перада мною, маўклівыя і нерухомыя, і іх бачыў толькі мой растрывожаны розум, і я адчула, што на шчоках у мяне цякуць слёзы.

З яснасцю, якая ніколі не прыходзіла да мяне, я зразумела: Валера ніколі не зможа забыцца на мінулае! Не зможа закрэсліць яго! Фотакартку ён разрэзаў на тры часткі, адну носіць з сабою, а дзе астатнія, магчыма, выкінуў. А можа, нікуды і не выкідаў, а проста пакінуў там, у Ратамцы, і ён не раз і не два глядзеў на тую разрэзаную фотакартку, і прыгадваў мінулае, і я не ведаю пра тое, а толькі магу здагадвацца. Але адно я ведаю цяпер цвёрда: няхай ён на дзесяць частак падзярэ тую фотакартку, яна ў сэрцы яго будзе жыць увесь час, будзе існаваць насуперак маім жаданням, і я нічога не змагу зрабіць з гэтым, нават

больш, ведаючы, я змушана буду маўчаць, каб не трывожыць Валеру...

Я заўсёды баялася гэтых думак. Яны прыгняталі і палохалі, разбуралі маю веру ў правільнасць таго, што я рабіла і раблю, нараджалі сумненні, і з гэтымі сумненнямі я цяпер нічога не змагу зрабіць. Раней мне было лягчэй, бо я загадала сабе: ніколі не распытваць яго пра мінулае. Потым мы самі ж і дамовіліся, каб не прыгадваць яго, але цяпер яно, яго мінулае, будзе ўвесь час жыць і разам са мною...

Я супакойвала сябе, суцяшала, не разумеючы, што самае горшае, самае небяспечнае ў сямейным жыцці — гэта наша схільнасць бачыць усё лепшым, не такім, як у сапраўднасці, жаданне крыху аздобіць самыя звычайныя рэчы, надаць ім колер найярчэйшы, той, які можа ўсцешыць вока і сэрца; і калі гэта адбываецца, мы лічым сябе шчаслівымі — кароткія хвіліначчкі падману і самазабыцця.

Жыццёвая мудрасць, якая абавязкова прыходзіць да кожнага: да аднаго — раней, да другога — пазней.

Да мяне яна прыйшла потым, і яна мне ўжо нічым не магла дапамагчы.

## 15

Чакаю Валеру. У слабым сутонні губляецца возера і лес, а яго ўсё не відно: зноў гайсануў на паляванне. А мне хочацца яго пабачыць, пабачыць як мага хутчэй і перадаць яму маю вялікую радасць. Думаю пра гэта, чаканне не сцягваецца, і мне добра стаяць вось так ля акна і глядзець на белую снегавую прастору.

Якія шчодрыя людзі ў шчасці!

А вось цяпер я чакаю Валеру, гляджу на лыжню — Валерава лыжня! — і лезуць у галаў розныя нядобрыя думкі. У апошні час мне ўсё часцей і часцей думаецца пра тое, што Валера нешта таіць ад мяне. Ён зрабіўся маўклівы і задумённы. Часам спытаюся ў яго пра што-небудзь, а ён прахопіцца, быццам драмаў, скажа «што?», і мне даводзіцца паўтараць сваё пытанне, і толькі тады ён адкажа; гаворыць, глядзіць на мяне, але ж я бачу, што думкі яго блукаюць недзе далёка.

Магчыма, гэта простая падазронасць, наіўная мая падазронасць. Але ж ёсць і факты! Дысертацыю сваю ён закінуў, да кнігі, якую намысліў пісаць, не дакранаецца, з алоўкам у руках я не бачыла яго ўжо тыдні тры. Раней я

не магла свярджаць гэта з поўнай упэўнасцю, бо ён заставаўся дома, калі я ішла на працу. Цяпер жа ў нас так: паснедалі — разам выходзім. Я ў бальніцу, а ён — стрэльбу за плечы і ў лес. І да вечара яго няма.

Фортка акна адчынена. У сутонні блізкага вечара ўсё цямней і цямней бэзавы далягляд — на моцны мароз — над лесам, дзе зайшло сонца. І лыжны след, што пачынаецца ад нашага дома і відзён з акна, расплываецца, чэзне.

Я запаліла святло. Слых мой абвостраны: чую, як гудзе машына на гравійцы, чую дзіцячыя покрыкі, і раптам рыпенне снегу і тупат ботаў ля дзвярэй.

Валера! Але чаму ён сёння едзе з таго боку, ад бальніцы, а не з возера?

Дзверы адчыняюцца. Не, гэта не Валера, гэта Габінаў. Сёння ўдзень у нас з ім была цікавая гаворка. Заўтра ён павінен ехаць у Маскву на спецыялізацыю, будзе там чатыры месяцы, і ў нас з ім адбылася як бы развітальная размова. Я зайшла ў свой стары пакой, там цяпер працуюць цесляры, і ён мяне адшукаў. Зірнуў на новае акно ў сцяне, сказаў са скептычнай патэтыкай:

— Нам здесь природой суждено к рентгену прорубить окно. Класіка і сучаснасць. Няблага!

— Рэнтген там, дзе куханька была. А тут — перавязачная будзе,— растлумачыла я.

Ён намагаўся не глядзець мне ў вочы, вывучаў светлыя зрэзы на бярвенні, потым разглядаў гурбу тонкага сасновага стругавіння і сказаў, і ў голасе яго прагучала непадробленая туга:

— Пройдзе час, і будзе тут першакласная бальніца.

— Хіба вы не верылі ў гэта?

— Я чуў шмат абяцанняў: рэнтген, хірургія...

— Але ж зацверджаны сметы, адпушчаны сродкі! Усё пастаўлена, як вы любіце казаць, на практычныя рэйкі. Улетку дабудуюць правае крыло — гэта хірургія. А ўвосень прыедуць хірургі. Дзве штатныя адзінкі! Вы ж лепей мяне гэта ведаеце. А я спрабую пераканаць вас, што тут пачнецца залаты час!

— Жаль только — жить в эту пору прекрасную... Памятаеце! І я магу даць новае, уласнае асэнсаванне гэтай паэтычнай думкі: вы — не затрымаецеся тут доўга, я — не вярнуся сюды...

— Як? Вас жа і пасылаюць на спецыялізацыю, каб вы вярнуліся сюды!

— Будзем па поўную шчырасць?
— Хіба мы гаварылі калі-небудзь інакш?
— Гэта — праўда. І менавіта таму, мабыць, я і не вярнуся. Жыць, у сэнсе духоўным, будзе мне тут цяжка. Мне і раней было не дужа лёгка. І я стаміўся. Стаміўся ад бясконцых наездак, ад бясконцых «сто пяцьдзесят» перад абедам, стаміўся ад педантычнай пачцівасці нашай Твораж. А вы прыехалі — усё перавярнулася. Не, не ў свеце гэтым — свет непарушны! — а ў маім асабістым успрыняцці гэтага свету. Вы працуеце — не шкадуючы сябе. Я гэта бачу. І кахаеце свайго Валеру — таксама не шкадуючы сябе, адкідваючы ружовенькую дабрачыннасць абывацеля. Я разумею гэта. І мне хочацца жыць на такой жа плыні. Дыхаць на поўныя грудзі. З гэтай жа яраснай поўнасцю і кахаць і аддаваць сябе сваёй працы...

Цяпер ён увайшоў у пакой, і на твары яго была ўсё тая ж маска адчужанасці і бесклапотнасці, быццам мы зноў стаялі там, у развярушаным рамонтам бальнічным пакойчыку.

— Дзе наш паляўнічы? — спытаў Габінаў і ахвотна прыняў прапанову распрануцца і пачакаць: я сказала, што Валера зараз вернецца, бо звычайна ў такі час ён ужо дома.

Нібыта ў пацвярджэнне маіх слоў лыжная палка застукала па шыбіне — вярнуўся ўрэшце Валера: ён звычайна так робіць — схаваецца, а лыжнай палкаю ў акно стукае. Насвістваючы, ён ляпаў лыжамі, ачышчаючы іх ад снегу, потым уваліўся ў пакой: запахла гаркавым пахам дыму — у лесе, мабыць, распальваў вогнішча.

— Нешта не відно трафеяў,— пажартаваў Габінаў.— Няўжо аніводнага не стрэлася зайчоначка?

— Зачараваныя яны сёння: усе набоі расстраляў, і ўсё — на вецер!

— Значыцца, не паляванне ў думках. Паляванне — гэта творчасць: яно таксама патрабуе ад чалавека ўсіх сіл, часу — усяго чалавека цалкам, адным словам.

— Тады ставім на стол развітальную. Галіна Сямёнаўна, як у нас з вячэраю? Сядайма!..

— Не, не. Я развітваюся,— сказаў Габінаў, і зрабіў Валеру знак адысці надалей ад дзвярэй кухні, дзе я была.

Я зрабіла выгляд, што не заўважыла гэтага, але і не падслухоўвала, нават быццам выпадкова зачапіла дзверы, і яны зачыніліся.

Пра што яны размаўлялі — не ведаю. Але гаворка ў іх і трох мінут не цягнулася. Я паспела толькі пакроіць хлеб,

дастала з шафкі талеркі, як дзверы адчыніліся, і Габінаў пачаў развітвацца.

Пазней, калі мы былі адны, я спытала жартам Валеру: якія, маўляў, у вас там сакрэты былі?

— Ніякіх,— адказаў ён.

— Габінаў спецыяльна прыйшоў, каб з табою пагаманіць. Я гэта адразу здагадалася.

— Магчыма, і спецыяльна. Але ён не гаманіў са мною, а раіў. Даволі ўзнёсла і паэтычна раіў. Але парада яго была падобна на загад, каб я кінуў свае паляванне і па-сапраўднаму кахаў цябе.

— Ты ўсё жартуеш?

— Не. Ён загадаў мне, каб я кахаў цябе да скону дзён. Без жартаў загадаў!..

Валера абдымае мяне, цалуе; адной рукою ён гладзіць мае валасы, а другою прыўзнімае накрыўку каструлі.

— Што маем на вячэру? Ух, які ж я галодны!

І я — збіралася ж, падрыхтавала самыя суровыя словы! — не магу яго лаяць; я магу толькі глядзець на яго, улюбёна сачыць за тым, як ён шумна мыецца, як моцна расцірае ручніком твар і шыю, як прыгожа, з вялікім апетытам вячэрае, і гаворыць, што ўсё вельмі смачнае, і мне слухаць гэта вельмі прыемна, і прыемна адчуваць і бачыць, што ён побач, што мы разам...

## 16

Вечар.

Цёплы, зусім не зімовы вечар. Па-веснавому пахне мокрая акацыя. Неба попельнае; за рэдкімі шэрымі воблакамі жаўцее стары месяц. За голлем дрэў відаць агеньчыкі ў вокнах бальніцы, яны здаюцца зморшчаныя, дрыжаць, быццам хтосьці патрэсвае іх у пераце з чорнага голля.

Мы з Валерам стаім ля скрыжавання, якраз у тым месцы, дзе дарога ад нашай бальніцы ўспаўзае на грабійку: чакаем аўтобуса, каб ехаць да мантажнікаў, якія цяпер перабраліся на граніцу з суседнім раёнам. З таго боку працавала другая брыгада мантажнікаў, і вось яны сустрэліся, высакавольтная лінія пракладзена, і мантажныя брыгады адпраўляюцца на нейкі іншы ўчастак. Валяк жа запрасіў Валеру абавязкова прыехаць на развітальную вячэру.

Дзіўна, дзіўна часам усё ў чалавечым жыцці — ста-

рая гэта, як свет, і непаўторна новая думка. Увосень я прыходзіла сюды на скрыжаванне гэтае шмат разоў увечары — любіла глядзець, як імчаць па шашы асветленыя знутры аўтобусы. І часцяком я тады спадзявалася — гэта было яшчэ да тоіі Валеравай тэлеграмы — і верыла, што магу ўбачыць і сустрэць Валеру. Бывае ж такое ў жыцці: ведаеш, што немагчыма гэта, што не будзе, што не варта чакаць, а ўсё роўна і спадзяецца чалавек, і чакае, і гэтае чаканне яму — добрая, гаючая надзея.

Мне тады не хапала толькі яго, мне тады здавалася, што з'явіся ён, і жыццё заквітнее, і я буду самым шчаслівым чалавекам, і ніхто і ніяк не зможа азмрочыць маю радасць.

Валера прыехаў, і я зрабілася шчаслівая.

Ён і цяпер побач, і я па-ранейшаму шчаслівая, але ў гэтым маім шчасці гэтулькі цяпер трывогі, гэтулькі сумненняў, што я пачынаю палохацца, каб яно куды не знікла, гэтае маё шчасце, палохаюся няясных думак, трывожуся невядома з якое прычыны.

Менавіта гэта мяне і дзівіць: тое, што было далёка, цяпер блізка, побач, але, наблізіўшыся гэтак, яно быццам нешта страціла з сваіх чароўных таямніц, і чароўнасць саступіла месца — а можа, проста перарабілася?! — незразумелым сумненням, клопату, трывогам...

— Валера?!

— Што?.. Што, мая родная?

— Я пачынаю баяцца.

— І я таксама: мы спознімся, здаецца.

— Не, зусім іншае ў мяне... Нейкая боязь... Невядомая, незразумелая боязь... Ты зрабіўся нейкі другі... Змяніўся дужа. І з гэтага, мабыць, боязь. Вось... Пачала гаварыць гэта — ажно дрыжыкі па спіне...

— Вецер. Азябла. Таму гэта. Э-ээ! Аўтобус. Каньяк у нас з табою ёсць, зараз прыедзем да хлопцаў — сагрэемся!

— Толькі ты там многа не пі. Страшэнна не люблю, калі чалавек п'яны!

— А хто п'яніц любіць? Хіба толькі яны самі сябе. І ты добра ведаеш: я меру не перабяру ніколі. Свята, дата якая — калі ласка, я з ахвотаю. А як некаторыя — абы шклянку налаб закінуць? Не разумею. На свеце ёсць шмат лепшаі асалоды...

Аўтобус амаль пусты. Мы сядзім на першым сядзенні, і я бачу шчыток кіравання, асветлены маленькай лям-

пачкаю, і на якім прыляпаны дзве каляровыя красуні з часопіснай вокладкі, і бачу каляіны дарогі, зыркія ад аранжавага святла захаду; каляіны імкліва імчаць на нас, і здаецца, радыятар сячэ іх, кідае пад колы аўтобуса.

І зноў мае думкі-трывогі са мною. А Валера паціху нешта мармыча-спявае, потым жартам штурхае мяне локцем, і твар у яго дужа вясёлы, нічым не азмрочаны, і мне робіцца весялей. Але толькі на кароткі міг, бо я бачу яго вочы, у якіх не прайшла, трывала пасялілася туга. Так, вочы чалавека не могуць хлусіць!..

Да мантажнікаў прыязджаем позна. Ужо зусім цёмна, вокны перасоўных дамкоў асветлены, чуваць смех. Раней, калі хварэў Валяк, я з ахвотаю ехала да мантажнікаў: падабаліся іх жарты, таварыскасць, шчырасць. Цяпер нібыта прыліпаюць мае ногі да прыступак. І прыступкі не пазнаць, усё змянілася, зусім не так выглядае, як некалі там, паблізу, калі стаялі мантажнікі: абламаныя парэнчы — толькі два стаякі ад іх, сцены дамкоў абшарпаныя, размаляваныя нейкімі літарамі і лічбамі, а пад вокнамі намаляваны вялізныя чырвоныя трохкутнікі; з вузкага коміна вывальваецца дым, вецер кладзе яго на дах, а з даху ён скочваецца ўніз, нам пад ногі; ліхтар на слупку матляецца, быццам вось-вось адарвецца і паляціць на чорны, закураны снег.

— Ну, наперад! — гаворыць Валера і, працягнуўшы над маім плячом руку, адчыняе дзверы.

Развітальная бяседа ідзе ўжо сваёй хадою. На стале пустыя бутэлькі, чайнік, пячэнне, бляшанкі з кансервамі — рыбныя і мясныя, пузаты белы слоік з варэннем, на талерцы грудка жоўтых яблыкаў і наверх іх — тры вялізныя апельсіны. Бубніць забыты ўсімі транзістар на цвіку ля акна.

Рая кідаецца нам насустрач, бярэ з маіх рук паліто; і яшчэ адно імгненне — і мы ўжо ў цесным сяброўскім гурце ля вузкага драўлянага стала, і нас знаёмяць з хлопцамі-мантажнікамі з суседняга раёна і з іх брыгадзірам, які тут з жонкаю і сынам Толікам, які адразу ж паведаміў, над агульны рогат, і сваё імя, і імя па бацьку, і прозвішча, і тое, што яму пяць год.

Каньяк, які Валера стаўляе на сярэдзіну стала, сустракаюць вясёлым гармідарам. А я нават і ад чаркі адмовілася, праўда, дзеля адчэпнага ўзяла крыху, і мяне ніхто болей і не прымушае піць. У нас стварылася адразу ж свая жаночая кампанія — Ірына, жонка брыгадзіра,

Рая і я — і мы п'ём чай з варэннем, і ў нас свая гаворка, і вясёлы гармідар мантажнікаў не замінае нам і не турбуе. Потым мы ўсе разам спяваем песні і смяемся пазней з жартаў, якія, як з меха, вытрэсвае Генадзь — у такім адчайна вясёлым настроі я не бачыла яго ніколі.

Валера неяк вельмі хутка пасябраваў з маленькім Толікам, і адразу забаўка ў іх знайшлася: скруцілі з газеты тоўстую трубку, запіхваюць па чарзе туды цукеркі; цукерка лічыцца як ступень ракеты — такая ў іх гульня.

— Хопіць,— загадвае Валера Толіку.— Інакш сойдзе наша ракета з арбіты. Шасціступеньчатая ракета ў нас запраграмавана. Давай адну назад!

— Не хачу. Яшчэ туды многа-многа можна!

— Хто ж табе гэта казаў?

— Татка!

— Добры ў цябе татка.

— І ён можа сапраўдную ракету зрабіць. І ён сказаў, што ў нядзелю зробіць вялікую-вялікую.

— Калі сказаў — зробіць. Татка ў цябе добры!

— А ты чый татка?

Валера разгубіўся, заміргаў неяк часта-часта, прыкусіў губу, але тут жа, вельмі хутка, авалодаў сабою, заўсміхаўся, хаваючы сваю збянтэжанасць; рукі яго міжвольна сціснулі газетную трубку, і тая сагнулася і гучна трэснула; цукеркі пасыпаліся на падлогу.

— Аварыя! — са смехам паведамляе Валера і, бачачы, што Толік зараз заплача, паспешліва дадае: — Таварыш камандзір! Толік, ты ж камандзір касмічнага карабля! Уключай, камандзір, аварыйны адсек! Правільна робіш! Складваем, а гэтую ступень адкідаем! І мяняем арбіту! Смелы ты камандзір, Толік!

Толіку падабаецца гульня. А мне цяжка глядзець і на яго і яшчэ цяжэй глядзець на Валеру. Я адвярнулася і ажно скаланулася ўся: са сцяны, з вялікай фотакарткі, глядзіць на мяне, як жывы, Лукаш!

А мантажнікі спяваюць «Ой, бярозы ды сосны...». Вядзе песню брыгадзір — у яго прафесійна пастаўлены гучны барытон; Валера, які ўсё яшчэ не кідае гульню з Толікам, таксама падпявае, і спявае Рая з Генадзем, і спявае жонка брыгадзіра, і міжвольна і я апынулася ў плыні сумна-ўрачыстай мелодыі.

А ў сэрцы маім песні няма.

«А ты чый татка?»

Гэтыя словы апякаюць мяне, апякаюць увесь час, апя-

каюць, нібыта агонь, і я адчуваю амаль фізічны боль; і словы тыя чуюцца мне ва ўсім, яны стаяць перада мною, яны ціснуць на мяне, прыгнятаюць сваім непамерным цяжарам.

Дурніца!

Якая ж я дурніца! Якое наіўнае дзяўчо! Тое, што зараз з дзіцячай непасрэднасцю спытаў Толік, даўно жыве ў Валеравым сэрцы. І менавіта гэта ён тоіць ад мяне. І я здагадвалася пра гэта, здагадвалася, але баялася гаварыць, каб не пакрыўдзіць, каб памагчы яму забыць сваё мінулае. Але ж ён не забудзе яго ніколі! Магчыма, на нейкі час ён зможа прымусіць сябе не думаць аб ім. Але варта яму будзе вось так, як сёння, дакрануцца рукою да чужога дзіцяці, пачуць дзіцячы голас — і памяць бязлітасна адновіць усё: і першы голас яго ўласнага дзіцяці, і плач па начах у калысцы, і першае слова, і першы няпэўны крок...

Гэта — будзе!

Гэта — ужо ёсць!

І мне няма куды сысці ад сваіх думак, няма куды схавацца ад простай і бязлітаснай праўды: ты, менавіта ты, а не хто-небудзь другі, стала паміж Валерам, бацькам, і яго дзіцем!

Што ты скажаш у сваё апраўданне?

Кахаю. Я кахаю і не магу жыць без Валеры. Ён ведае гэта, і ён не мае права нешта мяняць у гэтым маім шчасці! Толькі я магу тут нешта мяняць. Але чаму менавіта я? Ён — мужчына. А я — жанчына. Яму лягчэй. А мне цяжэй. І таму я павінна ўсё вырашыць. Толькі я! І ніхто за мяне тут не знойдзе разумнага і правільнага выйсця. Магчыма, гэта эгаізм. Няхай! Але ці ж ёсць у мяне права на тое, каб нешта вырашыць толькі сам-насам, без яго, Валеры, нават не напытаўшы яго, не параіўшыся?..

Кахаю...

Але ж хіба гэта апраўданне? Так, апраўданне. Апраўданне і патрэбна вырашыць толькі разумна, толькі справядліва, толькі адкінуўшы свой эгаізм, нічога не патрабуючы ўзамен...

— І нічога ўзамен?

Мае губы сказалі гэтыя словы, і я спалохалася, я збянтэжылася. Потым зрабілася сорамна, быццам зрабіла нешта непрыгожае, і вельмі баялася, што гэтыя мае словы пачуў Валера.

Але ні ён, ні хто-небудзь іншы не пачуў нічога: усе спявалі, а Валера па-ранейшаму забаўляўся з Толікам. Яго пальцы пяшчотна пагладжвалі Толікавы валасы, і мяне, калі я ўбачыла гэта, працяла думка, якая і ўразіла мяне і яшчэ больш збянтэжыла і напалохала. А хто вось так, з такою пяшчотай, прыгалубіць яго, Валераву дачку?! І што думае ён, Валера, вось у гэты міг? Які клопат трывожыць яго?..

Не, мабыць, ніколі ён не раскажа мне пра гэта. А можа, раскажа? Не! Я магу, я павінна зразумець гэтыя думкі сама, я разумею іх, няхай ён толькі зараз зірне на мяне...

Ну, зірні на мяне!

Зірні, Валера! Мне трэба, я хачу, мне неабходна бачыць твае вочы! Бачыць зараз! Зірні!..

Валера марудна, быццам з натугаю, узнімае галаву. Я з няўцямным жахам гляджу на яго сціснутыя губы, далёкія чужымныя вочы...

Яны глядзяць на мяне, гэтыя яго вочы, але яны нічога не заўважаюць, у іх толькі пакуты і боль; гэтыя вочы быццам згледзелі нешта незразумелае, крыўднае і балючае нешта, згледзелі не тут, а недзе там, у далёкім ад мяне, зусім не тутэйшым свеце, і ў гэтым свеце — я бачу гэта, разумею і вачамі і сэрцам — мяне ўжо няма, я зусім не існую ў тым свеце, які бачаць Валеравы вочы...

А мантажнікі спяваюць. Ах, як жа суладна ідзе песня, як хораша яна гучыць!

А ўва мне — боль. І каб заціснуць яго, не даць яму прасторы і сілы, я заплюшчваю вочы і таксама пачынаю спяваць, і чую, як звініць мой голас, і разумею, што ніколі больш у жыцці не давядзецца мне пачуць такой песні, не давядзецца больш гэтак спяваць...

## 17

Ранак, і мы не спім, і я прыгадваю, як учора Валера быў неяк асабліва радасны, узрушаны і, як мне падалося, шчаслівы бясконца. Ён урэшце скончыў сваю працу, склаў аркушы ў дзве тоўстыя папкі, звязаў матузы і, паляпаўшы рукою па іх, сказаў урачыста і ўзнёсла:

— Усё! А як жа мне тут працавалася добра! Спачатку перашкаджала паляванне... А мо і не перашкаджала яно? Не, мабыць. Я хадзіў са стрэльбаю, думаў... Таму потым усё так хутка і напісалася. Цяпер — адпачынак ма-

лепькі. А тады — у дарогу. Ты ведаеш, як мы паедзем?

— Не ведаю.

— Выклікаем з раёна таксі! Потым на цягніку. Затым, з Мінска, самалётам. Потым — зноў таксі. А там ужо пожкамі тэпаем да Дзвіны. А потым лета... І мы будзем лавіць судакоў... Ты калі-небудзь спрабавала закідваць спінінг?

— Не, ніколі.

— Навучу. Абавязкова навучу!..

Я пагадзілася. Пагадзілася таму, што ведала: не будзе ні судакоў, ні спінінга, ні Дзвіны. Не будзе таму, што я не паеду туды. Не паеду з Валерам. Не паеду адна. Не паеду на Дзвіну ні яшчэ куды-небудзь. Не паеду нікуды ўвогуле!..

А казаць пра гэта Валеру баюся.

Мяне палохае гэтая размова, і я ўсё адкладваю яе, адкладваю як мага. Часам думаецца, што маё рашэнне не мае ніякага сэнсу, наіўнае, смешнае. Але гэтае рашэнне жыве ўва мне, выспела. Яно нарадзілася ў той вечар, калі мы прыехалі развітвацца з мантажнікамі і Валера забаўляўся з Толікам...

Я і дагэтуль памятаю выраз Валеравых вачэй. Я чакала тады, маліла, каб ён зірнуў на мяне, спадзявалася на сілу свайго кахання і нават сабе не прызналася тады, што верыла і спадзявалася загаіць гэтай сілаю яго боль.

Ён зірнуў тады — выпадковасць жа, не мог жа ён сам чуць, што я загадвала паглядзець у мой бок! — і я зразумела, што той боль непадуладны маёй сіле, зразумела і ўпершыню падумала пра тое, што ўкрала ў Валеравай дачкі бацьку і што павінна аддаць яго.

Тады гэта было нават не рашэнне, а толькі подступы да яго, кароткая, дзіўна кароткая думка, якая напалохала мяне і тут жа была закрэслена і адкінута, і, зрабіўшы гэта, я тут жа знайшла падставы супакоіць сябе: кахаеш, маўляў, і не трэба падманваць сябе, усцешваць сябе тым, што можаш кроіць сваё ўласнае сэрца.

Цяпер я разумею, што гэта не падман, што гэта горкая праўда: я хацела абысці яе, схавацца ад гэтай праўды за сваё каханне, і вось цяпер гэтая праўда, ад якой я хацела выкруціцца, жорстка помсціць мне, не дае аніводнага дня спакою, і з гэткай жа жорсткасцю, з якой я цяпер разумею тую праўду, я бязлітасна караю сябе, адкідваючы апраўданні, эгаістычныя свае апраўданні.

Кахаеш Валеру?

Так, кахаеш. І гэтае каханне ніхто не адбярэ ў цябе: яно ў тваёй волі, у тваёй уладзе, і гэта тваё ўласнае права. Але ж ты не павінна, не маеш права адбіраць бацьку ў той маленькай дзяўчынкі, з якою не сустракалася ніколі. У яе таксама ёсць права мець бацьку. І болей нічога! Яна нават не можа табе выказаць гэтае права, патрабаваць, каб ты захоўвала яго і выконвала свой абавязак. Абавязак? Так, у мяне ёсць ён! І ёсць каханне, і ёсць права на гэтае каханне, але ёсць яшчэ больш важкае права, права майго абавязку: я абавязана думаць і прымаць рашэнні і за сябе і за яе, невядомую мне і безабаронную дзяўчынку...

Думкі пра гэта ўжо ўлегліся ў душы, яны не так прыгнятаюць мяне, як раней, я нават неяк змірылася з тым, што яны ёсць, што мне ад іх не схавацца, што яны ў маёй уладзе. Але будучая размова з Валерам. Падумаю, і робіцца жахліва. Ці зразумее ён мяне? Як паставіцца да таго, што пачуе?

Я заўважыла — і гэта ўжо зусім не падазронасць, а факт — і ўсё часцей адчуваю, што ён з нейкай трывогаю пытаецца ў мяне, ці кахаю я яго. Я не хлусіла, я адказвала, што кахаю, і ён верыць мне, і верыць у наша будучае, і гэтую яго веру я павінна разбурыць, я павінна буду пацвердзіць яго трывогу; і тое, што казала, значыцца, не зусім тое, што ёсць на самой справе.

Ці правільна гэта?

Ці лагічна гэта?

Ці справядліва гэта?

Не ведаю. Клапоцячыся пра шчасце Валеравай дачкі, разбурыць сваё ўласнае, і разбурыць яго, Валерава шчасце, якое, як ён часцей і часцей пераконвае мяне, знайшоў са мною? Значыцца, два шчасці — за адно!

— Якія ў нас планы на сёння?

— ...

— Я пытаюся, якія планы на сёння мы складаем. Ты што, зноў спіш?

— Не, не... Увечары — клуб. Новае кіно паглядзім. А зараз — снедаць будзем. Але перад тым ты павінен зрабіць важную справу.

— Цяжкую?

— Не вельмі. Павінен пагаліцца. Ты дужа колкі.

— А ты можаш пацалаваць мяне такога, непаголенага?

— А гэта пе ўваходзіла ў план. Тое, што трэба зрабіць, мы вырашылі. Рашэнне ёсць? Ёсць! Трэба выконваць. Для мяне, ты ж ведаеш, цяжка прыняць рашэнне. А прыняла — ужо і лягчэй. Ты паляжы крыху, а я зараз пастаўлю чайнік.

— Я зраблю гэта сам. Як дадатак да плана.

— Калі ласка, і ад мяне дадатак!..

І я цалую яго, і мы зноў дурэем і рагочам. Але я заўважаю, што да нашай весялосці прымешваецца нязнаная раней штучнасць, быццам мы абодва сілімся пераканаць адно аднаго, што нам дужа весела.

Валера ўзнімаецца, ідзе на кухню, уключае газ і ставіць чайнік, потым варочаецца ў пакой, размахваючы доўгім белым шнурам электрабрытвы. Ён пачынае галіцца, і я сачу за ім.

Усе яго рухі ўпэўненыя, вочы вясёлыя — ранейшыя вочы,— і мне на нейкі міг пачынае здавацца, што нічога не адбылося, што не было той развітальнай вячэры ў маннікаў, не было Толікавага пытання, не было разгубленага Валеравага твару, не было маіх гаротных і горкіх думак, развагі і рашэння, майго ўласнага рашэння, якое павінна ўсё скасаваць, закрэсліць, адкінуць у нябыт...

Разумею, што гэта не так, што гэта толькі мае мары, і такая туга падкочвае да сэрца, што не хочацца ўзнімацца, не хочацца ўвогуле нічога рабіць. Адно карціць: заплюшчыць вочы, ні пра што не думаць, а толькі слухаць, як вуркоча і гудзе Валерава электрабрытва...

Але няма, няма куды схавацца ад самое сябе!..

Валера сочыць за мною, я адчуваю гэта, спахопліваюся, але мой позірк ён ужо заўважыў і адразу насцярожваецца, углядаецца; электрабрытва гудзе, вуркоча ў яго руцэ, якая адстаўлена ўбок, нібыта Валера замахнуўся на мяне.

— Што з табою? — пытаецца ён і выключае электрабрытву; у пакоі робіцца ціха, аж звініць у вушах ад гэтай цішыні. Я маўчу, і ён зноў пытаецца.— Не, ты мне адкажы, што з табою?

— Нічога. Гляджу на цябе, мой родны. Думаю.

— Аб чым, калі не сакрэт?

— Наша жыццё...

— Не, у цябе такі твар... Такі твар, быццам нешта табе не па душы...

— Па душы... Не па душы... Хіба ж гэта галоўнае?!

— А што ты ў нашым жыцці лічыш галоўным?

— Я і сама не ведаю.

— Зараз будзем высвятляць. Пагалюся, і ўсё дэталёва прааналізуем. Я заўсёды быў прыхільнікам яспага і дакладнага аналізу. Правільны аналіз — палова перамогі. Згодна?

— Не ведаю нават.

— Апошнім часам ты ўсё часцей ужываеш гэтае «не ведаю». Што не папытаеш — гэты адказ. Нешта цябе іншае прыгнятае. Стой, стой! Хопіць мне гэтага «не ведаю»!

— Няхай хопіць.

— Ну, вось і ўсё. Сапсавалася зусім мая «Нева». Усё не збяруся набыць новую. Кажуць, ёсць «Агидель» — вяршыня даскапаласці. Цуд, а не электрабрытва.

— Вось, урэшце, ведаю, што табе на дзень нараджэння купіць.

— І не думай. Гэта нецікава, калі ведаеш, які будзе падарунак. А вось я табе падарунак намысліў — сто год думай і не здагадаешся. Прыеду, атрымаю прэмію і куплю.

— Вялікая, дарэчы, прэмія?

— Урэшце, у табе прачнулася гаспадыня: ты ўпершыню папытала мяне пра грошы.

— Не, мяне проста дзівіць. Памятаю, там яшчэ, у Мінску, ты казаў пра нейкую прэмію. Дык што, гэта ўжо другая?

— Тая ж. Гэта тое, што мы яшчэ з Васілём вынайшлі — новая форма бура для вялікіх глыбіняў. Пакуль зацвердзілі... А цяпер нам з табою належыць зацвердзіць план дзеянняў на ўвесь дзень...

— Ай, кінь ты гэта. Ідзеш мыцца?

— Так, толькі ты ляжы, прашу цябе. Я хуценька, а ты — паляжы,— ён цалуе мяне і мякка ляпае па плячы.— Ну, прашу цябе!..

Мне па-ранейшаму не хочацца ўзнімацца, і я ляжу і чую, як плюскоча вада, чую Валеравы крокі, яго голас,— Валера любіць, калі мыецца, што-небудзь напяваць ці пасвістваць.

Кожная мінута без яго — пакута. А што ж будзе, калі ён паедзе і я застануся адна?

Валера садзіцца ля мяне на ложак, і прыемна пахне свежай вадою і хвойным мылам. Расчэсвае мокрыя валасы, гаворыць:

— Кожны план, калі гэта рэальнасць, а не валюнтарызм, павінен грунтавацца на калектыўнай думцы і цвёр-

дай эканамічнай глебе. Значыцца, што мы маем? Прэмія за рацыяналізацыю — пяць тысяч...

— Кожнаму? І табе і Васілю?

— Безумоўна. І таму ў нас з табою ёсць цвёрдая эканамічная база складаць рэальны план...

— Ты даруй... Магчыма тое, што я зараз скажу, пакрыўдзіць цябе...

— Ніводнае тваё слова мяне не можа пакрыўдзіць і ніколі не крыўдзіла!

— Гэтыя грошы ты пашлеш дачцэ. Не, не пашлеш, а паедзеш і купіш ёй піяніна. Памятаю, аднойчы ты сказаў, што ў яе добры слых і што яна любіць спяваць... Яна павінна навучыцца іграць... Ты даруй, але я часта думаю пра яе. Ведаеш, у дзяцінстве я вельмі хацела навучыцца іграць на піяніна. Хацела і не змагла. І цяпер я хачу, каб твая дачка зрабіла тое, чаго зрабіць мне не ўдалося... Я не ведаю, ці разумееш ты мяне... Але вось такое жаданне ў мяне ёсць... І гэтыя грошы нам з табою не патрэбны. Абыдзецца... Абяцай, што ты гэта зробіш!..

Валера маўчаў. Вельмі доўга маўчаў, гладзіў мае валасы, і рука яго час ад часу спынялася, бы хтось затрымліваў яе. Я разумела: ён пакутліва думаў, шукаў, што мне адказаць. А мо прыгадваў мінулае, тое, пра што казала яму толькі што?.. Ах, гэтыя чалавечыя думкі! Ніхто і ніколі не змог і наўрад зможа калі-небудзь зазірнуць туды, дзе яны нараджаюцца, убачыць, як гэта адбываецца. Магчыма, гэта і на лепшае, для мяне, ва ўсялякім разе, безумоўна, на лепшае. Каб жа Валера ведаў, якое рашэнне выспела ў маёй галаве, хіба ж такая ласкавая была яго рука, хіба ж з гэткай пяшчотаю гладзіў ён мае валасы?!

— Ты сапраўдны чалавек, Галчо! І мудрая жанчына,— урэшце прамовіў ён.— І гэта найвялікшае маё шчасце, што я стрэў цябе!

— Ты абяцаеш, што зробіш гэта?

— Мы зробім тое разам з табою.

— Ты павінен мне абяцаць. Абяцаеш?

— Так, абяцаю. Я ўсё зраблю так, як ты пажадаеш.

— Дзякую.

— А цяпер ні пра што не думай. Я буду сядзець побач, а ты ні пра што не думай.

— Чалавек так не можа, каб ні пра што не думаць.

— Давай паспрабуем. Не, лепей будзем думаць пра нас... Уяўляеш? Мы — на Дзвіне!.. Човен... Плёскат хва-

ляў... Вербалозы... Пясочак жоўты... І мы ідзём басапож... І кнігаўкі над вадою! Уяўляеш?

— Нават вельмі добра. Я вось вочы закрыю, слухаю цябе. І ўсё бачу.

— Наперадзе ў нас ручаі. Вада ў ім халодная, халодная. Крынічная...

— І па дне водарасці. Зялёныя і гнуткія. І каменьчыкі таксама зялёныя.

— Правільна. А на другі бок ручая — бярозы. Мы спыняемся ля іх і сядзім. Чуеш, як шуміць пад ветрам лістота? Шу-шу-шу...

— Так, дарагі мой: усё, усё я гэта чую...

— Што з табою? Ты плачаш? Што здарылася?

— Я прыгадала... Ты сказаў — бярозы на другі бок ручая. А я прыгадала бярозы... Бярозы ў парку. Памятаеш? І тады ты яшчэ сказаў, што на галінах растуць зоркі... І я вельмі спалохалася тады, калі ты мяне пацалаваў... І потым крыўдавала, што ты мяне не цалуеш... Але тое было пазней...

— А цяпер ты не крыўдуеш?— папытаў ён і пацалаваў мяне. Але я не пацалавала яго.

— Цяпер — не. Але мінаюць дні, і мне ўсё цяжэй і цяжэй з табою... Не, не з табою! З табою мне добра! Мне цяжэй з маімі думкамі... Я ўсё мацней і мацней адчуваю сваю віну перад тваёй дачкою. Гэта ж я вінаватая, што ў яе не будзе бацькі...

— Ты не вінаватая! Чуеш? Ані ў чым не вінаватая. Нам з табою цяжка даецца шчасце... Гэта — праўда. Але мы яго збудуем. Разумееш?

— Збудуем на чужым няшчасці. На чужым горы! Праўда?

— Не кажы гэтак! Аніколі не кажы!

— Родны, не злуй. Я проста зрабілася нейкая дурная... Дурная ад гэтых сваіх думак... А мо не ад думак, а шчасце і радасць, і боязь згубіць гэта, разуменне, што губляць давядзецца...

— Ты разумная. І дужа добрая!..

Валера цалуе мяне, ён цалуе і гаворыць, шэпча мне ласкавыя словы, і гэтыя словы, як атрута, асядаюць ва мне, і я не магу змагацца з ёю, я таксама цалую яго, і ўжо няма ні думак, ні шкадавання, а толькі звініць у скронях узбунтаваная кроў...

А потым мы ляжым, і ляжым моўчкі, і я ведаю, што нашае маўчанне — хлусня, няпраўда, бо кожны пра не-

шта думае, і гэтае «пешта» і ёсць тое, што заўжды будзе стаяць паміж намі; яно, гэтае «нешта», будзе існаваць нават тады, калі мы апынемся далёка адно ад другога, і аніякі час, аніякая адлегласць не закрэсліць, не можа знішчыць яго...

І маўчаць мне ўсё цяжэй і цяжэй. Я ведаю, я перакапана, што павінна сказаць Валеру пра сваё рашэнне. Абавязкова! І чым хутчэй я зраблю гэта, тым лепей будзе і яму і мне.

Цяжэй, але лепей...

## 18

Зноў атрымала ліст ад Вольгі. Вось што яна піша.

«Галка, родная мая! Не бачыла цябе амаль што дзевяноста дзевяць год. І гэтулькі ж — не пісала. Апраўданні? Ты ж ведаеш: Вольга не прызнае аніякіх апраўданняў, і ненавіджу я іх! Той, хто апраўдваецца, як і той, хто просіць, павінны схіліць голаў. А чалавек не дзеля гэтага народжаны на боскі свет!

А вось пакаяцца — калі ласка: болей гэтак бессаромна ігнараваць сваю лепшую сяброўку не буду. Між іншым, калі і не будзе ад мяне лістоў, ты ведай: у маім сэрцы для цябе — самае добрае месца...

Але вады збегла за гэты час шмат. Пастарэла я, тамсям нават з'явілася ў тваёй Вольгі «высакародная» сівізна — тры валасінкі знайшла. З гэтага выпадку — ведай нашых! — перафарбавалася ў чароўную «рыжулю». Эх, зірнула б ты на мяне!

Адпачывала ў Ялце. Здарава! Адчуваю сябе добра, галава не баліць. З Ялты я пісала табе, але ў адказ атрымала хвігу — сапраўды царскі падарунак.

Грымнуў у хаце невялічкі скандальчык. Першая жонка майго дарагога мужанька наважылася адхвастаць у яго машыну і палову кватэры амаль. І мой прыгажун прыняў гэта за належнае і нават адмовіўся змагацца за месца пад сонцам. Давялося ўзяць усё гэта на свае плечы, выйграць усе баі і потым залечваць раны пад сонцам Ялты. Цяпер я — у норме.

Была ў Мінску, потым у Ждановічах, шукала Валеру: ён мог мне памагчы ў адной справе. Але ён знік бясследна, і ніхто не ведае, куды знік. А шкада, што ты яго не затрымала і не звязала. Павер мне — я ведаю з абсалютна дакладных крыніц — і ведай: Валера ў павуковым

свеце ідзе па ўзроўні зорак вялікай яркасці. Гэты Балівар паскача далёка!

Калі і куды ў адпачынак? Напішы гэта абавязкова. Мне запланавана камандзіроўка, і мы з табою можам сустрэцца на поўдні. Толькі загадзя давай свае каардынаты.

Месца ў мяне на кафедры трывалае. Я прайшла тут агонь і мядзяныя трубы. Пры сустрэчы — гаворкі нам на дзевяноста дзевяць год. І галоўная праблема — табе трэба сюды. Разумееш?

Твая, твая, твая... І яшчэ раз — твая Вольга».

Ліст мяне расчараваў. Добра яшчэ, што я прачытала яго на працы і Валера не бачыў — уся мая пошта ідзе мне на бальніцу. Яго ліст напэўна б пакрыўдзіў.

Ах, Вольга, Вольга... Ці ж яна гэта? Не, яе проста не пазнаць. І, мабыць, не салодка ёй давялося там: яна ганарліўка, не прызнаецца, але гэтае яе «агонь і мядзяныя трубы» мне шмат пра што гавораць. Дурніца яна! Навошта, у імя чаго кінула Сцяпана?!

І ў Ждановічах была. Навошта яна ездзіла туды? Шукала Валеру — гэта яна піша. Але навошта ён спатрэбіўся ёй? «Мог мне памагчы ў адной справе»! У якой? Не, проста авантурыстка нейкая з яе атрымалася!

Правільна зрабіла я, што не паказала ліст Валеру.

## 19

Ноччу я прачнулася. Апошнім часам гэта са мною здараецца: кладзёмся звычайна позна, але я ўсё роўна прачнуся ноччу, прачнуся вось так, як зараз — раптоўна, нечакана, невядома з якое прычыны.

У пакоі ціха. Валера спіць. За акном маладзік. Твар Валеры здаецца змрочна-белы, як мармур. Валасы раскіданы па падушцы, а губы сціснуты, быццам нечым ён незадаволены. Не, вось губы зварухнуліся і зварухнулася рука, і голас сонны, ціхі, і ў ім і маленне, і загад, і крыўда, і ўзнёслая патрабавальная ўрачыстасць:

— Я ж казаў табе, дачушка, што няможна, не трэба сваволіць!..

І зноў вусны шчыльна сціснутыя, і зноў, як змярцвелая, рука на падушцы, і зноў мармуровае святло маладзіка на твары, і зноў цішыня, і шоргат марознага снегу за акном... Мне горача, неяк адразу робіцца горача, быццам палае побач вогнішча, і скідаю з плеч коўдру, і ад гэтага майго руху Валера адразу ж прачынаецца.

— Што? Што ты казала? — пытаецца ён, і я разумею, што ён не зусім яшчэ развітаўся з тым, што прыснілася яму.

— Нічога не казала. Не спіцца. Ляжу вось і думаю...

— Ты не думаеш, а мерзнеш! Плечы, як ледзяшы, парабіліся! Хутчэй пад коўдру! Во-ось гэтак... І пра што ж ты думала?

Валера моцна абдымае мяне, і я адчуваю, які ж ён гарачы, і ад гэтай гарачыні дрыжыкі скалапаюць мае азяблыя плечы. А голас — той, саплівы яго голас! — усё яшчэ гучыць у маіх вушах, і я адчуваю, што вось ён, той міг, калі я павінна і змагу сказаць яму ўсё, бо потым раніцам мне цяжка будзе зрабіць гэта.

— Я думала пра тое, што ты павінен ехаць у сераду адзін.

— А ты? Табе будзе потым цяжка адной ехаць.

— Мне не давядзецца нікуды ехаць.

— Не разумею.

— Мне трэба заставацца тут. Я хачу ехаць. І не магу. Не маю права ехаць. І добра разумею, што з гэтага нам будзе лепш. Нам. І табе і мне.

— Магчыма, я сплю?

— Не, ты не спіш.

— Тады гэта нейкі падман. Нейкая невядомая мне гульня!

— Гэта — праўда. Звычайная і па-звычайнаму горкая праўда.

— Тады ты мне растлумач! — Валера падхапіўся і сеў на ложку.— Растлумач, каб я зразумеў, што не звар'яцеў і не сплю!

— Валера, родны мой,— я казала гэта і ўпершыню адчула, што спраўджваюцца мае найгоршыя прадчуванні, і Валера не разумее, не можа зразумець мяне. Але словы былі сказаны, і спыніцца ўжо не было як і не было патрэбы, і гэта надало мне сілы не заплакаць, заціснуць свой боль і размаўляць неяк дужа спакойна; мне нават здалося, што я кажу не Валеру, які ляжыць побач са мною, а камусьці яшчэ, і той чалавек далёка ад мяне.— Ты разумны, ты шчыры, ты ўсё павінен разумець... Я шмат думала і лепшага прыдумаць не змагла. Лепшага ўвогуле не існуе, ёсць толькі гэта, і ты... Не, не! Не перапыняй мяне. Ты слухай! Толькі слухай... Збіралася даўно, збіралася і не магла. А цяпер вось кажу... Ты толькі што, праз сон, размаўляў з дачкою, нешта загадваў ёй, нават прасіў... І гэта

будзе ўсё жыццё: мы будзем разам, а сэрца тваё будзе там, і ты кахаеш яе, і будзеш кахаць усё жыццё, і было б дужа непрыгожа, каб я паспрабавала забараніць гэта ці ўзялася падманваць цябе, рабіць выгляд, быццам нічога не заўважаю, быццам усё ідзе належным чынам... I я не вінавачу цябе. Павер мне, не вінавачу і ніколі не зраблю гэтага. Калі і ёсць хто вінаваты, дык гэта я адна. Я не мела права клікаць цябе сюды, я не мела права кахаць цябе... Не, не! Я хачу цябе кахаць, я кахаю! Павер мне, што гэта сапраўды так! Але цяпер я ведаю, што ў кахання ёсць свае законы, свае правы, свае межы...

— Межы? Якое глупства! Ды лухта гэта! Ты стамілася. Разумееш?

— Ты пачынаеш злавацць... Не трэба злаваць. Памятаеш нашу размову аб тваёй прэміі?

— Памятаю. I памятаю: усё ж вырашылі тады.

— Правільна, вырашылі. Але толькі цяпер разумець пачала, што я хацела супакоіць тым сваім патрабаваннем сваё сумленне, неяк прыглушыць, зменшыць сваю віну перад тваёй дачкою. Як хабар які! Як нейкая шчодрая дабрачыннасць! Украла бацьку, а хоча быць дабрадзейкаю. Не, я не буду ёю! Я буду пакутаваць, я, можа, і жыць доўга не змагу, але чужое шчасце я красці не буду!

— Тое, што ты гаворыш, не мае аніякага сэнсу. Мы — кахаем. Хто можа нас абвінаваціць?

— Мы!

— Мы?

— Так! Спачатку — мы, нават калі мы самі сабе не прызнаёмся, што вінаватыя. Потым — яна, твая дачка. Яна вырасце, сустрэне мяне. Мы ж абавязкова некалі сустрэнемся. I калі яна нават мяне ані ў чым не абвінаваціць, я буду ведаць яе абвінавачванне, я буду ведаць яе словы, я ведаю гэтыя словы зараз...

— Якія словы?

— Ты была, маўляў, шчаслівая, ты кахала... Але хіба ж мае слёзы цябе не трывожылі?..

Валера рыўком адкінуў коўдру, узняўся і, ужо стоячы на падлозе, выгукнуў:

— Чорт ведае што робіцца! Мы што, сёння з табою адкрываем сусвет? Тысячы людзей жывуць у такім жа становішчы. Разумееш? Тысячы!

— Няхай нават мільёны. Кожны жыве па законах свайго ўласнага сэрца.

— Але ж я кахаю цябе. Гэта ты можаш зразумець? Не каго-небудзь, а менавіта цябе!

— Я таксама кахаю, родны ты мой. Мне часам здаецца, што я нават і не жыву, а ўсё гэта — казка, добрая прыгожая казка...

— Слаўны ты канец прыдумала гэтай казцы. Нечаканы.

— Гэтага я і баялася. Ты нічога не зразумеў...

— Чаму не зразумеў?

— Таму што ў маёй казцы няма канца і не будзе аніколі. Я ўсё жыццё буду кахаць цябе, радавацца кожнаму твайму поспеху, поспеху тваёй дачкі...

— Мы яе возьмем да сябе. І яна будзе разам з намі!

— А маці! Падумай, што ты гаворыш!

— Тады што ж было ў нас з табою? Што было і што ёсць? Суцэльны падман?

— Ніякага падману не было.

— Тады ты можаш мне адказаць, дзеля чаго ты робіш усё гэта? Дзеля чаго ты намысліла гэтыя пакуты?

— Дзеля твайго шчасця.

— Майго шчасця? — ён кінуўся да мяне, пачаў цалаваць, і ў яго пяшчотах было нешта грубае, ніколі не ўведанае мною.— Шчасце маё — ты! Ты! Ты! І я гэта ведаю! Ведаю! Але не ведаю іншага: чаму яно, маё шчасце, само і разбурае яго, чаму маё жыццё ішло і ідзе гэтак невыносна цяжка?

— Ты хочаш сказаць, што маё ідзе лёгка. Так?

— Я вельмі кахаю цябе. Гэта — праўда.

— Другога кахання ў мяне не будзе. Я ведаю...

— Тады навошта ўсё гэта? Навошта?

— Маўчы. Ляжы і маўчы. Не патрэбны болей словы. Яны нічога нам не дадуць. Дзе твая рука?

— Азяблыя ж плечы. Як ты азябла! І нейкая зябкасць у душы, быццам трымціць усё ўсярэдзіне... І калі ж гэтая ноч скончыцца? Я ўключу транзістар...

— Уключай.

— Ч-чорт! Селі батарэі. І хацеў жа ўзяць запасныя!

— Памаўчым крыху, прашу цябе...

— Правільна. Я таксама пачынаю баяцца слоў...

Цішыня ў пакоі. За акном маладзік, але цяпер ён спроўз улева і асвятляе шыбы скоса, і размаляваная марозам верхняя шыба акна быццам падзелена на дзве няроўныя па колеру часткі; у цішыні чуваць, як недзе ў

кутку, пад дошкамі падлогі, нясмела і баязліва скрабуцца мышы.

Дзіўна, зусім жа новы дом, а яны ўжо завяліся.

## 20

Валераў чамадан ужо ў вагоне. Мы стаім на пероне і бачым, як запалілася зялёнае вока семафора, і бачым, як закрывае пляцоўку праваднік, і разумеем, што словы зусім непатрэбныя, што яны нічога не зменяць, не ўратуюць нас ад расстання, і мы баімся слоў.

Мы баімся слоў і пра мінулае і пра будучае. Асабліва я баюся слоў пра тое, што звязвала нас, баюся, але ведаю, што гэтыя словы неабходны, што павінна знайсці іх.

— Якія прыгожыя таполі,— гаворыць Валера, утаропіўшы позірк на дрэвы станцыйнага парку, якія густа абсыпала зыркая шэрань; вецер гайдае галіны, і шэрань асыпаецца і зіхаціць.— Зусім як у Ратамцы...

— Была адліга. Цяпер мароз. І шэрань асыпаецца з тапаляў.

— Уночы, мабыць, будзе завіруха.

— А ў вагоне цёпла?

— Нават вельмі. Горача!

— Ты ведаеш, пра што я зараз думаю? Першы раз такое ў жыцці: адчуваю, разумею, што раблю непапраўную памылку і лячу ёй насустрач. Сама! Хіба ж гэта не праўда?

Ён маўчаў, і тады я сказала зноў, сказала, каб неяк яго супакоіць, сказала, хоць і ведала, што раблю не тое, што трэба.

— Смешна... Ты едзеш, а я — застаюся. І не разумею, чаго ты маўчыш. Як каменны маўчыш! А я ж губляю цябе назаўсёды!..

Ён маўчаў, маўчаў упарта, быццам не чуў мае словы, і твар яго быў у белых плямах-палосах, быццам толькі што адхвасталі шырокай пугаю, і я сабрала ўсю сваю волю і сказала, зноў не разумеючы, навошта мне былі тыя словы:

— Я хачу, каб ты быў шчаслівы. Вельмі шчаслівы. І ты будзеш шчаслівы! Я ведаю: мужныя людзі заўсёды бываюць шчаслівыя. А ты — мужны... Цягнік жа ідзе! Ты што, не бачыш?..

Валера пацалаваў мяне, пацалаваў размашыста, з адчаем і моўчкі, пацалаваў гэтак моцна, што ў мяне заба-

лелі вусны, і, не сказаўшы аніводнага слова, ускочыў у тамбур.

Грукацелі колы, вохкалі пераходныя масткі вагонаў, і снегавы пыл хвастаў мяне па твары, і сэрца маё адкрывала нязнаны раней сэнс нашага кахання, сэнс упартага маўчання Валеры, сэнс бязлітасны, сэнс праўдзівы, сэнс, які ўратоўваў мяне.

Валера знайшоў мужнасць не папракнуць мяне ані ў чым, і да гэтай мужнасці яго прывяла я. І ніхто іншы, а я сама, сваімі рукамі перакрэсліла ўсё самае лепшае ў маім жыцці, перакрэсліла тое, што, напэўна ж, ніколі не будзе больш, што ніхто мне ўжо не верне, ніхто не падаруе, ніхто не аддасць.

Ён таксама разумеў гэта, разумеў і нават — я ж бачыла, бачыла ўсё вельмі добра! — зайздросціў мае смеласці, смеласці не вельмі разумнай і, магчыма, зусім і непатрэбнай, і не хацеў заставацца мужчынам, якога пакідае жанчына, і яшчэ мацней кахаў мяне і саромеўся нават на развітанне прызнацца ў гэтым сваім пачуцці; не жадаў прызнавацца ні сабе, ні мне, і паважыўся проста адпомсціць мне, ударыць як мага балюча, і не знайшоў патрэбных слоў, і вырашыў пакараць мяне гордым маўчаннем, і зрабіў гэта, і, зрабіўшы, сам пакутаваў, і таму не мог зразумець, што гэтым сваім маўчаннем ён суцешыў мяне больш, чым маглі суцешыць самыя ласкавыя словы, і пераканаў, што іншага шляху супакоіць сваё сэрца, захаваць сваю чалавечую годнасць у мяне не было, не магло быць і ўвогуле не існавала...

## 21

Працягла і тужліва спявалі снегіры: далёка-далёка, амаль і не чутно, лапатала сарока, змоўкла, і зноў — ціхі і маркотна-тужлівы пасвіст снегіроў, і шархаценне снегу, які коціцца па кудлатых галінах ялін, і невыразны, з прыглушаным звонам, гул...

Потым усё знікла, быццам у магнітафоне парвалася стужка. Але стужка была цалюткая і, суха шоргаючы, намотвалася на касету, і мне не хацелася ўставаць і глядзець, што там адбылося з магнітафонам. Я ўключыла яго, калі вярнулася са станцыі, і сядзела і слухала запіс, які мы зрабілі разам з Валерам у лесе, і ўсё ва мне быццам змерзлася — і думкі, і жаданні, і надзеі — і ўключыла я магнітафон машынальна, бо ён трапіў мне на во-

чы — стаяў у цэнтры стала. Я зазябла дарогаю і сядзела не распранаючыся, не задумваючыся над усёй складанасцю таго, што адбылося на пероне.

Потым я наважылася ўзняцца, каб выключыць магнітафон, і ў гэтае ж імгненне загучаў голас Валеры. Мне здалося, што Валера тут, у пакоі, і я нават азірнулася, але пакой быў пусты, і, яшчэ не асэнсаваўшы гэта, я зразумела, што чую запіс, які Валера зрабіў употай, зрабіў, калі мяне не было побач.

«...і зноў паўтараю табе: я не памыліўся, Галчо! Ты — Чалавек з вялікай літары, і не проста жанчына, а цуд, які не вельмі часта сустракаецца.

Цяпер я ведаю, чаму ты вырашыла гэтак зрабіць, чаму застаешся тут. Каханне зрабіла цябе празарліўкаю, і ты паспрабавала зазірнуць далёка наперад, магчыма, нават далей, чым гэта рабіў я сам, і ўбачыла там сябе адзінокаю. Без мяне! І гэта цябе напалохала. І ты яшчэ болей зацвердзілася ў думцы, што неўзабаве згубіш мяне, што маё мінулае ўварвецца ў наша шчасце і скрышыць яго. Ты спалохалася гэтага гора. Ты не схацела бачыць, як будзе гарэць, згасаючы, наша вогнішча, нашы надзеі. Табе здалося, што гэты агонь ужо запалаў, і ты намысліла патушыць полымя зараз, пакуль яшчэ моцная, пакуль воля ўпартая і розум чысты, і ты можаш скруціць, адолець свой боль, і захаваць сваю годнасць, і пайсці жанчынаю, якую не пакінулі, а моцна кахаюць.

Ты зрабіла і мяне ў чымсь і моцным і мудрым.

Я нават ведаю, што ты мне скажаш на развітанне. Ты будзеш шкадаваць аб тым, што робіш. Шкадаваць толькі на тое, каб я гэта бачыў і ў тым знайшоў суцяшэнне.

І калі гэта будзе менавіта так, а не інакш, значыцца, я не памыліўся: ты — сапраўдны мой сябар.

А сяброў не кідаюць. Ім не здраджваюць. Ім вераць! З імі ідуць да самага апошняга канца.

А зараз — наша песня. Я толькі снегіроў трошкі скараціў, каб табе гэта ўсё сказаць. І ты чакай мяне і слухай песню, і я буду побач...»

Зноў суха шастала-шухцела стужка, потым уварвалася і адразу запоўніла пакой мелодыя «Песняроў». Валера не паспеў тады ў час уключыць магнітафон, і першыя такты не былі схоплены, і цяпер песня, якая загучала з абарванага радка, была, як выбух, як яркая паласа святла, як гарачы прамень, і я ледзьве не задыхнулася ад

яго агню, і ўскочыла, і, сама не ведаючы навошта, павярнула валік гучання, і песня рынулася набатам, тужлівая, са звонам песня.

Потым я падбегла да акна, ірванула аканіцу, якая была заклеена на зіму, і яна адлящела, разадраўшы папяровыя палоскі, і марозная завіруха сцебанула мяне па твары. І тут жа адчыніліся дзверы, і на парозе з'явілася спалоханая Зіначка, і я глядзела ў яе здзіўленыя вочы і бачыла, што яна разумее мяне, што гатовая дапамагчы мне ва ўсім, і пакутуе страшэнна, і я была ёй удзячна, але аніводнага слова не сказала пра тое, што было ў маім сэрцы.

За акном, набіраючы моц, віхурыла завіруха, і ў мяне на руках, якімі я абапіралася аб падваконне, на лобе, шчоках і бровах раставаў марозны і халодны снег.

*1973*

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Празаік Алесь (Аляксандр Ануфрыевіч) Савіцкі нарадзіўся 8 студзеня 1924 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

У Полацку правёў маленства. З восені 1939 года вучыўся ў сярэдняй школе ў горадзе Гродна. У 1942—1943 гг. быў партызанам у атрадзе «Смерць фашызму», а ў 1943—1944 гг.— камандзірам падрыўной групы атрада «Бальшавік» (Ветрынскі раён). У 1944—1945 гг. знаходзіўся ў дзеючай арміі, удзельнічаў у вызваленні Варшавы і Гдыні, у баях за ўзяцце Берліна. Быў тройчы паранены.

Дэмабілізаваўшыся ў канцы 1945 г., каля васьмі год працаваў у рэдакцыі полацкай газеты «Бальшавіцкі сцяг». Быў старшынёй полацкага літаратурнага аб'яднання.

У 1958 г. скончыў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага, а ў 1961 г.— аспірантуру пры гэтым інстытуце. Працяглы час працаваў вучоным сакратаром Літаратурнага музея Якуба Коласа. У 1969—1973 гг.— загадчык сектара літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Першае апавяданне «Рыбацкае шчасце» надрукаваў у снежні 1948 г. у полацкай газеце «Бальшавіцкі сцяг». Надрукаваны кнігі: «Кедры глядзяць на мора» (1960), «Пасля паводкі» (1962), «Жанчына» (1963), «Белы гарлачык» (1965), «Палын — зелле горкае» (1967), «Самы высокі паверх» (1968), «Шкляная нітка» (1970), «След пракладае першы» (1971), «І нічога ўзамен» (1973), «Верай і праўдай» (1976), «Скажы мне праўду» (1978), «Толькі аднойчы» (1979), «Зямля не раскажа» (1980), «Літасці не чакай» (1982), «Памерці заўсёды паспееш» (1983), «Белая знічка» (1984).

Аповесць «Самы высокі паверх» і іншыя творы аб камсамоле і моладзі адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

Творы А. Савіцкага выходзілі ў перакладзе на рускую, украінскую, узбекскую, армянскую, чэшскую мовы.

# ЗМЕСТ

САМЫ ВЫСОКІ ПАВЕРХ . . . . 3
Аповесць

І НІЧОГА ЎЗАМЕН . . . . . . . . 299
Аповесць

*Біяграфічная даведка* . . . . . . 447

**Александр Онуфриевич**
**САВИЦКИЙ**

**Избранные произведения в 2-х томах**
**Том 2**

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар *П. З. Шаўцоў*. Мастак *Н. Ул. Сустава*. Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*. Тэхнічны рэдактар *Г. П. Тарасевіч*. Карэктар *І. М. Паланейчык*.

ІБ № 2203

Здадзена ў набор 13.04.84. Падп. да друку 30.11.84. АТ 05789. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 23,52. Ум. фарб.-адб. 23,52. Ул.-выд. арк. 26,45. Тыраж 9000 экз. Зак. 306. Цана 2 р. 10 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.